Моўшка: "Магутная сіла беларускай зямлі дала асобны духоўны і ўнешні воблік беларускім жыдам. Цяпер яны рожнюцца ад усіх другіх жыдоў, і іх па ўсяму сьвету называюць: "літвакамі". *(Зьмітрок Бядуля)*. "Ізраільскі гісторык Хаім-Гілель Бэн-Шошан (ураджэнец Валожына) узьнікненьне асобнага літвацкага субэтнасу датуе пачаткам XV ст." *(В. Зайка)*.

Максюта: Гэта "залаты век" нашай мовы, часы дзяржаўнасьці беларускай мовы!

Моўшка: Ну, дык дзе ж тая "дзяржаўнасьць" падзелася?

Максюта: Зноў цытата: "Вялікая пустыня (разумей – Беларусь) зьяўляецца краінай вельмі мала культываванай, населенай масай цёмнага народу, жабруючага і амаль выміраючага. Дзе прычыны гэтае незразумелае адсталасьці краю? Ці не вінавата прырода? (...) Ці ня ў расе трэба шукаць тлумачэньне. Але раса – тыя ж славяне, што культывавалі Польшчу, Малую і Вялікую Русь. Чаму-ж беларусы вышлі няздольнымі?" *(С. Южаков, 1886)*.

Моўшка: Тое ж у М. Някрасава:

... Волосом рус,
Видишь, стоит, измождён лихорадкою,
Высокорослый, больной белорус...

Што й казаць – схудалы "мякіньнік", "гальцепа"! Дазволь яшчэ пажартаваць: – А за Гомлем людзі ё? – пытаецца адзін беларус у другога. – Ё. Толькі дробненькіё, – адгукаецца другі.

Максюта: Пажартаваць і я магу: "Тата, а чаму ў Беларусі ўвесь час такая хлюпота? Чаму тут увесь час так халодна і ўвесь час лье дождж?" – "Ну, разумееш, сынку, усё гэта тлумачыцца складанымі атмасфэрнымі працэсамі, зьменамі ў паветраных масах, непрадказальнымі ваганьнямі тэмпэратуры. Карацей, сынку, якая краіна – такі й клімат!" Дарэчы, слова "Літва" значыць "залева" і этымалягічна зьвязана зь дзеясловам "ліць" (тое ж самае: *ć.* "litba", *r.* (дыялектнае) "литва"), больш таго сюды ж стасуюцца геаграфічныя назвы 'Латвія' і 'Латгалія'.

Моўшка: Я чуў, што пазьней той самы Южакоў перамяніў сваё меркаваньне: "Ранейшае ўяўленьне аб беларусах, як аб племені маларослым і слабасільным аказалася няверным. Большай часткай яны фізычна зложаны вельмі добра, маюць рост вышэй сярэдняга, жыцьцёвы індэкс перавышае ў іх 50 проц. і сьведчыць аб фізычнай крэпасьці." *(С. Южаков, 1908)*.

Максюта: Але нават і ў Расеі на нас па-рознаму глядзелі: "Не забудзьма, што яшчэ ў праграме кірыла-мэтодыеўскага брацтва быў прызнаны як асобны штат агульна-славянскае фэдэрацыі побач з расійскім, украінскім, польскім, чэскім і беларускі штат, што М. А. Бакунін у сваіх "лістох да брацьцяў славян" (1862) прызнаваў за Беларусьсю самастойнае месца як незалежнай дзяржавы, што падобныя правы прызнаваў Гэрцэн, што Надзеждзін акрэсьлена выдзяляў беларускую мову як самастойную славянскую мову разам з украінскай і польскай." *(А. Цьвікевіч)*.

Моўшка: А што наконт "Западно-руссизма"? Я чуў, што больш за іншых улягалі, увіхаліся менавіта "свае", беларусы.

Максюта: Так, слушна, і "празеліт з вуніятаў" Ксэнафонт Гаворскі (рэдактар часопіса "Вестник Западной России"), і ідэалёг "западно-руссизма" Міхайла Каяловіч (лічыў сябе "літвінам", напісаў "гісторыю вуніі ў Літве"), і "благородный" русыфікатар Іосіф Сямашка, і, як большасьць іншых "западно-руссов" мінулага веку, паходзілі зь сем'яў беларускіх вуніяцкіх сьвятароў ("у вуніі захоўвалася стыхія беларушчыны, і інтэлігентныя вуніяцкія сем'і былі носьбітамі ідэі беларускай самабытнасьці"). *(А. Цьвікевіч)*.

Моўшка: Бадай іх сьвет ня знаў!

Максюта: Але вось, што піша А. Цьвікевіч далей: ""Мясцовым ураджэнцам" было забаронена займаць пасады вышэй V клясы, а па службе праваслаўнага веравызнаньня – вышэй сьвяшчэньніка. Становішча "западно-руссов" было пры гэткіх умовах проста жалю годнае. Яны ўсёй душой хацелі быць "русскими", ад усяго сэрца жадалі быць карыснымі "вялікай Расіі", а яна, гэтая "богаслаўная Расія", вуснамі стопроцантавых вялікарусаў – *Соловьёвых* паварочвалася да іх задам і зь дзіўнай упартасьцю адпіхала ад сябе. (...) Першае сапраўднае выяўленьне беларускай ідэі – гэта толькі 70-я гады XIX ст., Францішак Багушэвіч, але і ягоны сын быў крайнім зоолёгічным польскім шовіністым і нават адмовіўся аддаць зацікаўленым асобам архіў бацькі."

Моўшка: "Междду протчым" трэба шчыра прызнацца, што і "даволі значная частка адукаваных яўрэяў выступала ў якасьці аднаго з найбольш дынамічных элемэнтаў русіфікацыі так званага "Северо-Западнаго края". (...) Пад іх кантролем знаходзілася значная частка сродкаў масавай інфармацыі беларускіх губерняў, у тым ліку і афіцыйны дзяржаўны друк."

Максюта: Ізноў мы не прыходзім ні да якой пазытыўнай высновы. Дзе ж ён, той жыцьцёвы стрыжань?

IV
Край — Land

А як завуць край родны мой –
Забыўся ўжо пра свой прыгон і зьдзек;
Мабыць, забраны, ці тутэйшы ён,
Я-ж сын яго – тутэйшы чалавек!
Янка Купала.

"Тутэйшы", кажу я, свой чалавек,
Сын бацькі свайго, а бацька дзяцей,
Тут і радзіўся, тут і жыву век...
Мацей Бурачок.

Кепска каля Вітэбска, у Оршы горшэ, а ў Мінску па-сьвінску.
Мазыр, што пузыр – кругом вада, а ў сярэдзіне бяда.
У Вільне – што ў мыльне.
У Слуцку ўсё не па-людзку.

Моўшка [illegible] сьвеце яшчэ на пачатку XX стагодзьдзя. У мястэчках гэбраяў было звычайна [illegible] зь іх, паводле афіцыйнага перапісу 1897 году, негэбраяў было пару чалавек [illegible] этая шчыльная гэбрайская маса ўсьведамляла сябе натуральнымі й арганічнымі насельніцтвам краю, нягледзячы на рэлігійную рыторыку пра 'goles' (выгнаньне). І сапраўды так. Аб'ектыўна гэбрай зрабіўся гэткім жа тыповым кампанэнтам беларускага краявіду, як балоты, каўтун, пан, прыгон ды што іншае." *(В. Зайка).*

Максюта: Дзіўна, што ў кнізе А. Булыкі "Лексічныя запазычанні ў беларускай мове XIV–XVIII стст." жыдоўская мова падаецца ў разьдзеле "экзатычная рэлігійная лексіка". Ведама ж, словаў гэтых адзінкі: "ебионитъ", "рабинъ", "месиашъ", "шатанъ". Выяўляецца, што "старажытнаяўрэйскія" словы "пурым", "талмуд" і "шабас" прыйшлі да нас праз "старапольскую" мову! Не зразумела, чаму "рабін" і "шатан" маюць моўнае азначэньне *яўр.*, а "пурым" і "шабас" – *стяўр.*! "Бедны ідыш" нават ня ўзгадваецца! Ёсьць усе мовы – ад грэцкай да нямецкай, але жыдоў на Беларусі як і не было! Але, як ні дзіўна, шмат у якіх беларускіх мястэчках ажно да Другой сусьветнай вайны не жыды былі "экзатызмамі", а беларусы! Ня рабіны былі "экзотамі", а папы з ксяндзамі!

Моўшка: "Зразумела, што Беларусь была найбольш талерантным краем у сьвеце ў дачыненьне да гэбраяў. Менавіта тут споўніўся ідэал для вывучэньня Торы – бясьпека і спрыяльныя сацыяльна-эканамічныя ўмовы. І ня дзіва, што тут паўстала столькі інтэлектуальных рухаў і выгадавалася столькі рабінаў, мысьляроў ды інтэлектуалаў кожнага кшталту" *(В. Зайка).*

Максюта: "Тут-жа, на Беларусі, разыгралася вялікая барацьба паміж дзьвюма жыдоўскімі рэлігійнымі партыямі: Хасыдым і Міснагдым" *(Зьмітрок Бядуля).*

Моўшка: У XIX ст. "пад узьдзеяньнем суседніх нацыянальных рухаў стаў стварацца гэбрайскі нацыянальны рух ці, лепей, – рухі, зь якіх асноўнымі зрабіліся сіянізм, бундызм і аўтанамізм. Да стварэньня ўсіх трох літвакі мелі самае непасрэднае дачыненьне. У Вільні ўзьнік протасіянісцкі рух "Хібат-Цыён", што стаў арганізацыйнай асновай для Тэадора Герцля. Там жа была заснаваная гэбрайская сацыял-дэмакратычная партыя – Бунд (у 1897 годзе ў Вільні адбыўся першы зьезд Бунду). Зь Вільняй зьвязанае й ўзьнікненьне й разьвіцьцё руху за тэрытарыяльную аўтаномію (нацыяналізму дыяспары). Бундызм і аўтанамізм на пэўных этапах можна нават лічыць зьявамі ў пераважнай ступені "літвацкімі". (...) У міжваеннае дваццацігодзьдзе ў Вільні быў створаны Інстытут гэбрайскіх дасьледваньняў (YIVO), які прэтэндаваў на ролю гэбрайскай акадэміі навук, існаваў шэраг школаў і гімназіяў, адукацыйнае таварыства "Вільбіг", ПЭН-клюб, выходзілі дзясяткі гэбрайскіх публікацыяў у абедзьвух мовах, працавала некалькі гэбрайскіх тэатраў (у тым ліку славутая "Віленская трупа"), існавалі літаратурныя суполкі. Выдавецтвы Клецкіна, Ром, Розэнкранца ды іншыя выпускалі кнігі на ідыш і гэбрайскай, што разыходзіліся па ўсім сьвеце." *(В. Зайка).*

Максюта: Нездарма ж Вільню называлі: "Jerušolaim d'Lite" (Літоўскі Ерусалім).

Моўшка: "Пры высокай канцэнтрацыі гэбрайскага насельніцтва, а таксама навучальных установаў – гімназіяў, школаў, сэмінарыяў, дасьледчых цэнтраў гэбрайскай культуры – Інстытуту "YIVO", навуковага

таварыства імя Ан-скага, бібліятэкі Матыяса Страшуна – Вільня зрабілася выбітным цэнтрам вывучэньня ўсходнеэўрапейскага гэбрайства." *(В. Зайка)*.

Максюта: Але й беларусы шмат чаго прыдбалі ад такога суседзтва, нават надвор'е навучыліся вызначаць паводле жыдоў: "Будзе дождж, то жыды сьцягаюцца; бяз плагі жыдоў насьцягалася; назвалакалася жыдоў, окіць/окідзь/плага будзе; як жыды надта зімою па сяле цягаюцца, то будзе мяцеліца; жыды нешта паўспадаліся/ўспадываюцца/ўзвалачыліся/кешкаюцца/ўскешкаліся як перад дажджом; холадна як на жыдоўскі Пэйсах, на жыдоўскія Кучкі". Навучыліся таксама прадчуваньню бяды: "жыды ўзшасталіся перад нечывільлю; мудзер на ліха жыд: дагадаўся, што ўцёк; на нейкую бяду жыдава паўсьцягаліся, праходу німа за імі; нешта жыды паўскапашыліся, бегаюць; жыдава тут нешта паскешкалася; чаго гэты жыд разшастаўся тут?"

Моўшка: Што й казаць, шмат хто зь беларусаў гергетаў і на ідышы! "A hun, vos krejet, a goj, vos redt jidiš, un a jidene, vos lernt Tojre, iz nit kejn gute sxojre" (курыца, якая кукарэкае, гой, які размаўляе на ідыш, жыдоўка, якая вучыць Тору, – гэта ўсё кепскі тавар).

Максюта: "Суседзтва гэтых дзьвюх нацыяў тварыла такія жыцьцёвыя ўмовы і эканамічныя стасункі, у якіх адна нацыя без другой не маглі абыйсьціся. За ўвесь час сумеснага жыцьця беларусаў і жыдоў на Беларускай зямлі гэтыя дзьве нацыі так псыхічна шмат перанялі адна ад аднэй. У мовах, у звычаях, у легэндах, у будоўніцтве, будзённым жыцьці – у іх формы так перамяшаліся, што (болей усяго ў жыдоў) прынялі новую самабытную акрасу." *(Зьмітрок Бядуля)*.

Моўшка: "У некаторых месцах Віленшчыны, па мястэчках, жыды, пераняўшыся забабонамі і міталёгіяй беларусаў, на Купальле сьцелюць хлявы крапівой і папаратнікам, каб ведзьмы малака не адбіралі ў кароў. Нешта падобнае да беларускай каляднай казы ёсьць і ў жыдоў. На Дзяды пры выпіўцы адзін адзеваецца казою і пяе беларускія прыказкі ў парадку жыдоўскага альфабэта: (Алеф) Антон канцавы, Мой родны Хведар Балайло! (уначы). (Бэйс) Браў ні браў – Лаяць ні трэба. Балайло! (Гімэль) Глазамі горад ні браць, балайло! і г. д." *(Зьмітрок Бядуля)*. Ёсьць і прыказка: "На сьвятога Юр'я дастане жыд дурня".

Максюта: Так, мы таксама пільна сачылі за вашай суботай: "Прыгатуй у пятніцу, будзеш мець на суботу; слонка нізка, шабас блізка". У ахвотку падраблялі нашыя "шабас-гоі" ў вашых школах, па суботах запальваючы сьвечкі. Не забываліся й мы на вашыя сьвяты: Пэйсах (жыды засьвяткавалі свой Пэйсах), Пурым (Пурым ня сьвята, трасца не хвароба)... нават некаторым сьвятам далі свае найменьні: жыдоўскія Будкі (Сукэс, Сьвята буданаў) (лапак нарубіць трэба на жыдоўскія будкі) альбо Кучкі (сёмы рачок ад жыдоўскіх кучок); Босіны (Ём-Кіпур) (на Босіны жыды ў сынагогу прыходзяць босымі нагамі).

Моўшка: Пэўне, мы вам доўг былі сплаціўшы: у ідышы ёсьць таксама азначэньні для вашых сьвятаў: "(goiške) xoge" хрысьціянскае сьвята ("az me klingt in klojster, iz a xoge" калі звоняць у царкве, дык, мабыць, сьвята); "Nitl" Ражство ("Nitl iz a bejze lejd" Ражство – злая пакута; "Nitl iz a bejz lidl" Ражство – злая песенька; "nitl *abr.* **nit tor lernen**" нельга вучыць); "di blinde naxt" *pejor.* "сьляпая ноч", калядная ноч; "vertepl" вярцеп, батлейка, калядны лялечны тэатар; "Verbne" Вербная нядзеля; "Xreščene", "Tojf-hoge" Вадохрышча; "Grin-xoge" Зялёныя сьвяткі, Сёмуха, Тройца; "srode-post" сярэдзіна посту (чацьвертая нядзеля Вялікага посту). І яшчэ тое-сёе: "Geblekexc" *pejor.* літаньня, малебен, набажэнства, імша; "tume" духоўная альбо маральная нечысьціня; чартаўня, ліха; хрысьціянскі малітоўны дом, царква, касьцёл; "tole" *pejor.* укрыжаваны Ісус Хрыстос; "majse-tole" *pejor.* гісторыя Ісуса Хрыста; "jarid" кірмаш; *fig.* імша; "mojexl-avojnes" грахоўныя мазгі (на папа/ксяндза); "nit geštojgn nit geflojgn" (алюзія на ўваскрашэньне Ісуса Хрыста) нахабная хлусьня, лухта, бязглузьдзіца.

Максюта: А колькі жывых назіраньняў, якія перайшлі ў нашую мову: "Распусьціўся як жыдоўская панчоха; скрапіўся як чорт жыда зьеўшы; спадзяваецца як жыды Масьяша; сьпяшаецца як жыд на шабас; узяў як чорт жыда; верыш як жыд у дзесянцёра; заўзімаюцца як жыды за жыдамі; завёўся як жыд у танцу; ашукаў як жыд свайго бога; цягне як жыд за жыдам; ходзіць як жыдоўская памыйніца; аброхалася як жыдоўская карова; пашанцавала/пашэнціла як жыду з гары едучы; чухаецца, фарбуецца, зафлондраўся, шваргоча, гергеча, таргуецца як жыд".

Моўшка: "На першы погляд магло-б здавацца, што ў пераняцьці культуры адной нацыі ў другой жыды, як нацыя болей культурная, павінна была мець перавагу над беларусамі і мець свой большы ўплыў над імі, але ў самай рэчы ёсьць іначай." *(Зьмітрок Бядуля)*.



V
Радзіма — Hejmland

Усе мы патроху жыды. *Сакрат Яновіч.*
Усе мы патроху татары. *Хаім Майсеевіч Ліфшыц.*

Масква й Варшава аплюлі вам імя
І ў дзікай чэрні ненавісьць спладзілі к вам,
А Беларусь пад крыльлямі сваімі
Вас грэла й вашым пянькаю была дзяцям.
Янка Купала.

Сэрца баліць, калі ў парыскім Цэнтры Жоржа Пампіду
побач бачыш карціны Марка Шагала і Хаіма Суціна.
Пад Шагалам на шыльдзе – "Марк Шагал (нар. Лёзна, Расея)".
Пад Суціным – "Хаім Суцін, (нар. Смілавічы, Літва)". *Андрэй Дынько.*

Моўшка: Вось паслухай ліста, які Вульф Сосенскі, жыд з Даўгінава (Віленскага павету), даслаў Антону Луцкевічу 25 сакавіка 1935 г. у Вільню: "Шаноўны дзядзька Антоні! Як ваша здароўя, як пажываеце? Ці добрая праца, і як працуецца? Ці добра, ці карысна вам йдзе праца? Як гадуюцца вашыя дзеткі? [illegible] вясола, ці лагодна, ведаеце, дзядзька, некалі меў я вам шмат чаго казаць і многа чым [illegible] гэтага не хацела. Пагэтаму нехай досыць будзе, што ёсьць... а ёсьцека досыць: адзін [illegible] на эпілепсію, беднота на вушы, наастатку мне яшчэ і горшая бяда спадкала, 1/III г.г. [illegible] і пакінула мне шасьцёра малых дзяцей, дзяцей як боб дробных, як мак, і жыві на [illegible] што хочаш! Вы мне прабачыце і выбачайце, не прышоў я к вам, маім гэтым пісьмом, каб вам усю маю бяду выліваць, каб маю гору вам расказаць, печалі і бяды. Думаю, цяперака усім досыць хапаець. Хочу во што: [illegible] маю цікавы зборнік бел.-жыд. фольклору (пэўна за адзін дзень яго не назьбіраў). Ён састаўляець цэнны, багаты навучны, гістарычна-этнаграфічны матэрыял, каторага я меў на ўвазе – гэдок як я некаліс рабіў – падарыць яго беларускаму музею ў Вільні! (...)".

Максюта: Я ведаю, што й Зьмітрок Бядуля (Шмуэль Плаўнік) вучыўся ў Даўгінаве, пэўна, яны зналіся?

Моўшка: Воляй лёсу гэты зборнік так ніколі й ня быў надрукаваны. Але, ня лічачы Гурвіча зь Вільні, які па словах Зьмітрака Бядулі даслаў "зборнік жыдоўска-беларускіх прыказак да друку ў загранічны журнал" у 1911–12 гг. (якога, на жаль, ніхто ніколі ня бачыў), гэта хіба што адзіны сшытак, які сьведчыць аб жывым карыстаньні жыдамі беларускай мовай:

шабэс – не бэн ёхід, пайдзе адзін, прыйдзе другі! [*jid.* 'benjoxed' адзінак, бянёха]
калі бацька добры, дай бацьку кібэд, калі бацька дурань, дай бацьку кіем [*jid.* 'kibed' пачастунак]
із хоцьбы гут, із хоцьбы ніт шлэхт [*jid.* 'šlext' блага, 'gut' добра]
я з табою адрабэ вэйадрабэ, а ты мне хайдарэеш! (я з табою як найлепей, а ты мне цягніш у балоту) [*jid.* 'adrabe-veadrabe' у найлепшых адносінах]
многа тілім начытаўся, пакуль ад грэхаў абчышчаўся [*jid.* 'tilim' псалтыр]
я тілім чытаць не хачу, благую жонкі браць ня буду
шішім рыбкес, плотка ў ахвотка, шчупак не дурак, еж, калі наведзеш, акунь не піскун, лін не блін, толька вока кінь, а келбіс глота, бо не жыве ў балота, малец, не сунь палец, бо укусіць! рыбу жывую ня сушуць? [*jid.* 'šišim riboj' 600 000 – колькасьць гэбрэяў, якія выйшлі з Эгіпту]
надан і іеруша з чортам у хаўрусы [*jid.* 'nadn' nacar, 'jeruše' спадчына]
каму цымус не смакуе, таму кугель не дадуць, а хто сэйфэр пацалуе, таму леўёсан дадуць [*jid.* 'sejfer' рэлігійная кніга, 'levjosn' левіяфан]
німа тэй мамкі, каб не мела б на бэйс-гакворэс ямкі [*jid.* 'bejs-hakvores' могілкі]
ну, што значэ хосід? - хосід значэ: хоць бы сядзеў дома альбо: хоць сябруйся з другімі, а то кажуць: хорт, сабака, дурак [*jid.* 'xosid' хасід; набожны жыд]
кібуд значэ: кейах, ботэ, дай альбо: кіем бацьку добра біць [*jid.* 'kibed' пачастунак, 'kojex' моц]
пахэд што значэ? поўна хата дурняў [*jid.* 'paxed' страх, боязь]
посьле хупы цалуй у дупы [*jid.* 'xupe' шлюб]
багроб тваю маць, з бацькам разам [*jid.* 'bagrobn' пахаваць]
куш ін тохэс не баліць, можна напапалам падзяліць [*jid.* 'kuš in toxes' пацалуй у сраку]
хохам, хохам, каб сраў гарохам [*jid.* 'xoxem' мудрэц]
іх вэл дыр цу райбн аф ячнэ-мэкэнэ! [*jid.* 'ix vel dir cu rajbn af jačne-mekene!' я цябе сатру ў парахню! (на мякіну)]
а ворт із а воробей, хап эм! [*jid.* 'vort' слова, 'xap im' хапай яго]
пасып соль на хвост, кэнст зайн а ров ін Сшкоўка [*jid.* 'kenst zajn a rov in...' можаш стаць рабінам у...]
– а ці-бу-ла ў кіно? – рэдзька хаджу (*vrtš.* цыбуля і рэдзька)

Максюта: Дык гэта ж сапраўдныя беларуска-жыдоўскія "локшыны"! Пэўна, гэта той самы Вульф Сосенскі, які друкаваўся са сваімі беларускімі апавяданьнямі ў "НН"?

Моўшка: Так, разам са Зьмітраком Бядулям. Усьлед ім будуць пісаць па-беларуску паэты Юлі Таўбін з Мсьціслава (1911–1937) і Зяма Піваараў з Касьцюковічаў (1910–1938), Рыгор Жалязьняк зь Віцебску (1914–1942) і шмат хто іншы.

Максюта: Яшчэ ў 1880-я гады ў Пецярбурскім унівэрсытэце гурток "Беларуская грамада" ўзначальваў разам з Аляксандрам Марчанкам жыд Ізраіль Ратнер (нар. 24.11.1861, Шклоў) – у беларускім адраджэнцкім руху яшчэ пры яго станаўленьні ўдзельнічалі й жыды. А за "польскім часам" "ува ўнівэрсытэце Сьцяпана Батуры ў Вільні беларусы й гэбраі разам праводзілі супольныя акцыі супраць антысэміцкай палітыкі польскіх уладаў. Беларусы ў знак салідарнасьці займалі *лавы жыдофске* – месцы зь левага боку аўдыторыі, якія рэакцыйны рэктарат адводзіў для гэбраяў. Беларуская і гэбрайская моладзь плячо ў плячо змагалася ў шэрагах эсэраў і капэзэбоўцаў." *(В. Зайка)*.

Моўшка: У 1913 г. на старонках віленскага часопіса "Di Judiše Velt" ("Жыдоўскі сьвет") зьявіўся вялікі артыкул Зьмітрака Бядулі пра беларускае адраджэньне. У тым самым годзе Бядуля стаў адным з заснавальнікаў, рэдактарам і вядучым аўтарам віленскага часопіса "Undzere gegent" ("Наш край"). У 1914 г. у Вільні выйшаў па-жыдоўску зборнік "Літва" зь перакладамі зь беларускай і літоўскай літаратураў.

Максюта: Барыс Аркадзевіч Клецкін (нар. 05.05.1875, Гарадзішча), віленскі жыдоўскі выдавец (першая палова XX ст.), выдаў чатырохтомны "Лексыкон жыдоўскай літаратуры, пэрыёдыкі і філялёгіі" (Вільня, 1926–29) Залмана Рэйзэна, клясыкаў яўрэйскай літаратуры, але разам з тым: першае выданьне "Гісторыі беларускай літаратуры" Максіма Гарэцкага (1920), "Геаграфію Беларусі" Аркадзя Смоліча, беларускія школьныя падручнікі для менскіх школаў.

Моўшка: Віленскае выданьне "Лексыкону" зьмяшчала 347 біяграфіяў жыдоўскіх пісьменьнікаў – ураджэнцаў Беларусі, а ўжо васьмітомнае пасьляваеннае нью-ёрскае выданьне – каля 450.

Максюта: А ці не пагутарыць нам пра "дзяржаўнасьць" нашых моваў?

Моўшка: Як ні дзіўна гэта чуць, але першымі менавіта "немцы падчас першай сусьветнай вайны прызналі мову ідыш, разам зь беларускай, польскай і літоўскай, афіцыйнай мовай у Вільні і на ўсіх прылеглых абшарах пад сваім кантролем. На ідыш былі выраблены пашпарты, друкаваліся афіцыйныя аб'явы ды іншыя дакумэнты, праводзілася навучаньне ў школах." *(В. Зайка)*

Максюта: Рушым у савецкія часы: у прынятай 15 ліпеня 1924 г. пастанове Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР "Аб практычных мерапрыемствах па правядзеньні нацыянальнай палітыкі" адзначалася: "Мовы нацыянальнасьцяў, якія насяляюць тэрыторыю БССР (беларуская, яўрэйская, руская, польская), з'яўляюцца раўнапраўнымі". "Навучаньне і выкладаньне ва ўсіх установах сацыяльнага выхаваньня і прафтэхнічнай адукацыі, а роўным чынам і абслугоўваньне ўсіх астатніх культурна-асьветных патрэбнасьцяў насельніцтва павінна весьціся на іх роднай мове".

Моўшка: У ліпені 1924 г. створаны яўрэйскі аддзел пры Інбелкульце, з 1925 г. створаны тры яўрэйскія камісіі й дзьве сэкцыі. Выдаваліся часопісы "Cajtšrift", "Працы БДУ". З 1929 г. ужо дзейнічала 5 камісіяў: лінгвістычная, тэрміналягічная, па вывучэньні гісторыі жыдоўскай літаратуры, па вывучэньні жыдоўскага фальклёру, па вывучэньні жыдоўскага насельніцтва. Камісіі займаліся зборам матэрыялаў для акадэмічнага слоўніка жыдоўскай мовы, а таксама складаньнем практычнага слоўніка жыдоўскай тэрміналёгіі, зборам і распрацоўкай матэрыялаў для дыялектычнага атласа жыдоўскіх гаворак Беларусі, распрацоўкай гісторыі жыдоўскай літаратуры і жыдоўскага фальклёру, гісторыяй жыдоў у Беларусі. Тэматычны плян на 1933 г.: "Яўрэйскі талковы слоўнік" (Х. Гальмшток, Шкляр, Файнзільбэрг), выдавецкі плян БАН на 1936 г.: "Граматыка яўрэйскай мовы" (А. Зарэцкі). Л. Віленкін выдаў у 1931 г. "Яўрэйскі лінгвістычны атлас Савецкага Саюзу", Зьмітрок Бядуля разам з Н. Рубінштэйнам у 1932 г. выдалі "Яўрэйска-беларускі слоўнічак".

Максюта: 21 кастрычніка 1926 г. – створаны Дзяржаўны яўрэйскі тэатар БССР (выпускнікі яўрэйскага сэктара Беларускай драматычнай студыі ў Маскве). У тым жа годзе адчынілася яўрэйскае аддзяленьне рабфака ва ўнівэрсытэце і яўрэйскае аддзяленьне ў Гора-Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі. 1928 г. – рэарганізацыя "Маладняка" ў Беларускую асацыяцыю пралетарскіх пісьменьнікаў і паэтаў, створана яўрэйская сэкцыя. 1931 г. – у Менску на базе пэдфака ствараецца Вышэйшы пэдагагічны інстытут зь яўрэйскім аддзяленьнем, якое праіснавала да сярэдзіны 30-х гадоў.

І вось ужо зерыла тое няўлоўнае шчасьце... Як усім жадалася таго лучэньня з Радзімай, як лучыцца маці зь дзіцем... Ужо хацелася сьпяваць разам:

Jankl, Mejcik, Jurke, Šurke, Raške, Baške, Cirke, Mirke,
Ale, ale, in a rod, ale, ale, in karahod:
Hajda-hajda-hajda, hajda-hajda-hajda-ho!

Ат не, усё зноў абарвалася, пакацілася долу... "Маці" зноў стала "мачахай", а ейныя "дзеці" – "пасынкамі й сіротамі"...



VI
Душа — Nešome

Ix ken dix, Vajsrusland, azoj vi ix ken majne ejgene finger…
X'gedenk dem vajsrusišn sum, velxer hot ale derflex farcojgn…
Izi Xarik.

Ver es hot nit kejn buše in ponem un kejn raxmones in harc,
der kumt nit arojs fun jidn.
(Хто ня мае сораму на твары і жалю ў сэрцы,
той паходзіць не ад гэбрэяў.)

[illegible] ... оў да літаратуры. Амаль усе, хто пісаў на ідышы, маўляў, усё роўна пісалі аб [illegible] ... вядомае:

[illegible] ...бак. Беларусі
[illegible] ...ючай!
[illegible] ...авору твайго прашу!
[illegible] ...так балюча.
[illegible] ...лазіш у душу?..
(пер. [illegible] Макарэвіча)

***Майсей Кульбак. Беларусь** (пазма)*
Беларусь яшчэ бог сьцярог,
Хоць і доля ў яе Макарава,
Бо ў бясхлебіцу
Ўздоўж дарог
Яе шчы і баршчы – яе варыва.
(пер. Я. Семяжона)

***Ізі Харык. На чужым балі** (пазма, 1935)*
Я знаю цябе, Беларусь, як пальцы свае і далоні,
Апоўначы нават змагу пазнаць твае сьцежкі крывыя,
І мяккі пявучы заход, палаюча-смольны сасоньнік,
Бярозы у сьнежнай імжы, і рэкі, і тракты сівыя.
Я помню вясковы твой сум, што плыў па начах выцьцём воўчым,
Самоту-жаўтуху, тугу мястэчак гарбатых, кульгавых.
Такой ты была, Беларусь! І варта заплюшчыць мне вочы,
Успомню я могільнік скрозь, гнілыя крыжы і курганы.
Багатай была, Беларусь... Ня зьлічыш багацьце краіны...
Боханы сітніцы ў нас зьяўляліся толькі ў марах...
Багатай была, Беларусь... Пра гэта хай скажуць батрачныя сьпіны
Ды зьбіты у панскіх стадолах, навекі скалечаны карак.
Завея і цемра. І едуць дзьве буды дзірава-самотных.
Шукаюць мястэчка. Німа.
Толькі ветры тут выюць-шалеюць.
Нябёсы і долы гайдаюцца ў золкіх шыротах.
Німа ні карчмы, ні мястэчка. Нікога. Нічога. Завея.
"Губерния Минская" едзе зь зялёным "присутствием" царскім у будах.
А неба усё абляпілі вароны магутнаю, чорнаю плоймай.
Свой чэрап аб гэтае неба разьбіць бы.
Родныя! Пустка усюды!
І месяц у высях тут лазіць белым арлом двухгаловым.
Я знаю цябе, Беларусь, як знаю твой золак у росах,
Бо ў кожнай пустэчы, глушы брысьці-вандраваць меў ахвоту.

Зяма Цялесін. Радзіма
Той край, дзе калісь нарадзіўся,
дзе столькі год пражыў, зрадніўся,
не пакідае памяці маёй...

Zjame Telesin. Farnaxt nebn tajx
Fun dem derfl, vos hot zix farhit
Lengojs dem farvoksenem breg,
A štile vajsrusiše lid
Baglejt mix, bagajstert un regt.

Мэнке Кац. Вяртаньне ў вёску Міхалішкі

Калі Вэльке-містык, увесь у лахманах і латах, вярнуўся з усіх
тутэйшых пякелішчаў да абсмаленай крушні, што некалі
была вёскай-пяюхай Міхалішкі, ён убачыў, нібы
той Абрагам, кінуты ў вогнішча, – ружамі палаюць
ускрэсіны. Ён продкаў убачыў сваіх, пыхлівых нябогаў.
Яны пратачыліся праз абсмаленыя гады,
іх сьлёзы перамяшаліся з попелам
Жабрацкай Прысады. З болем выла цішыня
гучней за галодную зграю ваўчыную
па-над месяцовым жахам
лесу. Пер'е ненажэрных
груганоў запаланяла
вецер.

(пер. Т. Галідэй)

Максюта: Мы таксама ў падушку ня спалі, а “батлейкі” складалі, вось паслухай:

А гдзе ета мая Сорка?
Гашпада, пазвольце мне пагукаць мая Сора!
О клейнцэ Сора, о клейнцэ Сора!
Хадзі скора, будзем гуляць уцора!
Казак прыдзець, неста будзець.
Гут морген, мой Абрумцык!
Гут морген, мая Сорацка!
А гдзе ты, Сорка, прападала?
На рынкі кабацок прадавала!
А сто ета я цябе так доўга не відала?
Ідзе ты быў, Хаім?
Ай, я буў у Полацку, Велізу,
ув Невелю, Дарагабузу,
і ў Склові, і ў Мугулёві,
у Старым Быхові і ў Орсы,
ігдзе сам цорт не хадзіў!
І сто я відзеў, уй, гевалт!
Ай, Хаім, ідзі папрасі музыкантаў,
хай зайграюць!
Ой, Сорка! полна нам гуляць,
у мяне будуць тут гарэлку браць.
Заўтра сабас, на гросы табе троску,
сзар мне рыбкі нямнозка.
А толькі хадзі – я цябе правяду.
А то тут есьць хандогі, –
яны цябе схандозуць.
Ой, гашпада! як ехалі мі з Дарагабуза,
А кабілка наса біла недуза,
абоз на абозе, воз на возе, –
адна кабіла ў вазе і тая не вязе.
Да як узьехалі мі на мост,
кабілка наса гоп пад мост!
А мі яе цап за хвост!
Нет, гаварым, ты не ўйдзес!..
Сталі мі думаць і гадаць,
сто нам з кабілкі рабатаць?
Мі ўзялі стрункі на ладункі,
з рэбер карэты,
а з ног пусталеты,
а з хвастоў сітцы.
Сталі мі кабілку выпрагаць,
катоцкі і аглоблі мі ламаць,
да як разлазылі мі агніска,
аз під самій небасіска;
а тут якраз казацыска ізь лясіска
і страснага дубавісца на пляцысца!
Як ударыў... пад нос,
дык ён носам затрос.
Уй, гевалт!..

Моўшка: Сапраўдны літвацкі дыялект: замест ‘š’ – ‘s’, ‘ž’ – ‘z’, ‘č’ – ‘c’ (sabesdiker, losn, gesribn, sejn, snej, idis, stetl, zaleven…). Але “гэта ўсё жарты-шмарты. Бязь іх яўрэй не яўрэй. А глыбінная душа яўрэйства ў досьціпах, у казках, у песьнях, у зычэньнях, у заклёнах кшталту гэтага:

У чорным моры чорны камень маўчыць.
У горле вароніным костка тырчыць.
Паганая сьвечка з сала сьвінога.
Для п'яніц карчма,
Для праведнікаў сынагога.
Ляціць Гурмізах на перапудзе.
Дзе не стаялі ніколі людзі,
дзе не пасьвілася вясёла жывёла,
Дзе ўся з жалеза зямля наўкола,
Дзе неба зь медзі на сто зямель.
Ратуй мяне, Зэдыкіэль.
Ацалі мяне, Тафтыф`ях.
Бог праўдзівы, прымі мой страх.
Душа мая ў тваёй правіцы.
Хай мне ўсё існае
Бачыцца й сьніцца,
Як аб сустрэчы з Табой
Напамін.
Амін.”
(Р. Барадулін).

На вуліцы мяцеліца,
снег усё агортае,
віхры, цэрці жэняцца,
шалеюць, дух ахапляе...
Вятры кручацца, шалеюць,
страшуць пад вакном,
завірухі ўсё змарэюць,
вось канец усім людзём...
А ў хатцы, у куточку,
седзяць Хаім і рэб Гэрц,
а каля печы, на прыпечку,
старая Малка бліны пячэць.
Удруг Малка цікавага нешта пачула:
трахта! нейкая брахкая, тэрц?!
Страх і сум Малцы агарнула,
са спуду закрычала: гвалт! Хаім, Гэрц!
Ах, калі ветры там шалеюць,
[illegible] чаго было пугацца?!
[illegible] хай [illegible]ятаюць,
[illegible] аяцца...
[illegible] уюць,
[illegible] ны,
[illegible] яюць.
[illegible] раны!..
[illegible] ветраваць,
[illegible] сьвет –
[illegible] аваць.
[illegible] жартаў [illegible] нет
Ціх[illegible]іха, Малка, хай шашуюць
вятры, калі паашалелі,
пагадзі, пагадзі і гуляць перастануць, –
Хаім з Гэрцэм мудра гаманілі.
змоўкла Малка, змоўклі
Хаім і рэб Гэрц,
толькі вецер
не сьціхае пад вакном,
усё гудзіць і б’ець у шыбы:
тэрц да тэрц...
Мусі ткі быць хаўтуры
ўсім людзём...

На гар Сінай мы стаялі,
там Тойра нам давалі,
пекна, пекна, пекна нам давалі.
Нам Тойра там давалі,
з радасьцю мы скакалі,
пекна, пекна, пекна мы скакалі.
На гар Сінай мы стаялі,
там мы Тойра бралі,
добра, добра, добра Тойра бралі.
Тойра бралі праз Майсея,
дзесяць словы сьвятыя,
добра, добра, добра словы сьвятыя.
Словы сьвятыя дзесянцёры
самі ж ад бога чулі,
пекна, добра, пекна ад бога чулі.
Як гутарылі мы з богам,
адпавядалі адным словам,
брава, добра, пекна, адным словам.
Адным словам загукалі,
ад радасьці засьпевалі,
добра, пекна, добра засьпевалі.
Мы сьпевалі, як Тойра бралі,
Тойра праз Майсея,
добра, пекна, добра праз Майсея.
Праз Майсея танцавалі,
галелуя засьпевалі,
добра, добра, пекна засьпевалі.
Засьпевалі на рохвольле,
галелуйя, галелуйя,
хай жыўе ***ам ісроэйл***, ***ам ісроэйл***.
(Зап. В. Сосенскім).

Бацька, бацька! Бацька, бацька!
Выбудуй ты нам нашу хатку,
выкупі ты нам нашу матку.
Бяз хаткі ня будзем,
бяз маткі заблудзім.
Аўромулю, Аўромулю,
Аўромулю, старушак ты наш.
(Ісхакулю, дзядулька наш,
Якавулю, татулька ты наш.)
Чаму-жа вы ня ходзіце,
чаму-жа вы ня просіце.
Чаму-жа вы ня моліцеся богу за нас.
Каб-жа нас асвабадзілі,
каб-жа нашу хатку выставілі,
каб-жа нашу матку выкупілі,
да із ***голас*** вывадзілі.
Лэйарцэйну правадзілі, ***лэйарцэйну***.
Ня плач, сынок, сынок, сынок,
ня крой сваё сэрца, сэрца.
Будзе хатка выставена,
будзе матка выкупена.
Чакай канца,
вэйнэмар мыфонаф шыр охадошо.
Галэлуіе, галэлу, галэлу, галэлуіе.
(Зап. Я. Станкевічам ад В. Сосенскага).

Уставала Хана рана,
эй, і раненька,
і збудзіла свае слугі,
эй, і дабрэнькі.
“Уставайце, мае слугі,
дабрэнькі,
зажыгайце сьвечачонкі,
эй, ерусалімкі.
А я тым часам,
Хана, пахаджу,
да й сына ***талмуд-хохэм***
ай, ураджу.”
Урадзіўся Шмуэль-***ганові***
добрым часам.
Спавівала яго Хана
шаўковым пасам.
Сара, Рыўка, Рахіль, Лія
бабкамі бувалі.
Аўром, Іцхок, Янкев-***овіну***
сандіке бывалі
Мойшэ, Арйе, Довід, Шлоймэ
кватэры бувалі
гакодэш борэху і малахім
Шмуэль-***ганові*** назвалі.
(Зап. С. Ан-скім у Віцебскай губерніі ў XIX ст.)

Максюта: Вось што пісаў аб беларуска-гэбрэйскіх рэлігійных сьпевах Ян Станкевіч: "Ня толькі ў жыдоў былі рэлігійныя песьні па-беларуску, але з часу красаваньня беларускае культуры (XV–XVI вв.) маем навуковыя творы, перакладзеныя жыдамі з гэбрэйскае мовы на беларускую ("Тайна тайных", "Лёгіка" і інш.). У XV стаг. маем беларускія пераклады Бібліі, зробленыя жыдамі з мовы гэбрэйскае. Бібліі гэтыя прытарнаваны да ўжыванья ў сынагогах." Але ёсьць яшчэ шмат народных дзьвюх-, нават трохмоўных песень, вясёлых, жартоўных:

– Fun vanen kumt a jid?
– Fun Ljubavič!
– Vos tut men in Ljubavič?
– Me trinkt bronfn,
Un me huljet,
Un me tanct a karahod!
(Хасыдзкая песьня)

***

Afn barg, unter barg
Flien tojbn porn.
Nox kejn naxes nit gehat,
Šojn avek di jorn.
На гарэ, пад гарой
Галубы стаялі.
Я йшчэ шчасьця не відала,
Годы мінавалі.

Špant že, brider, gixer ajn,
Kare ferd di porn.
Mir veln forn un derjogn
Undzere junge jorn.
Запрагайце, хлопцы, коні,
Коні вараныя.
Мы паедзем даганяці
Годы маладыя.

***

Hop, majne homentašn,
Hop, majne vajse!
Hop, mit majne homentašn
Hot pasirt a majse.

***

Un zi iz glajx in mark avekgelofn,
Un hot dort a goje mit a hun getrofn.
– "Сколько стоит" курка-маладзіца?
– Тры аршыны "ситца" на спадніцу.
(Зап. А Хадыкам і М. Залатухам у Амсьціславе)

Mir hobn derjogt undzere jorn
Afn brejtn brik:
– Jorn junge, kert zix umet
Xoč in gest curik
Мы дагналі нашы годы
На шырокім мосьце:
– Годы, годы маладыя,
Прыяжджайце ў госьці.

– Nejn, nejn, nejn, mir veln nit gejn,
Šojn nito cu vemen,
Ir hot badarft jungerhejt
Di jorn nit faršemen!
– Нет. нет, нет, мы не вернёмся,
Вы не заслужили,
Почему вы с юных лет
Годы погубили?
(Зап. А. Хадыкам і М. Залатухам у Амсьціславе)

Гоп, мае грачанікі,
Гоп, мае ячныя,
Чаму ж мае грачанікі
Такія ня смачныя?

Рыгор Барадулін прыводзіць свой варыянт:

Гоп, мае грачанікі,
Усе жыды начальнікі,
А ў калгасе дуракі
Дзеруць межы як быкі.

VII
Суседзі — Šxejnim

"Гора нам... Жыды мы." *Зьмітрок Бядуля.*

"Jidiše natur" un "goišker mazl" ("жыдоўская натура" і "мужыцкая доля").
"A jidiše kop" un "a jevoniše kop" ("жыдоўскі розум" і "маскалёўская мазгаўня").

Жыдоўскі "зараз", як беларускі "пачакай".

Литвины – земляники, землекопы, лопатники, белошапошники, магерки.

"Пацьвельваньне – мяккая, гуманная, ачышчальная тэрапія сьмехам. Беларус не жадае ліха суседзям, калі іранізуе [illegible]. Нехта можа і пакрыўдзіцца на іх нязлосныя показкі. Але апраўдвае беларусаў тое, што найболей [illegible] і дасьціпна яны пацьвельваюцца з саміх сябе." (П. Васючэнка).

[illegible] фальклёрны вобраз жыда-літвака?
[illegible] беларуса кажуць: багаты, брахлівы, хітры, скупы, бяздушны, паганы, адважны, [illegible] Але гэта ж усё й пра жыда. Троху дадамо – да багатага: "Грошай як у жыда; [illegible] Ой, жыдку, злажы на се світку! – Я і так багаты, хоць троха пархаты"; да [illegible] крычыць; жыд кожан хвалько; жыд з блахі то вала зробіць"; да хітрага: [illegible] мэнтнасьць; жыдоўскі розум – то шэльмоўства; на тое жыд, каб ашукваў; патуль [illegible] аредаць, пакуль хрысьціяніна не ашукае; жыда сам чорт не ашукае; жыд хітры, але падчас то й дурны"; да скупога: "На грошы ласы; жыд гаворыць: лай, адно грошы аддай; ну і даў жа, як жыд перцу"; да бяздушнага: "Такой ласкі і ў жыда дастанеш/знойдзеш"; да паганага: "Жыд чарцямі ўхоплен (павер'е); яшчэ рочэнцы цялёнку не вышлі, а яго зарэзалі паганэ жыды"; да адважнага: "Жыда і думка аб воўку палохае; жыда ўсюды страшыць; жыду і птушкі страшны; жыду воўк і ўва сьне страшны; жыду і жаба воўкам стане"; да патлатага: "Валасы кучмою лежаць як у жыда". Сёе-тое яшчэ: кампанейскі ("за кампанію і жыд павесіўся"), набожны ("як жыд прыдарожны"), удачлівы ("паньско і жыдоўско нідзе не прападае; пана і жыда ніколі чорт ня возьме"); "што будзе, то будзе, а жыд панам ня будзе; жыд скажа, як зьвяжа; жыд за жыда ўсёгды ўступываецца; жыд на рыбу як кот (жыду да рыбы сьмяюцца вочы), жыд заўсёды часныком сьмярдзіць (жыд жыдам сьмярдзіць), выпэцкаўся як жыд у гразь; у жыда ўсёгды шмацьцё вісіць, боўтаецца; ходзіць абшарпаўшысь як жыд; у падраных панчохах ходзіш як жыдоўка; ходзіць як жыдоўская памыйніца; каждая жыдоўка – абшарпанка; у кожнай жыдоўкі дарагій земчуг на шыі; жыдоўка ў перлах ходзіць". Напэўна, гэта і ёсьць тое, што завецца "жыдоўскай натурай, жыдоўскай работай". Вось яшчэ батлеечны партрэт: "На галаве рыжыя валасы з пэйсамі і гэтакая ж рыжая барада, доўгі чорны замызганы халат (лапсардак), шапка зімовая зь ліса, верх аксамітны, відаць белыя шкарпэткі, туфлі з задзёртымі насамі, гарбаты".

Моўшка: Але, "каб ты бачыў свой від, то думаў бы, што жыд"! Ды й самі жыды-суседзі ня надта ветліва ставіліся да "трэфных літвакоў". "Рацыяналізм літвацкага тэалягічнага дыскурсу стварыў для літвакоў уваччу суседзяў – гэбрэяў польскіх і ўкраінскіх земляў – стэрэатып эмацыйна стрыманай, крытычнай, нават чэрствай асобы, якая нічым ня грэбуе дзеля пошуку доказаў, каб у нечым пераканацца. Гэта апошняя рыса спрычынілася да мянушкі "цэйлэм-коп" (крыжагаловы): лічылася, што вучоны літвак можа лёгка перакінуцца ў хрысьціянства, каб толькі задаволіць сваю цікаўнасьць. Верагодна, што гэтаму паспрыяла распаўсюджаньне гэбрайскай асьветы (Гасколы) на беларуска-літоўскіх землях, а таксама гэткія вядомыя выхрысты, як арыенталіст Даніла Хвольсан (вядомы сваёй фразай "Лепей быць прафэсарам у Пецярбургу, чымся мэламэдам у Эйшышках") і авантурыст Якуб Брахман (аўтар антысэміцкага трактату "Кніга кагалу"), што паходзілі зь іх." *(В. Зайка).*

Максюта: "Ix bin a litvak – a bisele xoxem, a bisl durak!" Запраўды, "былі й выключэньні, як у выпадку Ўладзімера Мэдэма, што паходзіў зь менскай асыміляванай сям'і, дзіцем быў ахрышчаны ў праваслаўе, а пасьля стаў адным зь вядучых дзеячоў Бунду, вывучыў у сталым узросьце ідыш і ўсяляк прапагандаваў яго ўжываньне." *(В. Зайка).*

Моўшка: А як наконт забабонаў аб "крови христианских младенцев", аб "забойцах Хрыста"?
Максюта:

"Збаю байку:
Забіў жыд Хайку,
Павесіў над духам,
Абіў абухам,
Зрабіў дзюру,
Задраў скуру –
Кроў – кап, кап,
А жыд – хап, хап!"

Во яшчэ й прымаўкі: "Мэнчыў мяне, як жыды пана Езуса; жыды-анціхрысты шкуру з нас дзеруць; жыды тые ж басурманцы, бязьвернікі; жыды не вызнаюць Хрыста; жыды-інавернікі паганыя; усякая жыдоўка – чартоўка".

Моўшка: "У беларускім фальклоры існавала ўяўленьне аб "божай" птушцы-ластаўцы, якая, згодна з паданьнем, калі ўкрыжоўвалі Хрыста, скрала цьвікі ў яго забойцаў-"жыдоў". Ёй супрацьстаяла "жыдоўская" птушка-верабей. "Віна" вераб'я палягала ў тым, што ён зьдзекваўся з укрыжаванага Збаўцы, памнажаў яго пакуты на крыжы. Менавіта таму вераб'я ў прастамоўі называлі "жыдам". Ня менш цікавае і беларускае паданьне "Адкуль сьвіньні?". Паводле яго, падчас Крыжовага шляху адна з габрэяк вельмі моцна біла і кляла Хрыста. За гэта яна была перавернута Богам у сьвіньню." *(І. Марзалюк)*.

Моўшка: Сёе-тое ёсьць і ў батлейцы:

Жыд: Іцах-міцах, манарх-гіцах, бег я з павагаю і радасьцю праведаць цара. А што пану цару ад мяне патрэбна?
Цар: Адкажы мне, Лейба мой любы, колькі месяцаў таму назад нарадзілася тое дзіця?
Жыд: Калі пан цар хоча ведаць, бо я без сваіх талмудаў не магу сказаць. Сора Езэрмоўс, нойдзем талмуд гроўс. Барухаты едыной, елегэйну налегой, цібэлэ татэ, нібэлэ мамэ, і ліпа высока і на корань глыбока, ■ хто гэту ліпу будзе капаць, той будзе век панаваць. Ясны цар, ужо дзевяць месяцаў мінулася, як тое дзіця нарадзілася. Што знаў, тое і сказаў, няхай мяне цар прабачыць. падаю да ног. (...)
Жыд: Яснавяльможны сьвіняны кныр! Што ж, васпану, зрабілася, уся вантроба кроўю залілася. я думаў, што ты сьпіш, аж бачу, што ты сьмярдзіш. Браў ты з нас і драў ты з нас і крупавыя, і млынавыя, і мякіну, і сьмяціну, але ўжо цяпер як вазьму я тваю карону ды сяду на трону і буду каралём над яўрэямі, а ты сьвіньнёй над сьвіньнямі. От каб цяпер мая Сора знала, што я тут крулюю і над усімі яўрэямі паную. Сора, кум танцен маёхес.

Моўшка: А ці не жыды спаілі "братоў славянаў"?
Максюта: Вось што пішуць пра Зьмітрака Бядулю: "Драматызм крайняй і безнадзейнай беднасьці, як прычына з рэзультатам, зьвязанай з п'янствам, адчаем настрою і садызмам пачуцьця, таленавіта змалявана ў колькіх апавяданьнях" ("Сьцёпка", "Тулягі", "Сымон")". Ня менш яскравыя беларускія песьні:

На базары сесьці на прэкрасным месьце,
Вуй, вуй, вуй, мамуля,
Зок, зок, зок, Хаюля,
А гуценькі, гут, гут,
Рай-рам, рай-рам,
А гуценькі, гут, гут,
Там яўрэйка Хая віном таргавала,
Ой, яўрэйка Хая, што ж ты нарабіла?
Што ж ты нарабіла: віном напаіла.
(Зап. А. Глушко ў вёсцы Сялец)

На прэкрасным мейсцы карчомка стаяла, да нова,
Ай-вай і зуг-зуг кум-кірім бом-бом.
А ў таей карчомцы Хайка маладая – жыдоўка,
Хайка маладая водкай шынкавала, гарэлкай,
А ў таей карчомцы два салдаты пілі-гулялі,
Два салдаты пілі, усё Хайку манілі – жыдоўку,
А ў суботу рана ўсе жыды ў школе, у школе,
Усе жыды ў школе, толькі Хайка дома – жыдоўка,
А ў нядзелю рана прыйшлі тры вазочкі па Хайку,
А ў першым вазочку падушкі-пярыны, пярыны,
А ў другім вазочку шэрабро і злота, злота,
А ў трэці вазочак сама Хайка села, жыдоўка,
Сама Хайка села, песеньку запела, жыдоўка.
(Зап. А. Ласём у Жупранах)

Былі ў каморы ў нас грошы,
А я тыя грошы да Моўшы.
Ты піў, і я піла,
Ты насіў, і я насіла
Тыя грошы да Моўшы.
Было ў каморы ў нас жыта,
А я тое жыта да жыда.
Была ў каморы ў нас грэчка,
А я тую грэчку ў мястэчка (за рэчку).
Былі ў каморы ў нас боты,
А я тыя боты да Моты.
Былі ў каморы ў нас яйкі,
А я тыя яйкі да Хайкі.
Была ў каморы ў нас водка,
А я ж тую водку ды ў глотку.
(Зап. А. Хадыкам у вёсцы Пяскі)

Моўшка: Ведаем і мы добра вашыя беларускія песьні: "Сабралася бедна басота, дый гарэлку п'е... П'ем мы гарэлку, п'ем мы наліўку, будзем піць віно, а хто будзе з нас насьміхацца, будзем біць таго", "а я ў піру была, п'яная дамоў ішла, хмель-віно зялёнае, усё маё пахмелейка", "тая дзеўка напілася, ды і зь

печы звалілася", "ой, піла, піла, чапец згубіла", "у нядзелю п'ю, п'ю, ў панядзелак сплю, сплю", "ад панядзелка да панядзелка смачна п'ецца нам гарэлка", "паўзагона не ўзарала, да карчомкі дала драла, ад карчомкі да карчомкі нясі паўгарца гарэлкі", "бачыш, жана, як гарую: з адной карчмы – у другую", "пілі мы, пілі, усю пшаніцу прапілі", "у карчме ня быў, а каня прапіў", "ты, шынкарка маладая, пачом у цябе пляшка гарэлкі?", "шынкарачка малада, прадай мёду гарцы два", "волы нэ прісталы, з дарожкі нэ збывся, дашов до корчомкі, водочкі напывся", "гарэлачка-пітушачка, як я цябе люблю", "чарачка-каток, каціся ў раток", "чарачка мая, залатая..." Або ў сучаснай музыцы: "У суботу, нядзельку, зазірнуць у бутэльку, а ў бутэльцы на дне чорт рагаты жыве", "хочаш піва...", "маленькі жаўнерык, налівай, налівай яшчэ, выпівай, выпівай хутчэй", "куфаль піва, келіх віскі", "мы дапіць не пасьпелі да дна..."

Максюта: Вядома ж, дзеяслоў "пець" паходзіць ад "піць"! Ну, а ўжо пра батлейку й казаць німа чаго – "пэрлы":

Ой, калі з ба на мяне
цорны год няхай напаў,
ей-ей, няхай напаў,
калі б мяне казацынька
на сем месьце не застаў!
[illegible]

Ой, мір, мір,
стэйлэм, бэйлэм,
стэйлэм, бэйлэм.
Там і Борух троху гуляў,
Масіясу поўху даў,
ой, мір, мір,
стэйлэм, бэйлэм,
стэйлэм, бэйлэм.
Там і Борух троху ўпіўся,
ён пад лаўку падваліўся,
ой, мір, мір,
стэйлэм, бэйлэм,
стэйлэм, бэйлэм.

***

Бэрка
Што кроквы і латы!
Ішоў ты на варты
і спрасіў паўкварты,
даць я не даў, а запісаць – запісаў.
Апяць ішоў ты з варты
і спрасіў паўкварты,
я даць не даў, а запісаць – запісаў.

***

казак
Я казак, небарак, работы не маю, жыдоў б'ю,
водку п'ю, весела гуляю.

Моўшка: Як у нас кажуць: "Fun a kvatirele hot men a goldenem šnirele" (кварта гарэлкі прыносіць залаты ланцужок – дае добры заробак). Але німа чаго й казаць – "pojer blajbt pojer" (мужык ёсьць мужык). У ідышы ёсьць устойлівыя показкі: "šikere pojerim" (п'яныя мужыкі/сяляне), "šiker vi goj/pojer" (п'яны як гой/селянін), "zojfn/trinken vi a goj" (жлуктаць/піць як гой), "cejušen zix vi a šikerer pojer" (разьюшыцца як п'яны селянін). І яшчэ: "Hobn a tam vi cvej šikere gojes voltn zix kušn" (такі смак, быццам бы дзьве п'яныя гойкі пацалаваліся).

Максюта: Ну, тады яшчэ два ўзоры з сучаснай музыкі:

Болей ніколі ў жыцьці да Рагойшы
Я не пайду, лепш нап'юся ў Мойшы
Ў простай звычайнай карчме местачковай
Гарэлкі празрыстай, гарэлкі жытнёвай.
(М. Анемпадыстаў. Настаўнік Рагойша)

Роснымі лугамі,
Полечкам траўлівым
Іду да Абрама
На моцнае піва.
(альбом "Byvajcie zdarovy")



VIII
Страчаны лёс — An ongevorn mazl

Божа мой!
Колькі ўжо раз рабіў я павароты назад у жыццці сваім...
І колькі яшчэ раз буду рабіць?
Максім Гарэцкі.

Вось так ніто жыву і ня жыву,
Сваім, што бачу, ня веру вачам,
Што чую – не бяру у галаву,
І што я знаю – ўжо ня знаю сам.
Янка Купала.

Dem jidn majdt kejn umglik nit ojs.
(Ні адно ліха не абміне жыда.)

Vos jaršenen jidn? – Cores un meridn.
(Што атрымліваюць ў спадчыну жыды? – Ліха і гэмарой.)

Як ні горка, але чым далей, тым болей пайшла гуляць "казаччына" і завіхрыла, загула...
"XX стагодзьдзе было росквітам здрады, тут і кветачкі цьвілі, "зялёны ліст, чырвоны цьвет", і ягадкі крывавыя сьпелі. На нашым матэрыяле можна складаць анталёгію здрадніцтва." *(П. Васючэнка).*

Моўшка: Вось пастанова Бюро ЦК КП(б)Б ад 24 ліпеня 1925 г.: "Считать необходимым – изживать из употребления в белорусском языке слова 'жид', заменив его словом 'еврей'".
Максюта: "Спрадвеку ў беларускай мове слова "жыд" ня мела й слабога водценьню абразы, прынізу. Бальшавікі з Масквы прынесьлі ў слова "жыд" значэньне абразы, непрыхаванай нянавісьці. Быў прыняты ўказ, па якім за слова "жыд" давалі да пяці гадоў турмы. І гэта пачало мацаваць і без таго моцную сталінскую дружбу народаў". *(Р. Барадулін)*. Вось анэкдот: сын вяртаецца са школы: – Тата, мяне ў школе жыдам называюць! – Калі кажуць "жыд" – будзеш доўга жыць, а калі кажуць яўрэй, дык памрэш скарэй.
Моўшка: Але слухай далей – у 1929 г. наркам асьветы А. Платун на сходзе камсамольскага актыву заявіў: "...у зьвязку з абвастрэньнем клясавага змаганьня і беларускі, і яўрэйскі, і польскі нац. дэмакратызм і шавінізм адлюстроўваюць настроі кулака, настроі варожай нам клясы, выступаюць супраць лініі партыі, супраць лініі савецкае ўлады. І яны надзвычайна добра паміж сабой ужываюцца. Ня сварацца паміж сабою яўрэйскія, польскія, беларускія шавіністы і нац. дэмакраты, а, наадварот, падтрымліваюць адзін аднаго. Гэта ёсьць адзіны фронт, які выступае супраць лініі камуністычнае партыі, супраць лініі савецкае ўлады" (1930).
Максюта: А вось ужо зноў Зьмітрок Бядуля: "Контррэвалюцыйныя дзеяньні беларускіх нацыянал-дэмакратаў, уся іх праграма, маюць адным з сваіх вытокаў буржуазны беларускі нацыянальны рух часоў "Нашай Нівы"... Я, былы нашанівец, за апошнія гады паступова перавыхоўваўся ў кірунку няўхільнага набліжэньня да задач пралетарскай рэвалюцыі... рашуча адмяжоўваюся ад беларускіх нацдэмаў, як ад іх дзеяньняў, так і ад іх праграмы, якая ставіла курс на стварэньне буржуазна-фашысцкай Беларусі".
Моўшка: Блізу таго ж самага піша ў "Звяздзе" былы "нашанівец" Янка Купала...
Максюта: У маі 1939 г. Інстытут нацыянальных меншасьцяў цалкам ліквідаваны, а ў тым жа годзе Зьмітрок Бядуля адзін зь першых беларускіх пісьменьнікаў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сьцяга, Купалу ж далі ордэн Леніна ("каму ордэн, а каму ордэр")...
Моўшка: 1930 год – "вялікая колькасьць рабінаў і настаўнікаў хедараў і ешываў у Беларусі былі пазбаўлены правоў і заклеймены як "лішэнцы". Іх жытло канфіскавалася дзяржавай, а яны разам зь сем'ямі вымушаны былі жыць нелегальна на гарышчах і ў падвалах сынагогаў. (...) Ананімнае прашэньне: "Хто не быў сьведкам выгнаньня беларускага яўрэя зь яго дома, той ня бачыў сапраўднай катастрофы... Калі яўрэй у Бабруйску маліў мэра, каб улады пашкадавалі яго дзяцей і не пакінулі іх без прытулку, той зьдзекліва казаў: – Рака яшчэ ня поўная."

Ёсьць і анэкдот: 1930 год. Ідзе вучэбная часіна (па-расейску – урок) у менскай гэбрэйскай пралетарскай школе №1. Настаўнік пытаецца: – Дзеці, якая векапомная падзея адбылася ў 1799 г.? – Памёр Віленскі Гоэн. – Сьціхні! Што тут за рэлігійная прапаганда!?.. Дзеці, у 1799 годзе нарадзіўся наш вялікі паэт Пушкін! А якая падзея адбылася ў 1812 годзе? – У нашага Пушкіна было бар-міцвэ!

Максюта: Што і казаць – "страх і сумна". "Перад вайной 1941–1945 гадоў мне малому балюча запала жудаснае відовішча. Праз вокны зачыненых яўрэйскіх школаў ляцелі кнігі, як тыя птушкі з адарванымі крыламі. Літары, як птушыныя лапкі на сьнезе, на старонках гэтых бяздомных кніжак поўніліся лютай роспаччу, немым жалем. Пазьней зразумеў, што яўрэйскія кнігі паўтаралі сумны лёс беларускіх старадрукаў, уніяцкіх і глыбінных крывіцкім духам нашых фаліянтаў." *(Р. Барадулін)*.

Моўшка: Але, не зважаючы на свой лёс, нават і зараз жыды з асалодай размаўляюць і нават пішуць па-беларуску: выкладчыца з Полацку Дзіна Іткіна, Шыман Глазштэйн з Магілёва, Фэлікс Хаймовіч і Вольф Рубінчык зь Менску... Выдатна размаўляў па-беларуску, бо нават яшчэ ў дзяцінстве вучыўся ў Чашнікаўскай беларускай школе, сапраўдны носьбіт ідышу на Беларусі, як ня сумна гэта казаць, ужо нябожчык Гірша Рэлес. Шпрынца Рохкінд, аўтарка "Идиш-русского словаря", склала й "Слоўнік сынонімаў ў беларускай мове"...

Максюта: Пра беларускую мову і я збаю байку. За савецкім часам пры Машэраве ў Менску на Паркавай [illegible] кінатэатар, які называўся па-беларуску "Масква". Праяжджаў міма нейкі вялікі [illegible] зважыўшы новабудоўлю, дый кажа: "Чаго гэта ў вас сталіца нашай радзімы з [illegible] літару справілі, але і дагэтуль яна заўважна, бо зроблена з чарнейшай медзі. Але [illegible] разам зь літарай "А" зьніклі й апошнія беларускія школы...

[illegible] выклік справакаваў фашысцкі адказ. Нацысты паставілі й габрэяў, і беларусаў на [illegible] вынішчэньня. Савецкі камунізм давёў абедзьве нацыі – куды толькі даставалі ягоныя [illegible] сацыяльнай дэградацыі і нацыянальнай асыміляцыі." *(А. Дынько)*.

Максюта: Дэнацыяналізацыя і русіфікацыя, як наўмысна прышчэпленая эпідэмія, у 30–50-я гады захапіла ня толькі беларусаў, але, магчыма, у яшчэ большай ступені – яўрэяў. А дэнацыяналізаваны чалавек часьцяком становіцца ня проста абыякавым, але – горш таго – варожым да сваёй нацыі, да тых, хто ня страціў яшчэ сваёй гістарычнай памяці, культуры й мовы."

Моўшка: Мусібыць, таму й беларуская мова цяпер стала лаянкай, сродкам абразы ў вуснах дзяржаўнай улады.

"Але ўжо ноч настала, і варта па вулках ішла... і разьвіталіся між сабой, у думках жадаючы, каб дзеля спажытку сэрцу і розуму таксама і далей удвох схадзіцца."

Абодва нашыя субяседнікі скончылі сваё жыцьцё заўчасна і трагічна, трапіўшы, паводле словаў віленца Шмэркі Качаргінскага, "cvišn hamer un serp" (паміж молатам і сярпом), – абодвух растралялі як культурных носьбітаў сваіх моваў – ідышу і беларускай: Майсея Кульбака – 29 кастрычніка 1937 году напэўна ў Курапатах, Максіма Гарэцкага – а 3-яй гадзіне апоўдні 10 лютага 1939 году ў г. Кіраве (Вязьма).

"Яе (мову) вывелі з ужытку, як слова "жыд". Сьледам за ёй ідзе й мова-гаспадыня. І гаспадыні сказалі гжэчна: не выганяем, але просім вон! Няхай сабе жыд будзе называцца яўрэем. Толькі б яўрэі былі." *(Р. Барадулін)*.

"Зьнікненьне частак гэтай самай Беларусі азначае скурчваньне беларускай прасторы, разбурэньне беларускага топасу." *(В. Зайка)*.

"...якіх яркіх, цікавых, своеасаблівых, неардынарных людзей страціла Беларусь у гады таго "вялікага зыходу", як нам іх не хапае! Не хапае іхняга энэргічнага, напорыстага жыцьцялюбства, іхняга гумару, іхняй вострай дасьціпнасці, без чаго наша беларускае цеста часам бывае прэсным, калі не сквасьнелым..." *(В. Тарас)*.

"Літвацкі субэтнас, сутэрытарыяльны з этнасам беларускім, уяўляе сабой дагэтуль амаль некранутую крыніцу зьвестак па беларускай гісторыі, мовазнаўстве, беларускай і яўрэйскай культуры." *(В. Зайка)*.

• ales bestes! усяго найлепшага!
• beser hot gor kejn šir nit "лепш" ня мае межаў
• beser, vos beser kon śojn nit zajn! гэтак добра, што лепш ужо быць ня можа!
• dajne kinder in dajne jorn zoln beser maxn! каб твае дзеці ў тваім узросьце дасягнулі большага!
• dos lecte iz dos beste *glxv.* апошняе – найлепшае
• kejn besere teg zolstu nit hobn! *kll.* каб ты лепшых дзён ня меў!
bes(e)xákl/bes(a)xákl=bs"h *abr.* [*s.* בסך־הכל=בס"ה –>sax-hakojlel, saxakl] *adv.* наагул, усё разам, цалкам; ня больш як, фактычна [*sin.* in ejnem, in ganzn; ništ mer vi, faktiš]
• besexakl iz er a feldšer, ništ kejn dokter наагул ён – фэльчар, а ніякі ня доктар
besiate-dešmáje=bs"d [*s.* בסיעתא דשמיא=בס"ד] *adv.* з дапамогай нябёсаў, з боскай/божай помаччу/дапамогай
besimxe-rábe [*s.* בשמחה רבה –>mesamejex, (bal-)simxe, somejex-] *adv.* з задавальненьнем/асалодай, зь вялікай радасьцю; **besimxe-bábe** пародыя на "besimxe-rabe"
bes(j)edke *f*, -s [*r.* беседка] альтанка
besmedreš=bejs-(ha)médreš *m/n*, *pl.* bote(j)-(ha)midróšim [*s.* (בתי־(ה)מדרש (בית־(ה)מדרשים] сынагога, школа, дом для навучаньня і набажэнстваў
besmentaž *m*, -n [*s.* בית, *p.* cmentarz] могілкі, клады
besód [*s.* בסוד –>bal-sod, sod] *adv.* употай, тайком, сакрэтна, с(у)крыта, патаемна, пад сакрэтам, каб ніхто ня ведаў [*sin.* fartrojlex, gehejm]; **besódiker** сакрэтны, с(у)крыты, (па)таемны; **besódikajt** *f* сакрэтнасьць, с(у)крытасьць, (па)таемнасьць; **besód/besójde-sójdes** [*s.* (י)־בסוד־סודות] *adv.* пад вялікім сакрэтам
• haltn* epes besod трымаць штосьці ў сакрэце
besojlem=bejs-ójlem *m/n*, -s [*s.* (ס-)בית־עולם] "нябесны дом"; могілкі, клады, кладзішча
• avektrogn zol men dix afn besojlem! *kll.* каб цябе вынесьлі /вывалаклі на могілкі!
• fun a/dem besojlem trogt men nit curik *glxv.* з могілак не выносяць назад (зь ляску прыжджэм, а зь пяску ніколі)
• vi kumt der xazer afn besojlem? *glxv.* як трапляе сьвіньня на могілкі?
besojxem [*s.* בתוכם] *adv.* у тым ліку, зь імі, (па)між імі
besóx=betóx [*s.* בתוך –>tox] *prep.* у, (па)між [*sin.* in, cvišn]
bestje *f*, -s [*p.* bestia, *ukr.* бестія] бэстыя, зьвер; **bestjaler, bestjálišer** зьверскі
beša(j)te [*s.* בשעתו –>šas-, šo] *adv.* у свой (у яго, у яе) час, калісь, некалі [*sin.* in zajn cajt]; **bešatem** [*s.* בשעתם] *adv.* у іхныя часы; **bešás** (ven) [*s.* בשעת] *bndv./prep.* калі, у час; у той час, калі..., падчас, у часе [*sin.* bejs, ven, in der cajt ven]; **bešás(-h)atxák/-hadxák** [*s.* בשעת־הדחק] па неабходнасьці, па патрэбе, сьпешна, тэрмінова, неадкладна, безадкладна [*sin.* in a nojtfal, in a dringendiker cajt]; **bešás-májse** [*s.* מעשה־] *adv.* пры гэтым, у той жа (самы) час; у той час, калі гэта было; **bešásn=bešás dem**
• bešas me vejnt, zet kejner nit, bešas me laxt, zeen ale *šprxv.* на плач ніхто не зважае, сьмех бачаць усе (як сірата плача, то ніхто ня бача, а як скача, то ўсе бачаць)
• er iz a boki bešas vi a tojber afn bas *glxv.* ён такі знаўца Талмуду як глухі па басах (разумее як баран на Біблії)
bešajxes [*s.* בשייכות –>šajex, šajxes] *adv.* у сувязі, разам з, побач з [*sin.* in farbindung, in cuzamenhang]
bešalax [*s.* בשלח] "калі ж (фараон) адпусьціў (народ)" (назоў 16-га разьдзелу Торы) (Вых. 13:17–17)
bešalve [*s.* בשלו(ו)ה –>šalve] *adv.* мірна, с(у)пакойна, ціха-мірна, рахмана
bešefe [*s.* בשפע –>mušpe, balšefe, šefe] *adv.* удосталь, уволю, даволі, у пераліўкі, з коптурам [*sin.* in ibertlus, ibergenug]
• ba undz iz alcding faran bešefe мы маем усяго ўдосталь
béšexe=bíšexe=bášexe *f* [*ukr.* бешиха] *med.* рожа
bešéjn-voáin/-veájn [*s.* בשן־ועין] "з (выбітым) зубам або вокам"; *adv.* з пашкоджаньнем/калецтвам [*sin.* mit šodn, ceśediki]
• arojsgejn* bešejn-voain атрымаць шкоду, выйсьці са стратай
bešém- [*s.* בשם־] –>šmie, šmue, balšem, šem] у імя...
bešém-ómroj/bešemomre [*s.* בשם־אומרו] *adv.* з нагоды гаворкі (аб кімсьці), узгадваючы (кагосьці)
• zogn a zax bešem-umroj прамываць камусьці костачкі
bešém-vemálxes/-umálxes [*s.* בשם־ומלכות] *adv.* узгадваючы імя бога і ягоны тытул як цара нябеснага

bešojgeg [*s.* בשוגג →bišgoge, šojgeg] *adv.* ненаўмысна, ненаўмысьля, бяз злога замеру, празь недагляд, не жадаючы, зьнянацку, зьнячэўку, нечакана [*sin.* durx a farzen, on a bejzn mejn, ništ vilndik; *ant.* bemejzed]

bešolem [*s.* בשלום →šolem] *adv.* мірна, спакойна, добра, шчасна, шчасьліва, пасьпяхова, удачна [*sin.* in fridn; gancerhejt, gezunterhejt; ruik, gliklex]; **bešólemdiker** шчасны, пасьпяховы, удачны; **bešolem-vešólve** [*s.* ־ושלווה] *adv.* у цішы і ў спакоі, у міры і ў сяброўстве, у згодзе, ціхамірна

- bešolem derforn* шчасьліва даехаць
- dos umkern zix bešolem ahejm пасьпяховае вяртаньне дахаты
- a sax hunderter jorn hobn di felker gelebt mit di rojte jidlex bešolem-vešolve (Š.-A.) шмат стагодзьдзяў народы жылі з чырвонымі гэбрэямі ў міры і ў згодзе
- breng mix nor ahin bešolem, – /nox dem fli zix dir curik, /grisn zolstu ale libste /un dercejl zej fun majn glik (X. B.) аднясі мяне толькі туды спакойна, – пасьля вяртайся назад, перадай прывітаньне ўсім маім любым і раскажы ім аб маім шчасьці
- zolst bešolem iberkumen! хай усё скончыцца мірам!

Bešt *m abr.* **Balšemtov** *m* [*s.* בעש"ט=בעל־שם־טוב] Бэшт, Балшэм-тоў, наймя/эпітэт заснавальніка хасыдызму рэбэ Ісраэля з Мэджыбожу (1700–1760)

bešúm-ójfn (nit) [*s.* בשום־אופן →šum] *adv.* ніяк, ні ў якім выпадку, ні ў якім разе, ніякім чынам [*sin.* af kejn fal, durx kejn šum mitlen]; **bešúm-injen-veójfn** [*s.* ־ענין־ואופן] *adv.* бяз ладу/розуму, нястройна, недарэчы

- bešum-ojfn(-veojfn) nit ні ў якім разе
- ix ken bešum-ojfn nit farštejn ніяк не магу зразумець
- me ken bešum-ojfn nit maskim zajn ніяк нельга згадзіцца
- šojn že iz er gerext? – bešum-ojfn nit хіба ж ён мае рацыю? – зусім не
- kranke menčn konen lebn on doktojrim, doktojrim on kranke menčn – bešum-ojfn nit *šprxv.* хворыя людзі могуць жыць бязь лекараў, лекары бяз хворых людзей – ні ў якім разе

bešutfes (mit) [*s.* בשתפות(ו) →šutef] *adv.* разам, супольна, сумесна, талакой; у складчыну [*sin.* cuzamen, in ejnem]; **bešútfes(dik)er, bešútfišer** супольны, сумесны

- hobn* (bazicn*) epes bešutfes валодаць чымсьці супольна
- dem dax zol men dekn bešutfes, vet kost a sax velveler (Š.-A.) гэты дах трэба крыць талакой, выйдзе многа таней

bet *f/n*, -n, *dim.* **bétele** *n*, -x [*d.* Bett] 1. ложак, пасьцеля, пасьцель; 2. рэчышча; **betn** [*d.* betten] засьцілаць, (па)слаць; **bét-deke** *f*, -s, **bét-cix** *f*, -n капа, павалака, накрыўка; **bétgevant** *n*, **bétcajg** *n* пасьцельныя рэчы; **bét(-)veš** *n* бялізна; **bétzak** *m/n*, *pl.* -zek тухвяк, матрац, сяньнік

- lign* afn tojtn bet ляжаць на сьмяротным ложку
- az me bet zix gut do, ligt men gut dort *šprxv.* калі добра засьцеліш тут, добра будзе ляжаць і там (на тым сьвеце)
- di varemste bet iz di mames *glxv.* самы цёплы ложак – матчын
- er hot zajn ejgn umzist bet in turme *glxv.* ён мае свой уласны дармавы ложак у турме
- man un vajb lign in ejn bet, ober dejes hobn zej cvej *šprxv.* муж і жонка ляжаць у адным ложку, але маюць два розныя меркаваньні
- on a benkl, on a tiš, /cebroxn betl mit draj fis, /lcik hot šojn xasene gehat! *flksl.* ані ўслончыка, ані стала, зламаны ложак на трох нагох, Іцка ўжо ажаніўся!

Betár *abr.* **Brit Josef Trumpeldor** [*ivr.* יוסף תרומפלדור ברית"ר=ברית] "Саюз імя Язэпа Трумпэлдора" (назоў юнацкай арганізацыі сіяністычна-рэвізіяністычнага кірунку, створанай у Рызе ў 1923 г.)

betarbes [*s.*בתרבות →tarbes, umbetarbesdiker] *adv.* пачціва, з пашанай/павагай, далікатна, ветліва

betaxles-ha... [*s.* ...בתכלית־ה] *adv.* дужа, надта, вельмі, крайне, празьмерна, экстрэмальна [*sin.* mit der grester..., mit der šarfster..., mit der ekstremster...]; **betaxles-hapáštes** [*s.* ־הפשטות] *adv.* вельмі простым чынам, прымітыўна; **betaxles-hasíne** [*s.* ־השינאה] *adv.* вельмі варожа, дужа зьняважліва; **betaxles-hašlójmes** [*s.* ־השלמות] *adv.* вельмі дасканала, дакладна

- er tut es betaxles-hapinktlexkajt ён робіць гэта з празьмернай дакладнасьцю
- fajnt hobn* betaxles-hasine дужа зьневажаць

betejles *n* [*s.* בטלות →batlen, botl, mevatl] самазьнявага, самаўніжэньне

Beter/Betár [*s.* ביתר] Бэтар, назва гістарычнай крэпасьці ў Палестыне (апошняе месца абароны паўстанцаў Бар-Кохбы ў 135 г.)

beteve [*s.* בטבע →teve] *adv.* па (сваёй) натуры, па прыродзе, зроду, паводле характару

- der doziker jid iz geven beteve ništ kejn šlexter (M.M.-S.) гэты жыд быў па натуры неблагі

betke=bebke *f*, -s бабка (грыб)

betlen [*d.* betteln] жабраваць, цыганіць, канькаць; **betler** *m*, -s, (-n/-ke *f*, -s), **betlerúk** *m*, -es жабрак, проська, папрасяка, канькала; **bétler(i)šer** жабрацкі; **betl** *n*, **betleráj** *f/n* жабрацтва, галеча, убоства; **bétl-brojt** *n*, -n жабрацкі хлеб, міласьціна

- betlen di hajzer жабраваць па хатах
- (on)kumen* cu betlbrojt прасіць міласьціны
- zajn*/blajbn* vi betler on a torbe застацца як жабрак бяз торбы (ні з чым)
- a sojxer fort af jaridim, a betler gejt cu fus *šprxv.* гандляр едзе на кірмашы, а жабрак ідзе пеша
- az me huljet cufil in der jugnt, betlt men af der elter *šprxv.* хто змоладу не працуе, той на старасьці жабруе (змоладу банкетавалі, а пад старасьць жабравалі)
- ejn betler ken nit zajn af cvej jaridim *šprxv.* адзін жабрак ня можа быць на двух кірмашох (з адною сракаю на ўсіх кірмашох)
- ven frejt zix got? – az ejn betler kract dem andern *glxv.* калі радуецца бог? – калі адзін жабрак чухае другога

betn* (gebétn/gebótn) [*d.* bitten] 1. прасіць, маліць, благаць, канькаць; 2. *n*, **béteniš** *f*, -n маленьне, упрошваньне, заклінаньне, благаньне; **a bet ton*** папрасіць; **beter** *m*, -s, (-ke *f*, -s) прасіцель, просьбіт, хадайнік; **bétndiker** які просіць/канькае; **bétbriv** *m* пісьмовая просьба, прашэньне

- a guter beter zol er zajn far undz ён мог бы быць для нас добрым хадайнікам
- betn* af a xasene запрашаць на вясельле
- der posek bet zix me zol im daršenen гэты тэкст патрабуе тлумачэньня
- do bet zix a late тут патрэбна лата
- dos betn zix raxmim упросы, маленьне, благаньне

• es bet zix an ander vort патрэбна іншае слова
• zajn* a guter beter наказаць доўга жыць
• zix lozn* betn не жадаць
• zix ojscien* betndik выцягнуцца просячы
• zogt mir, ix bet ajx скажэце мне, калі ласка
• az me bet guts af jenem, vert men alejn geholfn *šprxv.* хто зычыць дабра другому, таму самому дапамогуць (памажы каму ў худабе, то дасьць бог і табе)
• me zol tomed betn af gute gest трэба заўжды маліцца на добрых гасьцей
• oj, elnt, oj, elnt, mamenju, azoj vi a štejn, oj vej, /nor betn bet ix dir, majn tajer lebn, /az du zolst xoč kumen oft cu mir cu gejn *flksl.* ой, я адна, ой, матуля, адна, як камень, але прашу цябе, мой дарагі, каб ты хоць часьцей прыходзіў да мяне

betoes [*s.* בטעות →toes] *adv.* памылкова

betojr(es) [*s.* (ת)בתור] *prep.* як, у якасьці, як толькі [*sin.* vi, als]; **betojres(-)cdóke** [*s.* צדקה־] у якасьці міласьціны; **betojres(-)éjce** [*s.* עצה־] у якасьці парады; **betojres-gmiles-xésed** [*s.* גמילות־חסד־] у якасьці дабрадзейства, [illegible]; **betojres(-)halvóe** [*s.* הלוואה־] у пазыку, у [illegible] напавер
• [illegible]-halvoe я даю вам гэта ў якасьці пазыкі

betóx=besóx [*s.* בתוך] *prep.* у, (па)між [*sin.* in, cvišn]

betue[illegible] [*s.* (ים־)בטוח →bitoxn, maftiex, havtoxe] [illegible] надзейны чалавек (які мае давер, якому можна даручыць грошы); **betúexer** аўтарытэтны, надзейны [*sin.* zixerer, ibergecajgter]; **betuxes** *n* [*s.* ות־] (сама)ўпэўненасьць, (сама)надзейнасьць, забясьпечанасьць, гарантыя [*sin.* zixerkajt; farzixerung, garantje]
• bist a betuex, ober šik arajn mezumonim! *glxv.* ты надзейны чалавек, але плаці грошы! (вер Яўменю, а грошы кладзі ў кішэню)
• der bester betuex iz di ejgene kešene *šprxv.* самы надзейны чалавек – уласная кішэня
• got iz a betuex, vos me meg im alc getrojen *šprxv.* самы надзейны бог, яму можна ўсё даверыць (німа прыяцеля апроч збавіцеля; найлепшы гандаль – з богам)

betupim-uvimxójles [*s.* בתופים־ובמחולות] "з бубнамі і танцамі"; *adv.* урачыста, зь вялікай радасьцю; зь вялікім шумам
• arojsgejn* emecn antkegn betupim-uvimxojles урачыста прымаць кагосьці

bevade [*s.* בוא(ו)דאי →avade] *adv.* (на)пэўна, пэўне, безумоўна, вядома [*sin.* gevis, zixer]

bevás-áxes [*s.* בבת־אחת] *adv.* за адзін раз, адначасова [*sin.* mit ejn mol, in ejn cajt]

bex *pl.* →bax=box *m*, -п ручай

bex! *int.* бэх! бах!

bexadrág *abr.* **bexejrem-derabénu-géršom** [*s.* =בחרד"ג בחרם־דרבנו־גרשם →xadrag] такую абрэвіятуру пісалі на канвэртах, каб нагадаць аб праклёне, які рабін Гершн-Мэйер-Гагойла (960–1028) усклаў на тых, хто чытае чужыя лісты без дазволу

bexarpe [*s.* בחרפה →mexaref-, xarpe] *adv.* са зьнявагай, з абразай, засаромлена, саромеючыся, сарамліва [*sin.* faršemterhejt, mit balejdikung]; **bexarpose** [*s.* בחרפתו] на ягоны (уласны) сорам

bexavruse (mit) [*s.* בחברתא →xavruse] *adv.* у хаўрусе, супольна, разам зь іншымі людзьмі [*sin.* cuzamen, inejnem, kolektiv]
• bexavruse mit emecn у хаўрусе з кімсьці
• nadn un jeruše zajnen mit dem tajvl bexavruse *šprxv.* пасаг і спадчына – у хаўрусе з чортам (прыйшло махам – пойдзе ветрам-прахам)

bexazoke [*s.* בחזקה →xazoke, maxazek] *adv.* валодаючы (нечым пэўны час), (маёмасьць, якая атрымана) у спадчыну

bexazore [*s.* בחזרה →maxzir, xazern, xojzer, xazore] *adv.* назад [*sin.* curik]
• šikn bexazore адсылаць назад, вяртаць

bexedre-xadórim [*s.* בחדרי־חדרים →xejder, xadre-] "ва ўнутраным пакоі"; *adv.* хавацца, каб ніхто ня ўбачыў
• bahaltn* bexedre-xadorim добра схаваць

bexé(j)n [*s.* בכן] *adv.* таму, вось чаму, пагэтаму, ну, значыцца, выходзіць [*sin.* nu, hejst es, deriber]

bexejrem [*s.* בחרם →maxrem, muxrem, ad-xorme, xejrem] *adv.* палохаючы/пагражаючы выгнаньнем або адлучэньнем
• freg(t) bexejrem колькі ні пытайся, ніхто ня будзе ведаць
• freg(t) mix bexejrem! колькі мяне ні пытайся, я зусім нічога ня ведаю! німа нават і думкі!

bexer *m*, -s [*d.* Becher] кухаль, келіх, кубак; **béxer-bretl** *n*, -ex *bot.* чашалісьцік, падвяночкавы лісток; **béxer-šveml** *n*, -ex *bot.* лісічка
• az me iz hexer, dergrejxt men cum bexer *glxv.* хто вышэйшы, дастане й келіха (наперадзе піва п'юць, а назадзе кіем б'юць)
• Tajere Malke – /gezunt zolstu zajn! /Gis on dem bexer, /dem bexer mit vajn, /bim-bam-bam, bim-bam! (M. V.) Дарагая Малка – здароўя табе! Налей кубак, кубак віна, бім-бам-бам!

bexezkes-/bexeskes- [*s.* בחזקת־] *prep.* (прымаць/разумець) як
• dos, vos ejn menč halt far a špas, ken ba a cvejtn zajn bexeskes-balejdikung *šprxv.* тое, што адзін чалавек лічыць за жарт, другі разумее як крыўду

bexezkes-kášres [*s.* בחזקת־כשרות] прымаць за кошар

bexezkes-sakóne [*s.* בחזקת־סכנה] прымаць за небясьпеку

bexinem [*s.* בח(י)נם →xoce-xinem] *adv.* бясплатна, дарэмна [*sin.* umzist]; **bexínemdiker** бясплатны, дарэмны
• undzer mi iz ništ geven bexinem наша праца не была дарэмнай
• bexinem krigt men kinem *šprxv.* дарэмна можна атрымаць толькі вошы (даўно тыя паўміралі, што задарма давалі)
• got git nit bexinem *šprxv.* і бог не дае бясплатна

bexipózn [*s.* בחפזון] *adv.* сьпехам, насьпех [*sin.* in ajleniš, xapndik]
• got hot Odemen geklept fun lejm un vaser far ejn tog – dem zibetn tog fun vox; es gemaxt gix, bexipozn, derfar, zogt men, iz der menč mit a sax xesrojnes *šprxv.* бог зьляпіў Адама з гліны з вадой за адзін дзень – у сёмы дзень тыдня; зроблены хутка, сьпехам, таму, маўляў, і мае чалавек шмат недахопаў

bexi-tó(j)v [*s.* בבי־טוב] *adv.* спрыяльна, добрым чынам, добра, ладна, ладам [*sin.* af a gutn ojfn, cum gutn]
• geendikt hot zix di gešixte bexi-tojv гісторыя добра скончылася

(be)xoce-xínem [*s.* (ב)חצי־חינם →bexinem] *adv.* за бясцэнак, за паўцаны, вельмі танна, амаль дарэмна [*sin.* halb umzist, zejer bilik]

bexojmer-uvilvéjnim [*s.* בחומר־ובלבנים] "глінай і цэглай"; *adv.* цяжкай працай

bexól-o(j)fn [*s.* בכל־אופן →kol] *adv.* у любым выпадку, што б ні здарылася/было, як бы то ні выйшла
bexól-tfúces-jisróel [*s.* בכל־תפוצות־ישראל] *adv.* ва ўсіх месцах, дзе ёсьць гэбрэі; ва ўсіх кагалах
bexte=buxte *f*, -s [*d.* Bucht] бухта
bexukojsaj [*s.* בחקותי] "паводле статутаў маіх" (назоў 33-га разьдзелу Торы) (Ляв. 26:3–27)
bexúš [*s.* בחוש →xuš] *adv.* ясным і канкрэтным чынам, відавочна; адчувальна, пачуцьцёва
• filn bexuś успрымаць, адчуваць
bez- [*p.* bez-, *ukr.* без] *pref.* без(ь)-, бяз(ь)-, бес(ь)-, бяс(ь)-
béz(-bojm) *m*, *pl.* -bejmer [*p.* bez, *ukr.* без] *bot.* бэз; **bézev(e)** бэзавы
bezborodke *m*, -s безбароды мужчына
bezbúš(e)nik *m*, -es, (-nice *f*, -s) [*s.* -בושה-] сарам(ат)нік, бессаромнік [*sin.* umfarśemter man]
bezdjelnik *m*, -es [*r.* бездельник] гультай, лодар
bezd(j)etnik/bezditnik *m*, -es, (-nice *f*, -s) [*p.* bezdzietny, *ukr.* бездітний] бязьдзетнік
bez(d)n=bejs-din *m/n*, -s [*s.* (־ם)בית־דין] суд рабінаў, суд справядлівасьці, судзілішча
• mir veln cu bezdn nit gejn мы (да рабіна) на суд ня пойдзем
bezé-halóšn [*s.* בזה־הלשון] "такой мовай"; *adv.* у наступных/такіх словах, паводле гэтых словаў, такім чынам [*sin.* tekstuel]
bezé-hoójfn [*s.* בזה־האופן] *adv.* такім чынам [*sin.* af aza ojfn]
bezejes-apéxo [*s.* בזעת־אפיך] "з потам на тваім твары"; *adv.* працай і напружаньнем
bezem/bezim=bejzm *m*, -er/-(e)s [*d.* Besen, *mhd.* bësem] венік, мятла; **bézemen/bézimen** падмятаць, (пад)месьці, (пад)мясьці; **bézemen zix** парыцца венікам (у лазьні); **bézemung** *f* падмятаньне
• a bezem ven er iz naj, iz er getraj *glxv.* венік надзейны, калі ён новы
• a najer bezem kert gut *glxv.* новая мятла чыста мяце
• az got vil, šist a bezem ojx (amol šist a bezem) *glxv.* калі бог захоча, і венік страляе
• az me tut a bezem šejn on, iz er ojx šejn (zet er ojx ojs vi a menč) *šprxv.* калі венік прыгожа апрануць, дык ён будзе прыгожа выглядаць (ён выглядае як чалавек) (прыбяры пянька – стане за панка)
• mit dem bezem iz mir gring, /x'ker kazarmes un ix zing – /oj-ra-ra, oj-ra, oj-ra, /s'endikt zix di bezem-šlaxt, /dank ix got, s'falt cu di naxt, /oj-ra-ra, oj-ra, oj-ra (I. M.) зь венікам мне лёгка, я мяту казарму і сьпяваю - ой-ра-ра, канчаецца бойка зь венікам, дзякуючы богу, настае ноч, ой-ра-ра...
bezgrámotne(r) [*r.* безграмотный] неадукаваны, непісьменны
bezíl(-h)azól/bezojl-hazól [*s.* בזיל(י)־(ה)זול/בזול־הזול →bezol] *adv.* вельмі танна
bez-kolíriker [*p.* kolor, *ukr.* колір] бясколерны
bezlád *m*, -n [*p.* bezład, *ukr.* безлад] бязладзьдзе, беспарадак; **bezladnik** *m*, -es неўладкаваны чалавек
bezljudnik *m*, -es [*p.* bezludny] нелюдзень, нелюдзім
bezmen/bezmer *m*, -s [*p.* bezmian, *ukr.* безмін] бязьмен
• haltn* (inderluftn) vi a bezmen трымацца на вазе
beznose(r) [*p.* beznosy, *ukr.* безносий] бязносы
bezódn vebišgoge [*s.* בזדון ובשגגה] *adv.* зламысна і памылкова, наўмысна і ненаўмысна
bezól [*s.* בזול →bezil-] *adv.* танна [*sin.* volvl, far a bilikn prajz]
bezpásportne(r) бяспашпартны
bezpečne(r) [*r.* беспечный] бесклапотны, бестурботны, неруплівы, нядбайны, нядбалы; **bezpéčnekajt** *f* бесклапотнасьць, неруплівасьць, нядбайнасьць, нядбальства
bezres-hašém=be(z)"h *abr.* [*s.* בעזרת־השם=בע(ז)"ה] *adv.* з божай дапамогай, з боскай помаччу; **bezres-hašém-jisborex=beh"i** *abr.* [*s.* ־יתברך=בעה"י] з божай дапамогай – хай будзе блаславёны; блаславі яго божа; **bezres-habójre** [*s.* ־הבורא] з дапамогай творцы
• mir veln bezres-hašem alcding ibergekumen (M.M.-S.) з божай дапамогай мы ўсё перабудзем
bezrukavke *f*, -s безрукаўка, камізэлька, кабат
bezxárpetnik *m*, -es, (-nice *f*, -s) [*s.* -חרם-] сарам(ат)нік, бессаромнік
béženec *m*, -nces, **béženke** *f*, -s бежанец, уцякач
béž(en)er [*fr.* beige, *p.* beż] бэжавы
beže *f tekst.* бязь; **béžener** бязевы
bgide *f* [*s.* בגידה] здрада [*sin.* farrat]; **bgídediker** здрадніцкі; **bgide-bemálxes** *f* [*s.* ־במלכות] дзяржаўная здрада [*sin.* meluxe-farat]
bgodim *pl.* →beged *m* [*s.* (־ים)בגד] адзеньне, адзежа, вопратка; *euph.* саван
b"h *abr.* **borex-hašém=borxašém** [*s.* ב"ה=ברוך־השם] дзякуючы богу
b"h *abr.* **bórex-hu=bórxú** [*s.* ב"ה=ברוך־הוא] "блаславёны ён"
b"h *abr.* **bal(e)bós** *m*, *pl.* balebatim, (-te *f*, -s) [*s.* בעל־הבית בע"ה/ב"ה=(בעלי־בתים)] гаспадар, уласьнік, кіраўнік; чалец кагалу; гараджанін, абывацель, жыхар, перабытнік, тубылец, мешчанін, мяшканец
bh"b *abr.* **šejne-xamiši-šéjne** (2-5-2) [*s.* שני־חמישי־שני] панядзелак-чацьвер-панядзелак (посныя дні ў месяцах іяры і хэшване)
• fastn bh"b пасьціцца ў панядзелкі і чацьвяргі
bi-=be-=ba- [*s.* -ב] *pref.* утварае ад сэміцкіх і іншых асноваў прыслоўі
• bignejve употай, крадком
biber *m*, -s [*d.* Biber] *zool.* бабёр; **bíberner** бабровы; **bíber-futer** *m* бабровае футра
• švicn vi a biber пацець як бабёр
• vejnen/klogn vi a biber раўці як бабёр/карова/вол/цёлка /мядзьведзь (немым голасам)
bibke *f*, -s [*d.* bibka] выпіўка, папойка
bibke=bobke *f*, -s бобка (авечы або казіны памёт)
• cigene bibke! (Ś.-A.) казіны памёт!
Bibl *f*, -en [*d.* Bibel] Біблія; **bíblišer** біблійны
bibule=babule *f*, **bibule-papír** *n* [*p.* bibuła, *ukr.* бібула] прамакальная папера, прамакатка, бібула; **bibulke** *f*, -s пяросная папера
bicikl *m*, -n [*d.* Bicykel] ровар, веласіпэд
bicnies [*s.* בצניעות] *adv.* набожна, скромна, сьціпла, цнатліва
bič *m* [*d.* Butsch?] спакушэньне, спакуса, змуста
• aruffirn emecn af a bič спакушаць, уводзіць кагосьці ў спакусу; вадзіць за нос, абдурваць
bíčene(r) [?] букавы
bíčeven zix [*ukr.* бічувати?] надарвацца, надрывацца, гараваць, цяжка працаваць
bičók *m*, *pl.* bičkes [*ukr.* бичок] *zool.* бычок (рыба)
bičues-xéjn [*s.* בתשואות־חן →čues-xejn] *adv.* дзякуючы, зь

вялікай падзякай, з удзячнасьцю, ад шчырага сэрца [*sin.* ful mit dankbarkajt, mit a harcikn dank, mit libharcikajt]
• ojb ir vet undz šikn ajere bixer, veln mir zej cunemen bičues-xejn калі вы нам вышліце вашыя кнігі, мы прымем іх зь вялікай падзякай

bičuve (af) [*s.* בתשובה →čuve] *adv.* у адказ, у раскаяньне

bidarke *f*, -s, **bidke** *f*, -s [*ukr.* бід(ар)ка, *p.* bied(k)a] двухколка

bide *f*, -s [*ukr.* біда] бяда; **bídeven** бедаваць; **bidne(r)** бедны
• fun der xupe biz cu der sude halt dix mit der bide *flksl.* ад вянца да банкету бяды не мінеш

bidelejko [*s.* בדליכא] *adv.* калі (як) німа; там, дзе зусім нічога німа

bíderer [*d.* bieder] чэсны, просты

bidle *f*, -s, **bidljak** *m*, -es [*p.* bydlę, bydlak, *ukr.* бидло, бидляк] быдла, быдлё

bidmoes-šóleš [*s.* בדמעות־שליש] "з поўнай чашай сьлёз"; [illegible] вялікім плачам

bidón [illegible] бітон

[illegible] ביאה] сужыцьцё, сэксуальныя адносіны, [illegible]

[illegible] lezmer, un a blindn a regnbojgn (mol ojs [illegible] un a sores dem tam fun bie) *glxv.* [illegible] музыку, а сьляпому (намалюй) вя- [illegible] (смак еблі)

[illegible] шышка

[illegible] (ב(י)אור(-ים)] камэнтар, тлумачэньне [illegible] komentar]; **Der Bier** камэнтар Танаху, зроблены Майсеем Мэндэльсонам і яго вучнямі ў Германіі напрыканцы XVIII ст.

bier-xómec *m* [*s.* ביעור־חמץ →mevaer] прыбіраньне рошчыны, спальваньне рэшткаў кіслага хлеба (напярэдадні Пэйсаху)

bies-hagójel *f* [*s.* ביאת־הגואל], **bies-hamošiex** [*s.* ־המשיח] прыйсьце, прышэсьце, прыход збаўцы (Мэсіяша)

bieš *m* [*s.* ביוש →buše] сорам, сарамлівасьць; абраза, зьнявага [*sin.* šemevdikajt; balejdikung]
• šteln in bieš прысароміць, прысарамаціць

bif(a)resje=befresje [*s.* בפרהסיא] *adv.* публічна, прылюдна, на вачох у людзей, адкрыта (у дачыненьні да звычайна скрытых дзеяньняў)

bifnej-(kol-)am-veéjde [*s.* בפני־(כל־)עם־ועדה] "перад усім народам"; *adv.* на вачох у людзей, прылюдна, адкрыта [*sin.* efntlex]; **bifnej-kool-veéjde** [*s.* ־קהל] *adv.* на вачох у людзей, прылюдна, адкрыта

bifrát (az, vos) [*s.* בפרט →prat, liprat-, ad-lapak, ubifrat] *adv.* асабліва, асобна, у прыватнасьці, адмыслова, адумысьля, спэцыяльна [*sin.* specjel, bazunderš; *ant.* bixlal]; **bifrojtret** [*s.* בפרוטרוט], **bifrotjes** [*s.* בפרטיות] *adv.* падрабязна, дэталёва, у дэталях, з усімі падрабязнасьцямі [*sin.* mit ale protim (ejnclhajtn), ojsfirlex]
• bifrat nox az... тым болей што...

bifxines=bivxines [*s.* בבחינת →mafxn, bxine] *adv.* у ролі, у катэгорыі, у сэнсе, у аспэкце

bigde(j)-dáles *pl.* [*s.* ב(י)גדי־דלות →beged] зрэбнае адзеньне, лахманы; **bigde-jóntev** *pl.* [*s.* ־יום־טוב] урачыстае/сьвяточнае адзеньне; **bigde-kehúne** *pl.* [*s.* ־כהונה] вопратка, якую насіў когэн; **bigde(j)-málxes** *pl.* [*s.* ־מלכות] каралеўскае, царскае адзеньне; **bigde-méši** *pl.* [*s.* ־משי] дзедаўская, старэчая вопратка; **bigde(j)-šábes** *pl.* [*s.* ־שבת] суботняя вопратка

bígl-ajzn *n*, -s [*d.* Bügelejsen] прас; **bígl-bret** *f/n*, -er дошка для прасаваньня; **biglen** прасаваць; **bigler** *m* чалавек, які прасуе бялізну

bignejve [*s.* בגנבה →ganev] *adv.* употай, крадком, патаемна [*sin.* umbamerkterhejt, štilerhejt]

bigótišer=bagótišer [*d.* bigott] фанатычны, які фанатычна веруе; ханжаскі, крывадушны, аблудны

bigrande=bagrande [*s.* -ב] *adv. hum.* з помпай, сілай, гвалтам

bigus/biges *m* [*p.* bigos, *ukr.* бігос] *kul.* бігус (капуста зь мясам); *fig.* непарадак, бязладзьдзе, блытаніна

bigváld [*s.* -ב, *d.* Gewalt] *adv.* гвалтам

bigzejle [*s.* בגזלה →gazlen, gzejle, nigzl, cu-, ba|gazlenen] *adv.* гвалтам, разбойніцкім чынам

bigzejres- [*s.* -בגזרת →gojzer, gzar, gzejre] на загад, паводле запавету, у імя/гонар; **bigzejres-óv** [*s.* אב-] *adv.* у гонар продкаў

bihejójs [*s.* בהיות →hejojs] *adv.* з прычыны, таму што, праз тое [*sin.* derfar vajl, azoj vi]

bi(j)e *f* [*s.* ביאה] сужыцьцё, сэксуальныя адносіны, коітус, ебля

bijóm [*s.* ביום →jom-, bimej] *adv.* удзень
• a xoxem balajle, a nar bijom *glxv.* мудрэц уначы, дурань удзень

bik *m*, -es, *dim.* **bikl** *n*, -ex [*p.* byk, *ukr.* бик] бык, бугай, буйвал
• er gejt arum vi kohols bik *glxv.* ён ходзіць вакол як кагальны бык (гульма гуляе)
• in der mojds glik gerot der bik *šprxv.* дзявочая доля – бугай (жаніх)

biker-xójlim *m*, -s [*s.* ב(י)קור־חולים(-ס) →mevaker-xojle] 1. дабрачыннае наведваньне хворых і догляд за імі; 2. больніца/шпіталь для бедных

biklál=bixlál [*s.* בכלל →klal, kojlel] *adv.* наагул, увогуле

bikle *f*, -s [*p.* buklak, *ukr.* баклаг] бутля, біклага

biks *f*, -n [*d.* Büchse] стрэльба; **bíksrer** *f* руля, дула; **bíksšlos** *m*, *pl.* -šleser замок (стрэльбы); **bíksnšvajg** *m*, -n спыненьне агню
• grejt haltn* di biks трымаць зброю напагатове (трымаць порах сухім)

biksáv=bixtáv [*s.* בכתב →kakosev, ksav, ksive, ksube, kosev-, mixtev, nixtev] *adv.* у пісьмовай форме [*sin.* in šrift, gešribn; *ant.* balpe]

bikše=bukše *f*, -s *texn.* букса

bikurim *pl.* [*s.* ביכורים →Švues] 1. першыя сьпелыя фрукты, якія гэбрэі прыносілі ў сынагогу на Швуэс; 2. першы твор пісьменьніка або мастака; 3. *tlmd.* назоў 11-га трактату 1-га разьдзелу (запаветы аб прынашэньні садавіны)

bikvies [*s.* בקביעות →kvies] *adv.* заўжды, заўсёды, пастаянна, стабільна [*sin.* štendik, stabil]

bilánc *m*, -n [*d.* Bilanz] балянс, раўнавага, роўнасьць; **bilancírn** (bilancírt) прыводзіць да балянсу, (з)раўнаважыць

bilbl *m*, *pl.* bilbulim [*s.* ב(י)לבול(-ים) →mevalbl, mevulbl] абгавор, нагавор, паклёп [*sin.* falše bešuldikung, farlojmdung]; **bilbulnik** *m*, -es паклёпнік; **bilbl-dám** [*s.* ־דם], **blút-bilbl** *m*, *pl.* -bilbulim крывавы паклёп (фальшывыя абвінавачаньні гэбрэяў у забойстве хрысьціянскіх дзяцей на Пэйсах); **bilbl-hamójxes** *m* [*s.* ־המוחות] зьбянтэжанасьць, мешаніна ў галаве/думках; **bilbúlim-**

máxer *m* паклёпнік, пляткар, плётнік
• arufvarfn*/ojstraxtn/maxn af emecn a bilbl абгаварыць, (на)паклёпнічаць, узводзіць паклёп на кагосьці
• ojsštejn* a (jenems/fremdn/Homens) bilbl цярпець (чыйсьці/чужы/Гаманаў) паклёп
• opkumen*/lajdn* umzist un umništ iber a bilbl пакутаваць ні за што з прычыны абгавору

bildn [*d.* bilden] 1. с-, у|тварыць, с-, у|твараць; 2. адукаваць, адукоўваць; **bild** *n*, -er малюнак, карціна, вобраз; **bílderdiker** маляўнічы, ілюстраваны; **bílderišer, bíldlexer** вобразны, карцінны; **bildung** *f* 1. утварэньне, стварэньне; 2. асьвета, адукацыя; **bílderiškajt** *f* вобразнасьць, карціннасьць; **bíldgeštel** *n*, -n сталюга, траяны, мальбэрт; **bíldkartl** *n*, -ex картка, паштоўка; **bildšejner** прыгожы; **bildšejnhajt** *f*, -n прыгажуня, красуня, харашуха; **bílderšrift** *f* карцінная пісьмо, піктаграфія, г(і)ерогліфы
• bild šejn прыгажосьць
• lebedik bild жывы вобраз

Bilem *m* [*s.* בלעם(ו)] *tnx.* Балам; *fig.* кепскі/дрэнны/благі/нахабны чалавек, злы на язык [*sin.* šlexter menč, bejze cung]
• Bilem iz geven a hunt antkegn im! Балаам быў супраць яго сабакам! (пра вельмі благога чалавека)
• Bilems mojl рот як у Балаама
• zajn* a Bilem быць нягоднікам

Bilhe [*s.* בלהה] *tnx.* Вала (Більга), прыслужніца Рахілі, якая нарадзіла ад Якуба двох сыноў (Б. 30:3)

bíliker [*d.* billig] танны; **bíliker vern*** танець; **bílikajt** *f* таннасьць
• a biliker derfolg танны посьпех
• bilik vi boršt танны як боршч
• kupitje, kojft že, kojft že papirosn, /trukene fun regn nit fargosn, /kojft že, bilik benemones, /kojft un hot af mir raxmones, /ratevet fun hunger mix acind (H. J.) купеце, купеце ж папіросы, сухія й не залітыя дажджом, купеце ж, сапраўды танна, купеце й пашкадуйце мяне, выратуйце мяне зараз ад голаду
• vos iz bilik, iz tajer *glxv.* што танна, тое й дорага

bil(j)e [*p.* byle] абыяка(ва), аднакава, усё роўна
• (a) bile ver абы-хто, хтосьці, нехта
• (a) bile vos абы-што, штосьці, нешта

bil(j)ét *m*, -n [*p.* bilet, *ukr.* білет] білет, квіток
• af biletn cu gejn* *fig.* цуды ў рэшаце
• blojer bilet *hist.* сіні білет (які вызваляў ад рэкруцтва ў мірны час у царскай Расеі)
• vajser bilet *hist.* белы білет (які цалкам вызваляў ад рэкруцтва)

bilme=b(j)elme *f*, -s, **bel(e)m** *m*, -s [*ukr.* більмо, *p.* bielmo] бяльмо, катаракта

biln* [*d.* bellen, *mhd.* büllen] 1. (gebilt/gebúln) (af) брахаць, гаўкаць; 2. *n*, **bil** *m*, **bileráj** *f//n*, -en брэх, брахня, гаўканьне; **a bil gebn*** гаўкнуць; **biler** *m*, -s брахун, агуднік, перагуд; **bílhunt** *m*, *pl.* -hint лайка
• biln* af der levone брахаць на луну
• biln* vi hunt, vi opgerisn fun kejt брахаць як сабака, з ланцуга сарваўшыся (як сабака на азярод/вецер/месяц/неба; брэша як клін чэша, як наняты, як цэп літоўскі)
• a hunt bilt! *glxv.* сабака брэша! (вецер носіць)
• a hunt łozt men biln, un me gejt zajn veg *šprxv.* на сабачы брэх не глядзі ды сваёй дарогаю ідзі (сабака лаець, ды ніхто не зважаець)
• a hunt, velxer (vos) bilt, bajst nit *šprxv.* сабака, які брэша, не кусаецца (ня бойся зьвяглівага/сварлівага, а бойся кусьлівага/маўклівага; ліхі сабака спадцішка кусае)
• a menč redt, a hunt bilt *glxv.* чалавек кажа, сабака брэша
• az a hunt bilt, zol men arojsgejn zen *šprxv.* калі сабака брэша, трэба выйсьці паглядзець
• der volf hot nit mojre farn hunt, ober es gefelt im nit zajn biln *šprxv.* воўк сабакі не баіцца, але ня любіць зьвягі
• geredt iz nit gebuln *glxv.* сказаў – не збрахаў
• nit jederer, af vemen hunt biln, iz a ganev *šprxv.* ня кожны, на каго брэша сабака, злодзей
• tu a hunt guts, bilt er nox *glxv.* зрабі сабаку добра, ён яшчэ й брэша

bilte *f* [?] фруктовае жэле, галярэтка, легумінка

bilti [*s.* בלתי(ו)] *prep.* акрамя, апрача, толькі, за выключэньнем, хіба (што, толькі) [*sin.* ojser, axuc, najert, sajdn]

bilti-mesúpek [*s.* בלתי־מסופק →beli-sofek] *adv.* упэўнена, сьцьвярджальна, не вагаючыся, без сумневу

bilu *abr.* **bejs-jankev lexu venejlxo** [*s.* בילו"=בית־יעקב לכו ונלכה] "Дом Якуба, прыходзь і разам пойдзем" (назва саюзу, які гэбрэйскія студэнты ўтварылі ў Расеі пасьля пагрому 1881 году з мэтай перасяленьня ў Палестыну)

bilxer (vi, fun) [*mhd.* billich] *adv.* важней, патрэбней; **bílxerkajt** *f*, -n перавага, пераважнасьць, значнасьць, прыярытэт, прывілей
• zajn* bilxer быць пераважным, мець прывілей

bim-bom [*d.* bim, bam] *int.* бім-бом; **bimblen** [*d.* bimmeln] бомкаць; ківаца, гайдацца, хістацца
• az draj zogn mešuge, darf der ferter zogn: bim bom *glxv.* калі трое кажуць – вар'ят, чацьверты мусіць згаджацца
• vi me bimblt, azoj klingt es *šprxv.* як гукнеш, так і адгукнецца (як клікнулі, так і адазваўся)

bimcies [*s.* במציאות →benimce, mojce-, moce-, nimce] *adv.* у сапраўднасьці, існы, які ёсьць у наяўнасьці/распараджэньні; **zajn* bimcies** існаваць
• aza zax iz gor ništo bimcies (Żtl.) такой рэчы зусім німа ў сьвеце

bime *f*, -s [*s.* (ות-)בימה] біма, амбона, падвышэньне, падмосткі, сцэна (пляцоўка пасярэдзіне сынагогі, зь якой чытаецца Тора) [*sin.* balemer]

biméj [*s.* בימי →jom-, bijom] *prep.* у дні, у час(ы), за, пры (кімсьці)
• dos iz geven bimej Nikolaj Horišn, in di cajtn fun gnot гэта было пры Мікалаю I, у часы прыгнёту

bim(e)nuxe [*s.* במנוחה →menuxe] *adv.* спакойна, у спакойным стане [*sin.* in ruikajt, ruik]
• Hej, lebedik, frejlex, /vos iz do der xideš? /Meloxe-meluxe /zingt bimnuxe /a lidele a jidišs! (Z. B.) Гэй, жыва, весела, якое тут дзіва? Рамяство-царства сьпяваае жыдоўскія песьні!
• ix vil beser hobn vejnik un bimnuxe, ejder a sax mit kopfardrejeniš (M.M.-S.) я жадаю мець трохі і быць спакойным, ніж шмат разам зь вялікім клопатам

bimhejre [*s.* במהרה →mehires] *adv.* хутка, скора, у хуткім часе (аб прыходзе Мэсіяша) [*sin.* in gixn, in kurcn]; **bimhejre-bejeméjnu** [*s.* בימינו] "хутка ў наш час"; у хуткім часе, як мага хутчэй
• ir zolt zix arojskrign fun der doziker blote bimhejre-be-

jeméjnu (Š.-A.) вам трэба выкараскацца з гэтага балота як мага хутчэй

bimkem/bimkojm=bemokem [*s.* ב(י)מקום(-ס) →mokem] 1. *m*, -s віцэ-, намесьнік, прадстаўнік, памагаты, памагач, асыстэнт [*sin.* vice, fartreter; gehilf, asistent]; 2. *adv.* замест(а), на месцы [*sin.* afn ort fun, anštot]; **bímkem-lerer** *m* асыстэнт настаўніка

• vet der ejdem kadeš zogn bimkem a zun (Prc.) зяць будзе чытаць кадыш замест сына

bimsojre [*s.* במסורה →masern, mesire, mojser, moser, muser] *adv.* у якасьці градыцыі, ад бацькоў к дзецям

bimxile [*s.* במחילה →mojxl, mexile] "з прабачэньнем"; *adv.* даруючы, выбачаючы; **bimxile-gmúre** [*s.* ־גמורה] *adv.* цалкам даруючы, выбачаючы

• du bist, bimxile, an idiot выбачай, але ты ідыёт

bimzumen, bimzumonim [*s.* במזומנ(ים) →mezumener, muxn-[illegible]zumen] *adv.* наяўнымі грашыма, гатоўкай

• er kojft kejn mol ništ af kredit, nor colt štendik bimzumonim [illegible] не бярэ напавер, але заўжды плаціць гатоўкай

bin [illegible] [*d.* Biene] пчала; **biner** *m*, -s, **bínencixtler** *m*, -s [illegible], пчаляр; **binencixtleráj** *f* пчалярства, бортні[illegible]; **bineráj** *n*, **bínencuxt** *f*, **bínen-ciung** *f*, **bínen-hodevanje** пчалярства, бортніцтва; **bínenmuter** *f*, -s мат[illegible] (пчаліная); **bínštok** *m*, -n вулей, борць

• nie zogt der bin: nit mit dajn honik, nit mit dajn gift (nit ix vil di bin (dem bis), nit ix vil di honik) *tnx.* кажуць пчале: ня трэба твайго мёду, ня трэба й твайго джала (не хачу ні мёду, ні смуроду; ня плямкай і ня гамкай; ня дай і ня лай; ня гладзь і не дзяры, і не кусай)

bindjuge=benduhe *f*, -s [*ukr.* бендюга] біндзюга, вялікая павозка; **bindjužnik** *m*, -es біндзюжнік, ламавік

bindn* (gebúndn) [*d.* binden] 1. вязаць; 2. *n* вязаньне; **bindn* zix** (cu) (пры)чапляцца; **bind** *m*, -n пераплёт, вокладка; **binde** *f*, -s бінт; павязка (на вочы); **binder** *m*, -s 1. гальштук; 2. вяровачнік; **bíndiker** зьвязны, які зьвязвае; **bíndndiker** які зьвязвае; **bíndikajt** *f* зьвязнасьць; **bindung** *f*, -en сувязь, зьвязваньне; **bíndbretl** *n*, -ex *med.* шына; **bínd(-)mašin** *f*, -en вязальная машына; **bíndrung** *m*, -en, *dim.* **bíndringl** *n*, -ex зьвяно, каленца; **bíndštejn** *m*, -er замковы камень; **bíndštrix/bíndštrox** *m*, -n злучок, рыска; **bíndvort** *n*, *pl.* -verter *gram.* злучнік

• bind mix af ale fir, nor varf mix cvišn di majnike *glxv.* зьвяжы мяне па рукох і нагох, толькі пакінь мяне сярод сваіх (няхай бы чортам называлі, абы ў балота ня гналі)

• bistu mešuge – loz dix bindn! *glxv.* калі ты вар'ят – дай сябе зьвязаць!

bine *f* [*s.* בינה] розум, паняцьце [*sin.* farštand]; *kbl.* адна зь дзесяці сфэраў сусьвету

bine *f*, -s [*d.* Bühne] сцэна, эстрада

binevue [*s.* בנבואה →nevie, nevue, novi] *adv.* праз прароцтва, празь вяшчунства

binjen *m/n*, *pl.* binjonim [*s.* בנין(-ים)] пабудова, будынак, дом [*sin.* gebaj, gebajde, hojz]

• af zajne rejd ken men nit bojen kejn binjen *glxv.* на ягоных словах хаты не збудуеш (слоў – на мех, а спраў – на сьмех; зь языком – і сюды і туды, а на справе – нікуды)

binkites-séjfer [*s.* בנקיטת־חפץ] *adv.* прысягаючы са сьвятой кнігай у рукох; **binkites-xéjfec** [*s.* ־חפץ] *adv.* прысягаючы са сьвятой рэччу ў рукох

binlajle [*s.* בן־לילה →balajle, lejl-šimurim] *adv.* на працягу аднае ночы

binorejnu-uvizkejnéjnu [*s.* בנערינו־ובזקנינו] з нашымі малымі і старымі, стары і малы, з усім кодлам

binšike [*s.* בנשיקה] *adv.* боскім пацалункам

• štarbn* binšike памерці лёгкай сьмерцю

binšime-áxes [*s.* בנשימה־אחת] *adv.* разам, на адным дыханьні, безь перадышкі, адным махам, за (адзін) раз [*sin.* in ejn otem, mit ejn mol]

bint *m*, -n [*d.* Binde] бінт; (пера)вязка

bintl/bindl *n*, -ex [*d.* Bündel] вяз(ан)ка, зьвязак, нізка, вясло; пачка, пачак; пучок, жмут(ок); **bíntlexvajz** *adv.* паступова

• a bintl finger *hum.* аплявуха

• ojszen* vi a bintl cores выглядаць як зьвязак ліха

• mit a klejn bindl ken men zix ojx dervergn *šprxv.* і малым матузом можна задавіцца

bir *m/n* [*d.* Bier] піва; **bírbrojer/bírbrajer** *m*, -s, **bírkoxer** *m* браварнік, вінакур, півавар; **bírbrojeráj/bír(-)brajeráj** *f*, -en браварня, піваварня; піваварэньне; **bírgelt** *n* чаявыя; **bírhejvn** *pl.* піўныя дрожджы; **bíršenk** *m*, -en шынок, піўная; **bíršojm** *m* піўная пена

• vos kumt arojs fun dem gutn bir in dem šlextn fas? (gute bir in a šlexter tun) *glxv.* што здарыцца з добрым півам у дрэннай бочцы?

birger *m*, -s, (-n *f*, -s) [*d.* Bürger] грамадзянін, падданы; бюргер, буржуй; **bírgerlexer** грамадзянскі; буржуазны; **bírgeršaft** *f*, -n грамадзянства, падданства; **bírgertum** *n* буржуазія; **bírger(-)krig** *f/m*, -n, **bírger-milxome** *f*, -s [*s.* ־מלחמה(-ות)] грамадзянская вайна; **bírger(-)majster=burgmajster/burgmister** *m* [*d.* Bürgermeisster] бургамістар, мэр; **bírger(-)rext** *n* грамадзянскае права

birgóln *pl.* [?] грудзі, сіські, пелькі, цыцкі

birje=berje *m/f*, -s [*s.* בריה(-ות)] удалы, здатны, здольны, ёмкі, спрытны чалавек; майстар, штукар, мастак; добры гаспадар

birkes-hamózn *f* [*s.* ברכת־המזון] малітва пасьля ежы; **birkes-kehánim** *f* [*s.* ־כהנים] блаславеньне, якое коганы спраўляюць у сынагозе

bírkhon *m*, *pl.* -hener [*d.* Birkhahn] *zool.* цецярук; **bírkhun** *f*, *pl.* -hiner *zool.* цяцёрка

birle *f*, -s [?] галава рагатай скаціны

birmize [*s.* ברמז=ברמיזה →remez, meramez] *adv.* ківаючы [*sin.* afn vunk]

biršús- [*s.* ברשות־ →haršoe, rešus] з дазволу; **biršusexem** [*s.* ברשותכם] з вашага дазволу (адказ госьця на гаспадарскае запрашэньне да стала)

• vi der "borexhabo", azoj iz "biršusexem" *šprxv.* якое пытаньне, такі і адказ (як паклічаш, так і адгукнецца)

biržár *m*, -es [?] фурман

birže/birze *f*, -s [*d.* Börse] біржа

bis *m*, -n [*d.* Biss] укус; **a bis ton*** (fun, in) укусіць, цапнуць

• xapn a bis перакусіць

• dajn nešome zol arajngejn in a kac, un a hunt zol ir a bis ton! *kll.* каб твая душа ўвайшла ў котку, а сабака яе ўкусіў!

• gib dir a bis in der cung (ejder du zogst a lign) каб ты сабе язык адкусіў (калі ты хлусіш)

biser *m* бісэр, пацеркі

bískele/biskl/biskn=biz(kl) [*d.* bis] да

biskup/biskop *m*, -n [*p.* biskup, *ukr.* біскуп] біскуп; **bísku-**

pišer біскупскі; **bískupšaft** *f*, -n біскупства

bisl *n*, -ex, **bísinke** *n* [*d.* bisschen, bissel] крыха, дробка, драбок; **bisl(ex)** *adv.* трохі, трошкі, крыху; **bísele** *adv.* трошачку, крышачку; **bíslexvajz** *adv.* патрошку, памаленьку; **bíslexvajzer** паступовы; **a bísinke(le)** трошачкі, крышачку

• a bisl fun alc крышачку ад усяго
• a bisl vaser кропля вады
• a klejn bisl/bisele дробязь, драбяза, драбніца
• cu bislex дужа мала
• dos bisl bixer якія-небудзь кнігі
• gezen a bisl? ці ты калі бачыў такое?
• nemen* cu bislex branfn глынуць гарэлкі
• a bisl a xucpe! крышачку нахабнасьці! німа чаго нэрвацца!
• a bisl geredt un a sax gemejnt *šprxv.* мала словаў, але шмат замераў (меней гавары, болей рабі)
• a bisl šat nor a bisl *šprxv.* дробязі шкодзіць толькі дробязь
• beser gut un a bisl, ejder šlexts un a fule šisl *glxv.* лепей добрага і трошкі, чымся кепскага і поўную міску (лепш у сваіх людзях з голаду паміраць, чым у чужых людзях золата зьбіраць; сваё лычка лепш чужога раменцу)

bisn *m*, -s [*d.* Bisschen] кус(ок), кавалак

• a feter/tajerer/guter bisn тлусты/дарагі/смачны кавалак (ласункі, прысмакі, ласікі, далікатэс)
• afgix iberxapn a bisn перахапіць сьпехам
• ojsvarfn* dem bisn папракаць кавалкам
• a fremder bisn šmekt zis *šprxv.* чужы кавалак пахне смачна (чужыя грашы і гультаю харашы)
• a guter bisn kost tajer *šprxv.* добры кавалак каштуе дорага
• cvej mol a bisn est men nit *šprxv.* два разы адзін кавалак не зьясі
• der bester bisn kumt on dem ergstn hunt *glxv.* найлепшы кусок дастаецца найгоршаму сабаку
• der eršter bisn iz an ekber, der cvejter maxt a lox, der driter šrajt: gib nox! *šprxv.* першы кавалак – сьвердзел, другі робіць дзірку, трэці крычыць: дай яшчэ!
• derštikt zolstu vern (mitn bisn, esndik)! *kll.* каб ты кавалкам задушыўся! каб табе кавалак засеў у горле (стаў упоперак горла)!
• loz er ojx visn fun a gutn bisn! *hum. glxv.* дай і яму пакаштаваць добры кавалак (калі з кімсьці згулялі жарт, так кажуць у адказ на словы: "loz er ojx visn, vi es śmekt" "дай і яму зразумець, чым гэта пахне")
• s'blajbt mir štejn der bisn in haldz кавалак у горле засеў
• s'gejt mir nit ajn der bisn in mojl кавалак у рот ня лезе
• ver se vejst ništ, /zol acinder visn, /vi šver un biter, karg un šiter /kumt undz on der bisn (Z. B.) калі хто ня ведае, дык хай зараз даведаецца, як цяжка і горка, і зрэдку дастаецца нам кавалак хлеба

bistre(r) [*r.* быстрый] быстры, шпаркі, спрытны, шыбкі, прудкі, хуткі

bisxús=bizxús [*s.* בזכות →zxus] *prep.* праз(ь), з нагоды/прычыны, дзякуючы

bíšexe=béšexe=bášexe *f* [*ukr.* бешиха] *med.* рожа

bišgoge [*s.* בשגגה →beśojgeg, śojgeg] *adv.* ненаўмысна, ненаўмысьля, бяз злога намеру, праз недагляд, не жадаючы [*sin.* durx a farzen, on a bejzn mejn, ništ vilndik; *ant.* bemejzed]

bišlejmes [*s.* בשלמות →šlejmes] *adv.* выдатна, паводле ўсіх правілаў мастацтва [*sin.* fulkum, fulštendik, in gancn]; **bišlejmesdiker** некрануты, непашкоджаны

• der vunć vert bišlejmes derfilt пажаданьне цалкам выканана

bišof/bišef *m*, -n [*d.* Bischof] біскуп

bištike [*s.* בשתיקה →štike] *adv.* тайком, употай, потайкі, цішком, моўчкі [*sin.* švajgndik, šlilerhejt; besod]; **bištíkediker** патаемны, зроблены цішком

bišxejnes (mit) [*s.* בשכנות →šoxn] *adv.* па суседзтве, паблізу, побач, дзьверы ў дзьверы, хата к хаце [*sin.* in der noent, tir baj tir, hojz baj hojz]

• zajn*/lign* bišxejnes (mit) межаваць

bit *m*, -n [*d.* Bütte] кадка, кадушка, чан, чоп; **bítele** *n*, -x, **bitl** *n*, -en/-ex дзіцячая ванна, таз, балея; **bítl-maxern** *f*, -s жанчына, якая мые дзеці

bite 1. *f*, -s [*d.* Bitte] просьба, запыт; 2. калі ласка; **bítšrift** *m*, -n прашэньне, заява

• bite zejer зь вялікай ласкай
• zix vendn* mit a bite vegn epes зьвярнуцца з просьбай аб нечым

bíterer [*d.* bitter] горкі; **bíterlexer** прагорклы, ёлкі; **bíterlexvern*** (пра)горкнуць, (зь)ялчаць; **bíter(lex)kajt** *f*, -n, **bíterniš** *f/n*, -n гаркота, горыч; штосьці горкае; **bítern (zix)** засмуціць, засмучаць; **bítergefil** *n* гаркота, горыч; **bítergroz** *n bot.* палын; **biteršebebiter** [*s.* -שבשבית-] надта горкі

• a bitere kelt сабачы холад
• a biterer jung горкі юнак
• biter in ek горкі напрыканцы
• biter vi der tojt, vi gal, vi majn lebn горкі як сьмерць /жоўць, як маё жыцьцё (як палын/дым/перац/чэмер)
• biter(lex) vejnen горка плакаць
• bitere trern горкія сьлёзы
• der biterer gojrl горкая доля
• der biterer tam fun cešejdung горыч разлукі
• s'iz biter in mojl горка ў роце
• s'iz im gevorn biter in noz/pisk яму стала горка ў носе/роце
• beser a ziser tojt, ejder a biter lebn *glxv.* лепш салодкая сьмерць, чымся горкае жыцьцё
• vi dem klugn iz biter, iz dem nar alc frejlex *glxv.* што разумнаму горка, дурню ўсё ў радасьць

bitjúg *m*, -n біцюг

bitl *m* (cu) [*s.* בטל(י)] пагарда, пагардлівасьць, грэбліваць, грэбаваньне, недаацэнка; ануляваньне, (с)касаваньне [*sin.* gringšacung, faraxtung]; **bítldiker** пагардлівы, зьневажальны, зьняважлівы, ганебны; **bítl-baciung** *f* пагардлівыя, грэблівыя адносіны; **bítl-šmejxl** *m* пагардлівая ўсьмешка; **bítl-ton** *m* зьняважлівы тон; **bítlvort** *n*, *pl.* -verter пагардлівае, зьняважлівае слова

• bacien* zix mit bitl пагарджаць, грэбаваць
• farźmuren di ojgn far bitl прыжмурыць пагардліва вочы

bitle *f*, -s [*p.* butla, *ukr.* бутля] бутля

bitl-éjv(ó)rim *m* [*s.* בטל־אברים(י)] неадчуваньне ўласнага цела, страта прытомнасьці

bitl-hajéš *m* [*s.* בטל־היש(י)] адмаўленьне ад усяго матэрыяльнага, ад зямных інтарэсаў; аскетызм

bitl-tójre *m* [*s.* בטל־תורה(י)] грэх, які перашкаджае вывучэньню Торы, адрывае ад мілых богу заняткаў

bitmides [*s.* בתמידות →tomed] *adv.* працягла, пастаянна; **bitmídesdiker** працяглы, бясконцы; **bitmídes-zax** *f*, -n пастаянная, надзейная рэч

bitmie [*s.* בתמיה →tmie] *adv.* зьдзіўлена, са зьдзіўленьнем [*sin.* mit farvunderung]

bitmimes [*s.* בתמימות →tmimes] *adv.* наіўна, нявінна, бязьвінна [*sin.* naiverhejt, umšuldikerhejt]; **bitmímesdiker** наіўны, нявінны, бязьвінны

bitn* (gebitn) [*d.* bitten, bieten?] віншаваць; **biter** *m*, -s, (-n/*f*, -s) (па)віншавальнік

• bitn* gut-jomtev віншаваць са сьвятам

• gejn* gut-jomtev bitn ісьці ў адведкі на сьвята

bitnáj (az) [*s.* בתנאי →tnaj, tane, masne, getnaj, ojsbitnajen] *adv.* умоўна, з умовай, пры ўмове [*sin.* mitn bading]

• dercejln vel ix ajx, nor bitnaj, az cvišn undz zol es blajbn (Š.-A.) я вам раскажу, але з умовай, што гэта застанецца паміж намі

bito [*s.* בתה →bas] яе дачка

• "bito" iz a toxter "bito" – гэта дачка (кажуць таму, хто часта паўтарае: "ix bite"; *vrš.* "bito" – "bite" "калі ласка")

bitok *m*, *pl.* bitkes *kul.* біток

bitóxn (-ún) [*s.* (בטחון(-ות →(bal)betuex, balbitoxn, maftiex. спадзявацца, спадзявацца, спадзявацца, давер, спадзяванне, надзея на Бога [*sin.* gotron, gloibn, hofenung af got]; **bitxojnes** *n* [*s.* -ות] спадзяванне, надзея, спадзяванне

• [illegible] bitoxn, hot men af šabes *šprxv.* хто мае давер, [illegible] чым сустрэць суботу

• [illegible] cit cuto himi, koved cit cu der erd *šprxv.* давер цягне [illegible] неба, гонар цягне ў пекла (за пыха бог зь неба сьпіха; гордую пыху бог зь неба сьпіха)

• zajn/majn bitoxn iz cekroxn ягоная/мая надзея лопнула

bitxiłe-urxíme [*s.* בדחילו־ורחימו] "са страхам і любоўю"; *adv.* зь вялікай павагай, зь вялікім рэспэктам

bivxines=bifxines [*s.* בבחינת →bxine, mafxn] *adv.* у ролі, у катэгорыі, у сэнсе, у аспэкце

bixdéj (cu) [*s.* בכדי →kedej] *bndv.* каб, для таго, з мэтаю, з намерам; дзеля таго, каб... [*sin.* mitn cvek, mitn cil, az, kedej]

bixer *pl.* →bux *m*, *dim.* **bixl** *n*, -en кніга; **bíxerdiker**, **bixldiker** кніжны; **bíxernik** *m*, -es, (-nice *f*, -s) кнігалюб, бібліяфіл; **bíxer-almer** *m*, -s, **bíxer-šafe** *f*, -s кніжная шафа; **bíxer-kener** *m* бібліёграф; **bíxer-kenerái** *f* бібліяграфія; **bíxerkrom** *f*, -en кнігарня; **bixermark** *m*, *pl.* -merk кніжны кірмаш; **bíxer-pólice** *f*, -s кніжная паліца; **bíxertreger** *m*, -s кніганоша; **bíxernice** *f*, -s, **bíxervorem** *m*, *pl.* -verem сіняя панчоха, кніжны чарвяк

bixides=bejexides [*s.* ביחידות →joxed, jixed, mejaxed, misjaxed] *adv.* прыватна, адасобна, у адзіноце [*sin.* opgezundert, alejn]

• gedavnt hot er bixides, ejner alejn (Š.-A.) ён маліўся адасобна, сам сабе

bixlál=biklál [*s.* בכלל →klal, kojlel] *adv.* наагул, агулам, увогуле [*sin.* in algemejn, in ganc; *ant.* bifrat]

• er hot bixlal nit lib gehat kejn plapler ён наагул не любіў балбатуноў

• ot di bixer hot er bixlal nit gelejent вось гэтых кнігаў ён увогуле не чытаў

bixojles=bejexojles [*s.* ביכ(ו)לת →joxlen, (bal)jexojles] у стане, здатны, здольны (нешта зрабіць) [*sin.* in štand, feik (cu ton epes), mesugl]; **zajn* bixojles** (cu) быць у стане, здатным (нешта зрабіць)

bixšives [*s.* בחשיבות →x(a)šives, xošev] *adv.* шануючы, з пашанай/павагай/гонарам

bixtáv=biksáv [*s.* בכתב] *adv.* у пісьмовай форме

bixvojde-uveácme/bixvojdoj-uveácmoj *adv.* 1. [*s.* בכבודה ובעצמה] яна сама, уласнай пэрсонай, асабіста, пэрсанальна; 2. [*s.* בכבודו־ובעצמו] ён сам, уласнай пэрсонай, асабіста, пэрсанальна

bixvójd(ik)er/bixvéjd(ik)er [*s.* -בכבוד →(be)koved, kibed, kvod-, lixvojd, nixbed, mexubed, mexabed] пачэсны, паважны, шаноўны

• in bixvojdikn elter у паважным узросьце

biz/bizkł=bískele/biskl/biskn [*d.* bis] *prep.* да; **bizahér, bizdanen, bizdanet** дагэтуль, дасюль; **bizn=biz dem**; **bizíctiker, bizahériker** папярэдні, былы; **biz(kł)vanen /biz(kł)vanet=bis(kł)vanen/bis(kł)vanet=biz vanet/vanen** дакуль, пакуль, да тых часоў

• biz der milxome да вайны

• biz hajntikn tog да сёньняшняга дня

• biz ict да цяперашняга часу

• bizn hojz да хаты

• di bizaherike jedies папярэднія зьвесткі

• fun Vilne biz Kovne ад Вільні да Коўна

• gejn* biz Molev ехаць да Магілёва

Bizánc *n* [*d.* Bysantz] Бізантыя; **bizánt(ín)išer** бізантыйскі

bizarer [*d.* bizarr] дзіўны, дзівачны, дзівосны

bize *f*, -s [*eng.* busy] клопатны час, клопат, турбота, занятасьць, сьпешка

bizéjr-ánpin [*s.* בזעיר־אנפין] у мініятуры

bizman-hazé [*s.* בזמן־הזה →ojszmanen, zman] *adv.* у гэты час; **bizman-kórev** [*s.* -קריב] *adv.* *iron.* у кароткі час, хутка

bizmilxómediker [*s.* -מלחמה] даваенны, перадваенны

bizojen *m*, *pl.* bizjojnes [*s.* (בזיון(-ות →mevaze] ганьба, зьняважа, сорам [*sin.* balejdikung, faršemung]; **bize-bizójen** *m*, *pl.* bize-bizjójnes [*s.* (בזי־בזיון(-ות] вельмі моцная зьняважа, найвялікшы сорам; **bizójendiker** сарамлівы

• a finctere bizojen пякучы сорам

• fargesn* dem bizojen забыцца на сорам

• s'iz a buše mit a bizojen! сорам і ганьба!

• s'iz mir a bizojen cu zogn к майму сораму

• šteln cu bizojen, in bizjojnes асароміць, зьняважыць

drisken [*p*. tryskać, *ukr*. дристати] дрыстаць; ліцца, сьвістаць; **driscixe** *f* дрыстачка, дрыстун, мыт(уха), бягунка, ганячка, гнётка

• umtrajbn zol dix driscixe! *kll*. каб ты жыватом езьдзіў! каб це бягунка замучала!

drítiker [*d*. dritt] трацінны, трацічны; **drite** *n* трэцяе (дэсэрт); **drithalbn=drit halbn** два з паловай; (der) **driter** трэці; **dritl** *n*, -ex, **drít(-)xejlek** *m* [*s*. חלק-] трэць, траціна; **dritns** па-трэцяе

• cum dritn на трэцяе, на дэсэрт

• hob ix genumen špiln mitn gutn dritl, /fejgele, kecele majns, /hob ix gemuzt ojston dos karakulene hitl, /fejgele, kecele majns *flksl*. я пачаў гуляць з добрага траячка, кацянятка, птушачка мая, я мусіў зьняць смушковую шапку, кацянятка, птушачка мая

drixnen [*v*.] дрыхнуць

driz *f*, -n, **drize** *f*, -s [*d*. Drüse] *anat*. залоза; **drizl** *n*, -ex *anat*. гланда

drižblen [*r*. дрюлять, дрючить?] 1. *argo* дрыхнуць; 2. зьмяншацца; падаць

drob *m*, -n [*r*. дробь] *mat*. дроб

drobine=drab(in)e *f*, -s драбіны, калёсы, воз

drobne(r)=dribne(r) [*p*. drobny] дробны; **drobne** *n*, **drobnes** *pl*. дробязь, дробныя грошы; **drob(isk)e** *n*, -s драбяза, малеча; **drobiskes/drobiškes** *pl*. вантробы, грыбухі

• a drobner regn дробны дождж

droen=drejen (gedrót) (mit) [*d*. drohen, dräuen, *mhd*. dreun] пагразіць, пагражаць, страшыць; **dróendiker** грозны, пагражальны, пагрозьлівы; **droung** *f*, -en пагроза

• s'drot im a gefar яму пагражае небясьпека

droen (gedroet) [*r*. дрожать?] дрыжаць; **dróendiker** дрыжачы; **dróeniš** *f* дрыжаньне, дрыгота, дрыгаценьне, дрыготка, дрыжыкі, уздрыгі

droge *f*, -s [*r*. дроги] драбы

drojblen [*p*. drobić, *ukr*. дробити] драбіць; **drojb** *n*, **drojbe** *f* 1. (птушыныя) вантробы, бэбахі; *kul*. лівер, сальцісон; 2. дробязь, драбяза; дзятва; **drojbl** *n*, -ex частачка, часьцінка; **drójblmašin** *f*, -en *texn*. драбілка

drojsn [*d*. draussen] 1. *adv*. знадворку, на дворы; звонку; 2. *m*, -s двор, надворак; вонкавы выгляд; **drójs(nd)iker** 1. вонкавы, знадворны; 2. *m* неспэцыяліст, непрафэсіянал; **drójsndikajt** *f* вонкавасьць, зьнешнасьць; **drójsn-cu** *adv*. вонкі, на двор

• fun drojsn звонку, знадворку

• in drojsn на вуліцы

• mit di finger in drojsn (gejn) пальцамі на двор (чаравікі есьці просяць; бот разявіў зубы – есьці просіць)

• az s'iz in drojsn ▪ blote, frejen zix di šusters *glxv*. калі на двары гразь, радуюцца шаўцы (як гразь, дык шавец кладзь; калі на дарозе лёд, то кавалю мёд)

• In drojsn gejt a regn, /un in štub iz xmarne... /Ix hob gehat a tajere libe, /biter iz majne... *flksl*. На дворы ідзе дождж, а ў хаце хмарна... Дарагая мне была мая каханая, горкая мая любоў...

dron *m*, -en [*d*. Drohne] *zool*. труцень

dron=derón [*d*. daran] *adv*. да таго/гэтага/гэнага, аб гэтым/тым/гэным

drong *m*, *pl*. -en/-es/drenger, *dim*. **drengl** *n*, -ex [*p*. drąg] жэрдка, жардзіна, шост, дрын, кол; **drongač** *m*, -es *fig*. бамбіза, байбус, лагіза, мяжджула, дзыга, дрын, даўгяла, даўгаль, дылда

• a langer drong *fig*. доўгі дрын (доўгі як жэрдка, цыбаты /дзыбаты хлопец)

• a poc vi a drong, a pireg vi a flodn *glxv*. *vulg*. поц як дрын, потка як пірог

dronžek/drondžik *m*, -es [*p*. drążek] пераклaдзіна; турнік

• gejn* afn dronžek *kort*. прайграваць

• nemen* afn dronžek браць на работу; падманваць, ашукваць

drosl *m*, -en [*d*. Drossel] *zool*. дрозд

drosve *f*, -s [*ukr*. дрохва?] *zool*. драфа

droše *f*, -s [*s*. דרשה(ות) →daršenen, draš, druš] *rel*. прамова, казань(не); *hum*. прамова [*sin*. religjeze prejdikung; rede]; **dróše-gešank** *n* вясельны падарунак

• haltn* drošes (a droše) разглагольстваваць, раздабарваць, красамоўнічаць

• di hun hert dem hons droše un zuxt zix a kerndl prose *glxv*. курка слухае пеўневу казань, але шукае прасянае зерне

• me mejnt nit di droše, nor di bakoše *glxv*. думае не аб казані, але аб запатрабаванай плаце

• vi di droše, azoj iz di bakoše *šprxv*. якое казаньне, такая й плата (прапаведніку)

drot *m/n*, -n, *dim*. **dretl/dritl** *n*, -ex [*d*. Draht] дрот; **drótener** драцяны; **dróteven** аплятаць дротам; **drótarbet** *f* філі-

гранная работа; *fig.* каварства, падступніцтва; **drotcvang** *f texn.* пласкагубцы, абцужкі; **drót-farcamung /-farcojmung** *f*, -en драцяная агарожа; **drótlozer** бяздротавы; **drótvorem** *m*, *pl.* -verem/-verim *zool.* драцяны чарвяк
• durxfirn drotn (durx) правесьці/працягнуць дрот
• štexiker drot калючы дрот

droxim *pl.* →derex *m* [*s.* (ים-)דרך] шлях, спосаб, лад, манера

drozd *m*, -en [*p.* drozd, *r.* дрозд] *zool.* дрозд

drožen/droščen (in) [*p.* drżeć, *ukr.* дрижати] дрыжаць; **drož /drošč** *m* дрыжыкі, дрыготка, дрыжаньне

drožke/dronžke/droške *f*, -s [*p.* d(o)rożka, *r.* дрожки] дрожкі; **drožkaž** *m*, -es рамізьнік, фурман, (з)возчык, вазак, возьнік
• forn* af a drożke ехаць на дрожках

drubez *m* [?] балея, цэбар

druk *m*, -es, *dim.* **drikl** *n*, -ex [*p.* drąg, *ukr.* друк, дрюк] друк, дручок, шост
• hejbn* emecn af drukes узносіць, узьвялічваць кагосьці да нябёс (падняць на шчыт)

druk [*d.* Druck] 1. *m*, -n ціск, уціск, уцісканьне, прыціск; 2. *f*, -n друк; друкарня; **druker** *m*, -s друкар; **drukeráj** *f*, -en друкарня; **drúkeršer** друкарскі; **drukn** 1. друкаваць; 2. *tekst.* набі(ва)ць; 3. *n* перапіска (перапісваньне, перадрукоўваньне) на машынцы; **drúkbarer, drúkfe(j)iker** прыдатны да друку; **drúkbarkajt** *f*, **drúkfe(j)ikajt** *f* прыдатнасьць да друку; **drúkbojgn** *m*, -s друкарскі аркуш; **drúk-feler** *m*, -n/-s, **drúk-grajz** *m*, -n друкарская памылка; **drúkrext** *n* аўтарскае права, капірайт; **drúktop** *m*, *pl.* -tep скараварка; **drúkvezn** *n* друк, пячаць, паліграфія; **drúkzax** *f*, -n друкаваны матэрыял
• arojs fun druk выйсьці з друку
• gejn* in druk ісьці ў друк
• opgebn* in druk здаць у друк

drum=derúm=dorem [*d.* darum] 1. *adv.* таму; 2. *m* прычына, падстава

drumlen [*d.* trummeln] барабаніць, тарабаніць, грука(та)ць; **druml** *f*, -en барабан
• drumlen epes emecn in kop мець цьмянае ўяўленьне аб нечым

druš *m*, -im [*s.* (ים-)דרוש →daršenen, draš, droše] тлумачэньне біблейскіх або талмудычных тэкстаў у вуснай манеры (нелітаральна); казань(не)

družine *f*, -s [*p.* družina] дружына

dšoim-/čoim-vasóvim *pl.* [*s.* רשאים־ועשבים] травы і карэньне, зёлкі, зельле [*sin.* grozn un krajter]

du (*dat.* dir, *ak.* dix) [*d.* du] ты; **ducn/duken** тыкаць (называць на "ты")
• du vest mix hobn cu gedanken! ты ў мяне папомніш!
• zix ducn mit emecn (zajn* mit emecn far du) быць на "ты" (запанібрата) з кімсьці
• zoł ix azoj visn fun dir, vi du – fun a gut jor! *kll.* каб я цябе так ведаў, як ты – добрае жыцьцё!

dub *m*, -n/-es *bot.* дуб; **dubove(r)** дубовы

dubelirer *m*, -s [*p.* jubiler] ювэлір

dubin(k)e *f*, -s дубіна, дручок

dubltove(r) [*p.* dubeltowy, *d.* doppelt] двайны, падвойны, двойчаты, дубальтовы; **dúbltfencter** *m/n* падвойная рама (вакно)

Dubne г. Дубна (Украіна)
• er darf hobn a menčn vi der dubner tajx *glxv.* яму патрэбны чалавек як рацэ ў Дубне (лічылася, што рака ў Дубне штогод праглынае людзей)

duden [*ukr.* дудити] дудзець; **dude** *f*, -s [*p.* duda] 1. **dúdlzak** *m*, *pl.* -zek дуда; 2. **dudke** *f*, -s дудка, жалейка; **dúdl-fojgl** *m*, *pl.* -fejgl *zool.* [*p.* dudek] удод
• haltn* zix mit der dude расхлябваць кашу
• farvos fajft der dales? – vajl er hot nor a dude! *glxv.* чаму сьвісьціць галеча? – таму што яна мае толькі дуду!
• fun der xupe cu der sude /halt zix, halt zix mit der dude, /es iz šojn farfaln *ftksl.* ад вянца да вясельнага банкету расхлябваць кашу, усё ўжо прапала

(d)ufen (af) [*p.* dufać] спадзявацца, разьлічваць, пакладаць/мець надзею

duft *m*, -n [*d.* Duft] 1. водар, пахошчы, добры пах, духмянасьць; 2. пára, параваньне, выпарэньне; **dúftiker** духмяны, пахучы; **duftn** пахнуць

dugme *f*, *pl.* dugmoes [*s.* (ות-)דוגמא →ledugme] прыклад, узор [*sin.* bajšpil, muster]

duhe=dehe *f*, -s [*p.* duga, duha, *ukr.* дуга] дуга (конская збруя)

dujen (zix) [*p.* dąć się, *r.* дуться] дзьмуцца, надзьмуць вусны

dukes *m*, *pl.* dúk(e)sim [*s.* (ים-)דוכ(ו)ס] князь, граф [*sin.* firšt, graf]; наймя графа Валянціна Патоцкага (г. Вільня, XVIII ст.); **dukse** *f*, -s [*s.* (ות-)דוכסה] княгіня, графіня, прынцэса

dul *m* [*mhd.* tol, dol] дурнота, шал, глум, дур; **duln** дурыць, тлуміць, марочыць; **dul vern*** адурэць; **dulkajt** *f*, **dúleniš** *n*, -n зьбянтэжанасьць, разгубленасьць; **duler** вар'яцкі, дурны, шалёны; **dúlhojz** *n*, *pl.* -hajzer вар'яцкі дом
• duln emecn a spodik/kop (dem mojex) дурыць камусьці галаву
• duln emecn in di ojern пратрубіць камусьці вушы, напець камусьці ў вушы
• er hot mir gedult majn kop ён затлуміў мне галаву
• maxn emecn dul un mešuge абдурыць кагосьці (задурыць, затлуміць галаву)
• der kop iz dul, der bojx iz ful, der mogn vejst nit fun epes cu zogn *glxv.* галава дурная, трыбух поўны, страўнік ня ведае, што й казаць (абжора і п'яніца)
• dul im, er iz a guter-bruder *glxv.* дуры яму галаву, ён жа сябра

duldn [*d.* dulden] цярпець, зносіць, трываць, вытрымліваць; **duldung** *f* цярпеньне, датрыманьне, трудаваньне

dulmón *m* [*r.* дурман, *d.* Mohn?] *bot.* дурнап'ян

duluben=d(a)luben [*p.* dłubać, *ukr.* длубати] калупаць, дзяўбці

dume *f*, -s [*p.* duma] 1. дум(к)а; 2. "дума", жыдоўскі народны танец; **dumen** думаць
• Xackele, Xackele, špil że mir a dume, –/ хоч an oreme, abi a mume! *ftksl.* Хацкелю, Хацкелю, зайграй жа мне "думу", – хоць і бедная, але ж цётка!

dumer [*d.* dumm] бязглузды, неразумны, на розум небагаты; **dumhajt** *f* дурата, дурота, дурнота, дурны розум, блазнота, глупства

dumper [*d.* dumpf] глухі; **dúmpiker** заглушаны
• a dumper konsonant *lingv.* глухі зычны

Dunaj *m* [*d.* Donau] рака Дунай

dunam [dönüm] мера плошчы, якой карыстаюцца ў Палестыне і Ізраілі (22 акры)

duner *m*, -n/-s [*d.* Donner] гром; **dúnern** грымець; **dúner(n)-diker** грамавы; **dúner-geknal** *n*, **dúner-klap** *m*, *pl.* -klep, **dúner-knaln** *pl.* грукат, перакаты грому; **dúneroplejter** *m*, -s громаадвод
• s'dunert гром грыміць
• s'hot a duner geton грымнуў гром
• vi a duner inmitn heln tog як гром пасярод яснага дня
• vi a duner zol geven trefn як громам стукнуты
• a duner af dir! *kll.* каб цябе пярун забіў (а маланка пяты пашчапала)!
• a duner dir in di zajtn arajn! *kll.* громам па жываце, маладнёю па кішкох!
• a duner hot mix getrofn/deršlogn! разьбі мяне гром!
• az a menč kumt arajn in hic, hert er nit dem duner, zet er nit dem blic *glxv.* калі чалавек распаляецца, ён ня чуе грому і ня бачыць маланкі
• az se dunert in vinter, iz der simen fun a zol *folk.* калі зімою гром грыміць – будзе дастатак (усё будзе танным)
• es meg dunern un blicn *glxv.* хай хоць сабе гром грыміць і маланка блішча (што б там ні было)
• trefn zol dix der erster duner! *kll.* каб цябе першы пярун [illegible]!
dunice=dinice *f*, -s [*ukr.* дійниця, *r.* дойница] даёнка
dunklen=tunklen [*d.* dunkeln, *mhd.* tunkeln] цямнець
dunst [*d.* Dunst] пара, параваньне, выпарэньне, туман
dupe *f*, -s [*p.* dupa, *ukr.* дупа] срака, дупа, задніца
duren [*p.* durzyć, *ukr.* дуріти] 1. дурыць; 2. *m*, *pl.* durnjes, **durák** *m*, -es дурань; **durakes** *pl. kort.* дурань (гульня)
• duren emecn dem kop дурыць камусьці галаву
durmen [*šp.* durmir, dormir, *it.* dormire] спаць
durštn=dorštn=darštn (nox) [*d.* dürsten] смагці, смагнуць, прагнуць; **duršt=doršt=daršt** *m*, **dúrštikajt** *f* [*d.* Durst] смага, прага; **dúrštiker=dórštiker** (са)смаглы, прагны; **durštik=dorštik zajn*** смагці, хацець піць
• durštiker najger прагная цікавасьць
• – Durštik majn mejdele? Mid iz majn klejninke? /Ci meg men zi nemen bam hant? /Ci meg men zi gletn? /Ci meg men zi kušn? /Ci meg men nor... trala-la-la... (Z. Š.) Хочаш піць? Стамілася, мая маленькая? Ці можна яе ўзяць за руку? Ці можна яе пагладзіць? Ці можна яе пацалаваць? Ці можна толькі... траля-ля-ля...
durx=dorx [*d.* durch] *prep./adv.* праз(ь), цераз, скрозь; **durxn=durx dem**; **durx-un-dúrx=durx un durx** *adv.* наскрозь; **dúrxiker** скразны; **durxundúrxiker** які праходзіць скрозь
• af durx un durx ушчэнт, наскрозь
• durx dem праз гэта, паводле гэтага, такім чынам
dúrx- [*d.* durch-] *knv./pref.* пра-, пера- (паказвае на: 1. праход празь нешта; 2. пераадольваньне перашкоды; 3. пашкоджаньне; 4. дзеяньне на працягу пэўнага часу; 5. завершанасьць дзеяньня; 6. падзел, разбурэньне)
dúrxajln [*d.* durcheilen] прайсьці, праходзіць (хутка)
dúrxakern [*d.* durchackern] пера-, пра|(г)араць, пера-, пра|ворваць; **dúrxakerung** *f* пераворваньне, праворваньне; **dúrxaker-kultur** *pl.* прапашныя, абганяльныя культуры
durxanánd(er) [*d.* durcheinander] *adv.* уперамежку, наперамену, усьцяж, без разбору, як трапіць; **durxanándiker** безупынны, бесьперапынны
• – Ix hob zix šojn gelozt in veg arajn forn, /un geforn bin ix dox axt teg durxanand, /un in vos far a štetele ix bin arajngeforn, /iz mir ojsgekumen ojsštrekn di hant. *flksl.* Я ўжо выбралася ў дарогу, ехала восем дзён усьцяж і ў кожным мястэчку, куды я прыяжджала, мне прыходзілася працягваць руку.
dúrxarbetn [*d.* durcharbeiten] пера-, а|працаваць, пера-, а|працоўваць, прарабіць, прароблiваць; **dúrxarbetung** *f* апрацаваньне
dúrxbajsn* [*d.* durchbeissen] пракусіць, пракусваць
dúrxblanken [*mhd.* blanken] праблiснуць, праблiскваць
dúrxbletern [*d.* blättern] пера-, пра|гартаць, пера-, пра|гортваць (бегла прачытваць)
dúrxblicn [*d.* durchblitzen] пранесьціся, пранасіцца як маланка
• s'hot durxgeblict a gedank думка мільганула
dúrxblikn zix [*d.* durchblicken] абмяняцца, абменьвацца позіркамі; **dúrxbliklexer** празрысты
dúrxblondžen [*p.* błądzić] праблукаць, праблудзіць, заплутацца
dúrxblozn* [*d.* durchblasen] праду(ва)ць, прадзьмуць, прадзьмухаць, прадзімаць
• s'iz im nit durxcublozn яго не прадзьмеш (пра ганарліўца)
dúrxbo(j)ern [*d.* durchbohren] прасьвідраваць, прасьвідроўваць, прасьвярдліць, прасьвердліваць
dúrxbojkern/dúrxbejkern [?] зь-, на|бі(ва)ць (моцна)
dúrxbrenen [*d.* durchbrennen] прагарэць, прагараць; прапаліць, прапальваць, прапячы, прапякаць
dúrxbrexn* [*d.* durchbrechen] праламаць, праломліваць, прабі(ва)ць; **dúrxgebroxn vern*** праламіцца; **dúrxbrux /dúrxbrox** *m*, -n пралом
dúrxbrodjen [*p.* brodzić] перабрысьці, перайсьці, пераходзіць у брод
dúrxbrotn* [*d.* durchbraten] прапячы, прапякаць, прасмажыць, прасмажваць
dúrxcien* [*d.* durchziehen] пра-, за|цягнуць, пра-, за|цягваць; прасунуць, прасоўваць
dúrxcviten [*ukr.* цвісти, *v.* цьвісьці] прарасьці, прарастаць
durxdém [*d.* durch dem] *adv.* праз гэта, з-за/паводле гэтага
dúrxdenken [*d.* durchdenken] прадум(в)аць, абмеркаваць, абмяркоўваць, разважыць, разважваць
dúrxdojben [*r.* долбить] прадзяўбці, прадзяўбаць
dúrxdrejen [*d.* durchdrehen] пракруціць, пракручваць
• es drejen zix durx file menčn круціцца/мітусіцца цэлы натоўп
dúrxdreljeven [*d.* drillen] прасьвідраваць, прасьвідроўваць, прасьвярдліць, прасьвердліваць
dúrxdremlen [*p.* drzemać, *ukr.* дрімати] прадрамаць
dúrxdrikn zix [*d.* durchdrücken] працiснуцца, працiск(в)ацца
dúrxdringen*, **dúrxcudringen*** [*d.* durchdringen] 1. пранікнуць, пранікаць; праніз(в)аць; 2. *n* пранікненьне, праніканьне; **dúrxdringlexer** 1. **dúrxdring(end)iker** праніклівы, уніклівы, пранізьлівы (погляд); 2. пранікальны, прапушчальны; **dúrxdringlexkajt** *f* праніклівасьць, уніклівасьць; 2. пранікальнасьць, прапушчальнасьць; **dúrxdring(end)ikajt** *f*, **dúrxdrung** *m* праніклівасьць, уніклівасьць
• nit durxcudringen непранікальны
dúrxegbern [*mhd.* negeber, negebor] прасьвярдліць, прасьвердліваць, прасьвідраваць, прасьвідроўваць
dúrxekzamenirn [*d.* examinieren] праэкзамэнаваць

dúrxesn* [*d.* durchessen] праесьці, праядаць; прадзіравіць, прадзіраўліваць
dúrxfajfn* [*d.* pfeifen] прасьвіст(в)аць
dúrxfajln [*d.* durchfeilen] прапілаваць, прапілоўваць (напільнікам)
dúrxfajxtn [*d.* durchfeuchten] прамокнуць, прамакаць, прамякнуць, прамякаць
dúrxfaln* (iz dúrxgefaln) [*d.* durchfallen] праваліцца, правальвацца; **dúrxfal** *m*, -n правал
dúrxfarher *m*, -n [*d.* Verhör] перакрыжаваны допыт
dúrxfeln [*d.* fehlen] прапусьціць, прапускаць; (з)рабіць пропуск/прабел
dúrxfiln [*d.* durchfühlen] прачуць
dúrxfiln [*d.* füllen] перапоўніць, перапаўняць
dúrxfiltern, dúrxfiltrirn [*d.* durchfiltrieren] прафільтраваць
dúrxfirn [*d.* durchführen] 1. правесьці, правадзіць, праводзіць, суправаджаць; правезьці, правозіць; 2. *n*, **dúrxfir** *m*, -n, **dúrxfirung** *f*. -en правоз; правядзеньне, праводка; **dúrxfirer** *m*. -s праваднік; **dúrxfirlexer** ажыцьцявімы, зьдзяйсьняльны; **dúrxfirlexkajt** *f*; **dúrxfir-fe(j)ikajt** *f* праваднасьць
• durxfirn farbaj правесьці міма
• durxfirn in lebn ажыцьцявіць, зьдзейсьніць
• durxfirn mit der hant iber di hor правесьці рукой па валасох
dúrxflatern [*d.* flattern] пранесьціся, праносіцца, пралящець, пралятаць, праімчацца, прашугаць
dúrxflejcn [*d.* durchfliessen] працячы, працякаць
dúrxflextn* (**zix**) [*d.* durchflechten] пераплесьці, пераплятаць; **dúrxflextung** *f* пераплёт, перапляценьне
dúrxflien* [*d.* durchfliegen] праляцець, пралятаць
• afile az a fejgele flit durx, lozt es ojx a federl *šprxv.* нават калі птушка праляціць, такі пёрка згубіць
dúrxflisn* [*d.* durchfliessen] працячы, працякаць; **dúrxflus** *m*, -n пратока
dúrxfojln [*d.* durchfaulen] прагні(ва)ць
dúrxforn*, dúrxcuforn* [*d.* durchfahren] 1. праехаць, праяжджаць; 2. *n* праезд (дзеяньне); **dúrxfor** *m*, -n праезд (месца); транзыт; **dúrxforer** *m*, -s падарожны (пра чалавека); **dúrxfor(evd)iker, dúrxforndiker** праезны
• durxforn* farbaj праехаць міма
• nit durxcuforn непраезны
dúrxforšn [*d.* durchforschen] дасьледаваць (дасканала); разьведваць; **dúrxforšung** *f*. -en дасканалае дасьледаваньне, вывучэньне
dúrxfresn* [*d.* durchfressen] праесьці, праядаць, прагрызьці, прагрызаць; праржавець
dúrxfrirn* [*d.* durchfrieren] прамерзнуць, прамярзаць
dúrxgalopirn [*d.* galoppieren] прагалапіраваць, праскакаць наўгалёп, пра(і)мчацца
dúrxgang *m*, *pl.* -en/-geng [*d.* Durchgang] пераход, пярэйсьце, праход; **dúrxgangcimer** *m*. -n прахадны пакой; **dúrxganghojf** *m*, -n прахадны двор
dúrxganv(en)en* zix [*s.* -גנב- →ganev] пракрасьціся, пракрад(в)ацца
dúrxgebrent vern* [*d.* durchgebrannt] прагарэць, прагар(в)аць
dúrxgebroxn vern* [*d.* durchgebrochen] праламацца, праломлівацца
dúrxgecejlemter [*s.* -צלמ- →cejlem] перакрыжаваны (крыж-накрыж)
dúrxgefalener [*d.* durchgefallen] які праваліўся
dúrxgefetster [*d.* fett] прамасьлены
dúrxgefojlter [*d.* durchgefault] прагнілы; **dúrxgefojlt vern*** прагні(ва)ць
dúrxgefrojrener [*d.* durchgefroren] прамерзлы; **dúrxgefrojrn vern*** прамерзнуць, празябнуць
• durxgefrojrn vern* af durx un durx прамерзнуць наскрозь (да касьцей)
dúrxgegesener [*d.* durchgegessen] праедзены, зьедзены
dúrxgehakter [*d.* durchgehackt] прасечаны
dúrxgejn*, dúrxcugejn* [*d.* durchgehen] 1. прайсьці, праходзіць; мінуць, мінаць; 2. *n* праход (дзеяньне); **dúrxgejer** *m*, -s прахожы, падарожны; **dúrxgejevdiker** прахадны
• durxgejn* farbaj прайсьці міма
• nit durxcugejn непрахадны
• s'iz nit durxcugejn, nit durxcuforn ні прайсьці, ні праехаць
• gearbet hostu af Soborne ploščad, /gevojnt lebn jidišn špitol, /du flegst dox durxgejn ale tog lebn majne fencter, /kum arajn cu mir xoč nox ejn mol *flksl.* ты працаваў на Саборнай плошчы, жыў каля жыдоўскай бальніцы, ты кожны дзень праходзіў ля майго вакна, зайшоў бы да мяне хоць яшчэ адзін разок
dúrxgekontrolirter [*d.* gekontrolliert] пракантраляваны, праверaны
dúrxgelejenter [*šp.* leer] прачытаны
dúrxgelexerter [*d.* löcherig] прадзіраўлены
dúrxgelozter [*d.* durchgelassen] прапушчаны
dúrxgemaxter [*d.* durchgemacht] прароблены
dúrxgenecter [*d.* durchgenezt] прамочаны; **dúrxgenect vern*** прамокнуць, прамакаць
dúrxgenglexer [*d.* durchgängig] праходны
dúrxgeprieter [*d.* gebrühet] 1. прапацелы, успатнелы, (у)спацелы, уваўрэлы; 2. упрэлы (аб ежы)
dúrxgepruvter [*d.* durchgeprüft] праверaны
dúrxgerisener [*d.* durchgerissen] прарваны, прадраны, прадзёрты; **dúrxgerisn vern*** прарвацца, прадрацца, прадзерціся
dúrxgesarfet vern* [*s.* -שרפ- →srejfe, nisref, (far)sarfen] прагарэць, прагар(в)аць
dúrxgešnitener [*d.* durchgeschnitten] перасечаны
• a durxgešnitene gegnt перасечаная мясцовасьць
dúrxgešosener [*d.* durchgeschossen] прастрэляны
dúrxgetraxter [*d.* getracht] прадуманы
dúrxgetribener [*d.* durchgetrieben] 1. прагнаны; 2. практычны, бывалы, хітры, пранырлівы
• a durxgetribener paršojn прайдзісьвет, прайдоха, праныра
dúrxgevalgerter [*d.* gewälgert] правалены
dúrxgevebter [*d.* durchgewebt] пранізаны, пралыганы
dúrxgevejkter [*d.* durchgeweicht] прамоклы; прамочаны
dúrxgezapter [*d.* gesaugt] прасякнуты, насычаны, прамочаны; **dúrxgezapt vern*** прасякнуцца, насыціцца, насычацца, прамокнуць, прамакаць
dúrxgisn* [*d.* durchgiessen] пралі(ва)ць (празь нешта)
dúrxglanc *m*, -n [*d.* durchglänzen] пробліск, проблісь
dúrxgličn zix [*d.* glitschen] прасьлізнуць, пракаўзнуць, прамкнуцца
dúrxgrobn* [*d.* durchgraben] пракапаць, пракопваць
dúrxgus/dúrxgos *m*, -n [*d.* Durchguss] праліў; пратока
dúrxhakn [*d.* durchhacken] 1. прабі(ва)ць, прарубіць, пра-

рубаць, пра-, пера|сячы, пра-, пера|сякаць; 2. *n* праходка (горная прамысловасьць)

dúrxhaltn* [*d.* durchhalten] упарціцца, упірацца

dúrxheftn* [*d.* durchheften] праніз(в)аць

dúrxhejcn [*d.* durchheizen] прапаліць, прапальваць

dúrxhilxn [*d.* hell] прагучаць

dúrxhobn* [*d.* durchhaben] мець на сваім вяку, перажыць, адолець, асіліць, здужаць; прайсьці, прачытаць

dúrxhojf *m*, -n [*d.* Hof] прахадны двор

dúrxhrizen [*p.* gryźć, *ukr.* гризти] прагрызьці, прагрызаць

dúrxjetn [*d.* jäten] прапалоць, (па)праполваць; **dúrxjetung** *f* праполка

dúrxjogn [*d.* durchjagen] пра-, вы|гнаць, пра-, вы|ганяць; пранесьціся, праносіцца, пра(й)мчацца

dúrxkačen [*ukr.* качати] пракаціць, пракочваць, пракатваць

dúrxkajklen [*d.* gaukeln, *mhd.* kugelen, kegelen?] пракаціць, пракочваць, пракатваць

dúrxkajln [*d.* kehlen] даць дыхту/чосу, пабіць

• [illegible] намуляць/намацаць бакі (добра пабіць)

[illegible] карас, *ukr.* ка́пати] пракáпаць (кропля за [illegible]

[illegible] кататися, *r.* кататься] пракаціць; **dúrx**[illegible] пракаціцца, праехацца, праяжджацца

[illegible] durchkämmen] прачасаць, прачэсваць

[illegible] kennen] правед(в)аць, давед(в)ацца (да [illegible] дазна(ва)цца

dúrxklajbn* **zix** [*d.* durchklauben] праб(і)рацца

dúrxklapn [*d.* klappen] прабі(ва)ць

dúrxkletern [*d.* durchklettern] пралезьці, пралазіць

dúrxklingen* [*d.* durchklingen] празьвінець, прагучаць

dúrxknejčn [*mhd.* knitschen, knautschen] прамяць; *fig.* уважліва прачытаць

dúrxknetn* [*d.* durchkneten] прамясіць, прамешваць

dúrxkontrolirn [*d.* durchkontrollieren] пракантраляваць, праверыць, правяраць, надгледзець, надглядаць, дасьцерагчы, дасьцерагаць; **dúrxkontrolirung** *f* праверка, кантроль, надгляд, дасьцярога

dúrxkoregirn [*d.* korrigieren] пракарэктаваць

dúrxkoxn [*d.* durchkochen] праварыць, праварваць

dúrxkrejcn [*d.* durchkreuzen] перасячы, перасякаць, перацяць, перацінаць, перарэзаць, пераразаць (накрыж)

dúrxkrign* (**zix**) (durx) [*d.* durchkriegen] 1. прасунуць, выцягнуць; 2. выхадзіць, дагледзець (хворага)

dúrxkrign zix [*d.* Krieg] пасварыцца

dúrxkrixn* (durx) [*d.* durchkriechen] прапаўзьці, прапаўзаць, пралезьці, пралазіць; **dúrxkrixer** 1. *m*, (-n *f*, -s) праныра, пройда, прайдзісьвет; 2. пранырлівы, спрытны

dúrxkukn (durx) [*d.* durchgucken] 1. прагледзець, праглядаць; 2. *n*, **dúrxkuk** *m*, -n прагляд, агляд, інспэкцыя

dúrxkumen*, **dúrxcukumen*** [*d.* durchkommen] 1. прайсьці, праходзіць, праб(і)рацца; 2. перанесьці, пераносіць, пра-, пера|цярпець, перабы(ва)ць; 3. абысьціся, абыходзіцца; 4. згаварыцца, згаворвацца, дамовіцца, дамаўляцца, (па)мірыцца; **dúrxkum** *m*, -en, **dúrxkumeniš** *n* згода, пагадненьне

• hert uf cu krign, kumt durx! будзе сварыцца, давай памірымся!

• kojm af durxcukumen ледзь абышлося

• vi-s'nit-iz durxkumen* mit der hojcoe сяк-так перабівацца (з хлеба на квас)

dúrxkvečn [*d.* durchquetschen] праціснуць, праціскаць, працерці, праціраць (бульбу)

dúrxlajdn* [*d.* leiden] працярпець, выцерпець, ператрываць

dúrxlajtern [*d.* durchläutern] ачысьціць, ачышчаць; **dúrxlajtern zix** распагоджвацца, распагодзіцца

dúrxlajxtn*=**dúrxlojxn*** прасьвяціць, прасьвечваць, прасьвечвацца; **dúrxlajxtiker** які прасьвечвае; **dúrxlajxtung** *f med.* прасьвечваньне

dúrxlaksirn [*p.* laksa?] паносіць, прасрацца, прадрыстацца

dúrxlebn [*d.* durchleben] пра-, пера|жы(ва)ць; **dúrxlebn zix** (неяк) зарабляць на жыцьцё, перабі(ва)цца

• kojm zix durxlebn ледзьве перабівацца

dúrxlejenen [*šp.* leer] прачыт(в)аць

dúrxlejgn [*d.* legen] 1. пралажыць, пракласьці, праклад(в)аць; 2. *n* пракладка, праклад(в)аньне

dúrxlernen [*d.* lernen] праштудзіраваць

• durxlernen ganc šas iz a grojse zax, durxlernen ejn mide iz a gresere zax спазнаць увесь Талмуд – вялікая справа, прыдбаць адзін добры звычай – яшчэ большая справа

dúrxléxern, **dúrxlexlen** [*d.* durchlöchern] прадзіравіць, прадзіраўліваць; **dúrxlexerung** *f*, -en *med.* прарыў, прарываньне

dúrxlezn [*d.* durchlesen] прачыт(в)аць

dúrxlojfn* [*d.* durchlaufen] прабегчы, прабягаць; **dúrxlojf** *m* прабег

dúrxlojgn [*d.* Lauge, *p.* ług] пралугаваць, прамы(ва)ць у лузе

dúrxlojxtn*=**dúrxlajxtn*** [*d.* durchleuchten] прасьвяціць, прасьвечваць, прасьвечвацца; **dúrxlojxtiker** які прасьвечваецца; **dúrxlojxt** *m*, -n прасьвет, пробліск

dúrxlojzn [*d.* Laus] вышукваць, шукаць (вычэсваць) вошы

dúrxlozn* [*d.* durchlassen] 1. прапусьціць, прапускаць; 2. дараваць, вы-, пра|бачыць, вы-, пра|бачаць, прасьціць, прашчаць; 3. *n* пропуск (дзеяньне); **dúrxloz** *m*, -n пропуск (у тэксьце); прагул, ненаведваньне; **dúrxlozfe(j)ikajt** *f* прапускная здольнасьць; **dúrxlozpunkt** *m*, -n прапускны пункт; **dúrxloz-šajn** *m*, -en пропуск (дакумэнт)

• durxlozn* farbaj прапусьціць міма

dúrxluftern [*d.* durchlüften] 1. праветры(ва)ць; 2. *n*, **dúrxlufterung** *f* праветрываньне

dúrxmarširn [*d.* durchmarschieren] прамаршаваць

dúrxmaxn [*d.* durchmachen] 1. прарабіць, прарабляць; 2. пра-, пера|жы(ва)ць

dúrxmekn [*s.*?] выкрасьліць, выкрэсьліваць, выкасаваць, выкасоўваць

dúrxmestn* [*d.* durchmessen] пера-, пра|мер(в)аць; **dúrxmester** *m*, -s 1. вымяральнік, вымернік, прамернік; 2. *mat.* прамер, дыямэтар

dúrxmistikn [*d.* misten] угнаіць, угнойваць

dúrxmišn [*d.* durchmischen] пера-, пра|мяшаць, перамешваць

dúrxnecn [*d.* durchnässen, netzen] 1. прамачыць, прамокнуць, прамакаць; 2. працячы, працякаць

dúrxnejen [*d.* durchnähen] прашы(ва)ць

dúrxnemen* [*d.* durchnehmen] праб(і)раць, праняць, праймаць; **dúrxnem(end)iker** пранізьлівы (вецер)

• duxnemen* af durx un durx праняць наскрозь (да касьцей)

• durxnemen* mit di ojgn пранізваць/сьвідраваць вачыма

dúrxništern [?] абшук(в)аць, агледзець, аглядаць, перары(ва)ць

dúrxnodlen [*d.* nadeln] пракалоць, праколваць, праткнуць, пратыкаць (іголкай)

dúrxnumerirn [*d.* numerieren] пранумараваць, пранумароўваць

durxójs [*d.* durchaus] *adv.* усюды, заўсёды; усьцяж, суцэльна, безупынку, безупынна, безь пярэрвы; **dúrxójsiker** суцэльны, безупынны, бесьперастанны; **durxójsikajt** *f* безупыннасьць, бесьперастаннасьць

• durxojs nit зусім не, ані(як), ні ў якім разе, ніякім чынам

dúrxpačn [*d.* Patsche, durchpeitschen] адшлёпаць, надаваць аплявух

dúrxparen [*p.* para, *ukr.* парити] прапарыць, прапарваць

dúrxpikn [*d.* picken] прадзяўбці, прадзёўб(в)аць, прадзяўбаць, прадзюбаць

dúrxrajbn* [*d.* durchreiben] працерці, праціраць

dúrxrajsn* [*d.* durchreissen] 1. прар(ы)ваць; 2. *n*, **dúrxrajs** *m*, -n прарыў (дзеяньне)

dúrxrajtn* [*d.* reiten] праехаць, праяжджаць, праскакаць (верхам на кані)

dúrxrajzn [*d.* durchreisen] праезьдзіць, праехаць, праяжджаць; **dúrxrajze** *f* падарожжа, аб'езд; **dúrxrajzn-der** *m*, -ne падарожны, праежджы, праезджы

dúrxregenen [*d.* durchregnen] прайсьці, праліцца дажджом

dúrxre(j)dn* **(zix)** (mit) [*d.* reden] пера-, па|гаварыць, перагаворваць, пагутарыць

dúrxrejnikn [*d.* reinigen] прачысьціць, прачышчаць

dúrxrevidirn [*d.* revidieren] 1. праглядзець, пракантраляваць; 2. *n* прагляд, рэвізія

dúrxrexenen [*d.* durchrechnen] падлічыць, падлічваць

dúrxrinen* (durx) [*d.* durchrinnen] працячы, працякаць

dúrxrocn [*d.* durchrosten, *mhd.* rozen] праржавець

dúrxrojšn [*d.* durchrauschen] прашумець

dúrxrukn [*d.* rücken] прасунуць, прасоўваць

dúrxsamen [*s.* -סַם- →sam] пратруціць, пратручваць

dúrxsilen [*v.* сіляць?] прасунуць, прасоўваць; зацягваць, зацягнуць

dúrxšajern [*d.* durchscheuern] вышараваць, прачысьціць, прамы(ва)ць (дасканала)

dúrxšajnen [*d.* durchscheinen] прасьвяціць, прасьвечваць; **dúrxšajn** *m*, -en прасьвет, прагал

dúrxšarn zix [*d.* scharren] прасьлізнуць, пракаўзнуць, прамкнуцца, праб(і)рацца

dúrxšifn [*d.* durchschiffen] перавезьці, перавозіць (на лодцы/чоўне); **dúrxšifn zix** праехацца (на лодцы)

dúrxšikn [*d.* schicken] перас(ы)лаць

dúrxšimlen [*d.* schimmeln] працьвісьці, праплесьнець, праб росьнець

dúrxšisn* [*d.* durchschiessen] прастрэліць, прастрэльваць

dúrxšlajdern [*d.* schlaudern] шпурляць, швыраць (празь нешта), перакінуць, перакід(в)аць

dúrxšlajxn* zix [*d.* durchschleichen] пракрасьціся, пракрад(в)ацца, прашмыгнуць, прашмыгваць

dúrxšlak *m*, -n [*d.* Durchschlag] друшляк

dúrxšlepn [*d.* durchschleppen] правалачы, працягнуць, працягваць

dúrxšlitlen zix [*d.* schlitteln] праехацца на санях

dúrxšlofn* [*d.* durchschlafen] пра-, па|спаць, выс(ы)пацца

dúrxšlogn* [*d.* durchschlagen] прабі(ва)ць (наскрозь); **dúrx-šlog** *m*, -n прабой; друшляк

• mit di elnbojgn kon men zix amol durxšlogn a veg, nor vajt vestu nit avekgejn *śprxv.* лакцямі можна прабіць сабе дарогу, але далёка ня зойдзеш (круцьцю – непаварацьцю)

• a menč mit gute manirn šlogt zix durx durx ale tirn *glxv.* чалавек з добрымі манерамі праходзіць праз усе дзьверы

dúrxšmajsn* [*d.* schmeissen] 1. выхлестаць, высьцебаць, набіць, адлупцаваць; 2. выгнаць, вышвырнуць

dúrxšmekn [*d.* durchschmecken] пранюх(в)аць

dúrxšmuesn (zix) (mit) [*s.* שמו(ע)ס-] перагаварыць, перагаварваць, паразмаўляць, пагутарыць, вытлумачыць, вытлумачваць; **dúrxšmues** *m*, -n размова

dúrxšmuglen [*d.* durchschmuggeln] правесьці (кантрабандай), працягнуць; **dúrxšmuglen zix** прашмыгнуць, прашмыгваць, праб(і)рацца, пралезьці, пралазіць (нішком)

dúrxšnajdn* [*d.* durchschneiden] прарэз(в)аць, праразаць; **dúrxšnit** *m*, -n [*d.* Schnitt] 1. (пера)сячэньне, прарэз, разрэз; 2. сярэдні ўзровень; **dúrxšnitlexer** сярэдні, звычайны; **dúrxšnitlexkajt** *f* пасярэднасьць, звычайнасьць

• in durxšnit у сярэднім

dúrxšnirlen zix (durx) [*d.* schnüren] праніз(в)аць, пралыгаць

dúrxšpacirn zix [*d.* spazieren] прагуляцца, прагульвацца

dúrxšpaltn* [*d.* durchspalten] расчаніць, расчэпліваць, раскалоць, расколваць (сякерай)

dúrxšpanen [*mhd.* spannen] прадыбаць, прашагаць, прайсьці, пракрочыць

dúrxšparn [*d.* sperren] праціснуць, праціск(в)аць, прап(і)хнуць, прапіхаць

dúrxšpiln [*d.* durchspielen] прайгра(ва)ць (музыку)

dúrxšprajzn [*mhd.* spriuzen] прадыбаць, прашагаць, прайсьці, пракрочыць

dúrxšpricn [*d.* spritzen] упырснуць, упырскваць

dúrxšpringen* [*d.* durchspringen] праскочыць, праскакваць

dúrxšprocn [*d.* sprossen] прарасьці, прарастаць

dúrxšrajbn* zix (mit) [*d.* durchschreiben] перапісвацца, ліставацца

dúrxšrajen* (zix) [*d.* durchschreien] перакрыкваць, перакрычаць, перагарлаць

dúrxštamlen [*d.* stammeln] прамармытаць, прамыркнуць

dúrxštekn [*d.* durchstecken] праткнуць, пратыкаць; прасунуць, прасоўваць

dúrxštepn [*d.* durchsteppen] праштабнаваць, праштабноўваць, праштапаваць, праштапоўваць, прашы(ва)ць, прастрачыць, прастрочваць

dúrxštexn* [*d.* durchstechen] 1. пракалоць, праколваць, праткнуць, пратыкаць; 2. *n* пракол, праколваньне; **dúrxštex/dúrxštox** *m*, -n пракол (дзірка)

• durxštexn* mit di ojgn пранізваць вачыма

dúrxštojsn* [*d.* durchstossen] праштурхнуць, праштурхоўваць, праціснуць, праціскаць, прапхнуць, прапіхаць

dúrxštrajxn* [*d.* durchstreichen] выкрасьліць, выкрэсьліваць, выкасаваць, выкасоўваць

dúrxštrain [*d.* durchstrahlen] прасьвяціць, прасьвечваць, праніз(в)аць (промнямі); **dúrxštralung** *f med.* прасьвечваньне

dúrxštromen [*d.* durchströmen] працячы, працякаць

dúrxštroz *m*, -n [*d.* Strasse] прахадная (скразная) вуліца

dúrxštudirn [*d.* durchstudieren] праштудыяваць

dúrxštupn [*d.* stupfen] праштурхнуць, праштурхоўваць, праціснуць, праціскаць, прапхнуць, прапіхваць

• durxštupn di cajt марнаваць час

dúrxšvebn [*d.* schweben] праплы(ва)ць, пранесьціся, пранасіцца, прамільгнуць

dúrxšvenken* [*d.* schwenken] прамы(ва)ць, прапаласкаць, прапалоскваць; **dúrxšvenkung** *f* прамываньне, прапалоскваньне

dúrxšvicn [*d.* durchschwitzen] прапацець

dúrxšvimen* [*d.* durchschwimmen] пра-, пера|плысьці, пра-, пера|плы(ва)ць

dúrxšvindlen [*d.* durchschwindeln] прамайнуць, праміль-гнуць

dúrxtapn [*d.* tappen] прамац(в)аць

dúrxtrajbn* [*d.* durchtreiben] прагнаць, праганяць

dúrxtraxtn [*d.* trachten] 1. аб-, пра|дум(в)аць; 2. *n*, **dúrxtraxtung** *f* прадумваньне, роздум, развага, разважаньне

dúrxtretn* [*d.* durchtreten] пратаптаць, пратоптваць

dúrxtrifn [*d.* triefen] працячы, працякаць

dúrxtrikenen [*d.* durchtrocknen] прасушыць, прасушваць; **dúrxtrikenen zix** прасохнуць, прасыхаць

dúrxtrogn* [*d.* durchtragen] пранесьці, праносіць

dúrxtunelírn [*d.* durchtunneln] правесьці, праводзіць тунэль

dúrxvaksn* [*d.* durchwachsen] прарасьці, прарастаць; **dúrx-** [illegible] прарастаньне

- [*d.* walgern] праваліць, правальваць (штось-

- [*d.* durchwandern] правандраваць; **dúrxvan-** вандроўнік, падарожнік

- [*d.* durchwärmen] прагрэць, праграваць

dúrxcuvarfn* [*d.* durchwerfen] кінуць, кідаць (праз нешта); прасеяць, прасейваць, прасяваць; **dúrx-varfn* zix** (пра)мільгнуць

dúrxvašn* [*d.* durchwaschen] 1. прамы(ва)ць; 2. *n*, **dúrxvašung** *f* прамываньне, прамыўка

dúrxvebn [*d.* durchweben] праткаць, праніз(в)аць, пераплесьці, пераплятаць

dúrxveg *m*, -n [*d.* Durchweg] 1. пераход, пярэйсьце, праход, найкарацейшы шлях; 2. транзыт

dúrxvejen [*d.* durchwehen] пра-, аб|веяць, абвяваць

dúrxvejkn [*d.* durchweichen] прамачыць, прамочваць; **dúrxvejkn zix** прамокнуць, прамакаць

dúrxvejtikn [*d.* Weh, *mhd.* wtac] выцерпець, адпакутаваць, выбалець, выстагнаць

dúrxventilírn [*d.* ventilieren] правэнтыляваць

dúrxvepn zix [*d.* vaporieren?] прамачыць, прамочваць, насыціць, насычаць, прасякнуць, прасякаць

dúrxvertlen zix [*d.* Wort] перакінуцца, перакідвацца словамі (жартачкамі)

dúrxvinken* zix [*d.* winken] пераміргнуцца, перамаргнуцца, пераміргвацца

dúrxvišn [*d.* durchwischen] працерці, праціраць

dúr(x)xapn [*p.* chapać, *ukr.* хапати] праб(і)рацца, прашмыгнуць, прашмыгваць

dúrxzajen [*d.* durchseihen] працадзіць, працэджваць

dúrxzajern [*d.* durchsäuern] пра-, с|кіснуць, пра-, с|кісаць

dúrxzajn* (iz dúrxgeven) [*d.* durchsein] прабыць (цяперашняга часу няма)

dúrxzalcn* [*d.* durchsalzen] прасаліць, прасольваць

dúrxzapn (zix) [*d.* Durchsaugen] пранікнуць, пранікаць, прасачыцца, прасочвацца, прасякнуцца, насыціцца, насычацца, прамокнуць, прамакаць; прамачыць, прамочваць, насыціць, насычаць

dúrxzecn [*d.* durchsetzen] 1. прабі(ва)ць; 2. выканаць, выконваць, зьдзейсьніць, зьдзяйсьняць, ажыцьцявіць, ажыцьцяўляць, спраўдзіць, спраўджваць

dúrxzegn [*d.* durchsägen] прапілаваць, прапілоўваць; **dúrxzeg** *m*, -n прапіл

dúrxzejen [*d.* säen] прасеяць

• durxzejen durx di cejn працадзіць скрозь зубы

dúrxzejfn [*d.* Seife] *fig.* намыліць (шыю/галаву), раскрытыкаваць

dúrxzen* [*d.* durchsehen] прагледзець, праглядаць; **dúrxzen* zix** прасьвечвацца; **dúrxzeiker, dúrxzeevdiker** празрысты; **dúrxzeevdikajt** *f* празрыстасьць

dúrxzidlen zix (mit) [*mhd.* sudeln] палаяцца, пасварыцца

dúrxzidn* [*d.* sieden] пракіпець; пракіпяціць

dúrxzingen* [*d.* durchsingen] прасьпяваць, прапець

dúrxzipn [*d.* durchsieben] прасеяць, прасейваць (праз сіта)

dúrxzixtiker [*d.* durchsichtig] празрысты; **dúrxzixtikajt** *f* празрыстасьць

dúrxzuxn [*d.* durchsuchen] абшук(в)аць; **dúrxzux** *m*, -n, **dúrxzuxung** *f*, -en [*d.* Durchsuchung] пératрус, вобшук, абшукваньне

dúrxžavern [*ukr.* ржавіти, *p.* rdzewieć] праржавець

du'st=du host, du vest

duš *m*, -n [*d.* Dusche] душ

dušen [*p.* dusić, *ukr.* душити] 1. душыць, за-, у|душваць; 2. *kul.* тушыць; **dušne(r)** душны; **dúšnekajt** *f* духата; **dušlive(r)** астматычны, дыхавічны, удушлівы, задушлівы

• s'iz do azoj dušne! тут так душна!

dúše(nju), duše-lebn [*r.* душенька] даражэнькі, каханенькі, родненькі

• – Majn mame hostu nit vos cu šeltn, /vajl šuldik bin ix nor alejn. /Alemol, oj, fleg ix mit dir, duše, redn, /un azoj hob ix farvolt cu zajn alejn. *flksl.* – Маю маці ты не праклінай, таму што вінавата я сама. Кожны раз, ой, я з табой, ясачка, гаварыла, і вось так мне заманулася застацца адной.

• špacirn, duše-lebn, zajnen mir gegangen /arum un arum dem bulvar, /ale mejdelex špiln libes, /un ix bin geblibn cu nar *flksl.* гуляць, мая душа, мы хадзілі на бульвар, усе дзяўчыны кахаюць, а я засталася ні з чым

duške *f*, -s дужка; *anat.* ключыца

dux *m*, -n [*p.* duch, *ukr.* дух] подых; дух; **duxovne(r)** духоўны; **duxovner** *m*, -ne духоўнік

• a knaper dux in dem слабы дух у гэтым

• gebn* dux паддаць духу; даць волю, разьвязаць рукі

• kejn dux nito і духу німа

dúx(ene)n [*s.* דוכ(נע)ן] *rel.* стоячы бласлаўляць сьвятарскім блаславеньнем натоўп у пэўныя даты; *hum.* стаяць задуменна

• duxenen iber epes рабіць вялікія паўзы, затрымліваць

• vajl di kojanim duxenen, ganvet men zej di štivl avek *śpr.v.* пакуль сьвятары бласлаўляюць, у іх крадуць боты (сьвятары перад блаславеньнем пакідаюць свой абутак у пярэднім пакоі)

duxovke *f*, -s [*r.* духовка] духоўка, духавая печка

duxtn=daxtn zix [*d.* dachte, denken] зда(ва)цца

• er iz, duxt zix, avekgeforn ён, здаецца, ад'ехаў

• hot zix gekont duxtn здавалася б

• es hot zix mir geduxt мне здалося

• Don zict bam lernen un s'cit zix /der tog epes lang on a sof. /Im duxt zix: dos blat iz a lonke, /di ojsjes – a cerede šof...

(H. R.) Дон сядзіць за вучобай, і дзень цягнецца бясконца. Яму здаецца: ліст як луг, літары – чарада авечак...

dvarcdóke *m/f, pl.* divre-cdóke [*s.* (דבר־צדקה) דברי־ →dover-, dvorim, diber, dabern, meduber; cadek, cedejkes, cidkes, macdek, (bal-)cdoke] дзеяньне з мэтай дапамогі людзям у іхнай патрэбе; **dvarmálxes** *m, pl.* divre-málxes [*s.* מלכות־] царскі наказ, загад; **dvaršéker** *m, pl.* divre-šéker [*s.* שקר־] хлусьня, мана, брахня, фальш(ывасьць), няшчырасьць [*sin.* lign, falškajt]; **dvartójre** *m, pl.* divre-tójre [*s.* תורה־] слова з/аб Торы; **dvarxól** *m* [*s.* חול־] будзённая рэч, будзённае слова [*sin.* voxedike zax, voxedik vort; *ant.* dover-šebikduše]; **dvarxóxme** *m, pl.* divre-xóxme [*s.* חכמה־] разумнае слова, мудрасьць, мудрагелістая думка

dvejkes *n* [*s.* דב(י)קות →misdabek, fardvejketer] *xsd.* духоўная еднасьць з богам, рэлігійны экстаз, духоўны запал [*sin.* gajstike baheftung mit got, religjezer ekstaz, getlexe bagajsterung]; **dvéjke(ne)n zix** [*s.* דבקע(נע)ן] уваходзіць у рэлігійны эстаз/транс (з адпаведнай мімікай і рухамі цела)

Dvojre hanevie [*s.* דבורה הנביאה] *tnx.* Дэбора прарочыца

Dvorim [*s.* דברים →dover-, divre-, dvar, dabren, diber] "(і вось) словы"; *tnx.* Другі закон; назоў 44-га разьдзелу Торы (Др. З. 1–3:22); **dvorim-b(e)téjlim** *pl.* [*s.* בטלים־] лапатаньне, балбатня, пустаслоўе, біліндрасы [*sin.* puste rejd, plapleraj]; **dvorim hoomdim berume-šelójlem** *pl.* [*s.* העומדים ברומו של עולם] "рэчы, якія ставяцца вышэй за ўсё ў сьвеце"; вельмі сур'ёзныя праблемы; **dvorim-gdójlim** *pl.* →dover-gódl *m* [*s.* דבר־גדול (גדולים־)] вялікая рэч; **dvorim-kejójsn/-kehavojósn** *pl.* [*s.* כה(וו)יותן־] рэчы, як яны ёсьць; дакладна, як рэчы выглядаюць; **dvorim-šebikdúše** *pl.* →dover-šebikdúše *m* [*s.* שבקדושה־] сьвятая рэч [*sin.* hejlike zax; *ant.* dvarxol]; **dvorim begéjv** [*s.* בגוו] нешта ёсьць у гэтым

• s'iz dvorim begejv ёсьць у гэтым слушная думка, сэнс; у гэтым нешта ёсьць, гэта нездарма

dvornik *m*, -es [*r.* дворник] дворнік

dxak=txak *m* [*s.* דחק →daxkes, dojxek] патрэба, цяжар, крайнасьць, небяспека, цяжкасьць, труднасьць [*sin.* engšaft, klem, šverikajt]

dzide *f*, -s [*p.* dzida] дзіда, кап'ё

dzike(r)/džike(r) [*p.* dziki] дзікі; **dzi(k)kajt/dži(k)kajt** / дзікасьць; **dzikán** *m*, -es, (-ke *f*, -s) дзікун

• dzičke epelex дзікія яблычкі, дзічкі

dz(j)eg(j)e(x)c/džegexc=djegexc *f/n*, **djod** *m* [*p.* dziegieć, *ukr.* дьоготь] дзёгаць

• a lefl dzegexc in a fesl honik лыжка дзёгцю ў бочцы мёду (кропля смуроду псуе гарнец мёду)

dzjelnik *m*, -es [*p.* dzielnik] разьмеркавальнік міласьціны

dzjerkáč/džerkác *m*, -es [*ukr.* деркач] дзяркач

dzjad/dž(j)ad/džod *m*, -es [*p.* dziad] старац, дзед, стары жабрак

dzjub *m*, -n [*p.* dzób] дзюба, глюга; **dzjuben/džuben/džoben** дзюбаць, дзяўбці

džajsne *f*, -s [*p.* dziąsna] дзясна, дзясла

džeblje *f*, -s [?] крошка, крыха

dželnice *f*, -s [*p.* dzielnica] вобласьць, раён

džet *m*, -n [*eng.* jet] рэактыўны самалёт; **džetn (zix)** лятаць на рэактыўным самалёце

džez *m* [*eng.* jazz] джаз

džimdže *f*, -s [?] *muz.* талерка

džimdžik *m*, -s [?] прылада, прыстасаваньне; **džímdžikvarg** *n* тэхнічныя прылады

džim(j)en [*p.* drzemać?] драмаць

• xapn a džim задрамаць

džjonsle *f*, -s [*p.* dziąsło] дзясна, дзясла

džongl *m*, -en [*eng.* jungle] джунглі

džoxen [?] да(ва)ць кухталя/грымака; **džox** *m* кухталь, грымак

džudezme *n* [*šp.*] джудэзма, лядзіна (мова сэфардзкіх гэбрэяў); **džudézmišer** лядзінскі





E

E=a=ajen *m/f*, -s [*s.* (ס-)עין] 1. "айн"/"аен", літара гэбрэйскага альфабэту; 2. лічба 70

e! *int.* э (не)!

-e [*s.* ה-] *suf.* азначэньне жаночай асобы або назоўнікаў жаночага роду

• šxejne суседка; zkejne баба; meluxe дзяржава; sxojre тавар

eb *m*, -n [*d.* Ebbe] адліў

ébnholc *n* [*d.* Ebenholz] эбэнавае (чорнае) дрэва

ec (enk) [*mhd.* ëz] вы

-éc [*sl.?*] *suf.* (часта *pejor.*) -юга, -ок

• ganefec зладзюга; švogerec сваячок; vergelec бамбіза

ecbe-elojhím/-elo(j)kím [*s.* אצבע־אלוהים/־אלקים] "божы палец"; боскі цуд, знак божай волі [*sin.* gots finger]

ecem [*s.* עצם →acomes, beecem] 1. *m* існасьць, сутнасьць, аснова [*sin.* hojptzax, iker]; 2. сам (па сабе), па сутнасьці; уласнай асобай, пэрсанальна [*sin.* (far zix) alejn, gufe]; **écem-**, **écemdiker** цэнтральны, самы значны, асноўны, галоўны; **écem-frage** *f*, -s галоўнае пытаньне

• [illegible] пэрсанальны падыход

• [illegible] насьці [*sin.* in grunt genumen]

[illegible] гравіраваць, травіць

[illegible] [*s.* אדום] *tnx.* Эдэм, назоў краіны на паўднё[illegible] Мёртвага мора і народу гэтай краіны; [illegible] варожай для гэбрэяў прасторы і хрысьці[illegible] наагул; **edojmi** *m*, -m [*s.* (ם-)אדומי] які [illegible] Эдэму

edern [*d.* Ader] цягнуць жылы, надакучыць, (на)дакучаць, даняць, даймаць, дапячы, дапякаць; **éderdiker** дакучны, (на)дакучлівы

éfenen [*d.* öffnen] 1. адчыніць, адчыняць, адкры(ва)ць, растуліць, ад-, рас|туляць; 2. *n* раскрыцьцё, раскрываньне, адкрыцьцё, адкрываньне; **éfenung** *f*, -en 1. адчыненьне, адкрываньне, адкрыцьцё; 2. дзірка, адтуліна; **éfntlexer** адкрыты, публічны; **éfntlexkajt** *f* адкрытасьць, грамадзкасьць, публічнасьць

• efenen a mojl, a/dem pisk (af) разявіць рот/пашчу (сварыцца, лаяць)

• efenen di (a por) ojgn расплюшчыць вочы

• ojb di tir efnt zix nit farn oreman, vet zi zix efenen farn dokter *šprxv.* калі дзьверы не адчыняюцца для бедняка, то яны адчыняцца для лекара

Efroim [*s.* אפרים] *tnx.* Яфрэм (малодшы сын Язэпа); назоў роду, які паходзіць ад Яфрэма (Б. 41:52)

efrojex *m*, *pl.* efrojxim [*s.* (ים-)אפרוח] кураня, птушаня [*sin.* hindele, fejgele]; *fig.* слабы, кволы чалавек; маладзён, юнец

efšer [*s.* אפשר] *adv.* магчыма, мо(жа), ану ж, напэўна; (а) ці [*sin.* s'ken zajn (az), meglex; tomer, ci]

• efšer vejst ir, vu er vojnt? а ці ведаеце вы, дзе ён жыве?

• ir volt efšer cugeforn ahin вам бы зьезьдзіць туды

• mir veln efšer blajbn мы, магчыма, застанемся

• nejn efšer? ці ж ня праўда? мо(жа) не?

• – Ruft mir arajn majn getraje muter, /efšer vet mir gringer vern. /Vi di muter hot geefnt di tir: /– Majn toxter, vej iz mir far dir. *flksl.* – Паклікайце мне маю верную маці, можа мне стане лягчэй. Калі маці адчыніла дзьверы: – Мая дачка, гора мне з табой.

efter(s) [*d.* oft] *adv.* часьцей

egber=ekber/ekbojer *m*, -s [*mhd.* negeber, negebor] сьвідар, сьвердзел; **égbern=ékbern** сьвідраваць, сьвярдліць

egdeš/egdiš/egdes/egdis=ekdeš/ekdiš *m*, -n [*d.* Eidechse] *zool.* скарпіён, яшчарка

egel *f* [*d.* Blutegel, *mhd.* ëgel] п'яўка

egle-arúfe *f* [*s.* עגלה־ערופה →ejgl] цялок, якога паводле Торы трэба прыносіць у ахвяру ў выпадку, калі ў полі знайшлі забітага чалавека, але забойцу не злавілі

• a kol (vi) fun an egle-arufe пранізьлівы (непрыемны) голас

e"h *abr.* **ole(ha)šólem**, **olev(-h)ašólem**, **alejem-hašólem** [*s.* ע"ה=עליה־/עליו־/עליהם־השלום] "ёй/яму/ім супакой"; мір праху ейнаму/ягонаму/іхняму, зямля ёй/яму/ім пухам, царства ёй/яму/ім нябеснае, вечны ёй/яму/ім спакой

ehé! [*p.* ehe, *ukr.* еге] *int.* эгэ!

ehr *f* [*d.* Ähre, *mhd.* ehre] колас

ej *n*, -er, *dim.* **éjele** *n*, -x [*d.* Ei] яйцо, яйка, яечка, кока; **éjernik** *m*, -es, (-nice *f*, -s) гандляр яйкамі; **éjer-kixl** *n*, -ex, **éjer-kuxn** *m*, -s *kul.* яечны пірог; **éjerlejgndiker** яйцаноскі; **éjer-prošek** *m* яечны парашок; **éjer-štok** *m*, -n *anat.* яечнік

• a jung vajbl hot lib a grobe kiške mit harte ejer *glxv. vulg.* маладая кабета любіць тоўстую "кішку" зь цьвёрдымі яйцамі

• a klejn ej iz ojx a kapore *šprxv.* і маленькае яйка – таксама ахвяра

• a nar zect men nit iber ejer *šprxv.* дурня на яйкі ня садзяць

• an opgešejlt ej falt ojx nit alejn (kumt nit glajx) in mojl arajn *glxv.* абчышчанае яйка само ў рот ня падае

• az me ganvet a sax ejer, ken men ojx vern a nogid *glxv.* калі накрасьці шмат яец, можна таксама стаць багатым

• az me ganvet an ej, hot men zibn jor dales *šprxv. hum.* скрадзеш адно яйка – сем гадоў пакутаў

• di kac zol lejgn ejer, volt zi geven a hun *glxv.* калі б котка несла яйкі, яна была б курыцай (каб тое каб, ды каб тое есьлі, то самі б грыбы ў рот лезьлі)

• mit ejn ej ken men a gance šisl baršč farvajsn *glxv.* адным яйкам можна цэлую міску баршчу забяліць

• s'hot nit di vert (es iz nit vert) kejn ojsgeblozn ej *glxv.* гэта выедзенага яйка ня варта (тры грошы ня варта)

• štarker fun an ejer-bejgele (fun a klejn ferdele) bin ix nit *glxv.* я не мацнейшы за абаранак (за малога коніка) (раблю ўсё, што магу)

ej! *int.* (г)эй! э!

ej=ejder [*d.* eher] *bndv.* чым(ся), ніж, пакуль, сьпярша, наперад, уперад, даўней, раней, перад тым, (на)перш

éjber-=ójber- [*d.* ober-] вышэйшы, верхні; **éjberl** *n*, -ex вярхушка, верхавіна; **éjberšaft** *f* вяршэнства, першынство, улада; **éjberšter** 1. *m* усявышні, бог; 2. найвышэйшы, самы верхні; **éjber-ejxl** *m*, -en [*d.* Eichelober] *kort.* трэфавая дама; **éjberflax** *f*, -n паверхня; **éjberflexlexer** павярхоўны; **éjberhant** *f* перавага; **éjberhar** *m*, -n манарх; **éjberharšaft=éjberheršaft** *f* вярхоўная ўлада

• krign* di ejberhant (iber) перамагчы, атрымаць перамогу

• az der ejberšter vet šenken dos štikele gezunt калі бог падаруе кавалак здароўя

• der ejberšter darf dox raxmones hobn! *glxv.* божа павінен жа быць літасьцівым!
• dos ejberšte funem štejsl таўкач, мяла; *fig.* самы галоўны, абсалютна неабходны
• er hot sejxl vi der ejber-ejxl *glxv.* ён дурны як бот/варона /цецярук (як кавальскія гарны)
• got (der ejberšter) zol gebn! хай бог дасьць! дай божа!
• šraj nit azoj! konst, xolile, ufvekn dem ejberštn не гарлань гэтак! можаш, барані божа, разбудзіць усявышняга

éjberhazbore *f*, -s [*s.* (-ות)הסברה-] дзіўная задума, мудрагелістая думка; хітры плян, фортэль, подступ, выкрут, падход, хітрыкі [*sin.* modner ajnfal; xitrer plan, fortl]

éjberkol *n*, *pl.* -kojles [*s.* (-ות)קול-] высокі голас, саправа

éjberšpicl *n*, -ex [*d.* Spitze] хітрыкі
• gejn* mit ejberšpiclex схітрыць, схітраваць
• lozn* in gang an ejberšpicl пусьціцца на хітрыкі

éjbervog *f* [*d.* Waage] перавага

éjberxoxme *f*, -s [*s.* (-ות)חכמה-] мудрагелістасьць, мудрагельства
• gejn* mit ejberxoxmes мудраваць, мудрагеліць

éjbiker [*d.* ewig] вечны; **éjbikajt** *f*, -n вечнасьць; **ejbikóniker** спрадвечны, адвечны
• af ejbike jorn (ejbik-ejbikim, af ale ejbikajtn) на векі вечныя
• der akt af ejbikn erdbanuc акт на вечнае валоданьне зямлёй
• der, vos lebt ejbik (got) той, хто жыве вечна (бог)
• faršvindn* af ejbik кануць у вечнасьць
• fun ejbik on (fun ejbike cajtn) спрадвеку, заўжды
• dos gute un dos šlexte iz nit af ejbik *šprxv.* дабро і зло – не назаўсёды (шчасьце і трасца – пераходныя свацьці)
• ejbik lebn, ejbik lernen *glxv.* век жыві, век вучыся (што жывем, то вучымся; будзем вучыцца, пакуль сьмерць лучыцца)
• ejbik lebt men nit *glxv.* вечна не жывуць
• lexaim vil ix trinken, /un take on an ek, /far di vos zajnen geforn /af ejbik avek! /bim-bam-bam, bim-bam! (M. V.) я хачу выпіць за здароўе тых, яшчэ й яшчэ, хто назаўжды зьехаў! бім-бам-бам!
• nito kejn ejbike zax af der velt *glxv.* німа вечных рэчаў на сьвеце

ejce *f*, -s [*s.* (-ות)עצה →jojec, acosi, mejaec, misjaec, bal-ejce] навучаньне, настаўленьне, (па)рада; выйсьце, выхад, вырашэньне, разгадка, выбар, альтэрнатыва [*sin.* rot; ojsveg, lejzung, brejre]; **éjce(ne)n, gebn* an ejce** (cu) да(ва)ць параду, (па)радзіць, (па)раіць [*sin.* ratn, curedn]; **éjce-geber** *m*, -s, (-n *f*, -s) дараднік, (па)раднік, (да)радца, райца; **éjcehaltung** *f*, -en (на)рада; **ejce-tójve** *f*, *pl.* ejces-tójves [*s.* (-ות)טובה-] добрая (па)рада
• a ganc kluge ejce разумная парада
• fregn/haltn* an ejce раіцца, радзіцца, пытаць рады
• hert, vos ix vel ajx ejcen (hert zix cu cu majn ejce) паслухайце маёй парады
• zix an ejce gebn* даць рады, выйсьці са становішча, знайсьці выйсьце
• zix kejn ejce nit gebn* ня даць рады
• dem gutn frajnd zol men gebn a šlexte ejce, un dem sojne a gute *šprxv.* і добраму сябру можна даць кепскую параду, а ворагу – добрую
farvólkenen zix [*d.* bewölken] захмарыцца, захмарвацца; **farvolknter** захмараны; **farvolkntkajt** *f* воблачнасьць, хмарнасьць
farvór [*d.* wahr] *adv.* сапраўды, запраўды, дапраўды
farvorclen, zajn* farvórclt [*d.* wurzeln] укараніцца, укараняцца, пусьціць, пускаць карані
farvórfener [*d.* verwerfen] закінуты, пакінуты, глухі, занядбаны; **farvórfn vern*** 1. быць закінутым/занядбаным; 2. (in, far) ператварыцца, ператвараца, рабіцца
• a farvorfener vinkl закінуты куток, глуш, глухмень
• farvorfn mit arbet завалены працай
• farvorfn vern* far a xaje ператварыцца ў скаціну
farvórenen [*d.* wahren] 1. забясьпечыць, забясьпечваць, гарантаваць; **farvóreniš** *f/n*, -n забесьпячэньне, гарантыя
farvórlozn*/farvórlejzn [*d.* verwahrlosen] запусьціць, запускаць, занядбаць, пакінуць без дагляду; **farvórlozter /farvórlejzter/farvórlester** 1. *m*, -te беспрытульнік;

2. беспрытульны, бездаглядны, занядбалы; **farvórloztkajt** *f* беспрытульнасьць, занядбаласьць
farvós=far vos [*d.* für was] *adv.* за што, чаму; **farvós** *m.* -n прычына, довад, падстава; **farvós-farvén** (far vos un far ven) *adv.* за што, пра што; чаму й за што; за што, за якое
• nor on a farvos без падставы
• farvos? – far micves за што? – за ласку
farvóxedikn [*d.* Woche] зрабіць будзённым
farvualírn завуаляваць
farvúndern [*d.* verwundern] зьдзівіць, зьдзіўляць; **farvúnderter** зьдзіўлены; **farvúnderung** *f* зьдзіўленьне
farvúnd(ik)n [*d.* verwunden] (па)раніць; **farvúndeter** 1. *m.*, -te ранены чалавек; 2. (па)ранены; **farvúndlexer** якога лёгка параніць; **farvundung** *f.* -en раненьне
farvúrf *m.* -n [*d.* Wurf] выгнаньнік, агіднік, нягоднік, па[illegible]радак, нелюдзь
[illegible] [*s.* -חיה- →xaje] азьвярэлы
[illegible] -חלש- →xalešn, xalošes, xoleš, xulše, gexalešter] [illegible]млець, зьнепрытомнець, страціць пры[illegible] **farxálešn zix** захацецца, закарцець; **farxá**[illegible]томны стан, нячуласьць, страта разу[illegible]**lešter** самлелы, абамлелы
[illegible] хапати] 1. захапіць, захапляць, за[illegible]скіпіць, заскічыць, заскічваць, засьпець, [illegible] 2. *n.* **farxapung** *f*, -en захоп; **farxápn zix**, **farxapt vern*** 1. схамянуцца; 2. захапіцца, захапляцца; **farxaper** *m.*, -s захопнік; **farxáperišer** захопніцкі; **farxápndiker** захапляльны; **farxapter** захоплены; **farxaptkajt** *f* (mit) захапленьне; **farxápeniš** *n* захоп; зьнікненьне; пагібель
• farxapn ba cajtns засьпець у час
• farxapn dos ojg (di ojgn) прыцягнуць увагу (зьнешнім выглядам, прыгажосьцю)
• farxapn emecn umgerixt застаць/засьпець кагосьці неспадзеўкі/зьнянацку
• farxapn mit zix захапіць з сабой
• s'hot farxapt dem otem (mit a farxaptn otem) дух перахапіла/заняло
• a farxapeniš af dir! *kll.* каб цябе разарвала!
• farxapt/gexapt zolstu vern! *kll.* чорт цябе схапі!
farxásm(en)en* [*s.* -חתמ- →xasmenen, xojsem, xosem, xsime] запячат(в)аць [*sin.* farziglen]; **farxásmet(en)er** запячатаны
• a farxasmete briv запячатаны ліст
farxávern zix [*s.* -חבר- →xevre, xavure, xover, misxaber] пасябраваць
farxázern [*s.* חזרן-] завучыць, завучваць
farxázern [*s.* -חזיר-] насьвіньнячыць, запэцк(в)аць, забрудзіць, забруджваць, замурз(в)аць
farxídešn [*s.* חידושן- →xideš, on-, op|xidešn] зьдзівіць, зьдзіўляць; **farxídešter** зьдзіўлены
farxlin(j)en, **farxlisnen**, **farxliščen zix** (mit) [*ukr.* хлинути, *p.* zachłysnąć] захлынуцца, захлынацца, захлябнуцца, захлёбвацца
farxlipen zix [*p.* chlipać, *ukr.* хлюпотати] захліпнуцца, захліпацца
• zi hot zix farxlipet in a grojs gevejn яна зайшлася ад плачу
farxljapen [*p.* zachlapać, *ukr.* хляпати] захляпаць, запырскаць, заляпаць
farxljoben/farxljopčen zix (in) [*p.* chłeptać, *ukr.* хлебтати] *hum.* захлынуцца, захлынацца, захліпнуцца, захліпацца (у пачуцьцях), закахацца
farxmaren zix [*p.* chmara, *ukr.* хмарити] захмарыцца, захмарвацца; **farxmáreter** хмарны, пахмурны
• Se hot zix farxmaret af a regn... /– Kum ahercu, du šejn mejdele, /ix vel dix epes fregn. *flksl.* На небе хмары на дождж... – Хадзі сюды, ты прыгожая дзяўчына, я хачу ў цябе нешта спытаць.
farxmuren [*p.* chmurzyć, *ukr.* хмурити] нахмурыць, нахмурваць, насупіць, насупліваць; **farxmúreter** нахмураны, захмураны, хмурны
farxójšexn [*s.* -חושכ- →xojšex] 1. зацьміць, зацьмяваць, зацямніць, зацямняць; 2. атруціць, атручваць; **farxójšexter** змардаваны, змораны, зьнясілены, змучаны, учарнелы, зьмізарнелы; **farxojšext vern*** мучыцца, пакутаваць, зьнемагаць
farxójveter/farxojfter [*s.* -חוב- →xajev, xojv, xiev, hisxajves, mexajev, mexujev, misxajev-, nisxajev] запазычаны, які залез у пазыку; **farxojven zix** залезьці, залазіць у пазыку, завінавацімца, запазычыцца
farxólemter [*s.* -חלומ- →xolem] летуценны, задумлівы, задуменны; **farxólemtkajt** *f* летуценнасьць, мройлівасьць, задумлівасьць; **farxólemen zix** аддацца марам, задумацца
• farxolemte ojgn задуменныя вочы
• Gegangen iz Xajele štil un farxolemt, /celozn di gold-blonde cep, /dos heldzl antblojzt un gemurmlt, gezungen /a lidele – trala-la-la! (Z. Š.) Ішла Хаечка ціха й задуменна, распусьціўшы свае сьветлыя залатыя валасы, агаліўшы шыю й напяваючы песеньку – траля-ля-ля!
farxraken [*p.* charkać, *ukr.* харкати] захарк(в)аць
farxrip(n)eter [*p.* chrypieć, *ukr.* хрипіти] ахрыплы, асіплы
farxušter [*s.* -חוש- →xuš] задуменны, задумлівы, расьсеяны, чульлівы [*sin.* cemišter, cexušter]
farzájern [*d.* versauern] заквасіць, заквашваць
farzálcn [*d.* versalzen] засаліць, засольваць
farzamen=farzo(j)men (zix) [*d.* versäumen] спазьніцца, спазьняцца, забавіцца, замарудзіць, замаруджваць, затрым(лів)ацца; **farzamung** *f* затрымка, замарудж(в)аньне, прамарудж(в)аньне
• štarbn* farzamt men nit памерці ніколі ня спозьнішся
farzamlen [*d.* versammeln] сабраць, зьбіраць; **farzamlung** *f*, -en сход, мітынг, асамблея
farzarazen [*p.* zarazić, *ukr.* заразити] заразіць, заражаць
farzavinjen zix [*p.* zawinąć się] завінуцца, узяцца за справу
farzécn [*d.* versetzen] 1. засадзіць, засаджваць; 2. залажыць, закласьці, закладаць; 3. *n* пасадка (гародніны); залог; **farzécndik** (epes) *adv.* пад залог
• farzecn di lecte hemd fun zix/lajb закласьці апошнюю кашулю
farzégn [*d.* sägen] запілаваць
farzéj(e)n [*d.* säen] 1. за-, па|сеяць, засейваць, засяваць; 2. *n*, **farzéj** *m*, -en сяўба, сеяньне; **farzejung** *f*, -en пасеў; **farzejer** *m* сейбіт; **farzéj-šetex** *m*, *pl.* -štóxim [*s.* (שטח(-ים] пасяўная плошча
• vos me farzejt, dos šnajdt men *šprxv.* што пасееш, тое і пажнеш
• vu vaksn naronim? – vu me farzejt zej nit дзе растуць дурні? – там, дзе іх ня сеюць

farzéjfn [*d.* Seife] намыліць, намыльваць

farzejmen=farzojmen аблямаваць, аблямоўваць, абшы(ва)ць; пад-, аб-, за|рубіць, пад-, аб-, за|рубліваць

farzén* (farzén) [*d.* versehen] 1. недагледзець, недаглядаць; 2. (mit) забясьпечыць, забясьпечваць; 3. *m/n*, -s/-en, **farzé** *m*, -en недагляд, памылка, промах; **farzéeniš** *n/f*, -n заморак, выradак, пачвара; выродзтва, нечысьць, агіднасьць, брыдкасьць, брыдота

• farzen* a feler не заўважыць памылку

• iber/maxmes a farzen па недагляду

• farzen iz farśpilt *glxv.* недагледзеў – прайграў

• mit ejces bin ix farzen, nor gelt darf ix hobn *glxv.* парадамі я ўжо забясьпечаны, цяпер грошы патрэбны

farzevlen [*s.* -זבל-] запэцкаць, забрудзіць

farzícn* (zix) (iz farzésn), **farzésn vern*** [*d.* sitzen] заседзецца, заседжвацца (у дзеўках); **farzésener** які заседзеўся

• a farzesene mojd старая дзеўка, векавуха

• farzesn vern* bizn grojen cop заседзецца ў дзеўках да сівых валасоў

• farzicn* lang cugast (in gest) заседзецца ў гасьцёх, загасьцяваца

• a jidiše mojd farzict nit *glxv.* жыдоўка не заседзіцца ў дзеўках

• bodaj fun a štekn cu šnicn, abi nit cu farzicn *glxv.* бадай з дрэва выразаны, абы ў дзеўках не сядзець (няхай сабе мужык як шкарпэтка, абы я была як кветка; хоць муж як лапаць, абы за ім ня плакаць; сякі такі, абы быў, абы хлеба зарабіў; сякі такі целяпей, а ўсё будзе ляпей; хоць за вала, абы ў дварэ не была; хоць за старца, абы ў дзеўках не астацца; хоць за рабога, абы ня ўбога; хоць за казла, абы замуж пайшла; хоць крыванос, абы бог прынёс)

• nito ba got kejn fargesene un kejn farzesene *šprxv.* ніхто ў бога не забудзецца і не заседзіцца

farzídn* (farzídt/farzótn) [*d.* sieden] закіпець, закіпаць

farziglen [*d.* versiegeln] запячат(в)аць; **farziglter** запячатаны; **farziglung** *f* запячатваньне

farzílbern [*d.* Silber] пасерабрыць; **farzílbern zix** засерабрыцца

farzíndikn [*d.* versündigen] згубіць, страціць (нешта за грахі); **farzíndikn zix** з-, са|грашыць, правініцца; **farzíndikter** грэшны, які зграшыў; **farzíndikung** *f* зграшэньне

• ni(š)t cu farzindikn! грэх скардзіцца! німа чаго грашыць! каб не зграшыць! дзякуй богу!

• ix hob es farzindikt in der mames bojx *glxv.* я зграшыў у лоне маці (адказ на незаслужанае абвінавачаньне)

• on an oreman ken men zix lajxt farzindikn *šprxv.* беднага лёгка абвінаваціць

farzinken* (farzunken), **farzunken vern*** [*d.* versinken] загрузнуць, за-, у|гразнуць, затануць, праваліцца, правальвацца

• farzinken* in maxšoves/gedanken паглыбіцца ў роздум

• farzinken* in trojmen аддацца марам

• farzinken* in xojves залезьці ў пазыкі (у даўгу, як у шаўку)

farzísn [*d.* versüssen] 1. засаладзіць, засалоджваць; 2. (па)цешыць; прынесьці, прыносіць, да(ва)ць асалоду; **farzister** падсалоджаны, засалоджаны

• farzisn di bitere pil падсаладзіць горкую пілюлю

fárzixdiker [*d.* sich] самастойны, незалежны; замкнёны (чалавек); **fárzixdikajt** *f* самастойнасьць, незалежнасьць; **farzíxiker** эгаістычны, самалюбны; **fárzixnik** *m* адзінокі студэнт-талмудыст

farzíxern [*d.* versichern] 1. за-, у|пэўніць, за-, у|пэўніваць; забясьпечыць, забясьпечваць, забесьпячаць; 2. *n* забесьпячэньне; **farzíxerter** забясьпечаны; **farzíxertkajt** *f* забясьпечанасьць; **farzíxerung** *f*, -en запэўненьне, запэўніваньне; забесьпячэньне, гарантыя, страхоўка

• vos du zest nit mit dajne ojgn, farzixer nit mit dem mojl *glxv.* сам ня бачыў, німа чаго й сьцьвярджаць

farzógn [*d.* versagen] заказ(в)аць, загад(в)аць; **farzóg** *m*, -n запавет, навучаньне, павучаньне, навука

• farzogn a centn (cu ton* epes) заракацца, заказаць дзясятаму (рабіць нешта) (і ўнукам, і ворагам заказаў)

farzojern [*d.* versauern] скіснуць, скісаць; сквасіцца, скващвацца; **farzójerter** пракіслы, сквасьнелы; заквашаны, скващаны

farzójfn [*d.* saufen] шмат піць, прапіваць усе грошы

farzójgn*/farzéjgn* (farzójgt/farzójgn) [*d.* saugen, säugen] засмактаць, засмоктваць; да(ва)ць дзіцяці соску

farzojmen=farzejmen [*d.* säumen] аблямаваць, аблямоўваць, абшы(ва)ць; пад-, аб-, за|рубіць, пад-, аб-, за|рубліваць

farzojmen=farzamen (zix) спазьніцца, спазьняцца, забавіцца, замарудзіць, замаруджваць, затрым(лів)аца

• xasene cu hobn, cu kneln un cu štarbn farzojmt men nit (štarbn farzojmt men nit) *šprxv.* ажаніцца, школіць дзяцей і памерці ніколі ня позна

farzórgn [*d.* versorgen] 1. забясьпечыць, забясьпечваць; 2. *n*, **farzorgung** *f* забесьпячэньне; **farzórg** *m* дабрабыт, дастатак; **farzorger** *m*, -s, (-n *f*, -s) апякун, карміцель, гадаваньнік, гадун; **farzórgerišer** клапатлівы, запасьлівы; **farzorgter** 1. заклапочаны; 2. забясьпечаны; **zajn* farzórgt** клапаціцца, турбавацца; **farzorgtkajt** *f* 1. заклапочанасьць; 2. забясьпечанасьць

• farzorgn zix af ejbik забясьпечыць сябе назаўсёды

farzúmpikter [*d.* sumpfig] забалочаны; **farzumpikt vern*** забалоціцца, забалочвацца; **farzúmpiktkajt** *f* забалочанасьць

farzúnkener [*d.* gesunken] загразлы, угразлы; **farzunken vern*/zajn*** (in) угразнуць; закасьнець

farzúpn (mit) [*mhd.* supfen] запі(ва)ць

farzúxn (fun) [*d.* versuchen] пакаштаваць, паспытаць, паспрабаваць; **farzúx** *m*, -n спроба

• farzux (majne) fiš! пакаштуйце (маёй) рыбы!

• farzuxn dem/a tam fun ganejdn/tojt паспытаць смак раю /сьмерці

• dem tam fun kapcn zol kejner farzuxn, /es triknt di gehirn ojs fun mojex, /a kapcn cu a tojtn iz geglixn, /dos zogt di Tojre, un ix zog dos ojx (D. M.) смаку беднасьці нікому ня варта каштаваць, ад роздуму мазгі сохнуць, бядняк – што мярцьвяк, гэтак сказана ў Торы, і я кажу тое ж самае

• der, vos hot nit farzuxt bitere, vejst nit, vos zise iz хто ня зьведаў горкага, не пазнае і салодкага (хто ў бядзе ня быў, той шчасьця ня зьведае)

faržávern, faržavert vern* [*ukr.* ржавіти] за(і)ржавець; **faržáverter** заржаўлены, заржавелы

faržeren [*p.* żreć, *ukr.* жерти] сажраць, зжэрці

faržex *m*, -en [*d.* Pfirsich] пэрсік

faržmuren [*ukr.* жмурити] зажмурыць, зажмурваць, замружыць, замружваць; **faržmúreter** зажмураны

• farżmuren di ojgn заплюшчыць вочы

fas *f/n/m, pl.* feser, *dim.* **fesl** *n*, -ex, **fésele** *n*, -x, **faske** *f*, -s [*d.* Fass] 1. бочка, куфа, кадаўб, ліпаўка, бонда, фаска, кубел, фаска; 2. *euph.* похва, дзюрка, разінька, шмонка, сукрыстая, потка

• rejdn* (vi) fun der puster (fun a pustn) fas гаварыць як у пустую бочку (несьці лухту)

• a fas vi a tojer потка як вароты

• ba a guter baleboste iz ful dos fas *šprxv.* у добрай гаспадыні поўны кубелец (у добрай гаспадыні і певень нясецца)

• fun lejdike/puste feser iz der tuml/ljarem greser (a pustn fas hilxt hexer) *šprxv.* пустую бочку далёка чуваць (парожняя бочка зьвініць, а поўная маўчыць)

fasn [*d.* fassen] схапіць, хапаць; зразумець, сьцяміць, скеміць

fasolje *f*, -s [*p.* fasola, *mhd.* fasol] *bot.* фасоля

• zi kukt af di grojpn un mejnt nor di fasoljes *glxv.* яна пазірае на крупы, але думае аб фасолі

fasón *m*, -en фасон; **fasóndiker** фасоністы

• holtn* tason трымаць фасон

• steln zix in tason расхрабрыцца, стаць у позу

fastn [*d.* fasten] 1. *rel.* пасьціць; 2. *n*, **fastung** *f* пост

• a guter eser iz a šlexter faster (ober a guter arbeter) *šprxv.* добры ядок – кепскі посьнік (але добры працаўнік) (наш Тадэуш – які ядэуш, такі рабатэуш)

• es iz gut cu fastn mit a polke fun a gandz un mit a pus-butelke добра пасьціць з гусінай ляжкай і з паўбутэлькай віна (для прахвоста німа поста)

• fastn hejst nit kejn brojt šporn *šprxv.* постам хлеб хутка разыходзіцца

• fun cu fil esn ken men štarbn, fun cu fil fastn ken men štarbn *šprxv.* можна памерці ад пераяданьня, можна памерці і ад празьмернага посту

• ganve nit un fast nit (nje ganvaj, nje fastaj) *glxv.* не крадзі і ня кайся (не пасьціся) (ня крадзь і ня плач; ня крадзь, не гавей, а жыві чэсьней)

fastrige/fastruge=farstrige *f*, -s [*p.* fastryga] фастрыга; **(fa(r)st)rígeven** фастрыгаваць

• me zet on di fastriges відаць, як сфастрыгавана (шыта белымі ніткамі)

fašine *f*, -s [*d.* Faschine] фашына, гальлё, вецьце

fašístišer [*d.* faschistisch] фашысцкі, фашыстоўскі; **fašizirter** фашызаваны; **fašizírn** (fašizírt) фашызаваць

faver *m*, -s [?] бант

fax *m*, -n [*d.* Fach] фах, прафэсія, занятак, рамяство; **faxove(r)**, **fáxmen(er)išer** прафэсіянальны, майстарскі; **fáx-hadroxe** *f* [*s.* הדרכה] прафэсіянальныя веды; **fáx-kenteniš** *f* веданьне справы; **fáxkener** *m*, -s, (-n *f*, -s), **fáxman** *m*, *pl.* -mener/-lajt, **fáxmenč** *m*, -n фаховец, прафэсіянал, спэцыяліст, знаўца справы, майстар; **fáxšul** *f*, -n прафэсіянальная школа

fax *m*, -n [*d.* Fach] пласт, слой; **fáxiker** кратны; **-fax(ik)er** складаны

• drajfax(ik)er трайны, трохкратны, трохскладаны

-fax- [*d.* -fach] *suf.* -кратны

• filfaxer шматразовы, шматкратны, разнастайны; ejnfaxer просты, звычайны, прымітыўны; ejnfaxkajt прастата, прымітыўнасьць, нескладанасьць

faxlen=fexlen=fixlen зьзяць, зіхацець, бліскаць, блішчэць, міг(а)цець

fázerdiker [*d.* faserig] валакністы

fe! [*p.* fe] фэ! фу!

• a cig štejt af der lonke un meket trojerik: me! /hej, du cig, du šojte, trojerik zajn iz fe! /šoklt er dos berdl: take-take fe! (I. M.) казьлянё стаіць на лонцы і сумна мекае: ме! гэй, ты казьлянё, ты дурнічка, сумаваць – гэта фе! качае яно галавой: так-так фе!

fébruar *m*, -n [*d.* Februar] люты

fecn [?] *argo* зарэзаць, забіць

fečejle=fačejl(k)e/facejle *f*, -s хустка

fedem/fedim *pl.* →fodem *m*, *dim.* **fédeml** *n*, -ex нітка; **fédemdiker/fédimdiker** зь нітак, ніцяны

feder [*d.* Feder] 1. *f*, -n пяро; 2. *f*, -n спружына; 3. *f*, -s пяро (для пісьма); **féder(d)iker** 1. пёрысты; 2. спружыністы, эластычны, пругкі, гнуткі; **féder(d)ikajt** *f* спружыністасьць, эластычнасьць, пругкасьць, гнуткасьць; **fédern** спружыніць, быць эластычным, пругкім, гнуткім; **fédern zix** мяняць пер'е; **féderartiker** пёрысты; **fédergroz** *n*, -n *bot.* папараць; **féder(-)halter** *m*, -s ручка, асадка; **fédermeserl** *n*, -ex сьцізорык

• gendzene feder гусінае пяро

• arajngejn*/xapn/zajn* in di federn (der menč iz arajn in di federn) убрацца ў пер'е (разбагацець, запанець)

• di cung iz di feder fun harcn *glxv.* язык – пяро сэрца

• me derkent dem fojgl (a fojgl derkent, dem fojgl derkent men) lojt/nox di federn *glxv.* па пер'і птушку пазнаюць (знаць жабу па пліганьні, а сокала па палёце; відаць сокал па палёту, а сава па паглёду; па латках пазнаць скупога, а па сьмеху дурнога)

• ufhejbn* a feder un lozn* faln dos gance iberbet (nox a feder jogt er zix, a perine lozt er arojs/ajn) *šprxv.* падняць пяро, але ўсю пярыну ўпусьціць

féderhojz=fóderhojz *n*, *pl.* -hajzer сенцы

fédern (zix) [*d.* vorder] уставаць рана; апярэдзіць, апярэджваць, выперадзіць, выпераджаць; **féderer**, **féderšter /féderster=fóderšter** пярэдні, перадавы; **féder-xejlek** *m/n*, *pl.* -xalokim [*s.* חלק(-ים)] пярэдняя частка

• federn emecn šolem першым павітацца з кімсьці

• federste fis пярэднія ногі

fefer *m* [*d.* Pfeffer] перац; **féfer(d)iker** пярцовы, горкі; **féfern** перчыць, прыправіць, пасыпаць перцам; **féfernice** *f*, -s, **féfer-puške** *f*, -s перачніца; **féfer-kuxn** *m*, -s пернік; **féferminc** *n kul.* мятная перапечка; **féferzixtiker** пародыя на "ejferzixtiker" (раўнівы, зайздросны)

• der fefer funem anekdot соль анэкдоту

• feferdike verter моцныя (зь перцам) словы

• gebn* emecn fefer (cu šmekn) даць камусьці перцу (панюхаць; задаць перцу)

• der, vos hot geholfn af fiš, vet helfn af fefer *glxv.* хто дапамог злавіць рыбу, той дапаможа і зь перцам (хто мае на рыбку, мае і на перац; боска ласка дасьць хлеба й мяска)

• vu der švarcer fefer vakst дзе чорны перац расьце (за блізкім сьветам, у чорта ў зубох, дзе зязюлі не кукуюць, дзе камар козы пасе, дзе саболі пасьвяць, дзе нашыя вароны не лятаюць, дзе чорт хамуты ня вешае, у віру на калу, у вірах на юрах; проці ліха на ўзгорку, дзе пень на калоду брэша)

• zalc dir in di ojgn (un fefer in noz)! (fefer dir in noz!) *kll.* соль табе ў вочы (і перац у нос)!

feferove(r) фарфоравы, парцалянавы
fej=f *m/f*, -en [*s.* (פֵּא-)ען] 1. "фэй", літара гэбрэйскага альфабэту; 2. лічба 80; **lange(r) fej** [*s.* ף] літара "f", якая пішацца напрыканцы слова
• di draj fejen (flejšers - fišers - furmanes) тры "f" (мясьнікі - рыбакі - фурманы)
• šrajb deruf cvej "fejen" (s'iz šojn cvej fejen; štel (megst šteln) cvej fejen af epes) (=farfaln) *glxv.* пішы прапала (можаш паставіць на чымсьці крыж)
fe(j) *m*, -en, *dim.* **féjele** *n*, -x [*d.* Feh] 1. *zool.* вавёрка, векша; 2. **féjenpelc** *m*, -n (a féjener futer) футра з вавёркі; **fé(j)ener** вавёрчын, вавёркавы
fejgl *pl.* →fojgl *m*, *dim.* **féjgele** *n*, -x птушка; **féjglšer=fójglšer** птушыны; **féjgldiker=fójgldiker** *fig.* добры, шчасьлівы, удачны, пасьпяховы
-fe(j)ik- [*d.* -fähig] *suf.*
• lebnsfe(j)iker жыцьцяздольны; brenfe(j)iker гаручы; šlaxtfe(j)ikajt баяздольнасьць
fé(j)iker [*d.* fähig] здатны, здольны; **fé(j)ikajt** *f*, -n здатнасьць, здольнасьць, якасьць, уласьцівасьць
• a feiker šiler здольны вучань
• af azojns iz er feik на гэта яго хопіць
• di feikajt cu bavegn zix здольнасьць рухацца
• er farmogt ale geherike feikajtn cu vern a kompozitor ён мае ўсе належныя якасьці, каб стаць кампазытарам
• feik af alc/alem здатны да ўсяго
fejk *m*, -n [*eng.* fake] падробка, фальшыўка
fe(j)ter, **fejster**, **fe(j)šer** [*d.* fett] тлусты, тучны
fel *f*, -n, *dim.* **felxl** *n*, -ex [*d.* Fell] шкура, скура; **félener** скураны
• a fel! шкура! сука! курва!
• dos iz aza fel, az di velt hot dos nit gezen! сьвет ня бачыў такой курвы!
• onšindn* di fel зьняць шкуру
• rateven dos ejgene felxl ратаваць уласную шкуру
• zi iz a fel! яна шкура!
• a naje fel iz af im ojsgevaksn новая скура на ім вырасла
• brenen zol af dir di fel! *kll.* каб на табе скура гарэла! (каб на табе шэрсьць курэла!)
• fun a fremder fel iz gut pases cu šnajdn *šprxv.* добра рэзаць чужую скуру на пасы (барышы харошы за чужыя грошы; дай божа спажыць, што ў чужой кішэні ляжыць)
• fun dem ber in vald zol men dos fel nit farkojfn *šprxv.* шкуры мядзьведзя, які жыве ў лесе, не прадаюць (на жывым мядзьведзю скуры не купляй)
• me hot nox dem ber nit gešosn, un me tejlt šojn zajn fel (tejln dem bers fel ejder me hot im gešosn) *šprxv.* яшчэ не забілі мядзьведзя, а ўжо дзеляць ягоную шкуру (калі мядзьведзь у лесе, то скуры не дзяруць; зь незабітага ліса шубы ня шыюць)
felblen/feldlen [*d.* fälteln] скласьці, складваць, сабраць, зьбіраць у зборкі/складкі
felčn (in) [*d.* falsch] здрадзіць, здраджваць; **felčer** *m*, -s, (-n *f*, -s) здраднік, здрайца, адступнік; **felčung** *f*, -en здрада, здрадніцтва, адступніцтва
feld *n*, -er [*d.* Feld] поле, палетак; могілкі; **féldarbet** *f*, -n палявая работа; **féldcixtler** *m* палявод; **féldcuxt** *f* паляводзтва; **féld-gazlen** *m*, *pl.* -gazlonim [*s.* (גזלן-)ים →gzejle, nigzl] разбойнік; **féldhun** *f*, *pl.* -hiner *zool.* курапатка; **féldkulturn** *pl.* палявыя культуры; **féldmojz** *f*, *pl.* -majz *zool.* палявая мыш; **féldštejn** *m*, -er камень; **féldtrumejt** *m*, -n паляўнічы рог; **féldtrumejter** *m*, -s гарніст
• ejner in feld iz kejn held *šprxv.* адзін у полі ня воін (адным пальцам вузла не завяжаш; адна пчала мёду не наносіць; адзін дасужы, ды ня дужы; аднаму і ў кашы няспорна)
• beser ejn ku in štal, ejder cen in feld *šprxv.* лепш адна карова ў хляву, чымся дзесяць у полі (лепей верабей у руцэ, як голуб на даху/страсе)
• es iz nito kejn ergere zorg, vi feld-zorg *glxv.* німа горшага клопату, як на полі (кажуць аб доўгачаканым лісьце)
feldšer/felčer=ferš(e)l *m*, -s [*d.* Feldscher] фэльчар
fel(d)z *m*, -n [*d.* Fels] скала, уцёс; **féldziker** скалісты; **féldznfester** цьвёрдакаменны; **féldznrand** *m*, -n рыф
feler *m* [*mhd.* pheller] пелерына, накідка
féliker [*d.* fällig] тэрміновы, хуткі, хуткасны
féliker [*d.* völlig] поўны
• felik gezunt цалкам здаровы
felker *pl.* →folk *n* народ, люд; **félkeršaft** *f*, -n [*d.* Völkerschaft] народнасьць; **félkermord** *m* гэнацыд, зьнішчэньне нацыі; **Félker-Lige** *f* Ліга Нацыяў
feln (ba) [*d.* fehlen] 1. неставаць, бракаваць, не хапаць; 2. памыляцца, рабіць памылку; **feln zix** мінаць, мінуць, прайсьці, праходзіць; **feler** *m/n*, -n памылка, недахоп, загана, вада, хвароба; **félerdiker**, **félerhaft(ik)er** памылковы; **félnd(ik)er** нездавальняльны; **félikajt** *f*, -n адсутнасьць, недахоп, нястача, брак
• a fiziše feler фізічны недахоп
• bagejn* a feler зрабіць памылку
• az der kluger felt, felt er vajt/štark *šprxv.* калі ўжо разумны памыляецца, дык моцна (трапіцца і найразумнейшаму здурнець)
• dem jidn felt tomed a tog *šprxv.* жыду заўжды аднаго дня бракуе (суботы, у якую нельга працаваць)
• der menč hot grojse ojgn un zet nit zajne ejgene felern /xesrojnes *šprxv.* чалавек мае вялікія вочы, але ня бачыць свае ўласныя недахопы (свайго горба ніхто ня бачыць; чужыя грахі перад вачыма, а свае за плячыма)
• der tojt felt kejnem nit *šprxv.* сьмерць нікога не мінае
• dos hot nox gefelt! гэтага яшчэ не хапала!
• es felt im a kljopke/šrajfl/šrajfele (in kop) яму бракуе клёпкі/шрубы ў галаве
• es vet ajx mer nit feln! мала вам ня будзе!
• far dem iz di velt, vemen sejxl felt *šprxv.* сьвет належыць таму, каму розуму бракуе
• mer felt mir nit! мне гэтага не хапала!
• mer vet dir nit feln! больш табе бракаваць ня будзе! (мала табе ня будзе!)
• mer vi tate-mame feln nit! толькі бацькі з маткай не хапае!
• oder tref, oder fel! *glxv.* або хібіў, або трапіў! (альбо пан, альбо прапаў!)
• s'felt an os (a noz) nit! *vrtš.* ані літары/носа не бракуе!
• vos er hot, felt im nit, vos es felt im, hot er nit *glxv.* што ён мае, яму не бракуе, чаго яму бракуе, ён ня мае
• vos felt ajx/im? чаго вам/яму бракуе?
• vos felt im un vos hot er! чаго яму бракуе і што ён мае! (аб чалавеку, які задаволены тым, што нічога ня мае)
• zol ix dos farmogn, vos es felt im! (zol dos mir cukumen, vos im felt!) каб я тое меў, чаго яму бракуе!
felp *m* [?] *tekst.* плюш; **félpener** плюшавы

felšn [*d.* fälschen] 1. фальсыфікаваць, падрабляць; 2. *n*, **felšung** *f.* -en фальсыфікацыя, падробка, падлог; **felšer** *m*, -s фальсыфікатар, падробнік

feminín [*d.* Femininum] *gram.* жаночага роду

fencter/fenster *m/n* [*d.* Fenster] вакно; **féncterbret** *f*, -er, **féncterbretl** *n*, -ex падаконнік, падваконьне, падаконец

• di blumen afn fencter кветкі на вакне

• di hojxe fencter вышэйшы сьвет

• ale mešugoim/mešugene šlogn jenem di fencter ojs (a mešugener, nor di fencter šlogt er ojs jenem) *šprxv.* усе вар'яты б'юць камусьці вокны (але не сабе)

• az me krixt durx a fencter, vakst men nit *glxv.* хто лазіць праз вакно, той расьці ня будзе (крадзенае ня йдзе на карысьць)

fendn [*d.* pfänden] браць у якасьці залога

fener *pl.* →fon *f.* -en. *dim.* **fendl** *n*, -ex сьцяг

fenik *m* [*d.* Pfennig] пфэніг

fer-=far- [*d.* ver- vor-] *pref.* пра-, за-; перад-, пера-, ад-, рас(ь)-, (паказвае на: 1. аддаленьне, расьсейваньне, пе- 2. паступовае спыненьне дзеяньня або перашкоды; 3. выкарыстаньне, выдатка- працоўку; 4. злучэньне; 5. пакрываньне, печым; 6. зьмену стану; 7. зьнішчэньне)

dim. **fércele** *n*, -s пёрд, пук, пердуны, бзьдзюлі [*d.* Vierzig] сорак; (der) **fércik(s)ter** саракавы; **fércikstl** *n*, -ex. **fércikt-xejlek** *m* [*s.* חלק] саракавая частка **férciker** I. *m*. -s сорак рублёў, саракоўка; 2. саракавым (гады); **fércikerléj** саракавым чынам

• di ferciker jorn саракавыя гады

• in di ferciker у саракагадовым узросьце

• biz fercik jor iz nuclex esn, nox fercik – trinken да сарака гадоў карысна есьці, пасьля сарака – піць

• a xazn un a ferd zajnen nor gut biz fercik jor *šprxv.* кантар і конь добрыя толькі да сарака гадоў

fercn [*d.* vierzehn] чатырнаццаць; (der) **fércnter, férceter** чатырнаццаты; **fercntl** *n*, -ex, **fércnt-xejlek** *m* [*s.* חלק] чатырнаццатая частка

ferd [*d.* Pferd] 1. *n* конь; 2. *n*, -es, **ferdáč** *m*, -es, **ferdák** *m*, -es *pejor.* скаціна, быдла, дурань; **férdišer, férdener** конскі; *fig.* глупы, дурны; **ferdl** *n*, -ex конік; канёк; **férdiškajt** *f* глупства, дурнота, дурасьць; **férdbin** *f*, -en *zool.* шэршань; **férdcuxt** *f* конегадоўля; **férdfarmest** *m*, -n скакавы конь; **férd(-)farmestn** *pl.* скачкі; **férdflig** *f.* -n, **férdvorem** *m zool.* авадзень, сьляпень; **férdjung** *m*, -en конюх; **férd(s)(-)ganev** *m*, *pl.* -ganovim [*s.* (ים-)גנב] канакрад; **férd(n)kraft** *f* конская сіла; **férd-štal** *f*, -n канюшня, стайня; **ferd-un-végl** *n*, **ferd-un-vógn** *m*, **ferd-un-kárete** *f*, **férdcug** *m* конь з возам, паязд, запрэжка

• afn (af a) ferd верхам на кані

• zajn* afn ferd *hum.* быць на кані

• a ferd fort arum di gance velt un kert zix um a ferd *šprxv.* конь езьдзіць па ўсім сьвеце, але вяртаецца назад канём (дзе вароне ні ляцець, то ўсё гаўно кляваць; пашлі дурака – ён дураком і вароціцца)

• a gešenkt(n) ferd kukt men nit in di cejn *šprxv.* дораную каню ў зубы не глядзяць

• ale gute ferd zajnen mešuge *glxv.* усе добрыя коні з выбрыкамі

• ba a ferd kukt men af di cejn, ba a menčn afn sejxl *šprxv.* у каня глядзяць зубы, у чалавека – розум

• dos gute ferd šlogt men *šprxv.* добрага каня б'юць

• er iz šojn geven afn ferd un untern ferd *glxv.* ён ужо пабыў і на кані і пад канём (быў у кузьні і ў млыне, у коле і ў мяле, на возе і пад возам, на лаве і пад лаваю)

• ferd-fus-kopite-podkeve-cvok (ferds-fus-podkeves-ejnikl; ferds fus podkeves an ejnikl; (dem) ferds (fus) bajčs štekele (a gešvesterkind); majn ferds-bajč-štekele iz geven ba zajn zejdns vogn a flekele; ku-bajč-ferds-štekele) *glxv.* каня-нагі-капыта-падковы-цьвік (сёмая вада на кісялі; нашаму парабку кумаў сват; на адным сонцы анучы сушылі; стрэчнай бабкі родны Хведар; пень гарэў, а чорт ногі пагрэў, іскра пала – і радня стала; адзін пень гарэў, а другі сьпіну грэў; сваякі гарбузовыя, жывуць цераз дарогу наўпрысядкі; Андрэй/Саўка Кузьме родны Хведар; Анціп – нашаму брату Міколка; твой бацька гарэў, а мой сраку грэў; як твайго бацька хата гарэла, то мая маці сраку нагрэла)

• ferdl, a ber gejt! коська, мядзьведзь ідзе! (з анэкдоту)

• – Ix bin geforn kejn zibn. /– Farvos nit axt? /– X'hob gekojft a ferd. /– Vos maxt der ferd? /– Lig in dr'erd, – maxt der ferd. *fksl.* – Я паехаў у сёмае. – Чаму ня ў восьмае? – Я купіў каня. – Як кажа конь? – Ляжы ў зямлі, – кажа конь.

• nit ale ferd hobn ejn glik *šprxv.* ня ўсім коням аднолькавы лёс

• ruf im nit ferd, a ferd vet azelxe nariškajtn kejnmol nit ton ня кліч яго канём, бо й конь такога глупства ніколі ня зробіць

• ven a ferd volt gehat, vos cu zogn, volt er geredt *šprxv.* калі б конь меў, што сказаць, ён бы сказаў (гэта так, сказаў бы і цяляк, ды язык каратак; і рыба б запела, калі б голас мела)

ferfl=farfl *n/pl.*, **fárfele** *n*, -x [*mhd.* varvelen] *kul.* фарфель /фарфаль (клёцкі зь цеста для макаронаў, нацёртага на тарцы, або з ламанай мацы)

fér(i)ške *f*, -s [*d.* Pfirsich] пэрсік

ferjen [*d.* Ferien] *pl.* вакацыі, канікулы

ferme *f*, -s [*p.* ferma] фэрма

ferštot=forštot *f*, *pl.* -štet прадмесьце, прыгарад

ferter/ferder [*d.* vierte] чацьверты; **fértele** *n*, -x дваццаць пяць капеек; **fertl** *n*, -ex/-en, **fért-xejlek** *m* [*s.* חלק] чвэртка, чвэрць, чацьвертая частка; **fértldiker** чацьвярны; **férthalbn=fert halbn** тры з паловай; **fértljor** *n* квартал (году); **fértljoriker/fértljeriker** квартальны; **fertlen, férttejln** чацьвертаваць; **fertns** па-чацьвертае

• a fertl af draj чвэрць на трэцюю (гадзіну)

• draj fertl af cvej тры чвэрці на другую (гадзіну)

• fertl of *fig.* чвэртка птушкі (вырас пеўню да костак, кату па пяту, пчале па крыльле, сабаку па хвост; вырас зь ляжачага сабаку)

fertl *n*, -ex, **fertke** *f*, -s [*p.* furtka] фортка, брамка, весьнічкі

ferz *m*, -n [*d.* Vers] страфа, верш, радок (у вершы); **férznmos** *f* памер верша; **ferznšrajberáj** *f* вершапісаньне

• vajse ferzn белыя вершы

férzfus *m*, *pl.* -fis [*d.* Ferse] стапа

feser *pl.* →fas *f*, *dim.* **fesl** *n*, -ex, **fésele** *n*, -x бочка

fesper *m* [*d.* Vesper] полудзень

fést(ik)n [*d.* festigen] (у)мацаваць, узмацніць, узмацняць; **fester** моцны, трывалы; **festkajt** *f* моц(насьць), мацу-

нак, трываласьць, сіла; **festung** *f/n*, -en крэпасьць, цытадэль, апора

festl *f* [*d.* Fessel] кайданы, путы

féstšteln [*d.* feststellen] 1. устанавіць, устанаўліваць, выявіць, выяўляць, вызначыць, вызначаць; 2. *n*, **féstštelung** *f*, -en устанаўленьне, выяўленьне, вызначэньне; **féstgeštelter** замацаваны, моцна пастаўлены

feter *m*, -s. *dim.* **feterl** *n* [*d.* Vetter] дзядзька

• az der tate nemt di mame, vert er a feter *šprxv.* калі тата бярэ (новую) маці, ён робіцца дзядзькам (звычайна дзеці завуць мачыху: "mume" – "цётка")

• er mejnt, az Šmelke iz zájn feter, un ix mejn, az Šmelke iz májn feter *glxv.* ён лічыць, што Шмулька ягоны дзядзька, а я лічу, што мой

• feter, me ken (m'ken) ajx! не дуры мне галавы! дудкі!

• mit der mamen iz der tate a foter – mit der mumen iz er a feter *glxv.* з маткай тата – бацька, зь цёткай ён – дзядзька

• on a noz – fort a feter *glxv.* хоць і бяз носа – але ж дзядзька

• zaj mir nit kejn feter un nej mir nit kejn šix! ты мне ня дзядзька і ня шый мне чаравікоў!

fets *n*, -n. **fete** *n* [*d.* Fett] тлустасьць, тлушч, тук, сала; **feter** тлусты, сыты; **fet vern*** таўсьцець, сыцець; **fet(s)kajt** *m*, -n тлустасьць, сытасьць; **fétikn** угнаіць, угнойваць; **fétdruk** *m* тоўсты (тлусты) шрыфт; **fétlájbiker** поўны, гладкі, сыты; **fétlájbikajt** *f* атлусьценьне, паўната, гладкасьць, сытасьць; **fétzajt** *f* бэкон

• a feter bisn тлусты кавалак

• fet maxn emecn di gric/jojx *iron.* ліць камусьці тук у крупнік/юшку (узбагачаць кагосьці)

• fet vi a fesl, vi xazer як тоўсты/тлусты як дзежка/сьвіньня (як печ/бабёр/мех/хамяк/шула)

• fet vi a kugl, vi a geštopte gandz тлусты як кугаль, як адкормленая гуся (як барсук/кабан/парсюк/вяпрук)

• feter vic непрыстойны (сальны) жарт

• derštikt zolstu zix mit dem fetn bisn! *kll.* каб ты тлустым кавалкам задушыўся!

• vest nit fet vern! не распанееш!

fevrál *m*, -n [*r.* февраль] люты; **fevraler** лютаўскі

fexer=foxer *m*, -s [*d.* Fächer] веер; **féxern** махаць веерам

fexlen=faxlen=fixlen [*d.* fächeln?] зьзяць, зіхацець, бліскаць, блішчэць, міг(а)цець; **féxldiker** бліскучы

fextn* **(zix)** (gefóxtn)[*d.* fechten] фэхтаваць; **fexter** *m*, -s, (-n *f*, -s) фэхтавальнік; **fexteráj** *f/n* фэхтаваньне

f"gl *abr.* **farglájxn** параўнаць, параўноўваць

fi=fix *n*, *pl.* fi [*d.* Vieh] жывёла, скаціна, быдла; **fihendler** *m* перакупшчык скаціны; **ficixtlerišer, ficuxtišer** жывёлагадоўчы; **ficuxt** *f* жывёлагадоўля; **fi-štal** *f*, -n хлеў

fialke *f*, -s *bot.* фіялка, браткі

fibern [*d.* fiebern] трэсьціся, калаціцца (ад ліхаманкі), хварэць на трасцу; **fiber** *m/n* гарачка, ліхаманка, трасца; **fiberdiker, fiberhaft(ik)er** ліхаманкавы, гарачкавы, трасцавы

fibre *f*, -s [*p.* fibra] фібра, валакно

ficine *f*, -s [*p.* oficyna] флігель, афіцына

ficken [*d.* fitzen] хвастаць, сьцёбаць, сьцябаць; **a ficke ton*** хвастануць, сьцебануць

fič-/fic-naser=pič-naser=f(l)ič naser [*d.* platschnass] мокры да ніткі (ізмок як воўк)

• vern* fić-nas прамокнуць да ніткі (да костак)

fidern [*d.* federn] быць гнуткім, пруткім, пругкім; **fideriker** гнуткі, пруткі, пругкі; **fiderikajt** *f* гнуткасьць, пруткасьць, пругкасьць

fidl *m/f*, -en [*d.* Fiedel] скрыпка; **fidlen** граць на скрыпцы, рыпаць; **fidler** *m*, -s, (-n *f*, -s) скрыпач; **fidl-šlisl** *m*, -en *muz.* скрыпічны ключ

• eršte(r)/cvejte(r) fidl першая/другая скрыпка

• iz nit gefidlt! (es fidlt nit!) так не атрымалася! не пасуе!

• špiln (af) a fidl граць на скрыпцы

• špiln di eršte fidl граць першую скрыпку

• a haldz iz nit kejn fidl *glxv.* горла – ня скрыпка

• un az di fidldike fidler /hobn fidldik gefidlt, hobn zej, /az di fidldike fidler /hobn fidldik gefidlt, ot azoj *fiksl.* і скрыпічныя скрыпачы скрыпічна скрыпелі на скрыпках, вось як

fífiker [*d.* pfiffig] вынаходлівы, пракідкі, паваротлівы, спрытны, ёмкі, хітры; **fífikajt** *f* спрыт(насьць), ёмкасьць, хітрасьць, выкрутлівасьць

• er iz a fifiker paršojn ён спрытнюга

figúr *f*, -n [*d.* Figur] фігура; **figurírn** (figurirt) фігураваць

fikcje *f*, -s [*p.* fikcja] фікцыя

fiks 1. *pl.* →fuks *m*, -n, (-ixe *f*, -s), *dim.* **fíksele** *n*, -x, **fiksl** *n*, -ex 1. ліса; 2. *n* лісінае футра; **fíksener** лісіны

fiksírn (fiksírt) [*d.* fixieren] фіксаваць; **fikser** фіксаваны; **fiksír** *m*, -n вызначэньне, акрэсьленьне (месцазнаходжаньня)

• fiks un fartik цалкам гатова

fílártiker [*d.* vielartig] разнастайны; **fílartikajt** *f* разнастайнасьць

fílbadájt(nd)iker, fílbatájtiker [*d.* vieldeutig] шматзначны; **filbadájtndikajt** *f*, **filbatájtikajt** *f* шматзначнасьць

fílbéndiker [*d.* Band] шматтомны

filc=pilc/pilč *m/n* [*d.* Filz, *p.* filc] лямец; **fílcener** лямцавы; **fílciker** падобны на лямец

fílcdódimdiker [*s.* -צדדים- →cad] шматбаковы

fílcíferdiker [*d.* Ziffer] шматзначны

fílcóliker [*d.* Vielzahl] шматлікі; **fílcolikajt** *f* шматлікасьць

fílcuzógndiker [*d.* vielsagend] шматабяцальны

fíldójresdiker [*s.* -דורות- →dor] шматвяковы (на працягу шэрагу пакаленьняў)

fil(e) [*d.* viel] многа, шмат, багата; **filkajt** *f* мноства, множнасьць; **fílerléj** мноства

• azój fil un azój fil i так многа і так многа

• azój fil gelt hot got alejn nit *glxv.* столькі грошай нават бог ня мае (дужа дорага)

• mit alte zaxn ken men nit fil maxn *šprxv.* са старызны ня шмат зробіш

• ver es fregt fil, dem entfert men fil *šprxv.* хто шмат пытае, таму і шмат адказваюць (хто пытае, той многа знае; хто ў другіх пытае, той і розум мае)

filek *m*, -n [*d.* Vielek] *mat.* многавугольнік; **fílékiker** многавугольны

fílfárbiker [*d.* Farbe] шматкаляровы; **fílfárbikajt** *f* шматколернасьць, шматкаляровасьць

fílfáx(ik)er [*d.* vielfach] шматразовы, шматкратны, разнастайны; **fílfáxikajt** *f* шматразовасьць, шматкратнасьць, разнастайнасьць; **filfax** *m mat.* кратнае

fílféld(erd)iker [*d.* Feld] шматпольны; **fílféldikajt** *f* шматпольле

fílfélkerdiker [*d.* Vielvölker-] шматнацыянальны, многанацыянальны

• filfelkerdike meluxe шматнацыянальная краіна
filfisl *n*, -ex, **filfisler** *m* [*d*. Fuss] *zool*. мнаганожка
filgeérter [*d*. geehrt] вельмі паважны, шаноўны
filgešécter [*d*. geschätzt] вельмі паважны, шаноўны
filgeštáltiker [*d*. Gestalt] разнастайны
fil(-)geteráj *f/n* [*d*. Gott] мнагабожжа, політэізм
filglid *m*, -er [*d*. Glied] *mat*. мнагачлен
filgórndiker [?] шматпавярховы
filin *m*. -es [*r*. филин] *zool*. пугач
filižanke *f*. -s [*p*. filiżanka] філіжанка, кубак
filje *f*. -s [*p*. filia] філія
filjer *m*. -s [?] гандляр рыбай; **filjeršer** які мае дачыненьне да гандляра рыбай; **filjervarg** *n* марскія прадукты
filjóriker [*d*. vieljährig] шматгадовы
filkántiker [*d*. Kante] шматгранны
filképiker [*d*. vielköpfig] многагаловы, шматгаловы, шматлікі
filkínderdiker [*d*. Kinder] шматдзетны
filklángiker [*d*. Klang] мнагагучны, шматгучны
filkolírter [*n*. kolor] шматколерны
fil(-)ájxt [*d*. vielleicht] *adv*. магчыма, мабыць, мо(жа)
film *m*. -es, **filme** *f*. -s (кіна)фільм; **filmirke** *f*. -s кінакамэра
fil(-)meneraj *nn* [*d*. Vielmännerei] паліандрыя, мнагамужжа
filmiljóniker [*d*. viele Millionen] шматмільённы, многамільённы
filminiker [*s*. -מינ-] разнастайны; **filminikajt** *f* разнастайнасьць
filmóliker [*d*. mal] шматразовы
filn [*d*. fühlen] чуць, адчуваць; **filiker**, **filbarer**, **filevdiker** [*d*. fühlbar] чулы, чульлівы; **filevdikajt** *f*, **filbarkajt** *f* чуласьць, чульлівасьць; **filung** *f*, -en адчуваньне, пачуцьцё; **fil-hernerl** *n*, -ex *zool*. шчупальца
• filn zix vi a hunt in di najn teg адчуваць сябе як сабака ў пост
• lozn* filn узьдзейнічаць
• vi filt ir zix? як вы сябе адчуваеце? як пачуваецеся?
• di velt iz ful mit cores, ober jederer filt nor zajne *šprxv*. сьвет перапоўнены горам, але кожны адчувае толькі сваё
• er hot zix gefilt vi a fejgele in nest (vi bam tatn in vajngortn, vi got in Odes, vi bam galex in arbl, vi a vorem in xren, vi a fiš in vaser) ён адчуваў сябе як птушка ў гнязьдзе (як у таты ў садзе-вінаградзе, як бог у Адэсе, як у папа ў рукаве, як чарвяк у хрэне, як рыба ў вадзе) (як у бога за дзьвярыма, як у пана бога за печчу, як у небі/раю)
• ejn harc filt di andere *šprxv*. адно сэрца чуе другое
• ver es filt zix, der mejnt zix *šprxv*. хто адчувае віну, таго чарвяк точыць (хто парася ўкраў, таму ўвушшу пішчыць; хто сала краў, таму ў вочы дым ідзе)
• vest nox kumen, vest nox filn, /vi es benkt majn harc; /švarce ojgn hobn fajer – dajne zajnen švarc... (Z. S.) ты яшчэ прыйдзеш, ты яшчэ пачуеш, як сумуе маё сэрца; чорныя вочкі хаваюць агонь – твае чорныя...
filn [*d*. füllen] на-, за|поўніць, на-, за|паўняць, начыніць, начыняць, нашпігаваць, нашпігоўваць; **filexc** *n* начынка; **filung** *f*, -en напаўненьне, запаўненьне
filšpráxiker [*d*. vielsprachig] шматмоўны
filštókiker [*d*. stöckig] шматпавярховы
filštúfik [*d*. stufig] шматступенчаты
filtájčiker [*d*. deutig] шматзначны
filtejliker [*d*. Teil] складальны, камбінаваны, састаўны
filtrafiker [*d*. Treff] *gram*. шматскладовы
filtrírn (filtrírt) [*d*. filtrieren] фільтраваць
fil-vajberáj *n* [*d*. Weib] палігамія; **filvajbernik** *m*, -es шматжэнец, паліга міст
filvéjnik, **fil-víncik** [*d*. wenig] больш-менш
filverik=fúlvarek/fúlverek/fúlvorok *m*, *pl*. -varkes/-verkes/-vorkes, **folvark=fulvark** *m*, -n/-es фальварак
filzájtiker [*d*. vielseitig] шматбаковы, шматгранны; **filzajtikajt** *f* шматбаковасьць
fil-zógevdiker [*d*. vielsagend] шматзначны
filzójmendiker [*d*. Samen] *bot*. шматнасенны, многанасенны
fincterer/finsterer [*d*. finster] цёмны; **fincternn/finstern** цямнець; мучыцца, пакутаваць, зьнемагаць, нудзіцца; **fincter/finster** *f*, **fincterniš/finsterniš** *f/n*, **fincterkajt/finsterkajt** *f* цемень, цемра(дзь), цемната; *fig*. невуцтва, недасьведчанасьць; **fincterlexer/finsterlexer** цьмяны
• es vert mir fincter/tunkl/švarc in/far di ojgn (es iz mir gevorn fincter far di ojgn) у мяне ў вачох пацямнела
• fincter iz mir majn velt цяжкае маё жыцьцё
• fincter iz mir! гора мне!
• fincter ponem змрочны твар
• fincter vi in (a) kejver, vi in Micraim, vi in an ojvn цёмна як у магіле/Эгіпце/печы (як у гробе/труне/коміне)
• fincter vi majn lebn, vi di naxt змрочны як маё жыцьцё, як ноч
• in der fincter у цемры
• a bejz/fincter jor af dir! *kll*. каб на цябе чорны год напаў!
• a fincterniš – xoć di ojgn arojscunemen цемра – хоць вока выкалі (цемрадзь лютая, цемра пякельная)
• an oreman šloft in der fincter *glxv*. бядняк сьпіць у цемры
• fincter un biter zol dir zajn! *kll*. каб табе было цёмна і горка!
• finctere zoln dir zajn dajne jorn/teg! *kll*. каб твае гады/дні былі цёмныя!
• s'iz mir biter un fincter mit dir! проста гора мне з табой!
• zaj že mir gezunt, /majn libe muter, /mir ix dox fincter, /un dir iz dox biter *flksl*. бывай жа здаровая, мая любая маці, мне млосна, а табе горка
findling *m* [*d*. Findling] знайда, знайдзён, знайдыш
fin(e)f [*d*. fünf] пяць; **finfe**, **fíneve** *adv*. ■ пятай гадзіне; **fínfele** *n*, -x пятак, манэта ў пяць цэнтаў; **finfer** *m*, -s пяцідаляравая купюра; **fínferl** *n*, -ex пяцёрка, пяць рублёў; **fínferléj** пятым чынам; **finfling** *m*, -n пяцёрка (група); (der) **fi(n)fter** пяты; **finftns** *adv*. па-пятае; **finfcíferdiker** *mat*. пяцізначны; **fi(n)ftl** *n*, -ex 1. **finftxejłek** *m* [*s*. חלק] пятая частка; 2. *kart*. пяцёрка; 3. *hum*. аплявуха, поўха; **finfek** *m*, -n пяцівугольнік; **finfékiker** пяцівугольны; **finfthalbn** чатыры з паловай; **finfjor** *n* пяцігодка; **finfjóriker**, **finfjériker** пяцігадовы; **finfštókiker**, **finfgórndiker** пяціпавярховы; **finfxadóšimdiker** [*s*. -חדשים-] пяцімесячны
• af finf furn forn fišer un firn friše fiš *gxv*. на пяці вазах едуць рыбакі і вязуць сьвежую рыбу
• der finfter jor – der finfter kind, /finf kinder, vi di cvajglex, /krixn arum mit di hojl bajxlex *flksl*. пяты год – пятае дзіцё, пяцёра дзяцей, як галінкі, коўзаюцца вакол з пустымі жывоцікамі
• finf texter, fargejt dos gelexter *glxv*. пяць дачок – гэта ня сьмешкі
• me darf im hobn vi dos/di finfte rod bam/in/cum vogn

glxv. ён патрэбны як пятае кола ў возе (як сабаку другі хвост (пятая нага); не прышый кабыле хвост)

finger *m* [*d.* Finger] палец; **fíngerl** *n*, -ex 1. пальчык; 2. пярсьцёнак; **fingerartiker** пальцападобны; **fingern** чапаць, кратаць, кранаць; **fíngerdruk** *m*, -n адбітак /сьлед пальца; **finger(h)ut** *m*, *pl.* -n/-hit напарстак; **fingerštexer** *m bot.* альяс

- bajsn* zix di finger (vos) кусаць пальцы
- gebn* emecn ibern di finger даць камусьці па пальцах
- (gejn*) af di špic finger (špic-finger) (хадзіць) на дыбачках
- grober finger вялікі палец
- grojser/langer/mitlster сярэдні палец
- hobn* klepike/lange finger *fig.* мець ліпкія/доўгія пальцы
- kenen*/visn* epes klor af di finger (kenen* epes/emecn vi zajne cen finger) ведаць нешта/кагосьці як свае пяць /дзесяць пальцаў
- kukn af epes cvišn/durx di finger глядзець на нешта скрозь пальцы
- kukn emecn af di finger пільна сачыць за кімсьці
- lebn fun di finf finger жыць працай уласных рук
- maxn finger-meloxes абдурыць (спрытнасьць рук)
- nit a klap ton* (mit) a finger on a finger палец аб палец ня ўдарыць (і пальцам не паварушыць)
- (ojs)zojgn* fun(em) finger высмактаць з пальца
- a klugn un a nar lejgt men ništ kejn finger in mojl arajn *šprxv.* разумнаму і дурню пальца ў рот не кладуць
- er iz mit im vi cvej finger (gor ejn knepl) *glxv.* ён зь ім як два пальцы (як прыкіпелі адзін да аднаго; як галубкі ў пары)
- finf finger in ejn hant un zajnen ojx nit glajx *šprxv.* нават пяць пальцаў на адной руцэ ўсе розныя (аднае маткі няроўныя дзяткі)
- kejn finger in mojl darf men im nit arajnlejgn (me badarf im kejn finger in mojl nit arajnlejgn; štek im nit kejn finger in mojl, vorum er vet opbajsn) пальца ў рот яму не кладзі (бо адкусіць) (хапае зь лёту)
- tunkt nit ajn kejn finger (nit (arajn)ton* kejn/a finger/hant) in kalt(n) vaser ня ўсадзіць пальца ў халодную ваду (за халодную ваду ня возьмецца; ён гніламу цяляці хваста не адарве)
- vest lekn di finger пальчыкі абліжаш

Fingstn *n* [*d.* Pfingsten] Сёмуха, Тройца (хрысьціянскае сьвята)

finír=fanír=fonír *m*, -n [*d.* Furnier] дыкта, фанэра; **finírener=fanírener** фанэрны

fink *m*, -en [*d.* Fink] *zool.* берасьцянка

finklen [*d.* funkeln] міг(а)цець, іскрыцца, бліскаць, зіх(а)цець; **finkl** *m* блісканьне, зіхаценьне, бляск, бліск; **finkldiker** іскравы, іскрысты, мігатлівы

- finkldik un fexldik з іголачкі (як з голкі зьняты)

finte *f*, -s [*d.* Finte] фінт, прыкідваньне

fiól *m*, -n [*d.* Phiole] фіял, кубак, шклянка

fiól *m*, -n, **fiolke** *f*, -s [*p.* fujarka?] дудка, жалейка

fioleter=violeter [*fr.* violett] фіялетавы, фіялкавы, ліловы

fir [*d.* vor] *bndv.* з(-пад), са, па-за

fir- [*d.* vor-] *knv.* прад- (паказвае на. 1. рух наперад або пастаноўку перад нечым; 2. папярэджаньне, папярэдняе дзеяньне; 3. узорнае дзеяньне)

fir- [*d.* für-] *pref.*

fir [*d.* vier] чатыры; **fire** *adv.* а чацьвертай гадзіне; **firek** *m*, -n (firvinkldike figur) чатырохкутнік, чатырохвугольнік; **firer** *m*, -s дзьве капейкі; **fírerléj** чацьвертым чынам; **fírékiker, fírékex(d)iker** чатырохкутны, чатырохвугольны; **fírfáx(ik)er** чацьвярны, які складаецца з чатырох частак; **firfísiker** чатырохножны; **firkántiker** чатырохгранны, чатырохкантовы; **firling** *m*, -n чацьвёрка

- af ale fir на ўсіх чатырох (устойліва)
- cvišn fir vent у чатырох сьценах
- di fir vent чатыры сьцяны
- gebojgn in firn сагнуты/складзены ў чатыры столкі/рэдзі
- beser fir in frejdn, ejder cvej in lejdn *glxv.* лепш чатыры ў радасьці, чымся два ў горы (лепш скасаваць благі шлюб і ажаніцца нанава)
- fir ojgn zeen mer, vi cvej *glxv.* чатыры вокі бачаць болей за два

firanke *f*, -s [*p.* firanka] фіранка

fírbrengen* [*d.* vorbringen] 1. высоўваць, выстаўляць; 2. вымаўляць

- fírbrengen* far di lipn вымаўляць/варушыць вуснамі

fírflien* [*d.* vorfliegen] ляцець, лётаць, (пра)лятаць міма

fírgebn* [*d.* vorgeben] да(ва)ць наперад, прапанаваць, прапаноўваць

fírgejn* [*d.* vorgehen] ісьці папярэдзе, здарыцца, здарацца; **firgejer** *m*, -s, (-n *f*, -s) [*d.* Vorgänger] папярэднік

fírgerixt(s)=fórgerixt(s) *n*, -n [*d.* Vorgericht] закуска (перад абедам)

fírgrizl *n*, -ex [*d.* Gruss] першае прывітаньне ў лісьце

fírhaltn* [*d.* vorhalten] па-, у|пікаць, дакараць, папракаць, рабіць вымову; **fírhalt** *m*, -n вымова

fírhang=fó(j)rhang *m*, -en заслона; драпіроўка; **fírhanke** *f*, -s, **fírhengl=fórhengl** *n*, -ex фіранка, занавеска

fírhobn* (mit) [*d.* vorhaben] мець намер, зьбірацца нечым заняцца

fírhojz *n*, *pl.* -hajzer, *dim.* **fírhajzl** *n*, -ex, **fires** *n* [*d.* Vorhaus] сенцы, калідор

fírkumen* [*d.* vorkommen] адбы(ва)цца, здарыцца, здарацца, мець месца; **fírkum** *m* выпадак, здарэньне, інцыдэнт

fírlejenen [*it.* legere, *šp.* leer] пра-, за|чыт(в)аць (у голас)

fírlejgn [*d.* vorlegen] прапанаваць, прапаноўваць, пада-(ва)ць; **fírlejg** *m*, -n прапанова, прад'яўленьне, падача; **fírlejger** *m*, -s прад`яўнік, падавец, падаўца

fírlojfn* [*d.* vorlaufen] бегчы, бегаць міма

firn (cu, mit) [*d.* führen] 1. весьці, вадзіць; везьці, вазіць; кіраваць; 2. *n*, **firung** *f* вядзеньне; катаньне; **a fir ton* /gebn*** павесьці; павезьці; **fir** *m*, -n, **firung** *f*, -en паводзіны; **firer** *m*, -s, (-n/-ke *f*, -s) правадыр, вож, вадзіцель; **fíreršaft** *f* правадырства, кіраўніцтва; **firexc** *n* трыманьне, абыходжаньне, паводзіны, учынак; **fírndiker** вядучы, кіроўны; **fírer-bixl** *n*, -ex даведнік; **fírfodem** *m*, *pl.* -fedem пуцяводная нітка, ключ да разгадкі; **fíršrift** *f*, -n пропісь

- a fir ton* mit di akslen павесьці плячыма
- azoj firt zix так павялося
- fir zix vi a menč (onštendik)! паводзь сябе як чалавек (прыстойна)!
- firn a libe вадзіць/круціць любоў (заляцацца)
- firn a seminar/togbux/milxome (kegn), di virtšaft, gešeftn весьці сэмінар/дзёньнік/вайну (супраць), гаспадарку/справы

• firn dos kind far/ba der hant весьці дзіцёнка за руку
• firn sojdes, a mišpet сакрэтнічаць, судзіцца
• firn sxojre везьці тавар
• firn zix vi a/der graf/štot-balebos, vi a šnoder af der xasene паводзіць сябе як граф/гаспадар, як жабрак на вясельлі
• gebn* a fir mitn smiček iber di strunes павесьці смычком па струнах
• vi gefeln ajx epes di firexcn? ці да спадобы вам гэтыя парадкі?
• vi s'firt zix ba lajtn як заведзена ў людзей
• cvej firer: Josl Mojše firt vaser, un got firt di velt (cvejen firn: der ojberšter firt on mitn alvelt, un Bere der vaserfirer firt on mit zajn kljače) два правадыры: Ёсель-Моўша возіць ваду, і бог водзіць сьвет (і Бэрка-вадавоз кіруе сваёй клячай) (*vrtš.* "firn" вазіць – вадзіць)
• vi me firt, azoj hot men *sprxv.* як вязеш, гэтак і маеш

firnemen* [*d.* vornehmen] распач(ын)аць, узяцца, брацца; **firnem** *m*, -en, **firnemung** *f*, -en справа, пачынаньне, **firnemer** *m*, -s, (-n *f*, -s) прадпрыемец, прадпрымальнік; **firnemerišer** прадпрыемніцкі, прадпрымальніцкі
• firnemt zix fir, azoj helft got *glxv.* працуй, нябожа, то і божа памажы (божа памажы, але і сам падбяжы)

firplojdern [*d.* vorplaudern] вярзьці лухту, (на)балбатаць, (на)малоць (языком), пустасловіць (перад кімсьці)

fir(s)ken=furken=forsken/foršken [*p.* furkać, parskać, *ukr.* фиркати, форкати] 1. фыркаць, пырхаць; 2. *n* храп (коньскі); **a firske ton*** фыркнуць, пырхнуць

firšpiln [*d.* vorspielen] паказ(в)аць, як трэба гуляць (у нешта)

firšprex ■ [*d.* Fürspreche] хадайніцтва; **firšprexer** *m*, -s, (-n *f*, -s) хадайнік
gos *m*, -n [*d.* Guss] залева, улева, лівень, патоп, зьліва; **(zix) a gos ton*** лінуць, пляснуць, пырскнуць; **gósajzn=gúsajzn** *n* форма для адліўкі
• s'hobn a gos geton trern fun ire ojgn сьлёзы пырскнулі ў яе з вачэй
• s'hot (mitamol) a gos geton a regn лінуў (раптам) дождж
gospode *f*, -s [*ukr.* господа] (заезны) дом, гаспода
gospodín *m* [*r.* господин] спадар; **gospodinje** *f*, -s [*p.* gospodyni] гаспадыня, спадырыня
gostinec/goščinec *m*, -nces [*p.* gościniec] 1. гасьцінец, шлях; 2. гасьцінец (падарунак)
• a gešlogener gostinec выбіты/укачаны гасьцінец
• er iz nox alc afn altn gostinec ён усё яшчэ на старым гасьцінцы (у тую ж дудку грае)
got *m*, *pl.* -n/geter, (-n/-ixe *f*, -s) [*d.* Gott] бог, бажаство; **gótenju** *m* божухна мой; **gothajt** *f*, -n бажаство; **gótsdinst** *f/n*, -n набажэнства, служба; **góts-farlejkener** *m* чалавек, які ня верыць у бога; атэіст, бязбожнік, баглай, блюзьнер; **gótsforxtiker** богабаязны; **gótsforxtikajt** *f* страх перад богам, багабоязь; **gótlozer** бязбожны; **gótlozikajt** *f* бязбожжа; **góts-kiele** *n*, -x, **góts-behejmele** *n*, -x [*s.* ־בהמה־] *zool.* божая кароўка, богаўка, багоўка, кузурка, барбуха; **góts-štrapče** *m*, -s (gots strapče) [*r.* стряпчий] *pejor./iron.* крывадушнік, бажона, сьвяцец, дэвотка; **gots nomen** *m* дзень пасьля Ём-Кіпуру
• az got vet gebn… калі бог дасьць...
• er hot in zix kejn got nit ён ня мае ў сабе (за душой) бога
• got cu (far)danken (danken got; a dank got) дзякуй/дзякуючы богу
• got helf! памагай бог! богпомач! бог у помач!
• got hot gebotn уласна (кажучы)
• got iz mit dir/ajx! бог з табой/вамі!
• got vejst vos бог ведае што
• got zol nit štrofn far di rejd хай бог даруе (не карае) за словы
• gotenju! got majner! божухна мой!
• gots gezegns вырадак
• gots vunder *hum.* божыя цуды (цуды ў рэшаце)
• hobn* got in harcn мець бога ў сэрцы (чулае сэрца)
• nemen*/haltn* got far der bord узяць/трымаць бога за бараду
• on got in harcn бяз бога ў сэрцы, без усялякага сораму
• švern* zix ba got бажыцца
• tajne/šraj cu got! крычы да бога!
• um got(e)s viln (vi got iz dir/ajx lib!) богам прашу; дзеля бога!
• alc, vos got tut, muz zajn gut *šprxv.* усё, што бог робіць, мусіць быць добра
• az got vil nit gebn, ken men zix alejn nit nemen *šprxv.* бог не захоча даць – сам ня возьмеш
• ba got iz alc meglex *glxv.* богу ўсё льга; ba got iz alc milxik богу ўсё малочнае (пародыя на папярэднюю прыказку)
• biz morgn iz nox got a foter (got iz a tate/foter) *glxv.* (заўтра –) бог бацька (пераначуем – болей пачуем; хай будзе, што будзе; што будзь, то і дзейся; і заўтра зноў будзе дзень)
• cu got derlejgt men nit *šprxv.* богу не дакладзеш

• got hejst ojx ništ zajn kejn nar (kejn nar ništ zajn) *glxv.* і бог кажа: ня будзь дурнем (божа, памажы, а сам не ляжы)
• got hot gegebn, got hot genumen *šprxv.* бог даў, бог узяў
• got iz a šejner balebos *šprxv.* бог – добры гаспадар
• got iz ejner, vos er tut, zet kejner *glxv.* толькі адзін бог робіць так, што ніхто ня бачыць
• got iz mešuge! бог - вар'ят!
• got nemt mit ejn hant un git mit der andere *glxv.* бог бярэ адной рукой, але дае другой (бог бярэ, бог дае; бог засмуціць, бог пацешыць)
• got vejst, vos er tut *šprxv.* бог ведае, што ён робіць
• got vejs(t) šojn gor nit, vos er tut бог зусім ня ведае, што ён робіць
• gotenju, hejb mix nit hojx uf, un varf mix nit niderik arop божухна мой, не ўздымай мяне высока і ня кідай мяне нізка (звалiўся з высакосьці, паламаў косьці)
• mit got ken men zix nit šlogn *glxv.* з богам біцца ня будзеш
• vos cu got iz cu got, (un) vos cu lajtn iz cu lajtn *glxv.* богу – богава, людзям – людзкае (богу багаваць, а нам працаваць)

gótiser [*r.* готический] гатычны

grab=hrab *m*, -n [*p.* grab, *r./ukr.* граб] *bot.* граб

grabjóż *m* [*p.* grabież, *r.* грабёж] грабеж, рабунак

grablen [*ukr.* грабати, *p.* grabić] грэбці; драпаць; **grablen zix** 1. корпацца, капашыцца, кешкацца; 2. (af) караскацца, карабкацца; **(g)rablje=hrablje** *f*, -s граблі; **grábljeven** грэбці, грабаць

gracje *f* [*d.* Grazie] грацыя; **gracjezer** грацыёзны; **gracjezkajt** *f* грацыёзнасьць

grač *m*, -n/-es [*p.* gracz, gracki] 1. ігрок, гулец; 2. гарач(лів)ы, спрытны, дзелавы чалавек, спрытняга
• beser fun a grač a pač, ejder fun ■ nar a kuš *glxv.* лепш ад зуха аплявуха, чымся ад дурня пацалунак (лепш, як харошы выб'е, ніж брыдкі пацалуе)

grač(e)n [*d.* kratzen, *sl.*?] драпаць, драць кіпцюрамі

gračke=g(o)račke *f*, -s гарачка, мітусьня, важданіна

grad(us) *m*, -n [*d.* Grad] градус; ступень; **gradacje** *f* градацыя; **gradírn** (gradírt) клясыфікаваць, ранжыраваць; **grádusdiker** градусны; **grádusnik** *m*, -es тэрмомэтар, градусьнік

grad(e)=grod(e) [*d.* gerade] *adv.* уласна, як-раз, дакладна, менавіта; **grader=groder** 1. прамы; 2. цотны

graf *m*, -n [*d.* Graf] граф; **grafšaft** *f*, -n графства
• ojszen* vi a graf (Potocki) выглядаць як граф (Патоцкі)

grafe *f*, -s [*ukr./r.*, *gr.*] графа

grafin *m*, -en, **grafinke** *f*, -s [*r.* графин] графін, карафа

grafik *f* [*d.* Graphik] графіка; **grafik** 1. *m*, -es графік, расклад; 2. *m*, -n *mat.* графік; **gráfišer** графічны; **grafírn** (grafírt) лінаваць, лінеіць

grafke=agrafke *f*, -s [*p.* agrafka] ангельская шпілька

gragen [*ukr.* грагати] кракнуць, кракаць; **gra-grá** *int.* кра-кра

gráge(r)n=gréjgern [*p.* grzechotka, *ukr.* грагати] сакатаць, стракатаць, лапатаць; бразгатаць, гракаць, трашчаць (аб коніках); **grager=gre(j)ger** *m*, -s трашчотка, бразготка; лапатун; **gragerái** *n* сакатаньне, бразгатаньне, трашчаньне, трэскат
• az a tojbet hert a grager, maxt er a broxe iber a duner *glxv.* калі глухі чуе бразготку, ён моліцца, як на гром (глухі не дачуе, дык прыложыць/лабрэша; паехалі глухія, павязьлі дровы сухія)

grajcer *m*, -s [*p.* grajcar] корачнік, штопар

grajcer=krajcer *m*, -s [*d.* Kreuzer] крэйцар (манэта)

grajfn* (gegrífn/gegrájft) [*d.* greifen] схапіць, хапаць

grajlex [*d.* grell, *mhd.* griulich] *adv.* уласна, якраз, дакладна, менавіта, вельмі; **grájlexer** добры, станоўчы, дадатны
• s'kon grajlex zajn вельмі можа быць (можа так здарыцца)

grájpele *n*, -x, **grajpl** *n*, -ex [*d.* Graupe] крупінка, драбінка, дрaбок; **grájpldiker** крупчаты, пытлёвы

grajšl *n*, -ex [?] *kul.* вантробы; **grajšlfus=krajzlfus** *m kul.* квашаніна з вантробамі

grajz *m*, -n [*d.* Greis] стары дзед; **grajzer, grajz-grójer /-gro(v)er** [*d.* greis, grau] сівы
• majn štender mit majner grajzn! *glxv.* гэта маё месца разам з маімі памылкамі! (як хачу, так і чытаю!) (кажа чалавек, які выкупіў сабе месца ў сынагозе)

grajz *m*, -n [*d.* kraus?] апіска, памылка, аблуда, заблуканьне, хіба; **grajzn** памыліцца, памыляцца, схібіць; **grájziker** памылковы, аблудны
• maxn a grajz зрабіць памылку

grajzlen=krajzlen zix [*d.* kräuseln] кудзерыць, кучаравіць, заві(ва)ць (валасы); **grajzl** *n*, -ex кудзер, локан, пасма; **grájzldiker** кучаравы; **grajzler** *m*, -s чалавек, які завівае валасы

grajžik *m*, -es [?] рубец, кіндзюк, флякі, трыбух

grak *m*, -n [*p.* grak, *ukr.* грак] *zool.* грак

gralnje=goralnje=g(u)ralnje *f*, -s бровар, вінакурня; **g(u)ralnik** *m*, -es браварнік, вінакур

gram *m*, -en [*d.* Gramm] грам

gram *m*, -en [*d.* Reim, *mhd.* gerime] рыфма (асабліва аб імправізацыях бадхэна на вясельлі); **gramen (zix)** рыфмаваць; **grámenflexter** *m*, **grámenmaxer** *m*, -s, **grámenzoger** *m* рыфмаплёт; **gram-štrám** *m* пісаніна (аб кепскіх вершах)
• gram-štram max mir a letnik! нейкая бязглузьдзіца!
• kejn gelt, kejn sxojre, kejn tam, kejn gram *glxv.* німа грошай – німа тавару, німа густу – німа вершаў

gram=gerám *m* [*s.* גרם] прычына

gramatik *f*, -es, **gramátike** *f* [*p.* gramatyka] граматыка, правапіс; **gramát(ikál)išer** граматычны; **gramátiker** *m* знавец граматыкі

gramer=gromer=geramer=gerojmer прасторны, раскошны, разьлеглы

grámete *f*, -s [*gr.*] грамата; **grámetner/grámotne(r)** граматны, пісьменны; **grámetnekajt** *f* граматнасьць, пісьменнасьць

grande [*p.* granda]
• af grande *argo* сілаю, сілком, гвалтам
• nemen* af grande браць на пушку

grandiezer [*d.* grandios] грандыёзны, велізарны; **grandiezkajt** *f* грандыёзнасьць, велізарнасьць

gránet(en)er/gránat(en)er [*mhd.* gran, *p.* granatowy] гранатовы, цёмна-сіні

granírn (granírt) [*ukr.* гранити] граніць; **granirter** гранёны

granít *m* [*d.* Granit] граніт; **granitener** гранітны

granke *f*, -s [*r.*] *plgr.* гранка

Granov мястэчка Гранаў (Украіна)
• er kukt kejn/in Granov *glxv.* ён касавокі

(g)rase *f*, -s [?] яма для вапны

grášice=krášice *f*, -s [*p.* grasica] вальлёвая/вальляковая залоза (у цяляці)

grate *f*, *pl.* -s/gratn [*ukr.* грати, *p.* krata] краты

gratke=gradke *f*, -s [*ukr*. грядка] паліца (для посуду)
gratulírn (gratulírt) [*d*. gratulieren] віншаваць; **gratuljacje** *f*, -s, **gratulirung** *f* віншаванье
gravi *m*, **graver** *m* [*r*. гравий] гравій, жвір, жарства
gravjúr *f*, -n [*d*. Gravüre] гравюра; **gravirter** гравіравальны; **gravírn** (gravírt) гравіраваць; **gravirer** *m*, -s гравёр
greb *f*, -n [*d*. Grobheit, *mhd*. grob] таўшчыня, грубіня; **greber=grober** тоўсты, грубы; **gréblexer** грубаваты; **greber vern*** паўнець, таўсьцець; **grébern** таўсьціць, рабіць надта поўным
greber [*d*. Gräber, *p*. grabarz] грабар, землякоп; далакоп, магільшчык
greblje=hreblje *f*, -s [*p*. grobla, *ukr*. гребля] грэбля, гаць
(g)rečke=grike *f* [*ukr./r*. гречка] грэчка; **gréčener=grikener** грэчневы
• grečene kaše грэчневая каша
grejs *f*, -n [*d*. Grösse] велічыня; **grejsn** усхваляць; **grejsn zix** (mit) гардзіцца, ганарыцца
• absoljute grejs *mat*. абсалютная велічыня
grejtn [*d*. bereiten, *mhd*. gereiten] рыхтаваць, гатаваць; **grejter** гатовы, падрыхтаваны; **grejtkajt** *f* (cu) гатоўнасьць, падрыхтаванасьць; **grejtung** *f* падрыхтоўка
• er iz šojn grejt geven maskim zajn, nor er hot zix batraxt ён быў ужо гатовы пагадзіцца, але перадумаў
• grejt zajn* gejn in fajer un in vaser быць гатовым пайсьці ў агонь і ў ваду (бога ашукае і ў чорта адхопіць)
• grejte malbušim/klejder/halboše гатовае адзеньне
• grejtn cum tiš накрыць на стол
• grejtn dem bux cum druk рыхтаваць кнігу да друку
• grejtn di limudim рабіць урокі
• grejtn zix cu der nesie рыхтавацца да ад'езду
• maxn zix grejt падрыхтавацца
• zajn* af alem grejtn быць да ўсяго гатовым
• grejt men im un al dos guts, /dos ort far im gelozn; /nox Havdole štil avek, /a broxe ibergelozn (P. H.) яму накрылі стол, падрыхтавалі месца; пасьля суботняй малітвы ён ціха сышоў, зрабіўшы бласлаўленьне
grejxn (biz, cu) [*d*. reichen, *mhd*. gereichen] дасягнуць, дасягаць, даста(ва)ць; **grejx** *m*, -n дасяжнасьць, дасягальнасьць; **grójx(nd)iker** дасяжны, дасягальны
• gring cu grejxn лёгкадасягальны
• in grejx у межах дасягальнасьці
• vajt grejxndik з далёкай пэрспэктывай
grek *m*, -n [*p*. grek] грэк; **grékišer** грэцкі
grek *m*, -n [?] вузел, пучок валасоў
greler [*d*. grell] рэзкі (колер)
grémpljeven [*d*. krempeln?] часаць (лён/воўну); **gremplje** *f*, -s часалка
grende=gžende *f*, -s [*p*. grzęda] курасадня, куросадні, сéдала
• firn di grende вяршыць справамі
grenec *m/f*, -n [*d*. Grenze] мяжа, граніца, грань, руб, рубеж; **grénecn (zix)** (mit) гранічыць, межаваць; **grénecdiker** гранічны, рубежны, памежны; **grénecloz(ik)er** бязьмежны, безгранічны; **grénec-brexer** *m* парушальнік граніцы; **grénec-hiter** *m*, **grénecler** *m*, **grénec-vexter** *m* пагранічнік; **grénec-opcol** *m* мытны збор; **grénecpas** *m* пагранічная палоса; **grénec-stojp** *m*, -es, **grénec-slup** *m*, -es, **grénecštejn** *m*, -er пагранічны слуп; **grénec-vax** *f* пагранічная ахова
• arojsgejn* fun di grenecn выйсьці за межы
• on a grenec, on a breg канца-краю німа
grenkes *pl*. *kul*. грэнкі
grepc(e)n/grebc(e)n [*mhd*. grob, grop] 1. (ад)рыгаць; 2. *n*, **grepc/grebc** *m*, -n адрыжка, адрыганьне; **a grepc ton*** рыгнуць
• grepcn vi a xazer адрыгнуць як сьвіньня
• a grepcele arojs, a gezuntele arajn! адрыжачка, выходзь, здароўечка, уваходзь! (кажуць, кормячы немаўля)
• me zol dix ajnladn cum gubernator af a sude, un du zolst im gebn a grepc in ponem arajn! *kll*. каб цябе запрасілі да губэрнатара на бяседу, і каб ты яму ў твар рыгнуў!
gréserer (grojser) [*d*. gross] большы; **grésern zix, greser vern*** павялічвацца
• in grestn tejl у большасьці, большай часткай, балышынёй
• der ejberšter zol gebn undz besers un ajx gresers! каб бог даў нам лепей, а вам болей!
• me ken maxn dem xolem greser, vi di naxt *šprxv*. сон можа здавацца большым за ноч
gret *n* [*mhd*. geraete] бялізна; **grétklamer** *m*, -n прышчэпка для бялізны; **grétštrik** *m* вяроўка для сушэньня бялізны
gret *m* [*d*. Gräte] костка рыбы
grezer *pl*. →groz *n*, -n, *dim*. **grezl** *n*, -ex, **grézele** *n*, -x трава
gríbene *f*, -s, **griv** *f*, -n, **grivn** *m*, -s [*d*. Griebe] *kul*. гусіны шмалец, шкварка, скварка
griber *pl*. →grub *f*, *dim*. **gríbele** *n*, -x; **gribl** *n*, -ex яма, яміна; магіла, дол; **gríberdiker** ямісты, у ямах; **griblen zix** (in) капацца, рыцца; **gríbleniš** *f*, -n, **gribleráj** *f* калупаньне ў дробязях
• es šviblt un griblt аж кішыць
• griblen zix in der nešome капацца ў душы
• štark griblen zix удавацца ў падрабязнасьці
gric *n* [*d*. Grütze] крупы, груца; *kul*. крупеня, крупнік
grike=grečke *f* [*p*. gryka] грыка, грэчка; **grikener=gréčener** грэцкі
gril *f*, -n [*d*. Grille] *zool*. цьвіркун, цыркун; **gril(c)n** 1. цьвіркаць, цыркаць, стракатаць; скрыга(та)ць; ляскаць, бразгаць; лямантаваць, галасіць, крычаць; 2. *n*, **grilc** *m*, -n скрогат, скрыгатаньне; **a grilc ton*** бразнуць; **grílc(nd)iker** пранізьлівы (аб гуку)
• grilcn emecn in di ojern стракатаць/цьвіркаць камусьці ў вушы (пратрубіць вушы)
• di kiške fult zix, der mogn grilt zix, di milx brit zix, un di kaše priet zix – un do bin ix ejn menč alejn, un in mark arajn muz men ojx gejn (un do iz frajtik) *glxv*. кішка поўніцца, страўнік бурчыць, малако кіпіць, каша прэ – а я тут адна, і на кірмаш таксама ісьці трэба (а сёньня пятніца)
• in majn štibl iz ruik, es grilct nor di gril, /arum štibele flist zix a vaserl štil, /arum štibl – fil bejmer, fil blumen – arum, /kum cu mir in der naxt, majn gelibter, o kum! (J. H.) у маёй хатцы ціха, толькі цвыркае цвыркун, каля хаткі ціха цячэ вадзіца, каля хаткі шмат дрэўцаў і кветак, прыйдзі да мяне ўначы, мой любы, о прыйдзі!
• špiln di griln, tancn di vancn *glxv*. граюць цьвіркуны, танчаць клапы (бычкі іграюць у лучкі, а цёлкі ў сьвісьцёлкі, а бараны ў арганы, а коні ў гармоні)
grímcorn *m* [*d*. Grimm, Zorn] гнеў, злаваньне, сердаваньне, ярасьць, абурэньне, азьвярэньне, разьюшанасьць; **grimen** злаваць, абурацца, лютаваць, бушаваць; балець (у жываце); **grímeniš** *//n* боль, калацьце, колька

• es grimt mir in bojx мне бурчыць у жываце
• in grimcorn з абурэньнем
• grimeniš in bojx бурчаньне ў жываце

grimplen (af) [*d.* klimpern, rumpeln?] брынкаць, дзынкаць, тромкаць

grind *m*, -n, **grindl** *n*, -ex [*d.* Grind] струп, вогнік, лішай, парша (у чалавека); **gríndiker** паршывы

grindn [*d.* gründen] 1. заснаваць, засноўваць, закласьці, закладаць; 2. *n*. **grindung** *f* заснаваньне, заклад; **grinder** *m*, -s, (-n *f*, -s) заснавальнік, фундатар; **gríndlexer/gríntlexer** грунтоўны; **gríntlexkajt** *f* грунтоўнасьць; **gríndungsfarzamlung** *f*, -en установчы сойм

grín(d)žele *n*, -x [*rum.* grindéi] полаз (у саней)

griner [*d.* grün] зялёны; **grín(b)lexer** зеленаваты; **grinen** зелянець; **grínendiker** які зелянее; **grinkajt** *f*, -n зялёнасьць, зялёны колер; **grins** *n*, -n, **grínvarg** *n* зеляніна, зеляніва, гародніна; **grin** *m kort.* віны; **gríns-hendler** *m*, **grins-farkojfer** *m* зеленіўшчык

... dos mejdl grin віновы туз, віновая дама

... зялёны як трава

... tet a stibl /mit a grinem dax. /un arum dem štibl ... elex a sax (Z. R.) каля мястэчка стаіць хатка ... дахам, а вакол хаткі расьце шмат дрэўцаў

... geringe] лёгкі; **gríngerhéjt** *adv.* улегцы; **gring-** ... касьць; **gringnker** лёгенькі; **gríng-dejediker** ... лёгкадумны, безразважлівы; **gríngglejbiker** ... даверлівы, лёгкаверны; **gríngvogiker** няважкі, лёгкі на вагу

• a gringer tojt лёгкая сьмерць
• es maxt zix nit azoj gring гэта робіцца ня так лёгка
• fun der gring мімаходам, мімаходзь
• gring afn šlof/rubl лёгкі на сон/грошы
• gring vi ■ bejgl ufcuesn, vi ba a litvak a droše, vi ba a xosid a bisl branfn nemen лёгка як абаранак зьесьці, як літваку казаньне, як хасыду чарка гарэлкі (як арэх раскусіць; як хлеба з маслам зьесьці; як сабаку муху схапіць, як лапаць сплесьці; як нагу у бот уставіць; як пёрынку асмаліць/спаліць; як волас перапаліць; як хукнуць)
• gring vi luft, vi a feder/hor лёгкі як паветра/пёрка/волас (як камар/птушка/пух/перына́)
• az me kakt zix ojs, vert gringer af dem harcn *glxv.* калі высярэшся, становіцца лягчэй на сэрцы
• az me redt zix ojs dos harc, vert gringer *šprxv.* калі выгаварышся, становіцца лягчэй на сэрцы
• bin ix nit gevezn a jor un cvej, a jor un cvej, /iz dox mir gevorn zejer vej, zejer vej, /hob ix zix gemaxt gring, vi a fejgele, gring, vi a fejgele, /un bin cu ir geflojgn *flksl.* я не была год і два, мне стала вельмі балюча, я абярнулася птушкай і да яе (да маці) прыляцела
• gring iz cu krign ■ sojne, šver iz cu krign a frajnd *glxv.* лёгка здабыць ворага, цяжка здабыць сябра
• nit azoj gring tut zix, vi s'redt zix *glxv.* не так лёгка робіцца, як гаворыцца
• vos ba a menčn iz šver, iz ba got gring *šprxv.* што цяжка чалавеку, лёгка богу

gringšacn/gríngšecn [*d.* schätzen] зьняважыць, зьневажаць, грэбаваць, пагарджаць, недаацаніць, недаацэньваць; **gríngšecerišer** зьняважлівы, пагардлівы, грэблівы; **gríngšecung/gríngšacung** *f* грэбаваньне, пагарда, недаацэнка

Grín-xoge *f* [*s.* חג הסנה] Зялёныя сьвяткі, Сёмуха, Тройца (хрысьціянскае сьвята)

gripe *f*, -s [*d.* Grippe] *med.* грып

griske *f*, -s [*d.* Griess, *p.* grys] чорны хлеб

grisn=gerísn [*d.* grüssen] (пры)вітаць; **grisn zix** (mit) вітацца, здароўкацца, рукацца

• lozn* grisn emecn перадаваць прывітаньні камусьці
• zajt (mir) gegrist! вітаю вас!

griv *f*, -n, **grivn** *m*, -s, **gríbene** *f*, -s *kul.* гусіны шмалец, скварка, шкварка

• cu hering darf men kejn zalc (cu a hering badarf men kejn zalc) un cu grivn kejn šmalc *šprxv.* селядцу ня трэба солі, а шкваркам – тлушчу
• der nogid pišt nit mit bojml un kakt nit mit grivn *šprxv.* багацей ня сцыць алеем і ня сера шмальцам
• mešugene gendz – mešugene grivn! (vi di gandz/gendz, azoj di grivn) *glxv.* вар'яцкія/якія гусі – вар'яцкі/такі шмалец! (якое вогнішча, такі і дым, які бацька, такі і сын; якое карэньне, такое і насеньне; які куст, такі і парастак; які род, такі і плод)

grive=gživ(k)e/gžib(k)e *f*, -s, *dim.* **grivke** *f*, -s [*p.* grzywa, *r./ukr.* грива] грыва

grivn(j)e *f*, -s, **grív(n)inke** *f*, -s, **grívenik** *m*, -es [*p.* grzywna, *ukr.* гривня] грыўна

Grixnland *n* [*d.* Griechenland] Грэцыя; **grix** *m*, -n, (-n *f*, -s) грэк; **grixišer** грэцкі; **grixiš** *n* грэцкая мова

grizen/grižen=hrižen [*p.* grzyść, *ukr.* гризти] грызьці; **grizote=hrizote** *f* згрызота

• grižen vi a mojz/hunt грызьці як мыш/сабака (як іржа жалеза)
• az es iz nito kejn flejš, grižet men bejner *šprxv.* калі німа мяса, мусіш грызьці косьці (як німа мяса, то і грыб закраса)

grizin(j)e *f* [?] рэпа, бручка

grober (gréberer) [*d.* grob] тоўсты; грубы; **grobák** *m*, -es таўстун, тоўсьцік, гладун, шула, апуцак, барыла; **gróblexer** грубаваты, дастаткова грубы; **grobján** *m*, -en/-es, (-ke *f*, -s), **grubján** *m*, -es, (-ke *f*, -s) [*d.* Grobian], **groberjúng** *m*, *pl.* grobe-jungen грубіян, хам(ула); **grobijanstve** *f* грубіянства; **grobijanske(r)**, **grob-júngišer** грубы; **grobkajt** *f*, -n грубасьць, грубіянства; **gróbbajxiker** таўстапузы, гладкі, чараваты, пузаты; **gróbhojtiker** таўстаскуры; **gróbkepiker** тупагаловы; **gróbvoliker** грубашэрсны

• a grober feler грубая памылка
• a grober finger вялікі палец
• a grober kop тупіца
• a grober nar тоўсты дурань
• drejen mitn grobn finger *fig.* пускацца ў разважаньні
• grob vi a budke/bečke/xazer тоўсты як будка/бочка/сьвіньня
• grob vi a fesl, vi xazer як тоўсты/тлусты як дзежка/сьвіньня (як печ/бабёр/мех/хамяк/шула)
• grobe vi klecer тоўстыя як бярвеньні (як дзяжа/печ/бабёр/мех/хамяк/шула, як куль саломы)
• redn* grob грубіяніць
• a rubl iz nit kejn gelt, un a grober-jung iz nit kejn bruder *šprxv.* рубель – ня грошы, а хам – ня брат (жук – ня мяса, швагер – не прыяцель; воцат – ня водка, а кума – ня жонка)
• gelt halt zix nor in a grobn zak *glxv.* грошы трымаюцца толькі ў грубым мяху (у грубага чалавека)
• vos a grober bojx kost, volt ix gevolt hobn/farmogn – vos er iz vert, zol majne sonim farmogn што тоўстае бруха каштуе,

хацеў бы я мець – чаго яно варта, хай мае ворагі маюць

grobn* (gegróbn) [*d.* graben] 1. капаць; 2. *m*, -s роў, яр, канал; **gróbajzn** *m/n*, -s рыдлёўка, жалязьняк

• du zogst, du host mix lib, /du gejst arajn in štub, /du gejst avek cu an ander mejdele /un grobst af mir a grub *ftksl.* ты гаворыш, што мяне любіш, ты ўваходзіш у хату, ты ідзеш да другой дзяўчыны і рыеш мне магілу

• štil vaser grobt tif *šprxv.* ціхая вада хавае глыбіню (ціхая сьвіньня глыбока рые; у ціхім віры чэрці водзяцца)

grócemer [?]

• grocem gold (grocemer gelter) процьма грошай

grod(e)=grad(e) [*d.* gerade] *adv.* уласна, якраз, дакладна, менавіта

• un grod ot dos hot im ufgebraxt менавіта гэта яго ўзарвала/дапякло

grod *m* [*d.* gerade] цот, чог; **groder=grader** 1. прамы; 2. цотны; **grode** *f*, -s *mat.* прамая; **grodek** *m*, -n *mat.* прастакутнік, прамавугольнік; **gródekiker** прастакутны, прамавугольны; **grodkajt** *f* прамізна; **gródlíniker** прасталінейны, прамалінейны; **gródlínikajt** *f* прасталінейнасьць, прамалінейнасьць; **gródlinik-harber** нехлямяжны, нязграбны; **gródvínkldiker** прастакутны, прамавугольны; **gródtlóike** *pl. zool.* парнакапытныя

• grod do дакладна тут

• grod farkert цалкам наадварот

• grod iz štendik gut (nor nit ba di hojšajnes) *glxv.* цот – заўжды добра (толькі не для галінак вярбы, якія прывязваюць да пальмавай галіны на Кучкі)

gro(j)er, grover [*d.* grau] шэры; сівы; **grojen, grojzn** шарэць; сівець; **grojkajt, grovkajt** *f*, -n шэрасьць; сівізна; **grójlexer, gróvlexer** шэраваты; сіваваты; **grovbórdiker** сівабароды; **grovhóriker** сівавалосы

• groj vi a tojb, vi aš, vi der ovnt сівы як голуб/попел/вечар (як лунь/зайчык/яблына)

• a duler/narišer kop vert kejnmol nit groj дурная галава не сівее/лысее

• a kop mit groje hor un mit grine sejxl (vos kumt arojs fun a grojen kop, az der sejxl iz grin?) *šprxv.* валасы сівыя, а розум зялёны (галава пасівела, а розуму не набрала; барада выросла, а розуму ня вынесла; век зжыў, а розуму не нажыў; барада па пояс, а розуму ні на волас)

• di cajt maxt groj di peje un endert di deje *šprxv.* час беліць валасы і мяняе меркаваньні

• di cajt maxt dem menćn groj un alt *šprxv.* час робіць чалавека сівым і старым

• groje hor zajnen kvores-bletlex *glxv.* сівыя валасы – кветкі на магіле

grojgres-derabi-códek *f* [*s.* גרוגרת־דרבי־צדוק] 1. высмактаная і высушаная фіга; 2. *fig.* хударлявы, схудалы, шчуплы, мізэрны, сухарлявы чалавек, худак (паводле гісторыі з Геморы)

• a klejns, a nideriks, a trukns vi a grojgres-derabi-codek, vi a fajg, hejst es (Š.-A.) маленькі, нізкарослы, сухарлявы, схудалы, як высушаная фіга

• er zet ojs vi a grojgres derabi Icxok (Codek) *glxv.* на яго паглядзець – адно косьць ды скура (ногі ды рогі, рэбры ды скура)

grojl *m*, -n [*d.* Greuel] страх, жах, кашмар, дрыжыкі, дрыготка, спалох; **grojln** жахнуцца, жахацца, дрыжаць, баяцца, (с)палохацца, пужацца; **grójliker, grójlener** кашмарны, брыдкі, агідны (аб учынку), жудасны, жахлівы; **grójlikajt** *f* жуда(сьць)

• a grojliker tojt жудасная сьмерць

• er iz mit im a grojl mit a grojl ён зь ім як зь лепшым сябрам

• es grojlt mir мяне калоціць (дрыжыкі б'юць)

• grojl fun farvistung агіднасьць запусьценьня

grojmer=g(e)ramer [*d.* geräumig] прасторны, ёмісты; **grojmkajt** *f*, -n прасторнасьць, ёмкасьць, ёмістасьць; **grojmen zix** зьмесьціцца, зьмяшчацца

Grojnem [*s.* גרונם] Гройнэм, мужчынскае імя (часта *iron.*)

grojp *f*, -n, *dim.* **grájpele** *n*, -x, **grajpl** *n*, -ex [*d.* Graupe] крупы, крупіна; **grójpener** крупяны; **grójpnrajser** *m* крупадзёрка

• zuxn a grojp (in šitere zup) шукаць крупіну (у рэдкім супе)

• er cejlt di grojpn in top arajn *glxv.* ён лічыць крупы, калі кладзе ў гаршчок (скупы і з камара кроў высмакча)

grojser (gréserer, grester) [*d.* gross] вялікі, буйны, значны; **grojs** *f*, -n велічыня; **grojskajt/grojshajt** *f*, -n гордасьць, вялікасьць, веліч; заразумеласьць, задаваньне, пыха, амбіцыя; **grojsn** вялічыць, узносіць; **grojsn zix** ганарыцца, надзімацца, пышыцца, занасіцца, задавацца, амбіціцца, фанабэрыцца; мець многа мух у носе; **grójsinker** *kšp.* велікаваты; **grójsartiker** грандыёзны, пышны, велічны, вялікасны; **grójsartikajt** *f* грандыёзнасьць, пышнасьць, велічнасьць, вялікаснасьць; **grójshalter** *m*, -s, (-ke *f*, -s) ганарлівец, горды, гардун, надуцік, амбіт, пышка; **grójshalterišer** ганарлівы, заразумелы, амбітны, пышлівы, фанабэрысты; **grójshalteráj** *f*, **grójshalteriškajt** *f* ганарыстасьць, гордасьць, гонар, пыха, фанабэрыя; **grójshantiker** вялікі (аб літарах); **grójsharciker** велікадушны; **grójsharcikajt** *f* велікадушнасьць; **grójsheršerišer, grójsmextiker** вялікадзяржаўны; **grójsheršeriškajt** *f*, **grójsmextikajt** *f* вялікадзяржаўнасьць; **grójskajt-manje** *f*, **grójskajt-mešugas** ▪ [*s.* משוגעת־] манія вялікасьці; **grójs-krax** *m*, -n [*s.* (?-)כרך-] мэгаполіс, вялікі горад; **grójsmaxt** *f*, -n вялікая ўлада (дзяржава); **grójs-misxer** *m* [*s.* מיסחר-] вялікі бізнэс, гандаль; **grójsmutiker** велікадушны; **grójsmut** *m*, **grójsmutikajt** *f* велікадушнасьць; **grójsštot** *f*, *pl.* -štet сталіца, вялікі горад; **grójsštotišer** сталічны, гарадзкі; **grójsvuksiker** рослы

• er volt gemegt zajn* greser/kliger a bisl ён ростам/розумам ня выйшаў

• grojs haltn* zix (haltn* zix in grojsn; maxn zix grojs; štejn* in grojsn; vern* grojs ba zix) задавацца, фанабэрыцца, выхваляцца, ганарыцца

• grojs vi a flig/milb/mapl/nus вялікі як муха/мурашка/выкідак/гарэх (малы)

• grojs vi a genec/hojf/feld/lokš/helfand/Rojm, vi der šorhabor вялікі/вялізны як позех/двор/поле/локшына/слонь /Рым/бык (як мора/горад/дуб/сасна/Дунай/сьвет)

• grojs vi an arbet, vi majne cores вялікі як работа, як маё ліха (канца-берагу німа)

• grojshantiker os вялікая літара

• zajn* grojs in di ojgn мазоліць/калоць/рэзаць вочы

• az a kind xapt, iz es a xoxme, az a grojser xapt, git men im iber di hent *šprxv.* калі дзіцё хапае – гэта жарт, калі дарослы – даюць па рукох

• di velt iz grojs, ire cores nox greser *glxv.* сьвет вялікі, а ліха

ў ім яшчэ болей (ліха ідзе і бяду за сабою вядзе)
• grojs vi a hunt zicndik *glxv.* вялікі як сядзячы сабачка (вырас пеўню да костак; сабаку па хвост; кату па пяту; раку па вусы; жабе/сьвіньні/вераб'ю па калена; на раз аблізаць; кавалер – кату па каўнер)
• grojskajt ligt af mist, un ver s'vil, nemt dos umzist *šprxv.* пыха ляжыць на сьметніку, хто хоча, можа ўзяць яе задарма
• me darf nit zajn hojx, me zol zajn grojs *glxv.* ня трэба быць высокім, трэба быць вялікім
• zol men azoj kenen maxn fun klejne grojse, vi m'ken maxn fun grojse klejne *glxv.* хай бы так рабілася з малога вялікае, як зь вялікага малое (аб грашох і адзежы)

grójzamer, grójziker [*d.* grausam] люты, акрутны, жорсткі, бязьлітасны, грубы; **grójzamkajt** *f* лютасьць, акрутнасьць, жорсткасьць, бязьлітаснасьць

gromade/gromide=hromade *f*, -s [*p.* gromada, *r./ukr.* грамада] ... ялянская грамада

gromer=gramer=geramer=gerojmer прасторны, раскошны, разьлеглы; **gromkajt=gerojmkajt=geramkajt** *f* ... ра. раскоша, абшар, разьлегласьць

gromírn=pogromírn (gromirt) [*p.* gromić, *r.* погром] граміць, ... спустошваць, разбураць

grosbux *n*, *pl.* -bixer [*d.* Grossbuch] гросбух

grosn *m*, *pl.* -s [*d.* Groschen] грош; **gróšndiker, grósener** грашовы; **grošnvajz** *adv.* грашыма, танна
• ... senter grosn добрая капейка
• cetejn grošnvajz надзяляць грашыма, раздаваць грошы
• hobn* dem grosn быць з грашыма
• on a grošn ba der nešome (nit hobn* kejn grošn gelt) (ня мець) ані граша/шэлега за душой
• a grosn hit op dem rubl *šprxv.* капейка рубель беражэ (рубель із гроша паходзіць)
• der gnejvišer grošn iz zis *šprxv.* крадзенае заўжды смачней (крадзенае лепш родзіць)
• kupil za fufciker, prodal za ferciker, abi sveži groš купіў за пяцьдзясят, прадаў за сорак – абы сьвежы грош
• ver es šojnt nit dem grošn, iz alejn nit vert kejn grošn *šprxv.* хто капейкі не беражэ, той і сам яе ня варты

gróx(o)vine *f*, -s [*p.* grochowiny] гарохавіна

groz *n*, *pl.* -n/grezer, *dim.* **grezl** *n*, -ex, **grézele** *n*, -x [*d.* Gras] трава; **gróziker** травяны; **grózartiker** травяністы; **grózesndiker** *zool.* траваедны; **grózgortn** *m*, *pl.* -gertner газон; **grózgril** *f*, -n, **gróz-špringer** *m*, -s *zool.* конік
• a goldene nešome (a gut menčele) – dortn, vu er iz durxgegangen, vakst nit kejn groz (hot dos groz ufgehert vaksn) *glxv.* залатая душа (добры чалавеча) – там, дзе ён прайшоў, не расьце трава
• di cig est do groz un dort groz *šprxv.* каза есьць траву і тут і там (дзе вароне ні ляцець, то ўсё гаўно кляваць)
• groz zol af dir vaksn! *kll.* каб на табе трава расла! (каб ты здох!)
• jenems groz iz griner *šprxv.* чужая трава зялянейшая (у чужым роце і зубоў болей; у чужым хлеве і блыха валом здаецца; чужыя жоначкі як перапёлачкі; у суседа ўсё лепшае)
• kejn groz vet šojn nit vaksn жаднай травінкі ўжо ня вырасьце
• špacirn, duše-lebn, zajnen mir gegangen /arum un arum dem groz, /vos far an umxejn hostu af mir gevorfn, /gevald, ix vejs nit far vos! *ffksl.* гуляць, мая душа, мы хадзілі на луг, за што ты на мяне пакрыўдзіўся, гвалт, я ня ведаю за што!
• vilde grozn vaksn iber naxt *glxv.* пустазельле расьце праз ноч

grožen (mit a finger) [*r.* грозить] грозіць пальцам

grub *m/f*, *pl.* griber, *dim.* **gríbele** *n*, -x, **gribl** *n*, -ex [*d.* Grube] яма, яміна; магіла, дол; **grub** *f*, -n, **grubn** *m*, -s капальня
• arajnfaln* in šmalc grub (šmalcgrub) плаваць як сыр у масьле (купацца як нырка ў сале)
• biz in grub arajn да гроба/труны/дамавіны
• grobn* af emecn a grub капаць камусьці магілу
• afile az der menč zet šojn dem grub ofn, zol er nit ufhern cu hofn (di grub iz šojn ofn, un der menč tut nox hofn) *glxv.* нават калі дол ужо выкапаны, ня трэба губляць надзею (канае, а зельле хапае; дума за морам, а сьмерць за плячамі; памірае зьбірайся, а жыта сей)
• beser cu hobn dem krankn in der (varemer) štub, ejder in (kaltn) grub *glxv.* лепш хворы ў цёплай хаце, ніж у халоднай магіле (лепш дзесяць разоў цяжка хварэць, як адзін раз лёгка памярэць)
• fun a lixtiker štub in a finctern grub! са сьветлай хаты ў цёмны дол! (з галашэньня плакальніцы)
• ver es grobt ■ grub af/far jenem (farn andern), (der) falt alejn arajn *šprxv.* хто другому яму капае, той сам туды трапляе (ня зыч ліха другому, каб не давялося самому; не гатуй людзям пятлі: сам павесішся; не гатуй каму бяды, бо сам яе сустрэнеш; не падстаўляй столка нікому, бо сам сядзеш на ёму)
• zej hobn bejde in ejn gribl gepišt *glxv.* яны ў адну ямку сікалі

(g)rude=hrude *f*, -s, *dim.* **grudke** *f*, -s, **grúdkele** *n*, -x [*p.* gruda, *ukr.* груда] груда; **grúdediker** пупырысты, шурпаты; **grudevate(r)=(h)rudevate(r)** гузаваты, шышкаваты

grunt/grund *m*, -n [*d.* Grund] аснова, падстава, падваліна, фундамэнт, падмурак; глеба, грунт; **grúntiker, gruntov(n)e(r)** асноўны, грунтоўны; **grúnteven** [*p.* gruntować] 1. грунтаваць; 2. нырaць, даваць нырца; 3. *n* грунтоўка (дзеяньне); **grúnt-bading** *m*, -en асноўная ўмова; **grúntcol** *f*, -n *gram.* колькасны лічэбнік; **grúntejgns** *n* нерухомая маёмасьць; **grúntfestikn** зацьвердзіць, зацьвярджаць; **grúnt-gedank** *m*, -en асноўная думка; **grúntgezec** *m* асноўны закон; **grúntkapital** *m*, -er асноўны капітал; **grúntlage** *f* тэза, тэзіс, асноўнае палажэньне; **grúntlejger** *m*, -s (з)аснавальнік, заладальнік, фундатар; **grúntloz(ik)er** 1. безгрунтоўны, беспадстаўны; 2. бяздонны; **grúnlozikajt** *f* безгрунтоўнасьць, беспадстаўнасьць; **grúnt-misxer** *m* [*s.* סחר(י)מ] разьдзелка зь нерухомай маёмасьцю; **grúntprodukt** *m*, -n галоўны прадукт; **grúnt-sibe** *f*, -s [*s.* (ות-)בה(י)ס] асноўная прычына; **grúnt-sojxer** *m*, *pl.* -soxrim [*s.* (ים-)סוחר] гандляр нерухомай маёмасьцю; **grúntštejn** *m*, -er аснова асноваў, вуглавы камень; **grúntvasern** *pl.* грунтовыя воды; **gruntvog** *f*, **grúntvage** *f*, -s грунтвага, ватэрпас
• gejn* cu(m) grunt заняпасьці, захірэць
• on kejn šum grunt (on a grunt) бяз дай прычыны
• di Tojre hot kejn grunt nit *šprxv.* Тора бяздонная
• in cores iz gor kejn grunt nito *glxv.* ліха прыходзіць бяз дай прычыны
• itlexer hunt af zajn grunt *šprxv.* кожны сабака на сваёй глебе (у сваім гародзе роўны ваяводзе)

grupe *f*, -s, *dim*. **grupke** *f*, -s [*d*. Gruppe] група, гурт; **grupove(r)** групавы; **grupírn** (grupirt) [*d*. gruppieren] 1. (grupirt) групаваць, гуртаваць; 2. *n* групаваньне; **grupirung** *f*, -en групоўка, групаваньне, гуртаваньне; **gruperáj** *f* групаўшчына

grus *m*, -n, *dim*. **griske** *f*, -s [*d*. Gruss] прывітаньне, вестка
• mit grus ajer/dajn... вітаю, ваш/твой... (у лістох)
• nemt majn benkšaft, vintlex, uf /un trogt avek a grus, /zogt im, az ix benk azoj, /x'gej fun benkšaft ojs (A. G-t) вазьмі мой сум, ветрык, і аднясі яму вестачку, скажы яму, што я моцна сумую

grušim *pl*. →goreš *m* [*s*. (-ים)גרוש] разьведзены; **gruše** *f*, -s [*s*. (-ות)גרושה] разводка [*sin*. cešejdte froj, gegete]
• an almone iz a sakone, a gruše iz a buše, a bsule iz a gedule *šprxv*. удава – небясьпека, разводка - сорам, дзеўка – гонар (вантроба – ня мяса, а ўдава – ня дзеўка)

gruz *m* [*p*. gruz, *ukr*. груз] друз

grúze(ve)n [*r*. грузить] 1. грузіць; 2. *n* пагрузка; **gruz** *m* груз

gruznen=grozn(j)en=hruznen [*ukr*. грузнути] 1. грузіць; 2. грузнуць; **gruzne** *f*, -s багна, твань, дрыгва

gsise=ksise *f*, -s [*s*. (-ות)גסיסה →gojses] агонія, кананьне, момант сьмерці [*sin*. ranglenіš mitn tojt, agonje, lecte lejdn farn štarbn]; **gsise-inúim** *pl*. [*s*. עינויים(י)] перадсьмяротныя пакуты/карачуны/корчы/дрыгуны; **gsíse-xorxlen** *n* перадсьмяротны хрып; **gsíse-zifc** *m* перадсьмяротны ўздых
• maxn mit der gsise курчыцца ад болю перад сьмерцю

gšomim=kšomim *pl*. →gešem *m* [*s*. (-ים)גשם] "дождж" (малітва на дождж, якую гэбрэі чытаюць на Кучкі)

gubernje *f*, -s [*r*. губерния] губэрня

gúdern=gódern стракатаць; балбатаць

guf *m*, -im/-n [*s*. (-ים)גוף →sigef, fargufn, baleguf] плоць, цела [*sin*. kerper, lajb]; **gúfiker** поўны, плотны, сыты; цялесны, целавы; **gúfnies** *n* [*s*. גופניות] цялеснасьць; **gúf-batraxtung** *f*, -en мэдкамісія; **gúf-geboj** *m*, -en канстытуцыя цела; **guf-hamájse** *m* [*s*. המעשה] аснова/сутнасьць казкі/гісторыі/апавяданьня
• mitn guf un mit der nešome душой і целам
• zajn* ejn guf/nešome жыць душа ў душу
• az der kop iz a nar, ligt der gancer guf in der erd *šprxv*. калі галава дурная, дык усё цела ляжыць у зямлі (трапляе ў пекла) (за дурной галавой сьпіна баліць, нагам неспакой; галава нагам зладзей)
• az der mogn iz zat, iz der gancer guf lustik *šprxv*. калі страўнік сыты, дык усё цела весяліцца
• (dos iz) a košere nešome mit a trejfenem/trejfe guf *glxv*. чыстая душа зь нячыстым целам (чорны мак, ды смачны; па вачох – сірата, па капцюрах – разбойнік)

gufe [*s*. גופא] само, сам (менавіта ён), уласнай асобай, пэрсанальна [*sin*. (far zix) alejn, perzenlex]
• gufe dermit тым самым

gulajen (zix) [*r*. гулять] гуляць

guldn=gil(d)n *m*, -s [*d*. Gulden] залатоўка (манэта)

gule=geule *f* [*s*. גאולה] выратаваньне, спасеньне, прыход мэсіі

gulje *f*, -s [*p*. gula, *ukr*. гуля] гуля; ёлуп, балван, ідыёт

gume *f*, -s, **gumi** *m* [*d*. Gummi] гума; **gúmener** гумовы; **gúmelastik** *f*, **gumke** *f*, -s гумка; **gúmešux** *m*, *pl*. -šix гумовыя тапачкі

gumen *m*, -s [*d*. Gaumen] 1. *anat*. паднябеньне; 2. гума; **gúmendiker** паднябенны

gunst *m* [*d*. Gunst] дабро, карысьць
• cu gunstn на карысьць

g(u)ralnje *f*, -s [*ukr*. гуральня] бровар; **g(u)ralnik** *m*, -es браварнік, вінакур

gurst *m* [?] усход, пад'ём (нагі)

gurtn [*d*. gürten] падпераэаць, падпяразваць

gurtom [*ukr*. гуртом] *adv*. гуртам

gus *m*, -n [*d*. Guss] 1. **gúsregn** *m*, -s лівень, залева, улева, зьліва, праліўны дождж (дождж цэдзе як з луба; як зь вядра хлешча/плюшчыць); 2. ліцьцё (выраб); **gús-zavod** *m*, -n гісэрня

gust *m*, -n [*p*. gust] густ, смак; **gustírn** (gustírt) смакаваць, каштаваць
• hobn* a gust cu epes мець смак да чагосьці
• jederer hot zix zajn gust *šprxv*. кожны мае ўласны густ (хто любіць гарбуз, а хто агуркі; адзін хоча сёе, другі - тое)

gútartiker [*d*. gutartig] *med*. дабраякасны

gútbazicer *m*, -s, (-n *f*, -s) [*d*. Besitzer] памешчык, абшарнік; **gútbazicerišer** памешчыцкі

gut(-)brúderišer запанібрацкі; **gut-brúderšaft** *f*; **gut-frájnd-šaft** *f* дружба, сяброўства; **guter-brúder** *m*, *pl*. gute-bríder сябра, сябар, прыяцель, братка, браток

gut(e)-órt *n* (a guter ort) *euph*. могілкі, кладзішча, клады
• af dem gutn-ort zogt men itlexn nox a gut vort *šprxv*. на могілках аб кожным гавораць добрае слова (пра нябожчыкаў лепей маўчаць; хвалі папа прыкапаўшы, а пападзю прысыпаўшы)
• af kejn gutn-ort zolstu nit štejn! каб ты на могілкі ані нагой!
• af kejn gutn-ort zolstu nit štejn/tretn, nor lign! *kll*. каб ты на могілках не стаяў/ступаў, а толькі ляжаў!
• s'zol dir zajn gut afn gutn-ort! *kll*. каб табе добра было на могілках!

guter (béserer, bester) [*d*. gut] добры; **gut(s)kajt** *f* дабрата; дабротлівасьць; **gut** *n*, *pl*. giter вотчына, маёнтак, маёмасьць; **guts** *n* дабро; маёмасьць, майно; **gútikajtn** *pl*. (fun lebn) лепшыя рэчы (у жыцьці); **gut-óp** *adv*. заможна, багата; **gutóvnt** *m* добры вечар; **gutn-óvnt! (a) gutn ovnt!** добры вечар!; **gut-jór! a gut jor!** добрага году! (адказ на вітаньне), добрага здароўя!; **(a) gut-šábes! a gutn šabes!** добры вечар! добрага шабасу! (у пятніцу, напярэдадні суботы); добры дзень! добрай суботы! (у суботу); **gut-šábes!** ну і ну! вось як!; **gut-vóx! a gute vox!** добрага тыдня! (вітаньне на заканчэньне суботы); **a gut-jómtev! gutn jomtev!** са сьвятам! добрых сьвятаў!; **gut(-h)élf!** памагай бог! богпомач! бог у помач! (звычайна кажуць апоўдні); **gut-mórgn** *m* (пры)вітаньне; **gut-mórgn! (a) gut(n) morgn!** добры дзень!; **a gutn!** усяго! пакуль! бывай!; **a gute naxt!** дабранач!; **a gutn (tog)!** да пабачэньня!
• a gut jor zolstu hobn! (a gut jor cu/af dir! hob a gut jor! hot /gilt ajx a gut jor!) добрага/шчасьлівага табе/вам году!
• a gut-morgn ajx! *hum*. дзень добры вам!
• dermonen emecn cum gutn узгадваць камосьці добрым словам
• far kejn šum guts in der velt nit ні за што на сьвеце
• fun di gute di besere лепшае з добрага
• gut un vojl файна, як мае быць
• gut vi bam tatn in vajngortn добра як у таты ў вінаград-

ніку (як у мамы гасьцяваць, як у небе/раю, як у пана бога за печчу)
• gut vi di velt добры як сьвет
• gute mides дабрачыннасьць, дабрадзейнасьць
• gut-jomtev, er iz do! са сьвятам, ён ужо тут!
• gut-morgn, gut-jor, a gutn-tog! шах-мах і ўсё зроблена!
• mir iz gut мне добра, я шчасьлівы
• mit gut ci mit bejzn ці па-добраму ці па-благому (ня кіям дык палкаю)
• s'iz gut hejs/kalt даволі горача/холадна
• s'vet derfun kejn guts nit arojskumen з гэтага нічога добрага ня выйдзе
• zaj(t) azój gut будзь(це) ласкавы, калі ласка
• a guter! – az er śloft, bajst er nit *glxv.* дабрак! -- калі ён сьпіць, не кусаецца (тады толькі добры, як сьпіць; добры чалавек: як сьпіць, з дубінай прайсьці можна)
• beser ślext geform, ejder gut gegangen *glxv.* лепш пагана [illegible] ніж добра ісьці (хоць дрогка, ды нагам лёгка; [illegible] затрасешся, пакуль данясешся, затое ногі не пры[illegible])
• [illegible] gedenkt zix lang, dos ślexte nox lenger *šprxv.* добр[illegible] [illegible]ецца доўга, благое – яшчэ даўжэй (добрае [illegible], а благое яшчэ далей)
• [illegible] "gut-morgn!" "gut-jor!" *glxv.* ён зь ім "дабр[illegible]" "дзень добры!" (шапачнае/павярхоўнае [illegible])
• [illegible] nito kejn ślexts on a bisl guts *šprxv.* ліха без дабра не бывае (няма нічога ліхога, каб на добрае ня выйшла; ліха перамелецца, дабро будзе)
• fun kejn gutn ken men kejn ślextn nit maxn, un fun kejn ślextn ken men kejn gutn nit maxn *šprxv.* зь добрага благога ня зробіш, а з благога – добрага
• gut šabes! – es gebrotene żabes! добрага шабасу! – еж смажаных жабаў!
• gut šabes, Brajne! добрай суботы, Брайна! (кажуць, калі ўлазяць у размову)
• Gut śabes, Xaše! – Vos maxstu, Baše! Добрай суботы, Хася! – Як справы, Бася!
• guts gedenkt men, ślexts filt men дабро памятаецца, благое адчуваецца (добрае доўга помніцца, а дрэннае век не забудзеш)
• s'iz gut, s'iz nit ślext, s'volt beser geven, volt beser geven добра, ня блага, калі было б лепей, было б лепей (адказ на залішнюю цікавасьць)
• vos far a "gut-morgn", aza "gut-jor!" *šprxv.* які "здароў будзь", такі і "на здароўе" (якое пытаньне, такое адпавяданьне; як паклічаш, так і адгукнецца; як вы нашым, так мы вашым)

guter-frájnt/-frájnd *m*, *pl.* gute-frájnt [*d.* Freund], **guter-brúder** *m* добры (блізкі) сябра; **guter-jíd** *m*, *pl.* gute-jídn [*d.* Jude] *xsd.* рэбэ, рабін; праведны/пабожны гэбрэй; **gut-jídišer** які мае дачыненьне да рэбэ
• a guter-jid hot lib cu nemen un fajnt cu gebn *glxv.* рэбэ любіць браць, але ня любіць даваць ("дай" ніхто ня любіць, а "на" ўсякі чуець; "дай" любіць поп усякі, а "на" – ніякі)
• a guter-jid iz a ślexter man *glxv. vrtś.* "добры жыд" – кепскі чалавек
• fun vanen zol a guter-jid visn, az boršč iz rojt? *glxv.* адкуль можа ведаць рэбэ, што боршч чырвоны? (будзённыя справы яго не цікавяць)
• kejn guter-jid zol dix nit kenen! *kll.* каб цябе праведны гэбрэй ня ведаў!

guter-jór *m euph.* д'ябал, чорт, нячысьцік
• alc af mir, a gut jor ojx af mir! усе на мяне і чорт на мяне!
• der guter-jor vejs im! чорт яго ведае!

gute-záxn *pl.* ласункі, лізікі, прысмакі, цукеркі, смаконікі; **gútginciker**, **gútginstiker** спрыяльны, прыхільны; **gútharciker** [*d.* gutherzig] добрасардэчны; **gútharcikajt** *f* добрасардэчнасьць; **gúthejsn*** за-, па-, сь|цьвердзіць, за-, па-, сь|цьвярджаць

gutman *m*, -es *kul.* грачаны пірог

gút-miniker [*s.* -]מ"נ-] дабраякасны; **gútmutiker** [*d.* gutmütig] дабрадушны, лагодны; **gútmut** *m*, **gútmutikajt** *f* дабрадушнасьць, дабрасэрдасьць; **gut-ójg** *n euph.* благое вока, (с)урокі, шкода
• opšprexn* a gut-ojg загаворваць ад сурокаў

gúts(-)giner *m*, -s, (-n *f*, -s) заступнік, апякун; **gut-šxéjnišer** [*s.* -שכנה"] добрасуседзкі; **gúttuiker** [*d.* guttun] добра зроблены; **gútviliker** [*d.* gutwillig] добразычлівы; **gútvilikajt** *f*, -n добразычлівасьць; **gútvinčer** *m* [*d.* wünschen] добразычлівец; **gút-vort** *n* [*d.* Wort] добрае, ласкавае слова; **gútzoger** *m*, -s [*d.* sagen] даручнік, паручнік, гарант

guvernantke *f*, -s [*p.* guwernantka, *fr.*] гувэрнантка

guz *m*, -n [*p.* guz] гуз; **guzevate(r)** 1. прышчав(ат)ы; 2. вузлаваты; 3. гузаваты, шышкаваты

guzme *f*, *pl.* -s/guzmoes [*s.* (ות-)גוזמא →megazem, bal-guzme, balmegazem, ojsguzmenen] неверагоднае перабольшаньне; мноства, плойма, процьма, зашмат, безьліч, сьціжма [*sin.* ibertrajbung; zejer a sax]; **gúzmediker** неверагодны, перабольшаны, перавялічаны; марнатраўны, неашчаднасьць; **gúzmedikajt** *f* марнатраўства, неашчаднасьць
• a guzme gelt процьма грошай (грошай як трэсак/сьмецьця/мякіны/пяску/гразі; сабакі ня ліжуць)
• dos iz a guzme гэта перабольшваньне
• s'vet nit zajn kejn guzme, ojb mir veln zogn, az... ня будзе перабольшваньнем, калі мы скажам, што...
• hot Bere der šuster lib cu dercejln guzmoes, ojstraxtn zaxn, vos ništ geštojgn nit geflojgn (Š.-A.) шавец Бэра любіў распавядаць байкі, небыліцы, бязглузьдзіцу

gvadz *m* [*p.* gwazdać, *ukr.* гвазда] жыжка, квача, каша, грязюка, размазьня; **gvadžen** шлёпаць па гразі

gvald=geváld/g(e)vált *f/m*, -n/-es [*d.* Gewalt] 1. *m*, -n/-es крык, гвалт; насільле; 2. *f* улада, мощ; **gvald!** гвалт! памажэце!; **gváldeven** крычаць гвалт(ам), лямантаваць; **g(e)váldiker**, **gvaldovne(r)** велічэзны, велізарны; **gváldzamer** гвалтоўны; **gváldgešráj** *n* гвалт, лямант, гвалтоўны крык; **gváld-glok** *m*, *pl.* -gleker звон, набат; **gváld-majsim** *pl.* [*s.* מ"עשים] насільле, гвалт(аваньне), гвалчаньне; **gváldris** *m*, -n прарэх, дзірка; **gváldruf** *m*, -n гвалтоўны крык; **gváldtat** *f/m*, -n гвалт(аваньне), гвалтоўны ўчынак; **gváldtuer** *m* гвалтаўнік; **gváldtuerišer** гвалтоўніцкі; **gváldtetiker** гвалтоўны; **gváldtormaz** *m*, -n стоп-кран; **gváldzax** *f*, -n гвалтоўная рэч
• a gvaldiker hamojn гвалтоўны натоўп
• gvald gešrign! дзеля бога! дзеля ўсяго сьвятога!
• gvaldzamer tojt гвалтоўная сьмерць
• maxn a gvalt нарабіць гвалту
• mit/iber gvald гвалтоўна, гвалтам, гвалтоўным чынам
• xoč šraj gvald хоць гвалт крычы

• šrajen* gvald крычаць гвалт, лямантаваць
• vi m'ken nit lebn mit gvald, azoj ken men nit štarbn mit gvald *šprxv.* гвалтам не жывуць і не паміраюць

gvar *m*, -n [*s.* (ֿ-)גבר →gvir] асілак, багатыр, волат, магут [*sin.* štarker man]; **gvárišer, gváresdiker** валатоўскі, багатырскі, мужны; **gvar-álim** *m* [*s.* ־אלים] вельмі моцны, дужы, ваяўнічы чалавек; уладар, валадар, верхавод, уладны, горды, уплывовы чалавек [*sin.* takef]; **gvar-xáleš** [*s.* ־חלש] слабы, хваравіты, маласільны, нядужы, недалужны, кволы, немачны чалавек, хілы, здыхляк, вахляк [*sin.* švaxer un kranklexer man]

• afn kuk daxt zix, epes ništ aza gvar, vajt fun a Šimšn hagiber (Š.-A.) як скінуць вокам, не такі ўжо й асілак, далёка да Самсона-волата

gvies-éjdes *m*, -n [*s.* ־עדות גבית] сьведчаньне
• opgebn* a gvies-ejdes сьведчыць

gvint *m*, -n [*p.* gwint] шруба; **gvintovnik** *m*, -es *texn.* інструмэнт для наразаньня разьбы, разьбарэз

gvintovke *f*, -s [*p.* gwintówka] вінтоўка

gvír=gevír *m*, -im, (-en/-ente/-inte/-ete *f*, -s) [*s.* (־ים)גביר →gavres, giber, gojver, gvar, gvure, misgaber] багацей, багач, тумар, вельмі багаты чалавек [*sin.* zejer rajxer menć]; **g(e)vírišer** багаты; багацеяў; **g(e)virešaft** *f*, **gvírimšaft** *f* багацьце
• a karger gvir iz der ergster kabcn *šprxv.* скупы багацей – найгоршы жабрак
• an emeser gvir сапраўдны багацей (без даўгоў)
• der grester gvir štarbt amol far der cajt *šprxv.* і самы вялікі багацей можа памерці заўчасна
• gvirim blozn zix, der oreman vert gešvoln *glxv.* багацеі дуюцца, бядняк пухне (паны пілі, а ў нас галовы баляць)
• vos ba an oreman ken zix farvalgern, hot es der gvir zajn ejgns nit *šprxv.* што ў бедака згубіцца, тым багацей не разжывецца

gvul *m*, -n [*s.* גבול →gegvul, magbil] мяжа, канец; сфэра, абсяг, бездань, прастора, гонь, плошча, тэрыторыя [*sin.* grenec, sof, šier; gebit, txum, šetex, teritorje]
• in a gevisn gvul у пэўных межах
• mixuc dem gvul (fun) уваход забаронены

gvure *f*, -s, **gvúrešaft** *f* [*s.* (ות-)גבורה →gavres, giber, gvir, gojver, gvar, misgaber] сіла, моц, магутнасьць, гэройства [*sin.* heldiškajt; kojex, štarkajt]; *kbl.* адна зь дзесяці сфэраў; **gvúrediker** гэраічны, магутны
• di vajbers gance gvure štekt in dem toxes *vulg.* уся жаночая моц тарчыць у срацы
• er hot a švarce gvure ён валодае чорнай сілай
• vu ašires, dort iz gvures *šprxv.* дзе багацьце, там сіла (хто дужшы, той і пружшы)

gzar *m*, -n [*s.* (ֿ-)גזר] нябесны суд, кара нябесная, няшчасьце, ліха, безапеляцыйнае вырашэньне [*sin.* mišpet, štrof fun himl]; **gzar(-)dín** *m* [*s.* ־דין] жорсткі нябесны прысуд, прыгавор, вырак, божая кара, няшчасьце, ліха
• a bejzer gzar zol af dir kumen! *kll.* злы вырак (божая кара) цябе чакае!
• a nar iz a gzar *glxv.* дурань як кара нябесная
• oj, a gzardin, a grojs umglik hot undz getrofn (M.M.-S.) ой, божая кара, вялікае няшчасьце нас напаткала

gzejle *f*, -s [*s.* (ות-)גזל(י) →gazlen, nigzl] 1. рабаваньне, рабаўніцтва, разбойніцтва; 2. нарабаваная маёмасьць, багацьце [*sin.* rojb(eraj); cugerojbt farmegn]

gzejre *f*, -s [*s.* (ות-)גזר(י) →gojzer, gzar, bigzejres-] 1. закон, пастанова, рашэньне, дэкрэт; прыкрае, непрыемнае распараджэньне, суровы закон супраць гэбрэяў (дэкрэты аб ганеньнях); 2. кара, пагром, няшчасьце, ліха [*sin.* gezec, bašlus, dekret; antisemitišer onfal, pogrom; umglik]; **gzejres hašmád** [*s.* השמד] законы супраць гэбрэяў; **gzejres-táx(-vetát)** *f* [*s.* (ות"ט-)גזירת־ת"ח] шэраг жыдоўскіх пагромаў на Украіне ў 1648- 1649 гг. (хмяльніцкія пагромы); **gzejre-šóve** *f* [*s.* ־שווה] мэтад талмудысцкай лёгікі (вывядзеньне аднае рэчы з другой праз пэўнае падабенства паміж абедзьвюма)
• a najer mejlex mit naje gzejres – a naj jor mit naje avejres *šprxv.* новы цар з новымі законамі – новы год з новымі грахамі (новы гаспадар – і новы парадак; новы поп новае і маленьне; за новым каралём – дагары камлём)
• klejne avejres brengen grojse gzejres *šprxv.* маленькія грахі цягнуць за сабой вялікія кары (дзе грэх, там і пакута; раз няпраўда ці ашука, а сумленьню навек мука)







H=hej *m/f.* -en [*s.* (הא-)ען] 1. "гэй", літара гэбрэйскага альфабэту; 2. лічба 5; **jom hej** [*s.* יום ה'] чацьвер

h'=her *m*, -n. (-n *f*) (га)спадар, (вас)пан

h'=heft *m/f.* -n сшытак, выпуск, нумар (часопіса)

h'=hašém=adojšém=d' [*s.* ה'] сымбалічнае азначэньне божага імя

ha [*p.* ha, *ukr.* га] *int.* га

• ha, vos maxt men? га, як справы?

• ha? vos hostu gezogt? га? што ты сказаў?

• vos tojg mir dajn "ha"? што мне з твайго "га"?

ha *m* га (гэктар)

ha- [*s.* -ה] азначальны член/артыкль усіх радоў, множнага і адзіночнага ліку [*sin.* der, di, dos]

haazinu [*s.* האזינו] "слухай (неба)"; назоў 53-га разьдзелу Торы (Др. 3. 32)

hábeljak *m*, -s [*p.* abelek, *ukr.* габелок?] доўгі жаночы плашч, накідка

(ha)boxer-hazécer *m* [*s.* -(ה)בחור־ה] *hum.* наборнік, лінатыпіст

• vifl jor du bist gegangen af di fis, zolstu gejn af di hent un di iberike zolstu zix šarn afn hintn! *kll*. колькі гадоў ты хадзіў на нагох, столькі ж мусіш хадзіць на рукох, а рэшту жыцьця – совацца на сраці!
hinton* [*d*. hintun] дзець, дзяваць
hínzixt *f/m*, -n [*d*. Hinsicht] адносіны, сэнс
• in a geviser hinzixt у пэўным сэнсе
• in ale/fil hinzixtn ва ўсіх (у шмат якіх) адносінах
• in (der) hinzixt (fun) у адносінах, у (гэтым) сэнсе (да)
hip(e)n/hípern=hupn (iber) [*d*. hüpfen] скакаць; пра-, пера|скачыць, пра-, пера|скокваць; прапусьціць, прапускаць; **híperndik** *adv*. з пропускамі
hipex=hofex [*s*. הפוך] *adv*. наадварот, насупраць
hipke=hupke *f*, -s [*p*. hubka, *ukr*. губа] губа, трут, цэра
hipokritstve *f* [*gr*. hypokrites] крывадушнасьць, прыкідваньне
hipšer [*d*. hübsch] значны, досыць вялікі, дастатковы, выстарчальны; **hipš** *adv*. шмат, багата, дастакова, парадкам, даволі, ці мала, досыць (многа); **hipškajt** *f* значнасьць; **hípšlexer** дастаткова прыгожы
• hipš genug (a hipš bisl) даволі шмат
hiptl=hejptl=hojptl *n*, -ex галоўка (капусты/салаты), качанок
hipuxim=hafoxim *pl*. →hejpex *m* [*s*. (הפכים) הפוך(י)] процілегласьць, супрацьлегласьць
(h)ircn=ercn [*d*. ihr] зьвяртацца на "вы", выкаць
hirer *m*, *pl*. hirhurim [*s*. (-ים)הרהור(י) →mahar(h)er] імгненная думка, бягучыя разважаньні [*sin*. plucemdiker gedank, farbajlojfndik traxteniš]; **hirer-avéjre** *m*, *pl*. hirhure-avéjre [*s*. (הירהורי) עבירה] грэшная думка; **hirer-čúve** *m*, *pl*. hirhure-čúve [*s*. תשובה] пачуцьцё раскаяньня/шкадаваньня, жаданьне зьмяніцца ў лепшы бок [*sin*. xarote-gefil]
• a farzunkener in hirhurim паглыблены ў разважаньні
hirn *n* [*d*. Gehirn, *mhd*. hirn] мазгі, глузды
hirš=herš *m*, -n, (-ixe/-n *f*, -s) [*d*. Hirsch] *zool*. алень; **hiršns** *n* аленіна
hirt *m*, -n, (-n *f*, -s) [*d*. Hirt] пастух
hirž *m* [*d*. Hirse] проса; пшано; **híržener** прасяны
hírže(ne)n [*ukr*. іржати, *p*. rżeć] іржаць, ірзаць; **a hirže ton*** заржаць; **hiržeráj** *f* іржаньне, ірзаньне
• hiržen vi a ferd/nar іржаць як конь/дурань
• kojft a ferdl, vos se hiržet /mit dem nomen Mucik, /kojft a hintl, vos se hafket, /mit dem nomen Cucik (Z. R.) ён купляе коніка, які ржэ і завецца Муцык, ён купляе сабачку, які брэша й завецца Цуцык
his- [*s*. -הת] *pref*.
hisbójdedes *n* [*s*. התבודדות] *xsd*. узьнікаючая пад узьдзеяньнем мэдытацыі адасобленасьць [*sin*. opgezunderkajt]
• praven hisbojdedes весьці адасобленае жыцьцё
• fun Kosev biz Kitev /iz a vejdele faranen, /avu der Balšem /af hisbojdedes iz gegan'en *flksl*. паміж Косавам і Кутамі быў лясок, у якім Балшэм адасобіўся
hisbójnenes *n* [*s*. התבוננות] разважаньне, удумваньне, раздумваньне, сузіраньне, кантэмпляцыя, мэдытацыя [*sin*. kontemplacje, arajnkler, arajntraxtung, meditacje]
hisgales *n*, -n [*s*. (-)התגלות →gile, nigle, nisgale] праяўленьне, адкрыцьцё; *xsd*. знаходжаньне схаванага праведніка
hiskarves *n*, -n [*s*. (-)התקרבות →korev, krejves, krojve, me-

kurev, mekarev] збліжэньне, прыязнасьць, дружнасьць [*sin.* dernenterung, bafrajndung, frajndlexkajt]

hislajves *n* [*s.* התלהבות] душэўны пад'ём, захапленьне, натхненьне, захопленасьць, (за)пал, гарачнасьць, экстаз, экзальтацыя, энтузыязм, па́тас [*sin.* bagajsterung, entuziazm, bren]; **hislájvesdiker** натхнёны, экзальтаваны, патэтычны

• redn* mit hislajves гаварыць з патэтыкай

• Ša-ša, nor, xsidim, šat, /der rebe iz šojn zat, /ša-ša, der rebe benćt /mit hislajves hojx, /Ša-ša, der rebe tanct, /ba im di ojgn glanct, /ša-śa, di rebecn /tanct dox mit im ojx. *flksl.* Ша-ша, хасыды, спакайней, рэбэ ўжо сыты, ша-ша, рэбэ моліцца з натхненьнем. Ша-ша, рэбэ танчыць, вочы ў яго блішчаць, ша-ша, рабініха танчыць ужо разам зь ім.

hismanes *n*, -n [*s.* (ן-)התמנות] пасада, месца; назначэньне на пасаду [*sin.* amt, štele; nominacje, baštimung af an amt]

hisn [*d.* husten] кашляць, керхаць

hisnacles *n*, -n [*s.* (ן-)התנצלות] апраўданьне, адказ, тлумачэньне [*sin.* farentferung]

hisnagdes *n* [*s.* התנגדות] апазыцыя, (су)праціўнасьць [*sin.* kegnšaft, opozicje]

hisnajges *n*, -n [*s.* (ן-)התנהגות →nojeg, minheg, hanhoge] абыходжаньне, паводзіны [*sin.* uffirung]

hisójreres *n* [*s.* התעוררות] духоўнае ўзбуджэньне, узрушэньне, абуджэньне маральных якасьцяў; малітва, якая скіравана на абуджэньне маральных якасьцяў

hispajles *n* [*s.* התפעלות →nifle, pe(j)le, mafle-łajses, nisim-veni-floes, majse-nifle, hafle-vofele, plie, pile-ploim] зьдзіўленьне, захапленьне, зачараваньне, натхненьне, сутаргавасьць, зьбянтэжанасьць пачуцьцяў [*sin.* ufruderung fun di gefiln; bavunderung, bagajsterung]; **hispájlesdiker** захапляльны; захоплены

• a hispajlesdiker ufnam захапляльны прыём

• arajnfaln*/arajnbrengen* in hispajles прыходзіць/прыводзіць у захапленьне

• er iz azoj arajn in hispajles, az... ён настолькі распаліўся, што...

• xapn cigene/kelberne hispajles (far) знаходзіцца ў цялячым захапленьні

hisrójmemes *n* [*s.* התרוממות] узвышэньне, падвышэньне, узьвялічваньне [*sin.* derhejbung]

Histadrút *f* [*ivr.* הסתדרות] суполка працоўных у Палестыне (з 1920г.)

histałkes *n* [*s.* הסתלקות] "зьніканьне"; сьмерць праведніка/сьвятога [*sin.* farśvindung]

histapkes *n* [*s.* הסתפקות] з(а)давальненьне/задаволенье тым, што ёсьць (самым малым, неабходным) [*sin.* banugenung]

histerik *f*, -es [*d.* Hysteriker] гістэрыка

• arajnfaln* in a histerik упадаць у гістэрыку

historje *f*, -s гісторыя; казка, байка; **históríšer** гістарычны; **históriker** *m*, -s, (-n *f*, -s) гісторык

hisxajves *n*, -n [*s.* (ן-)התחי(י)בות →xajev, xiev, xojv, mexajev, mexujev, misxajev, balxojv, farxojvter, nisxajev] абавязак, абавязацельства [*sin.* farflixtung]

hisxazkes/hisxaskes *n* [*s.* התחזקות →xizek, xazak, (be)xazoke, mexazek, maxzek] заахвочваньне, падбадзёрваньне [*sin.* štarkung, dermutikung]

hištadles *n*, -n [*s.* (ן-)השתדלות →mištadl, ojsštadlenen, štadlen] хадайніцтва, стараньне, высілак [*sin.* bamiung; intervenc]; **hištadles-šolíex** *m*, *pl.* -šelixim абраны хадайнік

hištapxes *n*, -n [*s.* (ן-)השתפכות] "выліваньне"; выказваньне пачуцьцяў [*sin.* ojsgos, iberflejc fun gefil]; **hištapxes-hanéfeš** *n* [*s.* הנפש] споведзь, выказваньне пачуцьцяў, душэўнага болю; **hištapxes-halév** *n* [*s.* הלב] "гэта выліваецца з сэрца"; збытак пачуцьцяў, моцная сардэчнасьць

hit *pl.* →hut *m/f*, -n, *dim.* **hitl** *n*, -ex/-en, **hítele** *n*, -x шапка, капялюш; **hítl(-)maxer** *m*, -s шапкар, шапачнік, шапавал; **hítvarg** *n* галаўныя ўборы

• hitl mit klapes шапка-аблавуха

• afn ganev brent dos hitl *glxv.* на злодзеі гарыць шапка (хто парася ўкраў, таму ўвушшу пішчыць; хто куры краў, у таго рукі трасуцца; хто сала краў, таму ў вочы дым ідзе; відаць па вачох, што ходзіць па начох)

• afn ganev in a cilinder brent nit dos hitl *glxv.* на злодзеі ў цыліндры шапка нčše гарыць

• az cvej šlogn zix, xapt der driter dos hitl *šprxv.* калі двох б'юцца, трэці хапае шапку (дзе двох звады вядзе, там трэці крадзе; дзе двух б'юцца, там трэці карыстае)

• dos hitl iz gut, nor der kop iz cu klejn *glxv.* капялюш добры, толькі галава замалая (калі розуму ў галаве німа, дык шапка ня дасьць)

• nit dos hitl iz fardrejt, nor der kop *šprxv.* ня шапка скасабочылася, але галава

hit *f*, -n [*d.* Hütte, *p.* huta] гута, шклозавод

hitn* (gehít/gehítn) [*d.* hüten] засьцерагаць, сьцерагчы, ахоўваць, пільнаваць, вартаваць, старажыць, даглядаць, дазіраць; **hiter** *m*, -s, (-n *f*, -s) вартаўнік, сторож, дазорац, даглядач; **hitung** *f* захаваньне, захоўваньне, варта

• hitn* emecn/epes vi fun a bejz ojg засьцерагаць кагосьці /нешта ад сурокаў

• hitn* vi dos ojg in kop, vi a briljant, vi an ejncik kind пільнаваць як сваё вока ў лобе, як брыльянт, як адзінага сына (як кот мышку/сала)

• az der menč hit zix, hit im got ojx *šprxv.* хто сам сябе сьцеражэ, таго й бог беражэ (сьцеражкога бог сьцеражэ)

• far got hot men mojre – far menčn muz men zix hitn *glxv.* бойся бога – сьцеражыся людзей

• got zol hitn! (zol mix got hitn fun dem!) ня дай (мне) бог! барані/бронь (мяне) божа! хай (мяне) бог сьцеражэ/бароніць (ад гэтага)!

hivnjak/hivnik *m*, -es [*ukr.* гівняк] гаўняк

hixc(e)n [*ukr.* гикати?] хіхікаць, гігікаць, кікікаць, кіхаць

hkb"h *abr.* **hakodeš-bórxu** [*s.* הקב"ה=הקדוש ברוך הוא →kudše-berix-hu] "гэты сьвяты, хай ён будзе блаславёны"; бог

(h)ladiš *m*, -es [*p.* gładyszka, *ukr.* гладишка] гладыш, збан(ок); сьмятаньнічак

hlibe *f*, -s [*r./v.*] глыба, камлыга

hljak/hljok=xljak *m*, -es [*ukr.* глек, *p.* hlak] гляк

(h)ljuben [*p.* lubić, *ukr.* любити] любіць, кахаць, мілаваць, галубіць

hlotke *f*, -s [*r./ukr./v.*] глотка

(h)lumen [*ukr.* глумити, *p.* głum] глуміць, псаваць, псуваць, гадзіць, плюгавіць, паганіць, партачыць; **hlumen zix** (iber) глуміцца, зьдзеквацца, кпіць; **hlum** *m*, **hlúmeniš** *n* глум, зьдзек, кпіны

(h)lušen=(h)lišen [*p.* głuszyć, *ukr.* глушити] глушыць

• hlušen di fiš глушыць рыбу

hm [*p.* hm, *ukr./r.* гм] гм

hnide *f*, -s [*p.* gnida, *ukr./r.* гнида] гніда
(h)nilje *f* [*ukr.* гнилля] гнільлё
hnoj=gnoj *m* [*p.* gnoj, *ukr.* гній] гной
hober *m/n* [*d.* Hafer] авёс; **hóberner** аўсяны; **hóber(-)cuker** *m/n* солад, брага; **hóberfeld** *n*, -er аўсянае поле; **hóber(-)grojpn** *pl.* аўсянка (крупа); **hóbergric** *m/f* аўсяная каша; **hóberzekl** *n*, -ex торба
• az me zect arajn a gandz in hober, štarbt zi fun hunger калі пасадзіць гусю ў авёс, яна памрэ з голаду
• di šnelkajt funem ejzl iz ophengik fun der col ufgegesenem hober *šprxv.* хуткасьць асла залежыць ад колькасьці зьедзенага аўса (каб конь добра вёз, падавай яму авёс)
• fun a gandz kojft men nit kejn hober *glxv.* (як) ад гусі авёс купляць (дастанеш, як у гусі аўса)
• Ix vel dir fun hober-štroj /špinen vajse zajdn, /nor du zolst mir a lejter šteln, /er zol cu himl štajgn. *flksl.* – З аўсянай саломы я табе вытку белы шоўк, але ты мусіш мне паставіць лесьвіцу да самога неба.
• [illegible] dos ferd mit gešrej, nor mit hober un hej *šprxv.* [illegible] каня крыкам, але аўсом і сенам (не гані каня дубцом, а гані аўсом; каб конь добра вёз, падавай яму авёс)
[illegible] [*d.* Habicht] *zool.* каршун
hobn* (ix hob, du host, er/ir hot, mir/zej hobn; gehát) [*d.* haben] 1. мець; 2. раджаць; 3. *n* роды; **hob** *m/n*, **hob-un-gób**, **hob-un-gúts** *n* скарб, манаткі, дабро, пажыткі, маёмасьць; **hóbern** *f*, -s (па)радзіха
• hobn* a hant (in) прыкласьці руку, прымаць удзел
• hobn* a harc (af) трымаць сэрца (мець зуб на кагосьці)
• hobn* a ponem мець твар/выгляд
• hobn* a šajxes мець адносіны (да), тычыцца
• hobn* an ort мець месца
• hobn* cu ton* мець агульную справу
• hobn* in zinen/ojgn (bedeje) мець на ўвазе
• hobn* jenem in arbl, in di švarce gret мець кагосьці ў рукаве, у чорнай бялізьне (у труне я яго бачыў; мне да яго справы німа)
• hostu nit, vejstu nit невядома адкуль (ні адтуль ні адсюль)
• vos hostu cu mir? што ты маеш да мяне?
• zajt mir un hot усяго найлепшага, посьпехаў вам
• darfst hobn, šik nox der boben *glxv.* прыйшоў час раджаць, пасылай па бабку
• ejder hobn un grobn, iz šojn beser gornit cu hobn *glxv.* чымся мець і хаваць, лепей ужо зусім ня мець (аб дзецях)
• er frejt zix, vos di mame hot im gehat un nit kejn fremde jidene ён весяліцца, што яго маці нарадзіла, а не чужая жыдоўка (бяз дай прычыны)
• – Ix vel dir di fiš ufesn, /un ale zoln zej zajn, /nor du zolst mir zibn kinderlex hobn, /un a mejdele zolstu mir zajn. *flksl.* Я зьем табе рыбу, каб уся яна засталася жывой, толькі ты мусіш радзіць мне сямёра дзяцей і застацца дзяўчынай.
• nit hobn zolstu kejn guts in štub! *kll.* каб у твае хаце дабра не было!
• vos me nemt zix nit alejn, dos hot men nit (un az me nemt zix alejn, šlogt men iber di hent) *šprxv.* чаго сам ня возьмеш, таго і мець ня будзеш (але хто бярэ сам сабе, той атрымлівае па рукох)
Hóceploc/Hócekloc *n*, **Hócmexa** [*d.* Hotzeplotz] Гоцэплоц (мястэчка ў Сылезіі) (азначэньне для далечыні); **hoceplóce/-klóce** дудкі! трасцу!
• antlojfn* in Hoceploc зьбегчы ў Гоцэплоц (куды вочы глядзяць; чорт ведама куды)
• farkrixn* in/kejn Hoceploc далёка зайсьці/заехаць, зарапартавацца
• fun Hoceploc бог/чорт ведае/ведама адкуль (з-за сьвету; дзе камар козы пасе; дзе саболі пасьвяць; дзе нашыя вароны не лятаюць; дзе чорт хамуты ня вешае)
hoc! [*ukr.* гоц!] *int.* гоц! гоп!
• zog nit: "hoc!", biz du bist nit aribergešprungen dem kloc *glxv.* не кажы "гоц", калі не пераскочыў (калоду)
hócke(ne)n/hočken zix [*ukr.* гоцати] гоцацца, гойдацца, гутацца; **hocke=hecke** *f*, -s 1. штуршок; жарт; 2. зараза; панос, мыт, мытуха, ганячка, гнётка; **hócelke** *f*, -s, **hócelixe** *f*, -s круцёлка, гоцалка, скакуха, непаседа (аб жанчыне); **hóckediker** дрогкі, трасучы
hoder *m*, -s [*mhd.* hader] лахман, рызман, шматок, скумат; **hódern** падраць, падзерці на шматкі/кавалкі
hoder *m* [*s.* הדר →mehader, mehuder, hider] 1. эсрог, цытрон (спэцыяльна адабраны, прыгожы і дарагі) [*sin.* esreg]; 2. *fig.* прыгажосьць; вельмі прыгожая рэч або прыгожы чалавек
hodes=hadás *m*, *pl.* -n/hadasim [*s.* הדס(-ים)] 1. *bot.* мірт; 2. **hadase** *f*, -s [*s.* הדסה(-ות)] міртавая галіна, якую прывязваюць да пальмавай галіны для блаславеньня на Сукэс; **hodes** *m*, -n, *dim.* **hodesl** *n*, -ex; **hódes-puškele** *n*, -x скрынка, пушка для прыпраў, якімі карыстаюцца ў час Гаўдалы [*sin.* bsomim-biksl, gevircn-puške]
• hodes štinkt di gance vox, un šabes-cu-naxts šmekt zi *glxv.* мірт сьмярдзіць увесь тыдзень, але суботнім вечарам пахне (*vrtš.* "hodes" – "мірт" і жаночае імя "Hadase" – "Гадаса")
hódeven [*p.* hodować, *ukr.* годувати] 1. гадаваць; 2. *n*, **hodevanje** *f*, **hodivl(j)e** *f* гадаваньне, гадоўля; **hodevanik** *m*, -es, (-nice *f*, -s), **hodovnik** *m*, -es, (-vánke *f*, -s) выхаванец, выхаваньнік, гадаванец, гадунец; **hódever** *m*, -s чалавек, які займаецца гадоўлей
• hodeven af cezect vern* гадаваць на забой
• hodeven mit refues нашпігоўваць лекамі
• hodeven texter af lajtiše gelexter! *glxv.* гадаваць дачок людзям на сьмех!
hodi! hodje! [*ukr.* годі] *int.* годзе!
• hodi vejnen! годзе плакаць!
hod-málxes *m* [*s.* הוד־מלכות →hojd] царская веліч; **hod-malxúse** [*s.* מלכותו־] яго царская вялікасьць
hófer(d)iker, **hóferlexer** [*d.* hoffärtig] 1. самаўпэўнены, ганарлівы, ганарысты, фанабэрысты, пыхлівы, зухлівы, бесклапотны, заўзяты; 2. *m* ганарлівец, самаўпэўнены чалавек; **hóferdikajt** *f* самаўпэўненасьць, ганарлівасьць, фанабэрыя, бодрасьць, бесклапотнасьць, заўзятасьць
hofex=hipex [*s.* הפוך →hejpex, hefex, mehapex, nepex] *adv.* наадварот, насупраць [*sin.* kapojer, farkert; *ant.* jošer]
hofixt *m*, -n [?] *zool.* арлан
hofn (af, cu) [*d.* hoffen] спадзявацца; **hóf(en)ung** *f*, -en надзея, спадзяваньне, спадзяванка, спадзеў; **hófntlex** *adv.* напэўна, мабыць, мо, мусіць, можна спадзявацца; **hófenungfuler** прасякнуты надзеяй; **hófenung(s)loz(ik)er** безнадзейны; **hófenung(s)lozikajt** *f* безнадзейнасьць
• a hofenung cu got спадзяваньне на бога
• af got darf men hofn, ober alejn ojx nit šlofn *glxv.* на бога спадзявайся, але й сам ня сьпі (божа, памажы, а сам не ляжы (а ты, дурню, падбяжы); памажы, божа, але й ты не лянуйся, нябожа)

• an oreman hot draj hofenungen (az er vet vern azoj rajx, vi zajn šoxn, oder der šoxn vet nox oremer vern, vi er iz, oder zej veln bejde štarbn kabconim) бядняк мае тры спадзяваньні (што ён разбагацее, як ягоны сусед, або сусед зьбяднее, або яны абодва памруць жабракамі)
• gut iz cu hofn, šlext iz cu vartn *šprxv.* добра спадзявацца, кепска чакаць (найцяжэй чакаць і даганяць)
• hofntlex fargesn menčn, ver es hot zej geštelt af di fis, un krixn šojn afn kop напэўна забываюцца людзі, хто іх паставіў на ногі, і лезуць ужо на галаву
• kolzman der/a menč hot/halt nox di ojgn ofn, zol er nox hofn *glxv.* пакуль вочы бачаць, нельга губляць надзею (проч маніся, а жыта сей; пакуль чалавек жыве, то ўсяго можна спадзявацца; хто сее, той мае надзею/той надзее)
• mit hofenung vestu zat ništ zajn (hofenung maxt nit zat) *glxv.* спадзяванкай сыты ня будзеш
• s'vilt zix nit glojbn, me muz ober di hofenung lejgn *glxv.* ня хочацца верыць, але трэба спадзявацца
• Sofkolsof vos mejnstu dermit, /vos du vilst cu mir nit kumen? /Ix hof, ix hof, s'vet zajn aza cajt, /du vest mix zuxn un nit kenen gefinen. *flksl.* У рэшце рэшт, што ты хочаш гэтым сказаць, што ты не жадаеш да мяне прыехаць? Я веру, я веру, надыдзе такі час, ты будзеш мяне шукаць і ня зможаш знайсьці.

hogl *m*, -en [*d.* Hagel] град; **hoglen** (mit) сыпаць/сячы градам
• faln* vi a hogl падаць як град
• es šit a hogl (s'hoglt) сыпле град
• me antlojft fun regn, bagegnt mit hogl *glxv.* уцякаў ад дажджу, трапіў у град (з дажджу пад рыну; з холаду ў мароз; ад бяды ўцёк, да ў гора трапіў)

hogn *pl.* hagunim [*s.* (ים-)הגון], **hagune**, -s [*s.* (ות-)הגונה] пачэсны, шаноўны, паваж(а)ны, людзкі [*sin.* bekovedik, lajtiš]
(ho)iker šoxaxti *m* [*s.* עיקר שכחתי(ה)] "найважнейшае я запамятаваў"; постскрыптум
hoj! [*p.* hoj, *ukr.* той] *int.* гой! гэй!
hojb *f*, -n, *dim.* **hajbl** *n*, -ex [*d.* Haube] чапец, каптур; чэхлік
• a vajbl in a hajbl жанчынка ў чапцу
• er iz gebojrn in a hajbl ён нарадзіўся ў каптурыку/сарочцы/кашулі (пад шчасьлівай зоркай)
• hojb un šlejer! чапец і вэлюм!
• vej iz dem vajbl, vos kumt ahejm cum foter in hajbl *glxv.* гора дзяўчыне, што пайшла прочкі да бацькі ў адным чапцы
• ven vert fun a mejdl a vajbl? – az me tut ir on a hajbl *glxv.* калі дзеўка робіцца жанчынай? – калі ёй надзяваюць каптур

hójbice *f*, -s [*d.* Haubitze] гаўбіца
hojbn*=hejbn* (gehójbn) падымаць
hojcen=uc(e)n [*mhd.* ûzen] пад'ялдыкваць, кпіць, насьміхацца
hojcoe=hecoe *f*, -s [*s.* (ות-)הוצאה →bal-hojcoe] 1. расход, выдатак, (с)трата, кошт [*sin.* ojsgabe, kostn; *ant.* haxnose]; 2. выманьне (таксама Торы ў сынагозе для чытаньня); **hojcoes-hadérex** *pl.* [*s.* הדרך] дарожныя расходы, выдаткі [*sin.* rajze-ojsgabes, vegkostn]
• arajnbrengen* emecn in hojcoes увесьці кагосьці ў страту
• gebn* hojcoe ушанаваць кагосьці правам выманьня Торы
• ojsdrejen zix mit der hojcoe неяк выкруціцца з расходам
• ojsšlogn* (zix) di hojcoes пакрыць страты
• ojsštejn* di hojcoes аплаціць выдаткі
• umkern di hojcoes вяртаць выдаткі
• az me vil zix ojsšlogn di hojcoes, šlogt men zix ojs di cejn *glxv.* зубы сабе павыбіваеш, але ўсе страты не пакрыеш

hojd [*s.* הוד →hod-] "веліч, вялікасьць"; *kbl.* адна зь дзесяці сфэраў
hojde [*s.* הודו] "дзякуе"; першае слова і назоў ранішняй малітвы [*sin.* dankt]; **hojdoe** *f*, -s [*s.* (ות-)הודאה] удзячнасьць, прызнаньне, згода
Hojde [*s.* הודו] *tnx.* Году (Індыя) (Эст. 1:1, 8:9)
• zogt er "Hojde", zogt zi "Xuš" ("kuš in oxer"), zogt er "flejš", zogt zi "fiš" *glxv.* ён кажа "Году", яна кажа "Хуш" ("пацалуй у сраку"), ён кажа "мяса", яна кажа "рыба"

hojden [*ukr.* гойдати, *p.* hojdać] 1. гойдаць, гушкаць; 2. *n* гайданьне, гушканьне; **hojd(lk)e/hójdevke** *f*, -s гойдалка, гушкалка, арэлі; **hójdevdiker** які гушкаецца, гайдаецца, вагаецца
• hojden zix af hojdlke гушкацца на арэлях

hojdoe *f*, -s [*s.* (ות-)הודעה →mojdie, jedeje, jedie, jadn] аб'ява, абвяшчэньне, паведамленьне [*sin.* meldung, onzog]; **hojdóecetl** *m*, -en паведамленьне (папера)
hojf *m*, *pl.* -n/hejf, *dim.* **hejfl** *n*, -ex [*d.* Hof] двор, дзядзінец; **hójfiker, hójfišer** дваровы, надворны; **hójfhunt** *m*, *pl.* -hint дварняк; **hójflajt** *pl.* прыдворныя
• az der porec iz a guter, iz der gancer hojf gut *šprxv.* калі пан добры, дык увесь двор добры (які пан, такі яго і крам)
• az got helft, me lozt šojn in hojf arajn, zogt der lakej: pan ji, pan spi, pan gosci ma, pan njema času калі бог дапаможа трапіць на падворак, дык лакей скажа: пан есьць, пан сьпіць, пан мае гасьцей, пан ня мае часу [*p.* pan je, pan śpi, pan gości ma, pan niema czasu]
• kolzman me zict in hojf, iz men a har, az me varft arojs funem hojf, iz men a nar *šprxv.* пакуль сядзіш у двары – гаспадар, выгналі вон з двара – дурань
• vos kumt mir arojs fun majn pojliš rejdn, az me lozt mix in dem hojf nit arajn? што мне з маёй польскай гаворкі, калі мяне не пускаюць на надворак?

hojfírn=(h)avírn (hojfírt/(h)avirt) [*d.* hofieren] дагадзіць, дагаджаць, заляцацца, прыпадаць (за кімсьці)
hojfn *m*, -s, *dim.* **hojfndl** *n*, -ex, **hájfele** *n*, -x, **hajfl** *n*, -ex [*d.* Haufen] куча, груда; **hójfnvajz** *adv.* кучамі, грудамі
• hojfn ruinen руіны, груды каменьня
• hojfn štejner крушня
• lign* hojfnvajz ляжаць грудамі

hojfn *m*, -s, *dim.* **hajfl** *n*, -ex, **hájfele** *n*, -x [*d.* Handvoll] жменя; **hójfnvajz** *adv.* жменямі
• laxn in di hojfns сьмяюцца ў кулак

hojker *m*, -s, (-te *f*, -s) [*d.* Höcker] 1. горб; 2. гарбун; **hójkerter, hójkerdiker** гарбаты; **hójkern zix** горбіцца
• zajn* a hojker быць гарбуном/няўдалым
• an oreman iz vi a hojker *glxv.* бядняк, як і гарбун (носіць усё сваё дабро на сабе)
• der, vos hot a hojker, muz im trogn *šprxv.* хто мае горб, мусіць яго насіць
• es iz gezunt – cum hojker *glxv.* гэта лекі – гарбатаму (як сьляпому акуляры, як лысаму грэбень; і самыя найлепшыя лекі бескарысны для калекі)
• jederer zet nor jenems hojker, ober ništ zajn ejgenem *šprxv.* свайго горба ніхто ня бачыць (чужыя грахі перад вачыма, а свае за плячыма; чужое бачыць пад лесам, а свайго ня бачыць пад носам; у чужым воку і парушынку ўгледзім, а ў сваім і калоды не пабачым)
• ven frejt zix a hojker? – ven er bagegent a cvejtn (az/ven er zet dem cvejtn; az/ven er zet a gresern hojker far zix) калі радуецца

гарбаты? – калі сустракае такога ж (з большым гарбом)

hojler [*d.* hohl, *p.* goły] пусты; голы; **hojlkajt** *f*, -n 1. паражніна, дуціна; 2. аголенасьць; галеча, беднасьць; **hójlnaketer** голы; **hójlzojmiker** *bot.* голанасенны

- a hojler šarbn голы чэрап
- der hojler emes голая праўда
- dos iz hojle fantazje! гэта голая фантазія!
- hojl vi a katojl голы як каталік
- hojl vi di mame hot im gehat (volt im ict gehat) голы як маці радзіла (як бізун/бубен/калена/костка/палец/пень, як сьвяты турэцкі, як у лазьні)
- hojle nariškajtn пустое глупства
- hojle vent голыя сьцены
- mit di hojle hent голымі рукамі
- šlofn* af der hojler erd спаць на голай зямлі
- hot men zin iz vojl, hot men texter, maxn zej hojl *šprxv.* ад сыноў – дабро, ад дачок – галеча

hojlex=hilex *m*, -n [*s.* (הולך-)ן] 1. *iron.* манера апранацца; [illegible]ходжаньне, паводзіны, прывычка, звычка, унада, [illegible]насьць [*sin.* uffirung]; **hojlex-bótl** *m*, -s [*s.* (בטל-)ס] [illegible], подар; **hojlex-róx(i)l** *m* [*s.* רכיל] паклёпнік, [illegible], плётнік [*sin.* bareder, pljotke-maxer, rexiles-trajber]

hojlexn [*s.* הולכן] *iron.* ады-, сы|сьці, ады-, сы|ходзіць, [illegible] [*sin.* (avek)gejn]

hojln=hajln [*d.* heulen] выць, раўці, рыкаць

- az me lebt cvišn velf, muz men hojln vi a volf *šprxv.* сярод ваукоў жыць, па-воўчы і выць (шыць – з шаўцамі, выць – з ваўкамі)

hojln [*d.* holen] прынесьці, прыносіць, даста(ва)ць

hojn *m*, -en [*s.* (הון-)ען] скарб, багацьце; **hojn-ráv** *m* [*s.* רב] вялікая маёмасьць, майно, багацьце

hojpt 1. *m*, -n [*d.* Haupt] галоўны, галава, кіраўнік; 2. *adv.* галоўным чынам; **hójptlexer** галоўны; **hójptfeler** *m/n*, -n галоўны недахоп; **hójpt-gedank** *m* галоўная думка; **hójpt-mase** *f* асноўная маса; **hójptonfirer** *m* галоўны кіраўнік; **hójptrolje** *f* галоўная роля; **hójpt-štot** *f, pl.* -štet сталіца; **hójptšverikajt** *f*, -n галоўная цяжкасьць; **hójptzac** *m*, -n *gram.* галоўны сказ; **hójptzax** *f*, -n галоўнае, галоўная рэч; **hójptzaxlex/hójptzexlex** *adv.* галоўным чынам; **hójptzaxlexer** галоўны

hojra=hore *f*, -s [*rum.* hora] румынскі народны танец

hojreg *m*, *pl.* harugim [*s.* (הרוגים) הורג →hargenen, harige, horeg, nereg] забіты, змардаваны [*sin.* getojter, dermordeter]; **hójregn** [*s.* הורגן] забі(ва)ць да сьмерці [*sin.* merderlex šlogn]; **hojreg-nefášes/-nefóšes** *m* [*s.* נפשות] забойца; злосьнік, злы чалавек [*sin.* merder; bejzer menč]

hójries *pl.* [*s.* הוריות] марэньне, летуценьне, лятунак, зданьне [*sin.* trojmerajen, ojsdaxtenišn]; *tlmd.* назоў 10-га трактату 4-га разьдзелу (пытаньні аб судовых памылках старэйшага сьвятара або сынэдрыёну)

- traxtn hojries марыць, летуцець

hojroe *f* [*s.* הוראה] вучэньне, навучаньне на рабіна; рабінства [*sin.* raboniše lere; rabones]

hójsener [*d.* aussen] зьнешні, вонкавы

hojsofe=hesife/hesofe *f*, -s [*s.* (הוספה-)ות →mojsef] дадатак, надбаўка, прыбаўка, прыбаўленьне (да пэнсіі) [*sin.* cugob, culog; gehalt-hexerung]

- bakumen* a hojsofe атрымаць прыбаўку
- az kohol vil arojsvarfn dem rov, bet er a hojsofe *glxv.* калі кагал хоча выкінуць рабіна, той просіць надбаўкі
- az me vil nit dem xazn, hejst er zix nor gebn a hojsofe *glxv.* калі хочуць пазбавіцца кантара, дык той яшчэ патрабуе сабе прыбаўкі

hojšajne=(he)šajne *f*, -s [*s.* (הושענא-)ות] 1. малітвы, якія чытаюцца на Сукэс і якія пачынаюцца і канчаюцца словам "hojšajne" ("дапамажы ж"); 2. галінка вярбы, якую прывязваюць да пальмавай галіны; **(hoj)šajnerábe** *f* [*s.* רבה] сёмы дзень Сукэсу (Кучак)

- šlogn* hojšajne абіваць лісьце з галінкі вярбы ў час маленьня
- dos iz šojn nit kejn menč – an opgešlogene hojšajne (er zet ojs vi an opgešlogene hojšajne) гэта ўжо не чалавек – абабіты вербалоз (ні на што ня варты, стары і хворы чалавек)
- hojšajne-rabe firt men di parxes in bod arajn на сёмы дзень Сукэсу пархуцікаў вядуць у лазьню (раней гэта было звычаем у мястэчках)

Hojšeje [*s.* הושע] *tnx.* (прарок) Асія; Кніга прарока Асіі

hojt *f*, *dim.* **hajtl** *n*, -ex, **hájtele** *n*, -x [*d.* Haut] скура, плеўка; **hójt-geveb** *m anat.* скурная тканка; **hójtiker** скурасты; **hójt-krankajt** *f*, -n хвароба скуры; **hójt-svjendžarnjes** *pl.* сьверб, сьвярбячка; **hójt-šinder** *m* скуралуп, жывадзёр; **hójt-šparelex** *pl.* цыпкі; **hójt-štof** *m bot.* клятчатка; **hójt-venerišer** *med.* скурна-вэнэрычны

- a naje hojt zix af im ongecojgn! скуру на ім памянялі!
- (arojs)krixn*/arojsšpringen* fun der hojt (ojsn hojt krixn* /špringen*) лезьці/вылузвацца са скуры
- di hojt brent af im скура гарыць/сьвярбіць на ім
- di hojt citert af im на ім скура дрыжыць (моцна баіцца)
- di hojt rajst af im! скура на ім дзярэцца! (хутка зношвае рэчы)
- fun (der) heler hojt *fig.* ні з таго, ні зь сяго; ні села, ні пала (нечакана, недарэчы, няўчасна, безгрунтоўна, беспадстаўна)
- ojsgevaksn vi fun der heler hojt *fig.* быццам зь неба спаў (выскачыў як каза з маку, як чорт з лазы, як жаба з куста)
- vi s'zol a hajtl arop fun di ojgn быццам заслона з вачэй спала
- (zajn*) hojt un bejn(er) скура ды косьці
- az an alter man nemt a junge mojd, citert af im di hojt *glxv.* калі стары бярэ маладую дзяўчыну, на ім аж скура дрыжыць (муж стары, жонка малада, то агонь да вада)

hojve *m* [*s.* הו(ו)ה] сучаснасьць, цяперашні час

hó(j)xcajt *f* [*d.* Hochzeit] вясельле, шлюб

hojxer (héxerer) [*d.* hoch] 1. высокі; 2. громкі; **hojx=hejx** *f, pl.* -n /hejx вышыня; **hojxkajt** *f*, -n, **hójxeniš** *f*, -n вышыня, узвышша; **hojxn=hejxn** падымаць, уз-, па|вышаць, узьнімаць

- (gib a) kuk arop vestu zen/visn, vi hojx du štejst *glxv.* зірні долу, каб ведаць, як высока ты стаіш
- hojx un dar, un šmekt mit nar высокі і худы, і сьмярдзіць дурнем
- hojx vi a drong высокі/доўгі як дрын/жэрдка/тычка
- krix nit cu hojx, vestu nit darfn niderik faln (fli nit hojx, vestu nit faln niderik) *šprxv.* хто высока заглядае, той нізка сядае (хто высока нос задзірае, той на лобе гуз набівае)
- me darf ništ zajn hojx cu zajn grojs *glxv.* ня трэба быць высокім, каб быць вялікім

hójxbacolnter высокааплатны; **hójxantviklter** высакаразьвіты; **hójxbagabter**, **hójxtalantírter** высокаадораны; **hójxbárgiker** высакагорны; **hojxdajč** *n* [*d.* hochdeutsch] верхне-нямецкая мова; **hójxdajčer** верхне-нямецкі (дыялект); **hójxgelernter** высокаадукаваны; **hójxgerétenišdiker** высокаўраджайны; **hójxgešecter=hojx**

gešecter, **hójxvirdiker** высокапаважаны, вельмі паважаны, высокашаноўны; **hójxgeštelter=hojx geštelter** высокаластаўлены; **hójxgetrajer** дакладны, пэўны; **hójxmutiker**, **hójxharciker** велікадушны; **hójxharcikajt** *f* велікадушнасьць; **hójxklingndiker** высакамоўны, напышлівы; **hójx(-)kvalificirter** высокакваліфікаваны; **hójx(-)kvalitativer** высакаякасны; **hójxland** *n* узвышша, пласкагор'е, плато; **hójxmitiker** [*d.* hochmütig] фанабэрысты, чванлівы; **hójxproduktiver** высокапрадукцыйны, высокапрадуктыўны; **hójxpunkt** *m*, -n вышэйшая кропка; **hójxre(j)der** *m*, -s гучнагаварыцель; **hójxsórtiker** высакасортны, высокагатунковы; **hójxštimiker** галасісты; **hójxšul** *f*, -n вышэйшая навучальная ўстанова; **hójxvaser** *n*, -en паводка, разводзьдзе; **hójxváserdiker** паўнаводны; **hójxvuksiker** высакаросты

hojx(ke)n [*d.* hauchen] дуць, дыхаць; **hojx** *m*, -n подых; **a hojx ton*** дыхнуць, дунуць

hojz *n*, *pl.* hajzer, *dim.* **hajzl** *n*, -ex, **hajzke** *f*, -s, **hájzkele** *n*, -x [*d.* Haus] хата, дом; **hójziker** хатні; **hójzarbetern** *f*, -s хатняя работніца; **hójz-baleboste** *f* [*s.* בעל הבית] дамаўласьніца, гаспадыня; **hójzfirung** *f* дамаводзтва; **hójzgezind** *n.* -er/-n, **hójzlajt** *pl.* сям'я, дамачадцы, дамашнія, хатнія; **hojzn** (mit, ba) ужы(ва)цца, ладзіць, жыць у згодзе/злагадзе; жыць, пражываць, мяшкаць; **hójzrok** *m* (хатняя) капота, хламіда, сурдут; **hójzrot** *n*, **hójz-virtšaft** *f* хатняя гаспадарка; **hójzvirtn** *f*, -s хатняя гаспадыня; **hójzzaxn** *pl.* хатнія рэчы; **hójz-zuxung** *f*, -en хатні ператрус

- farvos kenen zej nit hojzn cvišn zix? чаму яны ня могуць ужыцца між сабой?
- gejn* iber di hajzer хадзіць па хатах (жабраваць)
- nit hojzn mit šxejnes ня ладзіць з суседзямі
- fun itlexn hojz trogt men epes arojs *glxv.* з кожнай хаты штосьці выносяць
- kojfstu a hojz, freg zix nox, ver zajnen di šxejnim arum *šprxv.* купляеш дом, пытайся спачатку, хто твае суседзі
- ver es lebt in a glezern hojz, tor kejn štejner nit varfn *šprxv.* жывучы ў шкляной хаце, камяні не кідаюць
- x'hob fargesn ale libste, /x'hob farlozt majn ejgn hojz; /x'hob dem jam zix opgegebn; /trog mix, jam, cum muters šojs (X. B.) я забыўся на ўсіх сваіх любых, я пакінуў мой уласны дом; я аддаўся мору, нясі мяне, мора, ва ўлоньне маёй маці

hojz *m/f*, -n [*d.* Hose] калашына, калоша; **ho(j)zn** *pl.*, *dim.* **hejzlex** *pl.* нагавіцы, штаны, порткі, майткі; **hójzn-bendl** *n*, -ex матузок; **hójzn-kešene** *f* кішэня ў штанох

- a por hojzn пара нагавіц
- kurce hejzlex шорты
- a sod gejt nor in hojzn *šprxv.* сакрэт ходзіць толькі ў нагавіцах (толькі сярод мужчынаў) (калі сказаў бабцы, то так як усёй грамадцы)
- er hot in di hojzn a jarid ён мае ў штанох кірмаш
- zi trogt di hojzn (zi gejt in hojzn) яна носіць порткі (верхаводзіць у сям'і; бедная тая дамова, дзе вала бадзе карова)

hojzírn (hojzírt) [*d.* hausieren] гандляваць у разнос; **hojzirer** *m* разносчык, карабейнік

hójznblozn *pl.* [*d.* Hausenblase] рыбін клей

hok *m*, -n/-es, **hokn** *m*, -s, *dim.* **hokndl** *n*, -ex, **hekl** *n*, -ex [*d.* Haken] крук, бусак; кручок, гачок; **hoke** *f*, -s зачэпка, перашкода; **hokl** *m*, -en гаплік; **hók-un-špigl-árbet** *f* рукадзельле

hokico [*s.* הקיצה] уставай! прачынайся! абуджайся!

- hokico, Mendele, xap zix uf, Mendele, un krix arojs fun untern ojvn (M.M.-S.) уставай, Мэндэлэ, прачынайся, Мэндэлэ, і вылязай з запечча

hokus-pókus/-fókus *m* [*d.* Hokuspokus] фокус-покус, спрытнасьць рук

Holand *n* [*d.* Holland] Галяндыя; **hólender** 1. *m*, (-ke/-n *f*, -s) галяндыец; 2. **hólendišer** галяндзкі, галяндыйскі, галяндэрскі; **holendiš** *n* нідэрляндзкая мова

holc *n*, *pl.* helcer [*d.* Holz] дровы; дрэва (матэрыял); палена; **hólcerner=hílcerner** драўляны, драўняны; **hólciker** драўнінавы; **hólcarbet** *f* вырабы з дрэва; **hólcbaarbetndiker** дрэваапрацоўчы; **hólcbaarbetung** *f* дрэваапрацоўка; **hólc-epele** *n*, -x дзікі яблычак, дзічка; **hólchak** *m*, pl. -hek калун; **hólchaker/hólcheker** *m*, -s дрывасек; **hólckojln** *pl.* драўняны вугаль, вугольле; **hólcmarx** *m*, -n асяродак, асяродкавіна; **hólcmase** *f* драўняная маса; **hólcšnit** *m*, -n гравюра на дрэве; **hólcšniceráj** *f* разьбярства, рэзь па дрэве; **hólc-štof** *m* драўніна; **hólcvarg** *n* драўніна; **hólcvorem** *m*, *pl.* -verem/-verim *zool.* драўняны чарвяк

- ■ bintl holc вязанка дроваў
- a štik holc *fig.* дубіна, бервяно, палена, доўбня (пра чалавека)
- az me hakt holc – faln špener (vi me hakt dos holc, azoj špringen di špener) *šprxv.* дзе дровы сякуць, там трэскі лятуць (дзе п'юць, там і льюць)
- dos holc-epele švimt fun ojbn *šprxv.* дзікі яблычак плавае на паверхні (нявартыя рэчы заўжды трымаюцца наверсе) (гаўно ня тоне)
- ejn štikl holc kon alejn ništ brengen палена дроваў сам не прынясе

hóldern [*p.* gałda?] галдаць (як індык), галасаваць, тлумiць, гаманіць; **holderáj** *f* гáлас, гармідар, гарланьне, тлум, гоман

hóldern [?] прагна глытаць, жраць, жэрці

holedrige/holodrige *m*, -s, (-xe *f*, -s), **holedranec/holodranec** *m*, -nces, **holedriznik/holodriznik** *m*, -es, **holedrile/holodrile** *m*, -s, (-xe *f*, -s) [*ukr.* голодранець, *p.* hołodraniec] галадрыга, галадранец

hól(eš)ke=háleške *f*, -s *kul.* гал(уш)ка

holex Mojše-Mórdxe [*s.* הו(ו)לך משה־מרדכי →hilex, mehalex] сыйшлі! зьехалі! [*sin.* gegangen! zix opgetrogn!]

holík/holíš *m*, -n [*ukr.* голик, голиш, *p.* hołysz] галыш, галеча, галота

hol(j)uben=haluben галубіць

holoblje=halobl(j)e *f*, -s аглобля

- arojsgejn*/ špringen* fun (di) holobljes выскачыць з аглобляў (адбіцца ад рук)

holopuznik/holepuznik/holehuznik/holepupnik *m*, -es, (-nice *f*, -s) [*ukr.* голопуз] галапузы

holosne(r) [*p.* głośny, *ukr.* голосистий] галасісты

holote *f*, -s [*ukr.* голота] галота, банда, зграя, шайка

holoveške/holeveške *f*, -s, **holovnje** *f*, -s [*ukr.* головня, головешка, *p.* głownia] галавешка

holt/hold hobn*/krign* [*mhd.* holt] любіць, быць да спадобы, падабацца; **hóltiker** прыемны

- holt (hobn*) fun vajtn (a šlofedikn) любіць здалёк, на адлегласьці (не любіць) (калі сьпіць зубамі да сьцяны)
- holt hobn* vi a bitere cibele, vi cejnvejtik любіць як горкую цыбулю, як зубны боль (як сабака катá/палку/цыбулю, як сьвіньня гарбуз/сена, як цыган сьляпую кабылу)

• holt hobn* vi gold, vi an ejgn kind, vi got iz mir lib любіць як золата, як сваё дзіця, як бога (як матка дзіцятка, як сваю душу)
• holt vi ojgnvejtog, vi fefer in noz падабацца як боль у вачох, як перац у нос
• holt hob ix dir, nor... gej af drojsn я цябе люблю, але... ідзі на двор
• ix hob dix azoj holt, az ix volt dir majn tojt nit gežalevet! *kll.* я цябе так люблю, што й сьмерці сваёй табе не пашкадую!
• - Oj, mamenju tajere, mamenju lib, /dem junginkn šnajderl trajb nit fun štib (štub). /Der junginker šnajderl, šejn iz vi gold, /dem junginkn šnajderl hob ix dox holt. (M. L.) – Ой, матуля дарагая, матуля любая, не гані маладзенькага краўца з хаты. Маладзенькі краўчык, прыгожы як золата, ён мне да спадобы.

hólubces/hólupces/hólepces *pl.* [*p.* hołubce, *ukr.* голубці] [illegible]голубцы

[illegible]der-bojm *m*, *pl.* -bejmer [*d.* Holunder] *bot.* бузіна [illegible]

[illegible] (haroše) *m*, -s [*s.* (הרשע) (המן(-ס] *tnx.* Гаман(-[illegible]) злачынец, ліхадзей; вораг гэбрэяў, анты[illegible]; **hómen-klaper** *m*, -s пурымская бразготка; [illegible]-taš *m*, -n, **hómente** *f*, -s *kul.* трохкутныя коржыкі [illegible] чарнасьлівам, курагой і гарэхамі (на Пурым)
• er hot gehat Homens sof/mapole яму прыйшоў Гаманаў канец (паражэньне)
• hern vi Homen dem grager ня слухацца, ня браць да ўвагі, не зьвяртаць увагі (як Гаман на трашчотку)
• šlext/bejz vi Homen haroše злы/ліхі як Гаман-злачынец (як зьмяя/зьмей/скула/аса/шэршань)
• iber dem blozt men homen un me klapt šojfer! *hum.* такім чынам грубяць у бразготку і трашчаць шофарам (блытаніна: "homen-klapn" – "šojfer-blozn"; гэта ж усім зразумелая рэч!)
• s'zol dir dunern in bojx, vestu mejnen, az s'iz a homen-klaper! *kll.* каб у цябе грымела ў жываце: будзеш думаць, нібыта гэта пурымская бразготка!

hon *m*, *pl.* -en/hener, *dim.* **hónexl** *n*, -ex, **héndele** *n*, -x, **hendl** *n*, -ex, [*d.* Hahn] певень; **hónen(-)kam** *m*, -en петушыны грэбень/грабеньчык; **hónen-krej** *m* пеўневы крык; **honfis/hónenfus** *m bot.* курасьлеп, чырвонка палявая; **hónenfisike/hónenfusike** *bot.* казяльцовыя
• lozn* dem rojtn hon пусьціць чырвонага пеўня (падпаліць)
• ufštejn* mit honen-krej уставаць зь пеўнямі
• vi a gekojleter hon як зарэзаны певень
• zajn*/blajbn* vi a hon on a kam застацца як певень бяз грэбеня (ні з чым)
• az der hon krejet, krejet er umetum *šprxv.* калі певень закукарэкаў, дык паўсюдна
• beser a hon in der hant, ejder an odler in himl *šprxv.* лепш певень у руцэ, чымся арол у небе (лепш верабей у руцэ, чым жураў пад небам (як голуб на даху/страсе); лепей варона злоўленая, чым сокал пад небам)
• ver hot a kam un ken mit im nit kemen? (a hon) *rtnš.* хто мае грэбень, але ня можа ім расчасацца? (певень)

(h)óneče *f*, -s [*p.* onuca, *ukr.* онуча] ануча, вяхотка

honer/honor *m* [*p.* honor] гонар, амбіцыя, пыха, фанабэрыя, задаваньне; **honorister**, **honorove(r)**, **honerov(at)e(r)** ганарысты
• a menč mit a honer чалавек з гонарам
• aropzecn emecns honor зьбіць нечую фанабэрыю
• aveklejgn dem honer заглушыць гонар
• kracn dem honor драць гонар
• onrirn dem honer закрануць гонар, абразіць

honik *m* [*d.* Honig] мёд; **hónikdiker** мядовы; **hónik-kuxn** *m*, -s, **hónik-lekex** *m*, -er/-n мядовы пернік; **hónik(-)šojbn** *pl.* соты; **hónik-šveml** *n*, -ex *bot.* апёнак, апенька; **hónik-xojdeš** *m*, *pl.* -xadošim [*s.* (חדשים־) חודש־] мядовы месяц; **hónik-ziser** салодкі нібыта мёд, салодкамоўны
• nit lekn kejn honik не лізаць мёду (не салодка; справы зусім благія)
• badarf men honik, az cuker iz zis? *glxv.* ці патрэбны мёд, калі цукар салодкі? (ад добрага лепшага не шукаюць)

hooxez bejád [*s.* האוחז ביד] "той, хто трымае ў сваёй руцэ" (пачатак гімна, які сьпяваюць на Рош-Гашону)
• "hooxez bejad!" – az me xapt ba der hant, iz men take a ganev *šprxv.* "той, хто трымае ў сваёй руцэ" – калі схапілі за руку, дык напэўна злодзей
• "hooxez bejad" iz di beste tfile *šprxv.* "трыманьне ва ўласнай руцэ" – лепшая малітва (калі трымаеш у руцэ, дык маеш упэўненасьць)
• "hooxez bejad" – šolem bekešene *šprxv.* "хто трымае ў сваёй руцэ" – у таго мір у кішэні
• "hooxez bejad" štejt grojs gešribn *šprxv.* "той, хто трымае ў сваёй руцэ" – напісана вялікімі літарамі

hop! [*p.* hop, *ukr.* гоп] *int.* гоп!; **hopken/hopslen/hop(s)en** гопнуць, гопаць; **hopke** *f*, -s жыдоўскі народны танец (удзельнікі становяцца ў карагод і бяруцца за рукі або кладуць адзін аднаму рукі на плечы)
• hop, hop, ot azoj, /est di cig fun dax dem štroj (B. Š.) гоп, гоп, вось так, есьць каза са страхі салому
• "hop, hop!" un mir iz majns in kop *glxv.* "гоп, гоп!", а мне маё ў галаве

hopn *m/pl.* [*d.* Hopfen] *bot.* хмель
• on dir un on hopn *iron.* безь цябе і бяз хмелю (неяк абыдземся)

hor *f*, *dim.* **hórele** *n*, -x, **hérele** *n*, -x, **herl** *n*, -ex [*d.* Haar] 1. волас; 2. поўсьць, шчаціна; **hóriker=hériker** валасаты; **hórbadek** *m*, -n валасяны пакроў; **hórband** *m*, *pl.* -bender стужка для валасоў, касьнік, жычка; **hor-hóriker** дакладны, акуратны, пунктуальны; **hórnodl** *f*, -en, **hórnodele** *n*, -x, **hór-klemerl** *n*, -ex, **hóršpilke** *f*, -s шпілька, заколка; **hór-šajtl** *n*, -ex/-en парык (у замужніх жыдовак); **hóršpalter** *m* крыхабор, дробязьнік; **horšpalteráj** *f/n* крыхаборства, дробязьніцтва; **hóršpalterišer** крыхаборскі, дробязьніцкі; **hórvorem** *m*, *pl.* -verem/-verim *zool.* валасень
• a hor greser больш чым на валасок
• a hor(ele) mid трошкі/крышачку стомлены
• af kejn hor nit ні на волас
• afn (af a) hor на валасок
• biz a hor (cu der hor) да валаска (дасканала/дакладна)
• di hor šteln zix kapojr валасы становяцца дыбам
• gletn mitn hor arop гладзіць па галоўцы
• haltn* zix af a hor трымацца за валасок (ліпець на валаску)
• hor vi flaks валасы як лён (сьветленькія як лянок)
• s'hot gefelt a hor, s'zol zajn nox im ён быў на валасок ад сьмерці
• s'zol feln a hor! валаска не хапае!

• vos a hor iz vert чаго варты волас
• a froj (zogt men ba undz) hot lange hor un kurcn sejxl *glxv.* (у жанчыны) волас доўгі, да розум кароткі
• di hor zajnen nit zajne *glxv.* валасы не ягоныя (даўгоў як у сабакі кляшчоў/блох)
• ejn hor fun a mejdls kop šlept štarker fun cen oksn *glxv.* адзін волас зь дзявоцкае галавы прыцягвае/прываблівае мацней, як дзесяць валоў
• maxn fun a hor a gor *glxv.* рабіць з мухі слана (з камара зрабілі вала)
• on di groje hor derkent men di jor *šprxv.* па сівых валасох пазнаюцца гады

horáv [*s.* הרב →rav, rabojsaj, reb, (beha)rov] "гэты рабін" (тытул, які дадаецца да імя рабіна)

horb *m*, -n [*ukr./r.* горб, *p.* garb] горб; **horbate(r)** гарбаты; **hórbe(ve)n zix** горбіцца; **hórbiker** гарбаты, з гарбіной /гарбінкай; **horbún** *m*, -es, **horbúl** *m*, -jes, **horbate** *m/f*, **horbáč/horbič** *m*, -es, (-ke *f*, -s) гарбун; **horbûl** *m*, -n гарбыль

• a horbate noz гарбаты нос
• a horb zol dir onvaksn! *kll.* каб у цябе горб вырас!

hórčice=górčice *f*, -s [*p.* gorczyca] гарчыца

horde *f*, -s [*d.* Horde, *p.* horda] арда, зграя

horde [*sl.?*] *adv.*

• šteln zix horde станавіцца на дыбы

hore=hojra *f*, -s [*rum.* hora, *s.* הורה] румынскі народны танец

horeg *m*, *pl.* harugim [*s.* (ים-)הרוג →hojreg, harige, nereg] забіты [*sin.* getojter, derhargeter, dermordeter]

hore(j)-xójšex *pl.* [*s.* הרי־חושך →har-, horim-, behar] "цёмныя горы"

• er hot zix avekgelozt hinter di horej-xojšex (in horej-xojšex) ён накіраваўся за цёмныя горы (за блізкі сьвет)

horelke *f* [*ukr.* горілка] гарэлка, водка

horepašnik *m*, -es, (-nice *f*, -s) [*ukr.* горопашний, *r.* горепашник] гарапашнік, гаротнік; **horepašne(r)** гарапашны

hóreven (af) [*p.* harować] моцна/цяжка працаваць, пад-, над|рывацца; **horevanje** *f* цяжкая праца, намаганьне

• fardinen mit ejgener horevanje зарабіць уласным гарбом
• horeven vi a ferd, vi an ejzl/oks, vi a jidene far Pejsex працаваць як конь/асёл/вол (у ярме), як жыдоўка перад Пэйсахам (як мурашка/пчолка/пякельнік)
• horeven vi der oks in soxe працаваць як вол з сахой
• lebn fun ejgener horevanje жыць уласнымі намаганьнямі
• az du vest nit horeven, vestu nit esn *šprxv.* хто ня ўмее араці, таму хлеба ня даці (без мазаля на руках ня будзе хлеба ў зубах; каб рыбу есьці, трэба ў ваду лезьці)
• horeve, mejdele, vestu hobn a klejdele! *glxv.* гаруй, дзяўчынка, будзеш мець сукенку!
• un der tate horevet, horevet /ale jorn zajne, /un er kojft undz, un er brengt undz /zaxn šejne, fajne (Z. R.) бацька цяжка працуе ўсё сваё жыцьцё, але ён купляе і прыносіць нам прыгожыя рэчы

hórflaks *n* [?] жылістае мяса; *fig.* нязграбны чалавек, няўмека

horim-ugvóes *pl.* [*s.* הרים וגבעות →har-, hore-, behar] "гара і ўзгоркі"; цэлая гара, вельмі шмат

• cuzogn horim-ugvoes абяцаць залатыя горы

horíšn [*s.* הראשון →(be)rejšis, (be)roš, rišn] першы [*sin.* der eršter]

horláč *m*, -n, **horlačik** *m*, -es [*r.* горлач] гарлач, збанок; **horlačik** *m*, -es *hot.* гарлачык

horle=gorle *f*, -s [*r./ukr.* горло] горла

horn [*d.* Horn] 1. *m/n*, *pl.* herner рог; 2. *m*, -s рог (музычны інструмэнт); **hórndiker** рагаты; рагавы; **hórener**, **hórnartiker** рагавы, падобны на рог; **hornist** *m*, -n, (-ke *f*, -s) гарніст; **hórn-fi** *n* рагатая жывёла; **hórn-hajtl** *n*, -ex рагавіца

• blozn* in horn дудзець у рог
• es iz mit herner! нават з рагамі! (дзіва дзіўнае)
• onxapn dem oks far di herner узяць быка за рогі
• vos elter der oks, alc štarker der horn *šprxv.* чым старэйшы бык, тым мацнейшы рог (старога ліса не ашукаеш)

hórnbin *f*, -en [*d.* Hornisse] *zool.* шэршань

hórnbojm *m*, *pl.* -bejmer [*d.* Hornbaum] *bot.* граб

horne *f*, -s [*ukr.* горно] *texn.* горан

horn-kórn, **hor(j)em-kórnem**, **hore-kóre** [?] *adv.* шыварат-навыварат

horxn [*d.* horchen] (пад)слухаць, падслухоўваць; **hórxiker** (па)слухмяны; **hórxzamer** пакорны, пакорлівы; **hórxzamkajt** *f* пакора, пакорлівасьць, віннасьць, прыклоннасьць, паслухмянасьць

• horxn mit (grojse) ojgn *iron.* слухаць, вылупіўшы вочы

hóspitol *m* [*r.* госпиталь] шпіталь

hospodár *m*, -es [*ukr.* господар] гаспадар

hostcje *f*, -s [?] *bot.* цярноўнік

hostjen/hosc(j)en/hoščen (zix) (ba) [*p.* gościć, *r.* гостить] гасьціць, гасьцяваць

hotél *m*, -n [*d.* Hotel] гатэль, гасьцініца; **hoteljér** *m*, -n, (-śe *f*, -s) гаспадар гатэля

hóxcajt=hójxcajt *f* вясельле, шлюб

hóxgešecter [*d.* geschätzt] вельмі паважаны, высокапаважаны, высокашаноўны

hoz *m*, -n, (-ixe *f*, -s), *dim.* **hézele** *n*, -x, **hezl** *n*, -ex [*d.* Hase] заяц; **hózener**, **hózišer** заечы; **hézelex** *pl.* (дзіцячая гульня) кошкі-мышкі; **hóznfuter** *m* заечае футра; **hóznkrojt** *n* *bot.* заечая капуста; **hóznlip** *f* *med.* заечая губа; **hóznnisl** *n*, -ex (hozn nisl) фундук

• hozene ojern заечыя вушы
• vern* hoz зрабіць ногі, уцячы
• šisn* cvej hozn mit ejn šos забіць двух зайцаў адным стрэлам (адным ударам двух зайцаў забіць)
• a mazldiker hoz шчасьлівы заяц (аб чалавеку, зь якім заўжды нешта здараецца)

hoze *f* [*s.* העזה →balhoze] сьмеласьць, адвага, рызыка; дзёрзкасьць, нагласьць, нахабнасьць [*sin.* drejstkajt; xucpe]; **hóze(s)diker** дзёрзкі, наглы, нахабны; **hózenik** *m*, -es (-nice *f*, -s) дзёрзкі чалавек, нахабнік, басалай

• hobn* di hoze мець дзёрзкасьць, рызыку, адважыцца, рызыкнуць
• ix hob di hoze cu zogn я адважуся сказаць
• cvišn a sax hint vert der hoz tojt *šprxv.* у зграі сабак заяц прападзе

hrab=grab *m*, -n [*p.* grab, *r./ukr.* граб] *bot.* граб

hrablje=grablje *f*, -s [*ukr.* граблі] граблі

hreblje=greblje *f*, -s [*p.* grobla, *ukr.* гребля] грэбля

(h)rečke *f* [*ukr./r.* гречка] грэчка; **(h)réčener** грэцкі

hrizen/hrižen=grižen [*ukr.* гризти, *p.* gryźć] грызьці; **hrizote=grizote** *f* згрызота, назола; **hrízeniš** *f* грызьня, сварка

hromade=gromade *f*, -s [*p.* gromada, *ukr.* громада] сялянская грамада

(h)rube *f*, -s [*mhd.* gruobe, *p.* gruba, *ukr.* груба] грубка

• er darf ba im di hrube hejcn ён павінен яму грубку тапіць

(падноска ня варты, ня варт вады падаваць)

(h)rude=grude *f*, -s, *dim.* **hrudke** *f*, -s, **hrúdkele** *n*, -x [*ukr.* груда] груда; **hrúdediker** камякаваты, з грудамі; **(h)rudeva-te(r)** гузаваты, шышкаваты

• gance hrudes papirn гара паперы

hruken [*ukr.* грукати] грукаць; **hruk** *m* грук(ат)

hruznen/hruz(j)en=gruznen [*ukr.* грузнути] 1. грузіць; 2. (in) грузнуць

hšj"s/hš"j(s) *abr.* **hašém jisborex** *m* [*s.* =(ת)"השי/"השׁ הַשֵּׁם יִתְבָּרַךְ] "хай будзе блаславёным гэта імя"; бог

hu hadín [*s.* הוּא הַדִּין] "уласны закон"

hubl=hebl *m*, -en [*d.* Hobel] гэбаль; **húble(ve)n=hébleven** габляваць; **húblinkes** *pl.*, **húblšpon** *m*, *pl.* -špener габлюшка, стружка

• laxn nit hublšpener сьмяяцца скрозь слёзы

hučke *f* [?] бацьвіньне, цяўнік

hud(j)en/hudzjen/hudžen [*ukr.* гудіти] 1. гудзець, гусьці; 2. *n.* **hudjeráj** *f* гудзеньне; **hudók** *m*, -dkés гудок

• [illegible] hudjen funem vint гудзеньне ветру

• [illegible] hudzjet vi in a brojz гудзіць/грыміць як на бровары (як [illegible] малатарня)

[illegible] [*č.* huhati] *int.* гу-га

• [illegible] hu-ha fun kojles гул галасоў

huken [*ukr.* гукати, *p.* hukać] гукаць; гаркаць; **huk** *m*, -es [illegible] гук, выкрык; гуканьне; **a huke ton*** гаркнуць

huljen [*p.* hulać, *ukr.* гуляти] 1. гуляць, разгульваць, п'янствaваць; 2. *n.* **húljeniš** *n* разгул; **huljake** *m*, -s, **hulják** *m*, -es гуляка; **huljanke** *f*, -s, **hulke** *f*, -s гулянка; **a hulje ton*** гульнуць

• huljen af vos di velt štejt гуляць на чым сьвет стаіць

• vos mer kabcn – mer huljak(e), vos mer nogid – mer sobake /svinjak *glxv.* чым большы бядняк – большы гуляка, чым большы багацей – большы сабака/парсюк

• hulje, kabcn! cores kostn kejn gelt *glxv.* гуляй, бядуля! ліха дармавое

hulpak *m*, -es [?] бадзяга, валацуга, басяк

hultáj *m*, -es, (-ke *f*, -s) [*ukr.* гультай, *p.* hultaj] гультай; **hultájeven** гультайнічаць; **hultajske(r)**, **hultájišer** гультайскі; **hultajstve** *f* гультайства

humbug *m* [*d.* Humbug] ашуканства, блеф

humor *m*, -n [*d.* Humor] гумар; **humorist** *m*, -n, (-n *f*, -s) гумарыст; **humoristišer** гумарыстычны; **humoreske** *f*, -s гумарэска

humpik *m*, -es [?] прысадзісты, карчакаваты чалавек

humus *m* [*lat.* humus] гумус, перагной

hun *f*, *pl.* hiner, *dim.* **híndele** *n*, -x, **hindl** *n*, -ex [*d.* Huhn] курыца

• az a šejne hun gejt arum in štub, iz ojx šejn *šprxv.* калі прыгожая курыца ходзіць па хаце, дык і гэта прыгожа

• az an oreman est hun, iz er krank, oder di hun *glxv.* калі бядняк есьць курыцу, дык або ён хворы, або курыца хворая

• der odler iz dem hindl nit kejn xaver *šprxv.* арол кураню ня сябра (сітнік бердніку (сьвіньня каню, воўк казе) не таварыш; мядзьведзь карове ня брат; воўк сабаку не радня; качар курыцы ня пара; багатыр беднаму ня брат)

• "rebe! ix gej di hiner šextn!" – vi fil? – "ejne" "рэбэ! я іду курэй рэзаць!" – колькі? – "адну"

hundert [*d.* hundert] 1. сто; 2. *m*, -er сотня; **húnderter** *m* сотня (грошы); (der) **húndertster** соты; **hundert(st)l** *n*, -ex сотая частка; **húndertjoriker** стогадовы

• biz/iber hundert un cvancik (jor)! (hundert un cvancik jor zolstu lebn!) добрага здароўя на доўгія гады! каб ты жыў да ста дваццаці год!

hunger *m*, -s [*d.* Hunger] голад; **húngern** 1. галадаць; 2. *n* галаданьне; **húngeriker** галодны; **húngerdiker** *m*, -ke які галадае; **húnger-jor** *n*, -n галодны год; **húnger-lejdn** *pl.*, **húngerpajn** *f* пакуты ад голаду, галадуха; **húnger-štrajk** *m*, -n галадоўка; **húnger(-)tojt** *m* галодная сьмерць

• aropgekumen fun hungerland прыехаў з галоднага краю

• er hot derśpirt hunger ён адчуў голад

• hungerik vi a volf/hunt (in najn teg), vi dem milners xazer галодны як воўк/сабака (у пост), як млынарова сьвіньня

• ojsgejn*/śtarbn* fun/far hunger паміраць з голаду (кішкі марш іграюць)

• a zater ken nit farštejn kejn hungerikn *glxv.* сыты галодна-га не разумее

вец [*sin.* vejser, kener]; **jedeje zajn*** ведаць; **jedeje-hákl** *m* [*s.* הכל־] усёведны чалавек [*sin.* alvisiker, alcvejser]; **jedeje-hákldiker** усёведны, які ўсё ведае; **jedeje-nág(ej)n** *m*, *pl.* jode-nág(ej)n [*s.* (־יודעי) נגן־] знаўца музыкі; *hum.* знаўца картачных гульняў; **jedeje-séjfer** *m*, *pl.* jode-séjfer [*s.* ספר־] адукаваны, пісьменны, вучоны чалавек, які можа вучыць [*sin.* gelernter]; **jedeje-xéjn** *m*, *pl.* jode-xéjn [*s.* חן־ →xoxme-nisteres] кабаліст, містык; знаўца патаемных рэчаў [*sin.* mekubl]; **jedeje-šeejne-jedéje** *m* [*s.* שאינו־] чалавек, які ведае, што ён нічога ня ведае

• a jedeje-šeejne-jedeje iz a halber jedeje *šprxv.* знаўца, які ведае, што ён нічога ня ведае - ужо напалову знаўца

• kejn jedeje-sejfer bin ix ništ, lernen lern ix ništ (Prc.) я не пісьменны чалавек, вучыцца я не вучуся

jéder(er) (jedes) [*d.* jeder] кожны; **jédnfals** *adv.* у кожным разе (выпадку), ва ўсякім разе

• jeder barg-aruf hot zajn barg-arop *šprxv.* кожны ўздым мае свой спуск

• jeder/itlexer hot lib dem emes, ober nit jeder/itlexer zogt im *glxv.* кожны любіць праўду, але ня кожны яе гаворыць

jedíd *m*, -im [*s.* (־ים)ידיד] добры сябра, браценік [*sin.* guter-frajnd, guter-bruder]; **jedidi** [*s.* ידידי] мой сябра! (формула звароту ў лістох) [*sin.* frajnd majner!]; **jedídi-brivl** *n*, -ex сяброўскі ліст; **jedíd-némen** *m*, *pl.* jedidim-nemónim [*s.* (־ים)נאמן־] адданы, верны сябра [*sin.* getrajer frajnd]

• jedidi! frajnt majner! мой сябра!

• mir zajnen gevorn bald emese jedidim, gute-brider hejst es (M.M.-S.) мы хутка сталі добрымі сябрамі, тое, што завецца сапраўднымі браценікамі

jedie *f*, -s [*s.* (־ות)ידיעה →mojdie, hojdoe, jadn, jedeje, kejedue] (зь)вестка, пасланьне, навіна; веды [*sin.* melding, najes, bsure; visn]; **jedue** [*s.* ידוע] вядома [*sin.* bakant, bavust]; **jedue-lákl** [*s.* לכל־] усім вядома

• epes a jedie (a štikl jedie) вестачка

jéd(í)nak *m*, -es, (-načke *f*, -s) [*p.* jedynak] адзінак(а), адзіны сын

je(d)nerál *m*, -n *hum.* генэрал

jeféjf(i)e *f*, -s [*s.* (־ות)יפיה/יפהפיה] вельмі прыгожая жанчына, красуня, прыгажуня

Jefes [*s.* יפת] *inx.* Яфэт (адзін з трох сыноў Ноя) (Б. 5:32)

jefes-tójer/jefastojer *f*, -n/-s [*s.* (־ס/־ן)יפת־תואר] красуня, прыгажуня; вялікая прыгажосьць

• a jefastojer – a fas vi a tojer, un a toxes vi a rajbajzn *glxv. vulg.* прыгажуня – потка як вароты, а срака як тарка

jeger *m*, -s, (-n *f*, -s) [*d.* Jäger] паляўнічы, лоўчы, лавец; **jegeráj** *n* паляваньне, ловы; **jégerišer** паляўнічы

• az der jeger ken nit šisn, blajbt ojx der hunt on a bisn *šprxv.* калі паляўнічы няздольны страляць, дык і сабака галодны

jegíe-kapáimnik *m*, -es, (-nice *f*, -s) [*s.* יגיע־כפים־ניק] працаўнік, работнік, рабоцька, гарапашнік, гаротнік [*sin.* horepašnik]; **jegie-kápe/-kápev/-kapáim** *f* [*s.* כפ(י)ו־/כפים־] праца ўласных рук, уласная праца

jegle *f*, -s [*lit.* egle?] *bot.* яліна, елка

jehí *m* [*s.* יהי־] "хай будзе" (першыя словы бога пры стварэньні сусьвету), пастанова, загад, дэкрэт; **jehí-ójr** [*s.* יהי־אור] *inx.* "хай будзе сьвятло" (Б. 1:3); **jehí-rócn** [*s.* יהי־רצון] "няхай будзе божая воля" (пачатак і назоў шэрагу малітваў)

• a topeler jehi-rocn дзьве падобныя рэчы, зь якіх адна ўмацоўвае другую альбо робіць яе лішняй

Jehójnesn [*s.* יהונתן] "дар боскі"; *inx.* Ёнатан, сын цара Савула (1 Цар. 14)

Jehoješ [*s.* יהואש] псэўданім пісьменьніка Егоеш-Шлоймы Блумгартэна (1871–1927) (перакладнік Танаху на ідыш, аўтар першага слоўніка гэбрэізмаў у ідышы)

Jehojšue=Ješue [*s.* יהושע] "Егова ратуе"; *inx.* Ісус (Е(го)шуа, Есуа) (сын Навіна альбо Нуна, вучань і пасьлядоўнік Майсея) (Вых. 24:13)

Jehude [*s.* יהודה] "праслаўлены"; *inx.* Іегуда, Юда (адзін з 12 сыноў Якуба); назоў роду, які пайшоў ад Іегуды

• er rojmt ir ajn dem sod, vos Jehude hot ajngerojmt Tomer *inx.* ён кажа ёй пад сакрэтам тое, што Іегуда казаў Тамар

Jehude Halejvi [*s.* יהודה הלוי] Егуда Галеві (гэбрэйскі паэта і рэлігійны філёзаф, Гішпанія, каля 1075–1141 гг.)

Jehude Hamakabi [*s.* יהודה המכבי] Егуда Макавей (гэрой вайны гэбрэяў супраць грэка-сырыйцаў, II ст. да н.э.)

Jehude Hanosi [*s.* יהודה הנשיא →tane] "Егуда Патрыярх" (апошні з вучоных-складальнікаў Мішны, II-III ст.)

Jehude Haxosid [*s.* יהודה החסיד] Егуда Гахосід (Германія, г. Шпайер, г. Рэгенсбург, каля 1150–1217 гг.)

jehudi *m*, -m [*s.* (־ם)יהודי →jahudi] гэбрэй, жыд [*sin.* jid]; **jehúdišer, jehude-** юдэйскі; **jehudi belój** [*s.* בלא] гэбрэі, увага (асьцярожна)!

• jehudim, me šist, klajbt zix unter di strexes *glxv.* гэбрэі, страляюць, зьбірайцеся пад стрэхі

J(eh)udis=Judes [*s.* יהודית] Юдзіс, гэбрэйская гэраіня з апакрыфічнай кнігі "Jehudis"

jejcer *m*, *pl.* jecorim [*s.* (־ים)יצר] парыў, парыванье, імкненьне, схільнасьць; **jejcer(-)hóre** *m*, -s [*s.* (־ס)הרע־] 1. (cu) спакуса, змуста, схільнасьць да благога, благое імкненьне; 2. сатана, злы дух, які спакушае на благое; 3. *fig.* сьверб, сьвярбеньне, прага, юр, хоць, пал, цяга, пажадлівасьць, жадоба, прагнасьць [*sin.* drang, nejgung; sotn, bejzer gajst; bager, apetit, tajve]; **jejcerhórediker** спакусьлівы; **jejcerhóre-blételex** *pl.* юнацкія прышчыкі; **jejcer-tó(j)v** *m* [*s.* טוב־] добры намер, імкненьне да дабра, дабрачыннасьць, цнота, сумленнасьць

• a štarker/dembener/kuperner (an ajzerner) jejcerhore! моцная/нястрымная хоць!

• der jejcerhore rajx cu vern (der jejcerhore oncufardinen zix) прагнуць нажывы

• s'iz geven grojs/štark der jejcerhore была вялікая спакуса

• der jejcer-hore hot an ajzernem pisk *glxv.* спакуса мае жалезную морду (цяжка перабароць)

• der jejcer(-hore) šloft ba a mejdl un iz uf ba a vajbl *glxv.* спакуса сьпіць у дзяўчыне, але прачынаецца ў жанчыне

• di elter kumt on, un der jejcerhore tut zix zajns *šprxv.* сівізна ў бараду, нячысты ў рабро

• jak jejcer-hore napadnje, to i tkies-kaf nie pomoże *glxv.* як спакуса нападзе, дык і сьвятое абяцаньне не дапаможа (дай сэрцу/ахвоце волі – завядзе да няволі) [*p.* jak napadnie..., to i... nie pomoże]

• ven nit di šejne mejdlex, volt men gehat dem jejcer-hore in dr'erd *glxv.* калі б не прыгожыя дзяўчаты, спакуса даўно была б у зямлі

jejš=jieš *m* [*s.* אוש(י)] →mejaeš, misjaeš, farjiešter] адчай, роспач

Jejšu=Jišu(-hanójcri) [*s.* (ישו(הנוצרי)] Ісус Хрыстос (з Назарэта)

jekár-hamcíes *n*, -n [*s.* (־ות)יקר־המציאות] рарытэт, рэдкасьць [*sin.* zeltene zax]

jeke *m*, -s [*d*. Jeck, Jäckel] *hum*. нямецкі жыд

jékele *n*, -s [*d*. Jokel →jok(iś); Xelem] дурнічка, дурненькі (гэрой хэлмскіх гісторыяў)

• ojszen* vi jekele nar выглядаць як дурнічка

jekiri [*s*. יקירי →bejojker, benjaker] мой дарагі (зварот у лістох) [*sin*. majn tajerer]

• jekiri! majn tajerer! мой дарагі!

• haklal, jedidi jekiri, ix bet ajx, vi an emeser guter frajnd, ir zolt raxmones hobn (Š.-A.) словам, мой дарагі сябра, я прашу вас, як сапраўдны добры таварыш, паспачувайце

jekn [*d*. jecken] дурыць, чмуціць, насьміхацца, кпіць

jekum-púrk(o)n *m*, -s [*s*. (ם-)יקום־פורקן] пачатак і назоў двух блаславеньняў, якія чытаюць раніцай у суботу

• ir najer jekum-purkon *iron*. наві(з)на, новаўвядзеньне

jel *f*, -n (jelover bojm) [*r*. ель] *bot*. яліна, елка; **jelover** яловы; **jelnik** *m* яловая лапка

jelamdejne [*s*. ילמדנו] "хай ён нас вучыць"; давайма слухаць (думку/меркаваньне/довад)

jeled *m* и *pl*. jelodim [*s*. (ים-)ילד] дзіцё(нак), дзіця [*sin*. kind]; **jeled-šaašúim** *m* [*s*. שעשועים־] любы дзіцёнак; **jelud-íše** [*s*. ילוד אישה־] чалавек, чалавечае дзіця [*sin*. menč(nkind)]; **jeled-pjétrik** *m* нябога, бедны байструк

jelke(r)=jólk(edik)er [*p*. jelki] ёлкі, прагорклы

jelole *f*, -s [*s*. (ות-)יללה] лямант, галашэньне, плач [*sin*. geklog, jomer-geśrej]

• jelole maxn лямантаваць, галасіць

jemáx-/jimáx-š(e)mój *pl*. -š(e)móm [*s*. (שמם־) ימח־שמו] *kll*. "бадай яго/яе імя сьцёрлася" (прамаўляюць пасьля ўзгадваньня імя ворага); **jemáx-/jimáx-šmój-vezixrój** *pl*. -š(e)móm-vezixróm [*s*. (זוכרם־) וזכרו] *kll*. "бадай яго/яе імя і памяць аб ім/ёй сьцёрлася" (яшчэ больш абразьліва); **jemáx-/jimáx-š(e)mój** *m*. **jemax(-)šmójnik** *m*, -es, (-nice *f*, -s) праклятый, выкляты чалавек, нягоднік, падлюка, агіднік, паганец, выродак, нелюдзь [*sin*. ojsvorf, ślexter mené]

jemej- [*s*. ימי־ →jom, jojme] дзень, час (каго/чаго) [*sin*. di teg (cajt) fun]; **(šlojšes-)jemej-hagbóle** [*s*. (שלשת־)ימי־הגבלה] "тры дні абмежаваньня"; *tnx*. тры дні падрыхтоўваньня гэбрэяў перад атрыманьнем Торы на гары Сынай; тры дні перад Швуэсам (Вых. 19:15–16)

jem(o)lt=demlt=dam(o)l(s)t [*d*. damals] *adv*. тады

jencn [?] *vulg*. мець палавыя зносіны, любацца, цяці; **jencer** *m*, -s, (-ke *f*, -s) удзельнік палавога акту

jener, **jéniker** [*d*. jener] той, гэны; **jenc** тое, гэнае; **jénevelt** *f* той сьвет, тагасьветнае/замагільнае жыцьцё; **jén(e)veltiker** замагільны, пасьмяротны, тагасьветны, інасьветны; **jénhalb** [*mhd*. jenhalp] на тым баку, там

• di jenike, vos... тыя, што...

• nit dos, nit jenc ні гэтае, ні тое

• az me hot di velt, hot men jene velt ojx *śprxv*. калі ёсьць гэты сьвет, дык ёсьць таксама і той

• ba jenem/andern iz alc beser, vi ba zix (vos ba jenem, dos iz gut) *glxv*. усё чужое лепшае за сваё (там добра, дзе нас няма, а дзе мы жывём – там пуга з вузлом; на Падолью пірагі на кольлю, а мы прыйшлі і там іх не знайшлі; за морам валы дарам; там жыцьцё, як мёду піцьцё)

• ejnems šlimazl iz jenems mazl *glxv*. аднаму за няшчасьце, а другому за шчасьце

• mer af jener velt, vi af der velt больш на тым сьвеце, чым на гэтым

jener *m* [*mhd*. jener] студзень

jenike *f*, -s [*s*. (ות-)יניקה] харчаваньне, кармленьне, пажыва; духоўная ежа, натханьне, натхненьне [*sin*. zejgung, baśpajzung; bildung, gajstike špajz; inspiracje]

• cien* (a/di) jenike (fun) мець прыбытак (натхненьне)

jenk *m*, -en [*p*. jęk] енк, стогн; **jenčen/jenken** енчыць, стагнаць

jenkevate(r) [*p*. jąkliwy] заіклівы, заікаты

jenki *m*, -s [*eng*.] янкі, амэрыканец

Jente *f*, -s Ента (жаночае імя); *fig*. жанчына, кабета, баба; кумка, пляткарка

• a Jente! a jidene! во Ента! во жыдоўка!

• a Jente Grune пляткарка

• a Jente vi ale Jentes Ента як і ўсе Енты (баба як баба)

• di bobe Jentes nisim цуды бабы Енты

• di zelbe/ejgene Jente, nor anders geślejert *glxv*. тая ж самая Ента, толькі па-іншаму захінутая (тыя ж дзеўкі, толькі ў іншых сукенках; тая зязюля, але ня так кукуе; хрэн за рэдьку не саладзейшы; старая сьвіта па-новаму пашыта)

jenuke *f* [*s*. ינוקא] "дзіцё"; сын хасыдзкага рабіна, які зь дзяцінства займае бацькава месца [*sin*. kind]

jeríd=jaríd *m*, -n/-im [*s*. (ים-/ן-)ירד] кірмаш, рынак, базар; мітусьня, шум, галас, тлум, гармідар; *fig*. імша, набажэнства ў хрысьціянскім храме

jeride *f*, -s [*s*. (ות-)ירידה] заняпад, упадак, зьбядненьне, высіленьне, дэгенэрацыя, дэкаданс, выраджэньне [*sin*. gang barg-arop, faroremung, farminerung, dekadenc; *ant*. alie]

• dos gešeft iz in a jeride справы прыйшлі ў заняпад

jerie *f*, -s [*s*. (ות-)יריעה] адзін з кавалкаў пэргамэнту, зь якіх сшываецца сынагагальная Тора

Jerixe *n* [*s*. יריחו] *tnx*. г. Ерыхон (Лік. 22:1, 26:3)

jérlexer [*d*. järlich] гадавы, штогодні; **jern=jorn zix** [*d*. jähren] спраўляць дзень нараджэньня, гадавіну; **-jeriker=-joriker** -гадавы; **jertog=jortog** *m*, *pl*. -teg гадавіна

• mit mazl gejert zix! шчасьлівага дня нараджэньня!

jermolke=jármelke *f*, -s ярмолка

jern*=jojrn* (gejójrn) бушаваць, шумаваць, брадзіць (аб піве/віне)

Jerovom Ben-Nevót *m* [*s*. ירבעם בן־נבט] *tnx*. цар Ераваам (3 Цар. 11:26); *fig*. чалавек, які свой уласны грэх перакладае на іншых

jeruše *f*, -s [*s*. (ות-)ירושה →jarśenen, jojreś, bejeruše] спадчына, атрыманьне ў спадчыну, насьледзтва [*sin*. izovn, legat]; **jerúšediker** насьледны; пераемны; **jerúšedikajt** *f* спадчыннасьць; пераемнасьць; **jerúše-gerixt** *n*, -n маёмасны суд; **jerúše-rext** *pl*. права на атрыманьне спадчыны; **jerúše-rixter** *m*, -s судзьдзя па справах аб спадчыне

• di literariše jeruše літаратурная спадчына

• ale vajber hobn jeruše fun zejer muter Xave усе жанчыны маюць спадчыну ад сваёй маці Евы (маюць дапытлівасьць)

• er hot dercu derlejgt/culejgt (er derlejgt gor) der bobes jeruše ён да таго ж згубіў спадчыну сваёй бабы (што ён згубіў? - кажуць, калі нехта выхваляецца, што ён панёс вялікія страты)

• er lojft vi nox der bobes jeruše *glxv*. ён бяжыць як за бабінай спадчынай (імкнецца да нечага, ня маючы пад нагамі грунту)

• jeruše un nadn-gelt hobn kejn vert/mazl nit *śprxv*. спадчына і пасаг вартасьці ня маюць (шчасьця не прынясуць)

• tejl fanander dajn jeruše bam lebn, vet kejner nit vartn af dajn tojt разьдзялі сваю спадчыну пры жыцьці, ніхто ня будзе чакаць тваёй сьмерці

Jerušolaim *n* [*s.* ירושלים] г. Ерусалім; **jerušalmi** *m*, -m [*s.* (ם-)ירושלמי] жыд зь Ерусаліму альбо з Палестыны; **Jerušolaim-de...** [*s.* -ד] *fig.* Ерусалім нейкай пэўнай краіны (азначэньне для гораду, які разглядаецца ў якасьці значнага цэнтру юдаізму ў нейкай краіне); **Jerušolaim d'Lite/-delite** *f* [*s.* דליטא] г. Вільна (Літоўскі Ерусалім)

jerxe=irxe *f*, -s [?] баранок, смушкі, смушак; **jérxener** баранковы, смушковы

jesjen/ješen *m*, -s [*p.* jesień] восень

• a trukener jesjen un a naser maj iz far der gancer velt cu "xaj" *šprxv.* сухая восень і мокры май для ўсяго сьвету дужа добра (дождж у маі. будзе хлеба на гультаі; калі мокры май, то жыта як гай)

jesód *m*, *pl.* jesojdes [*s.* (ות-)יסוד →mejased] 1. фундамэнт, аснова, грунт, падмурак, падстава; 2. *kbl.* адна зь дзесяці сфэраў [*sin.* fundament, bazis, grunt(štejn)]; **jesójdesdiker** фундамэнтальны, асноўны, грунтоўны, падмуркавы

• af algemejne jesojdes на агульных падставах

• hobn* als jesod грунтавацца, абапірацца

• lign*/farlejgn in jesod, lejgn dem jesod (far) пакласьці пачатак, класьці ў аснову, закласьці падмурак

jesojmim *pl.* →josem *m* [*s.* (ים-)יתום] хлопчык-сірата; **jesojme** *f*, -s [*s.* (ות-)יתומה] дзяўчынка-сірата; **jesójmišer** сіроцкі, сірочы; **jesójmešaft** *f* сіроцтва; **jesójmim-hojz** *n*, *pl.* -hajzer сірочы прытулак

• bitere jesojme горкая сірата

• der jesojmišer gojrl сіроцкая доля

• kajlexdike jesojme круглая сірата

• a jesojme iz a volvele maške *glxv.* дзяўчынка-сіротка як танная гарэлка (лёгка на ёй ажаніцца)

• a jesojme iz micves cu kiclen *glxv.* сіротку прыгалубіць – ласка богу

• oj, šat že, mexutonim ale, /mir tuen bazecn a jesojme a kale, /mir tuen fregn vort ba vort, /ci i' zi geven ba ir foter afn hejlikn ort *flksl.* ой, цішэй жа, сваты ўсе, мы усаджваем нявесту-сірату, мы яе пытаем слова ў слова, ці была яна ў бацькі на магіле

jesurim *pl.* [*s.* (י)סורים →bal-jesurim] гора, ліха, беды, пакуты [*sin.* lajdn, vejtikn]; **jesurim-róim** *pl.* [*s.* רעים] страшныя, жахлівыя пакуты [*sin.* šreklexe lejdn]; **jesurim-šel-á(h)ave** *pl.* [*s.* של אהבה] любоўныя пакуты

• deršlogn fun jesurim забіты горам

• faršafn*/onton* emecn jesurim зрабіць каму-небудзь гора (прычыняць пакуты), назаляць, надакучаць

• hot nit kejn jesurim не бядуйце

• ix hob derfun jesurim я маю ад гэтага гора

• ništo kejn menć on jesurim/car/vejtik *glxv.* німа чалавека без пакутаў, бяз горычы/болю

ješ *m*, -n [*s.* (ן-)יש] нешта істотнае, існае, існуючае, істота; важная асоба/рэч [*sin.* zajendiks, faranens, vezn]; **ješ-meáin /-meájen** *m*, -s [*s.* (ם-)מאין] нешта, створанае зь нічога; **ješ-ómrim** 1. *m* [*s.* אומרים] чутка, погаласка, плётка, хадзячая думка [*sin.* klang, umgejendike mejnung, šmue]; 2. (az) ходзяць чуткі, нехта кажа, ідзе погаласка, ёсьць меркаваньне

Ješaje/Ješajohu [*s.* (ו)ישעיה] *inx.* прарок Ісай; кніга прарока Ісая

ješišim *pl.* →jošeš *m* [*s.* (ים-)ישישים] шаноўны, паважны стары чалавек, старац (хасыд)

ješive *f*, -s [*s.* (ות-)ישיבה] ешыбот, ешыва, гэбрэйская талмудычная навучальная ўстанова [*sin.* mesifte]; **ješíve-boxer** *m*, -im [*s.* (ים-)בחור], **ješíve-man** *m*, *pl.* -lajt, **ješívenik** *m*, -es навучэнец ешывы, ешыботнік

ješue *f*, -s [*s.* (ות-)ישועה] дапамога, збаўленьне, збавеньне, вызваленьне, цудоўнае/дзівоснае выратаваньне, парату-нак [*sin.* hilf, ojslejzung]; **ješues-venexómes** *pl.* [*s.* ונחמות] "збаўленьні і суцяшэньні"; добрыя навіны [*sin.* ojslejzungen un trejstn. gute najes]

• zej veln nox hern fun dortn gute bsures mit ješues-venexomes (Ś.-A.) пасьля яны пачуюць адтуль добрыя суцяшальныя зьвесткі

jetn [*d.* jäten] 1. палоць; 2. *n*, **jetung** *f* поліва, праполка; **jét-ajzn** *m*, -s матыка

jétvider=jértveder [*d.* jedweder] кожны, уся(ля)кі

• ojser jetvidn xšad без усялякага падазрэньня

jevomes [*s.* יבמות →jibem, arajes, agune] "швагерка, залвіца, залоўка"; *tlmd.* назоў 1-га трактату 3-га разьдзелу (запаветы аб шлюбе ў выпадку ўдоўства і ў некаторых іншых выпадках) [*sin.* švegerins]

jevonim *pl.* →jovn [*s.* יוון] 1. *m* грэк; *hist. iron.* расейскі жаўнер, маскаль, паліцыянт; рускі, кацап; хахол, украінец; 2. *n* Грэцыя; **jevoniš** *n iron.* руская або ўкраінская мова; **jevónišer** юдэйска-грэцкі

• a jevoniše kop! маскалёўская галава/мазгаўня!

• jevoniše tojre брыдкая мова, брыдкаслоўе, пахабшчына

jevoréxexo *m* [*s.* יברכך] "ён мусіць цябе блаславіць" (словы са сьвятарскага блаславеньня); *fig.* лаянка, сварка, злосьць, злаваньне [*sin.* zidlvort, gebejzer]

Jexéskl/Jexézkl [*s.* יחזקאל] *inx.* (прарок) Езэкіль; Кніга прарока Езэкіля

jexides *f* [*s.* יחידות] індывідуалізм, саматужнасьць, адзінота; **jexidim** *pl.* →joxid *m* [*s.* (ים-)יחיד] адзіночка, саматужнік; **jexídišer** індывідуальны, саматужны; **jexide(j)-sgúle/-zgúle** *pl.* [*s.* יחידי סגולה] абраньнікі, выбраньнікі, лічаныя і выбраныя людзі

jexojles *n*, -n (cu) [*s.* (ן-)יכולת →joxlen, bixojles, baljexojles, bejexojles] здольнасьць, здатнасьць, схільнасьць, магчымасьць, мажлівасьць [*sin.* feikajt, meglexkajt]

Jezus [*p.* Jezus] Езус, Ісус (Хрыстос)

j"h *abr.* **jórhundert** *m*, -n/-er век, сталецьце, стагодзьдзе

jibem *m* [*s.* יבום →mejabem, jevomes; x(a)lice] *tnx.* закон, паводле якога брат памерлага мужыка, які ня меў дзяцей, мусіць браць шлюб з братавай (Др. З. 25:5–10)

Jicxok ovinu [*s.* יצחק אבינו] "наш бацька Ісак"; *tnx.* патрыярх Ісак

jid=jud *m*, -n, (-iške/-ene *f*, -s), *dim.* **jídele** *n*, -x, **jídene** *n*, -x [*d.* Jude] гэбрэй, жыд; чалавек, асоба, спадар; **jidiš** *n* ідыш, жыдоўская мова; **jídišer** жыдоўскі; **jidl** *n*, -ex дзівак, прастак, прасыцеча; **jídiškajt** *f* гэбрэйская рэлігія, юдаізм; **jídiš-lexer** самабытна жыдоўскі; **jídišn** абразаць, рабіць абразаньне; **jídišer** *m* чалавек, які робіць абразаньне; **jidlak /jidlik=judak** *m*, -es *pejor.* мізэрны, нязграбны жыд; дзівак; **jídišmeser** *m/n* нож для абразаньня; **jidiš-kínd** *n*, *pl.* jidišekínder гэбрэйка, жыдоўка; **jidlen zix** трымацца юдэйскага ладу жыцьця; **jídnkind** *n* сапраўдны, добры жыд; **jídntum** *n* жыдава, жыдоўства; **jídnfreser** *m*, **jídnhaser** *m* юдафоб

• a jidiše kop жыдоўская галава (жыдоўскі розум)

• a jidišer gazlen *iron.* жыдоўскі разбойнік

• der ejbiker jid вечны жыд

• draj mol jidiškajt! жыд жыдам!

- funvanen kumt a jid? адкуль вы прыехалі?
- jidiše natur! жыдоўская/кепская натура!
- jidiše poċt! *iron.* жыдоўская пошта! (вельмі павольная; некалі пошту перадавалі праз балагулаў)
- nemen* a jidiš vort in mojl чытаць малітвы
- reb jid! спадар! (зварот да незнаёмага жыда)
- vi ix bin a jid! як тое, што я жыд! (сапраўды так!)
- vos vil der jid? чаго спадар жадае?
- zaj nit kejn jidene! ня будзь жыдоўкай!
- a jid iz frum, nor nit umetum *glxv.* жыд набожны, але ня ўсюды
- a jid iz jedn grojs in di ojgn *glxv.* жыд усім рэжа/коле /мазоліць вока
- a jid iz kejnmol nit šiker *glxv.* жыд ніколі не бывае п'яны
- a jid, az er iz klug, iz er klug, un az er iz a nar, iz er a nar *glxv.* жыд, калі ён разумны, дык ён разумны, але калі ён дурань, дык ён дурань
- a jid, vos er iz, a nar iz er nit *glxv.* жыд, які б ня быў, дурнем ніколі ня будзе
- [illegible] lebn mištejns-gezogt: časam z kvasam, a poroju s [illegible] *glxv.* уласна кажучы, жыдоўскае жыцьцё: часам [illegible] парою з вадою
- [illegible] me/kiške ken men nit šacn *glxv.* жыдоўскую [illegible] нельга ацаніць
- [illegible] iz a kiler tišebov, a jidiš glik iz, az er kumt [illegible] a jidišer gevins iz der gojrl cu kadeš *šprxv.* жыдоўская суцеха – халаднаваты пост, жыдоўскае шчасьце – малітва, жыдоўская выгада – жалобны лёс
- a jidišer "zaraz" iz vi a pojlišer "dalibog" un vi a rusišer "sejčas" *glxv.* што жыдоўскае "зараз", што польскае "далібог", што рускае "сейчас" (аднолькава ненадзейна)
- alc iz ba jidn cu vejnik (far a jidn iz alc cu vejnik), ober/nor xoxme/sejxl hot jeder/itlexer genug *glxv.* усяго ў жыдоў мала, толькі розуму кожны мае дастаткова
- beser in rusiše/gojiše hent, ejder in jidiše majler *glxv.* лепш у рускага ў рукох, ніж у жыда на языку
- der jam iz on a grunt, un jidiše cores – on a breg *šprxv.* мора – бяздоннае, а гэбрэйскія беды – бязбрэжныя
- der jid entfert tomid farkert: zogt ir im "šolem-alejxem", entfert er ajx "alejxem-šolem" *glxv.* у жыда ўсё навыварат: вы яму "шолэм-алэйхэм", а ён вам адказвае "алэйхэм-шолэм"
- der jid hot nor gelt cu farlirn, un cajt krank cu zajn *glxv.* жыд мае грошы, толькі каб губляць, і час, каб хварэць
- di rajxste menčn in der velt zajnen, farštendlex, jidn – far alemen cecoln zej zix *glxv.* найбагацейшыя людзі ў сьвеце, зразумела, жыды – за ўсіх расплочваюцца яны
- er iz ■ šejner/zajdener (an erlexer) jid *glxv.* ён прыстойны /шаўковы/сумленны жыд
- itlexer jid hot zix zajn pekl *glxv.* кожны жыд мае свой клунак (ліха)
- – Jo, dos iz emes, dos vejsn mir git, /dos geher ober cu jevrej, /du rufst zix ober mit dem nomen "jid", /dix kenen mir gornit, gej, gej. (A. G.)

  Так, гэта праўда, мы гэта добра ведаем, гэта тычыцца яўрэя, але ты "жыд", мы цябе зусім ня ведаем, ідзі, ідзі.
- nem a jidn unterfirn/unterforn, varft er dir arop/arojs funem vogn *glxv.* падвязі жыда, ён скіне цябе з воза (пусьці сьвіньню пагрэцца, то і самому німа дзе дзецца; прасіў воўк адно лапу падвезьці)
- vajz/gib a jidn/hunt a finger, vil/bet er di gance hant (vajz a jidn a finger!..) *glxv.* пакажы жыду/сабаку палец, ён захоча ўсю руку (упрасіўся на парог, а і зь печы ня згоніш; пусьці сьвіньню на ўзьмежак, то яна ў бульбу)
- ven kon zix gefinen ba jidn in štub a hunt? – ven ejns fun di bejde: oder der jid iz kejn jid nit, oder der hunt iz kejn hunt nit ці магчыма знайсьці ў жыда ў хаце сабаку? – адно з двух: альбо жыд ня жыд, альбо сабака не сабака

jieš=jejš *m* [*s.* אוש(י)י →mejaeš, misjaeš, farjiešter, baljieš] адчай, роспач [*sin.* farcvejflung, ophentikajt]; **jíešdiker**, **jíešfuler** адчайны, роспачны, поўны адчаю
- er iz ful mit jieš ён поўны адчаю
- falt nit arajn in jieš! не ўпадайце ў адчай!
- jiešfuler blik поўны адчаю позірк

Jiftax [*s.* יפתח →šojfet] *tnx.* Яфтай (Іфтах), імя аднаго з народных правадыроў (Суд. 11:12)

jigdal [*s.* יגדל] "хай узьвялічыцца (жывы бог)" (вершаваная рэлігійная паэма, якую ашкеназы чытаюць перад ранішняй малітвай)

jimáx-/jemáx-š(e)mój *pl.* -š(e)móm [*s.* (־שמם) ימח־שמו] *kll.* "бадай яго/яе імя сьцёрлася" (прамаўляюць пасьля ўзгадваньня імя ворага); **jimaxšmojnik** *m*, -es, (-nice *f*, -s) пракляты чалавек
- jimax-šmoj zolstu vern! *kll.* бадай ты здох! (каб і сьледу ад цябе не засталося!)

(j)ingl *m/n*, -ex [*d.* Junge] хлопчык; *kort.* валет; **jíngele** *n*, -x, **jíngl-cingl** *n* хлопчык, хлапчаня, хлапчук; **jíngerer** маладзейшы, малодшы; **jíngster** малодшы, меншы; **jíngl(i)šer** хлапчуковы; **jíngliškajt** *f* блазенства; **jínglšaft** *f* хлапчуковы ўзрост, малалецтва; **jínglvajz** *adv.* у хлапчуковым узросьце; **jinglen zix** *iron.* маладзіцца
- di jinglše jorn юнацкія гады
- firn zix vi a jingele весьці сябе як хлапчук
- jinglše geng дзяцінства
- zaj nit kejn jingl! ня будзь хлапчуком!
- es hot gezolt vern a mejdl, hot der hon a krej gegebn, iz gevorn a jingl *glxv.* мусіла быць дзяўчынка, але певень кукарэкнуў, і атрымаўся хлопчык *hum.* (німа чаго тлумачыць, і так усё зразумела)
- kejn jingere zoln nit štarbn! каб маладыя не паміралі! (кажуць, як памірае стары)

jire *f* [*s.* ראה(י)י] страх перад богам, багабоязь, набожнасьць; паважнасьць, прыстойнасьць [*sin.* gotsforxtikajt, frumkajt; grojs derexerec]; **jires-/jiras-hakóved** *m/n* [*s.* ראת־הכבוד(י)י] глыбокая пашана, павага; **jires-hakóvediker** шаноўны, паважны; **jires-hašém** *n* [*s.* השם־] страх перад богам, багабоязь, набожнасьць; **jires-šomáim** *m* [*s.* שמים־] страх перад нябёсамі, багабоязь, вялікая набожнасьць; **jires-šomáim-pónem** *m* [*s.* פנים־] ханжаскі, крывадушны, аблудны, фальшывы, няшчыры твар; **jire-šomáim** *pl.* →jore-šomáim *m* [*s.* (יראי־) ירא־שמים] богабаязны і набожны жыд; **jire-xét** *pl.* →jore-xét *m*, *pl.* [*s.* חטא־] чалавек, які лякаецца і бараніцца граха
- er lejgt di tume in der jire arajn *glxv.* ягоная набожнасьць трымаецца на нячыстай сіле

jirgózn *m* [*s.* ירגזון] гнеў, злосьць [*sin.* corn. kas]

Jirmjohu/Jirmie [*s.* ירמיהו] прарок Ярэмія; Кніга прарока Ярэміі

jisker=jizker [*s.* יזכור →hazkore] "ён (бог) хай памятае" (першае слова малітвы аб памерлым або загінулым); **jísker-bux** *n*, *pl.* -bixer памінальная кніга (адмыслова аб зьніклых кагалах)

Jiso(s)xer [*s.* יששכר] *tnx.* Ісахар (адзін з дванаццаці сыноў Якуба); назоў роду, які паўшоў ад Ісахара (Б. 30:18)

Jisre [*s.* יתרו] *tnx.* 1. Ётар, галоўнае імя цесьця Майсея, які меў паводле традыцыі сем імёнаў; 2. назоў 17-га разьдзелу Торы (Вых. 18–20)

• er hot jisres nemen *glxv.* ён мае сем імёнаў

jisren *m*, *pl.* jisrojnes [*s.* (-ות)יתרון] дадатнасьць, перавага, выгада, вартасьць, годнасьць, выдатная адзнака, лепшая якасьць [*sin.* majle, beserkajt, ojscejxenung]

Jisroel *n* [*s.* ישראל →Medines-Jisroel] Ізраіль (імя, якое бог даў патрыярху Якубу; азначэньне для гэбрэйскага народу; азначэньне для гэбрэя, які не паходзіць з коганаў або левітаў; назоў гэбрэйскай дзяржавы (XX–VIII стст. да н.э.); скарочаны назоў дзяржавы Ізраіль (створана ў 1948 г.); **jisróeldiker, jisreéjlišer** ізраільскі; **jisroejli/isreejli** *m.* -m [*s.* (-ם)ישראלי], **jisreejlis** *f*, *pl.* jisreéjlies [*s.* (ישראליות) ישראלית] ізраільцянін

• a sojne Jisroel вораг Ізраілю

jišev *m* [*s.* (-ים)שוב(')י →mejašev, mejušev, jojšev] развага, абдумваньне, (аб)меркаваньне, разважаньне [*sin.* baklerung, iberlejgung]; **jiševn zix** разважаць, меркаваць, думаць; **jišev-hadá(a)s** *m* [*s.* הדעת־] роздум, развага, разважаньне; рада [*sin.* batraxtung, baklerung; barotung]

• mit jišev-hadas абдумана, разважліва

• alcding zol men ton mit a jišev-hadaas (M.M.-S.) усё трэба рабіць з развагаю

• az me jiševt zix cufil, nemt der anderer dervajl di parnose avek *glxv.* пачнеш зашмат разважаць, другі гэтым часам адбярэ заробак

jišev *m*, *pl.* jišuvim [*s.* (-ים)שוב(')י →arajnjaševe(ne)n] пасялішча, вёска, сяло, сяліба [*sin.* bavojntort; dorf, kolonje; bafelkerung]; **jišúvnik** *m*, -es, (-nice *f*, -s) (просты і бязглузды) селянін, жыд-вясковец

• vojnen ojsern jišev (in a zajt funem jišev) жыць на водшыбе

Jišmoel *m* [*s.* ישמעאל] "бог чуе"; *tnx.* Ізмаіл, азначэньне для Турцыі або турка (Б. 16:15) [*sin.* Terkaj, di terkn, a terk]

jišokejni [*s.* ישקני] *tnx.* "няхай вусны яго мяне пацалуюць" (Песьн. 1:2)

• zogn jišokejni ашукаць, абдурыць і груба абсьмяяць

Jišu=Jejšu Hanojcri [*s.* (הנוצרי) ישו] Ісус Хрыстос (з Назарэта)

jiter *m* [*s.* תור(')י →mejater] рэшта, астача; шкумат тканіны, які застаецца пасьля раскрою, і які кравец ня можа пакінуць сабе [*sin.* iberblajb, iberiks, reśt]

jiteš *m*, *pl.* jitušim [*s.* (-ים)תוש(')י] *zool.* камар, маскіт [*sin.* moskit, komar]; *fig.* думка, якая сьвідруе мозг, не дае спакою

jixed *m*, *pl.* jixudim [*s.* (-ים)יחוד' →joxed, bixides, mejaxed, misjaxed] адасобленасьць, самасьць; (забароненае) знаходжаньне асобна з чужой жонкай; адасабленьне маладых пасьля вянца; 2. *kbl.* асобнае божае імя альбо іншы сродак, які карыстаюць дзеля ўмацаваньня адзінасьці бога й еднасьці зь ім [*sin.* opgezundertkajt, alejnkajt]

jixes *m* [*s.* (')יחוס →jaxsn, mejuxes, mejaxes, misjaxes, baljixes] (высокае/высакароднае)паходжаньне, высакароднасьць, радавітасьць, радавод; арыстакратызм [*sin.* opštamung; aristokratiškajt]; *hum.* наўда вялікая (важнае/вялікае рáсы сьвіньня; фігурант, боты ў рант); **jíxesdiker** высакародны, радавіты; **jíxesn zix** лічыць сябе арыстакратам (высакароднага паходжаньня); **jixes-ácme** *m* [*s.* עצמו־] уласная вартасьць/годнасьць, сабекошт чалавека (у параўнаньні з вартасьцю яго сям'і); **jíxes-briv** *m* радаводны запіс, генэалягічнае дрэва, радавод; **jíxes-gast** *m hum.* радавіты госьць

• on jixes on štam бяз роду бяз племені

• - A šejn mejdele bistu /n'a šejnem tatn hostu, /fun a šeinem jixes bistu, /un a voser xosn vilstu? *flksl.* – Ты прыгожая дзяўчына і прыемны бацька ў цябе, ты з добрага роду, якога ж жаніха ты хочаш?

• a šejner jixes – zajn elter zejde iz nox geven a ganev выдатная радавітасьць – яшчэ яго стары дзед быў злодзеем

• jixes "na" bejs-hakvores, "a v domu" cores *šprxv.* высакароднасьць на могілках, а дома ліха (на назе сафіяк рыпіць, а ў баршчу чорт кіпіць) [*p.* na, a w domu]

jixje [*s.* יחיה] "хай ён жыве" (слова, якое дадаецца пасьля ўзгадваньня чалавека)

jizker=jisker [*s.* יזכור] "ён (бог) хай памятае" (першае слова малітвы аб памерлым альбо загінулым)

jo=je [*d.* ja] 1. **joj** так, ага, але, да; 2. *m*, -en, **józogung** *f*, -en згода, сьцьвярджальны адказ

• af jo пазытыўна

• az s'iz šojn jo azoj калі ўжо ды так

• cušoklen mitn kop af "jo" кіўнуць галавой (выказаць згоду)

• cvišn jo un nejn імгненна, мігам, уміг, умомант

• er iz jo gegangen ён сапраўды пайшоў

• gebn* a jo-vort згадзіцца на шлюб

• ir vet kumen? – jo вы прыйдзеце? – так

• jo, dos iz geven majner a feler так, гэта было маёй памылкай

• jo, x'hob šir nit fargesn ага, ледзьве не забыўся

• vu me darf jo un vu me darf nit дарэчы і не дарэчы

• beser "joj", ejder "loj" *glxv.* лепш "але", чымся "не"

jobrex=jabrex *m* [?] хам(ула), грубіян

joc *m*, -n/-es? [?] прафан, невук, тупіца; абмежаваны, невялікага розуму чалавек

joce-midáte vern* [*s.* יצא־מדעתו] зьехаць/сысьці з глуздоў, звар'яцець [*sin.* aropgejn fun zinen]

jod *m* [*d.* Jod] *xem.* ёд

jodaim 1. *pl.* →jad *m* [*s.* (-ים)יד] (вялікая і моцная) рука, лапа; 2. "рукі"; *mšn.* назоў 11-га трактату 6-га разьдзелу (запаветы аб мыцьці і аб нечысьціні рук) [*sin.* hent]; **Jod-haxazóke** *m* [*s.* יד־החזקה] "Моцная рука"; назоў рэлігійнай кнігі Рамбама (слова [יד] у назове нагадвае аб 14 частках кнігі) (кніга вядомая таксама пад назвай "Mišne-Tojre")

jode-nágejn *pl.* →jedeje-nágejn *m* [*s.* (יודעי־נגן) יודע־נגן] знаўца музыкі; *hum.* знаўца картачных гульняў; **jode-séjfer** *pl.* →jedeje-séjfer *m* [*s.* ספר־] адукаваны, пісьменны, вучоны чалавек, які можа вучыць; **jode-xéjn** *pl.* →jedeje-xéjn *m* [*s.* חן־] кабаліст, містык; знаўца патаемных рэчаў

joder *m/f*, -n/-s, **jód(e)re** *f*, -s, **jondre** *f*, -s [*p.* jądro] ядро; **jóderdiker** ядраны, бучны, каржакаваты, каранасты, прысадзісты; **jóderland** *n* мацярык, кантынэнт

• der joder funem nus ядро гарэха

• joderdike verter моцныя словы

jodle *f*, -s [*p.* jodłe] *bot.* яліна, елка; **jódleve(r)=jadlove(r)** яловы; **jódle-cvajgn** *pl.* яловыя галінкі; **jódle-šiškes** *pl.* яловыя шышкі; **jódle-vald** *m*, *pl.* -velder яловы бор

• jodleve holc яловыя дровы

jodlen [*d.* jodeln] сьпяваць ёдлем

jogn [*d.* jagen] гнаць, ганяць; **jogn zix** 1. гнацца, ганяцца; 2. паляваць; **jog** 1. *f*, -n (пох) гон(ка), пагоня; 2. *m*, -n паўха, аплявуха; чос, муштра, нагонка; **a jog ton*** пагнаць,

памчаць; **jóge(r)lex** *pl.* квач (гульня); **jógeniš** *n* 1. сьпешка, пасьпех, гонка; 2. бягунка, мыт(уха), ганячка, гнётка, дрыстун, дрыстачка; **jóg-gevet** *n* скачкі; **jóg-hunt** *m*, *pl.* -hint ганчак; **jógveg** *m*, -n, **jogeráj** *f*, -en трэк; гіпадром
• jogn dos ferd гнаць каня
• jogn on otem (on a nešome) гнаць ва ўсю моц
• jogn zix noxn kerbl гнацца за доўгім рублём
• jogn zix vi a kac nox a mojz ганяцца як котка за мышкай
• vos iz dos jogeniš? куды сьпяшацца?
• jog zix nit nox koved, vet er alejn cu dir kumen *glxv.* не гаішся за гонарам, ён сам да цябе прыйдзе (чужая пахвала як гром грыміць, а самахвальства сьмярдзіць)
• s'zol af dir kumen a jogeniš! *kll.* каб ты жыватом езьдзіў! (каб це бягунка замучала!)
• ver es jogt nox a vint, xapt a ruex *šprxv.* хто гоніцца за ветрам, той чорта схопіць (хто зашмат жадае, той нічога ня мае; разам лзьвюх сарок за хвост не ўтрымаеш)

jogn-vaanóxe [*s.* יגון־ואנחה] "смутак і ныцьцё"; ліха, бяда і гора, гора і сьлёзы [*sin.* trojer un zifceniš, cores un harcvejtik]
• a yidiš parnose iz jogn-vaanoxe, un zajn glik iz a maroxe *prvrb.* жыдоўскі заробак – гора і сьлёзы, а яго шчасьце – рамантак

jojce [*s.* יוצא] гатова! досыць! [*sin.* fartik! opgekumen!]; **jojce zajn*** выканаць, выконваць прымусова абавязак, адбы(ва)ць сваё; 2. (far, mit) задаволіць, задавольваць, запатоліць, запатольваць; абыходзіцца, здавальняцца [*sin.* ojstiin, zix bagejn, zix banugenen]
• af jojce cu zajn* (abi jojce zajn*) фармальна выканаць свой абавязак
• culib/fun jojce vegn дзеля праформы/выгляду, каб толькі адбяёдацца, для прыліку
• un jojce і досыць (гэтага дастаткова)
• az es iz ništo kejn fiš, iz men jojce mit hering *šprxv.* калі німа рыбы, можна абысьціся й селядцом
• az me vil jojce zajn far der velt, muz kostn fil gelt *šprxv.* каб увесь сьвет запатоліць, трэба шмат грошай
• far der velt muz men mer jojce zajn, vi far got alejn перад людзьмі абавязкі нават большыя, чым перад самім богам
• ver es vil jojce zajn far alemen, der iz ništ jojce far kejnem (Ś.-A.) хто хоча запатоліць усіх, той не запатоліць нікога

jojce-dójfn *m*, -s [*s.* (ם-)יוצא־דופן] выключэньне, вылучэньне, вынятак, выключны выпадак; рэдкі чалавек або рэдкая рэч [*sin.* ojsnem]; **jojce-dójfndiker** рэдкі, выключны, дзіўны; **jojce-min(-h)aklál** *m*, *pl.* -n/jojcim-min(-h)aklál [*s.* (יוצאים־)מן־הכלל] выключэньне, рэдкасьць [*sin.* ojsnem, zeltnkajt]
jojce-micráim *pl.* [*s.* יוצאי־מצרים] гэбрэі, якія выйшлі з Эгіпту
jojcer *m*, *pl.* jo(j)cres [*s.* (ות-)יוצר] гімнічны сьпеў, які сьпяваюць у пэўныя суботы і на сьвяты
• dergejn* jojcres даймаць, дапякаць
• kelberne jojcres! цялячыя сьпевы!
• zix farbajtn*/fartojšn (mit) di jojcres пераблытаць рэчы (усе карты), прыняць за іншае

jójcer-mešorsim (vašer mešorsov) *pl.* [*s.* (ואשר משרתיו) יוצר־משרתים] вельмі шмат памагатых, паслугачоў
jojce-venixnes *m* [*s.* יוצא־ונכנס] часты наведвальнік, свойскі чалавек [*sin.* ofter ajngejer, hejmišer menć]
joj(e)c *m*, -im [*s.* (ים-)יועץ →ejce, misjaec, acosi] дарадчык, саветнік, (па)радчык, (ла)радца, райца [*sin.* ejce-geber, rotgeber, baljojec]
Jojel [*s.* יואל] *tnx.* (прарок) Ёіль; Кніга прарока Ёіля

jojfe *m* [*s.* יופי] вельмі прыгожая рэч, рэдкасьць [*sin.* zejer šejne zax, antik]
jojme [*s.* יומא →jemej, jom] "гэты дзень"; *tlmd.* назоў 5-га трактату 2-га разьдзелу (запаветы аб набажэнстве ў сынагозе на Ём-Кіпур) [*sin.* der tog]; **jojme-depágre** *m*, -s [*s.* (ם-)דפגרא־] вольны дзень, выпадковы дзень адпачынку [*sin.* frajer tog, cufeliker oprutog]; **jojmem-/jom-veláj-le=jomvolájle** [*s.* יום(מ)־ולילה] дзень і ноч
Jojne [*s.* יונה] *tnx.* (прарок) Ёна; Кніга прарока Ёны
jojnek zajn* [*s.* יונק] ссаць, (у)смактаць, усмоктваць, харчавацца, карміцца, сілкавацца [*sin.* zojgn, arajncien, zix špajzn]
jojred *m*, *pl.* jordim [*s.* (ים-)יורד] зьбяднелы, абяздолены, гаротны, заняпалы чалавек, гаротнік [*sin.* faroremter; gefalener]
• zej zajnen geblibn jordim яны дайшлі да галечы

jojre-déje *m* [*s.* יורה־דעה] другая частка "Šulxn-orex" (запаветы аб кошары і трэфе, аб чысьціні і нечысьціні)
jojreš *m*, *pl.* joršim, (-ke/-te *f*, -s) [*s.* (ים-)יורש →jaršenen, (be)jeruše] нашчадак, спадкаемца, спадкаемец, спадчыньнік, насьледнік; пераемнік, пасьлядоўнік; сын [*sin.* jeruše-geber, arber; noxfolger; zun]; **jojreš-écer** *m* [*s.* עצר], **tron-jojreš** *m* насьледны прынц
• on joršim вымарачны
• zajn* emecns jojreš-ecer быць нашчадкам трона
• er iz kools jojreš *glxv.* ён – кагальны нашчадак (ён лічыць, што ўсё, што ня мае гаспадара, належыць яму)

jojrn*=jern*=(j)irn (gejójrn/gejójrt) [*d.* gären, *mhd.* jërn] бушаваць, шумаваць, брадзіць (аб піве/віне); **jojrung** *f*, -en бушаваньне, шумаваньне, браджэньне; **jojrexc** *n*, **jójr-roščine** *f*, **jójrštof** *m* рошчына
Jo(j)sef Dele Rejne [*s.* יוסף דילה ריינה] легендарны сэфардзкі кабаліст, які ледзь не злавіў сатану
Jo(j)sef hacadik [*s.* יוסף הצדיק] *tnx.* Язэп, Ёсіф (адзін з дванаццаці сыноў патрыярха Якуба)
jojšer *m*, **jójšerdikajt** *f* [*s.* יושר →bal-jojšer, jašren, jošer] справядлівасьць, сумленнасьць [*sin.* gerextikajt]; **jójšerdiker** справядлівы, сумленны
• a jojšer было б правільна, было б добра
• handlen nit alpi jojšer рабіць насуперак сумленьню
• kazacker jojšer казацкая справядлівасьць
• der ojšer hot nit kejn jojšer *glxv.* у багацея справядлівасьці ня знойдзеш (багаты праўду любіць, як сабака палку)
• itlexer ojšer hot zajn jojšer *šprxv.* кожны багацей мае сваю ўласную справядлівасьць
• jojšer vert dermont afile ba ganovim, ven zej tejln zix *glxv.* аб сумленнасьці ўзгадваюць нават злодзеі, калі дзеляцца
• jojšer vil men, az der cvejter zol hobn *glxv.* сумленнасьць патрэбна, але ў іншага
• zux ništ ba rajxe kejn jojšer *glxv.* не шукай справядлівасьці ў багатых

jojšev *m*, *pl.* jošvim [*s.* (ים-)יושב →mejašev, mejušev, jišev] хасыд, які стала жыве ў двары рэбэ; **jojšev-ójel** *m*, *pl.* jošve-ójel [*s.* (יושבי) אוהל־] даматур; чалавек, які бесьперапынна сядзіць і вучыцца; **jojšev-róš** *m* [*s.* ראש־] старшыня, кіраўнік, прэзыдэнт [*sin.* forzicer, president]
jojvl *m*, -en [*s.* (ן-)יובל →bal-jojvl] "бараноў рог"; *tnx.* пяцьдзясят гадоў, пасьля якіх прададзеная зямля мусіць быць вернута першаму гаспадару; пэрыяд у пяцьдзясят гадоў; юбілей, сьвяткаваньне 25, 50, 70, 100 гадоў нейкай падзеі; **jojvlen** адзначаць юбілей

• ejn mol in a jojvl дужа рэдка, аднойчы ў жыцьці
• tomer ejn mol in a jojvl маўляў, толькі раз на юбілей; гады-ў-рады

jojx *f*, -n, *dim*. **jajxl** *n*, -ex, **jájxele** *n*, -x [*p*. jucha] *kul*. юшка, суп, булён, навар
• dem oreman kost zajn kojleś tajerer, vi dem nogid zajn jojx/gebrotns *šprxv*. бедняку куліч каштус даражэй, чым-ся багацею суп/смажаніна
• fun volvele fiś gist men arojs di jojx *šprxv*. з таннай рыбы юшку выліваюць вон
• ir zajt take a korev mit mir, ober nit mit majn jojx *glxv*. так, вы мне сваяк, але не маёй юшцы (ты, брат мой, а еж хлеб свой)
• Ix hob arajngeśtelt a jajxele koxn, /se iz šojn cvej mol ojsgelofn... /Nor cvej śiduxim hob ix opgelozt /un mitn dritn hob ix nit getrofn. *flksl*. Я паставіла варыць юшачку, ён ужо два разы ўцякаў... Але два вясельлі я ўжо ўпусьціла і з трэцім мне не патрафіла.
• oreman, kox kaše, zup jojx! *glxv*. бядак, вары кашу, сёрбай юшку!
• oreman, zup jojx! *glxv*. бядуля, хлябай юшку!

jo(j)xcn [*d*. jauchzen] крычаць (ад радасьці/болю)
Jójxenen Ben-Zakaj [*s*. יוחנן בן־זכאי] Ёйхэнэн Бэн-Закай (вучоны-талмудыст I ст.)
jo(j)xluhú [*s*. יאבלוהו] "бадай яго зьелі"; згублены, які прапаў, прапашчы (аб грашох/справе) [*sin*. farfaln, farlojrn]
• s'iz – jojxluhu справа – швах

jojz *m*, -n [?] лядашты, ляда(ш)чы, нядужы чалавек; крыўляка
Jojzl *n*, -en [*d*. Jesu?] *pejor*. Ісус Хрыстос; расьпяцьце, абраз
jok(iš) *m*, *dim*. **jekl** *n*, -ex [*d*. Jokel?] дурань, разява(ка)
jokl *m* [*d*. Jokel] прастак, прасьцеча; *argo* вош; **jokl (benflékl)** як бо яго завуць
jokter *m* пародыя на слова "доктар"
jold *m*, -n/-es [*r*. ёлд: елда?] 1. прафан, невук, тупіца; абмежаваны, невялікага розуму чалавек; 2. *hum*. бравы малойца, добры хлопец; **jóldovke/jóldevke** *f*, -s *argo* дзеўка, баба, краля; **jóldišer** няхітры, прастадушны, дурненькі; **jóldeven** абдурваць, падманваць, абакульваць; блазнаваць, крыўляцца
• a jold in kapeljuś пудзіла гарохавае (невук у капелюшы)

joldes *f*, -n [*s*. (יולדת־)] парадзіха [*sin*. kimpetorn, gevinem]
• az dos vajb iz a joldes, iz der man a jold *šprxv*. калі жонка парадзіха, дык мужык бравы малойца

jolem *m*, -s [?] вязаны шарсьцяны каптурык
jóleve(r) [*ukr*. яловий, *p*. jałowy] ялавы, бясплодны
• joleve ku ялавая карова

jolke *f*, -s [*r*. ёлка] елка; **jólke-bapucung** *f* елачныя аздабленьні (цацкі)
jólk(edik)er=jelke(r) ёлкі, прагорклы; **jolke vern*** зьялчэць, ялчаць
• jołkedik fets ёлкі тлушч

jolop *m*, -es [*ukr*. йолуп, *p*. jołop] ёлуп(ень)
jom *m*, -im [*s*. (ימים־) יום →jemej, jojme, hajem] "дзень" (штодня новы псалом, які чытаецца пасьля ранішняй малітвы) [*sin*. tog]
jómern (af) [*d*. jammern] лямантаваць, галасіць, плакаць, рыдаць; **jomer** *m*, -n лямант, крык, плач, галашэньне; **jómerlexer, jómerdiker** роспачны, жаласьлівы, немы; **jómertol** *m* даліна плачу
• tut dox mir nit azoj bang der gołdener feder, /vi di pave alejn, alejn, /zint ix bin avek fun majne tate-mame, /zic ix un jomer, un vejn, un vejn... *flksl*. мне не так шкада залатога пёрка, як шкада самой павы, з таго часу, як я зьехала ад сваіх бацькоў, я сяджу і лямантую, і плачу

jom-hadín *m* [*s*. יום־הדין →bimej, jom] судны дзень, дзень апошняга суду; сьвята Рош-Гашона альбо Ём-Кіпур
jomim-neróim/-nojróim *pl*. [*s*. ימים־נוראים →jom] "боязкія дні"; дні пакаяньня (10 дзён ад Рош-Гашоны да Ём-Кіпуру); **jomim-neróimdiker** богабаязны, набожны; **jomim-vešónim** [*s*. ושנים־] дні і гады, доўгі час; чалавечы век, чалавечае жыцьцё [*sin*. teg un jorn, a lange cajt; a menćns lebn]
Jom-/Jon-/Jin-Kíper *m* [*s*. יום־כיפור=יו"כ →jom] "дзень дараваньне"; Ём-Кіпур, Судны Дзень (гэбрэйскае сьвята); **Jomkiper-/Jonkiper-kótn** *m*, -s [*s*. (ס־)קטן] апошні дзень кожнага месяца, у які набожныя гэбрэі маюць звычай пасьціцца
• dos gance jor iz zi lejdik gezesn, un erev Jom-Kiper hot zi a zok ongehojbn *glxv*. увесь год седзьма прасядзела, а напярэдадні Ём-Кіпуру пачала вязаць шкарпэтку
• erev Jom-Kiper vern ale ganovim frum *glxv*. напярэдадні Ём-Кіпуру ўсе злодзеі пабожныя

jomtev/jontev/jontef *m*, *pl*. jomtojvim/jontojvim/jomimtójvim [*s*. יום־טוב(־ים/ימים־טובים)=יו"ט →jom] (гэбрэйскае) сьвята, сьвяточны дзень [*sin*. fajertog]; **jómtevdiker/jóntevdiker** сьвяточны; **jómtevdikajt/jóntevdikajt** *f* сьвяточнасьць; **jómtevn/jóntevn** 1. сьвяткаваць, ладзіць/спраўляць сьвята; 2. супачыць, спачываць [*sin*. fajern, praven; ruen]; **jómtev-cajt** *adv*. па сьвятах, на сьвята; **jómtev-tog** *m*, *pl*. -teg сьвяточны дзень
• a gutn jomtev! a gut-jomtev! са сьвятам!
• jomtevdike klejdung, štimung сьвяточнае адзеньне, сьвяточны настрой
• jomtevdiker kideś сьвяточнае асьвячэньне віна
• lekoved jomtev y гонар сьвята
• onton* jomtev-klejder надзець сьвяточную вопратку
• me darf nit cunojfmišn cvej jomtojvim *glxv*. ня варта зьмешваць два сьвяты
• ojs jomtev, vider vox *glxv*. канец сьвяту – зноў будзень
• ot hostu dir – di andere teg jomtev! (di cvejte teg jomtev!) *glxv*. вось табе – іншыя дні сьвята! (вось табе, бабка, і Юр'еў дзень (і сьвятога Юр'я); сьвята, сьвята, а пасьля сьвята ўсё тая ж лата)
• xuc šabosim, jomtojvim un goiške xagoes (on šabosim un on jomim-tojvim) *glxv*. бяз шабасаў, гэбрэйскіх і хрысьціянскіх сьвятаў (кажуць, калі нехта зьмяншае свае гады)

jom-/jojmem-velájle=jomvolájle [*s*. יו(מ)ם־ולילה →jom, mejnone-dejojme; balajle] дзень і ноч [*sin*. tog un naxt, štendik]
jonc *m*, -es [?] тупіца, тупень, недарэка, дурніца, прыдурак
jopen [*d*. jappen?] стагнаць, енчыць
jor *n*, -n [*d*. Jahr] год; **jóriker** гадавы; **jórlexer** штогодны, гадавы; **jorn=jern zix** адзначаць дзень нараджэньня; **jórbux** *m/n*, *pl*. -bixer штогоднік; **jórcajt** *m/f*, -n 1. пара году; 2. гадавіна з дня сьмерці, угодкі (адмыслова па бацькох); **jórcajt-lixt** *n* сьвяча, якую запальваюць на ўгодках; **jorcéndlik/jorcéndling** *m*, -er дзесяцігодзьдзе; **jórgang** *m*, *pl*. -geng 1. год выданьня; 2. гадавы камплект; **jórgelt** *n*, -er штогодні даход (прыбытак); **jorhúndert** *m*, -n/-er век, сталецьце, стагодзьдзе; **jór-jérlexer** штогодні; **jór-ejdes** *m* фальшывы сьведка; **jórmark** *m*, *pl*. -merk кірмаш, торг, ярмарка; **jórnlang** *adv*. гадамі, на працягу гадоў, з даўнейшых часоў; **jórtog=jértog** *m*, *pl*. -teg

гадавіна; **jortójznt** *m*, -n/-er тысячагодзьдзе, тысячалецьце
• a ganc/kajlexdik/gejendik jor увесь/круглы год
• a jor mit a mitvox 1. бяз году тыдзень; 2. *jur.* (поўны) год
• a sax jorn доўгія гады
• af s'jor (in kumendikn jor) на наступны год (у будучым годзе)
• ale/vos a jor (ale jorn, jor(n)-ájn jor(n)-ójs) штогод
• fun jornlang гадамі, на працягу гадоў, доўгія гады
• (gor) nit lojt di jorn не па гадох
• hajntiks jor у гэтым годзе
• hobn* kurce/opgešnitene/opgerisene/faršnitene jorn мець кароткае жыццё
• in di jorn у гадох, ва ўзросьце
• in ejne jorn (mit) аднаго ўзросту
• maxn a sof cu jorn даканаць
• s'iz faribet draj jor прайшло тры гады
• ven s'gejn ojs di jor напрыканцы дзён
• a fincterer jor af dir! *klł.* бадай ты счарнеў! (каб табе павылазіла!)
• a gliklex jor! добрага, шчасьлівага году!
• abi gezin, cores kumen alejn! *šprxv.* абы толькі гады, ліха [illegible] само!
• a langer jor zolstu zajn)! (jorn dir!) жыві доўга! доўгага веку жыцьця!
• aza jor af mir, vi cuker iz zis (un vi Varše iz ■ šejne štot) такога ў мне жыцьця, як салодкі цукар (і як прыгожая Варшава)
• aza jor ■ mir, vi me ligt af ir *glxv.* каб мне так жыць, як ляжаць на ёй
• aza šlext jor af im! *klł.* ліха на яго! бадай ён згарэў!
• cu lánge/léngere jor(n)! на доўгія гады! (пажаданьне)
• di gute jor zol ix hobn! (lomix hobn aza jor!) каб я меў такі добры год!
• er zet ojs vi a švarc jor in milx gekoxt *fig.* ён дужа блага выглядае (як чорт, звараны ў малацэ)
• gute jorn dir! (dir cu lange/lebedike jor! dir cu lengere jorn!) добрых табе гадочкаў! (добра жыць да не тужыць! каб доўгія лета жыў!)
• junge jorn – nariše jorn *šprxv.* маладыя гады – неразумныя гады (маладосьць – усё дурносьць)
• vest nox hobn ba mir opgešnitene jorn! будзеш ты ў мяне мець салодкае жыцьцё!

jordim *pl.* →jojred *m* [*s.* (-ים)יורד →jeride] абяздолены, гаротны чалавек; **jórdišer** зьбяднелы, высілены, разароны, заняпалы, даведзены да галечы

jorem-hójde [*s.* יר"ה=ירום־הודו →kire] "хай зьзяе ягоная веліч" (словы, якія прамаўляецца пасьля ўзгадваньня імпэратара падчас блаславеньня)

jore-šomáim *m*, *pl.* jire-šomaim [*s.* (יראי־) יראי־שמים] богабаязны і набожны жыд [*sin.* gotsforxtiker un frumer jid]; **jore-šomáimdiker** богабаязны

jore-xét *m*, *pl.* jire-xét [*s.* (יראי־) יראי־חטא] чалавек, які лякаецца і бароніцца граха

joršim *pl.* →jojreš *m*, (-ke/-te *f*, -s) [*s.* (-ים)יורש →jaršenen, jeruše] нашчадак, спадкаемца, спадкаемец, спадчыньнік, насьледнік; пераемнік, пасьлядоўнік; сын

Josef=Jojsef hacadik [*s.* יוסף הצדיק] *inx.* Язэп (адзін з дванаццаці сыноў патрыярха Якуба)

josem *m*, *pl.* jesojmim [*s.* (-ים)יתום →farjoscmter] хлопчык-сірата; **jósemdiker** сірочы, сіроцкі, бязродны; самотны, адзінотны, адзіноки; безбаронны [*sin.* farlozener, elnter, umbašicter]; **josem-kótn** *m*, *pl.* jesojmim-ktánim [*s.* (-ים)קטן] сірата-малалетак
• a kajlexdiker josem круглы сірата
• a josem est a sax, un a biter harc redt a sax *šprxv.* сірата шмат есьць, а горкае сэрца шмат гаворыць
• a josem hot a sax mames *glxv.* у сіраты многа мамак
• a kind on a foter iz a halber josem, on a muter – a gancer josem *šprxv.* дзіцё бяз бацькі – напалову сірата, бяз маці – цалкам сірата
• a por hojzn far a josem! пара нагавіцаў для сіраты! (з анэкдоту)
• ix bin ojx nit kejn josem-kotn! *glxv.* і я таксама не сірата-малалетак! (і мая доля не шчарбатая, і мая душа ня лішняя)
• ven a josem lajdt, zet kejner nit, ven er frejt zix, zet di gance velt *šprxv.* ніхто ня бача, калі сірата плача, а калі сірата засьмяецца, дык увесь сьвет здрыганецца (як сірата плача, то ніхто ня бача, а як скача, то ўсе бачаць)

jošer [*s.* ישר →jašren, (bal-)jojšer] *adv.* роўна, правільна, пэўна, верна, насамрэч [*sin.* glajx; rixtik; *ant.* hofex]

jošeš *m*, *pl.* ješišim [*s.* (-ים)ישישי] шаноўны/паважны стары чалавек, старац (хасыд) [*sin.* xošever alter man, zokn]

Joške/Jósele pandre/pandrik *pejor.* расьпяты Хрыстос
• arbet, Joške!.. працуй, Ёшка!..
• danken un lojbn Joške dem tojbn! *glxv. iron.* дзякаваць і выхваляць Ёшку глухога!
• gerext, Joške! *iron.* маеш рацыю, Ёшка!

jošn-nójšn [*s.* ישן־נושן] зусім стары [*sin.* gor alt]

jošpiz=jaspiz *m* яшма

jošvim *pl.* →jojšev *m* [*s.* (-ים)יושב] хасыд, які стала жыве ў двары рэбэ; **jošve-ójel** *pl.* →jojšev-ójel *m* [*s.* (יושבי) יושבי־אוהל] даматур; чалавек, які бесьперапынна сядзіць і вучыцца

jove jojme [יבוא יומו] яшчэ прыйдзе ягоны дзень

jóvešer [*s.* -יבש] прапашчы (аб грашох)

jovn [*s.* (-ים)יון(ו)] 1. *n* Грэцыя [*sin.* Grixnland]; 2. *m*, *pl.* jevonim грэк; *hist. iron.* расейскі жаўнер, маскаль, паліцыянт; рускі, кацап; хахол, украінец
• arajnfaln* vi a jovn in suke зрабіць нешта неспадзяванае, сказаць нешта недарэчы, зьявіцца несвоечасова
• zix filn vi a jovn in suke адчуваць сябе няёмка
• a jovn vert klug nox varmes жаўнер разумнее паеўшы
• ale hint un ale jevonim (un ale rabojnim) hobn ejn ponem *šprxv.* усе сабакі і ўсе жаўнеры (і ўсе рабіны) на адзін твар
• getrogn, getrogn – un avekgegebn dem jovn *glxv.* насіла, насіла – і аддала ў маскалі (маці пра сына)

jox *m/f*, -n [*d.* Joch] ярмо, прыгнёт, цяжар
• a jox afn kop ярмо на галаву
• krexcn untern fremdn jox стагнаць пад чужым прыгнётам
• šlepn dem jox цягнуць ярмо
• trogn* af zix dem jox цягнуць лямку

joxcn=jojxcn крычаць (ад радасьці/болю)

joxcum/joxcung *m* [?] *min.* бэрыл, смарагд

joxed/joxid *m*, *pl.* jexidim [*s.* (-ים)יחיד →bixides, jixed, mejaxed, misjaxed, benjoxed] 1. адзін(оч)ка, адзінец, самотнік, саматужнік, (адна)асобнік, ідывід; 2. *gram.* адзіночны лік [*sin.* ejclner menc, individuum; ejncol; *ant.* klal; rabim]; **joxed-bedór** *m* [*s.* יחיד־בדור] адзіны ў свой час, выключны, выдатны, адметны чалавек [*sin.* ejnciker in zajn cajt, ojsgecejxnter]; **joxed-bemíne** *m* [*s.* יחיד־במינו] адзінкавы, адзіны ў сваім родзе, абсалютнае выключэньне, унікальная асоба;

joxed-bemínediker унікальны, выключны; **joxed-bemínedikajt** *f* унікальнасьць, выключнасьць
• a joxed kegn kohol farlirt alemol *šprxv.* адпаасобнік кагалу не супрацўнік (адзін у полі не ваяка; адзін дасужы, ды ня дужы)
joxlen [*s.* יכ(ו)לען →(bal)jexojles, bixojles] *iron.* магчы, быць здатным, здольным; ведаць як, быць у стане
joxt=juxt *m* юхт; **jóxtener=júxtener** юхтовы
jož=jež *m.* -n, **jožik** *m*, -es [*r.* ёж] *zool.* вожык
jublen [*d.* Jubel] 1. весяліцца, сьвяткаваць, спраўляць сьвята; 2. *n.* **jubl** *m* забава, пацеха, разгарненьне; **júblendiker** радасны, сьвяточны
juč! *int.* аюсь! (выкрык, якім адганяюць сьвіньней); **jučen** рохкаць
jud=j=i *m/f*, -n [*s.* (י-)יוד] 1. "юд", літара гэбрэйскага альфабэту; 2. лічба 10; 3. *hum.* **=jid** гэбрэй, жыд; **juder** *m*, -s дзясятая частка; **cvej judn** [*s.* ײַ] дыфтонг "ej"; **pasex cvej judn** [*s.* ײַ] дыфтонг "aj"
jud=jid *m.* -n, (-iške/-ene *f*, -s), *dim.* **jídele** *n.* -x гэбрэй, жыд; **judak=jidlak/jidlik** *m*, -es *pejor.* мізэрны/нязграбны жыд; дзівак
Judl, Judke Юдл, Юд(к)а (мужчынскае імя)
• s'vet zajn "Judke, bacol!" будзе так: "Юдка, плаці!"(з анэкдоту)
• s'iz – Judl, a gutn tog! такія справы – Юдл, дабрыдзень! (справы швах!)
jugnt [*d.* Jugend] 1. *f*, **júgntlexe** *pl.* маладосьць, юнацтва; моладзь; 2. *f*, -n маладая жанчына; **júgntlexer** 1. *m* юнак; 2. юнацкі; **júgntlexkajt** *f* юнацтва; **júgnt-bavegung** *f* юнацкі рух
• a stalner jugnt сталая маладосьць (аб чалавеку сталага ўзросту, які хоча выглядаць маладым)
• in der jugnt – a behejme, in/af der elter – a ferd *glxv.* у маладосьці – карова, на старасьці – конь
• vos me xapt arajn in der jugnt, iz (dos) af der elter vi gefunen *šprxv.* што схопіш у маладосьці, тое ў старасьці як знойдзеш (хто ззамаладу працуе, той на старасьці пануе)
jukn [*d.* jucken] сьвярбець, чухацца
juks *m* [?] сьмецьце, адкіды, кепскі тавар, хлам, халусьце
jul(i) *m*, -s [*d.* Juli] ліпень
junger (jingerer) [*d.* jung] малады; **jung** *m*, -en, *dim.* **jingl** *n*, -ex юнак, маладзец; **jungling** *m*, -en юнак, падлетак, хлапец; **jungáč** *m*, -es, **jungáčl** *n*, -ex дзяцюк, лайдак; **jungling=jingling** *m*, -en падлетак, хлапец, юнак; **júngerhéjt** *adv.* у маладосьці; **jungkajt** *f* маладосьць, юнацтва; **junger-mán** *m*, *pl.* junge-lájt, **junger(-)mánčik** *m*, *pl.* jungemánčikes маладзяшка, малады чалавек; **júngfroj** *f*, -en дзяўчына; **júng-gezeln** *f*, -s дружка; **júngfi** *n* маладняк (аб жывёлах); **júngšof** *n* маладняк (аб дробнарагатых жывёлах); **júngvald** *m* парастакі, маладняк (аб расьлінах); **júngvarg** *n* моладзь; маладняк (аб жывёлах)
• a jung mit bejner/šporn разьбітны хлопец, зух
• di junge jorn маладыя гады, юнацтва
• jung vi an ejfele, vi a bejmele, vi eršt fun der ej arojs малады як птушаня/дрэўца, як толькі зь яйка вылупіўся
• junger bejn/bojm маладая костка, маладое дрэва
• az an alter man nemt a jung vajb, vert der man jung un dos vajb alt *šprxv.* калі стары бярэ маладуху, ён маладзее, а яна старэе (муж стары, жонка малада, то агонь да вада; са старым жыць – воўкам выць)
• ven di kinder zajnen jung, dercejln di eltern zejere xoxmes; ven di eltern zajnen alt, dercejln di kinder zejere nariškajtn *šprxv.* калі дзеці малыя, пераказваюць бацькі іхныя хохмы; калі бацькі старыя, пераказваюць дзеці іхныя глупствы
• vi me halt zix jungerhejt (vi me jungerhejt zix halt), azoj vert men alt *šprxv.* як трымаешся ў маладосьці, такі будзеш і стары
jun(i) *m*, -s [*d.* Juni] чэрвень
jupice *f*, -s [*ukr.* жупиця] жупан
jup(k)e/jubke *f*, -s [*r.* юбка] спадніца
Júrberik/Júrb(a)rik [*lit.* Jurbarkas] мястэчка Юрбарг (Літва)
• ojsgeven ganc Jurbarik un kejn kontrabande nit gefunen *glxv.* увесь Юрбарг абышоў і кантрабанды не знайшоў (недарэка)
jurke *m* [*ukr./v.* Юрка] Юрка, бабыль, кутнік, бесхацінец, "дзярэўня"
• hern emecns vi dem jurke не зьвяртаць увагі на кагосьці
• ojszen*/švajgn*vi jurkes hunt выглядаць/маўчаць як юркаў сабака (як мур/слуп/сыч/рыба) (у Юркі й сабакі німа)
juster [*d.* just] паважны, сталы, моцны, заможны
jušen [*ukr.* юшити] разьюшвацца, бушаваць, шалець
juške *f*, -s [*v.*] юшка (у печы)
juške *f*, -s [*ukr.* юшка] *kul.* юшка
juvelír *m*, -n, **juvelirer** *m*, -s [*d.* Juwelier] ювэлір; **juvl** *m*, -en ювэлірная рэч
juxe *m/f* [*d.* Juch?] лютасьць, злоснасьць
• di juxe hot zix in im cekoxt ён моцна разьюшыўся
• farkoxte juxe лютая злосьць
juxt=joxt *m* [*ukr.* юхта, *p.* jucht] юхт; **júxtener=jóxtener** [*d.* juchten] юхтовы
juxte *f* [*p.* jucha?] *kul.* юшка







K=kof *m/f*, -n [*s.* (ך-)כף] 1. "коф", літара гэбрэйскага альфабэту; 2. лічба 20

k=kuf *m/f*, -n [*s.* (ך-)קוף] 1. "куф", літара гэбрэйскага альфабэту; 2. лічба 100

-k- [*sl.*] *suf.*

• šljar(k)e аборка, фальбона

ka=ke(j)n=kajn=kin *part.* не, ні

kaaló(j)s(-habójker) [*s.* (הבוקר־)בעלות], **kaaló(j)s-hašáxer** [*s.* השחר־] з усходам сонца, на золку/досьвітку/сьвітань-ні, ранкам, раніцой, нараніцу, сьвітанкам, як толькі ўзыдзе ранішняя зорка [*sin.* mitn zunufgang, far tog, baginen]

• kaalos, kojm es rojtlt zix der mizrex (Prc.) на досьвітку, ледзь толькі зачырванее ўсход

kaare=kajre *t*, -s [*s.* (-ות)קערה] міска, талерка (на якую кладуцца сымбалічныя стравы для пэйсаховай бяседы); талерка, якую выстаўляюць каля дзьвярэй сынагогі напярэдадні Ём-Кіпуру для збору ахвяраваньняў [*sin.* šisl, teler]

kaas=kaes *m* [*s.* כעס] →(bal-)kajsn, ce-, der|ka(e)sn, farkaaster, ka(e)sdiker] гнеў, злосьць, злаваньне, сердаваньне; **kaas-vexéjme** *m* [*s.* וחמה־] ярасьць, абурэньне, азьвярэньне, разьюшанасьць [*sin.* grimcorn]

• kaas-vexejme maxt dem menčn far a behejme *šprxv.* азьвярэньне робіць чалавека быдлам

kabák *m*, -n [*ukr.* кабак] *bot.* кабачок, кабак

kabák *m*, -es [*r.* кабак] шынок, карчма

kabán *m*, -s [*r./ukr.* кабан] кабан, парсюк, кныр, кнораз, вяпрук

kabcje=kapcje *f*, -s [*ukr.* капці, *p.* kapcje] кабці (стары стаптаны абутак), атопак (атопкі), апорак (апоркі); пантоплі

kabcn=kapcn *m*, *pl.* kabconim/kapconim, (-te *f*, -s) [*s.* (-ים)קבצן] капцан, бядняк, бядак, худак, бядуля, жабрак, галяк, галыш, галота, абадранец, басота

• geven a mol a jid mit a jidene, /kabconimlex grojse vi di velt: /hobn zej texterlex cvej gehat, /nor on a grošn gelt... (P. H.) жылі-былі жыд зь жыдоўкай у вялікай беднасьці: мелі яны двух дачушак, але без капейкі грошай...

kabke=kapke *f*, -s [*ukr.* капка, *p.* kapka] капка (кавалачак скуры, якім зашываюць дзірку на абутку); насок, перад (абутку)

kabl *m*, -en [*d.* Kabel] *texn.* кабель; **kablen** тэлеграфаваць па кабелі; **kablográm** *f*, -en каблаграма, тэлеграма

kablen *m*, *pl.* kablonim [*s.* (-ים)קבלן →kabole] прадпрыемец; чалавек, які атрымлівае дапамогу

kablu dati [*s.* קבלו דעתי] прымеце (да ўвагі) маю думку, маё меркаваньне, мой пункт гледжаньня

• azoj mejn ix, nor kablu dati zog ix ništ (Prc.) так я мяркую, але я не кажу, што трэба прыняць маё меркаваньне

kabole *f*, -s [*s.* (-ות)קבלה →mekabl, (bal)mekubl, bekabole, kablen] 1. расьпіска, акт (аб атрыманьні або перадачы); 2. традыцыя або рэч, атрыманая ў спадчыну ад бацькоў; 3. *f* кабала (гэбрэйская містычная філязофія) [→Zojer]; **kabole-iúnis** *f* [*s.* עיונית־] "тэарэтычная кабала" (пасіўны кірунак у гэбрэйскім містыцызьме); **kabole-májsis** *f* [*s.* מעשית־] "практычная кабала" (актыўны кірунак у гэбрэйскім містыцызьме, процілеглы "kabole-iunis"); **kaboles-pónem** *m/n* [*s.* קבלת־פנים] сьвяточная сустрэча гасьцей, прыём; **kaboles-šábes** *m/n*, -n [*s.* שבת־] сьвяточная сустрэча суботы (у пятніцу пасьля захаду сонца); малітвы, якія чытаюць адвячоркам у пятніцу ў сынагозе; **kaboles-kinjen** *m/n* [*s.* קנין־] зацьвярджэньне дагавору або кантракту (абодва бакі бяруць у рукі рагі хусты); першы шлюбны дагавор

• a hispajlesdiker kaboles-ponem захапляльны прыём

kabren *m*, *pl.* kabronim [*s.* (-ים)קברן →kejver, kvure, kojver, mekaber] далакоп, магільшчык, грабакоп, грабар [*sin.* bagreber, kvures-man]

kac *f*, *pl.* kec, *dim.* **kecl** *n*, -ex, **kécele** *n*, -x [*d.* Katze] кошка, котка; **kácener** кашэчы, каціны; **kácn-jamer/-jomer** *m*, -s кашэчы канцэрт, пахмельле; **kácn-mojex** *m*, *pl.* -mojxes [*s.* (-ות)מוח־] каціны розум; **kácn-muzik** *f* (м)яўканьне, кашэчая музыка; галас, гармідар; **kácnšprung** *m* (каціны/блышыны) крок, кароткая адлегласьць; **kac-un-mójz** гульня ў ката й мыш

• arajn|lejgn a kac in bojx arajn выклікаць неспакой, растурбаваць

• arojslozn* di kac fun zak выпусьціць котку зь меха

• hern emecn vi di kac не зьвяртаць на кагосьці ўвагу

• hobn* a kac in kop мець котку/дзірку ў галаве (кепская памяць)

• kojfn a kac in (a) zak (me kojft nit kejn kac inem zak) купляць ката ў мяшку

• lebn cvišn zix vi cvej kec жыць паміж сабой як дзьве коткі (як сабака з коткай)

• maxn emecn a kacn-jomer/-muzik рабіць камусьці сцэну, закаціць камусьці скандал/гістэрыку

• ojszen* vi a kac in zojermilx/smetene выглядаць як котка ў сыраквашы/сьмятане

• vi cvej kec (in ejn zak) як дзьве кошкі (у адным мяху)

• zix filn vi a kac in vaser адчуваць сябе як котка ў вадзе

• a kac ken ojx kalje maxn *glxv.* і котка можа шкоды нарабіць

• a kac šikt men nit nox puter/smetene (in jatke nox flejš; un hunt nox flejš) *šprxv.* котку не пасылаюць па масла /сьмятану (у краму па мяса; а сабаку па мяса) (воўк – не пастух, ■ сьвіньня – не агароднік)

• a švarce kac iz durxgelofn cvišn zej чорная котка прабегла паміж імі

• af a hunt cu klejn, af a kac cu grojs *glxv.* на сабаку замалы, на ката завялікі (аб малой вопратцы)

• az di baleboste iz a kac, iz di kac a baleboste *šprxv.* калі гаспадыня – котка, дык котка – гаспадыня

• er šit vi a kac mit ejer *glxv.* сыпле як котка яйкамі (аб фанабэрыстым чалавеку; брэша як лён/клін чэша)

• far a kac ken men zix nit bahaltn *glxv.* ад коткі не схаваешся

• majn kac iz nox ba zej in grub мая котка яшчэ ў іх у яме

• vi kumt (s'vet kumen) di kac ibern vaser? як кату пераплысьці цераз раку? (як зьдзейсьніць задуму?)

• vu iz di kac, un vu iz di puter? *glxv.* дзе котка, а дзе масла? (фрашка: кухарка скрала два фунты масла, а звалiла на котку, якая важыць усяго два фунты)

kacáp *m*, -s, (-ke *f*, -s) [*r./ukr.* кацап, *p.* kacap] *pejor.* кацап

• Ver ken ject den blajbn štil, /nit šikn tojznt kloles, /af dem kacap, vos plogt 'zoj fil /dem jidn in zajn goles, /despotiše maxt, o finctere naxt, /cu hojx hostu gekletert, /es vet kumen di cajt, /ven der jid vet fun vajt /dix zen ceklapt, cešmetert. /Ober dan vet dos jidl šojn /hobn derrajxt zajn cil. /Ject zingt mit mir dos lidl šojn /un kumt ahejm mit mir! (L. G.) Хто можа цяпер заставацца спакойным, ня слаць тысячу праклёнаў на кацапаў, якія катуюць жыдоў у выгнаньні,

дэспатычная ўлада, о цёмная ноч, зайшла так далёка, прыйдзе час, калі жыд здалёк убачыць цябе разбуранай. Але тады ўжо маленькі жыд дасягне свае мэты. Зараз жа засыпаймa разам песьню і хадзем са мной дахаты!

kacavejke/kacevejke=kucevejke/kucefajke *f*, -s [*p*. kacawejka/kucubejka, *r./ukr*. кацавейка] кацавейка

kacelap=kačelap(nik)/kačalap=clap *m*, -es [*p*. kaczyłap] *iron*. неахайны/брудны чалавек, бруднюха, мурза; дармаед, лодар, гультай (так некалі міснагеды абзывалі хасыдаў)

• a xosid – a kačelap хасыд – гультай

kacepie *f*, -s [?] мясная лаўка, ятка; **kacepinik** *m*, -es мясьнік

kacét *m*, -n [*p*. kacet, *d*. KZ=Konzentrationslager] канцлягер; **kacetler** *m*, -s, (-n *f*, -s), **kacetnik** *m*. -es вязень канцлягера

kacev *m*, *pl*. kacovim, (-te *f*, -s) [*s*. (קצָב-)ים] разьнік, рэзьнік, мясьнік, гандляр мясам [*sin*. flejšer, flejšheker, flejšhendler]; **kacevnják** *m*, -es *pejor*. мясьнік; **kacoves** *f* [*s*. -וּת] занятак/прафэсія мясьніка; мясны промысел; **kacóvišer** мясьнікоў, які мае прыналежнасьць да мясьніка

• a hunt ken kejn kacev ništ zajn *šprxv*. сабаку нельга быць мясьніком (ня вер казлу ў капусьце, а ваўку ў авечках; пусьці воўка да гавец; воўка за пастуха наняць)

• az der kacev gejt avek funem kloc, špringt aruf der hunt (az der kacev gejt avek, špringt der hunt afn kloc) мясьнік ад калоды, сабака на калоду (кошка з дому – мышка на стол; пан за парог, а слугі за пірог)

• er iz šuldik got di nešome un dem kacev dos flejš ён вінны богу душу, а мясьніку плоць (пазыкі завялі ў лыкі; даўгоў як у сабакі блох/кляшчоў)

kaciklen [*d*. kitzeln?] шчыкатаць, казытаць, ласкатаць

kačanove(r) [*p*. kasztanowaty, *ukr*. каштановий] руды (аб кані)

káč(e)n/kačán *m*, -es [*p*. kaczan] качан, (капусная) храпка

kačen [*ukr*. качати] каціць, качаць, катаць; **kač(aj)en zix** качацца; **káč(e)lke** *f*, -s качалка

• kačen zix far gelexter качацца/заходзіцца ад сьмеху

• ba im iz a glater kop, xoč nem un kače af im a blat lokšn у яго такая гладкая галава, хоць раскатвай на ёй локшыны

kačke *f*, -s [*p*. kaczka] *zool*. качка; **kačer=kočer** *m*, -s [*p*. kaczor] качар; **káč(k)ener** качыны; **kačkevate** *adv*. па-качынаму, перавальваючыся з боку на бок; **káčkemilx** *f* птушынае малако

• gejn* kačkevate хадзіць перавальваючыся

• kukn af di kačkes un mejnen di gendz пазіраць на качкі, а думаць пра гусі (скашываць вочы, скоса пазіраць, быць крывым)

• lozn*/maxn kačkes/kačkelex (afn vaser) пускаць паверх вады плоскія каменьчыкі

• a nekejve iz vi a kačke *hum*. жанчына як качка (усё ў яе добра, але тварам ня выйшла)

• di kačke kukt gor on a zajt, ober ire ojgn trogn vajt *šprxv*. качка глядзіць толькі ўбок, але яе вочы вядуць далёка

• – Ix bin geforn kejn draj. /– Farvos nit fir? /– X'hob gekojft a kačke. /– Vos maxt di kačke? /– Kiri-kiri-kačke, – maxt di kačke. *flksl*. – Я паехаў у трэцяе. – Чаму не ў чацьвертае? – Я куліў качку. – Як кажа качка? – Кіры-кіры-качкэ, – кажа качка.

• un az di kačke vet šrajen – loz zi šrajen *glxv*. калі качка крычыць – няхай сабе крычыць (з анэкдоту)

• vos vet men ba im nemen – di kačkes afn vaser? што ад яго возьмеш – хіба ка́чкі на вадзе?

kadege *f*, -s [*pr*. kadegis?] *bot*. чартапалох

• kadeges klepn zix cu klejder un krenk cum guf *šprxv*. чартапалох чапляецца за вопратку, а хвароба за цела

kadep *m*, -es [*ukr*. кадуб/кадіб, *p*. kadłub] кадаўб, калзь, кадушка

kader *m*, -dren/-s [*fr*. cadre] кадр; **kádrove(r)** кадравы

kader-hoórec *m* [*s*. כדור־הארץ] земная куля, глёбус [*sin*. erdkajlex, erdglobus]

kadeš/kadiš *m/n*, *pl*. kadejšim [*s*. (קדיש-)ים] 1. кадыш (памінальная малітва, адмыслова па бацькох); 2. *m* чалавек, які чытае памінальную малітву; сын, нашчадак па мужчынскай лініі

• a gedungener kadeš найманы чалавек (каб чытаць памінальную малітву па нябожчыку, калі ў сям'і бракуе мужчыны)

• opzogn a kadeš nox epes разьвітацца зь нечым назаўсёды

• er hot dem kadeš cu hojx ongehojbn *glxv*. ён занадта гучна пачаў чытаць памінальную малітву (зрабіў вялікі замах, але ня здольны выканаць)

• est un trinkt, un zogt kejn kadeš nit есьць і п'е, і памінальную малітву не чытае

• me kon šojn nox im/dem zogn kadeš! па ім/гэтым ужо можна чытаць памінальную малітву! (адной нагой у дамавіне/труне; капцы прыйшлі)

kadik *m*, -es [*p*. kaduk, *ukr*. кадук] кадук, д'ябал, чорт

kadik *m*, -es [*p*. kaduk, *pr*. kadegis?] ядловец, хваёвая лапка /галіна

kadinje *f*, -s [*ukr*. кадина?] таўстун, тоўсьцік, гладун, шула, апуцак, барыла

kadmen *m* [*s*. קדמון →mikadmes-] рэч або істота, якая існуе заўжды; бог; **kadmojnim** *pl*. [*s*. קדמונים] ранейшы, папярэдні, старадаўні, старажытны, дагістарычны (чалавек), папярэднік, старажытны вучоны; **kádmen-** пра-, прота-, стара-, перша-; **kadmójnišer** першабытны, старажытны, старадаўні; **kádmen-zind** *f* першародны грэх

• fun kadmojnim (on) спрадвеку, здаўна, здавён-даўна, з даўнейшых часоў (калі яшчэ швэд босы хадзіў)

• kadmojniše cajt першабытныя часы

• azoj iz šojn baj undz ajngefirt fun kadmojnim (Š.-A.) так ужо ў нас павялося здаўна

kadme-veázle [*s*. קדמא־ואזלא] назовы дзьвюх інтанацыйных адзнак, зь якімі чытаецца Тора, у форме выгнутых у розныя бакі апострафаў; **kadme-veázle-fis** *pl*. крывыя ногі (клышасты/клышаногі/клыпаногі); **kadme-veázle-vonces** *pl*. абвіслыя вусы

kadojčen [?] трэсьці, калаціць; па-, на|біць

kadoxes *n* [*s*. קדחת] *med*. малярыя, ліхаманка, трасца, цяцюха; **kadoxes-revíes** *n* [*s*. -רביעית] ліхаманка, якая зьяўляецца зноў на чацьверты дзень хваробы; **kadoxes-šlíšes** *n* [*s*. -שלישית] ліхаманка, якая зьяўляецца зноў на трэці дзень хваробы

• hobn* dos najn-jerike kadoxes мець дзевяцігадовую трасцу (дрыжаць/калаціцца як авечы хвост, як асінавы ліст, як чорт пад крыжам)

• az an oreman maxt xasene, krigt der hunt kadoxes *glxv*. калі бядак жэніцца, сабаку дастаецца трасца

• az me lejgt arajn kadoxes, nemt men arojs krenk *šprxv*. хто ўкладвае трасцу, хваробу й атрымлівае (не ўлажыўшы, ня выняць)

• es past im vi a gutn-jidn dos kadoxes *glxv*. гэта яму пасуе

як рэбэ трасца (як сьляпому акуляры/люстэрка; як лысаму грэбень)
• es varft emecn vi in kadoxes калоціць кагосьці як у трасцы (дрыжыць як авечы/баранчыкаў хвост, як асінавы ліст, як дрыгва/ляк, як на верацяне, як чорт пад крыжам)
• hundert hajzer zolstu hobn, in jeder hojz hundert cimern, in jeder cimer cvancik betn, un kadoxes zol dix varfn fun ejn bet in der cvejter! (s'zol dix varfn fun ejn bet in der anderer!) *kll.* каб ты меў сто дамоў, у кожным доме па сто пакояў, у кожным пакоі дваццаць ложкаў, але каб трасца цябе кідала з аднаго ложка ў другі! (каб цябе, божа, дай міленькі, трасца трасла празь сем лет не перастаўшы!)
• kadoxes mit košern fodem! kadoxes in a klejn tepl/tepele! трасцу табе! фігу з макам! фіндос пад нос!
• krenk gegesn, kadoxes gebenčt *glxv.* хваробу зьеўшы, трасцу блаславіўшы
• krign zolstu di kadoxes! *kll.* трасцу табе ў бок!
• varfn zol dix di kadoxes! *kll.* каб цябе трасца трасла/ўзяла! (каб цябе так цяцюха трасла!)
• ves ker zix on kadoxes mitn toxes? што агульнага ў трасцы са сракай?

kad(uš)ke *f*, -s [*r./ukr.* кадка] кад(уш)ка, кадзь

kaes=ka(a)s *m* [*s.* כעס] гнеў, злосьць, злаваньне, сердаваньне; **káesdiker** гнеўны; **ká(e/a)sn zix** гневацца, злаваць; **káesnik** *m*, -es гарачлівы, гняўлівы чалавек

káfak(e)l(e)/kafakál(e)/kafekál(e)/kaf-hakéle *m* [*s.* כף־(הקכ)ע] *rel.* чысьцец, пекла

kaflje *f*, -s, **kafl** *m*, -en [*p.* kafel, kafla] кафля

Kafrísn *n* [*s.* קפריסין →jain-kafrisn] востраў Кіпр [*sin.* Cipern]; *fig.* найлепшы тавар, вышэйшая якасьць; **káfrísndiker** выдатны, найлепшы [*sin.* ojsgecejxnter, perfekter]
• a xosn hob ix ajx gegebn take nor kafrisn, mit ale majles (M.M.-S.) жаніха я вам даў такі вышэйшага гатунку, здатнага да ўсяго

káftern [*s.* כפתורן] *argo* красьці па кішэнях

kaftl=koftl *n*, -ex кофта, блюзка; фуфайка, каптанік

kaftn *m*, -s/-tenes, **kaftán** *m*, -es [*p.* kaftan] жупан, каптан (мужчынская доўгая вопратка)
• az me farčepet a jidn a hekele, vil er, me zol im opmaxn a gancn kaftn *šprxv.* зачапі жыда за гаплік, ён наробіць шуму, быццам зь яго ўвесь каптан здымаюць
• az me maxt dem dales a kaftan, vert der kaftan klener *šprxv.* калі бедняку шыюць жупан, дык жупан будзе замалы

kagan(j)ec=kanec *m*, -n [*p.* kaganiec, *ukr.* каганець] каганец; агарак

Kain *m*, -s [*s.* (קין-ס)] "набыцьцё, прыдбаньне"; *tnx.* Каін (першы сын Адама); *fig.* забойца (Б. 4:1–24)

kajen [*d.* kauen] жаваць; **kajer** *m*, -s сківіца, пашча, рот; **kájtabik** *m* жавальны тытунь; **káj-un-špáj** *n hum.* 1. бурда, дрэнь, гадасьць, кепская ежа; 2. дробязь, драбніца, лёгкая справа
• gebn* kajen štroj даць пажаваць саломы
• kajen di erd грызьці зямлю, пакутаваць
• bistu a behejme, kaj že štroj! *glxv.* калі ты скаціна, дык жуй жа салому (з анэкдоту)
• di alte kajen, un di junge špajen старыя жуюць, маладыя плююць
• es iz nit kejn fiš – s'iz kaj-un-špaj! гэта ня рыба – гэта "жуй-і-плюй"!
• kajen iz kejn hevl nit жаваць – ня глупства (Каін – ня Авель) (*vrtš.* "kajen" жаваць – "Kain" [*s.* קין] Каін, "hevl" [*s.* הבל] глупства – "Hevl" [*s.* הבל] Авель)
• vider kajt er iber alc dos ejgene! ён перажоўвае ўсё тое ж самае! (завёў катрынку!)

kajen zix [*p.* kajać się, *ukr.* каятися] (рас)каяцца, раскайвацца

kajklen=kojklen [*d.* gaukeln, *mhd.* kugelen, kegelen?] 1. каціць, качаць, катаць; 2. *n* качаньне; **kajkl** *n*, -ex, **kájkele** *n*, -x куля, кулька, галка, шарык
• kajklen zix fun/far gelexter качацца/заходзіцца ад сьмеху
• kajklen zix mitn bojx качацца жыватом
• maxn kajkelex fun brojt рабіць шарыкі з хлеба

kajl *m*, -n [*d.* Keil] клін; **kájlšrift** *f* клінапіс

kajl(e)n [*d.* kehlen, *mhd.* keln, köln, koln] 1. рэзаць, забіваць; 2. *n*, **kajlung** *f* некашэрны зарэз/забой (скаціны); **kajler** *m* разьнік, рэзьнік

kajler *m*, -s [*d.* Keiler?] сальнік

kajlex *m*, -n/-s/-er [*d.* Kugel, *p.* kula, *ukr./v.* куля, *mhd.* kule] шар, гала; **kájlex(d)iker** круглы; **kájlexinker** кругленькі; **kájlexartiker** шарападобны; **kájlexiks** ■ жыдоўскі народны танец (удзельнікі становяцца ў карагод і бяруцца за рукі або кладуць адзін аднаму рукі на плечы)
• kajlexdiker jor круглы год
• maxn jenem kajlexdik *fig.* падмануць, ашукаць кагосьці
• az ■ torbe fleker iz kajlexdik, iz di levone (a lebl brojt) špicik (azoj vi a torbe fleker iz kajlexdik!) як торба з палкамі круглая, гэтак і поўня (бохан хлеба) сьпічасты (недарэчнае параўнаньне)
• gelt iz kajlex(d)ik – amol iz es do, amol iz es dort *šprxv.* грошы коткія – часам тут, часам там (грошы круглы, ад таго й коткі; грошы – круглая рэч, раскоцяцца; грошы, як вошы: тут німа, тут і ёсьць)
• vajl der lebl brojt iz kajlexdik, gejen derfar di kačkes borves таму што хлеб круглы, таму й качкі ходзяць босыя (пра недарэчнае параўнаньне)

kájmelon *m*, -en [*s.* (קיימא־לן-ען)] факт, бясспрэчная ісьціна, труізм [*sin.* festgeštelte zax, bakanter fakt]
• a kajmelon fun *hum.* ня менш чым; каля (аб колькасьці)

kajn=kejn [*d.* kein] не, ні

kajn=kejn [*mhd.* kein, gen] *prep.* у

kajór=keór [*s.* כאור=קאיאר] 1. *adv.* досьвіткам, на досьвітку, на золку, на сьвітаньні; 2. *m*, -n раніца, сьвітаньне, досьвітак, золак
• fun frier ovnt biz kajor зь вечара да раньня
• špet banaxt, rixtiker gezogt, fri in kajor позна ўначы, дакладней кажучы, на досьвітку

kajre=kaare *f*, -s [*s.* (קערה-ות)] міска, талерка (на якую кладуцца сымбалічныя стравы для пэйсаховай бяседы); талерка, якую выстаўляюць каля дзьвярэй сынагогі напярэдадні Ём-Кіпуру для збору ахвяраваньняў [*sin.* šisl, teler]

kajsn *m*, *pl.* kajsonim, (-te *f*, -s) [*s.* (כעסן-ים) →kaas, derkaasn, inkaesdiker] злосьнік, гарачы і гняўлівы чалавек, гарачлівая асоба; **kájse(ne)n=ka(a/e)sn zix** сердавацца, злавацца, гневацца, уражацца
• a kajsn iz erger vi a švebele *glxv.* злосьнік горш за запалку

-kajt [*d.* -keit] *suf.* -асьць (утварае назоўнікі жаночага роду)
• ojsterliškajt незвычайнасьць, надзвычайнасьць; lajxtkajt лёгкасьць; lajtiškajt людзкасьць, прыстойнасьць

kajxn [*d.* keuchen] задыхацца; зайсьціся, заходзіцца (ад

сьмеху); **kajxer** *m*, -s глотка, пашча, ляпа, зяпа; **kájxhust/kájxhis** *m* коклюш
• kajxn far gelexter зайсьціся/качацца ад сьмеху, рагатаць, бакі рваць
• max cü dem kajxer! заткні глотку!
kak *abr.* **kehile-kdójše** *f*, *pl.* kehiles-kdojšes [*s.* קק"ק=קהילה קדושה (קהילות קדושות)] "сьвяты кагал"; жыдоўскае насельніцтва аднаго месца; месца, дзе ёсьць кагал
kakemajke *f.* -s [?] *hum.* цацка, штуковіна
kakeruze=kukuruze *f.* -s кукуруза
kakn [*p.* kakać, *ukr.* какати, *nhd.* kacken] какаць, сраць, дрыстаць; **kaker** *m*, -s *vulg.* сруль, сярун
• az me hot nit vos cu ton, iz kakn ojx an arbet *glxv. vulg.* калі німа чаго рабіць, пасраць – таксама праца
• du est nit un pare kakt nit! што я там зьеў, нічога ня зьеў! (што еў, што ня еў)
• gej (vajter) kakn! *vulg.* ідзі (далей) сраць!
• kak, az der toxes iz cu! *vulg.* сяры, калі срака зачынена!
kakosev [*s.* ככתוב →kasve-, ksube, ksav, ksive, mixtev, nixtev] як напісана ў Торы
kal *m* [*p.* kal, *r./ukr.*] кал
kal *m*, -im [*s.* (קל-)ים] легкадумны, распушчаны, распутны, разбэшчаны чалавек, распусьнік [*sin.* lajxtziniker, ojsgelasener menč]; **kales** *n* [*s.* קלות] легкамыснасьць, легкадумнасьць, неабачлівасьць, безадказнасьць [*sin.* lajxtzinikajt, umaxrajesdikajt]; **kálesdiker** легкамысны, легкадумны, неабачлівы, безадказны; **kal-šebekálim** *m* [*s.* שבקלים] "самы легкадумны"; вельмі распушчаны, разбэшчаны чалавек; **kales-dáas** *n* [*s.* דעת] легкадумнасьць [*sin.* lajxtzinikajt]; **kales-róš** *n* [*s.* ראש] легкадумнасьць, сваволства [*sin.* lajxtzinikajt, faršajtkajt]
kalamaške *f.* -s [*ukr.* каламашка, *p.* kałamaszka] каламажка (калымага)
kalamjexe *f* [*ukr.* каламаша] бурда
kalamút *f* [*ukr.* каламуть, *p.* kałamucić] каламуць; **(kale)mutne(r)** каламутны; **(kale)mutne vern*** за-, ус|каламуціцца; **kalamutjen** каламуціць
• zajn* emecn kalemutne afn harcn у кагосьці каламуць /туга на сэрцы
kalanter *m* [*v.*] *med.* карантын, калантыр
kalatojke *f*, -s [*r.* колотовка] (масла)бойка, калатоўка
kalb *m*, *pl.* kelber, *dim.* **kelbl** *n*, -ex [*d.* Kalb] бычок, цялё; **kálb(n)flejš** *f/n* цяляціна
• az di mame/muter iz a ku, iz di toxter a kalb *glxv.* калі маці – карова, дык дачка – цялушка (якая матка, такое й дзіцятка; калі бацька рыбак, то й сын у ваду паглядае)
• bidne kelber tut men bindn /un me šlept zej, un me šext, /ver s'hot fligl, flit arufcu, /iz ba kejnem nit kejn knext (A. C.) бедных цялят зьвязваюць, цягнуць і рэжуць, хто мае крылы, лётае высока і нікому ня служыць
• kalbflejš iz halbflejš, tojbnflejš iz gor kejn flejš *šprxv.* цяляціна – напалову мяса, галубяціна – зусім ня мяса
kálbšorc *f* [*prov.* calv soritz] *zool.* кажан
kale *f*, -s [*s.* (כלה-)ות] нявеста, нарачоная, маладая; **kálenju** *f* нявестухна; **kále(ne)n** прыбірацца, выстройвацца; **kále-mojd** *f*, -n, *dim.* **kále-mejdl** *n*, -ex дзяўчына на выданьні, ларослая дзяўчына
• ojszen*/ojsgeputst/ongeton vi kale (unter der xupe) выглядаць/прыбралася як маладая (як пад вянец, як да шлюбу, як на вясельле, як тая краля, як перад замужжам)
• zicn* in kale-bank сядзець на куце
• ale kales zajnen šejn, ale mejsim zajnen frum *šprxv.* усе нявесты прыгожыя, усе нябожчыкі рахманыя (пра нябожчыкаў лепей маўчаць)
• ale mejdlex zajnen kales *glxv.* усе дзяўчыны – нявесты (*vrtš.* kales [*s.* קלות] легкадумнасьць – kales [*s.* כלות] нявесты)
• az ale zuxn šejne kales, vu kumen ahin di miese mejdn? калі ўсе будуць шукаць прыгожых нявест, куды ж дзецца непрыгожым дзяўчынам?
• az di kale ken nit tancn, zog zi, az di klezmorim kenen nit špiln *glxv.* калі маладая ня можа танчыць, яна кажа, што музыкі ня могуць граць (няўмелай скакусі і дым заваджае; дурной танцоўцы і хвартух завада)
• di kale halt zix cu di ojgn in der xupe-naxt, ober zi kukt durx di finger нявеста закрывае вочы ў першую ноч, але падглядае скрозь пальцы
• ejner hot lib a kale mit a sax gelt, der anderer hot lib a kale on a hemd *glxv.* адзін любіць нявесту зь вялікімі грашыма, другі любіць нявесту без сарочкі
• es iz nito kejn miese kale (un kejn šlexter xazn) *šprxv.* німа непрыгожай нявесты (і кепскага кантара)
• nem di kale un drej zix! бяры нявесту і круціся! (сам рабі, што хочаш) (з анэкдоту)
• ojb ba a kale zajnen šejne ojgn, iz ba ir alc šejn *glxv.* калі ў маладой прыгожыя вочы, дык яна і ўся прыгожая
• ojs kale vider a mojd! *glxv.* зь нявест зноў у дзеўкі! (не атрымалася жаданае, справа не задалася)
• ven di kale iz af der cajt, kukn di mexutonim on a zajt *glxv.* калі нявеста цяжарная, сваты пазіраюць убок
kalejen [*v.*] калець, мерзнуць; **kaljele** *f* калатун, халаднеча, халадзеча
kalekotke/kalakotke=kolekotke *f*, -s [*p.* klekotka] бражджотка, бразготка, клякотка, ляшчотка, ляскаўка, трашчотка; **kalekočen/kalakočen (zix)** клекатаць, трашчаць
kalendár *m*, -n [*d.* Kalender] каляндар
kalende=koljende *f*, -s калядка; калядны падарунак; **kal(j)énd(r)even** калядаваць; канькаць, жабраваць
kalfe=kalpe *f*, -s [*s.* (ם-)קלפי] скрынка для галасаваньня; кагальныя выбары; акт абраньня на пэўную кагальную пасаду [→gabe, parnes]
• a kalfe iz a farkerte papir-mil *hum.* кагальныя выбары – папераpэзальная машына наадварот (у машыну кладуць рознае шмацьцё, а атрымліваецца папера, а ў выбарчую скрынку кладуць паперу, а атрымліваецца "шмацьцё")
kalifjór/kalafjór *m*, -n [*d.* Karfiol] кветкавая капуста
kalifonje/kalofonje=kan(i)folje/kanifól *f* [*p.* kalafonia] каніфоль
kálike/káljeke *m/f*, -s [*ukr.* каліка, *p.* kaleka] калека; **káliker** кульгавы; **kal(j)ečen/kaličen** калечыць; **kaljectve** *f* калецтва
• maxn far a kalike зрабіць калекам
• štejn* beser far a kalikn *iron.* стаяць лепш за калеку
• a nar iz a kalike af ale fir (a nar iz an ejbiker kalike) *glxv.* дурань – калека на ўсе чатыры (што глухі, што дурны; німа розуму – лічы калека)
• az Mešiex vet kumen, veln ale kranke (ojs)gehejlt vern, nor a/der nar vet blajbn a nar (a kalike blajbn) калі Масіяш прыйдзе

на зямлю, усе хворыя ачуняюць, але дурань застанецца дурнем/калекам (гарбатага хіба труна выпрастае/паправіць; з дугі аглоблі ня зробіш; крывога дрэва ня выпрастаеш)

káline *f*, -s [*r./ukr.* калина, *p.* kalina] каліна

kalitke *f*, -s [*r.* калитка] фортка, брамка, весьнічкі

kaljaken [*ukr.* калякати] калякаць

kaljás/kalés=koljás *m*, -n каляска

kalje [*p.* kalać] сапсавана, пашкоджана; скаламучана, запэцкана, забруджана; апаганена, спаскуджана; **kalje maxn** (са)псаваць; запэцкаць, забрудзіць; апаганіць, спаскудзіць; **kalje vern*** сапсуцца, сапсавацца; запэцкацца, забрудзіцца; апаганіцца, спаскудзіцца; **káljediker**, **kálje-gevorener** папсаваны, сапсаваны, сапсуты, пашкоджаны; запэцканы, забруджаны; апаганены, спаскуджаны; **káljedikajt** *f* псута, пашкоджаньне; **kálje-verevdiker** скорапсавальны, нетрывалы

• der veter vert kalje надвор'е псуецца

• [illegible]asin iz kaljedik у машыне няспраўнасьці

• [illegible]rn gix kalje рыба хутка псуецца

• [illegible]axn di baciung/rie/maroxe, di gance špil, dem mogn [illegible] адносіны/зрок/лёс, усю гульню, страўнік

• [illegible] hent maxn kalje di vent *šprxv.* незанятыя рукі псу[illegible] [illegible]цкаюць сьцены

kal(j)uže/káleže *f*, -s [*p.* kałuża, *ukr.* калюжа] калюга, калюжына

kal(a)lojčen/kalojčen [*p.* kołatać, *ukr.* калатати] калаціць, малаціць, боўтаць, узбоўт(в)аць

• kalojčen mit der cung малаціць языком

kalóš *m*, -n [*d.* Kalosche, *p.* kalosz, *r./ukr.* калоша] галёша, калош

• a rusišer podrjačik gejt in kalošn un hot kejn grošn *glxv. hist.* расейскі падрадчык ходзіць у галёшах і ня мае грошай

kaloše *f*, -s [*r.* калоша, *ukr.* колоша] калоша, калашына

kalpe=kalfe *f*, -s [*s.* (ס-)קלפי] скрынка для галасаваньня; кагальныя выбары; акт абраньня на пэўную кагальную пасаду [→gabe, parnes]

kalter (kélterer) [*d.* kalt] халодны; **kaltkajt** *f* халоднасьць, холад, халадэча; **káltlexer** халаднаваты; **káltblútiker** халаднакроўны; **káltblutikajt** *f* халаднакроўнасьць; **káltharciker** бяздушны

• kalt gever халодная зброя

• kalt vi (an) ajz, vi a ščavje, vi ba a mes халодны як лёд /шчаўе, як у нябожчыка (як верхаводка/рыба/жаба /залеза/сьліжань)

• kalt vi af drojsn, vi in a lidovne/pustine холадна як на двары, як у лядоўні/пустэльні

• a kalter malex халодны анёл (аб стрыманым чалавеку)

• az me blozt, vert kalt *glxv.* калі трубяць (у шофар), становіцца холадна (пачынаюць трубіць на пачатку элула – жнівень-верасень)

• beser cu gebn dem kind mit der varemer hant, ejder mit der kalter *glxv.* лепш даваць дзіцяці цёплай рукой, чымся халоднай (лепш даць пры жыцьці, ніж пасьля сьмерці)

• er hot gehat (af zix) kalt(s) un varem(s) *glxv.* ён прайшоў і ваду й агонь (быў у кузьні і ў млыне, у коле і ў мяле, на возе й пад возам, на кані й пад канём, на лаве і пад лаваю; шытае і поратае знае)

• s'iz mir nit kalt un nit varem мне ні холадна й ні горача

kalupen=kolupen [*ukr.* колупати] калупаць

kalvexójmer [*s.* (ס-)קל־וחומר →apšite, mikolškn, alaxes-kame-vekame] 1. тым больш; 2. "няважна й важна"; *tlmd.* лягічная формула, вынік, выказ (тое, што магчыма ў лёгкім выпадку, безумоўна й для цяжкага выпадку; напрыклад: калі кволы дзіцёнак здольны нешта зрабіць, безумоўна, гэта ж можа зрабіць і здаровы дарослы чалавек)

kalx/kalex *m* [*d.* Kalk] вапна; **kálxiker**, **kálxener** вапенны, вапнавы; **kalxn** бяліць (вапнай); **kálxštejn** *m*, -er вапняк; **kálx-ojvn** *m*, -s апальня; **kálx-vaser** *f/n* вапенная вада

• nit-gelošener kalx нягашаная вапна

kam *m*, -en, *dim.* **keml** *n*, -ex, **kémele** *n*, -x [*d.* Kamm] грэбень, грабянец; **kamen=kemen** [*d.* kämmen] часаць

• (op)šern* untern keml абстрыгчы пад грэбень

kam=ko(j)m [*d.* kaum] ледзь(ве)

kamáš *m*, -n [*d.* Kamasze, *p.* kamasz, *ukr.* камаша] камаш, крагі; **kamašnik** *m*, -es рамесьнік, які робіць камашы

kamáš *m* [*terk.*] кумач

kámbale *f* [*r.*] *zool.* камбала

kamcn *m*, *pl.* kamconim, (-te *f*, -s), **kamcenjúk** *m*, -s [*s.* (ים-)קמצן →mekamec] скнара, жмінда, скупы, скупярдзяй, скупянда [*sin.* karger]; **kámcenen** скнарнічаць, жміндзіць, скупярдзяйнічаць; **kamcones** *n* [*s.* ות-] скупасьць, скупярдзяйства; **kamcónišer** скупы, скнарлівы, скнарны, прыцісклівы

• zajn* a kamcn (af) скнарнічаць, жміндзіць, скупярдзяйнічаць

• a nogid a kamcn, a xazer, vos hot af zajn lebn kejn nedove ništ gegebn, kejn štikl brojt an oremen! (Š.-A.) багацей-скнара, сьвіньня, які за сваё жыцьцё жаднай міласьціны ня даў, жаднага кавалачка хлеба бедняку!

kame [*s.* כמה →mikame] *adv.* некалькі, шмат [*sin.* etlexe, a sax]; **kame-vekáme** [*s.* וכמה] *adv.* дужа, вельмі шмат, зашмат, цэлы мех; **kame érter** [*abr.* כ"ע] у шэрагу выпадкаў

• kame-vekame tamim шмат прычын

kameje *f*, -s [*s.* (ות-)קמיע, *it.* cammeo, *gr.*] камэя, амулет; кавалачак паперы альбо пэргаміну са сьвятымі словамі альбо замовамі ад злога духа, ад няшчасьця

kámenice *f*, -s [*p.* kamienica, *ukr.* камениця] камяніца (будынак)

kamer *f*, -n, *dim.* **kémerl** *n*, -ex [*d.* Kammer] камора, пакой, палата

• špiln kamer-kámer(-hojz) гуляць у хованкі

kamerád *m*, -n, (-n *f*, -s) [*d.* Kamerad] таварыш, сябар, сябра

kamerine [?]

• gejn* kamerine пераяжджаць на новую кватэру

• zicn* kamerine кватараваць

kámertux *n* [*d.* Kammertuch] *tekst.* тканіна на кашулі, батыст

kames *f/n*, -n [*s.* (ן-)כמות] колькасьць [*sin.* col, kvantitet]; **kámesdiker** колькасны

kamf *m*, -n [*d.* Kampf] барацьба, змаганьне; **kám(f)fe(j)iker** баяздольны; **kám(f)fe(j)ikajt** *f* баяздольнасьць; **kámflustiker** ваяўнічы; **kámflustikajt** *f* ваяўнічасьць

kamfar/kamfer=kanfar/kanfer *m* [*d.* Kampfer] камфора, камфара

kámgar(n)=kángarn *m* [*d.* Kammgarn] *tekst.* гарус, камвольная тканіна; **kámgarener/kángarener** гарусны, камвольны

kamín *m*, -en [*d.* Kamin, *ukr.* камін] камін; **kamíngzims** *m*, -n камінны гзымс

kamíš *m*, -n [*r.* камыш] *bot.* чарот

kam(i)zójl *m*, -n, **kamezelke** *f*, -s [*d.* Kamisol, *p.* kamizelka] камізэлька, камзол, кабат

kaml(j)et *m* [*d.* Kamelott] *tekst.* камлёт, баркан; **kámljetener** камлётавы, барканавы

kamód=komód *m*, -n камода
kamornik *m*, -es [*v.*] каморнік
kampánjeven (iber) [*p.* kampania] удзельнічаць (браць удзел) у кампаніі
kamsá *f* [*r./ukr.*] *zool.* камса
kan *f*, -en, *dim.* **kendl** *n*, -ex [*d.* Kanne] кана, бітон, конаўка
• di kan fun blexer iz ful mit lexer бляшаная кана ўся на дзірках
• hilcerner kan драўляная конаўка
kan [*s.* ק"ן] 150, сто пяцьдзясят [*sin.* hundert fufcik]
• kan zehuvim iz a klejnštetldiker nadn *iron. glxv.* 150 залатовак – местачковы пасаг
kan bojxn [*s.* כאן בוכין] "тутака плачуць"; тут пануе ліха
kanál=kenál *abr.* **kenisker leéjl** [*s.* כנ"ל=כניזכר לעיל] як вышэй згадана [*sin.* vi ojbn dermont]
kanalje *f* [*p.* kanalia, *it.* canaglia] шэльма, паганец, паскуда
kanap(k)e *f*, -s [*d.* Kanapee, *p.* kanapa] канапа
kanarik/kanarek *m*, -es [*p.* kanarek] *zool.* кенар
kanát *m*, -n [*r./ukr.*] канат, ліна
kanave *f*, -s [*r./ukr.*] канава
kancer *m* [*d.* Kanzerom] *med.* рак, ракавая пухліна
kančik *m*, -es [*p.* kańczug, *ukr.* канчук] канчук, нагайка, бізун
• unter kančik з-пад палкі
• roš-xojdeš nisn lejgt men dem kančik untern kišn, rešxojdeš ier nemt men dem kančik afir *glxv.* на пачатку месяца нісана дубчык кладзі пад падушку, на пачатку месяца іяра вымай (так некалі казалі настаўнікі хедара ў сувязі са сьвяткаваньнем Пэйсаху)
kandelaber *m*, -s [*p.* kandelabr, *fr.* candelabre] кандэлябр
kándl-cuker *n* [*d.* Kandis-zucker] ледзянцовы цукар
kane *f*, -s [*p.* kanka] клізма, прамывачка, клістырная трубка, кана
• maxn/farrukn emecn a kane ставіць камусьці клізму
• a kane iz a gešeft, vu me lejgt tomid mer arajn, vi me nemt arojs *glxv.* клізма – гешэфт, заўсёды трэба болей укласьці, чым пасьля атрымаеш
• Xane, Xane, loz dir maxn fun forn a kane! *glxv.* Хана, Хана, дай табе ўставіць сьпераду кану!
kanec/kanic=kagan(j)ec *m*, -n каганец; агарак
kanevál=konovál *m*, -es/-n канавал
kanevój=konvój *m*, -en канвой
kanfar/kanfer=kamfar/kamfer *m* камфора, камфара
kanfe *f*, -s [*s.* (כנמות) כנמע →arbekanfes] адзін з чатырох рагоў талеса
kanforke *f*, -s [*r.* конфорка] камфорка, фаерка
kángarn=kámgar(n) *m tekst.* гарус, камвольная тканіна
kan(i)folje/kanifól=kalifonje/kalofonje *f* [*ukr.* каніфоль] каніфоль
kanikules *pl.*, **kanikuln** *pl.* [*p.* kanikuła] канікулы, вакацыі; **kanikuljarer** канікулярны
kanister *m*, -s [*d.* Kanister] каністра
kanje *f*, -s [*ukr.* каня, *p.* kania] *zool.* ка́ня
kanjók=konjók *m*, -es [*r.* конёк] *fig.* канёк
kanjučen/kanjuken/kanojken [*ukr.* канючити] канючыць, канькаць
• di vajb ojket, un der hunt kanojket, dos kind xlipet, un der dales ripet *glxv.* жонка войкае, і сабака канючыць, дзіцё хліпае, і беднасьць рыпае (бяда за бядою, як рыба за вадою; бяда на бядзе едзе й бядою паганяе)
kanoes *n* [*s.* קנאות] парыў, запал, гарлівасьць, апантанасьць; фанатызм [*sin.* ejfer; fanatizm]; **kanoi** *m*, -m [*s.* (ם-)קנאי] фанатык, вылюдак; **kanoim** *pl.* зэлоты, радыкальная гэбрэйская сэкта, якая вяла барацьбу з рымлянамі тэрарыстычнымі сродкамі ў часы Другога Храма; **kanóišer** фанатычны, апантаны
kanón *m*, -en, **kanone** *f*, -n [*d.* Kanone] пушка
kanoplje=konoplje *f*, -s *bot.* каноплі
kánse(ne)n [*s.* קנסע(נע)ן →knas, farknasn] налагаць/накладаць штраф, штрафаваць
kant *m/f*, -n, *dim.* **kéntele** *n*, -x [*d.* Kante] 1. кант; рант; 2. *m*, -n край, краіна, рэгіён; **kántiker** кантовы; **kántišer** краёвы, рэгіянальны; **kánteven** акантоўваць, аблямоўваць; **kántforšung** *f* краязнаўства; **kántkener** *m*, -s краязнаўца; **kántkenteniš** *f* краязнаўства; **kántštejn** *m*, -er бардзюр
• kantiker klamer *gram.* квадратныя клямары/дужкі
kanter=konter *m*, -s [*p.* kantar, *ukr.* кантар] бязьмен, вагі
kantonist *m*, -n [*d.* Kantonist] жыдоўскі юнак, прызваны на шматгадовую вайсковую службу ў Расеі ў часы цара Мікалая I (1825–55)
kantór=kontór *m/f*, -n [*d.* Kontor] кантора; **kantorke=kontorke** *f*, -s канторка, бюрка; **kantorščik=kontorščik** *m*, -es канторшчык
kantor *m*, -s [*d.* Kantor] кантар
kantšaft *f*, -n [*d.* Bekanntschaft] знаёмства
• šlisn* kantšaft (mit) завесьці знаёмства
kanure=konure *f*, -s, *dim.* **kanúrikl** *n*, -ex [*r./ukr.* конура /канура] канура
kanve *f*, -s [*p.* kanwa, *r./ukr.* канва] канва
kap *m*, -n [*d.* Kap] мыс
kápá(b)l/kápávl (af) [*d.* kapabel] здатны, здольны, гатовы; **kápábl zajn*** быць здатным
kaparnik *m*, -es [*ukr.* капарник] ашуканец, круцель, шальмец, шалахвост, абармот, махляр; паганец, погань, паскуднік, поскудзь, агіднік, нягоднік, басалай
kapcje=kabcje *f*, -s кабці (стары стаптаны абутак), атопак, апорак; пантоплі
kapcn=kabcn *m*, *pl.* kapconim/kabconim, (-te *f*, -s) [*s.* (ם-)קבצן, *p.* kapcan] капцан, бядняк, бядак, худак, бядуля, жабрак, галяк, галыш, галота, абадранец, басота [*sin.* oreman]; **kápcenen** жыць з выпадковых заробкаў, жабраваць; **kapcones** *n* жабрацтва, жабраваньне, убоства, галата, бядота, беднасьць; **kapcónišer/kapcanske(r)** жабрацкі
• az a kapcn huljet zix fanander, iz ba im a grošn kejn gelt nit *glxv.* як бядняк разгуляецца, дык для яго грош – ня грошы (калі бал, то бал – дай за грош вантробы; за грош вантробы, за паўгроша піва, то будзе на ўсё сяло дзіва)
• az cvej kapconim gejen tancn, cerajsn zix ba di klezmers /klezmorim di strunes *glxv.* калі жабрацкая пара ідзе танчыць, рвуцца ў музыкаў струны (беднаму і вецер у вочы)
• cvej kapconim kenen kejn ejn šabes nit maxn *glxv.* два бядулі разам ня могуць справіць аднае суботы
• der nogid trogt zajn got in kešene, (un) der kapcn/oreman – in harcn *glxv.* багацей носіць свайго бога ў кішэні, жабрак/бядняк – у сэрцы
• er iz geven un farblibn a kapcn in zibn poles *glxv.* ён быў і застаўся жабраком у сямі крысох (гол як сакол)

• ven frejt zix der kapcn/oreman? – ven/az er farlirt un gefint *glxv.* калі радуецца жабрак? – калі ён губляе й знаходзіць

kapčonke *f*, -s [*r.* копчёнка] вэнджаная рыба

kapdn *m*, *pl.* kapdonim, (-te *f*, -s) (af) [*s.* (יִם-)קַפְדָן →kpejde, makped] строгі, суровы, гнеўны, злосны чалавек; пэдант; дакладны, пэдантычны, дысцыплінаваны чалавек: фанатык [*sin.* štrenger, corndiker; pedant; fanatiker]; **kapdones** *n* [*s.* ות-] строгасьць, суровасьць; **kapdónišer** дакладны, пэдантычны

kape *f*, -s [*p.* kapa, *ukr.* капа] капа, пакрывала

kapél *f*, -n. **kapele** *f*, -s [*d.* Kapelle, *p.* kapela] капліца

kapelje *f*, -s [*p.* kapela] *muz.* капэля

kápeljuš/kápaljuš/kápelič/kápelač *m*, -n [*p.* kapelusz, *ukr.* капелюш] капялюш; **kápeljuš-maxer** *m*, -s майстар, які робіць капелюшы

• s'dajnt zain kapeljuš gedenkt er, az er hot nox a kop af di [illegible] дзякуючы свайму капелюшу, ён памятае, што [illegible] на плячох

• [illegible]os kapeljuš-maxer *glxv. hum.* яго песенька сьпета [illegible]ясьнічым, а цяпер нічым: быў піўнічым, а застаў[illegible]ым; быў калісьці Яўхім, ды цяпер чорт яго ўхапіў)

[illegible] (*p.* kapać, *ukr.* капати] ка́паць; **kap** *m*, -n, *dim.* **kápečke** /**kápičke** *n*, -s, **kápeł(j)e** *n*, -x кропля, капка, троха; ■ **kape ton*** капнуць; **kap-káp** кап-кап

• [illegible]emen* a kap прамачыць горла

• s'[illegible]obn a kape geton trern закапалі сьлёзы

• s'kapet gold золата капае (зь неба)

• x'vel ■ kapele харп a dreml я б хацеў трохі падрамаць

• zict xoć a kapele пасядзеце хоць кропельку

• Aj, du forst avek un, aj, du forst avek fun mir, /af vemen że loztu mix iber? /Azoj v'a štejn, azoj v'a bejn, vi z'cu majn lebn, /oj, zec że zix lem mir ejn kap anider. /Ot heng ix zix, ot štex ix zix, oj, far dajne ojgn, /oj zec że zix lem mir ejn kap anider. *ffksl.* Ой, ты едзеш прэч ад мяне, на каго ты мяне пакідаеш? Як камень, як костку (мяне кідаеш), ой, гора мне, ой, сядзь жа са мною побач. Вось павешуся, вось зарэжуся, ой, за твае вочы, ой, сядзь жа са мною побач.

• fun "kap-kap" ken men kejn ojšer nit vern *glxv.* ад "кап-кап" дужа не разбагацееш (ад работы праведнай ня быць хаце каменнай)

kaper *m*, -s [*hol.* kaper, *ukr.* капор] капар, каптур

kaperál *m* [*nhd.* Kap(o)ral, *p.* kapral] капрал

kaphon *m*, *pl.* -hener [*d.* Kapaun, *mhd.* Kaphan] каплун

kapídrexer [?] сподні; **kapidrex** *adv.* навыварат

kapišón *m*, -en [*fr.* capuchon] капюшон, каптур

kapitál *m*, -n [*d.* Kapital] капітал; **kapitaler** капітальны

• šlogn* kapital (fun) здабываць/атрымліваць выгаду

kapitán *m*, -en [*d.* Kapitän] капітан

kapítl *m/n*, -en/-ex, **kap'** [*d.* Kapitel] капітэль, разьдзел (у кнізе)

• onhejbn* a naj kapitl перагарнуць новую старонку, пачаць новы разьдзел

kapke=kabke *f*, -s насок, перад (абутку)

kapl *n*, -ex, **kápele** *n*, -s [*d.* Kappe] каўпак, ярмолка

kaplan *m* [*d.* Kaplan] кап(ɔ)лян, каталіцкі сьвятар

kaplice *f*, -s [*p.* kaplica] капліца

kapój(e)r [?] *adv.* наадварот, навыварат, насупраць; уверх, дагары, дыбам, дуб(к)а; **kapójerdiker** няправільны, адмоўны, нэгатыўны; **kapójr-gajst** *m* дух пярэчаньня; **kapójervarfn*** перакуліць, перакульваць, абярнуць, абарочваць; **kapójerfaln*** куляцца, перакульвацца; **kapójerkumen*** нечакана зьявіцца, зьяўляцца; **kapójeršteln** перастаўліць, перастаўляць (наадварот); **kapójeršvimen*** усплы(ва)ць

• di hor hobn zix geštelt kapojr валасы ўсталі дыбам

• Mojše kapojer надакучлівы чалавек, зануда

• ton* epes kapojr зрабіць нешта шыварат-навыварат /наадварот

kapón *m* [?] *kul.* хлебная поліўка, заціркa

kapore *f*, -s [*s.* (ות-)כַּפָּרָה →mexaper] "выкуп"; кара, аплата; ахвяра, свойская птушка (курка або пеўнік), прызначаная для ахвяраваньня напярэдадні Ём-Кіпуру; бязьвінная ахвяра (чалавек, пакараны замест іншага) [*sin.* ojskojf, ojslejz]; **kapores** *pl.* цырымонія ахвяраваньня, выкуп за грахі; **kapóre-hindl** *n*, -ex ахвярны пеўнік; чалавек, які пакутуе за чужыя грахі; казёл адпушчэньня; **kapórenice** *f*, -s *argo* курыца

• a šejne rejne kaporе! добра, што ад гэтага пазбавіліся! (туды яму й дарога! так яму й трэба! па заслугах!)

• darfn* af (cen tojznt/tisjaći/tišonce) kapores патрэбны як дзірка ў галаве

• ix darf dos hobn af kapores мне ў гэтым німа ніякай патрэбы

• nit hobn* kejn kaporе ня мець спадзяваньня на дараваньне віны

• tojgn* af (cen, cen tojznt/tisjaci/tišonce/sim sot) kapores (vos tojg af kapores) нікуды ня варты

• šlogn* kapores mit emecn (з)ганіць, скасаваць, адкінуць, абвергнуць, абсьмяяць, высьмеяць кагосьці

• šlogn* kapores *rit.* праводзіць абрад ачышчэньня ад грахоў, абяртаючы вакол галавы пеўніка альбо курку; жорстка паводзіць сябе

• zajn*/vern* a/di kaporе fun (far, nox) emecn быць моцна закаханым, тужыць/зьнемагацца па кімсьці

• zajn*/vern* a kaporе far emecn/epes (far emecns zind) *iron.* быць пакараным замест кагосьці, быць гатовым прыняць ахвяру за нешта

• zajn* di kapore-hindl быць ахвярным пеўнем (казлом адпушчэньня)

• a ganc jor hodevet men di kapore, un erev Jom-Kiper flit zi avek *šprxv.* цэлы год гадавалі ахвяру, але напярэдадні Ём-Кіпуру яна зьляцела

• a kaporе a joxed far a rabim *šprxv.* адна ахвяра за ўвесь натоўп (адзін за ўсіх)

• a kaporе far mir (far ale jidiše kinder)! *kll.* а бадай ты пакутаваў за мяне (за ўсіх жыдоў)!

• a kaporе gelt – abi der koved iz grojs! *glxv.* не шкада грошай, абы быў вялікі гонар! (аб чалавеку, які нічога не шкадуе дзеля дасягненьня ўласнай мэты)

• a kaporе zolstu vern hajntike naxt! *kll.* а бадай ты стаў ахвярай у гэтую ноч!

• cores tojgn af kapores *glxv.* ліха нікуды ня варта

• ix darf dix hobn af kapores (af erev Jom-Kiper)! (ver majn geślogene kaporе!) *kll.* каб ты стаў маёй ахвярай (напярэдадні Ём-Кіпуру)! (у труне я цябе бачыў!)

• zol dos zajn majn kaporе! хай мяне бог карае!

kapote/kápete *f*, -s, **kapót** *m*, -n [*p.* kapota, *r./ukr.* капот] капота, халат

• kojl(en)en emecn di kapote прыдзірацца, чапляцца да кагосьці; уціскаць, прыгнятаць кагосьці

• a gutn tog mit der kapote! 1. *hum.* дабрыдзень з капотай! (усім да пабачэньня!); 2. справы швах!
• a štub on fencter iz kejn gute dire nit, un a kapote on a kneplex iz kejn šejn beged nit *šprxv.* як хата без вакон (магіла) – нядобрае жытло, гэтак і капота бяз гузікаў (саван) – непрыгожая вопратка

kapríz *m*, -n [*p.* kapriz] капрыз; **kaprizne(r)**, **kapríziker** капрызны; **kapríz(n)even**, **kaprízn** капрызьнічаць; **kapríznekajt** *f* капрызнасьць
• praven kaprizn выказваць норавы

kapšik *m*, -es [*ukr.* капшук, *p.* kapszuk] капшук

kapter *m*, -s, **kaptur** *m*, -es [*p.* kaptur, *ukr.* каптур] каптур, капюшон
• drejen emecn a/dem kapter дадзяваць, дакараць, назаляць

kapuce *f*, -s [*nhd.* Kapúze, *p.* kapuza] каптур, капюшон

kapúl/kapójl=kopíl *m*, -n/-es, **kapile** *f*, -s [*ukr.* копил] капыл
• a kapuljer oncuhereniš *iron.* тоўсты намёк
• der šuster bam kapul, un der top iz ful *šprxv.* шавец за капылом – гаршчок поўны (хто дбае, той і мае)

Kapulje мястэчка Капыль (Беларусь)
• kapuljer naronim un klecker ganovim *glxv.* капыльскія дурні й клецкія злодзеі
• a kapuljer oncuhereniš (mit a buxce in zajt) *iron.* празрысты/тоўсты намёк (і таўхель у бок)

kapuste *f* [*p.* kapusta, *r./ukr.* капуста] капуста; *kul.* капуста

kapút [*d.* kaput] капут
• gejn*/vern* kaput псавацца

karabelnik=korobejnik/korobelnik *m*, -es [*r.* коробейник] карабейнік; **karabelnikeráj** *n* карабейніцтва

karabken/karapken zix [*p.* karabkać się, *ukr.* карабкатися] карабкацца

karáf *m*, -n, *dim.* **karafke** *f*, -s, **kar(a)fín** *m*, -en, *dim.* **karafinke** *f*, -s [*d.* Karaffe, *p.* karafka, *ukr.* карафа] карафа, графін

karahód *m*, -n [*r./ukr.* корогод] карагод, жыдоўскі народны танец (удзельнікі становяцца ў карагод і бяруцца за рукі або кладуць адзін аднаму рукі на плечы)

karaimer *m*, (-n *f*, -s) [*s.* →kroi] караім; **karaímišer** караімскі; **karaimiš** *n* (di karaimiše šprax) караімская мова

karanter=kuranter, **karantne(r)** [*d.* Garantie, *fr.* garant] пэўны, акуратны, надзейны; плацежаздольны
• a guter vort iz karanter fun a nedove добрае слова лепш за міласьціну (добрае слаўцо лепш, чым піўцо; прыемнае слова – вясеньні дзень; не частуй ні піўцом, ні вінцом, а прывітай шчыранькім слаўцом)

karapúz *m*, -n [*r./ukr.*] карапуз

karaúl *m*, -n [*p.* karauł, *r./ukr.* караул] каравул, варта
• šrajen* karaul крычаць каравул/гвалт

karave(r)=korave(r) каравы, брудны

karb *m*, -n [*d.* Kerbe, *p.* karb, karbowaniec] 1. *dim.* **kerbl** *n*, -ex рубель; 2. нарубка, зарубка, насечка, засечка; **karbn** карбаваць, біркаваць, рабіць насечкі; **karbevane(r)** закарбаваны, насечаны, які мае зарубкі
• trefn* in karb (arajn) трапіць у самую кропку

karbírn (karbírt) [*p.* karbować] заві(ва)ць (валасы); **karbírl** *n*, -ex бігудзі, шчыпцы для завіўкі

karból *m*, **karbolke** *f* [*p.* karbol, *r./ukr.* карболка] карболка

karbón/karbón(e)c *m*, *pl.* -es/karbojnim/karbojnes, **karbovanec** *m*, -nces [*ukr.* карбованець, *r.* карбонец, *p.* karbowaniec] *hum.* рубель

karc=kor(e)c *m*, -es, *dim.* **kercl** *n*, -ex карэц (мерны посуд)

karcer *m*, -s [*d.* Karzer] карцэр

kardinál *m*, -n [*d.* Kardinal] кардынал

kardúpl *m*, -s, **kuredúp** *m* [*ukr.* курдупель, *p.* kurdupel] курдупель, чалавек малога росту, карлік, гном

kare *f*, -s [*p.* kara, *ukr./r.* кара] ка́ра; **karen** караць

k(a)rél *f*, -n [*d.* Koralle, *p.* koral] пацерка, каралі
• cebajt że mir a finf-un-cvanciker, /oj, af gole kareln, /ix vel di klezmer gut bacoln, /abi mir zol der xosn gefeln *flksl.* разьмяняйце ж мне чацьвяртак, ой, на каралі, я добра заплачу музыкам, абы мне жаніх спадабаўся

kare(r) [*p.* kary] 1. кары, вараны; 2. *m* вараны конь; **káre-ojgiker** (mit kare ojgn) з карымі вачыма
krant *m*, -n, **kran** *m*, -en [*ukr./v.*] кран(т) (водаправодны)
kranter/krantne(r)=kuranter [?] распаўсюджаны, ужывальны; дапушчальны; лепшы; **krantkajt** *f* распаўсюджванасьць, ужывальнасьць; дапушчальнасьць
• dos iz kranter гэта лепей
krap *m*, -n, *dim*. **krepl** *n*, -ех [*nhd*. krappe, *d*. Krapfen, *p*. krapel, krepel] 1. *kul*. маленькія калдуны, клёцкі з душой (зь мясам ужываюцца звычайна на Пурым, у сёмы дзень Сукэсу і напярэдадні Ём-Кіпуру; з сырам – на Швуэс); 2. трохкутная шапка службоўца альбо вайскоўца
krapen [*ukr*. крапати] крапаць
krapírn=krepírn (krapírt/krepírt) [*d*. krepieren] здохнуць, здыхаць, (с)канаць
• azoj halt ix in ejn vartn un ejn hofn, /ix vart, ix ver cepiket, ix krapir, /un der guter jor hot mir nox nit getrofn, /iz es meglex, az majn got zol blofn mir? (D. M.) такім чынам я чакаю і спадзяюся, я чакаю, я затурканы, я канаю, але на добры год яшчэ не натраліў, магчыма мой бог згуляў са мной жарт?
krasávice *f*, -s [*r*. красавица] прыгажуня, красуня; **krasavec** *m*, -vces прыгажун, красун
k(r)astrój=kostrój *m hist*. скрозь строй (палачная дысцыпліна ў расейскім царскім войску)
krášice=grášice *f*, -s [*p*. grasica] *anat*. вальлёвая/вальляковая залоза (у цяляці)
krate *f*, *pl*. -s/kratn [*p*. krata] крата; **krátene(r)** кратчаты; клятчасты, у клетку
kravát *m*, -n, **krávete/kravate** *f*, -s [*d*. Krawatte, *p*. krawat] гальштук
krax *m*, -n [*s*. (ʔ-)כרך] сталіца, вялікі горад
kraxn [*d*. krachen] 1. грука(та)ць, трашчаць (аб лёдзе); 2. рабіцца банкрутам; 3. *n* выбух, грукат, грук; **krax** *m*, -n 1. выбух, грукат, грук; 2. банкруцтва, крах, правал, праруха; **a krax ton*** грымнуць
kraž *m*, -es [*v*.] краж, плаха
krec *f/pl*., **krécikajt** *f*, **kréckrankajt** *f* [*d*. Kratze] *med*. кароста, парша (у жывёлаў); **kréciker** пархаты, паршывы, карасьлівы, шалудзівы; **krecik vern*** паршывець, шалудзівец
• krecik vi a xazer/cojg шалудзівы як сьвіньня/сука
• ojsmajdn* vi a krecikn пазьбягаць як пракажонага
krečme=kričme *f*, -s, **krečem** *m* [*mhd*. kretscheme, *p*. karczma] карчма; **krečmer/krečmár** *m*, -s, (-ke *f*, -s) карчмар
• farforn* in fremder krećme заехаць у чужую карчму (далёка зайсьці, зарапартавацца)
• ale tog a majl, ale šo a krečme *glxv*. штодня міля, штогадзіну карчма (фурман-п'яніца прыпыняецца каля кожнай карчмы)
• es nit dos dorf un nit di krećme! *glxv*. гэта ня тая вёска й ня тая карчма! (ня ў той стэп)
• kejn krečme tor men nit farmajdn *glxv*. не праміна́й жаднай карчмы
kredenc *f*, -n [*p*. kredens] сэрвіз, крэдэнс, буфэт, посудная шафа
kredit *m*, -n [*d*. Kredit] крэдыт
• kredit iz an ejdele materje *glxv*. крэдыт – далікатная матэрыя
kréftikn [*d*. kräftigen] у-, (за)мацаваць, у-, за|мацоўваць; **kréftikn zix** мацнець; **kréftiker** моцны, сільны; **kréftiker vern*** узмацнець, падужэць; **kréftikajt** *f* моц, сіла; **kréftikndiker** жыватворны
• farn zumer iz dos jingl gevorn kreftiker un iz ojsgevaksn за лета хлопчык паўзмацнеў і падрос
krejc=krajc *m*, -n [*d*. Kreuz] крыж; **krejcn** крыжаваць, с-, пера|крыжоўваць; **kréjcikn** расьпяць, раскрыжаваць; **krejcung** *f*, -en 1. (с)крыжаваньне; 2. **kréjc-veg** *m*, -n ростань, раздарожжа; **kréjcartik** *adv*. накрыж; **kréjcikung** *f*, -en расьпінаньне, раскрыжаваньне, расьпяцьце; **kréjcbejn** *m*, -er *anat*. крыж; **kréjcbild** *n*, -er расьпяцьце; **kréjc-cug** *m*, -n, **kréjcfor** *m*, -n крыжовы паход; **kréjcforer** *m*, -s крыжак, крыжаносец; **kréjckrig** *m*, -n вайна крыжакоў; **kréjcfarher** *m*, -n перакрыжаваны допыт; **kréjc(-)punkt** *m*, -n пункт перасячэньня; **kréjc-špin** *m*, -en *zool*. павук-крыжавік; **kréjcling** *m*, -en помесь, мешаніна
krejen [*d*. krähen] 1. сьпяваць, кукарэкаць; квахтаць, квактаць, кудахтаць; 2. ■ пеўневы крык
• a hon hot nit gekrejt певень не кукарэкнуў (ніхто слова не сказаў)
• a xazn zingt, un a hon krejt, iz nox nit glajx *glxv*. кантар сьпявае, а певень кукарэкае – гэта розныя рэчы
• az a hun krejet, šikt men zi cum šojxet, az a vajb krejet, šikt men zi lezozl *špixv*. калі курыца квохча, яе адпраўляюць да рэзьніка, калі жонка квохча, яе пасылаюць к чорту
• bin ix a hun, muz ix krejen *glxv*. калі я курыца, дык мушу кудахтаць (калі курэц, то насі люльку й тытунец)
• dem hon vilt zix krejen пеўню хочацца кукарэкаць
• er gejt, ven kejn hener krejen un kejn menćn zeen *glxv*. ён ходзіць, калі пеўні не крычаць, і людзі ня бачаць (відаць па вачох, хто ходзіць па начох)
• farvos farmaxt der hon di ojgn, ven/bešas er krejet? – er vil zol di velt mejnen (zol di velt visn), az er vejst es af ojsvejnik чаму закрывае вочы певень, калі ён сьпявае? – хай сьвет думае, што ён ведае свой сьпеў на памяць
• O, zajt gezunterhejt, majne libe eltern! /Ix for avek in vajtn veg, /vu kejn vint vejt nit, /un vu kejn fejgele flit nit, /un vu kejn hon krejt nit. *flksl*. О, бывайце здаровы, мае любыя бацькі! Я ад'яжджаю ў далёкі шлях, дзе вецер ня дзьме, дзе птушкі не лятаюць, дзе певень не крычыць.
• tut nor di hun a krej, hot zi šojn gelejgt an ej *špixv*. курыца толькі кудахнула – а ўжо зьнесла яйка
krejn *m* [*d*. Kren, *p*. chrzan] *bot*. хрэн
krejndl *n*, -ех [*d*. Krone →krojn] гальштук, пас, тасьма, жычка
krejs *m*, -n [*d*. Kreis] круіз, марское падарожжа; **krejsirn** (krejsirt) падарожнічаць па мору; **krejser/krejcer** *m*, -s крэйсер
krejves *f/n* [*s*. קי(י)רבות →kirves, korev, krojve, mekarev, mekurev] сваяцтва, кроўнасьць, сяброўства [*sin*. mišpoxe-farbindung, krojvešaft, frajntšaft]

krejz *f*, -en [*d*. Krause, *p*. kryza] брыж, жабо
krékene *f* [?] малодзіва
krekn [*ukr*. крекнути?] *hum*. легчы касьцямі; **krekn zix** (mit) задыхацца, давіцца, душыцца
• krekn far umetikajt паміраць ад нуды
• krekn zix hustndik кашаль з надрывам
krel *m*, -n [*d*. Kralle] кіпцюр, кіпець, пазур; **krein** дзерці, драпаць
krel=karél *f*, -n. *dim*. **krelxl** *n*, -ex [*d*. Koralle, *p*. koral] пацерка, каралі
krel *m*, -n [?] *argo* хлеб
krein [*d*. grellen?] кіпець, шумаваць
krem *m/f*, -en [*fr*. creme] крэм
kremen *m*, -(e)s, **krémnje-štejn** *m* [*r*. кремень] крэмень
• laxn mit kremenes сьмех скрозь сьлёзы (і сьмех і гора)
kremer *m*, -s, (-ke *f*, -s), **krémerl** *n*, -ex [*d*. Krämer] крамнік, гандляр; **kremeráj** *n* невялікі гандаль, гандлёвая справа
• az me šikt a nar in mark arajn (az a nar gejt in mark, cvišn di kromen), frejen zix di/ale kremer калі пасылаюць дурня на кірмаш, весяляцца ўсе гандляры
• dem kremer nart men nit *glxv*. крамніка не абдурыш
krémpeven [*p*. krępować] за-, у|мацаваць, за-, у|мацоўваць, увяз(в)аць; **krémpelec=krímpelic** *m* [*p*. krępulec] скрутак, жгут
krempirn zix (krempirt) [*p*. krępować się] адчуваць сябе нядобра (кепска/блага/дрэнна); саромецца; **krempirter** нядобры, хворы; сарамлівы
kremplen [*d*. krempeln] часаць (воўну)
krénice/krénece=kérnice *f*, -s [*ukr*. криниця, *p*. krynica] крыніца
• špaj nit in krenece, vest nox darfn trinken fun ir vaser *šprxv*. ня плюй у крыніцу, прыйдзеш па вадзіцу
krenken [*d*. kränken] хварэць; **krenken zix** засмучацца, сумаваць, смуткаваць, журыцца; **krenk** *f*, -en хвароба, хворасьць, немач; **krénkiker**, **krénklexer** хваравіты, балючы; **krénklexkajt** *f* хваравітасьць; **krenkung** *f*, -en, **krénkeniš** *f/n*, -n згрызота
• a krenk! трасцу!
• orxarn (onfregn zix) a krenk падхапіць (нажыць) хваробу
• visn*/kenen*/farštejn* a krenk (er iz a dokter, er vejst a krenk) трасцу што ведаць/разумець (ён доктар, ён ведае хваробу) (з анэкдоту)
• a kranker lebt fun krenk *šprxv*. хворы жыве хваробай
• a lange krenk iz a zixerer tojt *šprxv*. доўгая хвароба – пэўная сьмерць
• az me git krenk, hot men krenk *šprxv*. хто дае трасцу, дастае хваробы
• di cvejte krenk iz erger fun der eršter *šprxv*. другая хвароба горш за першую
• ejner vejst nit dem anderns krenk *glxv*. ніхто ня ведае чужой хваробы (чужая болька – людзям сьмех; чужая болька не баліць; да чужога цела німа нікому дзела)
• krenken zolstu! *kll*. хваробу/трасцу табе!
• ven cu a krenk iz do a refue, iz dos a halbe krenk *glxv*. калі ёсьць лекі, дык хвароба толькі напалову
• zol dir got gebn a lajxte krenk un a gutn dokter! дай табе божа лёгкую хваробу й добрага доктара!
krep *m*, **krepe** *f* [*d*. Krepp, *p*. krepa] *tekst*. крэп
krepinke *f*, -s [*r*. крапинка] крапінка
krepírn=krapírn (krepirt/krapirt) [*d*. krepieren] здохнуць, здыхаць, (с)канаць
krepke(r) [*r*. крепкий] моцны, дужы
krepl *n*, -ex, **krep(e)x** *m*, -n, **krap** *m*, -en [*nhd*. krappe, *d*. Krapfen, *p*. krapel, krepel] *kul*. маленькія калдуны, клёцкі з душой (зь мясам ужываюцца звычайна на Пурым, у сёмы дзень Сукэсу й напярэдадні Ём-Кіпуру; з сырам – на Швуэс); **krépiflejš** *n* мясная начынка для калдуноў
• gebn* mit a krepl in kop даць калдуном у галаву
• (afile) kreplex vert ojx nimes (cu esn) і калдуны прыядаюцца (адно надакучыць)
• az epl iz krepl, iz kugl a lokšntepl калі яблык – калдун, дык кугаль – гаршчочак для локшынаў
• dem gancn kez lejgt men nit arajn in ejn krepl *šprxv*. усяго сыру не кладуць у адзін калдун
• er maxt ojs im kreplflejš (maxn kreplflejš fun emecn) *glxv*. ён крышыць яго на дробныя кавалачкі
• Fišelex in vaser /un krepelex in puter... /Voser xosn vil nit nemen, /a ruex in zajn muter. *flksl*. Рыбкі ў вадзе, калдункі ў масьле... Бадай чорт пабраў маці таго жаніха, які ня хоча мяне ўзяць.
• jidiše keplex! – klogn un vejnen, un esn vajter kreplex *glxv*. жыдоўскія дзеці! – лямантуюць і плачуць, а далей ядуць калдуны (плачуць, таму што іх б'юць, а гатаваньне калдуноў зьвязана зь "біцьцём")
• kreplex in xolem iz nit kejn kreplex, nor ■ xolem *glxv*. калдуны ў сьне – не калдуны, але толькі сон
• kreplex zolstu (nit) esn! еж лепей калдуны! ідзі к д'яблу! каб ты быў здаровы! (кажуць, калі нехта нясе лухту)
• ven me šlogt, koxt men kreplex *glxv*. як б'юць, дык вараць калдуны (звычай дазваляў гатаваць калдуны тры разы на год: напярэдадні Ём-Кіпуру, калі б'юць пеўня-ахвяру, на сёмы дзень Сукэсу, калі б'юць вербалозам, і на Пурым, калі б'юць Гамана, і чацьверты раз, паводле народнага гумару, калі б'юць жонку)
kreps=krebs *m*, -n [*d*. Krebs] *zool*. рак
krésle *f*, -s [*r*. кресло] крэсла
kréstince *f*, -s [*sl*.] уласнасьць, маёмасьць
kreščen [*r*. крестить] хрысьціць
kretín *m*, -in [*d*. Kretin] крэтын
krexc(e)n [*d*. krächzen] 1. крахтаць, кректаць, стагнаць; 2. *n*, **krexc** *m*, -n стогн, енк; **a krexc ton*** крэхнуць, кректануць; **kréxceniš** *f* кректаньне, стагнаньне, енчаньне
• a froj brengt arojs mer in a krexc, ejder ■ mansparšojn in gancn al-xet *šprxv*. адзін стогн жанчыны выказвае больш, ніж раскаяньне мужчыны
• afile a bojm krexct bejsn faln *šprxv*. нават дрэва стогне, калі падае
• az me ken nit helfn dem frajnd mit gelt, zol men im xoč helfn mit a krexc *glxv*. калі нельга сябру дапамагчы грашыма, дык хоць стогнам
• ix hob far dir kejn krexc nit iberik *glxv*. у мяне на цябе й лішняга стогну німа (свайго ліха поўная хата)
• mit a krexc bacolt men nit a xojv *glxv*. стогнам доўгу не сплоціш
• zifcn un krexcn cebrexn a halbn guf fun dem menčn *glxv*. уздыхі й енк адбяруць палову цела/здароўя ў чалавека
kri *f* [*s*. קרי →ksiv; mesojre] *mx*. спосаб чытаньня слова, напісаньне якога адрозьніваецца ад вымаўленьня
kric(e)n [*d*. kritzeln, *mhd*. krizen] 1. (mit) скрыга(та)ць (зубамі); 2. вырэзваць, гравіраваць (на дрэве/мэталу/каменю); **kric** *m*, -n драпіна; скрыгат, скрыгатаньне; **kricbild** *n*, -er гравюра
• kricn mit di cejn скрыга(та)ць зубамі

krie *f* [*s.* קריעה →kojreje, krišme, krue-blue, kries-jamsuf] разрываньне адзеньня (у знак жалобы); **krie-blíe** [*s.* בליה] абадраны й брудны, у лахманох, у падранай вопратцы, абадранец, галадранец, абшарпанец, галабокі
- rajsn* krie разрываць на сабе вопратку, выказваць смутак; цяжка працаваць
- az man un vajb šlogn zix, rajsn zix di kinder a krie *šprxv.* калі мужык з жонкай б'юцца, дзеці ў роспачы
- er gejt krie-blie *glxv.* ён ходзіць як жабрак/абадранец
- far vemen horeve ix un rajs krie a ganc lebn? Take nor fun dajnetvegn dox, zunenju (M.M.-S.) дзеля каго я гарую й рвуся ўсё жыцьцё? Такі ж дзеля цябе аднаго, сынку

kries-hatójre *f* [*s.* קריאת־התורה] чытаньне Торы ў сынагозе ў час набажэнства

kries-jámsuf *m* [*s.* קריעת־ים־סוף →krie] *tnx.* разьдзяленьне Чырвонага мора Майсеем, пасьля выхаду габрэяў з [illegible] вялікія цяжкасьці, нечалавечыя намаганьні [illegible]
- [illegible]men* vi/mit (a) kries-jamsuf давацца зь цяжкасьцямі [illegible] kumt sverer on vi kries-jamsuf *glxv.* заробак даецца [illegible] чымся Майсею разьдзяленьне Чырвонага [illegible]

krig=krug *m f*, -n, *dim.* **krigl** *n*, -ex гарлач, збан, гладыш
- [illegible] di rebecn, /oj, iz dos a rebecn... /A pejsexdike krigele, [illegible] lokšn-kigele, /oj, iz dos a rebecn, /aza jor af mir! *flksl.* Ой, рабініха, ой, гэта рабініха... Пэйсаховы збаночак, з локшынаў піражочак, ой, гэта рабініха, каб я так жыў!

krig [*d.* Krieg] 1. *f*, -n вайна; 2. *m/f*, -n, **krigeráj** *f/n*, -en, **krígeniš** *n*, -n сварка, спрэчка, звада, грызьня, гырканьне; **kriger** *m*, -s, (-n *f*, -s), **krígsman** *m*, *pl.* -lajt ваяр, ваяка, супярэчнік; **krígerišer** ваяўнічы; **krígeriškajt** *f*, -n ваяўнічасьць, варожасьць, непрыязнасьць; **krígfirndiker** ваюючы, які ваюе; **krign zix** сварыцца; **krígscajt** *f* ваенны час; **kríg(s)(-)cuštand** *m* ваеннае становішча; **krígsgefangener** ваеннапалонны; **krígshak** *m fig.* тапор вайны; **krígšif** *f*, -n ваенны карабель
- bagrobn* krigshak закапаць тапор вайны
- cvej frojen in štub iz an ejbike krigeniš дзьве жанчыны ў хаце – вечная звада (агонь з вадою ў адной хаце не жывець)
- fun a krigeraj/milxome iz ništo vos vartn af guts (vart nit kejn guts) ад сваркі/вайны німа чаго дабра чакаць
- krign zix iber klejnikajtn сварыцца з-за драбязы
- krign zix vi di/cvej kec/hint, vi a kac mit a hunt, vi hint iber a bejn, vi švegerns біцца/сварыцца/жыць як два каты /сабакі, як кот з сабакам, як сабака за костку, як швагеркі (як агонь з вадою, як ятроўкі)
- a šlexte šolem iz beser, vi a guter krig *šprxv.* благі мір лепш добрай вайны (лепей лычны мір, чымся раменная свара; лепей саламяная згода, ніж залатая звада)
- az di ganovim krign zix, kumt der pojer cu zajn ku *šprxv.* калі злодзеі сварацца, мужык ідзе да сваёй каровы (і коні ўкрадзеныя знойдуцца, як злодзеі паб'юцца)
- badarft ir ajx cu krign, šlogt ajx beser! *glxv.* трэба вам сварыцца, лепш пабецеся!
- got krigt zix mitn vajb *glxv.* бог сварыцца з жонкай (кажуць дзеці, калі грыміць гром)
- iz a kabcn a mol gevezn, /flegt er nor mit got zix krign, /vunder iber vunder hot mit im getrofn, /ven er hot gezungen ot aza min nign: /čiri-bim, bam, bam... (L. M.) жыў на сьвеце бядняк, які толькі з богам і сварыўся, дзіва дзіўнае зь ім здарылася, калі ён сьпяваў такі напеў: чыры-бім, бам, бам...

krign* (gekrígn/gekrógn) [*d.* kriegen] 1. здабы(ва)ць, даста(ва)ць, прыдбаць, атрым(лів)аць; 2. *n* здабыча
- krign* jedies здабыць зьвесткі
- krign* kalte fis ногі падкасіліся
- krign* a psak/xejlek/gešlogn/bacolt атрымаць наганяй /удар/заробак
- krign* fun a štejn di vejxe атрымаць ад каменя мякіш (пра скнару)
- far gelt krigt men alc, nor nit tate-mame *šprxv.* за грошы толькі бацькі з мацерай ня купіш (абы грошы, то й роднага бацька купіш)
- m'ken ba im krign mit a štejn in kop ад яго можна атрымаць толькі камень у галаву (скнара)
- s'iz in ergec nit cu krign, me zol zuxn batog mit lixt днём з агнём не знайсьці
- vinter vestu ba im kejn štikl ajz umzist nit krign у яго і ўзімку лёду не дастаць (скупы зімой лёду ня дасьць)

kri(h)e/krije *f*, -s [*ukr.* крига, *p.* kryha] крыга

krik *f* [*d.* Krücke] ляска, качарга, мыліца, кульця, кульба, хадула

krik=karík=kerík=curík [*d.* zurück] *adv.* назад

krimen [*d.* krümmen] крыўляць, крывіць, корчыць рожы; **krim** 1. *m*, -en скажэньне, скрыўленьне; грымаса, гімора, крывая міна, мігі; 2. *f* нахіл, схіл; **krimeráj** *f* грымасьнічаньне, крыўляньне; **krimung** *f*, -en скрыўленьне, выгіб, выгін; паваротка (дарогі)
- krimen mit der noz (af) круціць (крывіць) носам
- in der krim наўскасяк, наўскасы, наўскос

kriminalnik *m*, -es [*d.* Kriminal] злачынец

krímpelic=krémpelec *m* скрутак, жгут

krinoline/krineline *f*, -s [*fr.* crinoline] *tekst.* крыналін

krip *m* [*ukr.* кріп] *bot.* кроп

krip *f* [*d.* Krippe] ясьлі

kripl *m*, -en [*d.* Krüppel] вырадак, пачвара; **krípldiker** выродлівы, пачварны, убогі; **krípldikajt** *f* убоства, пачварнасьць, агіднасьць

krire *f*, -s [*s.* קרירה(-ות)] моцны холад, мароз, сьцюжа [*sin.* grojse kelt, frost; *ant.* xmime]; **kríredіker** вельмі халодны, сьцюдзёны

krisilje *f*, -s [*sl.*] крэсіва

kriske *f*, -s [*ukr.* криси] крысо, брыжы, фальбона

krist *m*, -n, (-n *f*, -s) [*d.* Christ] хрысьціянін; **krístikn** хрысьціць; **krístlexer** хрысьціянскі; **krístntum** *n*, **krístnšaft** *f*, **krístlexkajt** *f* хрысьціянства; **krístikung** *f*, -en хрост, хрэст, хрышчэньне, кшчэньне; **kristlen zix** трымацца хрысьціянскага ладу жыцьця
- der kristlexer glojbn, di kristlexe emune хрысьціянская рэлігія, вера, хрысьціянскае веравызнаньне
- vi es kristelt zix, azoj jidlt zix як робяць хрысьціяне, гэтак жа робяць і жыды

krístn-dajč *n* [*d.*] нова-верхне-нямецкая мова

kristól/krištól/krištál *m*, -n [*d.* Kristall] крышталь; **kristólener/krištálener** крышталёвы

Kristus [*d.* Christus] Хрыстос

kriš(l)en [*ukr.* кришити] крышыць; **kriš** *m*, -n, *dim.* **krišl** *n*, -ex,

kríške *f.* -s крошка, крыха; **kríšldiker** рассыпісты

krišme *f* [*s.* קריאת־שמע →kojreje, krie, šma-Jisroel] "крышма /крыят-шма" (малітва, якая пачынаецца словамі "šma-Jisroel" і чытаецца раніцай, вечарам і на сон); **krišme-lejenen** *n.* -s агульнае маленьне разам з навучэнцамі хедара напярэдадні абразаньня

• lejenen krišme чытаць гэтую малітву

• mojre hobn* (citern) vi a ruex far krišme баяцца як чорт "крышмы"/ладану

• az dos vajb iz brojgez, lejent zi op krišme un drejt zix um cum man mitn toxes *vulg.* калі жонка злуе, яна чытае малітву й выстаўляе мужыку сраку

• az m'lejent op krišme, šloft men ruik *šprxv.* хто чытае малітву на сон, сьпіць спакойна

• host mojre? – lejen że krišme *hum.* баішся? – чытай малітву на сон

kriválnice *f.* -s [*p.* krzywulec, *v.* крывулі] полаз (саней)

krivden [*ukr.* кривдити, *p.* krzywdzić] (па)крыўдзіць; **krivde** *f.* -s (antkegn) крыўда

• onnemen* zix emecns krivde заступіцца за кагосьці

• er nemt zix on gots krivde *glxv.* ён заступаецца за бога (чалавек, які празьмерна выказвае сваю набожнасьць і павучае іншых)

krixn* (iz gekróxn) (in, cu, af) [*d.* kriechen] лезьці, лазіць; поўзаць; **krixer** *m.* -s, (-n *f.* -s) паўзун, праныра, пралаза; задзірака; **krixeráj** *f* угодлівасьць, дагодлівасьць, ліслівасьць; **krixerišer, krix(nd)iker** паўзучы; угодлівы, ліслівы; **krixgixkajt** *f* прыцішаньне, замаруджаньне; **krix-hejzelex** *pl.* паўзункі; **krixlox** *m/f, pl.* -lexer *texn.* лаз, люк

• krixn* af ale fir поўзаць на ўсіх чатырох

• krixn* far emecn af ale fir поўзаць перад кімсьці на карачках (на задніх лапках, рачкаваць)

• krixn* fun haldz (s'krixt im fun haldz) лезьці/перці з горла (празьмерна)

• krixn* in/far di ojgn лезьці ў вочы

• krixn* vi a padle/šnek/čerepaxe цягнуцца/паўзьці як падла/смоўж/чарапаха (бы старэчая пуга, як вуж/вусень, як муха на сыроватцы/смале)

• krixn* vi a vorem (in štojb), vi far a porec поўзаць як чарвяк (у пыле), як перад панам (рачкаваць)

• krixn*, vu me darf un vu me darf nit лезьці куды трэба й куды ня трэба

• az di tir iz ofn, darf men nit krixn durxn fencter *šprxv.* калі дзьверы адчыненыя, ня варта лезьці праз вакно

• az me ken gut krixn, krixt men aruf *glxv.* хто можа добра лазіць, той пралезе наверх

• der emes/sejxl iz a krixer *glxv.* праўда/розум – праныра (праўду не закапаеш)

• di ojgn krixn fun kop вочы лезуць на лоб

• er lozt zix krixn afn kop ён дазваляе залазіць/садзіцца сабе на галаву

kríž(ik) *m.* -es [*ukr.* криж, *p.* krzyż] крыж; *anat.* крыж, паясьніца, сярэдзіна; **krížik** *m.* -es дэнка, дэнца, днечка (для рэзкі мяса альбо раскачваньня цеста)

• duren emecn dem kríż дурыць камусьці сярэдзіну (нэрваваць, раздражняць кагосьці)

kro(e) *f.* -en [*d.* Krähe] варона; **króen-nest** *f.* -n вароніна гняздо

• a kro in pave-federn варона ў паўлінавым пер'і

• a vajse kro белая варона

• az di kro lernt zix a najem gang, fargest zi dem altn *šprxv.* калі варона зьведала новы ход, яна забывае стары

• di kro flit hojx un zect zix af a xazer *šprxv.* варона лётае высока, але садзіцца на сьвіньню (у бруд)

krogn=kragn *m.* -s, *dim.* **krágele** *n.* -x [*d.* Kragen] 1. каўнер; 2. шыйка, горлачка птушкі

kroi *m.* -m [*s.* (ם-)קראי] караім (сэктанты, якія ў Бабілёніі ў VIII ст. выракліся Талмуду й аддзяліліся ад гэбрэйскага народу) [*sin.* karaimer]

krojn *f.* -en, *dim.* **krejndl** *n.* -ex, **krójnele** *n.* -x [*d.* Krone] карона; **krojnen=krejnen** [*d.* krönen] каранаваць, (у)вянчаць; **krojnung=krejnung** *f.* -en каранаваньне; **krójnbletl** *n.* -ex пялёстак; **krójnprinc** *m.* -n кронпрынц; **krójnštot** *f, pl.* -štet сталіца; **krójnverk** *n* галоўная справа

• a krojn afn kop *fig.* "карона" на галаве (пархі)

• majn krojn золатца маё, мой даражэнькі (зварот)

• mame krojn любая/родная матуля (зварот)

krójste(ne)n (zix) [?] рухацца, перамяшчацца

krojt *f/n* [*d.* Kraut] капуста; **krójt-vorem** *m, pl.* -verem *zool.* капусьнік; **krójt-babele** *n.* -x, **krójtflaterl** *n.* -ex, **krójt-federl** *n.* -ex *zool.* бялян-капусьнік

• a hejptl/kepl krojt галоўка капусты, качан

• zojer(e) krojt квашаная капуста

• a nar vakst vi in krojt arajn *glxv.* дурань расьце як у капусьце (дурняў ня сеюць і ня жнуць, яны самі растуць)

• der volf zol zajn zat, un dos kepl krojt zol zajn ganc *iron.* і воўк мусіць быць сытым, і капуста цэлая

• er hakt vi in krojt *glxv.* ён сячэ як у капусьце (прорва ненасытная)

• fun brojt (mit krojt) vern di bakn rojt *šprxv.* ад хлеба (з капустай) становяцца чырвонымі шчокі

• krojt fult di hojt *glxv.* капуста пучыць жывот (ад капусты ногі тлусты; як капуста тлуста, то і ў жываце ня пуста)

krojvim *pl.* →korev *m.* (-te *f.* -s) [*s.* (ים-)קרוב] родзіч, крывіч, кроўнік, сваяк; **krójve(te)** *f.* -s [*s.* (ות-)קרובה] родзічка, сваячка: **krójvišer** родны, сваяцкі, роднасны, кроўны; **krójvešaft/krójvišaft** *f.* **krójviškajt** *f* роднасьць, сваяцкасьць, сваяцтва; **krojv(l)en (zix)** (па)радніцца

krojzn=krajzlen=grajzlen [*d.* kräuseln, *mhd.* krusen] кучаравіць, кудзерыць; **krojz** *m.* -n, *dim.* **krajzl** *n.* -ex 1. пасма, кудзеркі; 2. колца (дыму); **krójziker** кучаравы, кудзерны

• - Du libst mix? – Ix lib dix! – Du šemst dix? – Ix šem mix... /– O, lib mix un šem dix un švajg, /un ze vi es mišn zix pex-švarce krojzn /mit goldene... trala-la-la... (Z. Š.) – Ты любіш мяне? – Я цябе люблю! – Ці сорамна табе? – Мне сорамна... – Дык любі ж мяне, мей сорам і маўчы, і глядзі, як мяшаюцца чорныя смаляныя кудзеркі з залатымі... тра-ля-ля-ля...

krok *m.* -n [*ukr.* крок, *p.* krok] крок, шаг

Kroke *f* г. Кракаў

• Kroke iz nit in ejn tog gebojt gevorn *glxv.* Кракаў не за адзін дзень пабудаваны (не за дзень Вільня станавілася)

• zen* Kroke mit Lemberg/Lemberik убачыць Кракаў зь Львовам (ад моцнага ўдару) (аж сем карчмоў/бажніц /касьцёлаў/жыдоўскіх школаў убачыць; семдзесят сем агнёў убачыць; аж зоркі ў вачох заскакалі; сьвечкі ў вачох засьвяціліся; яскаркі з аччу пасыпаліся)

krokve *f*, -s [*ukr*. кроква, *p*. krokiew] кроква
krolik *m*, -es [*r*. кролик] *zool*. трус; **królikener** трусіны
krom *f*, -en, *dim*. **kreml** *n*, -ex [*d*. Kram, *p*. kram] крама; **kromen** мець краму, гандляваць
• hit ajer gezunt, ir krigt es nit in krom far kejn šum gelt! беражэце сваё здароўе, не сварэцеся ў краме за кожную капейку!
• a krom iz a ganev *glxv*. крама ёсьць злодзей (часам невядома, куды дзяваюцца грошы)
• Avreml! vos hert men in dajn kreml? *glxv*. Абраме! што чуваць у тваёй краме?
• beser cu firn a klejn kreml mit ejgn gelt, ejder a grojse krom mit fremd gelt *glxv*. лепш мець маленькую крамку, але ўласную, чымся вялікую, але чужую (лепш біць свае вошы, ніж лічыць чужыя грошы; на чужое шчасьце мухаю ня пасьці; лепей сваё благое, чым чужое добрае)
krónike *f*, -s [*d*. Chronik] хроніка, летапіс; **króniker** *m*, -s хронікёр, летапісец
krónkrigelex *pl*. [*d*.] *bot*. званочкі
krop *m* [*v*.] *bot*. кроп
krop *m* [*d*. Kropf] *med*. вальняк, вальлё
• me hodevet dem indik biz Pejsex nor culib dem krop *glxv*. індыка гадуюць да Пэйсаху толькі дзеля вальняка
krópeve/krópive *f* [*r*. крапива, *ukr*. кропива] *bot*. крапіва
• opbrenen/opbrien zix mit kropeve апячыся крапівой
kropívnice *f* [*r*. крапивница] *med*. крапіўніца
• es vakst vi kropeve/švemlex nox a regn ён расьце як крапіва/грыбы пасьля дажджу
• naronim un kropeve vaksn afile on a regn *glxv*. дурні й крапіва растуць нават без дажджу
kropjen [*ukr*. кропити] пырскаць, капаць па кроплі
kropn [*d*. köpfen] набі(ва)ць, нап(і)хаць, напхнуць; адкармліваць (гуся)
krošim *pl*. [*s*. קרשים] "дошкі", якія кладуць на дно магілы [*sin*. breter]
krot=krit *m*, *pl*. -n/-es/kret [*r./ukr*. крот, *p*. kret] *zool*. крот; **krótbergl** *n*, -ex кратавіна
krovjanke *f* [*r*. кровянка] *med*. крываўка, воспа ў кароў
kroxim *pl*. →kerex *m* [*s*. (כרך-)ים] том (кнігі)
kroxmel/kroxm(á)l *m* [*p*. krochmal, *ukr*. крохмаль] крухмал; **kroxmal(j)en** крухмаліць; **kroxmalne(r)** крухмальны
kručen [*ukr*. крутити, *p*. kręcić] круціць, хітраваць, віляць; **kručel** *m*, -es круцель; **kručke** *f*, -s круцельства, крутня, ашуканства
kručke *f*, -s [*v*. бручка?] рэпа
• az cibele iz biter, iz kručke rojt *glxv*. як цыбуля горкая, гэтак і рэпа чырвоная (недарэчнае параўнаньне)
kručók/kručik *m*, -es [*p*. kruczek, *r./ukr*. крючок] кручок, гаплік, гачок; *fig*. зьедлівасьць, падчэпка
kručók/kručik *m*, -es [*v*. круг, *ukr*. крючок, *d*. Krug] кручок (пасудзіна, пляшка каля чвэрткі літра)
krue-blúe/-uvlúe [*s*. קרוע־בלוע/־ובלוה →kojreje, krišme, krie] абадраны й брудны (у лахманох, у падранай вопратцы), абадранец, галадранец, абшарпанец, галабокі [*sin*. opgerisn um opgeślisn]
krug *m/f*, *pl*. -n/krig, *dim*. **krigl** *n*, -ex [*d*. Krug] гарлач, збан, гладыш, крынка
• der krug trogt azoj lang vaser, biz er blajbt on ojern (dos krigl gejt azoj lang nox vaser, biz dos ojer brext zix op) *šprxv*. да пары збан воду носіць: вушка адарвецца, і збан паб'ецца (да пары сіцечка сее: гарцаваў, гарцаваў, пакуль карку не зламаў)
• zi šemt zix vi di kac, vos hot ufgegesn dos krigl/tepl (mit) smetene яна саромеецца як котка, што зьела крынку сьмятаны (глядзіць як мыш з дражджоў (як пацук з мукі); стыдаецца як казёл у капусьце)
kruim *pl*. [*s*. קרואים] госьці
kruk *m*, -es [*r./ukr*. крюк] крук, гак
krulik=krolik *m*, -es [*p*. królik, *r*. кролик] *zool*. трус
krumer [*d*. krumm] 1. (krímerer) косы, крывы; 2. *m* кульгавы; **krum** *adv*. наўскос, наўскасяк, скажона; **krume** *f*, -s *mat*. крывая; **krumkajt** *f* крывізна; **krúmlexer** касы, незадаволены, зайздросны; **krúmbanic** *m*, -n кепскае /дрэннае/благое) карыстаньне; **krúmfísiker** крываногі; **krúmgedrang** *n*, -en падман, мана, крутня, хітрасьць; **krúmlápediker** касалапы, крывалапы; **krúmlíniker** крывалінейны; **krumrúkndiker** перакошаны, з крывой сьпінай
• a krum vort крывое/няшчырае слова
• a krume mine крывая міна/мора
• a krumer ponem/ksav/špigl/šmejxl крывы твар/почырк, крывое люстэрка, крывая ўсьмешка
• in der krum наўскасяк, наўскасы, наўскос
• krum kop крывы розум
• krum ojstajćn скажона тлумачыць
• krum un lom un hojkerdik крывы, кульгавы й гарбаты
• krum un štum крывы і нямы
• s'iz nit krum гэта – ня крыва (пасуе)
• a tojber hot gehert, az/vi a štumer hot dercejlt, az a blinder hot alejn gezen, az a krumer iz gelofn глухі *glxv*. чуў, як нямы распавядаў, што сьляпы бачыў, як кульгавы бег (глухі сказаў: паслухаем, а сьляпы – пабачым)
• beser a krumer fus, ejder a krumer kop *glxv*. лепей крывая нага, чымся крывая галава (бяз розуму горш, чым без здароўя)
• bešas hadxak iz a krume nekejve ojx gut – abi zi ligt nor glajx *glxv*. у крайнім выпадку крывая баба таксама добра, абы яна толькі роўна ляжала
• es iz nito kejn glajxers, vi a krume lejter, un kejn krumers. vi a glajxverter *šprxv*. німа нічога прамей крывых драбінаў і крывей прамога выслоўя
• kejn krumer iz cu im nit glajx ні адзін кульгавы яму ня роўня
• ojx mit krume fis kon men gejn af a glajxn veg *šprxv*. і з крывымі нагамі можна ісьці роўным шляхам
• orem iz nit rajx – krum iz kejn glajx *šprxv*. бедна – не багата, крыва – ня роўна
• ven di lixt iz krum, iz der šotn krum *šprxv*. калі сьвятло крывое, цень таксама крывы (які поп, такі й прыход: ад дурнога куста й дубец крывы, і ягада пуста)
krup *m*, -n [*r./ukr*. круп, *fr*. croupe] круп (каня), крыж
krup *m* [*r*. круп, *fr*. croup] *med*. круп
krupne(r) [*r*. крупный] буйны
krupnik *m*, -es [*p*. krupnik] *kul*. крупнік, крупеня (суп з пацаку з грыбамі); **krupenik** *m*, -es, (-nice *f*, -s) мельнік, крупадзёр
• ba vemen di perl iz šiter, un ba vemen der krupnik iz biter *glxv*. у кагосьці пэрлы дробныя, а ў кагосьці крупнік

горкі (аднаму аж з горла прэ, а другі з голаду мрэ; аднаму льецца, а другому нават ня капае; аднаму шчасьце ракою плыве, а другі ў няшчасьці цэлы век жыве; бог зь людзьмі робіць ігрыска: аднаго ўгору, другога нізка)

• blut iz nit kejn krupnik *glxv.* кроў – ня крупнік (кроў не вада – разьліваць шкада)

• az krupnik iz an axile, iz Xandrivke a kehile *glxv.* калі крупнік – ежа, дык Хандрыўка – кагал (лахман – не адзежа, зацірка – ня ежа)

kruv *m*, -im [*s.* (כרוב-)ים] хэрувім, керубім

krux(k)e(r), **kruxle(r)** [*ukr.* крихкий] крохкі

kruz=xruz *m*, -im [*s.* (כרוז-)ים →maxrez] вызаў, выклік, адозва, вокліч, покліч, абвестка (ад імя рабіна) [*sin.* ojsruf, proklamacje]

krúževe *f*, -s [*r.* кружево] карункі

kružók *m* [*r.* кружок] кола (сяброў), суполка

ksav [*s.* (כתב-)ים →kakosev, ksive, ksube, kosev-, mixtev, nixtev, Kisve(j)-hakojdeš, (še)biksav] 1. *m/n*, -n почырк; 2. *m/n*, *pl.* ksovim пісьмо, дакумэнт, папера, літаратурны твор, літаратурная праца [*sin.* (hant)šrift, gešrifts, dokument]; **ksavjád** *m/n*, *pl.* -n/kisve-jád, **k"j** *abr.* [*s.* כ"י=(כתבי־יד/ן-)יד] рукапіс, манускрыпт; **ksav-pláster** *m*, *pl.* kisve-pláster [*s.* (כתבי־)פלסתר] пасквіль, брахняпіс, паклёп, абмова [*sin.* paškvil]; **ksav-rabónes** *m/n* [*s.* רבנות] пісьмовы дагавор паміж кагалам і рабінам: запрашэньне на займаньне пасады рабіна

• dos iz zajn ksav гэта ягоны почырк

• mejdl mit a ksav дзяўчына, якая страціла нявіннасьць

• perldiker ksav (perl-ksav) бісэрны почырк

ksise=gsise *f*, -s [*s.* (ות-)נסיסה →gojses] агонія, сьмерць, кананьне

ksiv *m*, -n [*s.* (ן)כתיב →mesojre; kri] *tnx.* напісаньне слова, якое паводле традыцыі адрозьніваецца ад вымаўленьня; **ksive** *f*, -s [*s.* (ות-)כתיבה →kasve-, kakosev, ksav, ksube, kosev-, mixtev, nixtev] пісьмо, каліграфічны шрыфт, рукапісныя літары; **ksiven** каліграфічна выпісваць гэбрэйскія квадратныя літары; **ksiveráj** *n* каліграфія; **ksívišer** які мае дачыненьне да квадратных літараў; **ksive-vexsíme tojve** *f* [*s.* וחתימה טובה] "добры запіс і запячатваньне"; віншаваньне на Рош-Гашону (пажаданьне добрага Новага году)

ksjondz=kšondz *m*, -n/-es [*p.* ksiądz] ксёндз

ksorim *pl.* →keser *m* [*s.* (כתר-)ים] арнамэнтальная карона, якой упрыгожваецца Тора ў сынагозе

ksovim *pl.* [*s.* כתבים →ksav] літаратурныя творы, працы

ksube *f*, -s [*s.* (ות-)כתובה →kasve-, kakosev, ksav, ksive, kosev-, mixtev, nixtev] шлюбны кантракт/дагавор [*sin.* xasene-opmax]; *hum.* напісаны рахунак, дакумэнт продажу; **ksubes** *tlmd.* назоў 2-га трактату 3-га разьдзелу (запаветы аб абавязках паводле шлюбнага дагавору)

• az der zun hot xasene, git er dem vajb a ksube, un der mamen a get *šprxv.* калі сын жэніцца, ён бярэ шлюб з жонкай, але дае развод маці

• az me šrajbt dem vajb a ksube, git men a get der Tojre *šprxv.* хто бярэцца з жонкай, той разводзіцца з Торай (ажаніўся – той перамяніўся)

Ksuvim *pl.* [*s.* כתובים →tilim, mišle, Iev, di finf megiles, Daniel, Ezre, Nexemje, divre-hajomim a'/b'] трэцяя частка Старога Запавету (пасьля Торы й Прарокаў) [*sin.* šriftn]

kšak *m*, -es [*p.* krzak] куст, хмызьняк

kšal-bérex *m* [*s.* כשל־ברך →maxšl, mixšl, nixšl] "спатыклівы, са слабымі каленямі"; хісткі, няўстойлівы, слабы на ногі чалавек; чалавек, які надарваўся; кілун [*sin.* štrojxler af di kni, vakldiker, švaxer af di fis; gebrixter]

kšej-ójref *m* [*s.* (קשי־) קשה־עורף] упарты чалавек, упорнік [*sin.* hartnekiker menč, akšn]; **kši-ójref** *m* [*s.* קשי־] упартасьць, настойлівасьць, упорлівасьць, натурлівасьць [*sin.* hartnekikajt, ajngešpartkajt]

kšejrim [*s.* כשרים →košer, kašres, hexšer, maxširin] кашэрныя, годныя, якія пасуюць; дазволеныя; ачышчаныя, чыстыя; чэсныя, сумленныя [*sin.* košere, rejne, erlexe]

kšivde *f* [*p.* krzywda] крыўда

kšomim=gšomim *pl.* →gešem *m* [*s.* (ים-)גשם] "дождж" (малітва на дождж, якую гэбрэі чытаюць на Кучкі) [*sin.* regn]

kšorim *pl.* →kešer *m* [*s.* (ים-)קשר] вузел, якім завязваюць скураныя раменьчыкі філяктэрыяў; *fig.* зьвязка, сувязь

ktanej-emúne *pl.* [*s.* קטני־אמ(ו)נה] людзі, якія ня маюць спадзяваньня на бога; скептыкі, сумнявальнікі [*sin.* skeptikers]

ktanim *pl.* →kotn *m* [*s.* (ים-)קטן] малалетак, які яшчэ не нясе юрыдычнай адказнасьці

ktojres *f/pl.* [*s.* קט(ו)רת] ладан; разьдзел Мішны [*sin.* vajrex; pitim-haktojres]

• gebn* šmekn ktojres даць панюхаць ладану

• in di ktojres iz do xelbne ojx *šprxv.* і ладан сьмярдзіць (у балоце не бяз чорта, а ў роду не без выроду)

ku *f*, *pl.* ki, *dim.* **kíele** *n*, -x [*d.* Kuh] карова; **kú-štal** *f*, -n хлеў

• a ku iz geflojgn ibern dax un gelejgt an ej (a ku iz ibern dax geflojgn, un hot an ej farlojrn, un hot dem švanc cebroxt) *glxv.* карова пераляцела цераз дах і зьнесла яйка (і хвост зламала) (усякае бывае: жук мычыць, а карова лятае)

• a tojte ku git kejn milx *šprxv.* здохлая карова малака не дае

• af ejn ojg nor iz di ku blind *glxv.* толькі на адно вока карова сьляпая (так кажуць, маючы намер зьменшыць недахоп)

• rebe, di ku iz ajer! рэбэ, гэта карова ваша! (з анэкдоту пра рэбэ, які забараняў у суботу выцягваць карову зь ямы, пакуль не даведаўся, што карова ягоная ўласная)

• šlepn di ku afn bojdem цягнуць карову на вышкі (ставіць калёсы паперадзе каня)

kub *m*, -n [*d.* Kubus] куб; **kúbartiker** кубападобны; **kúbišer** кубічны; **kubik** *m*, -es кубік

kúbebe=kebebe *f* [*fr.* cubébe] *bot.* кубэба

• kubebe mit lakrec/kačkemilx/indik-zomen хрэн зь перцам (нясмачная страва); лухта непадсяваная (журавель на хвойцы, мох і балота, смаляны/смаловы/смольны дуб)

kubek/kubik *m*, -es [*p.* kubek] кубак, чарка

kub(e)l=kibl *m*, -en [*mhd.* kübel] кубел(ец), кубялок, кадзь, кадушка; памыйнае вядро

kublik *m*, -es [*v.*] кублык (від жаночай прычоскі)

kubuc *m*, -n [*s.* (ן-)קובוץ →melupn, šurek, nekude] дыякрытычны знак (ֻ), які ў гэбрэйскіх тэкстах азначае галосную літару "u" (ставіцца ўьнізе зычнай літары, пасьля якой павінна гучаць гэтая галосная)

kuce *f*, -s [*r./ukr.* куча?] *vulg.* куча (гаўна)

kuce *f*, -s [*r.* куцый, *ukr.* куций?] (куцы) хвост

kúcenju-múcenju *n* [*v.* куцаць?] сюсюканьне
• zajn* kucenju-mucenju (mit) сюсюкаць, міндальнічаць
kuce(r) [*r.* куцый, *ukr.* куций] куртаты; **kucelape(r)** каротканогі; **kucepíndrik** *m*, -es карантыш(ка), недамерак, курдупель
kuce-/kojce-šeljúd *m* [*s.* קוצו־של־יוד] "верхні кончык літары юд ["]"; *fig.* дробязь, драбяза, драбніца, ёта
kucevejke/kucefajke=kacavejke/kacevejke *f.* -s кацавейка
kucibabe *f* [*ukr.* куці-баба, *p.* kuciubabka] куца-баба (дзіцячая гульня, хованкі)
kucn [*altfr.* touz?] кашляць
kuče *f.* -s [*r./ukr.* куча] куча
kuče=kiče *f.* -s [*ukr.* куча] куча, кут (ніша ў печы для дроваў, чыгуноў альбо для свойскай птушкі)
kučeber *m* [?] лятарэя
kučeménт/kočuménт=kičeménт *m*, -n [?] турма, вязьніца, пасьценак
kučer *m.* -s [*r.* кучер, *d.* Kutscher] фурман, возьнік, вазак
kučer *m.* -n [*r./ukr.* кучери] кучары (валасы); **kučerave(r)** кучаравы
• [illegible] ton* mit di kučern страсануць кучары
kučeraben [?] цыраваць, рапараваць; халтурыць, рабіць абы-якорую руку
kučme *f.* -s [*r./ukr.* кучма, *p.* kuczma] кучма; футравая (баранковая) шапка
• di kalošn tu zix on – /s'gejt a šarfer vinter; /un di kučme nem ojx mit, /vej iz mir un vind mir! (I. M.) галёшы надзень – надыходзіць суровая зіма; і шапку таксама вазьмі, гора мне!
kudaxčen [*r.* кудахтать] кудахтаць
kudelnje *f.* -s [*ukr.* куделя, *p.* kądzel] кудзеля
kudle *f.* -s [*ukr.* кудли, *p.* kudły] кудла; **kudl(ev)ate(r)** кудлаты
• a kudlate hintl кудлаты сабачка
• štarendike kudles непаслухмяныя кудлы
kudše-b(e)rix-hú *m* [*s.* קודשא־בריך־הוא →hakodeš-borxu] "гэты сьвяты, хай ён будзе блаславёны"; бог [*sin.* got]
kuf=k *m/f.* -n [*s.* (ק-)קוף] 1. "куф", літара гэбрэйскага альфабэту; 2. лічба 100
kufajke *f.* -s [*ukr./v.*] куфайка, фуфайка
kufe *f.* -s, **kuflek/kuflik** *m*, -es [*d.* Kufe, *p.* kufa, kufelek] бочка, кубел, цэбар
kufer *m*, -s, **kufert** *m*, -n [*d.* Koffer, *mhd.* kuffer, *p.* kufer] куфар
• az in dem kufert ligt samet un zajd, ken men in trantes arojsgejn far lajt калі ў куфры ляжыць аксаміт і ядваб, можна выходзіць на людзі ў трантах
kufl *m*, -en, **kuflik** *m*, -es, **kuflje** *f*, -s [*mhd.* kuefel, *p.* kufel] куфель, кухаль
kuge *f.* -s [?] куча, груда, купа
kugl *m*, -en [*d.* Kugel] *kul.* кугаль, бабка (зь цёртай бульбы, локшынаў, гародніны, хлеба або з мукі й тлушчу), запяканка (можа быць салодкай альбо несалодкай); **kúgelnik** *m*, -es форма для выпечкі кугаля; **kúgl-top** *m* гаршчок для выпечкі кугаля
• maxn a gutn kugl fun epes зрабіць добры кугаль з чагосьці
• az a jidene ken kejn kugl nit maxn, kumt ir a get *šprxv.* калі жыдоўка ня можа сьпячы кугель, яе чакае развод
• az me est šabes kugl, iz men di gance vox zat *glxv.* калі паясі пірага ў суботу, цэлы тыдзень будзеш сыты
• der kugl gerot nox di gest *glxv.* пірог удаецца пасьля гасьцей
• der kugl ligt im af dem ponem *glxv.* кугель намаляваны ў яго на твары (жыд жыдам; а каб ты бачыў свой від, то думаў бы, што жыд)
• mit a jid(n) iz gut kugl cu esn, nor/ober nit fun/af ejn teler *glxv.* зь жыдам добра бабку есьці, толькі не з аднае талеркі
• morgn/šabes noxn (kaltn) kugl *glxv.* заўтра (у суботу) пасьля (халоднага) кугаля (калі не цяпер, дык у чацьвер; пасьля дожджыку ў чацьвер і ў сьвятую пятніцу; заўтра аб гэтай парэ)
• šabes on a kugl iz vi a fojgl on fligl *glxv.* субота бяз кугалю як птушка бяз крылаў
• – Ven du volst geven der bojre-ojlem, /vos volstu gemaxt? /– X'volt gemaxt un gemaxt. /– Er volt gemaxt un gemaxt, un gemaxt... /– X'volt gemaxt a kugl, /er zol in ojvn nit arajn. /– Dos volt er gemaxt. /– Apikorsim un misnagdim /volt ix krenk gegebn, /nor di xsidimlex. *flksl.* – Калі б ты быў богам, што б ты зрабіў? – Я б зрабіў і зрабіў. – Ён бы зрабіў і зрабіў, і зрабіў... – Я б зрабіў кугаль, каб ён у печ ня ўлез. – Вось што б ён зрабіў. – Бязбожнікам і міснагедам трасцу я б даў пакаштаваць, толькі хасыдам.
• ver es est fil kugl, muz trinken fil branfn *glxv.* хто есьць многа кугеля, мусіць піць многа гарэлкі
• ver es est lang kugl, der lebt lang *glxv.* хто доўга есьць кугель, той доўга жыве
kukavke *f*, -s, **kukuvejke** *f*, -s, **kukú** *f*, **kukúk** *m* [*p.* kukawka, *d.* Kuckuck] *zool.* кукаўка, зязюля; **kukú** ку-ку
• s'šrajt a kukavke зязюля кукуе
kukeriki/kukeriku/kukareku [*d.* kikeriki, *p.* kukuryku, *ukr.* кукурику] кукарэку; **kukeriken** кукарэкаць
• – Ix bin geforn kejn cvej. /– Farvos nit draj? /– X'hob gekojft a hon. /– Vos maxt der hon? /– Kukeriku. – maxt der hon. *flksl.* – Я паехаў у другое. – Чаму ня ў трэцяе? – Я купіў пеўня. – Як кажа певень? – Кукарэку. – кажа певень.
• ojx mir a balebos in dorf! – "ni be ni me, ni kukareku!" *glxv.* на табе, вясковы гаспадар! – "ні бэ ні мэ, ні кукарэку!" (ні бэ ні мя, ні божае імя; ні цэ ні бэ)
kukíl=kokúl *m* [*ukr.* кукіль, *p.* kąkol] *bot.* куколь
kukl *m*, -en, *dim.* **kíkele** *n*, -x [*d.* Kugel?] круглы хлеб
kukle *f*, -s [*r.* кукла] лялька
kukn (af) [*d.* gucken] глядзець, па-, на|зіраць; **kuk** *m*, -n, *dim.* **kúkele** *n*, -x погляд, позірк; **a kuk ton*/xapn/gebn*** (af) зірнуць, глянуць; **kuker** *m*, -s глядач; **kúkerl** *n*, -ex вочка ў дзьвярох; **kukers** *pl.* ахоўныя акуляры; *hum.* вочы, лупы; **kúkndik** *adv.* гледзячы; **kúkvinkl** *m/n*, -en пункт гледжаньня; **kuke de loxe** *f hum.* стробаскоп
• a fincterniš cu kukn! страх глянуць!
• afn erštn kuk на першы погляд
• er kukt af im vi a hunt af a rebn ён глядзіць на яго як сабака на рэбэ
• gib nor a kuk! кінь толькі погляд! толькі падзівіся/зірні /глянь!
• kukn af di hent/finger глядзець на рукі/пальцы (жыць з рукі)
• kukn af jenem vi af a bern глядзець на кагосьці як на мядзьведзя
• kukn dem tojt/tajvl in di ojgn глядзець сьмерці/д'яблу ў вочы

• kukn (glajx) in di ojgn глядзець (прама) у вочы
• kukn in der velt загледзецца
• kukn in špigl глядзецца ў люстэрка
• kukn krum (mit a krum ojg) глядзець скоса/скрыва
• kukn mit cen/zibn ojgn глядзець ва ўсе вочы
• kukn mit tojznt ojgn уважліва пільнаваць
• kukn, vuhin der vint blozt трымаць нос па ветры
• m'ken štarbn kukndik можна памерці гледзячы
• mitn kuk maxt es dos (vert dos ba im) ён гэта робіць адным поглядам
• nit gekukt/kukndik (af/deruf) нягледзячы, не зважаючы (на)
• nit kukn in jenems vinkl/zajt не глядзець у чыйсьці бок
• onšteln a por kukers вытрашчыць/вылупіць вочы
• kukn un hern un švajgn! *glxv.* бачыць, чуць і маўчаць!
• kukt men far zix iz šlext, kukt men hinter zix iz nox erger *šprxv.* глядзець перад сабой – кепска, глядзець за сабой – яшчэ горш

kukuruze=kakeruze *f*, -s [*rum.* cucuruz] кукуруза; **kukurúzener** кукурузны

kul *m*, -es, **kulje** *f*, -s [*r./ukr.* куль, *p.* kul] куль, вязанка (саломы, сена)
• a kul štroj куль саломы

kulák *m*, -es [*r.* кулак] кулак, куркуль; **kulákišer** кулацкі

kulbe *f*, -s [?] парт(а)манэт, кашэль, пулярэс

kule *f*, -s [*s.* (קולא-)ות] "аблягчэньне, палягчэньне"; спрошчаная інтэрпрэтацыя закону [*sin.* fargringerung; *ant.* xumre]

kule [*s.* כולה/כולו →kol] *adv.* зусім, цалкам, суздром, усьцяж, суцэльна, абсалютна [*sin.* in gancn, durxojs, absolut]
• kule švarc цалкам чорна

kule haj [*s.* כולי האי] гэта ўсё; гэтак (шмат)? [*sin.* dos alc; azoj fil? take?]

kule mukše [*s.* כולו מוקשה] цалкам загартавана, замацавана, моцна [*sin.* in gancn gehartevet, geštolt, fest]

kule revex [*s.* כולו רווח] чысты заробак, бясстратна, бязгубна [*sin.* blojz fardinst]

kule Tojre [*s.* כולה תורה] цалкам уся Тора

kule xajev [*s.* כולו חייב] цалкам павінна, наскрозь грахоўна [*sin.* in gancn šildik, durxojs zindik]
• S'iz a dor fun kule-xajev, zajt nit kejn naronim, – /un fun zindikn Mešiex gixer kumen vet! /Ax, du tatele in himl, s'betn bnej raxmonim: /ze, Mešiex zol nit kumen a bisele cu špet... (Š. K.) Гэта пакаленьне ў адказе за ўсё, ня будзьце дурнямі – але з-за грэшнікаў мэсія прыйдзе хутчэй! Ах, ты татачка ў небе, рахманыя дзеці просяць цябе: глядзі, каб мэсія трошкі не спазьніўся...

kule zake [*s.* כולו זכאי] цалкам правільна, цалкам добра [*sin.* in gancn gerext/gut]

kulebjake *f*, -s [*r.* кулебяка, *p.* kuliebjak] *kul.* кулябяка (пірог зь мясам або з рыбай)

kulek/kulák/kulik *m*, -es [*r./ukr.* кулак, *p.* kułak] кулак; **kúlikl** *n*, -ex рукавіца
• far a klugn iz genug a vunk, far a nar – a kulek разумны разумее кіў, дурань – кулак (добры й слова паслухае, а ліхі й кія не; ня слухаеш ківа, паслухаеш кія)
• a kind vert gebojrn mit kulikes, un a man štarbt mit ofene hent дзіцё нараджаецца са сьціснутымі кулачкамі (з коркамі, з куксамі), чалавек памірае з адкрытымі рукамі

kulem [*s.* כולם] усе (яны) [*sin.* (zej) ale]

Kulikóv г. Кулікоў (мястэчка каля Львова)
• kulikover mišpet кулікоўскі суд (фрашка: шавец учыніў злачынства, і суд прысудзіў, каб яго павесіць; але шавец быў у мястэчку адзін, а краўцоў два; кагал вырашыў, што будзе лепей, калі павесяць краўца) (каваль зграшыў, а сьлесара павесілі; шавец сукно ўкраў, ■ краўца выбілі)

kulinarer [*p.* kulinarny] кулінарны

kuliš=kolíš *m*, -n [*ukr.* кулиш] *kul.* кулеш, поліўка, рэдкая крупяная альбо бульбяная каша

kulje *f*, -s [*p.* kula, *lit.* kule] куля, мыліца, кульця, кульба, хадула; **kuljen** кульгаць; **kuljave(r)** кульгавы
• gejn* af kuljes хадзіць з кульбай (на мыліцах)
• Ba majn rebn fun Petuć, /reb Zilmele Gedaljes, /kumt a jidl nebex krum /af cvej grojse kuljes. /– Varf avek di kuljes! – /bafojlt der rebe /un gloct ojs mit di ojgn. /Un vi der jid hot im gefolgt, /hot er zix ojsgecojgn. /Čiri-bim, čiri-bom... *flksl.* Да майго рэбэ зь Петуча, рэб Зілмэлэ Гедальеса, прыйшоў жыд кульгавы на мыліцах. – Выкінь свае мыліцы! – загадаў рэбэ й вылупіў вочы. Прыйшлося калеку выцягнуцца на зямлі, паслухаўшы рэбэ. Чыры-бім, чыры-бом...
• ix cu dir af simxes, du cu mir af kuljes! *kll.* каб ■ хадзіў да цябе на сьвяты, а ты да мяне на мыліцах!
• zolst gejn af gumene kuljes! (gejn zolstu af kuljes!) *kll.* каб ты хадзіў на (гумовых) кульцях!

kuljen [*p.* kulić] куляць

kulke *f*, -s [*mhd.* kule, *p.* kula, *ukr.* куля] куля, шар, гала

kulne *f*, -s [?] пят(к)а

kult *m*, -n [*d.* Kult] культ

kúlteve *f*, -s [*r.* культя?] пранік (для бялізны)
• az me šlogt di vajb mit a kulteve, vert derfun di gret nit vajs калі біць жонку пранікам, ад гэтага бялізна белай ня стане

kultúr *f*, -n [*d.* Kultur] культура; **kultureler** [*d.* kulturell] культурны; **kultureikajt** *f* культурнасьць

kum *m*, -es [*r./ukr.* кум, *p.* kum] кум; **kume** *f*, -s кума

kumáč *m* [*r./ukr.* кумач] кумач

kumen* [*d.* kommen] 1. (iz gekumen) прыйсьці, прыходзіць; 2. (gekumt) належаць; завінаваціцца, завінавачвацца, быць вінаватым (аб грашох); быць абавязаным/удзячным; 3. *n* прыход, прыбыцьцё, прыбываньне, прыйсьце; прыезд; **kúme(n)diker** будучы, надыходзячы, наступны; **kúme(n)dikajt** *f* будучыня, будучае, прышласьць
• far vos kumt es mir? за што гэта мне?
• ix kum dir a dank я ўдзячны табе
• kumedike cajt *gram.* будучы час
• kumen* afn zinen/gedank (in kop arajn) прыйсьці на думку
• kumen* cu aza nideriker madrejge (vi) апусьціцца да апошняй ступені
• kumen* cu gejn, cu forn, cu flien, cu jogn, cu lojfn, cu rajtn, cu špringen прыйсьці, прыходзіць; прыехаць, прыяжджаць; прыляцець, прылятаць; прымчацца, прыскакаць (на кані); прыбегчы, прыбягаць; прыскакаць
• kumen* cu gelt разбагацець
• kumen* cu rejd размова зайшла (аб)
• kumen* cu zix прыйсьці ў сябе, ачуняць
• s'kumt mir fun im hundert rubl ён павінны мне сто рублёў

• az m'kumt cum lebn, darf men štarbn *šprxv.* як толькі ўзьбіўся на жыцьцё, памірaць трэба
• ven es kumt nor cu gelt, kumt cu a krigeraj як толькі справа даходзіць да грошай, адразу лаянка

kumer *m* [*d.* Kümmernis] смутак, журба, маркота, засмучэньне
kúmisbrojt=kómišbrojt *n* салдацкі сухар
kunc *f*, -n, **kúncštik** *n* [*d.* Kunst] фокус, выкрут, выкрутас, штукі, хітрыкі; **kúnciker** умелы, мастацкі, ёмкі, спрытны, вынаходлівы; **kúncikajt** *f* умельства, мастацкасьць, вынаходлівасьць; **kuncn** *pl.* штучкі, капрызы; **kúncn(-)maxer** *m*, -s, (-n *f*, -s) фокусьнік, акрабат, штукар; **kuncn-maxeráj** *f/n* фокусьнічаньне, штукарства
• (ba)vajzn*/maxn kuncn выкідваць фокусы
• maxn dem kunc *fig.* выкінуць штуку (памерці)
• ot nur a kunc! *iron.* таксама мне фокус!
• on kuncn! бяз фокусаў!
• s'iz a klejne kunc (s'iz kejn kunc nit) няхітрая справа, нескладна
• a kunc iz cu kojfn sxojre un cu hobn kinder – nox a gresere kunc iz sxojre cu farkojfn un kinder megadl cu zajn *šprxv.* вялікая штука – купляць тавар і мець дзеці, але яшчэ большая – прадаць тавар і выгадаваць дзеці
• got iz an alter kuncmaxer *šprxv.* бог – стары штукар (бог зь людзьмі робіць ігрыска: аднаго ўгору, другога ніжка; і бог ашуканствам жыве: у аднаго адбярэ, другому дае)

kund *m*, -n, (-n *f*, -s) [*d.* Kunde] кліент, пакупнік; **kúndšaft** *f*, -n кліентура
• štendike kundšaft сталая/пастаянная кліентура
• kejn besere kundn zolstu nit hobn! *kll.* каб ты лепшых пакупнікоў ня меў!

kundes *m*, *pl.* kundejsim [*s.* (קונדס(-ים] гарэза, свавольнік, шыбеньнік, шалапут, балаўнік, дурасьлівец, шаляніца; жартаўнік, жартоўнік [*sin.* frejlex jingl, štifer; vicler, śpaser]; **kundejske(r)** гарэзьлівы, дурасьлівы, жартаўлівы; **kundéjseven** свавольнічаць, дурэць, шалапутнічаць, пракудзіць, гарэзаваць, гарэзьнічаць; **kundejseráj** *f/n*, -en гарэзьлівасьць, свавольства, непаслухмянасьць, балаўство, дурыкі
• ■ farśajter kundes гарэзьлівы хлапец
• firn zix vi a kundes весьці сябе як шалапут

kune-/kuni-léml *m*, -(e)s [?] дурань, дурніца, разява(ка)
kunkl-múnkl *m* [*d.* Kunkel?] выбрык, штука
• maxn kunkl-munkl рабіць выбрыкі

kunst *f*, -n [*d.* Kunst] мастацтва; **kúnstverk** *n* мастацкі твор; **kúnstmist** *n* штучнае ўгнаеньне; **kúnstzajd** *f/n* штучны шоўк; **kúnstzajdener** шаўковы

kuntres *m*, *pl.* kuntrejsim [*s.* (קונטרס(-ים] аркуш паперы з нататкамі, сшытак, брашура, тлумачэньне, камэнтар [*sin.* bejgn mit farcejxenungen, heftl, brošur, pejreś, komentar]

kupe *f*, -s, *dim.* **kupke** *f*, -s, **kúpkele** *n*, -x [*r./ukr.* купа, *p.* kupa] купа, куча, груда; **kúpesvajz** *adv.* купамі, грудамі
• a kupe štejner куча каменьня, крушня
• lign* kupesvajz ляжаць грудамі
• klejne kinder kakn klejne kupkelex *gxv.* малыя дзеці какаюць маленькімі купкамі
• nox der xupe lejgt men xosn-kale af ejn kupe (noent cu der dupe) *glxv.* пасьля вянчаньня маладых кладуць на адну купу (блізка да дупы)

kuper *n* [*d.* Kupfer] медзь; **kúperner** медны, мядзяны; **kúperarc** *n* медная руда; **kúperšmid** *m*, -n катляр, масёнжнік; **kúperštox** *m*, -n гравюра на медзі; **kúpervarg** *n* медзяныя рэчы; **kúper-vitriol** *m*, **kúper(-)vaser** *f/n xem.* мядзяны вітрыёл, купарвас

kuperte=koperte *f*, -s [*p.* koperta] 1. вечка гадзіньніка; 2. капэрта

kupe-šel-šrócim *f* [*s.* קופה־של־שרצים] "скрынка з чарвякамі"; несумленнае мінулае; брыдкі ўчынак, які нельга забыць [*sin.* puśke mit verem]

kup(j)éc *m*, -pces [*r.* купец] купец

kupke=kubke=kopke *f*, -s [*p.* kubka] чапец, каптур, хуст(к)а (жаночы галаўны ўбор, які насілі ў Польшчы)

kuplung *f*, -en [*d.* Kupplung] *texn.* счапленьне, злучэньне, сьціск(аньне)

kuráj *m* [*r.* край] *bot.* перакаці-поле

• a lebn af/cu/in dir/ajx! zol(st) (zolt ir) lebn! lang lébn zolstu (zolt ir)! каб ты здаровы быў! будзь здароў! будзьце здаровы! (каб ты жыў-быў да здароў! добрага здароўя (на доўгія гады)!)
• a lebn af dajn kepele! здароўя на тваю галоўку!
• af šejnem iz gut cu kukn, mit a klugn iz gut cu lebn *šprxv.* на прыгожага глядзець хораша, а з разумным добра жыць (краса прыглядзіцца, а розум прыгадзіцца; краса да вянца, а розум да канца)
• az es kumt cum lebn, darf men štarbn (stajen nit kejn jorn) *šprxv.* калі прыйшло сапраўднае жыцьцё, трэба паміраць (пакуль тыя барышы, у бацькоў ня будзе й душы; пакуль сонца ўзыдзе, раса вочы выесьць)
• az mir veln lebn, veln mir zen *glxv.* будзем жыць – пабачым
• az m'lebt, hot men hofenung cu štarbn *šprxv.* хто жыве, той мае спадзяваньне памерці
• beser a lebediker hunt, ejder ■ tojter lejb *šprxv.* лепей жывы сабака, чымся здохлы леў
• dem menčns lebn iz vi a jarid *šprxv.* чалавечае жыцьцё як кірмаш
• dos lebediks/lebedike lejgt men nit afn tojtn *šprxv.* жывое на мёртвае не кладуць
• ejn mol lebt men *glxv.* адзін раз жывем
• ejner vil lebn un ken nit, der anderer ken - un vil nit *glxv.* адзін хоча жыць, але ня можа, другі можа – але ня хоча
• me darf lebn un lozn lebn трэба жыць і даваць жыць
• me volt gekent lebn, nor di kinder un ejniklex lozn nit *glxv.* можна было б жыць, але дзеці і ўнукі не дазваляюць
• mir zoln lebn in naxes un frejd! каб мы жылі ў шчасьці і ў радасьці!
• vi m'hot, azoj lebt men *šprxv.* хто як мае, той так і жыве
• Vos štejstu lebn majn fencter, /Avremele melamed? /Du bist ba mir der šenster, /Avremele melamed. *flksl.* Што

ты стаіш каля майго вакна, Аўрэмэлэ-настаўнік? Ты ў мяне самы прыгожы, Аўрэмэлэ-настаўнік.
• zol ix (íx zol) azój lebn! каб я гэтак жыў! (слова гонару)
• zolstu azoj veln lebn! каб ты так жыў!
-leb(n) (zol lebn) [*d.* leben] любы, любая, дарагі, даражэнькі
• brúder-lebn! братка даражэнькі!
• máme-lebn! любая маці!
• majn zis-lebn! мой любы-салодкі!
• táte-leb(n)! любы тата!
• Lebn gospital štejt a bejmele, /dos bejmele iz in drajen ajngebojgn... /Oj, dortn gejt zix majn tajer zis-lebn /mit ire cvej farvejnte ojgn. *flksl.* Каля шпіталя стаіць дрэўца, дрэўца зусім нахілілася... Ой, там ходзіць сабе мая дарагая, мая любая з заплаканымі вачыма.
lebn (dem) [*d.* neben] *prep.* (ка)ля, пры, паблізу
• lebn mir каля мяне
• lebn der štub каля хаты
lebries-noójlem [*s.* לבריאת־העולם →bries-] *adv.* паводле стварэньня сусьвету
lecim, *pl.* lejcim/leconim [*s.* לץ(-ים/-ננים) →haloce, locn, oplecevn] жартаўнік, блазен, штукар, выскаляка, насьмешнік, перасьмешнік, фігляр; *folk.* чорт-штукар, які кпіць зь людзей [*sin.* opšpeter, oplaxer; vicler]; **le(j)cones** *n* [*s.* ל(י)צנות] насьмешка, кпіны, жарт, іронія, шкелі, жартаслоўе [*sin.* oplaxeraj, xojzek, špas, vicleraj]; **léc(eve)n** (fun) жартаваць, блазнаваць, кпіць, шкеліць [*sin.* špotn, oplaxn, opton špiclex, špasn]; **le(j)cónesdiker** жартаўлівы, гарэзьлівы; схільны да зьдзеку, да кпінаў; **lecone-hadór** *pl.* [*s.* לצני־הדור] жартаўнікі, людзі з іранічным розумам
• on lecones бяз жартаў
• trajbn* lecones (mit) (maxn leciše štik) жартаваць, блазнаваць, кпіць, шкеліць, крыўляцца, выскаляцца, балбатаць
• ober lecones in a zajt (Š.-A.) але жарты ўбок
lecter [*d.* letzt] 1. апошні; 2. *m* агіднік, нягоднік, басалай, паганец; **lect** 1. *adv.* канчаткова, надзвычайна, надзвычай; 2. *f* канец, заканчэньне; **lectns** *adv.* у апошні час, урэшце, нарэшце; **léctgiltiker** заключны; **lectling** *m*, -en пасьледак, пасьледыш; **léc(t)gelt** *n* грошы на разьвітаньне
• af der (guter) lect на (добрае) заканчэньне
• bizn lectn otem да самай сьмерці, да апошняга дыханьня
• cum lectn (kumt) dos beste *glxv.* рэшткі заўсёды салодкія /смачныя
• der lecter, max di tir cu (der lecter maxt di tir cu) *glxv.* апошні, зачыняй дзьверы
• dem lectn bajsn di hint *šprxv.* апошняга кусаюць сабакі (хто позна ходзіць, сам сабе шкодзіць)
• di lecte kiele git milx *glxv.* апошняя кароўка дае малако (апошнія грошы – шчасьлівыя)
lečken [?] асьцярожна абыходзіцца, цацкацца
ledašče *m/f*, -s [*ukr.* ледащо, *p.* ladaco] ляда(ш)чы; лайдак, гультай
lédele *n*, -x, **ledndl** *n*, -ex [*d.* Augenlid, *mhd.* lidelin →lodn] павека; **ledl** *n*, -ex замок (фотаапарата)
leder *f/n* [*d.* Leder] скура; **léderner** скураны; **lédervarg** *n* скураныя вырабы
• švediš leder замш(а)
ledojres [*s.* לדורות →xad-bedore, (ben-)dor], **ledór-dójres** [*s.* לדור־דורות] *adv.* навекі вякоў, для будучых пакаленьняў
ledugme [*s.* לדוגמא] *adv.* напрыклад, прыкладам, да прыкладу, на ўзор [*sin.* cum bajšpil, vi a muster]
lédvice=ljédvice *f*, -s [*p.* polędwica, lędźwie] паляндвіца
leejne-hašémeš [*s.* לעיני־השמש] *adv.* сярод белага дня, адкрыта [*sin.* in mitn heln tog, efntlex]
leéjs-zíkne [*s.* לעת־זיקנה →zikne, zokn] на старасьці гадоў [*sin.* af der elter]
leejver-hajám [*s.* לעבר־הים] *adv.* у кірунку да краіны, якая на тым баку мора
leerex [*s.* לערך →(lefi-)erex, beerex] *adv.* прыблізна, каля, больш-менш; прапарцыянальна [*sin.* mer-vejniker, arum, baj; proporcionel]; **leérexdiker** прыблізны
lefc *f*, -n [*mhd.* lëfs] *anat./geogr.* губа; **lefcn** *pl. anat.* вусны; **lefcung** *f*, -en сутокі, вусьце
lefi [*s.* לפי] *adv.* паводле, пасьля, па, за, усьлед, сьледам [*sin.* lojt, nox, vedlik]
lefidati [*s.* לפי־דעתי] *adv.* паводле майго меркаваньня
lefi-érex [*s.* לפי־ערך →(le)erex, beerex] *adv.* прыблізна, каля, больш-менш, груба кажучы; адносна, прапарцыянальна [*sin.* arum, mer-vejniker; relativ, proporcionel]; **lefiérexdiker** прыблізны, адносны, грубы
lefi-májsev [*s.* לפי־מעשיו →majse] *adv.* паводле ягоных паводзінаў, па ягоных заслугах
• dos eršte vajb iz bašert fun himl, dos cvejte – lefi-majsev *šprxv.* першая жонка ад бога, другая – што заслужыў
lefišó [*s.* לפי־שעה] *adv.* пакуль (што), тым часам, часова [*sin.* af dervajl, cajtvajlik]; **lefi-šóediker** часовы [*sin.* dervajliker, provizorišer]
lefi-túme [*s.* לפי־תומו] *adv.* невіноўна, нявінна, бяз задняй думкі, наіўна, бясхітра, прастадушна [*sin.* umšuldikerhejt]
lefizé [*s.* לפי־זה] *adv.* паводле гэтага
lefl *m*, *dim.* **léfele** *n*, -x [*d.* Löffel] лыжка; **léfldiker** лыжкападобны
• iber a lefl вельмі густы (пра суп/кашу)
• s'nogt/s'cit untern/bam lefele точыць/смокча пад лыжачкай
• der mazldiker vert gebojrn mit a gildenem lefl in mojl *šprxv.* шчасьлівец родзіцца з залатой лыжкай у роце (нарадзіцца ў сарочцы)
• hot men es nit šefldik, hot men es lefldik *glxv.* не ра́жкамі, але лыжкамі
• ver es iz bam šisl, jener iz bam lefl *glxv.* хто каля міскі, той з лыжкай
lefoxes [*s.* לפחות] *adv.* прынамсі
léftov=lévtov *m* [*s.* לב־טוב] чалавек з добрым сэрцам; назоў павучальнай кнігі [*sin.* gutharciker menč]
lefuke [*s.* לאפוקי] *adv.* хіба (толькі), акрамя, апрача, зь іншага боку [*sin.* sajdn, ojser, in kegntejl]
legabe [*s.* לגבי] *adv.* у адносінах да; параўнальна, у параўнаньні з [*sin.* in baciung cu; in farglajx mit]
legamre [*s.* לגמרי] *adv.* зусім, цалкам, абсалютна (звычайна ў нэгатыўным сэнсе) [*sin.* fulštendik]
• x'ken im legamre nit я яго зусім ня ведаю
Legbójmer=Lag-b(e)ójmer *m* [*s.* ל"ג־בעומר] Лаг-Баомэр (гэбрэйскае сьвята 18-га іяра ў памяць аб паўстаньні Бар-Кохбы супраць рымлянаў)
légern=lágern (zix) [*mhd.* lëgeren] прылегчы, улегчыся, уладкавацца, уладкоўвацца; стаяць лягерам; **léger(-)/láger(-)gelt** *n*, -er эканомія; **léger-sxojre** *f* [*s.* סחורה] ляжалы тавар
• a mejdl iz vi a leger-sxojre *glxv.* дзяўчына – ляжалы тавар (векавуха)
legírn (legirt) [*d.* legieren] сплаўляць (мэтал); **legirung** *f*, -en сплаў

l(e)gote/l(e)hote=ligote *f*, -s ільгота

lehabe [*s.* להבא] *adv.* у будучым, (на)далей [*sin.* in der cukunft, vajter]

• af der lehabe на будучае

lehadám *abr.* **loj hoju dvorim meojlem** [*s.* להד"ם=לא היו דברים מעולם] такога яшчэ ніколі не было, лухта, бязглузьдзіца, вымудры, прыкла́ды, фальш, нішто [*sin.* ništ geštojgn ništ geflojgn, falš, gorništ]

leháj=(e)lehéj/(e)leháj/eliháj [*d.* als hätte, als wäre, *s.* (להי(י?)] *bndv.* бы, нібы(та), быццам, мэрам, маўляў, моў, хай будзе, дапусьцім, напрыклад

lehareg-uleábed (af) [*s.* להר(ו)ג־ולאבד →horeg] "(гатовы) забіць і зьвесьці"; вельмі раззлаваны, разгневаны

lehašmid-uleháreg [*s.* להשמיד־ולהרוג] "(гатовы) зьнішчыць і забіць"; вельмі раззлаваны, разгневаны

lehávdl [*s.* להבדיל →havdole, hevdl, hamavdil] *int.* каб адрозьні(ва)ць, непараўнальна, нельга параўнаць, ня йдзе ні ў якае параўнаньне, каб ня ўзгадваць побач; **lehávdl elef (alfej) havdoles** [*s.* אלף (אלפי) הבדלות] які мае тысячу (тысячаў) адрозьненьняў

• hejsn hejs ix Josl-Ber, /un ix din a militer – /oj-ra-ra, oj-ra, oj-ra, /štivl trog ix, a mundir, /lehavdl vi an oficir, /oj-ra-ra, oj-ra, oj-ra (I. M.) я завуся Ёсель-Бэр, служу ў войску – ой-ра-ра, я нашу боты, мундзір, пардон за параўнаньне, як афіцэр, ой-ра-ра...

• mit di ejgene cigl kon men šteln a šul un a klojster, lehavdl (Prc.) з аднае й тае ж цэглы можна пабудаваць і сынагогу й царкву, каб ня ўзгадваць побач

• šprixvort (a gojiš glajxvertl) iz lehavdl a Tojre *glxv.* (мужыцкая) прыказка/прымаўка – ня Тора

le(h)axes [*s.* להכעיס →mumer-lehaxes] 1. *adv.* насупрэкі, насуперак(і), наўмысьне, сумысьля, наўмысьля, на злосьць, на ліха; (каб) пакрыўдзіць, раззлаваць [*sin.* cu dercerenen, cu fardrisn]; 2. *m*, -n злапамятнасьць, незычлівасьць, злосьніцтва, зласьлівасьць; **leháxesdiker** злапамятны, незычлівы, злосьніцкі, зласьлівы; **leháxesnik** *m*, -es, (-nice *f*, -s) насупрэчнік; **af cu lehaxes=af celoxes/culoxes=afculoxes/afceloxes** *adv.* каб пакрыўдзіць, каб раззлаваць; з мэтай уразіць, стругануць (кагосьці); на злосьць; нягледзячы на

• mir kadoxes, abi im lehaxes! *glxv.* мне трасца ў бок, абы яму на злосьць

• Ver s'iz nit geven, /ver s'hot nit gezen /tajere Malkele, /vejst nit, vos s'iz šejn, /vejst nit, vos s'iz xejn, /tajere Malkele – /Pejsex noxn sejder /in jomtevdik klejder, /tajere Malkele, /sonim af lehaxes, /ver hot aza naxes? /Tajere Malkele. (N. Š.) Хто ня бачыў, хто ня ведае Малкелэ – дарагая Малкелэ, хто ня ведае, якая яна прыгожая, хто ня ведае, якая яна прывабнаядарагая Малкелэ – на Пэйсах пасьля бяседы ў сьвяточнай сукенцы, дарагая Малкелэ, на злосьць ворагам, хто мае такое шчасьце? Дарагая Малкелэ.

lehejpex (cu) [*s.* לה(י)פ(ו)ך] *adv.* насуперак, напоперак, насупор, насупраць, наадварот [*sin.* farkert, umgekert, in kegntejl]

• lehejpex cu emecn насуперак камусьці

lehove *f* [*s.* להבה] полымя

leibed [*s.* לאיבוד →ibed] *adv.* дарма, дарэмна, марна, без карысьці

• gejn* leibed пайсьці прахам (марная праца), дарэмна траціцца, марна прападаць

leinjonejnu [*s.* לענינו] *adv.* да нашай рэчы [*sin.* cu undzer zax]

-lej [*d.* lei] *suf.* надае прыметнікам і прыслоўям значэньне множнасьці й разнастайнасьці (таксама пры асновах займеньнікаў і колькасных лічэбнікаў)

• alerlejiker разнастайны, усялякі; ander(er)lej іншага/другога роду; cvejerlej дваяка; drajerlej траяка

lejb *m*, -n, (-ixe/-nte *f*, -s) [*d.* Löwe, *mhd.* lebe] леў; **léjbnmojl** *n bot.* званец; **léjbn-tejl** *m* ільвіная частка

• af a tojtn lejb špringen hozn *šprxv.* па мёртвым ільве скочуць зайцы (над пешым арлом і сарока з калом)

• az a lejb šloft, loz im šlofn *šprxv.* калі леў сьпіць, пакінь яго сьпячым

lejce *f*, -s, **lejc/lejč** *f*, -n [*p.* lejce] лейчына, лейца, повад

• etlexe mol a ci ton* mit di lejces некалькі разоў дзергануць лейцамі

• haltn*/oplozn* di lejces трымаць/адпусьціць лейцы

• der menč fort, un got halt di lejces *šprxv.* чалавек едзе, але бог трымае лейцы (чалавек так, а бог сяк; чалавек сяк, а бог інак; чалавек думае, а бог робіць; думаеш адно, а яно перавернецца на дно)

lejcim *pl.* →lec *m*, *pl.* leconim [*s.* (לצנים/ים-)לץ], **lejcn** *m*, *pl.* lejconim [*s.* (ים-)ליצן] жартаўнік, блазен, штукар, выскаляка, насьмешнік, перасьмешнік; **le(j)cones** *n* [*s.* ות-] насьмешка, кпіны, жарт, іронія, шкелі, жартаслоўе

• trajbn* lejcones (mit) кпіць, насьміхацца

• af lejcones у насьмешку

• zajn* a cilpunkt far lejcones быць мішэньню для кпінаў

lejd=lajd *f*, -n [*d.* Leid] мука, пакута, гора; **lejd ton*** (az, vos) шкадаваць

• tejln lejd(n) un frejd(n) (in lejdn un in frejdn) дзяліць гора і радасьць

• beser cu zen lejd, ejder cu hern frejd *glxv.* лепш (побач) бачыць гора, чымся (здалёк) чуць аб радасьці (аб дзецях) (чаго вочы ня бачаць, аб тым ня плачуць)

• fun fil redn kumt arojs lejdn *šprxv.* языку дай волю, завядзе ў няволю (язык у роце, як чорт у балоце; хто язык доўгі мае, таму дрэнна бывае; празь язык галаву сьцінаюць; языча, языча, сабе дабра ня зыча, які чорт цябе кліча?)

• Šlogt der zejger fir, oj, oj, oj, fir, oj, oj, oj, fir, /lign zol ix šojn mit di fis cu der tir... /Hot a gute naxt, hot a gute naxt, /cores majne, grojse lejdn /hobn mix aher gebraxt. *flksl.* Гадзіньнік б'е чатыры гадзіны, ой-ой-ой, ляжаць бы мне ўжо нагамі да дзьвярэй... Добрай ночы, добрай ночы, мае гора, мае вялікае гора мяне сюды прывяло.

lejder=lajder *adv.* на жаль

léjdiker [*d.* ledig] 1. пусты, парожні; 2. вольны, незаняты; **léjdikajt** *f* пустата; **léjdikerhéjt** паражняком, улегцы; **léjdik(-)gejer** *m*, -s, (-n/-ke *f*, -s) лотр, лодар, лайдак, гультай, пустапас, пустадомак, абібок, дзяньгуб; **lejdik(-)gejeráj** *f/n* гультайства, лодарнічаньне, пустадомства, бязьдзейнасьць; **léjdikgejn***, **(arúm)gejn* lejdik** быць бяз працы, гультаяваць, гультаіць, ленавацца, латраваць, брынды/байбы біць, лайдачыць, лодырнічаць; **léjdikštejn** *n* прастой

• lejdik un lejz вольны й незаняты

• mit lejdike hent з пустымі рукамі

• štejn* lejdik прастойваць

• a jid un a volf gejen nit arum lejdik *šprxv.* жыд і воўк бяз

справы не сланяюцца (ваўка ногі жывяць, гадуюць; старца кій корміць)
- az der mogn iz lejdik, iz der mojex ojx lejdik *glxv.* калі страўнік пусты, і ў галаве таксама пуста (галоднаму і ў галаву нічога не ідзе, галоднай курцы проса на думцы, галоднаму каню авёс сьніцца)
- in a lejdik fas ken di broxe nit arajn *glxv.* у пустую бочку блаславеньне ня можа ўвайсьці (як німа тавару, дык нічога і не заробіш)
- Texelex, texelex, zej rinen zix ojset, /di gribelex blajbn dox lejdik... /A dos mejdele, vos špilt a falše libe, /der šem farblajbt ir af ejbik. *flksl.* Рачулкі, рачулкі перасыхаюць, а рэчышчы застаюцца... Аб дзяўчыне, што гуляе ў фальшывае каханьне, застаецца слава назаўсёды.

Leje [*s.* לאה] *tnx.* Лея (першая жонка Якуба) (Б. 29:16)

léjenen [*it.* legere, *šp.* leer] 1. чытаць; 2. *n* чытанка з Талмуду, якую задаюць вучням; урок Талмуду; малітва; **a lejen ton*** (vegn) пачытаць; **léjener** *m*, -s, (-n *f*, -s) чытач; **léjeneršaft** *f*, -n пасада лектара; **léjnevdiker** чытэльны, дазбор.ливы; **léjen-cejxn** *m*, -s закладка ў кнізе; **léjen-cimer** *m*, -n, **léjenzal** *m*, -n чытальня, чытальная заля
- [illegible]rb/šver lejenen цяжкая чытанка
- [illegible]en notacjes, a kurs чытаць натацыі/курс
- lejenen vi a vaser(l) чытаць як ваду ліць (чытае як рэпу грызе/сячэ; чытаець як бобам сыпець)

lejeser-bitóxn [*s.* ליתר־בטחון] каб засьцерагчыся, на ўсялякі выпадак [*sin.* af jedn fal]

lejeser-tójkef [*s.* ליתר־תוקף] каб надаць моцы і дзейснасьці [*sin.* cucugebn kraft un giltikajt]

lejeser-xízek [*s.* ליתר־חיזוק] каб замацаваць [*sin.* kedej cu farštarkn, cu bafestikn]

lejfer *m*, -s [*d.* Lieferant?] пасыльны, пасланец

lejgn [*d.* legen] 1. класьці; 2. *n* складваньне, кладка; **lejgn zix** 1. лажыцца, класьціся; 2. несьціся (аб курах); **lejg** *m*, -es удар
- es lejgt zix nit afn sejxl не ўкладаецца ў галаве
- lejgn an ojg пакласьці вока
- lejgn axt зьвяртаць увагу
- lejgn klep атрымаць удар
- lejgn zix in der leng un in der brejt рабіць усё дзеля дасягненьня мэты (класьціся косткамі; распляскацца ў блін)
- lejgn zix šlofn лажыцца спаць

lejke=like *f*, -s, **lejek=liek** *m*, -es [*ukr.* лійка, *r.* лейка, *p.* lejek] лейка

léjkenen (az, in) [*d.* leugnen] абвергнуць, абвяргаць, адкінуць, адкідаць, адварачаць; пярэчыць, запярэчваць; зьняпраўдзіць, зьняпраўджваць; **léjkener** *m* нігіліст, чалавек, які ўсё абвяргае
- lejkenen štejn un bejn (štejn-un-béjn) [*d.* Stein un Bein schwören] цалкам адмовіцца, запірацца, не прызна(ва)цца
- ejbik nit lejkenen un kejn mol nit opgebn iz a sojxerišer klal (kejnmol nit lejkenen un kejnmol nit avekgebn) *glxv.* ніколі не пярэчыць, але ніколі і не саступаць – правіла гандляра

lejle-uléjle [*s.* לעילא־ולעילא] *adv.* узвышана, узьнята, узьнесена, вышэй і вышэй [*sin.* derhojbn, gor hojx, hexer un hexer]; **lejle-uléjlediker** выдатны, найлепшага гатунку, найлепшай якасьці [*sin.* ojsgecejxnt, fun der hexster kvalitet]

lejl-(ha)šimúrim *m* [*s.* ליל־(ה)שימורים →balajle, binlajle] ноч на Пэйсах, начная бяседа на Пэйсах [*sin.* Pejsex-naxt, sejder-naxt]

lejm *f/n* [*d.* Lehm] гліна; **léjmiker** гліністы; **léjmener** гліняны; **lejmen** паралізаваць, абмякнуць (пра рукі/нагі); **lejmer** *m*, -s тынкар; **léjm-erd** *f* гліназём; **léjmvarg** *n* фаянс
- lejmiker bodn гліністая глеба
- er hot lejmene hent ён мае нязграбныя рукі (няўклюда, ні да чога ня здатны; у няўмекі рукі калекі)

lejmer [*s.* לאמר →ojslejmern] *tnx.* "так сказаць, гэтак кажучы, да прыкладу" (часта *hum.*); **léjmern=lójmern** [*s.* לאמרן/לומרן] (вы)каз(в)аць, (вы)гаварыць, выгаворваць; чытаць мараль, натацыю; навучаць, сароміць [*sin.* (arojs)zogn; arajnzogn, musern]

lejster *m*, -s [*ukr.* лейстер, *p.* rejestr] лейстры, рэестар, сьпіс

lejšn [?] залаціць, пакрываць пазалотай; **lejšgold/lejžgold** *n* пазалота, сусальнае золата

lejter *m*, -s [*d.* Leiter] лесьвіца, драбіна
- az der rebe ken ton nisim, /hob ix alejn gezen, /er krixt aruf afn lejter /un falt arop a tejter (tojter)... *flksl.* як рэбэ можа рабіць цуды, я бачыў на ўласныя вочы, ён палез на драбіны й зваліўся мёртвы...
- az du gejst afn lejter, cejl di treplex *glxv.* калі ідзеш па сходках, лічы прыступкі
- di velt iz vi a lejter: arojf gejt ejner, arop dem cvejter *šprxv.* сьвет, як лесьвіца: адзін – угору, другі – долу (бог зь людзьмі робіць ігрыска: аднаго ўгору, другога нізка)
- mit a lejter afn himl aruf ken zix kejner nit bavorenen *šprxv.* драбіны на нябёсы нікому не гарантаваны (вузкая сьцежка да неба)

lejter *m*, -s [*d.* Leiter] кіраўнік; **lejtung** *f* кіраўніцтва; **léjt(-)artikl** *m*, -en [*d.* Leitartikel] уступны артыкул, перадавіца

lejtn [*d.* löten] 1. *texn.* літаваць, паяць; 2. *n* літаваньне, пайка; **lejtexc** *n* прылітовак, прыпой

lejvi *m*, *pl.* leviim [*s.* ל(ו)וי(-ים)] *tnx.* лявіт (малодшы сьвятар у Ерусалімскім Храме альбо ягоны нашчадак; азначэньне для гэбрэя, які ня "koj(h)en" і не "jisroel"); **Lejvi** *tnx.* Левій (адзін з дванаццаці сыноў Якуба); назоў роду, які пайшоў ад Левія

lejxe *f*, -s, **lejxec/lejxes** *n* [*s.* ל(י)חה(-ות)] сьлізь, склізь, макрота, флегма, харкавіньне [*sin.* šlajm]

lejz *m*, -n [?] *kort.* біт(к)а

lejz *f*, -n [*d.* Weinlese, *mhd.* lësen] збор вінаграду

lejzer [*d.* leise] ціхі

lejzn [*d.* lösen] 1. вырашыць, вырашаць; 2. нагандляваць, зарабіць, зарабляць, выручыць, выручаць (аб грашох); **lejz** *f* вызваленьне, воля, збаўленьне, спасеньне; **lejzung** *f*, -en 1. вырашэньне, адгадка, разгадка; 2. **lejzexc** *n* утаргаваныя грошы, утаргоўка, прыбытак, збор, выручка; **léjzbarer** вырашальны
- af der lejz на волі
- lejzung fun a reteniš адгадка

lekaf-zxús=lekef zxus [*s.* לכף זכות] *adv.* "годным чынам, паводле годнасьці/заслугаў"; **lekaf-xójv=lekef xojv** [*s.* חוב] *adv.* "паводле віны"
- dan zajn* lekaf-zxus/-xojv судзіць (аб чалавеку) паводле ягонай годнасьці/віны

lekatxile=lexatxile [*s.* לכתחילה →txiles] *adv.* спачатку, на пачатку; паперадзе, наперадзе, перад тым як; **lekatxílediker=lexatxílediker** першапачатковы

lekex/lejkex 1. *m*, -er/-n, **lékexl** *n*, -ex [*d.* Lebkuchen, *mhd.* lëbe-

kuoche] мядовік, мядовы пернік, пірог; 2. *m*, -er/-n *kort.* звонкі; 3. званковы; **lekex-un-brónfn** *m*, -s (a lekex un bronfn) "пернік і гарэлка"; прыём гасьцей, вечарын(к)а, сямейнае сьвята
• di tojz lekex званковы туз
• gejn* af a lekex un bronfn ісьці на гарэлку/гулянку
• a lebn vi a lekex жыцьцё як пернік (як мёду піцьцё)
• az a karger vert mild, est er boršč mit lekex *glxv.* як скнара расшчодрыцца, дык есьць боршч зь пернікамі
• der bester lekex iz der, vos got hot gegebn *šprxv.* найлепшы пернік – ад бога (*vrtš.* "lekax-tojv" *tnx.* [*s.* כי לקח טוב נתתי לכם] "добрае вучэньне" – "lekex" "пернік")
• er hot im gevizn a lekexl (vajzn* emecn a lekexl) ён паказаў яму пернічак (прывабіў/спакусіў)
• gib mir lekex un ruf mix nar (ruf mix nar, nor gib mir lekex) *glxv.* дай мне пернік і можаш называць мяне дурнем (хоць мяне воўкам называй, толькі штодзень барана дай; лай, адно грошы аддай)

lekiš *m*, -n [?] дурань, тупіца; **lekiševate(r)** дурнаваты, бязглузды
• lekiš (der) ber вялікі дурань (дурны як пень)

lekn [*d.* lecken] лізаць, хлябтаць; **lekn zix** (cu) падлізвацца, падлабуньвацца, выдыгаць; **lek** *m*, -n лізок, трошкі; **a lek ton*** лізнуць; **leker** *m*, -s 1. лізун; 2. язык (у быдла); **lekeráj** *fn*, -en падлізваньне; ласунак; **lékerl** *n*, -ex ледзянец
• a lek afn bodem апошняя кропля на дне
• a lek un (a) šmek лізь-кусь, крыха, дробязь
• arojscien*/vajzn* emecn a leker паказваць камусьці язык
• di kac lekt milx котка хлебча малако
• lekn dem štojb fun emecns fis зьлізваць пыл з чыіхсьці ног
• lekn (zix) di finger (fun epes) (me lekt derfun di finger) пальчыкі абліжаш
• leker est zix ojx cu (vert ojx nimes) *šprxv.* і (ялавічныя) языкі прыядаюцца
• vest kejn honik nit lekn! не лізаць табе мёду!

lekól-/lexól-(h)adejes [*s.* לכל־הרעות] *adv.* паводле агульнага меркаваньня, з агульнага пункту гледжаньня; **lekól-/lexól-(h)apoxes** [*s.* לכל־הפחות] *adv.* у крайнім выпадку, самае малое, ва ўсялякім разе, прынамсі, хаця б, хоць бы

lekoved [*s.* לכבוד →koved, kibed, kvod-, lixvojd, nixbed, mexubed, mexabed] *adv.* у якасьці пашаны, павагі; у гонар; дзеля, для
• lekoved šabes у гонар суботы

lektik *f*, -s [*p.* lektyka] насілкі

leláag-ulkéles [*s.* ללעג־ולקלס] *adv.* на сорам і ганьбу [*sin.* cu šand un cu špot]
• maxn lelaag-ulkeles зьневажаць, ганьбіць

lele *f*, -s [*p.* lalka, *ukr.* ляля, лялечка] *zool.* лялька, кукалка

lem=lebn dem *prep.* (ка)ля гэтага, паблізу

l(e)máj=hal(e)máj [*s.* למאי(ה) →amaj] *bndv./adv.* бо, таму што; д(зе)ля чаго, навошта, чаму, зь якой нагоды [*sin.* far vos? cu vos?]
• lemaj zoln menčn zajn azoj šlext, az zej kenen zajn gut? (Š.-A.) навошта людзям быць такімі кепскімі, калі яны б маглі быць добрымі?

lemajle [*s.* למעלה →majle] *adv.* звыш, вышэй, над [*sin.* iber, hexer]; **lemajle-min-haséjxl** [*s.* למעלה־מן־השכל] *adv.* вышэй за разуменьне, незразумела; **lemajle-min-hatéve** [*s.* למעלה־מן־הטבע] надпрыродна, звышнатуральна [*sin.* ibernatirlex]

lemajse [*s.* למעשה →majse] *adv.* фактычна, на самай справе, на практыцы [*sin.* faktiš, in der praktik]

leman(h)ašém [*s.* למען־השם=למע"ש] "у імя бога"; *adv.* напрамілы бог, богам прашу!; дзеля бога; божай воляй; абавязкова
• ir zolt lemanhašem kumen вы абавязкова прыходзьце

leman-hoémes [*s.* למען־האמת] *adv.* папраўдзе кажучы, калі нічога ня ўтойваць
• leman-hoemes darf men zogn, az... справядлівасьць патрабуе сказаць, што...

leman-jéjdu [*s.* למען־ידעו] *adv.* яны мусяць ведаць, трэба ведаць

leman-jíšmeu-vejíru [*s.* למען־ישמעו־ויראו] *adv.* каб чулі і бачылі, каб гэта ўсім было навукай

lemares-á(j)in [*s.* למראית־עין] *adv.* на колькі можна бачыць; для вонкавага эфэкту, знадворку, звонку, каб было відаць звонку [*sin.* klape-xuc]

lemáte-šiber *m* [*s.* למטה־] *argo* граміла, налётчык на банкі, мядзьведнік

lemázl [*s.* למזל →mazl] *adv.* шчасьліва, на шчасьце, у добры час
• di kimpetorn hot lemazl gebojrn a kind (Š.-A.) парадзіха ў добры час нарадзіла дзіця

Lemberg/Lémberik *n* г. Львоў
• a lemberger iz nor ■ xoxem biz cum šrankn *glxv.* жыхары Львова разумныя толькі да шлягбаўма (толькі ў сваім горадзе)
• draj zaxn zajnen do in Lemberg: falše ejdes, švarcer retex un "bloje pupkes" *glxv.* тры рэчы ёсьць тут у Львове: фальшывыя сьведкі, чорная рэдзька і "сінія пупкі" ("bloje pupkes" – так дражнілі жыхароў Львова)
• er klert, ci di kulikover bejgl zajnen greser fun di lemberger *glxv.* ён разважае, ці кулікоўскія абаранкі большыя за львоўскія

lemehadrin [*s.* למהדרין →hadren, mehadrin-] "для тых, хто строга трымаецца кожнага пункту запавету"; якія выконваюць усе запатрабаваньні, найлепшага гатунку

lemer *pl.* →lam *n*, *dim.* **lémele** *n*, -x, **leml** *n*, -ex ягня, ягнё; **lémerner** які мае дачыненьне да ягня
• er lejgt zix vi a lemele (un štejt uf vi a lejb) *glxv.* ён кладзецца як ягня (але ўстае як леў)
• er maxt zix lemele *glxv.* ён строіць зь сябе ягнё (*vrtš.* "Lemele" Лэмэлэ (мужчынскае імя) – "lemele" ягнё)

lémern [*s.*?] гаварыць, казаць, гутарыць

Lemex *m*, -s [*s.* למך] *tnx.* Ламэх; *fig.* цяльпук, мяла, размазьня, кісель (аб чалавеку) (Б. 5:29)
• gej ix af gix – cerajs ix di šix, gej ix pamelex – bin ix a Lemex іду памалу – падзяру чаравікі, іду хутка – буду цяльпуком (недавернешся – б'юць, перавернешся – б'юць; і не даступіў – б'юць, і пераступіў – б'юць)

lemeš/lemiš *m*, -n [*p.* lemiesz] лямеш

lémeške/lémiške [*ukr.* лемішка, *p.* lemieszka] 1. *f*, -s лямешка (рэдкая страва з мукі); 2. *m/f*, -s наіўны чалавек, размазьня, кісель (аб чалавеку), дурань

lemisporóm [*s.* למיספרם] "паводле іхнага зьлічэньня"; *adv.* паводле хрысьціянскага календару

lemóšl [*s.* למשל →mošl, nimšl, opmošlen, mišle] *adv.* напрыклад, прыкладам, да прыкладу, на ўзор [*sin.* cum bajšpil, a štejger]

• nit alc, vos glanct, iz gold – lemošl, a lisine… ня ўсё тое, што блішчыць, золата – напрыклад, лысіна…

lemp *pl.* →lomp *m*, -n, *dim.* **lempl** *n*, -ex лямп(ачк)а

lempert *m*, -n, (-ixe *f*, -s) [*mhd.* leparte] *zool.* леапард

lemžik *m*, -es [*ukr.* лемза, *p.* lamza] ёлуп, балван, ідыёт, дурань

Lenčne *f* мястэчка Ленчна (Польшча)

• lenčner ganovim ленчнянскія злодзеі (гэта мястэчка некалі славілася злодзеямі)

• Rebe korev, zajt ir nit fun Lenčne? – Ir zajt alejn a ganev! Паважаны спадар, вы ня зь Ленчны? – Самі вы злодзей!

lend *f*, -n [*d.* Lende] сьцягно, бок

• ongurtn di lendn падперазацца, закасаць рукавы

lender *pl.* →land *n*, *dim.* **lendl** *n*, -ex край, краіна, старана; зямля, зямельны ўчастак, дзялянка; **lendler** *m*, -s, (-ke *f*, -s) земляўласьнік, землеўладальнік

lenen zix [*d.* lehnen] прысланіцца, прысланяцца; **len** *m* [*d.* Lehnstuhl, *mhd.* lëne] падушка; крэсла

leng *adj.* -en [*d.* Länge] даўжыня, працягласьць; **lenger** *comp.* 1. даўжэй; 2. надоечы, нядаўна; **lénglexer**, **lengexiker** (пра)даўгаваты; **leng(-)ójs** *prep.* уздоўж, наздоўж; **lénghóriker** доўгавалосы; **léngfísiker** даўганогі, даўгоны; **léngmos** *f* мера даўжыні; **léngtol** *m*, -n лагчына

• [illegible] meter di leng два мэтры даўжынёй

• in der leng у даўжыню

• lengojs breg уздоўж берага

• vetn* brejter vi lenger расплывацца ад асалоды

• vaksn in der leng kost kejn gelt nit *glxv.* расьці ў даўжыню грошай не каштуе (кажуць на доўгіх і худых)

• vos lenger es ligt, alc štarker vet dos zajn *glxv.* (таксама *vulg.*) чым даўжэй ляжыць, тым мацнейшым будзе

léngaike *f*, -s [?] сорт ігрушы

lenken [*d.* lenken] весьці, кіраваць

lénketke *f*, -s [*p.* lękowaty] зыгзаг

lenój [*s.* לנוי] *adv.* дзеля прыгажосьці; у якасьці аздабленьня, упрыгожваньня [*sin.* culib šejnkajt, vi a bapucung; *ant.* letašmeš]

lente=ljente *f*, -s [*r.* лента] стужка

leojlem [*s.* לעולם] *adv.* кожны раз, заўжды, заўсёды; фактычна; на(в)огул, наагул, агулам, увогуле [*sin.* ale mol, štendik; faktiš; bixlal]; **leójlemes/leójlomes** [*s.* לעולמות] *adv.* на векі вечныя, назаўсёды, у вякі вякоў, давеку, навек(і), век-вяком [*sin.* af ejbike cajtn, af štendik]; **leojlem tikex** [*s.* תמי(י)כה] заўжды мусіш браць; бяры, што табе даюць; **leojlem-vóed** [*s.* ועד־] *adv.* на векі вечныя, назаўсёды, назаўжды, давеку [*sin.* af ejbik, af ale mol]

• "leojlem" – nem, "tikex" – mon (bet vajter) *glxv.* даюць – бяры і яшчэ патрабуй

• leojlem muz men zajne šepsn šern *šprxv.* спачатку трэба сваіх авечак абстрыгчы

• "leojlem tikex" – az me git (mir), pik ix *šprxv.* "бяры, што табе даюць", – калі даюць, я дзяўбу

• "leojlem tikex" – dervajl kuk ix *glxv.* "бяры, што табе даюць", – і яшчэ ўглядаюся

leosed [*s.* לעתיד] *adv.* у будучым, у прышласьці; (на)далей [*sin.* in der cukunft; af vajter]; **leosed-lóve** [*s.* לבא־] у далёкай будучыні, пасьля прыходу мэсіі

lepák *m*, -es [*p.* łepak] бамбіза, ёлуп, балдык

lepečen [*ukr.* лепетати, *p.* lepietać] 1. лепятаць, лапатаць; 2. *n* лепет; **lépčixe** *f*, -s пляткарка, плётніца, пахатуха, зводніца, язычніца, брахуха

lepen [*ukr.* ліпити, *p.* lepić] ляпіць; **lepke(r)** [*p.* lepki] ліпкі, ліпучы, клейкі

• vos hot lepke finger злодзеяваты

lépišer [*d.* läppisch] нехлямяжы, нязграбны, недарэчны, бязглузды, аляпаваты; **lépiškajt** *f* нехлямяжасьць, нязграбнасьць, недарэчнасьць

• a lepiše fraze аляпаватая фраза

• a lepišer gang нязграбная хада

lepl *n*, -ex [*d.* Ohrläppchen] мочка; **leplex** *pl.* навушнікі (шапка-аблавуха)

léplexer=léblexer [*d.* lau] цёплы, цеплаваты

leponem [*s.* לפנים →ponem] *adv.* павярхоўна, для блізіру, для вока, для выгляду, робячы выгляд [*sin.* ojbnojfik, far jenems ojgn, farn drojsn, maxndik an onštel]; **lepónemdiker** зьнешні, уяўны; **lepónemdikajt** *f* падабенства

lepoxes [*s.* לפחות →poxes-] *adv.* сама меней, найменш, прынамсі, хаця, хоць [*sin.* vejnikstns, xoč]

-ler [*d.* -ler] *suf.* -ер, -эр, -ец, -нік і інш. (асобы мужчынскага роду)

• betler жабрак; pajkler барабаншчык; vicler жартаўнік

ler [*d.* leer] пусты, парожні, незаняты; **lerkajt** *f* пустата, пустэча

• az der mogn iz ler, iz der šlof šver *glxv.* калі страўнік пусты, сон цяжкі (галоднаму пасьцель мулка; галоднаму цыганы сьняцца)

lér(e)nen [*d.* lernen] 1. (mit) вучыць, на-, а|бучаць; 2. *n*, **ler** *f*, **lernung** *f*, -en вучэньне, навучаньне; **lere** *f*, -s вучэньне, дактрына; **lerner** *m*, -s вучоны чалавек; студэнт, які вывучае Талмуд; **lerer** *m*, -s, (-n/-ke *f*, -s) настаўнік, выкладчык; **lereráj** *f/n* настаўнічаньне, настаўніцкая праца; **lérer(i)šer** настаўніцкі; **lérer-cimer** *m*, -n настаўніцкая; **léreršaft** *f* настаўніцтва; **lérnjung** *m*, -en, **lérnjingl** *n*, -ex вучань (у майстэрні); **lérnjor** *n*, -n навучальны год; **lérnbux** *m/n*, *pl.* -bixer падручнік; **lérn(-)anštalt** *m*, -n навучальная ўстанова; **lérndojer** *m* тэрмін навучаньня; **lér(n-)gelt** *n* плата за навучаньне

• farnemen* zix lereraj выкладаць, настаўнічаць

• kenen* lernen ведаць Талмуд

• lernen epes ojsvejnik вучыць штосьці на памяць

• a lerner halt šver un šviger far di herner *glxv.* студэнт трымае цесьця й цешчу за рогі ("доіць" іх)

• lern di boben zingen! вучы бабу сьпяваць!

• lernen a flokn tancn! вучыць палку танчыць!

• me lernt zix biz zibecik, un štarbn štarbt men a nar *glxv.* вучыся да сямідзесяці гадоў, але дурнем памрэш (век жыві, век вучыся, а дурнем памрэш)

• vos Xaimke lernt nit, ken nit Xaim *glxv.* чаго Хаімка ня вывучыць, таго ня зможа Хаім (бяз вучэньня німа ўмеласьці)

lerócn [*s.* לרצון] *adv.* прыемна, па сэрцу, да сэрца, па душы, да спадобы [*sin.* ajngenem, cum harcn]

• zajn* emecn lerocn быць камусьці да спадобы

leroe [*s.* לרעה] *adv.* непрыяльна, неспагадна, нязручна, шкодна, кепска, блага, дрэнна [*sin.* umgincik, cum šlextn, cu šedikn; *ant.* letojve]

• (ojs)nicn leroe emecns cutroj злоўжываць чыімсьці даверам

leróv [*s.* לרוב] *adv.* многа, шмат, багата, удосталь, уволю, даволі [*sin.* a sax, bešefe]

les brejre [*s.* לית ברירה] у скрайнім выпадку, німа выбару (альтэрнатывы), па крайняй неабходнасьці
les dín velés dájen [*s.* לית דין ולית דיין] німа закону і німа судзьдзі, беззаконнасьць
les man depaleg (az) [*s.* לית מאן דפליג] небясспрэчна, што...
lesate [*s.* לעת־עתה] *adv.* пакуль (што), тым часам, у дадзены момант [*sin.* dervajl]; **lesátediker** часовы
leséjrugin [*s.* לסירוגין] *adv.* з пропускамі, без чаргі, пераменна [*sin.* hiperndik, ništ lojt der rej, alternirndik]
lesnik/lešnik *m*, -es, (-nice *f*, -s) [*r.* лесник] лясьнік
lesóf [*s.* לסוף →sof] *adv.* урэшце, нарэшце, напасьледак, у канцы, на заканчэньне, напрыканцы [*sin.* cum šlus, cu end, af cu endikn]
léstern [*d.* lästern] блюзьнерыць, (з)ганьбіць, апаганіць, апаганьваць; **lésterndiker** блюзьнерскі; **lésterung** *f*, -en блюзьнерства, кашчунства, спаганьваньне, ганьбаваньне
leščen=laščen [*ukr.* лащити, *p.* łaszczyć] лашчыць, песьціць
lešém [*s.* לשם] *prep.* дзеля, для, з-за, праз(ь), у якасьці, у імя/гонар, аб, паводле [*sin.* culib, vegn, far]; **lešém-šomáim** [*s.* שמים־] дзеля нябёсаў, дзеля бога; ідэалістычна, добрым чынам
• er flegt kejn mol ništ rejxern, lešem tajneg, lešem refue (Prc.) ён ніколі не курыў: ні дзеля асалоды, ні ў якасьці лекаў
lešitose [*s.* לשיטתו] *adv.* паводле ягонай тэорыі, паводле ягонага мэтаду [*sin.* łojt zajn teorje/metod]
lešn* (gelóšn) [*d.* löschen] гасіць, тушыць; **lešer** *m*, -s прэс-пап'е; **léšer-hokn** *m* пажарны бусак; **léšpapir** *n*, -n прамакатка
• lejg ix mir in bet arajn /un leš mir ojs dos fajer, /kumen vet er hajnt cu mir – /der vos iz mir tajer *flksl.* я кладуся ў ложак і гашу агонь, ён прыйдзе сёньня да мяне, мой дарагі
lešojnes *pl.* →lošn *n* [*s.* לשון(־ות)] мова, гаворка, гутарка, словы, прамова; здольнасьць гаварыць
lešone-tojve *f*, -s [*s.* לשנה־טובה →Rošešone, šone-tojve] віншаваньне з Новым годам; **lešone tojve tikosejvu (vesexosejmu)** [*s.* (ותחתמו) תכתבו] на добры год няхай вас запішуць (і запячатаюць) (традыцыйнае віншаваньне на Рош-Гашону альбо на Ём-Кіпур)
lešono habó(o) birušolaim [*s.* לשנה הבה בירושלים] на будучы год у Ерусаліме (віншаваньне на Ём-Кіпур або на Пэйсах)
• Lomir zix iberbetn, /ovinu šebašomajim, /lomir zix iberbetn, /zaj dajne verter mekajem. /Lešono habo birušolaim! *flksl.* Давай перапросімся, ойча наш нябесны, давай перапросімся, хай твае словы зьдзейсьняцца. Наступны год у Ерусаліме!
(le)tarbes-róe [*s.* (ל)תרבות־רעה] *adv.* убок ад юдаізму, да благога, на ліхі шлях
• arojsgejn* letarbes-roe адысьці ад юдаізму, разбэсьціцца
letašmeš/letašmiš [*s.* לתשמיש →mešames-hamite, tašmeš] *adv.* для карыстаньня, для ўжытку, для практычных патрэбаў [*sin.* cum banicn, praktiš niclex; *ant.* lenoj]
leteóvn=mumer-leteóvn *m* [*s.* (מומר) לתאבון] жыд, які чыніць грэх, таму што ня можа супрацьстаяць спакусе
leter *f* [*mhd.* litter] літара, буква
Letland *n* [*d.* Lettland] Латвія; **let** *m*, -n, (-n *f*, -s) латыш; **letiš** *n* латыская мова; **létišer** латыскі, **létlandišer** латвійскі
letnik *m*, -es [*p.* letnik →gram-štram] 1. летнік (летняя лёгкая вопратка); 2. чалавек на адпачынку; **letne(r)** летні, лёгкі (аб вопратцы)
letojre lexupe ul(e)majsim-tójvim [*s.* לתורה לחופה ולמעשים־טובים] (прысьвяціць сябе) вывучэньню Торы, шлюбу/сям'і й добрым справам
• ir zolt im megadl zajn letojre lexupe ulmajsim tojvim! выхоўвайце яго так, каб ён прысьвяціў сябе вывучэньню Торы, сям'і й добрым справам (зычэньне ў час абразаньня)
letojve [*s.* לטובה →tojve, mejtev] *adv.* патрэбна, прыдатна, да ладу, у дапамогу [*sin.* gincik, cum gutn, cu helfn; *ant.* leroe]; **letojves** [*s.* לטובת] на карысьць (інтарэсаў); **letojves-haklál** [*s.* הכלל־] *adv.* паводле агульных інтарэсаў, на агульную карысьць, на карысьць грамадзтва
• di cajt virkt undz letojves час працуе на нас
• dos redt letojves im гэта гаворыць яму на карысьць
• majn ganc lebn arbet ix letojves-haklal (M.M.-S.) усё маё жыцьцё я працую на карысьць грамадзтва
letokes *pl.* [?] перашкоды, перапоны
lev *n*, *pl.* levoves [*s.* (לבבות) לב →belev-, abireslev, šivres-halev] 1. сэрца; 2. *pl.* бадзёрасьць, адвага, кураж [*sin.* harc; mut, kuraž]; **levtov=leftov** *m* [*s.* טוב־] чалавек з добрым сэрцам; назоў павучальнай кнігі; **lev jedeje** [*s.* יודע] сэрца ведае/чуе
• hobn a (puxke) levoves мець (мяккія) сэрцы
• mjaxke levoves занадта мяккія сэрцы; малая адвага
• ale oremelajt hobn gute hercer/levoves *šprxv.* усе бедныя людзі маюць чулыя сэрцы
• xosn, max dir a lev! *glxv.* жаніх, супакой сваё сэрца!
levád [*s.* לבד] *adv.* за выключэньнем
levade *f*, -s [*ukr.* левада] лявада, лівада, луг, выган
levaje *f*, -s [*s.* (ות־)לוי(ו)ה →melave] жалобная, пахавальная працэсія, хаўтуры; *hum.* праводзіны, провады [*sin.* trojercug; arojsbaglejtung]; **levájediker** пахавальны, жалобны; **levajer** *m*, -s, **leváje-unternemer** *m*, -s арганізатар пахаваньня
• gejn* nox der levaje ісьці ў пахавальнай працэсіі
• gegangen af a xasene un getrofn af a levaje *glxv.* ішоў на вясельле, ■ патрапіў на хаўтуры
levatole [*s.* לבטלה] *adv.* бясплатна, дарэмна, дарма, занадта, залішне, задужа, зашмат [*sin.* umzist, iberik]
leviim *pl.* →lejvi *m*, **levin** *m* [*s.* (־ים)לוי] левіт
levjosn *m* [*s.* לויתן(ו)] кіт; левіяфан (легендарная рыба, якую будуць есьці праведнікі на тым сьвеце) [*sin.* valfiš]
levkoje *f*, -s, **levkój** *m*, -en [*d.* Levkoje] *bot.* ляўконія, мацыёла
levone *f*, -s [*s.* (ות־)לבנה] месяц (маладзік, княжыч, поўня, ветах); **levón(ed)iker** месячны; **levónele** *n*, -x спадарожнік; **levóne-jor** *n*, -n месячны год; **levóne-naxt** *f*, *pl.* -next месячная ноч
• aropfaln* fun der levone зваліцца зь месяца
• fule levone поўня
• halbe levone паўмесяц
• halbe levones круглыя дужкі, клямары, ()
• šejn vi di levone прыгожы як месяц
• dajn mazl zol dir lajxtn, vi di levone in sof xojdeš! *kll. hum.* каб табе шчасьце зьзяла, як ветах!
• me muz di levone mexadeš zajn, azoj lang zi štejt *šprxv.* трэба маліцца на маладзік, пакуль ён на небе (касі, каса, пакуль раса; гні дрэўца, пакуль гнецца; тады рыбу лаві, як бярэцца за вуду)
• oj, gotenju, ix štej akegn der levone, /er zol nit blajbn kejn almen, un ix kejn almone *flksl.* ой, божухна, я стаю насу-

праць месяца, хай ён не застанецца ўдаўцом, а я ўдавой

Levonen *n* [*s.* לבנון] Ліван; **levónenšer** ліванскі

levónixe *f* беларускі танец "Лявоніха"

levúš *m/n*, -n/-im [*s.* לבוש(-ים/-ין) →halboše, malbeš] адзеньне, адзежа, убраньне, вопратка, форма, зьнешнасьць; *kbl.* сымбалічная вопратка бога альбо мэсіі [*sin.* baklejdung, forem, ojserlexkajt]

• der alter levuš past zix ništ cum najem inhalt (Prc.) старая форма не пасуе новаму зьместу

-lex-/-lax- [*d.* -lich] *suf.* -ават-, -н-, -енн- ды інш. (надае значэньне прыналежнасьці да нечага ды іншыя якасьці прыметнікам, прыслоўям і назоўнікам)

• menčlexer чалавеч(н)ы, людзкі; menlexer мужчынскі; švarclexer чарнаваты; naivlexer наіўнаваты; erlex сумленна; bašajmperlexkajt відавочнасьць

-lex/-lax→-l- *suf.*

lexaim 1. *m*, -s [*s.* לחיים(-ס) →xaj, xajes, opxajen] выпіўка, трунак, пітво, напой, гарэлка [*sin.* getrank, maške]; 2. *int.* (піце) на здароўе! піце здаровы! [*sin.* cum gezunt! cum lebn!]; **lexaim-(tójvim-)ulešólem** [*s.* (טובים-)ולשלום] "на добрае жыцьцё і на мір!" (традыцыйны адказ на "lexaim"); **lexaim ulešnóbl** пародыя на "lexaim-(tójvim-)ulešólem"

• maxn (a) lexaim выпіць чарку

• trinken* lexaim far emecn выпіць за чыё-небудзь здароўе

• lexaim vil ir trinken /far dem pintele jid, /vos mučet zix tomid /un vert kejn mol nit mid! /bim-bam-bam, bim-bam! (M. V.) я хачу выпіць за жыдоўскую яскравую душу, якая пакутую заўжды, але ніколі не стамляецца! бім-бам-бам!

lexatxile=lekatxile [*s.* לכתחילה →atxile, txiles, masxl, hasxole] *adv.* спачатку, на пачатку; паперадзе, наперадзе, перад тым як [*sin.* in/cum onhejb; fun forojs, ejder vos un ven; *ant.* bedieved]; **lexatxílediker=lekatxílediker** першапачатковы

lexc *m*, -n [?] цеча, уцечка

lexcn (nox) [*d.* lechzen] прагнуць; марыцца, таміцца; **lexcung** *f*, -en прага; марэньне, нуда

lexem *n* [*s.* לחם →laxme, pas-lexem] хлеб [*sin.* brojt]

l(e)x(e)m *abr.* **litvak - xazer - mamzer** [*s.* ממזר - חזיר] *pejor.* літвак - сьвіньня - байструк (польскія жыды некалі палохалі сваіх дзяцей: "der litvak vet ajx xapn" (прыйдзе літвак і вас пахапае), – таму дзеці і дражнілі літвакоў: "lexem")

lexer *pl.* →lox *f/n*, *dim.* **lexl** *n*, -ex, **léxele** *n*, -x дзір(к)а, лох; **léxern, lexlen** дзіравіць; **léxer(d)iker** дзіравы; **lexler** *m*, -s, (-n *f*, -s) дзіракол

• lexerdike hent дзіравыя рукі

• lexerike henčkes дзіравыя пальчаткі

• lexern di ojern прадзіравіць/прадудзець вушы

• es šit zix fun im vi fun a lexerdikn zok *glxv.* зь яго сыплецца як зь дзіравай панчохі

léxerlexer [*d.* lächerlich] сьмяхотны, сьмехатворны; **léxerlexkajt** *f* сьмяхотнасьць, сьмехатворнасьць; **léxele** *n*, -x улыбка; сьмешкі

léxlexo [*s.* לך־לך] "ідзі зь зямлі тваёй" (назоў 3-га разьдзелу Торы) (Б. 12 17)

• lexlexo kejn Xerson, kejn Volin, ergec anderš (M.M.-S.) ідзі сабе ў Хэрсон, у Валынь, куды-небудзь у іншае месца

lexo-dójdi [*s.* לכה־דודי] "хадзі, любы"; першыя словы і назоў літургічных сьпеваў, якія сьпяваюцца адвячоркам у пятніцу на сустрэчу суботы

• arajnforn* mit di halobljes in lexo-dojdi arajn прыехаць у пятніцу адвячоркам надта позна (заехаць з аглоблямі ў малебен)

• Az ix vel zogn: lexo dojdi, /zolt ir zogn: čiri-biri-bim. /Az ix vel zogn: likras kale, /zolt ir zogn: čiri-biri-bam. /Lexo dojdi, čiri-biri-bim, /likras kale, čiri-biri-bam, /lexo dojdi, likras kale, /čiri-biri-biri-biri-bam! *flksl.* Калі я скажу: прыйдзі, мой любы, – вы мусіце адказаць: чыры-біры-бім. Калі я скажу: на сустрэчу зь нявестай, – вы мусіце адказаць: чыры-біры-бам!

• tu on dem kapeljuš un zog "lexo-dojdi"! *hum.* надзявай капялюш і кажы "хадзі, любы"! (кажуць таму, хто зарана пачынае шабасаваць)

lexojve [*s.* לחובה] *adv.* з абвінавачаньнем, вінавата, кепскім/благім/дрэнным чынам [*sin.* cu der bašuldikung, cum šlextn; *ant.* lizxus]

lexól-/lekól-(h)adejes [*s.* לכל־הדעות] *adv.* паводле агульнага меркаваньня, з агульнага пункту гледжаньня; **lexól-/lekól-(h)apoxes** [*s.* הפחות] *adv.* у скрайнім выпадку, самае малое, ва ўсялякім разе, прынамсі, хаця б, хоць бы [*sin.* vejnikstns, xoč, cum vincikstn]

• er vil dix zen a profesor, oder lexol-hapoxes a dokter (Š.-A.) ён хоча бачыць цябе прафэсарам, альбо ў скрайнім выпадку доктарам

lexošim *pl.* →laxeš *m* [*s.* לחש(-ים)] магічная мова, замовы, шэпты

lexúd [*s.* לחוד →xad-] *adv.* асабліва, адмыслова [*sin.* bazunder]

lexu-neráneno [*s.* לכו־נרננה] "хадзем сьпяваць"; першыя словы і назоў псальмы, якую сьпяваюць адвячоркам у суботу (Псл. 94, 91)

lezejxer(-ójlem) [*s.* לזכר(־עולם)], **lezikórn** [*s.* לזכרון →zikorn, zixrojnes, zejxer, zxojr, (h)askore, mazker] у/на памяць [*sin.* cum ondenk, cum gedenken]

lezixren-dójres [*s.* לזכרון־דורות] будучыя пакаленьні павінны гэта памятаць

lezn* (gelézn) [*d.* lesen] чытаць; **lézbarer** [*d.* lesbar] чытабельны, лёгкачытэльны; **lézbarkajt** *f* чытабельнасьць, лёгкачытэльнасьць; **lezer** *m*, (-n *f*, -s) чытач; **lézerišer** чыта(льні)цкі

• zise briv hostu fun mir gelezn, /dos iz gevezn hejse verter af a kaltn štejn, /oj, vos iz den mit dir gevezn, /beser nejn, oj, beser nejn *flksl.* ты чытаў мае салодкія лісты, гэта былі гарачыя словы на халодным камяні, ой, што здарылася з табой, лепш ня трэба

ležanke *f*, -s [*r./ukr.* лежанка] ляжанка; **ležen** *m*, -s ляжак; **ležik** *m*, -es лежань, лежабок

lgote=legote/l(e)hote=ligote *f*, -s [*r./ukr.* льгота] ільгота; **lgotnik** *m*, -es ільготнік; юнак, які мае права не служыць у войску

• kejner hot nit kejn l(e)gote cu hobn xarote *glxv.* кожны мае права пакаяцца

li-=le-=la- [*s.* -ל] *pref.* да, для, дзеля, паводле (утварае ад сэміцкіх і іншых асноваў прыслоўі)

líbele *n*, -x [*d.* Libelle] *zool.* страказа

líbepele *n*, -x [*d.* lieb, Apfel] мандрагора (плод)

líbiške/líbičke *f*, -s [*d.* lieb?] сьліва

libn, lib hobn* (cu) [*d.* lieben] любіць, любаваць, кахаць; **lib vern*** палюбіцца, у-, с|падабацца; **libe** *f*, -s, **libšaft** *f*, -n любоў, любошчы, любоцьце, любасьць, каханьне;

liber 1. *m* любы, мілы чалавек, улюбёнец, каханчык; 2. любы, мілы, каханы; **liber(št)** *adv.* любей, ахвотней; **líberšthobn*/veln*** аддаваць перавагу, лічыць/уважаць за лепшае; **líberštkajt** *f*, -n перавага; **líbinker** *m*, -ke любенькі; **líblexer** мілы, ласкавы, ветлівы, прыязны; **líb(lex)kajt** *f*, -n ласкавасьць, ветлівасьць, прыязнасьць; **libling** *m*, -en любімец, улюбёнец, пястун; **líbndiker, líbefuler** любячы, любасны; **libster** *m* каханы; **líbe-derklerung** *f*, -en прызнаньне ў каханьні; **líbharciker** любы, мілы, ласкавы, пяшчотны; **líbharcikajt** *f* ласкавасьць, пяшчотнасьць; **líbhober** *m*, -s, (-n *f*, -s) аматар, заўзятар **libhoberáj** *n* аматарства; **líbhoberišer** аматарскі; **liberajxer** улюблівы

- lib bakumen*/krign* палюбіць
- lib hobn* emecn dos xajes/lebn абажаць, абагаўляць
- lib hobn* vi a bitere cibele, vi cejnvejtik любіць як горкую цыбулю, як зубны боль (як сабака катá/палку/цыбулю, як сьвіньня гарбуз/сена, як цыган сьляпую кабылу)
- lib hobn* vi an ejgn kind, vi got iz mir lib любіць як сваё дзіця, як бога (як матка дзіцятка, як сваю душу)
- lib vi an ejgn kind, vi tate-mame любы як сваё дзіця, як бацькі
- libling funem gojrl улюбёнец лёсу
- špiln a libe (mit) заляцацца, упадаць, улягаць; фліртаваць, круціць любоў
- a tropn libe brengt amol a jam trern *šprxv.* кропля любові нясе часам мора сьлёз (тады дзеўка схамянулася, як у пузе страпянулася)
- di libe iz blind *glxv.* каханьне вачэй ня мае (ад каханьня німа спакойнасьці ні ў касьцелі, ні на дзелі, ні на пасьцелі; каханьне горш ніж дрыстачка, бо і пшонны крахмал не паможа; каханьне не блінцы, а закахаўшыся – канцы)
- di libe iz zis, nor zi iz gut mit brojt *šprxv.* любоў салодкая, але яна добрая з хлебам
- dos, vos dir iz nit lib, tu nit jenem *glxv.* чаго сабе ня хочаш, таго і другому не рабі (што ня міла самому, дык ня зыч і другому)
- far a bisl libe bacolt men mitn gancn lebn *šprxv.* за кроплю любові сплочваюць усім жыцьцём
- fun a falšer libe bakumt er kopvejtik, un zi – bojxvejtik *šprxv.* ад фальшывага каханьня ён атрымлівае боль у галаве, яна – боль у жываце
- hob mix vejnik lib, nor hob mix lang lib! любі мяне патрошку, але доўга!
- libe un hunger vojnen ništ inejnem *šprxv.* любоў і голад не жывуць разам (дзе недастаткі, там у сям'і звадкі)
- nit dos iz lib, vos es iz šejn, nor dos iz šejn, vos es iz lib *šprxv.* ня тое люба, што прыгожа, але тое прыгожа, што люба (ня тое хораша, што хораша, але тое, што каму да спадобы)
- ven di libe iz geven štark, hot di bet gedint di šarf fun der šverd, ven di libe iz adurx, iz a brejt bet šmol *šprxv.* калі каханьне было моцнае, ложкам служыла лязо мяча, калі каханьне прайшло – і шырокі ложак вузкі
- x'hob gelibt a mejdele fun axcn jor, /un libn lib ix zi šojn cvej-draj jor *flksl.* я закахаўся ў дзяўчыну васямнаццаці гадоў, і я люблю яе ўжо два-тры гады

libre *f*, -s [*p.* libra, *ukr.* лібра] дзесьць паперы

libries-(ho)ójłem [*s.* לבריאת(ה)עולם] *adv.* з таго часу, як створаны сьвет; ад стварэньня сьвету (аб нейкай даце)

licénc *f*, -n [*p.* licencja] ліцэнзія

licitator *m*, -tórn, (-tórše *f*, -s) [*p.* licytator] аўкцыяніст; **licitacje** *f*, -s таргі, аўкцыён; **licitánt** *m*, -n вядоўца аўкцыёну; **licitírn** (licitírt) прада(ва)ць з таргоў, таргавацца

licmises [*s.* לצמיתות] *adv.* навек(і), давеку, назаўжды, назаўсёды [*sin.* af ejbik, af štendik]

lič/lic *m*, -n [*ukr.* лич, *p.* łycz] лыч, рыла

ličman *m*, -es [*p.* liczman] жэтон, фішка (ігральная)

lid *f/n*, -er, *dim.* **lídele** *n*, -x [*d.* Lied] песьня, верш; **líderkranc** *m*, -n нізка вершаў, вянок санэтаў; **lídtekst** *m*, -n словы/тэкст песьні

- dos iz šojn an alt lidl гэта ўжо старая песенька
- cu a najer lid (cu itlexn najem lid) ken men cupasn an altn nign *glxv.* да новай песьні можна дапасаваць стары напеў
- šmidt der jid, der jid, /der jid – der šmid, /ejns-cvej-draj... /un er, un er, un er, un er /zingt zix cu a lid, /jidiš-lid, jidiš-lid, /zingt a jidiš-lid derbaj (V. J.) куе жыд-каваль, раз, два, тры, і сьпявае пры гэтым песьню, жыдоўскую песьню
- Zun in majrev zect zix gix, /vos darf nox a menč, vi ix? /Lider, klejne lider, /li-li-li - lider. (J. R.) Сонца на захадзе хутка садзіцца, што яшчэ трэба такому чалавеку, як я? Песьні, маленькія песьні, лі-лі-лі – песьні.

lidej gmar/gemer [*s.* לידי גמר] да заканчэньня; да ажыцьцяўленьня, да выкананьня [*sin.* cu an opšlus; cu farvirklexung]

lidke=litke *f*, -s лытка

lif *m*, -n, **lifčik** *m*, -es [*p.* lifk, *nd.* liv] ліф(ік), станік

lífern=lívern [*d.* liefern] да-, па|ставіць, да-, па|стаўляць; **líferung=líverung** *f*, -en пастаўка, дастаўка; **liferánt=liveránt** *m*, -n пастаўнік; перакупшчык коней

lifnáj-velifním [*s.* לפני־ולפנים] *adv.* у сьвятая сьвятых, у самым захаваным і важным месцы [*sin.* in kodše-kodošim]

lifnej-kól-am-veéjde [*s.* לפני־כל־עם־ועדה] *adv.* ва ўсіх перад вачыма, адкрыта, не хаваючыся [*sin.* far alemen in di ojgn, efntlex]

lifním-mešures-hadín [*s.* לפנים־משורת־הדין] *adv.* мякка, наколькі вымагае закон; паблажліва, з паблажкамі, міласэрна, спагадліва

lift *m*, -n [*r.* лифт, *eng.* lift] ліфт; **liftjór** *m*, -n, (-še *f*, -s) ліфцёр

ligemine *f*, -s [*p.* legumina] звычайна салодкая страва, прысмакі; мешаніна, сумесь

lign* (iz gelégn/gelign) [*d.* liegen] ляжаць; **lígndiker** ляжачы; **lígndikerhéjt** *adv.* лежучы, у ляжачым стане; **liger** *m*, -s галоўная бэлька; **lígvund** *f*, -n *med.* пролежань; **lígštul** *f*, -n мяккае крэсла

- do ligt тут пахаваны
- lign* emecn in blut гэта ў крыві ў кагосьці
- lign* vi a mes ляжаць як нябожчык (як нежывы/пласток /плаха, як без душы)
- lign* vi a porec/graf/monarx/mes, vi šabes noxn kugl ляжаць як пан/граф/манарх, як у шабас пасьля кугаля (як кот на печы)
- s'ligt nit in kop ня лезе ў галаву
- der, vos ligt af/in dr'erd, ken nit faln *šprxv.* хто ляжыць на/у зямлі, не ўпадзе
- ojb du zolst lign zolstu krank lign! *kll.* калі ўжо тябе ляжаць, дык хворым!

lign *m*, -s/ligunim, **lignt** *m/f*, -n [*d.* Lüge] мана, хлусьня,

няпраўда, брахня; **lígnern** (lign zogn, zogn a lign) ілгаць, хлусіць, маніць; **ligner** *m*, -s, (-n/-ke/-te *f*, -s) брахун, (і)лгун, хлус, манюка; **lígnerišer** лгарскі, хлусьлівы; **lígneriškajt** *f* хлусьлівасьць, ілжывасьць

• bakn*/hakn ligns хлусіць не падсяваючы (як наняты; брэша як лён/клін чэша; брэша, што сьліна да губы прынясе)
• onbrokn ligns/ligunim набрахаць, наманіць, нахлусіць
• varfn* dem lign emecn in ponem выкрываць чыюсьці хлусьню
• a guter lign iz ojx amol vert gelt *glxv.* добрая хлусьня таксама калі-нікалі варта грошай
• a lign tor men nit zogn, dem emes iz men nit mexujev zogn (ober dem emes darf men nit zogn) *šprxv.* хлусіць нельга, але праўду гаварыць неабавязкова (ня трэба)
• a lign zogn fun šolem-bajes vegn хлусіць дзеля спакою ў сям'і
• a ligner darf/muz hobn ■ gutn zikorn *glxv.* хлус мусіць мець добрую памяць (ілжываму добрая памяць патрэбна)
• beser cu zogn: "ix vejs nit", ejder cu blajbn a ligner *glxv.* лепш сказаць: "я ня ведаю", ніж стацца хлусам
• beser iz a mieser (nit šejner) emes, ejder/vi ■ šejner lign *glxv.* лепш брыдкая праўда, чымся прыгожая хлусьня
• dem ligner glejbt men nit afile, ven er zogt šojn dem emes (dem ligner glejbt men afile an emes ojx nit) *šprxv.* лгару і праўды не павераць (хто раз залжэ, таму ніколі веры німа; з брахні ня мруць, да ім болей веры не даюць)
• ejner iz ■ lign, cvej iz ligns, draj iz a politik *šprxv.* адна хлусьня – гэта хлусьня, дзьве – многа хлусьні, тры – палітыка
• er zogt nor cvej mol in jor ■ lign – zumer un vinter *glxv.* ён хлусіць толькі два разы на год – узімку і ўлетку
• in der jugnt a ligner, af der elter a ganev *šprxv.* у маладосьці хлус, на старасьці злодзей
• mitn lign kumt men vajt, ober ništ curik *šprxv.* няпраўдаю /круцельствам/лгарствам/махлярствам/круцячы сьвет пройдзеш, але назад ня вернешся (круцьцю – непаварацьцю)

lignáj [*s.* לגנאי →gnaj] *adv.* на сорам, у дакор; у якасьці папікі/папроку/ганьбы [*sin.* cu šand, cu xarpe; *ant.* lišvax]

• zogn nit lignaj emecn казаць не ў дакор камусьці
• zol es im ništ zajn lignaj ня трэба разумець гэта як ганьбу яму

lik *m*, **like** *f* [*p.* łyko, *ukr.* лико] лыка, луб; **líke-vixeč** *m*, -n вяхотка з лыка

lik *m*, -es/-n, **likl** *n*, -ex [*p.* zaułek] за(ка)вулак, закутак

like *f*, *pl.* likuim [*s.* לי(י)קוי] зацямненьне, пацямненьне, зацьменьне [*sin.* eklips]; **like-xáme** *f*, -s [*s.* חמה־] сонечнае зацьменьне [*sin.* zuneklips, zun-farfunklung]; **like-levóne** *f*, -s [*s.* לבנה־] месячнае зацьменьне

like=lejke *f*, -s, **liek=lejek** *m*, -es лейка

likér *m*, -n [*d.* Likör] лікёр

likšejarviex=lixšejarviex [*s.* לכשירויח] калі ён заслужыць, калі ён зь ім разьлічыцца

likšejarxev=lixšejarxev [*s.* לכשירחיב] калі ён разжывецца, разбагацее; калі скончыцца цяжкі грашовы стан

likvider [*d.* Liquida]

• likvide konsonantn *lingv.* плаўныя зычныя

Liles/Lilis *f* [*s.* לילית] Ліліс/Ліліт, жаночы дэман, царыца дэманаў; *fig.* прыгожая жанчына, якая спакушае мужчынаў

lilje *f*, -s [*mhd.* lilje, *p.* lilija] *bot.* лілея; **lila, lilove(r)** лілёвы

limdines-hajám [*s.* למדינת־הים →medine] *adv.* у кірунку да далёкай краіны, на тым баку (па той бок) мора

limed *m*, *pl.* limudim [*s.* (ים־)לימוד(י) →lamdn, lomdes, melamed, melumdes] вучэбны прадмет, вучэбны занятак, вучэбная тэма [*sin.* dos lernen; lern-teme, lern-kegnštand; studjum, lekcjes]; **limúdies** *pl.* [*s.* לימודיות] сьвецкія навукі, матэматыка; **limude-xójl** *pl.* [*s.* לימודי־חול] сьвецкія вучэбныя прадметы альбо заняткі; **limude-kódeš** *pl.* [*s.* קודש־] рэлігійныя вучэбныя прадметы альбо заняткі

límene *f*, -s 1. **limon** *m*, -en лімон, цытрына; 2. *argo* турэмная запіска; **limonád/limenád** *m*, -n ліманад

• a zojere limene *fig.* кіслы лімон, кісьляк (аб чалавеку)

líndern [*d.* lindern] зь-, па|мягчаць, аб-, па|лягчаць; **linder** мяккі, лёгкі; **línderung** *f* зьмякчэньне, памякчэньне; **línderndiker** памякчальны, зьмякчальны, які зьмякчае; **línder-mitl** *n*, -en памякчальны сродак

líndnbojm *m*, *pl.* -bejmer, **linde** *f*, -s [*d.* Lindenbaum] *bot.* ліпа

lín(d)(n)(-)vorem *m* [*mhd.* lintwurm] крылаты зьмей, дракон, цмок

lin(d)z *f*, -n/-es [*d.* Linze] 1. *bot.* сачавіца, сычаўка, сачэўка; 2. **linze** *f*, -s лінза

line *f*, -s [*mhd.* lîna, *p.* lina] ліна, канат

lines-(ha)cédek [*s.* לינת־(ה)צדק] 1. багадзельня, прытулак для старцаў і старых [*sin.* hekdeš]; 2. суполка, якая дбае аб багадзельнях

-ling [*d.* -ling] *suf.* (асобы мужчынскага роду)

• cvejtling двайнік; cenerling падлетак; gletling пястун

linírn (linirt) [*d.* linieren] лінаваць, лінеіць; **linje** *f*, -s лінія, рыс(к)а; **linéišer, linealer** лінейны, лінейчасты; **linejke** *f*, -s лінейка; **linirter** (разь)лінеены

• a linirte heft сшытак у лінейку

lin(j)en/linjajen [*ukr.* линяти, *p.* linieć] 1. ліняць; 2. *n* лінька

linker [*d.* link] 1. левы; 2. *m*, **linkáč** *m*, -es, **linkíst** *m* лявак; **links** *adv.* налева, улева; **linkáčišer, linkístišer** лявацкі; **linkajt** *f*, **linkšaft** *f* левізна; **línkhantiker** ляўша, ляўшун

• di linke zajt левы/адваротны бок, ніц, спод, выварат, подшыўка
• gejn* af link займацца левымі справамі
• hobn* cvej linke hent мець дзьве левыя рукі (быць нязграбным)
• linke sxojre левы (крадзены) тавар
• maxn link хаваць крадзенае
• ojszen* vi di linke zajt (kojmen, fun a brodevke) выглядаць як адваротны бок (коміна/бародаўкі)
• az m'handlt nit mit links, hot men nit kejn rexts *glxv.* хто не займаецца "левымі" справамі, ня мае й "правых"
• er iz hajnt mit dem linkn fus funem bet ufgeštanen (fun/af der linker zajt) *glxv.* ён сёньня ўстаў з ложка зь левай нагі (на левы бок)
• vest es zen, vi dajn linkn ojer on a špigl *glxv.* ты гэта ўбачыш, як сваё левае вуха безь люстэрка (угледзець/убачыць як сваю патыліцу, як сваё вуха, як сьвіньня неба)

linoléj *m*, -en [*d.* Linoleum] лінолеюм; **linoléjener** лінолеюмавы

lip *f*, -n [*d.* Lippe] *anat.* губа (*pl.* губы/вусны); **líp(nd)iker** губны, лабіяльны; **lípnblumendike** *bot.* губацьветныя; **lípn-rejtl** *n*, -ex губная памада

• banecn di lipn прамачыць вусны
• brengen* far/af di lipn казаць, гаварыць, вымаўляць
• zajn* ba alemen af di lipn быць ва ўсіх на вуснах
• farmax dajne lipn (štarker dos mojl) un ajl zix nit mitn

entfer *glxv.* сьцісьні свае вусны і не сьпяшайся з адказам (будзь перш выслухачым, а пасьля павядачым; хто гаворыць – сее, хто маўчыць – жне)

lipe *f*, -s [*r./ukr.* липа, *p.* lipa] *bot.* ліпа; **lípove(r)/lípeve(r)/lípene(r)** ліпавы; **lipec** *m* (lipover honik) ліпавы мёд

lipke(r) [*r./ukr.* липкий] ліпкі, ліпучы, клейкі

liprát-gódl=lapág *m*, -n *abr.* [*s.* לפרט־גדול=לפ"ג(-ן) →bifrotret, bifrotjes, prat, ad-lapak] "паводле вялікага часалічэньня"; паводле поўнага гэбрэйскага летазьлічэньня [*s.* ה'תשנ"ט "hatašnát"=5759-ты год]; **liprát-kótn=lapák** *m*, -n *abr.* [*s.* קטן=לפ"ק(-ן)] "паводле малога часалічэньня"; паводле гэбрэйскага летазьлічэньня бяз тысячаў [*s.* תשנ"ט "tašnát"=(5)759 год]

lisičke *f*, -s [*r./ukr.* лисичка] лісіца, лісічка (грыб)

lísine *f*, -s [*ukr.* лисина, *p.* łysina] лысіна; **lise(r)** лысы; **lísekop** *m*, *pl.* -kep лысая галава

• vern* lise, bakumen* a lisine (аб)лысець

liske=liške=luške *f*, -s [*ukr.* луска, *p.* łuska] луска

list *m*, -n, **liste** *f*, -s [*d.* Liste] ліст, сьпіс

• švarce liste чорны сьпіс

lístiker [*d.* listig] хітры, падступны, аблудны

lisxús=lizxús [*s.* לזכות →(bi)zxus, zxie, zojxe, zoxe-, mezake] *adv.* у абарону, на добрае, добрым чынам [*sin.* cu der fartejdikung, cum gutn; *ant.* lexojve]

lišáj *m*, -en/-es [*r./ukr.* лишай, *p.* liszaj] *med.* лішай

lišen=hlišen/(h)lušen [*p.* głuszyć, *ukr.* глушити] глушыць; **liš** *m*, -n глухі гук/стук/грук

liške *f*, -s [*ukr.* лишка, *p.* licho] лішка

lišmó [*s.* לשמה] дзеля самой рэчы, зь любасьці, бяз задняй думкі, бескарысьліва

• arbetn lišmo працаваць добрасумленна

lišváx [*s.* לשבח →švax] *adv.* хвалячы, усхваляючы, шануючы, з пахвалой/ухваленьнем [*sin.* cum lojbn, mit lojb; *ant.* lignaj]

• dos iz im lišvax гэта яму на карысьць

litájn=latájn/latéjn *n* [*d.* Latein] лаціна; **litájnišer=latájnišer/latéjnišer** лацінскі

Lite *f* Літва (сучасная Беларусь, Літва, Латвія) (паўночна-ўсходняя частка расьсяленьня гэбрэяў у Эўропе); **litvín(er)** *m*, (-ke/-n *f*, -s) ліцьвін, літовец; **lítvišer** 1. літоўскі; 2. які мае адносіны да літвака; **litvak=letvak** *m*, -ákes, **lítviške=lítvičke=lítvačke** *f*, -s літвак (беларуска-літоўскі-латыскі жыд)

• a litvak hot a cejlem in kop *glxv.* літвак мае крыж у галаве (на гэта літвак адказваў: "to kuš mix nit in kop arajn" – "дык не цалуй мяне ў галаву (пацалуй мяне ў сраку)") (польскія жыды вельмі пагардліва ставіліся да літвакоў і выдумлялі пра іх розную небыль)

• a litvak nemt zix unter afile an am cu zajn *glxv.* літвак бярэцца нават нянькай быць

• a litvak štarbt nit *glxv.* літвак не памірае (яго альбо вышлюць у Сібір, альбо ён стане выхрыстам, альбо зьедзе ў Палестыну - так ці гэтак ён ужо будзе не літвак)

• a xucpe fun a mojd, ba a litvak kojft zi xale! нахабная дзяўчына, у літвака купляе яна халу!

• draj zaxn zajnen šener noxn tojt vi bam lebn: a burek, a rak un a litvak *glxv.* тры рэчы прыгажэйшыя пасьля сьмерці: бурак, рак і літвак (таму літвакоў называлі: "brl" – "burek-rak-litvak")

• du bist nox ništ kejn litvak, far vos že bistu a xazer? ты яшчэ не літвак, дык чаму ж ты сьвіньня?

• mit a litvak šrekt men di kinder *glxv.* літваком палохаюць дзеці

• un zi vet mir alc dercejln, /ci majn gelibter kumt fun Pejln (Pojln) /ci fun Lite, ci fun Zamet, /a bankir ci a melamed (X. B.) і яна мне распавядзе, ці мой любы будзе з Польшчы ці зь Літвы, ці з Жмудзі, банкір ці мэламэд

• ven glejbt a litvak? – az er cejlt draj mol iber *glxv.* калі літвак дасьць веры? – калі пералічыць тры разы

• vu a litvak iz gezesn, zol men ojsbrenen dos ort *glxv.* дзе літвак пасядзеў, трэба выпаліць месца

liter *m*, -s [*d.* Liter] літар; **litrove(r)** літровы

liter *m*, -s [*p.* litera?] пуцёўка, падарожны ліст

literát(or) *m*, -n [*d.* Literat] літаратар, пісьменьнік, словатвоца; **literárišer** літаратурны; **literatúr** *f*, -n літаратура, словатворчасьць

litke=lidke *f*, -s [*ukr.* литка, *p.* łytka, łydka] лытка

litlie [*s.* לתליה →taljen, tlie]

• sof ganev litlie *glxv.* канец злодзея – шыбеніца (і злодзей да пары крадзе; быць бычку на лычку, а кароўцы на вяроўцы; колькі б воўк ні валок, павалакуць і воўка)

livak *m*, -es [*r.* левак?] ляўша, ляўшун

liver *m*, -s [*p.* libra, *ukr.* лібра] дзесьць паперы

liver *m*, -s [*ukr.* лівер, *p.* lewar, liwar, *lat.*] 1. вінаградная альтанка; 2. *texn.* лівэр, лівар, сіфон (насос для перапампоўваньня вадкасьці)

lívern=lífern да-, па|ставіць, да-, па|стаўляць; **liverung=líferung** *f*, -en пастаўка, дастаўка; **liveránt=liferánt** *m*, -n пастаўнік; перакупшчык коней

lixe *f*, -s [*ukr.* лихо, *p.* licho] ліха

lixojre [*s.* לכאורה] *adv.* на першы погляд, можа здацца, можна было б падумаць [*sin.* in flug, es ken zix daxtn, me volt gekent mejnen]

lixšejarviex=likšejarviex [*s.* לכשירוויח] калі ён заслужыць; калі ён зь ім разьлічыцца

lixšejarxev=likšejarxev [*s.* לכשירחיב] калі ён разжывецца/разбагацее; калі скончыцца цяжкі грашовы стан

lixt [*d.* Licht] 1. *f/n*, **lixtik** *f*, **líxtikajt** *f* сьвятло, сьвет; 2. *f/n* сьвяча, сьвечка; 3. *n*, -er зорка; сыгнальны агонь; **líxtiker** сьветлы; **líxtikn (zix)** сьвяціць, блішчаць, бліскаць; **líxt(-)benčn** *n* блаславеньне, якое прамаўляе жанчына ў пятніцу адвячоркам на запальваньне сьвячэй; **líxtbild** *n*, -er слайд; **líxtfilbarer** сьвятлоадчувальны; **líxtfilbarkajt** *f* сьвятлоадчувальнасьць

• a lixtike nešome сьветлая душа

• a minut far lixtbenčn/benčlixt *fig.* у апошнюю хвіліну

• lixtik in ale vinkelex сьвятло ва ўсіх куточках

• lixtik vi di zun, vi der tog сьветла як на сонцы, як удзень

• ojskukn mit lixt прагледзець вочы

• varfn* a lixt (af) кідаць сьвятло

• zuxn (vi) mit lixt шукаць днём з агнём

• zen* ale in roze lixt бачыць усё ў ружовым сьвятле

• ejn bruder bin ix mir gevezn, /hob ix gehandlt mit lixt; /štarbn tu ix jedn tog, /vajl esn hob ix ništ *flksl.* я застаўся адзін брат, я гандляваў сьвячамі; я паміраю кожны дзень, таму што ня маю чаго есьці

• es vert nit frier lixtik, biz es iz nit ganc fincter *glxv.* не разьвіднее, пакуль цалкам не сьцямнее

• fun a gutn kop biz cu a šlextn kop iz nor a xilek a grošndik lixtl

glxv. паміж добрай і кепскай галовамі розьніца толькі ў грашовай сьвечцы (кепскай галаве, каб нагнаць добрую, трэба вучыцца і ўвечары пры сьвячох)
• ix zol handlen mit lixt, volt di zun nit untergegangen *glxv.* калі б я ўзяўся гандляваць сьвечкамі, дык сонца б не заходзіла
• lixtik - perl cu klajbn сьвятло – можна пэрлы зьбіраць
• me zuxt es mit lixt *glxv.* (сонца) днём з агнём шукаць (удзень са сьвечкай шукаць)
lixve *f*, -s [*ukr.* лихва, *p.* lichwa] ліхвярства, барыш
lixvójd 1. *m*, -n [*s.* לכבוד →(le)koved, kibed, kvod-, nixbed, mexubed, mexabed] прысьвячэньне, пасьвячэньне; 2. *adv.* паважанаму, шаноўнаму (спадару), з павагаю/рэспэктам (у пачатку ліста)
lizxús=lisxús [*s.* לזכות] *adv.* у абарону, на добрае, добрым чынам
liżes *pl.* [*ukr.* лижи, *r.* лыжы] лыжы; **liżnik** *m*, -es, (-nice *f*, -s) лыжнік
ljactk *m*, -e* [*ukr.* глек, *p.* hlak] гляк, глячок (аплецены посуд)
ljadz [*r./ukr.*] ляда
ljader lada] абы(-хто/-што); **ljader** кожны, усякі, любы
• ljader minut кожную хвіліну, праз колькі мінутаў
ljade tog любы дзень
• ljade ver абы-хто, нехта
ljag=ljog/ljok *m* [*p.* lak, *d.* Lacke, Lache] лёк, тузлук, селядзечны расол
ljak=hljak *m*, -es [*ukr.* глек, *p.* hlak] гляк
l(j)ak(ír) *m*, -n [*d.* Lack] ляк
ljal(k)e *f*, -s [*ukr.* ляля, *p.* lalka] ляля, лялька
• śpiln zix in ljalkes гуляцца зь лялькамі
• a štume ljale *fig.* нямое цялё
• teater fun ljalkes лялечны тэатар
ljame *f*, -s [?] (па)гулянка, папойка, выпіўка
ljámeven [*p.* lamować] аблямоўваць; **ljámevke/ljam(k)e** *f*, -s аблямоўка
ljamke *f*, -s [*r./ukr.*] лямка, пастромак
• cien*/šlepn di ljamke цягнуць лямку
ljampke *f*, -s [*p.* lampka] шклянка для віна
ljapen [*ukr.* ляпати] ляпнуць, ляпаць; **ljap** *m* ляп, аплявуха, поўха, пляскач
ljáremen [*d.* lärmen] галасіць, лемантаваць, падымаць трывогу/шум; **ljarem** *m*, -s лямант, гвалт, трывога; **ljáremdiker** шумны, гвалтоўны
• maxn a ljarem узьняць гвалт/шум
ljasken [*ukr.* ляскати] ляскаць, бразгаць; **a ljaske ton*** ляснуць, бразнуць; **ljaskeráj** *f* бразганьне
ljazgen [*r.* лязгать] лязгаць; **a ljazge ton*** лязгануць
ljedašče(r) [*ukr.* ледащий] ляда(ш)чы
ljepke(r) [*p.* lepki] клейкі, ліпкі
l(j)ešč *m*, -n/-es [*r./ukr.* лещ, *p.* leszcz] *zool.* лешч
ljod *m* [*sl.*] лёд; **l(j)odes** *pl.* марожанае, марозіва, лёды
ljog/ljok=ljag *m* лёк, тузлук, селядзечны расол
ljon *m* [*sl.*] лён
ljon *m* [*p.* lon, *ukr.* льоник, *nhd.* lonne] лёнак (затычка на канцы бруса), калок, штыр
l(j)os *m*, -n [*d.* Los] лёс
ljoxe *f*, -s [*p.* locha] лёха, сьвінаматка
ljóxene *f*, -s [*r.* лохань?] міс(к)а, балея
ljuben=hljuben [*p.* lubić, *ukr.* любити] любіць, кахаць, міласваць, галубіць; **ljubken** *iron.* кахаць, мілаваць, галубіць; **ljub(č)e** *f*, -s [*p.* luba] любачка, любая; **ljúbenju/ljúbelju** *n* любачка мая (наша); **ljúbediker** *hum.* улюблівы; **ljubke** *f*, -s інтрыжка, мімалётнае каханьне; **ljubovnik** *m*, -es, (-nice *f*, -s) палюбоўнік, каханак
• Du zolst nit gejn mit kejn andere mejdelex, /du zolst nor gejn, ljubenju, mit mir! /Du zolst nit gejn cu dajn mamenju in štub arajn. /ober kumen zolstu nor cu mir! *ftksl.* Табе нельга хадзіць зь іншымі дзяўчатамі, ты мусіш хадзіць, мой міленькі, са мной! Табе нельга ісьці да сваёй маці ў хату, ты мусіш ісьці толькі да мяне!
ljubistik *m* [*ukr./r.* луб, *p.* łub?] луб
ljucerne *f* [*d.* Lizerne] *bot.* люцэрна
ljuk *m*, -es [*mhd.* lücke, *r.* люк] люк
ljulje-ljulje, ljuli-ljúli(nke) [*ukr.* люлі, *p.* luli] *int.* люлі-люлі; **ljuljen** люляць
• az es iz nito kejn "papu", gejt men "ljulju" *glxv.* калі німа "ням-ням", ідуць "лю-лю"
ljulke *f*, -s [*ukr.* люлька, *p.* lulka] курыльная люлька; **ljúlkecibek** *m*, -es цыбук
• a(n ojs)gerejxerte ljulke пракураная люлька (хітрая бэстыя, біты сабака; прабеглы чалавек, зух)
l(j)uster *m* [*d.* Lüster] глянец, бляск, зьзяньне
l(j)uster *m*, -s, **l(j)ustre** *f*, -s [*d.* Lüster] люстра, жырандоля
l(j)utne *f*, -s [*p.* lutnia] лютня
l(j)uxte *f*, -s [*p.* luchte, *mhd.* luchte] люхт(а), душнік, прадуха
lmaj=(ha)l(e)máj [*s.* למאי(ה)] *bndv./adv.* бо, таму што; д(зе)ля чаго, навошта, чаму, зь якой нагоды
-lo [?] *suf. pejor./vulg.*
• toxterlo дачура; zunderlo сын-сьвін
lóbede/lóbide=lábede *f*, -s [*ukr.* лобода, łoboda] *bot.* лебяда
lobedranjec=labedranec *m*, -nces абадранец
lobn zix (mit) [*d.* laben] мець асалоду; **lobung** *f*, -en асалода
lobus/lobuz/lobes *m*, -es/-n [*p.* łobuz] хлапчук, жэўжык, свавольнік; ёлуп, балдык; **lobusevate(r)/lobuzevate(r)** злосны, зласьлівы; нахабны, наглы
lóbzeg/lójbzeg *f*, -n, *dim.* **lóbzegl** *n*, -ex [*d.* Laubsäge] *texn.* лобзік
locn *m* [*s.* לצון →haloce, lec, opleceven] насьмешка, кпіны, шкелі, жарт, іронія, жартаслоўе [*sin.* oplaxeraj, špot, špas, xojzek]
lod *f*, -n, **lodn** *m*, *pl.* -s/ledn, *dim.* **ledl** *n*, -ex [*d.* Fensterladen] аканіца, ваконьніца
• az me šikt a nar di lodn farmaxn, farmaxt er zej in der gancer štot *glxv.* пашлі дурня зачыніць аканіцы, ён зачыніць іх ва ўсім горадзе (пашлі дурнога, а за ім другога; пашлі дурня маліцца, скажы дурному паклоны біць – ён сабе лоб разаб'е; пашлі асла, а за ім пасла; пашлі дурня на рыбу, дык ён жаб наловіць; пашлі дурака па быка, дык ён цёлку прывядзе)
lód(ene)n* (gelódn/gelódnt) (cu) [*d.* laden] весьці судовую справу, прыцягваць да адказнасьці, падаваць скаргу; **lodn* zix** (mit) судзіцца; **lodung** *f*, -en, **lódeniš** *f/n*, -n цяжба, судовы працэс
• az me tut zix lodn, kumt men saj vi nit cum šodn *glxv.* праз суд страты ня вернеш (калі карман сухі, то і суд глухі; бяз грошы мы і ў судзе нехарошы)
lód(ene)n*/lódeven (gelódn(t)/gelódevet) [*d.* laden] грузіць, накладваць, навальваць; **lod** *f* [*d.* Lade] скрыня, скрынка; **lodung** *f*, -en груз, паклажа, пагрузка
loder *m*, -s [*r.* лодырь] лайдак, гультай

• fojler loder гультай з гультаёў
lodke=lotke *f*, -s [*r.* лодка] лодка, човен; **lódočnik** *m*, -es лодачнік
lodovnje *f*, -s [*p.* lodownia] лядоўня
Lodž *n* г. Лодзь (Польшча)
log *m*, -n [*d.* Lage] 1. складка (на адзежы); 2. пласт, слой
logl *m*, -en [*mhd.* la(e)gel] бурдзюк, мех (для віна)
ló(h)e(te)r (nox, af, cu) [*s.* -להוט] ласы, ахвочы, сквапны, прагны, прагавіты, хцівы [*sin.* brenendiker, giriker]; **ló(h)et-kajt** *f* прагнасьць, ахвота, імкненьне; **lo(h)et zajn*** (nox) гнацца за чымсьці, дамагацца, прагнуцца, імкнуцца
• loheter nox der axile пражэрлівы, ненажэрлівы, ненаедлівы, абжорлівы
loj [*s.* לא] не, ня, ні [*sin.* nejn, ni(ś)t]; **lój-velój** [*s.* ולא] цалкам не, тысячу разоў не
• es iz mikojex axcn un drajcn *fig.* адносна гэтага – не! (18+13=31 – "loj" [*s.* לא] "не")
• (ober gor) loj mit an alef! (mit a spodik/brolivke, mit a fejg unter a dexele) ні за якія пернікі! дулю з маслам! (хвігаю /кукішам падцёр нос; фіндос пад нос) (у процілегласьць: "loj [*s.* לו] mit a vov" калі б...; дай, божа, каб...)
loj almen Jisroel [*s.* לא אלמן ישראל] "не пакінуты (яшчэ) гэбрэі"; яшчэ ёсьць надзея
loj dubim velój jaar [*s.* לא דובים ולא יער] "німа ні мядзьведзя ні лесу"; німа ні пачатку ні канца (ні да печы ні да рэчы; ні да рады ні да звады; ні з пушчы ні з поля)
• loj dubim veloj jaar – nit kejn ber un nit kejn švarce jagdes "німа ні мядзьведзя ні лесу" – німа ні мядзьведзя ні чорных ягадаў
loj boje velój nivre [*s.* לא היה ולא ניברא] гэтага ніколі не было, лухта, бязглузьдзіца, вымудры, прыкла́ды, забабоны
loj hoju dvorim meojlem=lehadám *abr.* [*s.* לא היו דברים מעולם=להד"ם] такога яшчэ ніколі не было, лухта, бязглузьдзіца, вымудры, прыкла́ды, фальш, нішто
loj huxšer dore [*s.* לא הוכשר דרא] пакаленьне да гэтага не дарасло, эпоха гэтага ня варта
loj jimolet [*s.* לא ימלט] не прамінуць
loj jizoxer velój jipoked [*s.* לא יזכר ולא יפקד] "яму аб гэтым ня трэба ані думаць, ані ўзгадваць"; аб гэтым зусім ня варта гаварыць
loj kol odem zojxe [*s.* לא(ו) כל אדם זוכה] ня кожны чалавек – абраньнік лёсу
loj majle velój mojred [*s.* לא מעלה ולא מורד] ні да рады ні да звады (ні да печы ні да рэчы; ні да бока ні да вока)
• dos iz far mir loj majle veloj mojred мне ад гэтага ні горача ні холадна
loj miduvšex/mejukcex, velój mejukcex/miduvšex [*s.* לא מן דובשך, ולא מן עוקצך=לא מדובשך. ולא מעוקצך] *tlmd.* ня трэба мне твайго мёду і твайго джала
• loj miduvšex, veloj mejukcex – nje daj, nje laj *hum. sprxv.* ня трэба мне твайго мёду і твайго джала – ня дай і ня лай (і ня лай і не перапрашай; ня гладзь і не дзяры, і не кусай)
loj(-)aléjxem [*s.* לא־עליכם=ל"ע] ня тут кажучы, не аб вас гаворачы/кажучы, не пра вас сказана, барані/крый вас божа [*sin.* ništ far ajx gedaxt, ništ af/far ajx gezogt]; **loj-aléjxem-diker** *hum.* ня ў лепшым стане, які кепска сябе адчувае
• filn zix lojalejxem адчуваць сябе блага, недамагаць
• ix bin, loj-alejxem, icter štark geengt in gelt (Š.-A.) у мяне зараз, барані вас божа, цяжкае грашовае становішча
• ix bin epes loj-alejxemdik нешта я сябе кепска адчуваю
• loj-alejxem, nit far ajx gezogt барані вас божа, не пра вас сказана
lojbn [*d.* loben] (па)хваліць, усхваляць, славіць; **lójbndiker** які хваліць/славіць; **lojb** *f*, -n, **lojberáj** *f*, -en (па)хвала, усхваленьне; **lójb-cajgeniš** *f*, -n пахвальны аркуш; **lójb-gezang** *m*, -en хвалебны сьпеў, гімн, выхвала; **lójbrede** *f*, -s хвалебная прамова; **lójbvirdiker/lójbverdiker** пахвальны, варты пахвалы
• cerajsn* zix lojbndik парвацца хвалячы
• lojbn emecn in tog/himl arajn (bizn himl) усхваляць/узносіць да нябёс кагосьці
• me meg im derfar lojbn un rimen гэта робіць яму гонар і пашану
• a lojb dem ejberštn! (gelojbt der ejberšter! gelojbt zajn liber nomen! gelojbt iz got!) хвала ўсявышняму/богу! (хай будзе пахвалёны!)
• alejn zix cu lojbn past nit, ober es šat nit *glxv.* сябе хваліць – не пасуе, але й ня шкодзіць
• der, vos lojbt zix alejn, muz hobn šlexte šxejnim *glxv.* хто сам сябе хваліць, мусіць мець кепскіх суседзяў (каб яны яго ганілі)
• tate-mame darfn dem kind nit lojbn, vajl kejner vet zej nit glojbn *glxv.* бацькам ня варта хваліць свайго дзіцяці, бо ніхто ім веры ня дасьць
lojeg-leróš *m* [*s.* לועג־לרש] чалавек, які сьмяецца зь бедных альбо нешчасьлівых людзей
loj(-)dáj [*s.* לא־די] *bndv.* не даволі, ня досыць, мала таго
• loj-daj vos du gejst arum šling un šlang, bistu nox a ligner ojx (M.M.-S.) мала таго што ты брынды б'еш, ты яшчэ і хлус
lojer [*d.* lau] цеплаваты, летні
lójern (af) [*d.* lauern] падпільнаваць, падпільноўваць, сачыць; **lójerer** *m* чалавек, які сочыць, падпільноўвае
loj-filolti [*s.* לא־פיללתי] *tnx.* "не спадзяваўся я (убачыць твой твар)" (Б. 48:11); **lój(-) fidalti** [*s.* לא־פידלתי] "я не іграў на скрыпцы"; гэтага не было, я б хацеў абысьціся бяз гэтага; пародыя на "loj-filolti"
lojfn* (iz gelófn) [*d.* laufen] 1. бегчы, бегаць; 2. *n*, **lo(j)f** *m* (па)бег, зьбег, рывок; 3. *n* правал, няўдача, фіаско; **a lo(j)f ton*** рвануць, пабегчы, зрабіць рывок; **lojfer** *m*, -s, (-n *f*, -s) 1. бягун; 2. *šaxm.* слонь; **lójfern** *f*, -s шлюха, распутніца, блядзь; **lójfiker** беглы, хуткі; бягучы; **lójfndik** *adv.* бягом, бегма; **lójfndiker** бягучы; **lójfeniš** *n*, -n беганіна; **lójfgevet** *n*, -n спаборніцтва па бегу, выперадкі
• der lojf fun der cajt бег часу
• in lojf fun di jorn на працягу гадоў, цягам часу
• lojf un frej zix! бяжы і радуйся!
• lojfike konte бягучы рахунак
• lojfn* af viperedkes бегаць навыперадкі
• lojfn* čvaljom/stromgolovoj/gix/fajl-ojsn-bojgn, on otem бегчы бегма/стрымгалоў/хутка, імчацца стралой
• lojfn* vi a fajl fun bojgn, vi a hirš бегчы стралой з лука, як алень (як куля/вецер/скажэнны/угарэлы, як чэрці зь пекла)
• lojfn* vi an untergešosener, vi a farsamter/mešugener, vi a farsamte mojz бегчы як падстрэлены/угарэлы/вар'ят, як атручаная мыш

• az es gejt, lojft es (gejt es mit alemen) *glxv.* калі ідзе, то й бяжыць (шчасьліваму шчасьце)
• az me git, nemt men, az me šlogt, lojft men *glxv.* даюць – бяры, б'юць – уцякай
• got hot gegebn dem nar hent un fis, un hot im gelozt lojfn *glxv.* бог даў дурню рукі й ногі й пусьціў яго бегаць
• lojfn un kojfn tojg nit *šprxv.* бегучы не купляюць (хто сьпяшыць, той і спатыкаецца, той людзей сьмяшыць; сьпехам нарабіў сьмеху)
• Šaxne/Šapse/Xane, vos lojfstu? *glxv.* Шахна/Шапса/Хана, чаго ты мітусішся? (усе гэтыя імёны зьвязаны са словам "спакой": "Šaxne" [*s.* שכנא - שכן], "Xane" [*s.* חנא - חנה], "Šapse" [*s.* שבתי - שבת])

lojg *m.* -n, **lójgvaser** *f* [*d.* Lauge, *p.* ług] *хем.* луг, шчолак; **lójgiker** лугавы, шчолачны; **lojgn** класьці ў шчолак, вышчалачваць, вылугоўваць; **lojgvarg** *n* мыйны сродак

loj jéxrec(-gelt) *m* [*s.* לא־יחרין] хабар; грошы, якія даюць камусьці, каб той маўчаў аб нечым [*sin.* švajggelt]

loj-júclex *m.* -s. (-te *f*, -s) [*s.* (ס-)לא־יוצלח] нікчэмнік, няўдачнік, няўклюда, няўмека; нехлямяжы, нязграбны, непапаможны чалавек [*sin.* šlimazl, tojgenixts, umgešikter, umbaholfener]; **loj-júclexdiker** нікчэмны, нехлямяжы, нязграбны; брыдкі, агідны (аб зьнешнасьці)

lojki [*s.* לא־כי] ня так, ня верна, ня правільна, ня слушна [*sin.* ništ azoj, ništ rixtik]

loj-kólš(e)ken [*s.* לא־כל־שכן] тым больш, (на)пэўна, безумоўна, вядома, зразумела, бясспрэчна, як жа [*sin.* nox mer, iz dox gevis, avade, apšite šojn]
• hajnt loj-kolšken vos far a pretenzjes veln zej šojn hobn! (Š.-A.) сёньня, зразумела, якія ў іх могуць быць ужо прэтэнзіі

lójmern=léjmern [*s.* לומרן/לאמרן] (вы)казаць, выказваць, (вы)гаварыць, выгаворваць; чытаць мараль, натацыю; навучаць, сароміць [*sin.* (arojs)zogn; arajnzogn, musern]

lojn *m.* -en [*d.* Lohn] плата, узнагарода; **lój(e)nen (zix)** быць выгадным, каштаваць; **lójnbarer, lójn(evd)iker** выгадны, даходны, карысны; **lójnbarkajt** *f*, **lójn(evd)ikajt** *f*, **lojnung** *f* выгаднасьць, мэтазгоднасьць; **lójnarbet** *f* праца па найму; **lójnarbeter** *m*, **lójnnemer** *m*, -s, (-n *f*. -s) наёмны рабочы
• lojnevdik farkojfn epes выгадна прадаць штосьці
• s'lojnt undz maxn dos vos frier нам выгадна зрабіць гэта як мага раней
• vi di arbet, azoj der lojn *šprxv.* якая праца, такі й заробак (як робім, гэтак і маем)

lojne *f* [*d.* Laune] настрой

loj-oléjnu/-eléjnu [*s.* לא־עלינו] не аб нас узгадваючы, не пра/аб нас гаворачы/кажучы
• er iz, loj-olejnu, šver krank ён, не пра нас кажучы, цяжка хворы

loj-sáxmed *m* [*s.* לא־תחמוד] *тэх.* "ня прагні (чужога)" (9-ты запавет) (Вых. 20:17)

lójsese/lójsajse *m*, -s [*s.* לא־תעשה] "не рабі"; забарона нешта рабіць [*sin.* farver; *ant.* ese]

loj-sígnev *m* [*s.* לא־תיגנוב] *тэх.* "не крадзі" (7-мы запавет) (Вых. 20:15)
• er hot avekgeganvet dem Xumeš (dos Xumešl) mit dem (mitn) "loj-signev" ён скраў Тору са словамі "не крадзі" (на вуснах)

loj-sínef *m* [*s.* לא־תינאף] *тэх.* "не чыні пералюбу" (6-ты запавет) (Вых. 20:14)

loj-sírcex/-sércex *m* [*s.* לא־תירצח] *тэх.* "не забівай" (5-ты запавет) (Вых. 20:13)

lojšn [*d.* lauschen] прыслухоўвацца

Lo(j)t [*s.* לוט] *тэх.* Лот; *fig.* п'яніца
• farvos zogt men "šiker vi Lot" un nit vi Nojex, velxer iz geven a trinker nox frier far Lotn? чаму кажуць "п'яны як Лот", а не як Ной, які быў п'яніцам яшчэ раней за Лота?
• šiker vi Lot п'яны як Лот (як гразь/твань/зямля/рамізьнік/шавец/каморнік/Бэйла)
• vajl Nojex, a foter fun draj ojsgegebene zin hot ejgentlex gemegt trinken, ober nit Lot, a tate fun cvej ibergevaksene mojdn чаму ўласна Ной, бацька трох жанатых сыноў, мог піць, а Лот, бацька дзьвюх перасядзелых дачок, ня мог

lojt [*d.* laut] *prep.* паводле; **lojtn=lojt dem**
• lojt der alter gevojnšaft паводле старой звычкі
• lojt di tradicjes паводле традыцыяў
• lojt vi ix ze паводле таго, што я бачу
• lojtn opštam паводле паходжаньня

lojt *m*, -n [*d.* Lot] 1. грузіла; 2. лот (мера вагі: 1/2 унцыі); **lójtvajz** *adv.* лотамі
• beser a lojt mazl, ejder a funt gold лепш унцыя шчасьця, чымся фунт золата
• di krenk kumt centnervajz un gejt avek lojtvajz *šprxv.* хвароба прыходзіць цэнтнэрамі, а сыходзіць лотамі

lojt *f* [*d.* Laute] гітара

lójterer [*d.* lauter, *mhd.* liuter] відавочны, яўны; ясны, чысты, празрысты; спрыяльны (аб надвор'і); **lojter** *adv.* выключна, нічога акрамя, відавочна, скрозь; **lójterkajt** *f* яснасьць, ясната, чыстата
• a lojterer tog ясны дзень

lojve *m*, *pl.* lojvim [*s.* לווה(-ים) →halvoe, malve] даўжнік, вінавайца; чалавек, які бярэ ў пазыку (пазычае) [*sin.* halvoe-nemer, debitor, balxojv]

lojxtes *pl.* [*p.* luchte, *mhd.* luchte] люхты (у печы)

lojxtn*=lajxtn* (gelójxtn) [*d.* leuchten] блішчаць, сьвяціць, зьзяць; **lójxtndiker** які зьзяе/сьвеціцца, сьвятлівы, зіхоткі

lojz *f*, *pl.* lajz, *dim.* **lajzl** *n*, -ex [*d.* Laus] *zool.* вош; **lojzn** вышукваць, шукаць вошы
• az a lojz krixt arajn in a parx, vejs zix der parx nit, vi cu kracn *šprxv.* калі блыха залазіць парху ў галаву, той ня ведае нават, як чухацца

lojzer [*d.* los] 1. вольны, халасты; 2. жыдкі, рыхлы; **lojz vern*** вызваліцца, вызваляцца
• a lojz ej яйка ўсьмятку
• lojz lozn* выпусьціць, выпускаць на волю
• lojz maxn распусьціць, распускаць; вызваліць, вызваляць
• lojzer mogn панос

lok *m/f*, -n, **lokn** *m*, -s, *dim.* **lekl** *n*, -ex [*d.* Locke] локан, пасма, клок, кудзер

lokál *m*, -n [*d.* Lokal] памяшканьне; **lokírn** (lokirt) лякалізаваць

lókern (af, nox) [*d.* Locker] сачыць, высочваць, дапільноўваць; **lókerung** *f*, -en, **loker** *m*, -n пастка, засада; **lókerl** *n*, -ex блешня (рыбалоўная прынада); **lókeršpajz** *f* прынада
• ajnšteln a lokerung nox emecn зрабіць засаду, сачыць за кімсьці
• farčepen di lokeršpajz чапляць прынаду

lokn [*d.* locken] вабіць, прынаджваць, спакушаць; **lókndiker** прывабны, прынадны, спакусьлівы

lokš *m*, -n [*ukr.* локша] локш(ын)а, лакшына; **lokšn** *pl.*,

lókšnzup *m*, **lókšn(-)jojx** *f kul.* лакшыны, локшыны, суп з локшынамі; **lókšener** локшынны; **lókšnbret** *f*, -er дошка для наразаньня локшынаў; **lókš-bojdem(-cibele/-police)** усё роўна што; **lókšn-kugl** *m*, -en *kul.* пірог з локшынаў; **lókšntepl** *n*, -ex гаршчок для гатаваньня локшынаў
• a blat lokšn раскатанае цеста для локшынаў
• a harc vi a lokšnbret сэрца як дошка для наразаньня локшынаў (бы заезджая/заездна карчма)
• a hinerše lokšn-jojx (lokšn mit jojx) *kul.* локшыны з курыцай (курыны суп)
• brokn lokšn *fig.* ламаць локшыны (малоць/малаціць/мянціць языком; вярзьці лухту)
• kalte lokšn *fig.* марная справа
• xapn di lokšn far di fiš *fig.* хапаць/есьці локшыны перад рыбай (перад невалам рыбу лавіць; забягаць наперад; рабіць наадварот)
• a simen – a lokš afn bord! доказ – локшыны на барадзе! (з анэкдоту)
• er iz gekumen mitn dišel in di lokšn arajn *glxv.* ён прыцягнуўся з дышлям у локшыны (аб чалавеку, які з дарогі спазьніўся на вячэру ў пятніцу)
• es nit di lokšn far šabes *glxv.* ня еж локшынаў раней суботы
• gots nisim – draj lokšnteplex in ejnem! *glxv.* боскія цуды – тры гаршкі ў адным! (кажуць, калі нехта зьдзіўляецца глупству)
• Lomir zingen, kinderlex, a zemerl cuzamen, /a nigndl, a frejlexn mit vertelex in gramen. / Di mame koxt a lokšnzup mit kaše un di knejdlex. /Cum kinder-jontev kumt aher, mir špiln zix in drejdlex! /Čiri-bim, čiri-bom... *flksl.* Давайма, дзеткі, засьпяваем разам, песеньку, вясёлую з рыфмаванымі словамі. Маці варыць суп з локшынамі, кашу й клёцкі. Надыходзіць дзіцячае сьвята, мы гуляемся з ваўчкамі.
• m'ken nit zajn štarker far a lokšn-kugl *iron.* німа нічога мацнейшага за кугаль з локшынаў
• ot azoj koxt men di lokšn! *hum. glxv.* дык вось як вараць локшыны!

lom *m*, -en [*r./ukr.* лом, *p.* łom] лом

lomdim *pl.* →lamdn *m*, *pl.* lamdonim [*s.* (לומדים/-ים)למדן] настаўнік, талмудыст; **lomdes** *n* [*s.* לומדות] вучонасьць, эрудыцыя, адукаванасьць у галіне юдаізму; **lómdišer** вучоны, адукаваны

lomer [*d.* lahm] крывы, кульгавы; **lomen** (af) кульгаць
• az a lomer lojft, un a nar kojft, kumen bejde glajx on *šprxv.* што кульгаваму бегчы, што дурню купляць
• az me hot a krom, iz men vi lom *glxv.* хто мае краму – быццам кульгавы

lomir=nomir=loz mir [*d.*] давайма, давай(це) мы (загадны лад 1-й асобы множнага ліку); **lomix=nomix=loz mix** да(ва)й я (загадны лад 1-й асобы адзіночнага ліку)
• lomir zingen давайма сьпяваць
• lomir zix iberbetn, iberbetn, /loz di mame visn, /lomir zix iberbetn, /lomir zix cekišn *flksl.* давай перапросімся, хай маці ведае, давай перапросімся, давай пацалуемся

loml *f* [*mhd.* lamel] лязо

lomp *m*, *pl.* -n/lemp, *dim.* **lempl** *n*, -ex [*d.* Lampe] лямпа; **lómpn-fiber** *m* хваляваньне перад выхадам на сцэну
• redn* cum lomp гаварыць да лямпачкі (як гарохам у сьцяну)
• šemen iz gut cu der lomp *glxv.* сорам добры для лямпы (*vrtš.* "šemen zix" саромецца - "šemen" [*s.* שמן] алей)
• zolst zajn vi a lomp: hengen ba tog, brenen ba naxt un ojsgejn zolstu in der fri! *kll.* каб ты быў як лямпа: віселі удзень, гарэў уначы й згас раніцам!

lončen [*p.* łączyć?] лашчыць, песьціць

lončnik *m*, -es [*p.* łącznik] стык; *plgr.* злучок, дэфіс

lonke *f*, -s [*p.* łan, łąka, *ukr.* лан, лон] лонка, луг, сенажаць
• ojslejgn dem flaks af der lonke разаслаць лён на лугу

lopčen [*r.* лопчить] сьвярбець, гарэць, пячы
• es iz volvl un lopčet *glxv.* гэта танна і пячэ

lopen/lopn(j)en лопнуць

lópete *f*, -s [*r./ukr.* лопата, *p.* łopata] лапата, рыдаль, рыдлёўка, жалязьняк
• lopetes un kočeres *fig.* каракулі, грымзолі
• šarn gelt mit lopetes грэбці грошы лапатай

lópetke *f*, -s [*r./ukr.* лопатка, *p.* łopatka] 1. *anat.* лапатка; 2. лапатка, лопасьць; (тэх) шпатэль
• aveklejgn emecn af bejde lopetkes палажыць кагосьці на абедзьве лапаткі

lopúx *m*, -n [*r./ukr.* лопух, *p.* łopuch] *bot.* лопух

lórberner [*d.* Lorbeer] ляўровы; **lórber-blat** *n*, *pl.* -bleter ляўровы ліст; **lórber(-)bojm** *m*, *pl.* -bejmer ляўр; **lórber-kranc** *m*, *pl.* -krenc ляўровы вянок
• ruen af di lorberkranc спачываць на ляўрах
• lejg nit af dajn kop kejn lorber-kranc, zoln dos ton andere не ўскладай на сваю галаву ляўровы вянок, хай гэта зробяць іншыя

los *m*, -n/-es, (-ixe *f*, -s) [*r./ukr.* лось, *p.* łoś] *zool.* лось; **lósener** ласіны

los=ljos *m*, -n лёс

lošek/lošik *m*, -es, **loškl** *n*, -ex [*ukr.* лоша, *p.* łoszę] жарабя, жарабё; **lóšik-ekl** *n*, -ex конскі хвосьцік (фрызура)
• Joške, Joške, špan dem lošik, /lomir gixer lojfn! /Tomer vet er zix opšteln, /veln mir im nit kojfn. *flksl.* Яшка, запрагай жарабё, давайма хутчэй пабяжым! Калі ён спыніцца, мы яго ня купім.

lošn *n*, *pl.* lešojnes [*s.* (לשון(-ות →malšines, bal-lošn] мова, гаворка, гутарка, словы, прамова; здольнасьць гаварыць [*sin.* šprax; rejd, verter; feikajt cu redn]; **lóšenen** *argo* балбатаць, выхваляцца; **lošn-hóre** *f/n* [*s.* הרע] зласлоўе, абгавор, плёткі, паклёп, зьнявага, абраза; **lošnhórenik** *m*, -es паклёпнік; **lošn-jóxed/-jóxid** *n* [*s.* יחיד] *gram.* адзіночны лік; **lošn-hakójdeš** *n* [*s.* קודש(ה)] "сьвятая мова"; гэбрэйска-арамэйская мова, мова Танаху, мова рэлігійнага культу; **lošn-kójdeš(dik)er** гэбрэйска-арамэйскі; **lošn-nekéjve** *n* [*s.* נקבה] *gram.* жаночы род; **lošn-nekíe** *n* [*s.* נקיה] "чыстая мова"; эўфэмізм; **lošn-rábim** *n* [*s.* רבים] *gram.* множны лік; **lošn-sagenó(h)er /-seginóer** *n* [*s.* סגי־נהור] замаск(ір)аваная/эзопаўская мова; **lošn-zóxer** *n* [*s.* זכר] *gram.* мужчынскі род
• arójs mit lošn! разгаварыўся!
• cung, gib lošn! язык, дай мову!
• farlirn* dos lošn (blajbn* on lošn) страціць/адняць/адабраць мову
• redn* lošnhore (af) зласловіць, узьвесьці паклёп, абмоўляць, абгаварыць
• s'iz ba emecn opgenumen gevorn dos lošn прыліп у кагосьці язык да глоткі
• lošn-hore iz di ergste mide un greste core *šprxv.* паклёп – найгоршая звычка і найвялікшае ліха

• opnemen zol dir dos lošn! *kll.* каб табе мову адняло! (каб ты языком не павярнуў!)
• verem zoln esn dajn flejš/lajb! *kll.* няхай цябе чэрві апануюць! (чэрві тачы тваю галаву!)
• vos me šemt zix cu zogn af jidiš, zogt men af lošn-kojdeš *šprxv.* калі сорам сказаць на ідышы, кажуць на "сьвятой мове"

lot *m*, -n [*d.* Lot] *texn.* адвес

loter/lotre *m*, -s [*mhd.* lot(t)er, *p.* łotr] лотр, латруга, гультай, лайдак; п'яніца

lotviš 1. *n* [*d.* lettisch] латыская мова; 2. *m*, -n латыш; **lótvišer=látvišer** латыскі

lovke(r) [*r./ukr.* ловкий] спрытны; **lovkost** *n*, -n спрыт(насьць)

Lovn (Hoarami) *m* [*s.* (הארמי) לבן] *tnx.* Лаван (цесьць Якуба); *fig.* ашуканец, ашукальнік, падшывальнік, абакула, круцель, вілаводнік, манюка, чмурыла, махціц [*sin.* opnarer, švindler, drejer]

lox *m/in*, *pl.* lexer, *dim.* **lexl** *n*, -ex, **léxele** *n*, -x [*d.* Loch] дзір(к)а

• farkrixn* in a lox залезьці ў дзірку
• maxn emecn a lox in kop/harcn зрабіць камусьці дзірку ў галаве/сэрцы (пратрубіць вушы)
• a lox in himl/spodik/boršt дзірка ў небе/шапцы/баршчы (цесьць аб чым плакаць)
• a lox in kešene! дзірка/пуста ў кішэні!
• a lox in štetl! *iron.* дзірка ў мястэчку! (калі чагосьці бракуе, але можна абысьціся й так)
• a lox maxt a ganev (un a ganev maxt a lox) *šprxv.* дзірка робіць злодзея (і злодзей робіць дзірку) (ня вінна сьвінка, а вінна дзірка)
• a lox vi a tojer дзірка як брама
• beser a lox in kešene, ejder a lox in harcn *glxv.* лепей дзірка ў кішэні, чым дзірка ў сэрцы
• me darf dos (nejtik) vi a lox in kop (vi kopvejtik) гэта патрэбна як дзірка/боль у галаве (як валасьсё ў носе)
• ništ di mojz iz der ganev, nor der/dos lox iz der ganev *šprxv.* мыш – ня злодзей, дзірка – злодзей (ня вінна сьвінка, а вінна дзірка)

lox(é/éj)n [*s.* לכן] *adv.* таму, вось чаму, праз тое, дзеля таго /гэтага, з прычыны таго, за гэта/гэнае/тое [*sin.* deriber, derfar]

loze *f*, -s [*p.* łoza] *bot.* лаза; дубец

loz=l(j)os *m*, -n лёс

-loz [*d.* -los] *suf.* бес(ь), без(ь)-, бяс(ь)-, бяз(ь)- (надае прыметнікам значэньне адсутнасьці чагосьці)

• endloz(ik)er бясконцы; blutlozer бяскроўны

lozn* (gelózn/gelózt) [*d.* lassen] 1. пусьціць, пускаць; 2. пакінуць, пакідаць; 3. зда(ва)ць, спасьці, спадаць; 4. *n* (за)пуск (рухавіка); увод; пачатак крыгалому на рэках; **a loz ton*** кінуць

• alc, vos es lozt zix усё, што магчыма
• dos lozn in gang увод у дзеяньне
• loz nor zajn gelt, vet men bacoln як толькі будуць грошы, адразу заплацяць
• lozn* a jeruše, an ort, špurn пакінуць спадчыну/месца/сьляды
• lozn* afn cvejtn jor пакінуць на другі год
• lozn* an oder пусьціць кроў
• lozn* far zix пакінуць за сабой (для сябе)
• lozn* in farkojf/farker пусьціць у продаж/абарот
• lozn* in galop пусьціць у галёп
• lozn* in gang ale mitlen пусьціць у ход усе сродкі
• lozn* in gang di hent даваць волю рукам
• lozn* špilkes падпускаць шпількі
• lozn* zix in veg/tanc пусьціцца ў дарогу/танец
• lozn* zix lojfn пусьціцца наўцёкі, задаць лататы
• lozn* zix mitn veg (fun) устаць на шлях
• lozn* zix vajter уцякаць
• loz zi hejsn šejndele, loz zi hejsn krejndele – abi a kale (abi a mojd) *glxv.* хай будзе красачка, хай будзе ясачка – абы нявеста (усё адно якая)

ložírn (ložírt) [*d.* logieren] пражываць; **loží** *m*, -en жытло

lub *m* [*ukr./r.* луб, *p.* łub] луб; **lubjanke** *f*, -s [*p.* łubianka] лубянка (кошык)

lubin=lupin *m*, -en [*p.* łubin, lubin] *bot.* лубін

lučin(k)e *f*, -s [*r./ukr.* лучина] лучын(к)а; **lučnik** *m*, -es лучнік (прыстасаваньне для асьвятленьня хаты, у якім гарэла лучына)

luder *m*, -s [*mhd.* lot(t)er] лодар, лотр, гультай

luex *m*, *pl.* -n/luxes [*s.* (לוח-)לוח] гэбрэйскі месячны каляндар

• alte luxes старыя календары
• an ibergezesene/ibergevaksene mojd iz vi a farajoriker luex *glxv.* перасядзелая/пераросłая дзеўка, як леташні/лонскі каляндар
• cum štarbn darf men kejn luex nit hobn *glxv.* каб памерці, ня трэба мець месячны каляндар (без пары ня ўмерці; усё роўна, ці сягоньня ўміраць ці ў заўтра)
• der luex treft ojx a mol *šprxv.* некалі і месячны каляндар супадае
• der malex-hamoves kukt nit in luex *šprxv.* сьмерць ня гляджіць календару (сьмерць і радзіны не выбіраюць радзіны; сьмерць ускоча, калі захоча)
• ver es koxt noxn bux, un zejet noxn luex, der hot a ruex *glxv.* хто варыць па кнізе і сее па календары, той чорта што мае

luft *f* [*d.* Luft] паветра; **lúftiker** 1. паветраны; 2. халаднаваты, сьвежы, лёгкі, прасторны; **lúftikajt** *f* халадок, сьвежасьць, лёгкасьць, прасторнасьць; **lúftern** праветры-(ва)ць; **lúfterung** *f*, -en праветрываньне; **luftl** *n*, -ex *bot.* дзьмухавец; **lúftloz(ik)er** беспаветраны; **lúft-balon** *m*, -en паветраны шар; **lúft(-)menč** *m*, -n (a lúftike paršójn) ветрагон, лёгкадумны чалавек; **lúftrer** *f*, -n *anat.* трахея, дыхальнае горла; **lúftrojm** *m* паветраная прастора; **lúftšik** *m*, -es, **lúftšikl** *n*, -ex фортка, фортачка; **lúftšlos** *m*, *pl.* -šleser паветраны замак

• af der frajer luft на вольным паветры
• af frišer luft bakumen rojte beklex ад сьвежага паветра чырванеюць шчочкі
• arojsgejn* af der frajer/frišer luft выйсьці на сьвежае паветра
• hengen* in (der) lufin вісець у паветры
• in der luft hot zix gefilt, az der friling iz noent у паветры адчувалася блізкая вясна
• luftern di šprax рот халадзіць (ваду малоць; языком лапці плесьці; лады разводзіць)
• otemen mit luft дыхаць паветрам
• s'cit do a luft тут дзьме
• špringen* in der lufin (fun) скакаць ад радасьці

lugn (af) [*mhd.* luogen] назіраць, сачыць, дзівіцца (патаемна), красьціся

luhaške *f*, -s [*v.*] *zool.* люгашка, ляг(ух)а, жаба

luke *f*, -s [*mhd.* lücke, *r.* люк] *texn.* люк

Lúkeml мястэчка Лукамля (Беларусь)

• "nu" iz in Lukoml "ну" – у Лукамлі (кажуць чалавеку, які часта "нукае" (nu... nu...); Лукамля стаіць на ўзгорках, і фурманы ўвесь час панукалі коней)

Luknik [*lit.* Luoke] мястэчка Лукнік (Літва)

• ven ništ di lukniker jidn, voltn di škocim kejn štejner ništ gevorfn калі б не лукніцкія жыды, шалапуты ня сталі б камяні шпурляць

luks *m*, -n [*d.* Luchs] *zool.* рысь

lulev *m*, *pl.* lulovim [*s.* (לולב-)ים] пальмавая галіна (зьвязаная разам з галінамі мірта і вярбы, выкарыстоўваецца сумесна з цытронам для блаславеньня на Сукэс)

• a lulev mit an esreg пальмавая галіна з цытронам (несумяшчальныя рэчы: дужа малы і дужа вялікі)

• der esreg kost dos gance gelt, un ibern lulev maxt men di broxe *glxv.* цытрон каштуе ўсіх грошай, але бласлаўляюць пальмавую галіну

• er zet ojs vi a cebroxener lulev *glxv.* ён выглядае як паламаная пальмавая галіна (аб згорбленым чалавеку)

lumen=hlumen zix (iber) [*ukr.* глумити, *p.* głum] глуміцца

lump *m*, -n [*d.* Lump] басяк, нягоднік; **lumperáj** *n* басяцтва, нягоднічтва; **lúmpiker** жабрацкі, басяцкі, зрэбны, абадраны

lumpn *m* [*d.* Lumpen] ануча, вяхотка

lung *f*, -en [*d.* Lunge] *anat.* лёгкае; **lúngen-oncindung** *f*, -en *med.* запаленьне лёгкіх; **lúng(en-)feler** *m*, -s хвароба лёгкіх, сухоты; **lung-un-léber** *m kul.* лівер, сальцісон

• a kalter lung-un-leber *fig. hum.* сухар, чэрствы, абыякавы чалавек (і не шманае, і ў вус ня дзьме)

• ojsesn* zix di lung мець згрызоту, мучыцца

• onhengen* emecn a lung-un-leber af/unter der noz *hum.* навесіць камусьці ліверу на/пад нос (пра жураўля на хвойцы расказваць; лухту непадсяваную лухціць)

• ba im – vos af der lung, dos af der cung *glxv.* у яго – што на ўме, тое на языку

• ejner hot es af der lung, der anderer af der cung *glxv.* у аднаго на ўме, у другога на языку (што цьвярозы думае, п'яны скажа)

lunk *m*, -en [*d.* lenken?] вывіх; **a lunk ton*** вы-, зь|віхнуць, спрывіліць

lupe *f*, -s [*mhd.* lobbe, *p.* łupy] лупа, надзьмутая губа

• šteln/maxn lupes вусны закапыліць (грыбы надзьмуць)

lupe *f*, -s [*d.* Lupe] люпа

lup(e)n [*ukr.* лупити, *p.* łupić] (аб)лупіць, (аб)чысьціць, абчышчаць; **lupine** *f*, -s лупіна, лупіньне, шалупіньне

lúpete *f*, -s [?] ануча

luste *f*, -s [*r./ukr.*] луста

luster *m*, -s, **lustre** *f*, -s люстра, жырандоль

lústiker [*d.* lustig] вясёлы; **lust** *f* радасьць, асалода; жаданьне, ахвота; **lústikajt** *f* вясёласьць; **lústrajze** *f*, -s падарожжа (дзеля забавы)

• a lustike kompanje/štimung вясёлая кумпанія, вясёлы настрой

• zix lustik maxn (iber) весяліцца

• a lustiker dales gejt iber ales *glxv.* вясёлая беднасьць ўсё адолее

luščen [*ukr.* лущити, *p.* łuszczyć] лушчыць, лузаць; **luške /luske=liške** *f*, -s луска

lušen=hlušen/(h)lišen [*p.* głuszyć, *ukr.* глушити] глушыць

lušpajke *f*, -s [*r./ukr.*] лушпайка

lutnje=ljutne *f*, -s *muz.* лютня

luxes *pl.* →luex [*s.* (לוח-)ות] гэбрэйскі месячны каляндар; **luxes(-habrís)** *pl.* [*s.* חברית →šejne-luxes-habris] *tnx.* скрыжалі Майсея [*sin.* tovlen]

luxte=ljuxte *f*, -s люхта, душнік, прадуха

lúže *f*, -s [*r./ukr.*] лужа, лужына, калюга

M

M=mem *m/f*, -en [*s.* (מֵם-)עַיִן] 1. "мэм", літара гэбрэйскага альфабэту; 2. лічба 40; **lange(r) mem** [*s.* ם →šlos-mem] літара "m", якая пішацца напрыканцы слова
m'=me(n)
m=meter *m*, -s [*d.* Meter] мэтар
ma [?] *int.* няхай, тым горш
ma(-)=mo=me [*s.* (־)מָה] *int.* што? як!? [*sin.* vos; vi]
ma li lešaker [*s.* מה לי לשקר] чаму я павінны хлусіць? зь якой нагоды я мушу хлусіць?
ma piši [*s.* מה פשעי] якая мая віна? чым я саграшыў?
ma šine [*s.* מה שינוי] якая розьніца?
• ma šine gehupt, ma šine gešprungen? *glxv.* якая розьніца (як маліцца): ці з падскокам, ці подскакам (ці пень, ці калода, усё патарч носам; ці савою аб пень, ці пнём аб саву)
ma šmexem [*s.* מה שמכם] як вас завуць?; **ma šmexo** [*s.* שמך] як цябе завуць/клічуць? якое тваё імя? [*sin.* vi hejstu? vi iz dajn nomen?]
maamakim [*s.* מעמקים →amkes, majmek, mimaamakim, omek] глыбокія месцы, глыбіні, глыбокасьці [*sin.* tifenišn, tifkajtn]
maapilim *pl* [*s.* מעפילים] "сьмелыя, адважныя, папярэднікі" (азначэньне для гэбрэйскіх імігрантаў, якія ўварваліся ў Палестыну насуперак забароне англійскай улады) [*sin.* gevagte, forojsgejer]
maare=mejre=majre=meore *f*, -s [*s.* (־ות)מְעָרָה] 1. пячора, бярлог, логавішча, грот; 2. надгробак, грабніца
má-bekáx [*s.* מה־בכך] *int.* дык што ж? якога ж гэта роду? [*sin.* to vos iz? vos że art es?]
mabl *m*, -en [*s.* (־עַן)מַבּוּל] *mx.* патоп; залева, улева, зьліва, ліўень [*sin.* farflejcung, gos]; **mábldiker** праліўны (дождж); **mablen** як зь вядра хлястаць/ліць/плюшчыць; **mabl bimej Nojex** [*s.* בימי נ(ו)ח] *mx.* сусьветны патоп у часы Ноя
• a mabl zol af dir kumen vi af Sdom! *kll.* а бадай на цябе садомскі патоп!
• got hot gešvojrn, es zol mer kejn mabl nit zajn *glxv.* бог паабяцаў, што больш патопу ня будзе
macdek zajn* [*s.* מצדיק →cadek, cdoke, cedejkes, cidkes] апраўд(в)аць, справядліва вытлумачыць, не пратэставаць [*sin.* barextikn, derklern far gerext, onnemen on protest]; **macdek-hadín zajn*** [*s.* הדין־] прыняць/прымаць за справядлівасьць боскі прысуд; зьмірыцца, зьмірацца (зь лёсам), скарыцца, скарацца
mace *f*, -s [*s.* (־ות)מצה] маца (тонкія сухія праснакі з пшанічнай мукі (зь няквашанага цеста), якія ядуць на Пэйсах); **máce-beker** *m*, -s *fig.* вахляй, дзяньгуб, абібок, біндус, баглай; **máce-mel** *f/n* змолатая ў муку маца (у ёй укачваюць рыбу і іншыя прадукты перад смажаньнем, а таксама яе дадаюць у мясныя, рыбныя і гароднінныя катлеты або зь яе робяць клёцкі); **máce-redl** *n*, -ex зубчатае колца, з дапамогай якога робіцца маца; **máce-redler** *m* чалавек, які пракатвае цеста для мацы зубчатым колцам; **(mace-)šmúre** *f* [*s.* שמורה] "захаваная маца" (мука для мацы адмысловым чынам захоўваецца ад вільгаці); **máce-vaser** *n* [→maim-šelonu] чыстая вада, якая ідзе на прыгатаваньне мацы; *fig.* нешта такое, што ўсе прагнуць набыць
• farkojfn zix vi mace-vaser прадавацца нарасхват
• af maces un af taxrixim muz zajn *glxv.* на мацу і на саван мусіш мець (грошы) (жывы не бяз хаты, а мрэц не без магілы)
• er zict vi a mace-beker *glxv.* ён лайдачыць, лодырнічае (працуе толькі раз на год, як пекар, які выпякае мацу)
• maces un vajn muz zajn – šmalc un ejer nit zejer *glxv.* маца і віно неабходны – шмальц і яйкі неабавязкова
• me lojft vi nox mace-vaser *glxv.* бягуць як за вадой для мацы
• s'gejt vi mace-vaser разыходзіцца як вада на мацу
• velfele, velfele, rir mix nit on, ix gej maces bakn *glxv.* ваўчок, ваўчок, не чапай мяне, я іду мацу пячы
macejve *f*, -s [*s.* (־ות)מצבה] надмагільны помнік, манумэнт [*sin.* denkmolštejn, monument]; **macéjve-ufdekung** *f*, -en зьняцьце покрыва з надмагільнага помніка; **macéjve-ufšrift** *f*, -n надмагільны надпіс
• af der macejve zajnen ale jidn šejn *glxv.* на помніку ўсе жыды прыгожыя
• er iz a šejner paršojn – af der macejve *glxv.* ён прыстойны тып – на помніку
• Oj, oj, s'a jomer un a klog, /cvej gelibte in ejn axt-tog. /Af der macejve vet zajn gešribn, /az cvej gelibte iz do farblibn. *flksl.* Ой-ой, плач і лямант, двое закаханых на адным тыдні. На помніку напішуць, што двое закаханых тут засталіся.
macen [*ukr.* мацати, *p.* macać] мацаць
macev *m* [*s.* מצב] сытуацыя, стан(овішча) [*sin.* situacje, cušt and]
• der macev fun zajn gezunt hot zix farbesert стан ягонага здароўя палепшаў
macl zajn* [*s.* מצל →nicl, misnacl] у-, (вы)ратаваць, у-, вы|ратоўваць [*sin.* (op)rateven]
macliex zajn* [*s.* מצליח →(bal)muclex, balmacliex, hacloxe, šo-muclaxes] мець посьпех, удачу; ручыць, шанцаваць, шаньціць; ашчасьлівіць, (па)дарыць шчасьце [*sin.* hobn derfolg, baglikn; bašern glik, šenken hacloxe]
• vinčn* macliex zajn* жадаць посьпеху
• zajt macliex! жадаю вам посьпеху! хай вам пашанцуе!
• zol šojn zajn a grojser jarid in ganejdn, un zolst dortn macliex zajn! *kll.* каб ужо ж у раі быў вялікі кірмаш, і ты там зрабіў посьпех!
mačejuvke *f*, -s [*p.* macejówka] шапка з брылём
mad=mojd *f*, *pl.* -n/mejdn [*d.* Mädchen, *mhd.* mait, meide] дзеўка, дзяўчына, дзяўчо
made *f* [*s.* מדע] навука; літаральныя/дакладныя веды [*sin.* visnšaft, veltlex visn]
madejre *f*, -s [*šp.* madéra, *p.* madera] мадэра (віно)
madex [*s.* מהדאך] *tlmd.* калі (для ўжытку ў лёгіцы) [*sin.* ojb, az, ven]
• madex x'hob nit dercejlt dem tatn – zol ix dir dercejln? калі я не расказваў гэтага роднаму бацьку – няўжо расказжу табе?
madfes/madpes=matpes/matfes *m*, *pl.* matpisim/matfisim [*s.* (־ים)מדפיס] друкар, выдавец
madjár *m*, -n [*p.* madiar, *ukr.* мадяр] мадзяр, вэнгар, вугорац; **madjárišer** вэнгэрскі, вугорскі, мадзярскі
madrejge *f*, -s [*s.* (־ות)מדרגה] ступень, узровень, стадыя [*sin.* nivo, štapl, stadje]
• aropgejn* fun der madrejge спусьціцца ўніз з вышыні
• hexste madrejge найвышэйшая ступень
• zi hot derhojbt rejnkajt cu der madrejge fun an extn kult яна ўзьвяла чысьціню ў сапраўдны культ
• me štarbt nit frier, biz me kumt nit curik af der eršter madrejge *šprxv.* перад сьмерцю чалавек вяртаецца на першы ўзровень

madrex/madrix *m*, *pl.* madrixim [*s.* (-ים)מדריך →hadroxe] мэнтар. выхавальнік, выхавацель, настаўнік, п(р)авадыр, вож [*sin.* vegvajzer, firer, dercier]; **madrex/madrix zajn*** выхоўваць, павучаць, настаўляць (духоўна)
• fun a madrex павучальны

madxe=matxe zajn* [*s.* מדחה →dojxe] адпіхнуць, адпіхаць, адагнаць, адганяць ад сябе; адкласьці, адкладаць, адцягнуць, адцягваць

madzgen/madž(g)en [*v.*] мадзгаць, пэцкаць, вэдзгаць, мазаць (займацца чымсьці непрафэсійна, па-дылетанску); **madzge/madžge** *f*, -s мазьня, мазаніна; **madzger** *m*, -s, (-ke *f*, -s) мазіла, пэцкаль, дылетант, аматар, непрафэсіянал

mafcer zajn* [*s.* מפציר] моцна прасіць, прыста(ва)ць [*sin.* štark betn, cuštejn]

mafker zajn* [*s.* מפקיר →pojker, hefker] прыносіць, прынесьці ў ахвяру, ахвяраваць (нечым); рызыкаваць (нечым) дзеля вышэйшай мэты; зрачыся, зракацца, выцурацца; пакінуць без нагляду, пакарыцца выпадку

mafleg zajn* [*s.* מפליג] высунуць, высоўваць, напіраць, падкрэсьлі(ва)ць, выхваліць, выхваляць, перавялічыць, перавялічваць, перабольшыць, перабольшваць [*sin.* arojshejbn, ojslojbn, ibertrajbn]

mafle-lájses [*s.* מפליא־לעשות →pe(j)le, pile-ploim, (majse-)nifle, nisim-venifloes, nispoel, hafle-vofele, plie] "паказвае цуды" (апошнія словы бласлаўленьня "ašer-jocer")
• mafle-lajses šur-/s(j)ur-bur *hum.* велічэзныя фокусы, разумныя выдумкі, вымудры; на скорую руку, сьпехам

mafsek/mafsik zajn* [*s.* מפסיק →hafsoke] перар(ы)ваць, перапыніць, перапыняць, перабі(ва)ць (работу/малітву) [*sin.* iberrajsn, iberhakn; redn in mitn davnen]; **mafsek-mišnóse zajn*** [*s.* משנתו־] пера-, с|пыніць, пера-, с|пыняць навучаньне

maftejex *m*, *pl.* maftejxes [*s.* (-ות)מפתח] паказальнік, індэкс (у кнізе)

mafter/maftir *m*, -s [*s.* (-ם)מפטיר →haftojre, balmafter] 1. апошняе і ганаровае запрашэньне да чытаньня Торы ў сынагозе, заканчэньне чытаньня Торы ў суботу і ў сьвяты; 2. гэбрэй, які апошнім чытае Тору
• gebn* emecn a mafter (за)даць камусьці пытлю/зыра/лазьні/(а)фаеру
• ongefregt zix a mafter! дагуляліся!
• zix (ajn)kojfn mafter заблытацца ў справах, (з)рабіць глупства, наклікаць на сябе бяду
• az me fregt, fregt men zix on mafter (derfregt men zix) *šprxv.* хто пытае, той дапытаецца (пытаючыся, дапытаешся; язык і кія дапытаецца)
• ejn man hot lib smetene, un der anderer mafter (ejner hot lib di zojermilx, der cvejter – mafter) *glxv.* адзін чалавек любіць сьмятану/сыракваШу, другі – пашану (адзін хоча тое, другі сёе; хто любіць гарбуз, а хто агуркі; хто едзе па снасьці, а хто па шчасьці)
• kojm puct zix ejner op di štivl, ruft men im šojn af mafter *glxv.* не пасьпеў начысьціць боты, ужо шаноўны чалавек (хто мае грошы, той добры і харошы)

maftiex=mavtiex zajn* [*s.* מבטיח →betuex, bitoxn, havtoxe] (па)абяцаць, запэўніць, запэўняць [*sin.* cuzogn, farzixern]
• maftiex zajn un nit opgebn, faršport men a krom cu hobn *glxv.* абяцаць, але не выконваць – зьбераженш краму

mafxn=mavxn zajn* [*s.* מבחין →bxine] адрозьні(ва)ць, распазна(ва)ць, давед(в)ацца розьніцу [*sin.* unteršejdn, derkenen dem unteršejd]

magazín *m*, -en [*d.* Magazin] 1. магазын, крама; 2. часопіс; **magazinér** *m*, -s крамнік, кладаўшчык

magbil zajn* [*s.* מגביל →gvul] пастанавіць, пастанаўляць, (вы)рашыць, (вы)рашаць, вы-, на-, а|значыць, вы-, на-, а|значаць [*sin.* baštimen]

maged/magid *m*, *pl.* magidim [*s.* (-ים)מגיד →Hagode] (юдэйскі) прапаведнік [*sin.* prejdiker, zoger, baldaršn]; **mágedke** *f*, -s жонка прапаведніка; **magides** *n* [*s.* -ות] прапаведніцтва, казаньне; **magídeste** *f*, -s прапаведніца

magejfe *f*, -s [*s.* (מגי)פה(-ות)] падзёж, здыхата, паморак, эпідэмія, пошасьць [*sin.* epidemje]
• a magejfe zol af dir kumen! *kll.* каб на цябе чума чорная найшла!
• in a magejfe iz a cig ojx a behejme (az es kumt a magejfe af fi, vert a cig ojx farrexnt als a behejme) *glxv.* як паморак, дык і каза пойдзе за карову (калі німа рыб, добры і грыб; як німа мяса, то і грыб закраса)

mage(-u)máse *m/f*, -s (mit) [*s.* (-ם)מגע־ומשא] дотык, сутыкненьне, кантакт, дачыненьне, зносіны, адносіны, стасункі (часта ў нэгатыўным сэнсе) [*sin.* barirung, baciung, kontakt]
• hobn* a mage-umase (mit) знацца, мець агульную справу
• nit hobn* mit emecn kejn mage-umase ня мець з кімсьці ніякай агульнай справы

magie *m*, *pl.* magiim [*s.* (-ים)מגיה →bal-magie] карэктар, выпраўца, выпраўляльнік [*sin.* korektor, durxkuker]; **magie zajn*** рабіць карэктуру, выпраўляць

magistrát *m*, -n [*d.* Magistrat] магістрат
• kop mojex mágistrat! *iron.* моцная галава! (мазгі густыя, розуму багата, чэрап густа варыць)

magl *m*, -en/-jes, **mangl** *m*, -en [*d.* Mangel, *p.* magiel] маглі, качалка; **mágl(j)even/maglen** качаць, маглявaць, прасаваць (бялізну)

mágnét *m*, -n [*d.* Magnet] магнэс; **magnétišer** магнэсавы; **mágnet-ajznštejn** *m min.* магнэсавы жалязьняк
• kools kerbl hot in zix magnet *glxv.* кагальны рубель мае ў сабе магнэс
• s'cit vi a magnet цягне як магнэс
• M'hot mir geredt kales mit nadn /un mit klejder, um mit ■ sax gelt. /Vi a magnet hostu mix cugecojgn, /ject gej ix durx dir fun der velt. *flksl.* Мне сваталі нявестаў з прыданым і з хусьцем, і зь вялікімі грашыма. Як магнэс ты мяне прыцягнула, цяпер я гіну празь цябе.

ma(ha)r... *abr.* **mojrejne haráv reb** [*s.* מהר"...=מורנו הרב רב] наш настаўнік рабін рэб... (тытул, зь якога звычайна пачынаюцца імёны славутых рабінаў-вучоных)

Maharál *m* [*s.* מהר"ל] Магарал, Іегуда Ліва бэн Бэцалель [*s.* לוי־יהודה בן־בצלאל] (Познань, 1512/1525?–1609, Прага), рабін, талмудыст, вучоны

Maharám *m* [*s.* מהר"ם] Магарам з Ротэнбурга, Мэір бэн Барух [*s.* מאיר בן־ברוך] (Вормс, 1215?–1293, Энзісгайм, Эльзас), вучоны-талмудыст

mahar(h)er zajn* [*s.* מהרהר →hirer] удум(в)ацца, развaжыць, разважаць, раздумваць, раздумляць, размысьліць, размышляць, ламаць сабе галаву [*sin.* arajntraxtn, arajnklern, zix arajngriblen]
• maharer zajn* af emecn падазраваць кагосьці

maharíč=magaríč=mo(ho)ríč *m* магарыч, барыш
Maharšál *m* [*s.* מהרש"ל] Магаршал, Шлойма бэн Ехіэль Лурыя (Познань, 1510?-1573, Люблін), вучоны-талмудыст
Maharšó *m* [*s.* מהרש"א] Магарша, Шмуэль Эліэзар бэн Ігуда га-Леві Эдэльс (1555–1631, Польшча), вучоны-талмудыст
mahón *m* [*d.* Mahagoni, *p.* mahoń] чырвонае дрэва; **mahónener, mahíneve(r)** з чырвонага дрэва
maj *m.* -en [*d.* Mai] май, травень; **majove(r), májiker** [*p.* majowy] майскі; **majovke/majuvke** *f.* -s маёўка; **majovnik** *m.* -es, (-nice *f.* -s) чалавек, які адпачывае; **májglekl** *n.* -ex *bot.* ландыш; **máj-žuk** *m.* -es майскі жук
• majove kadoxes *med.* сянная ліхаманка
• majove kadoxes iz gut – jener zol es hobn *glxv.* добрая рэч – сянная ліхаманка, але хай бы хто іншы хварэў
maj dekoamre rabonen [*s.* מאי דקאמרי רבנן] *tlmd.* што нашыя вучоныя рабіны кажуць; **maj dekoamre rébecn** [*s.* רביצין] што кажуць жонкі вучоных рабінаў (параўныя на "maj dekoamre rabonen")
• nit visn* maj dekoamre rebecn нічога ня ведаць (ведае курыную сюсю, і гую ня ўсю)
maj mašme lon [*s.* מאי קא משמע לן] *tlmd.* што нам тут яго слухаць? навошта ён нам гэта распавядае?
• Maj ko mašme lon der regn? /Vos że lozt er mir cu hern? /Zajne tropns af di šojbn /kajklen zix, vi tribe trern. /Un di stivl iz cerisn, /un es vert in gas a blote; /bald vet ojx der vinter kumen – /x'hob kejn vareme kapote... (A. R.) Які сэнс мае дождж? Што ж я магу ад яго пачуць? Яго кроплі коцяцца па шыбам, як мутныя сьлёзы. І боты падраныя, і на вуліцы гразь; хутка яшчэ вецер задзьме – у мяне німа цёплай капоты…
maj kule haj [*s.* מאי כולי האי] што гэта азначае цалкам? што гэта такое? што за дзіва?
maj nafke-míne [*s.* מאי נפקא־מינה] якая розьніца?
maj tajme [*s.* מאי טעמא] паводле чаго? на якіх падставах?
majájsenik *m.* -es [*s.* (עס-)מה־יעשהניק] распусьнік, распушчаны, распутны, разбэшчаны чалавек, гультай, агіднік, гарэзьнік, нягоднік, паганец, вісус, свавольнік [*sin.* ojsgelasener menč, hultaj, kolbojnik]
majdane-méjlex/-mlóxim *pl.* [*s.* מעדני־מלך/־מלכים] царскія стравы, вельмі смачная ежа [*sin.* keniglexe špajzn, zejer gešmak esn]
majdanim *pl.* [*s.* מעדנים] смачная, файная ежа [*sin.* gešmake majxolim, fajne esns]; **majdánimdiker** смачны
majdem/majdim *m.* -s (af, in) [*s.* (ם-)מאדים →ojsmajdimen] аматар; маладзец, малайчына, малойца; зухаваты, здатны, здольны, спрытны, дасьведчаны, энэргічны чалавек [*sin.* libhober; feiker, geniter, flinker]
• a majdim af epes здатны на штосьці
• mazl majdem *astr.* Марс
majdn* (gemítn/gemájdt) [*d.* meiden] мінуць, мінаваць; **majdn* zix** разысьціся (у дарозе)
májerkepl=mójerkepl=méjerkepl *n.* -ex марская ракавіна; *zool.* чарапашына
majestét *m/f.* -n [*d.* Majestät] вялікасьць (тытул); **majestétišer** велічны
ma(j)im *n* [*s.* מ(י)ם →gemajimter] вада [*sin.* vaser]; **ma(j)im-axrójnim** *n* [*s.* מ־אחרונים] "апошняя вада" (вада, у якой абмываюць пальцы пасьля ежы і перад бласлаўленьнем); **ma(j)im-šeéjn-lóhem-sof** *n* [*s.* מ־שאין־לחם־סוף] бясконцыя воды; невычэрпныя пытаньні; **ma(j)im-rišójnim** *n* [*s.* מ־ראשונים] "першая вада" (вада, у якой абмываюць пальцы перад ежай); **ma(j)im-šelónu** *n* [*s.* מ־שלנו] вада, якую пакідаюць стаяць у посудзе на ноч і ўжываюць для прыгатаваньня мацы на Пэйсах; *hum.* наша вада, нейкая маёмасьць; **ma(j)im-xá(j)im** *n* [*s.* מ־חיים] "сьвежая вада"; *hum.* гарэлка [*sin.* fris vaser; bronfn]
• Ongezoljet afn harcn, maxt men a lexaim, /ojb der umet lozt nit ruen – zingen mir a lid. /Iz nito kejn bisl branfn – lomir trinken majim; /majim-xajim iz dos xajim – vos darf nox der jid? (Š. K.) Калі золка на сэрцы, мы выпіваем чарку, калі сум не дае спакою, мы пяем песьню. Німа ні кроплі гарэлкі – давайце піць ваду, вада – гэта ж жыцьцё, а што яшчэ патрэбна жыду?
majke *f.* -s [*r.*] майка, саколка
májkern [*s.* מעקרן] 1. "выр(ы)ваць"; разбурыць, разбураць, (з)руйнаваць; 2. лягчаць, спакладаць [*sin.* ojsrajsn, cešternj; kastrirn]
majl *f.* -n [*d.* Meile] міля; **májlntrit** *adv.* сямімільнымі крокамі
• af a majl fun an umglik далей ад граху
• far a majl за вярсту, вельмі далёка
• simxes af an ejl, cores af a majl *šprxv.* радасьці на локаць, гора на мілю
majle *f.* -s [*s.* (ות-)מעלה →lemajle] добрая якасьць, вартасьць, годнасьць, цнота; дадатнасьць, перавага, выгада; ступень, градус, вышыня [*sin.* gute ejgnšaft; hexerkajt, beserkajt; grod, štapl, hejx; *ant.* xisorn]; **majle zajn*** узвысіць, узвышаць, да(ва)ць перавагу
• ejne fun di vezntlexe majles funem roman адна з істотных вартасьцяў рамана
• hobn* di majle legabe/kegn epes выгодна адрозьнівацца ад чагосьці
• zix haltn* in der majle трымаць фасон, уласную годнасьць
• ale majles in ejnem iz nito ba kejnem *glxv.* ніхто не валодае разам усімі добрымі якасьцямі (яшчэ той не радзіўся, хто б усім дагадзіў; яшчэ гэткі не спаткаўся, каб усім ён спадабаўся; і бог усім не дагодзіць)
• ale majles kenen ništ zajn in ejnem (mit ale majles iz nito) *glxv.* німа ў сьвеце поўнай дасканаласьці (німа чалавека бяз ва́ды; і сонца свае плямы мае)
• az di kale iz nit šejn, hot zi andere majles *šprxv.* калі нявеста непрыгожая, дык мае іншыя добрыя якасьці
• der emes hot ale majles, ober er iz a šemevdiker *glxv.* праўда ўсім хораша, але цнатлівая
• es iz nito kejn majle on a xisorn *šprxv.* кожная вартасьць мае загану (німа роду без выроду; у кожнай чарадзе авечку з матыліцамі знойдзеш; і на здаровай яблыні гнілы яблык знойдзецца)
majle-géjre zajn* [*s.* מעלה־גירה →malegejren] пераможваць, жаваць жвачку; *fig.* паўтараць сказанае
majlem zajn* [*s.* מעל(י)ם →alme-, bealme] за-, (с)хаваць, захоўваць, затаіць, затойваць, не выказ(в)аць [*sin.* ojsbahaltn, farhojln, farborgn, ništ ojszogn]
majler *pl.* →mojl *n*, *dim.* **majlxl** *n.* -ex рот
majln bakojdeš [*s.* מעלין בקודש] "падвышае ў сьвятась-

ці"; у кірунку сьвятасьці трэба штораз узвышацца, а не зьніжацца

majlose/majlosoj [*s.* מעלתו] тытул "яго годнасьць"; яго міласьць/мосьць, ягомасьць, ягамосьць

majmed *m* [*s.* מעמד →bemajmed] сытуацыя, стан, пазыцыя; пасада, месца [*sin.* situacje, štand, pozicje; štele]

majmek zajn* (in) [*s.* מעמיק →amkes, omek, (mi)maamakim] паглыбіцца, паглыбляцца, удум(в)ацца [*sin.* zix fartifn, arajntraxtn]

majmen *m*, *pl.* majminim [*s.* (-ים)מאמין →emune, bal-majmen] чалавек, які верыць у бога; вернік [*sin.* glejbiker]

majmer *m*, *pl.* majmorim [*s.* (-ים)מאמר] 1. жарцік, прыказка, выслоўе, афарызм; 2. артыкул, эсэй [*sin.* vertl, zog, aforizm; artikl, esej]; **majmeristik** *f iron.* пісаніна, нудная публіцыстыка; **majmer-hamúsger** *m* [*s.* המוסגר] сказ у дужках, заўвага; **majmer-xazál** *m* [*s.* מאמר־חז"ל] афарызм, які ўзгадваецца ў Талмудзе

majmodes *pl.* [*s.* מעמדות] 1. выбарка сэнтэнцыяў з Танаху, Талмуду і малітоўнікаў, каб чытаць іх пасьля ранішняй малітвы альбо пасьля чытаньня псальмаў; 2. штогодняя сума грошай, якую зьбіраюць паміж сабой хасыды для свайго рэбэ

• majmodes iz velveler vi tilim (tilim kost tajer, majmodes iz velveler!) цытаты з Танаху таней за псалтыр (з анэкдоту пра хворага багацея-скнару)

majne *f*, -s [*s.* (-ות)מענה] адказ, апраўданьне; повад, прычына, падстава, матыў; прэтэнзія [*sin.* entfer; ojsrejd, terec; pretenzje]

Májne-lošn *n* [*s.* מענה־לשון] "Словы мовы"; назоў кнігі з малітвамі, якія чытаюць на могілках; *fig.* востры язык, вялікі рот, вострыя і калючыя словы [*sin.* rejd fun der cung; šarfe cung, grojs mojl, šarfe un štexike šprax]

• arajnlejgn a majne-lošn паслаць падалей, аблаяць

• efenen dem majne-lošn разявіць пашчу

• hobn* a majne-lošn мець вялікі рот

majner [*d.* mein] мой; **májnike** мае (родзічы, сваякі); **májniker** мой, які належыць мне; **fun/far májn(e)tvegn/májn(e)t vegn** [*d.* meinetwegen] з-за/празь/дзеля мяне, па мне

• frier majne, špeter majne раней маё, пазьней маё

• majne – dajne маё – тваё

• majn vajb, majn ku, majn ferd un majne kunder! мая жонка, мая карова, мой конь і мае дзеці! (з анэкдоту пра жыда селяніна)

majneš zajn* [*s.* מנאש →meaneš, ojneš, baronšin] (па)караць [*sin.* baštrofn]

majn-majn-majn [?] *int.* цялушка-цялушка... (так клічуць кароў)

majnster *m*, -s, (-ke *f*, -s) [*d.* Meister] майстар

majofes *m* [*s.* מה־יפית] "які ты прыгожы"; першыя словы і назоў аднаго са сьпеваў, якія сьпяваюцца ў пятніцу адвячоркам (мэлёдыя, на якую выконваўся гэты сьпеў у Польшчы, дужа падабалася панам); **majófesnik** *m*, -es, **majófes-jid** *m*, -n чалавек, які празнушчаецца, ламае карак, гнецца перад чужымі; ліськівец, падлізьнік, падліза, падхалім [*sin.* xojnef, culeker]; **majófes-lidl** *n*, -ex ліськівыя сьпевы, прамовы; падхалімаж

• zingen* majofes рассыпацца дробным макам

ma-jó(j)ker [*s.* מה־י(ו)קר] ці дорага гэта? колькі каштуе? які кошт? якая цана?

majontek/majontik *m*, -tkes [*p.* majątek] маёнтак

• a majontik (mit gelt) багацьце, скарб, маёмасьць

• s'kost a majontek! гэта каштуе вялікіх грошай!

• ufnašn ken men a gancn majontik *šprxv.* зласаваць можна вялікі скарб

majre=mejre=maare=meore *f*, -s [*s.* (-ות)מערה] 1. пячора, бярлог, логавішча, грот; 2. надгробак, грабніца

majrev *m* [*s.* מעריב] "той, хто робіць вечар" (назоў вячэрняй малітвы)

majrev *m*, **májrev(-)zajt** *f* [*s.* מערב] захад (кірунак сьвету); **májrev-cu=majrev cu** *adv.* да захаду; **májrevdiker, májrev-zajtiker** заходні; **Májrev-Ejrope** *f* Заходняя Эўропа; **májrev-ejropejišer** заходне-эўрапейскі; **májrev-lénder** *pl.* заходнія краіны; **májrev-vint** *m*, -n заходні вецер

• vajter majrev-cu больш на захад

• Oj, bobenju, zog nox nit "got fun Avrom", /vos iz dos mit dir hajnt der ajl? /In majrev-zajt iz nox di zun nit fargangen, /oj, bobenju, vart nox ■ vajl. (H. R.) Ой, бабуля, не кажы яшчэ "бог Абрагама", чаго ты так сёньня сьпяшаешся? На захадзе яшчэ сонца не схавалася, ой, бабуля, пачакай яшчэ хвілінку.

majrex/majrix *m*, *pl.* majrixim [*s.* (-ים)מאריך →arixes-, bearixes] пустаслоў, чалавек, які піша або гаворыць вельмі падрабязна і шматслоўна; **majrex/majrix zajn*** пра-, за|цягнуць, пра-, за|цягваць, адтэрмінаваць, адтэрміноўваць; пустасловіць, гаварыць, расказваць, распавядаць, пісаць (падрабязна/доўга/шматслоўна) [*sin.* ojscien, farlengern; redn oder šrajbn ojsfirlex]; **majrex-jómim(-vešónim) zajn*** [*s.* (-ושנים)ימים] "падаўжаць дні (і гады)"; доўга жыць [*sin.* lang lebn]

• ir zolt majrex-jomim-vešonim zajn! прадаўжы, божа, веку добраму чалавеку! (каб вам яшчэ многа гадкоў смачна спалася і лёгка ўставалася!)

• ix hob fajnt majrex cu zajn un hob lib redn cu der zax (Š.-A.) я ненавіджу пустасловіць і люблю гаварыць па сутнасьці справы

majse [*s.* מעשה] па падабенству, падобна, нібы(та), па прыкладу [*sin.* azoj vi a..., lojtn štejger fun a..., vi es past far a...]

majse *f*, -s, *dim.* **májsele** *n*, -x [*s.* (-יות)מעשה →ese, lemajse] 1. казка, байка, прыпавесьць, фрашка, (неверагодная/фантастычная) гісторыя, апавяданьне, аповяд, расказ; 2. здарэньне, прыгода, справа, падзея [*sin.* deroejlung; fantastiše gešixte; gešeeniš]; 3. *euph.* "штучка", "сорам", палавы орган; **majse-betóx-májse** *f* [*s.* בתוך מעשה] гісторыя, якая ўплецена ў другую гісторыю; складанае, заблытанае апавяданьне; **majse-bréjšes** *f* [*s.* (מעש)בראשית] стварэньне сусьвету; хаос, перадгістарычны стан сьвету; пачатак; **májse-bixl** *n*, -ex кніга ка́зак/апавяданьняў, фантастычныя гісторыі; **májse-bixldiker** казачны; **májse-geštaltn** *pl.* казачныя вобразы; **majse-jódaj** *pl.* [*s.* ידי →jad, šeljad, mijad-lejad] праца маіх рук; **majse-jódov** *pl.* [*s.* ידיו] праца іхных рук; **majse-merkóve** *f* [*s.* מרכבה] *kbl.* прывід боскай калясьніцы, патаемная боская містэрыя; **majse-nífle** *f* [*s.* נפלא →pe(j)le, pile-ploim, nifle, nisim-venifloes, nispoel, mafle-lajses, hafle-vofele, plie] дзівосная, цудоўная гісторыя; **majse-nísim** [*s.* נסים] 1. *f* дзівоснае/цудоўнае здарэньне; 2. праз цуд; цудоўным/дзівосным/незвычайным/надзвычайным чынам; **majse-nójre** *f*, -s [*s.* (-ם)נורא] дзівоснае/цудоўнае здарэньне; незвычайная/надзвычайная /дзівосная рэч; **majse-ójnen** *f* [*s.* אונן] ананізм; **majse-rá** *f*,

pl. majsim-róim [*s.* (מעשים־)רע־] благі ўчынак, злачынства, ліхадзейства, бясчынства [*sin.* šlexte tuung, bejzvilike handlung]; **majse-sdóm** [*s.* (מעשי־)סדום־] амаральныя паводзіны, амаральная дзейнасьць, амаральны ўчынак, амаральнае дзеяньне; **majse-sótn** [*s.* שטן־] д'ябальскія штучкі, д'ябальшчына, чартаўшчына; на злосьць, на ліха; **majse-šábes** *f* [*s.* שבת־] байкі, балбатня; **majse-šehóje** *f*, -s [*s.* (שהיה־)ס] факт, сапраўднае здарэньне, прыгода, эпізод з жыцьця, быль; **majse-tatúim** *f*, *pl.* majse-/majsim-tatuim [*s.* (מעשים־)תעתועים] амаральныя паводзіны, амаральная дзейнасьць, амаральны ўчынак, дзікасьць, дзікунства, скандал, лютасьць, шаленства, жорсткасьць, бязьлітаснасьць; **majse-tóle** *f* [*s.* תלוי־] *pejor.* гісторыя Ісуса Хрыста; **majsim** *pl.* [*s.* מעשים] падзеі, дзеяньні, учынкі; абыходжаньне, паводзіны [*sin.* tuungen, uftuen; uffirung]; **majsim-ašer-lójjeósu** *pl.* [*s.* אשר־לא־יעשו] незвычайныя, надзвычайныя рэчы, немагчымая навізна; рэчы, якія нельга рабіць; кепскія, благія дзеяньні, учынкі; **majsim-bexól-jóm** *pl.* [*s.* בבליום] штодзённыя падзеі, факты, звычайныя рэчы; **majsim-tójvim** *pl.* [*s.* טובים] (gute majsim) добрае і чалавечае абыходжаньне, дабрадзействы

- a majse on an ek (on a sof) бясконцая гісторыя
- a fules majse брудная гісторыя/справа
- a mol iz geven a majse жылі-былі..., жыў некалі... (пачатак казак)
- a šejne majse! *hum.* добрая справа!
- arbetn majsim (mit) рабіць усё магчымае
- aza majse gor! вось яно што!
- bagejn* majsim-tatuim (vilde majsim) рабіць дзікія ўчынкі (бясчынствы), лютаваць
- di majse iz, az... так здарылася, што...
- dos iz majse parx гэта хамства
- es tuen zix majsim так атрымліваецца, гэтак выходзіць
- far velxe/vosere majsim-tojvim (kumt dos im)? *iron.* за што яму такая ласка? чым ён гэта заслужыў?
- gexapt in der majse набрацца вальнадумства (у адносінах да юдаізму)
- (gor)nit majse sojxer неабдумана
- herst/gehért a majse! што ты кажаш! ці чуў ты!
- jene majse *vulg.* похва, вагіна, потка
- kejn majse nit зусім ня блага, нічога/нішто сабе
- majse ganev па-зладзейску
- majse sojxer сур'ёзна, прадукцыйна
- mit vort un majsim словам і справаю
- onarbetn majsim шмат нарабіць, перакуліць сьвет, рабіць усё магчымае; нашкодзіць, напракудзіць, насававоліць, нагарэзьнічаць
- puste majses бязглузьдзіца, бяссэнсіца
- s'iz bobe-majses! гэта бабскія казкі!
- s'iz jene majse! гэта іншая гісторыя!
- vi in a majsele як у казачцы
- vos far a majse! што за гісторыя!
- vos iz di majse mit im? што зь ім здарылася? у чым справа?
- xapn/pakn emecn bejs (der) majse схапіць кагосьці на месцы злачынства
- xoć tu zix a majse on хоць у вір/пельку галавою
- zix a majse onton* накласьці на сябе рукі, скончыць жыцьцё самагубствам
- a flekele/štekele arajn, a flekele/štekele arojs, di majse iz ojs kiёk туды, kiёk сюды, і казачцы канец
- a majse fun a cigele a vajse (di majse mit der cig) *glxv.* казка пра белую козачку
- a šejne majse, ober zi hot šojn a bord (di majse hot šojn a bord) *glxv.* прыгожая казка, але ўжо з барадой (старая показка/байка; сьпяваная песьня)
- es iz gor majse-sdom *glxv.* гэта дзікі ўчынак (лютасьць)
- es tut zix majsim *glxv.* дым каромыслам, гармідар
- majsim-tojvim helfn nit, majsim-roim šatn nit *šprxv.* дабрадзействы не дапамагаюць, злачынствы ня шкодзяць

majser *m*, *pl.* majsres [*s.* (מעשר־)ות →eser-, asore-] *tnx.* дзесяціна; дзясятая частка ўраджаю, якую кожны гэбрэй мусіў аддаваць сьвятарам; дзясятая частка заробку, якую аддаюць на дабрачыннасьць; **májsern** сыскваць дзесяціну; **majser-šéjni** [*s.* מעשר־שני] *tlmd.* назоў 8-га трактату 1-га разьдзелу (запаветы аб другой частцы дзесяціны, якую трэба зьесьці сям'ёй у Ерусаліме); **majsres** [*s.* מעשרות] "збожжавы падатак"; *tlmd.* назоў 7-га трактату 1-га разьдзелу (запаветы аб дзесяціне)

- majser fun štroj un zalc дзесяціна саломы й солі

majs(t)l=mejsl *n*, -ex [*d.* Meissel] разец; зубіла; долата

majstns=mej(n)stns [*d.* meistens] *adv.* большай часткай, у большасьці

májstreven/majstern (mit) [*d.* meistern, *p.* majstrować] майстраваць; **majster** *m*, -s, (-n/-ke *f*, -s) майстар; **májsteršaft** *f*, **májsteriškajt** *f* майстэрства; **májsterišer, májsterhafter** майстэрскі, умелы; **májsterverk** *n*, **májsterštik** *f* мастацкая праца, шэдэўр

- a majster vert nit gebojrn *šprxv.* майстрамі ня родзяцца (ня бог пашыў боты – шаўцовай работы)

majšer zajn* [*s.* מעשיר →nisašer, ašires, ošer, ojšer] (у)збагаціць, (у)збагачаць [*sin.* rajx maxn]

majtek *m*, *pl.* matikim [*s.* (מעתיק־)ים] перапісчык; перакладаль)нік, тлумач [*sin.* iberšrajber; iberzecer]; **majtek zajn*** перапіс(в)аць; перакласьці, перакладаць

majtke *f*, -s [*p.* majtki] майткі, нагавіцы

majver zajn* [*s.* מעביר →avejre, ojver, over] 1. зьняць, здымаць з пасады; адмовіць, адмаўляць, адхіліць, адхіляць; 2. (af) уводзіць (кагосьці) у грэх, падштурхнуць да граху; 3. чытаць кожны тыдзень "sedre" [*sin.* aropnemen fun amt, opzogn, bazajtikn]

Majver-jábek *m* [*s.* מעבר־יבוק] "Пераход цераз раку Ябэк" (назоў кнігі, у якой зьмешчаны малітвы, якія чалавек мусіць чытаць перад сьмерцю, і малітвы, якія чытаюцца пасьля сьмерці)

majver-náxle zajn* [*s.* מעביר־נחלה] адмовіць, адмаўляць у праве насьледаваньня/пераймаьня спадчыны; экспрапрыяваць, высваяць; адабраць, адбіраць уласнасьць [*sin.* opzogn fun jeruše-rext; ekspropriiren]

majver-sédre zajn* [*s.* מעביר־סדרה →sedre] перачытваць разьдзел з Торы з націскам

majxl *m*, *pl.* majxolim [*s.* (מאכל־)ים →axile, axlen, baaxile, meakl] страва, ежа, яда; ласунак, прысмакі, смаконікі [*sin.* špajz, sort esn; geśmak esn]; **májxldiker** смачны, прыемны; **majxlmlóxim** *m/n* [*s.* מלכים־] царская (вельмі смачная) ежа; **majxl-tárfes zajn*** [*s.* טרפות־] частаваць кагосьці безь яго ведама трэфнай ежай; **majxl-tárfesnik** *m*, -es жыд, які гандлюе быццам бы кашэрнай ежай; **majxoles-asúres** *pl.* [*s.* מאכלות־אסורות] забароненая (некашэрная) ежа

• a majxl-majxolim (a batamt majxl) (дужа) смачная страва, усім стравам страва
• harbe majxolim вострыя стравы
• maxn/grejtn gešmake majxolim гатаваць смачную ежу
• milxike majxolim малочная ежа
• a majxl farn bajxl! прысмакі для пузякі! (за вушы не адцягнеш! вельмі смачная ежа)
• a majxl vi a mojd mit a bajxl страва як брухатая дзяўчына
• der zelber (dos ejgene) majxl, nor in an ander(er) šisl *glxv.* тая самая страва, толькі ў іншай місцы (той сам штук, да другі спосаб; тая зязюля, але ня так кукуе; тое, але не такое)

majz *pl.* →mojz *f, dim.* **majzl** *n*, -ex, **májzele** *n*, -x мыш; **májzišer, májzener** мышыны; **májznlox** *m/f, pl.* -lexer мышыная нара

makabi *m*, -m, **makabejer** *m* [*s.* (-ם)מכבי, מכבייער] макавей

makábrišer [*d.* makaber, *p.* makabra] жудасны, жахлівы, страшны

makará *m* [?] ніткі для шыцьця

makarél/makerél *m*, -n [*d.* Makrele] *zool.* макрэль

makarones/makaronen *pl.* [*d.* Makkaroni] макароны

makdem/makdim zajn* [*s.* מקדים →kojdem] апавясьціць, апавяшчаць: апярэдзіць, а-, вы|пярэджваць, (з)рабіць раней [*sin.* zogn fun onhejb on: avekšteln cu eršt, ton frier]; **makdem/makdim zajn* zix** пасьпяшацца, прысьпешыцца, выперадзіць, выпераджаць, быць першым/наперадзе [*sin.* zix cuajln, zix federn, zajn fun di erste]

makdeš zajn* [*s.* מקדיש →kodeš, mekadeš] прысьвяціць, прысьвячаць [*sin.* hejlikn, vidmen, opgebn]

make *f*, -s [*s.* (-ות)מכה →decax adaš beaxab, eser-makes] бяда, гора, пакута, ліха, злыдні; чума, пошасьць, звод, паморак, эпідэмія; *tnx.* адна зь дзесяці эгіпецкіх караў (Вых. 7); скула, верад, скульле, нарыў, гнайнік, болька, балячка, рана; *fig.* зусім нічога [*sin.* plog, pest, onšikeniš; bloter, gešvir; gor ništ, in gancn ništ]; **make ašer loj ksuve batojre** [*s.* אשר לא כתובה בתורה]. **make šelój ksuve batojre** [*s.* שלא] "пакута, якая не была засьведчана ў Торы"; новае няшчасьце, насланьнё, ліха; новая бяда, навала, кара [*sin.* naj onšikeniš, culog cu di cores, friše štrof]; **makes** [*s.* מכות] *tlmd.* "удары"; назоў 5-га трактату 4-га разьдзелу (запаветы аб цялесных карах) [*sin.* klep]; **makes-axzórjes** *pl.* [*s.* מכות־אכזריות] страшэнныя ўдары [*sin.* šreklexe klep]; **makes-bxójres** [*s.* מכת־בכורות] *tnx.* сьмерць першароднага сына (адна зь дзесяці эгіпецкіх караў) (Вых. 11:5); **makes-medíne** *f* [*s.* מכת־מדינה] бяда, гора, ліха для ўсёй краіны [*sin.* landplog]; **makes-récex** *pl.* [*s.* מכות־רצח] сьмяротныя ўдары [*sin.* merderlexe klep]

• di cen makes *tnx.* дзесяць эгіпецкіх караў
• šlogn* makes-recex моцна аддубасіць
• a make! (makes!) чорта з два! трасцу/скулу!
• a make dir in bojx/haldz (in di bejner)! *kll.* скулу табе ў жывот/шыю/косткі! (скульле, мульле пад бок!)
• a make iz gut (cu zen) – ba jenem untern orem (afn haldz) (a make in jenems orem iz nit šver cu trogn) *glxv.* скула – добрая рэч у кагосьці пад пахай (чужая скула не баліць)
• az me vet makes esn, vet men kadoxes kenen *šprxv.* калі скулу зьясі, трасцу будзеш ведаць (чалавек галодны да нічога ня згодны; галоднаму ў галаву нішто ня йдзе; усё забудзеш, калі хлеба не здабудзеш)
• er iz a guter/vejx – xoč lejg im cu a make/gešvir (vejx/gut vi cuculejgn cu a make) ён такі дабрак (мяккі), хоць прыкладай яго да скулы (да нарыва)
• got šikt (cu) di refue far der make *glxv.* бог пасылае спачатку лекі, а пасьля хваробу (абы струп, будуць вошы, абы бяда, будуць грошы)
• got zol af dir onšikn fun di cen makes di beste! *kll.* хай бог нашле на цябе лепшую зь дзесяці караў эгіпецкіх!
• hobn zolstu makes-bxojres! *kll.* хай сьмерць возьме твайго першароднага сына! (адна зь дзесяці эгіпецкіх караў)
• ix vinč dir fun di cen makes di beste! *kll.* бажаю табе лепшую зь дзесяці караў эгіпецкіх!

makef *m*, -n [*s.* (-)מקף] *gram.* штрых, рыска, дэфіс, злучок, працяжнік [*sin.* štrix, tire]

makeróndl/makaróndl *n*, -ex, **makrón** *m* [*eng.* macaroon] міндальнае пячэньне

maker-tójve *m*, *pl.* makire-tójve [*s.* (מכירי) מכיר־טובר] чалавек, удзячны за дабро, за ласку [*sin.* dankbarer menč]

maklen [*s.* מקלען] (па)біць палкай (кіем рэбры памацаць)

makljer *m*, -ljáres [*d.* Makler] маклер

makohine *f*, -s [?] ступка, макітра

makovke/mákevke *f*, -s [*ukr./r.* маковка] макаўка

makped *m*, *pl.* makpidim [*s.* (-ים)מקפיד →kapdn, kpejde] строгі абаронец, пэдант, задужа пунктуальны чалавек [*sin.* štrenger ophiter, pedant]; **makped zajn*** (af) строга захоўваць, абараняць, зьвяртаць увагу на дакладнасьць

mákrete/mákerte/makitre *f*, -s, **máketer** *m*, -ы [*ukr.* макітра, *r.* макитра] макітра, макацёр, міска, паўмісак

makrev/makriv zajn* [*s.* מקריב →korbn] ахвяраваць, прынесьці/прыносіць у ахвяру

• makriv zajn* dos lebn ахвяраваць жыцьцём

makše zajn* [*s.* מקשה →kaše, nisbakeš, bakoše] пытаць, ставіць пытаньні ў навучаньні [*sin.* fregn a kaše, šteln a frage inem lernen]; **makšn** *m*, *pl.* makšonim [*s.* (-ים)מקשן] апытвальнік; чалавек, які задае пытаньні [*sin.* freger]

• a makšn falt tomed in der blote arajn *šprxv.* хто шмат пытае, той заўжды падае ў гразь (язык і кія дапытаецца)

makše-/mekaše-léjled *f* [*s.* מקשה־לילד] (па)радзіха, у якой цяжкія роды [*sin.* švere gevinern, hobern]

makulatúr *f* [*d.* Makulatur] макулятура

makux *m*, **makuxe** *f*, -s [*ukr./r.* макуха, *p.* makuch] макуха

makxeš zajn* [*s.* מכחיש] абвергнуць, абвяргаць [*sin.* oplejkenen]

maláj *m*, -es малáй, кукурузная перапечка; хлеб з кукурузы, гароху альбо проса

Malat мястэчка Мал'яты (Літва)

• malater mejdlex laxn, nox ejder me hejbt zej on kiclen мал'яцкія дзяўчаты сьмяюцца яшчэ перад тым, як іх пачынаюць казытаць

malaxe(j)-hašóres *pl.* [*s.* מלאכי־השרת →malex] анёлы, якія дапамагаюць богу і знаходзяцца паблізу яго трона

malbeš *m/n*, *pl.* malbušim [*s.* (-ים)מלבוש →halboše, levuš] адзеньне, адзежа, вопратка, апранаха [*sin.* klejd, ontuexc, beged]; **malbeš zajn*** адзець, адзяваць, забясьпечыць, забясьпечваць адзежай [*sin.* baklejdn, bazorgn mit klejder]; **malbeš-arúmim** *m* [*s.* ערומים] "той, хто адзявае голых"; азначэньне для бога; **malbeš-arúmim zajn*** адзяваць голых; **malbeš-umánil zajn*** [*s.* ומנעיל] адзяваць і абуваць, цалкам забясьпечваць адзеньнем [*sin.* baklejdn un bašuxn]

• najer malbeš абноўка

• gerame malbušim раскошнае адзеньне

malc *n* [*d.* Malz] солад; **malcn** саладзіць (жыта); **málc(n)-milx** *f* соладавае малако

malčiške *m* [*r.* мальчишка] малец, хлопец

• Du host dox ongezogt, az du bist a malčiške, /farvos že hostu mir gedrejt azoj majn kop? /Du host dox ongevizn, konst nit zajn majn xosn. /cu vos že hostu zix untergexapt? *flksl.* Ты ж сказаў, што ты малец, чаму ж ты мне закруціў так маю галаву? Ты ж сказаў, што ня можаш быць маім жаніхом, навошта ж ты мне падвярнуўся?

maldeveške=mendeveške *f*, -s мандавошка, вош

mal(e)=malje zajn* [*s.* (ע)מל →mile, mojel], **mal(e)n** [*s.* (ע)מל] *rit.* абрэзаць, абразаць, (з)рабіць абразаньне [*sin.* bašnajdn, idišn. durxfirn di bris-mile]

male [*ukr./r.* мало] мала

• male vos! ш мала што!

• male vos er vil/zogt! ці мала што ён хоча/кажа!

malebonde=balebonde *f*, -s [*ukr./r.*] *hum.* балабонка, ня-

malegejren=molegéjren [*s.* מעלה־גירהן →majle-gejre] жаваць жвачку; *fig.* паўтараць сказанае; жвачка, **malegéjrediker** жвачны; **malegejrexc** *n* жаванне, **malegejre zajn*** жаваць бесьперастанку

• malegejredike balexaim жвачныя жывёлы

malejcen [*r.* млеть?] млець

malex *m*, -n [?] ліха, бяда, няшчасьце

malex *m*, *pl.* maloxim [*s.* (ים-)מלאך] анёл; боскі служка, пасланец; *fig.* дужа добры чалавек; **malex pimper** *m folk.* анёл, які скідае зь неба ласункі на альфабэт, калі дзеці пачынаюць вывучаць гэбрэйскую мову; **malex-éljen** *m*, *pl.* malaxe-éljen [*s.* (מלאכי) עליון] боскі, божы анёл, ганец, пасланец; **malex-(ha)dójme** *m* [*s.* (ה)דומה] анёл, які прымае нябожчыкаў на тым сьвеце; **malex-hagójeł** *m* [*s.* הגואל] анёл-збаўца, анёл-вызваліцель; **malex-hamojšie** *m* [*s.* המושיע] анёл, які дапамагае; чалавек, які прыходзіць, каб дапамагчы ў неабходны момант; **mal(e)x(-h)amóves** *m* [*s.* (ו)המות] анёл сьмерці, сьмерць; **malex-hašólem** *m*, *pl.* malaxe-hašólem [*s.* (מלאכי) השלום] анёл міру, які нясе мір; **malex-xabóle** *m*, *pl.* malaxe(j)-xabóle [*s.* חבלה] кепскі анёл, які мучыць грэшнікаў у пекле; *fig.* параджэньне пекла; кепскі, благі, дрэнны чалавек

• a cetrogener malex расьсеяны чалавек

• a guter/bejzer malex добры/злы геній

• a kalter malex абыякавы, бяздушны, халодны чалавек

• a malex vejnt, a malex vejnt /un badekt di groz mit toj; /libster majner, libster majner, /ix benk nox dir azoj... (P. H.) анёл плача і пакрывае траву расою; любы мой, я сумую толькі аб табе...

• a menč iz kejn malex nit *glxv.* чалавек – не анёл

• az a kind falt, štelt im a malex unter di hent (štelt der malex di hent unter) *glxv.* калі дзіцёнак падае, анёл падстаўляе яму рукі (як малы падае, то анёл зь пярынкаю, як старое, то чорт з бараною)

• der malex-hamoves hot a sax ojgn *glxv.* анёл сьмерці мае шмат вачэй

• der malex-hamoves klapt šojn cu im in tir анёл сьмерці грукае ўжо яму ў дзьверы (насок паглядае ў пясок)

• der malex-hamoves šext un blajbt tomed gerext *šprxv.* анёл сьмерці забівае і заўсёды мае апраўданьне

• der malex-hamoves zol dix cunemen fun der velt! *kll.* каб цябе анёл сьмерці забраў з гэтага сьвету!

• der malex-hamoves zol zix in dir farlibn! *kll.* каб у цябе закахаўся анёл сьмерці!

• di maloxim gejen nit arum af der erd *šprxv.* анёлы па зямлі не пахаджаюць (ніхто не без граху; адзін бог без граху, а ўсякі грэшан)

• er hot derzen far zix dem malex-hamoves ён убачыў анёла сьмерці (семдзесят сем агнёў убачыў; аж зоркі ў вачох заскакалі; сьвечкі ў вачох засьвяціліся; яскаркі з аччу пасыпаліся)

• frier zajnen di maloxim arumgegangen af der erd, hajnt zajnen zej (afile) in himl (ojx) nito спачатку анёлы расхаджвалі па зямлі, цяпер жа іх і ў небе німа

• halt mix farn malex Gabriel un getroj mir ništ fil *glxv.* прымай мяне за архангела Габрыэля, але не давярай мне цалкам (вер Яўменю, а грошы кладзі ў кішэню; зь мядзьведзем дружы, а стрэльбу дзяржы)

máline/málene *f*, -s [*ukr./r.* малина, *p.* malina] маліна; **málinik** *m*, -es маліньнік; **malínove(r)** малінавы; **malínovke** *f*, -s 1. малінавая настойка; 2. *zool.* малінаўка

malíne *f*, -s [назва пецярбурскай карчмы "Малинник", *s.* melina?] *argo* "маліна"; сховішча, патаемнік (адмыслова ў геце ў часы 2-ой сусьветнай вайны на выпадак аблаваў)

mal(j)aríe *f* [*it.* malaria] *med.* малярыя

mal(j)er *m*, -s/-ljáres [*d.* Maler] маляр; **máljeven** [*p.* malować] маляваць, мазюкаць; **maljarke** *f*, **mal(j)evanje** *f*, -s маляркa, маляваньне

malke *f*, -s [*s.* (ות-)מלכה →malxes, mejlex, meluxe] 1. царыца, каралева [*sin.* kenign]; 2. *kort.* дама; **malke-švó** *f* [*s.* שבא] *tnx.* царыца Саўская (3 Цар. 10)

• di malke grin (švarc/pik) віновая/пікавая дама

• malke di cacke *flksl. iron.* царыца як лялька

• šteln af der malke švarc ставіць на пікавую даму

• af der malke grin nemt men ojx a mol ojs a grojsn kon *šprxv.* і на віновую даму ставяць вялікія стаўкі (аб непрыгожай нявесьце, але зь вялікім пасагам) (хоць бы дзеўка ня коха, абы грошай панчоха; няхай жонка і сьвінка, абы грошай поўна скрынка)

• af itlexer zax iz do a cajt – ix hob malke-mejlex-tojz mit bele *kort.* на ўсё свой час – у мяне дама-кароль-туз казырныя

• Pejsex kumt, bin ix mir frejlex, /majn vajb a malke un ix a mejlex; /majses hobn mir a fuln zak! /Tanc ix mir a frejlexn hop-čik-čak! *flksl.* Пэйсах прыходзіць, я весялюся, мая жонка царыца, а я цар; падзеяў мы маем поўны мех! Я танцую вясёлы танец гоп-чык-чак!

• vi dos vajb iz a malke, azoj iz der man a mejlex *šprxv.* калі жонка – царыца, дык і мужык – цар

malke-kedíše [*s.* מלכא־קדישא] "сьвяты цар"; бог

malkes *pl.* [*s.* מלקות] лупцоўка, цялесная кара; сымбалічная лупцоўка напярэдадні Ём-Кіпуру ў якасьці пакуты за грахі [*sin.* šmic, kerperlexe štrof]; **málkenen** цьвічыць, съцёбаць, хвастаць, лупцаваць, дзяжыць, пляжыць

maloje *m*, -s [*s.*?] ліхвяр, квотнік

m(a)lojen=molojen (bam harcn) адчуваць мло(сна)сьць /моташнасьць

malorós/malorús *m*, -n [*ukr.* малорос] маларос, украінец

Maloxi [*s.* מלאכי] *tnx.* прарок Малахія; Кніга прарока Малахіі

malóxim-ksav *m* [*s.* מלאכים־כתב →malex] *hum.* неразборлівы, нечытэльны почырк; **malóxim-šprax** *f* неразборлівая, невыразная мова; **malóxišer** анёльскі

malpe *f*, -s [*p.* małpa] малпа; **málpišer** малпін(ы)

malšines *n* [*s.* מלשינות →lošn] паклёп, зласлоўе, абгавор, абмова, нагавор, плёткі [*sin.* falše bašuldikung, barederaj, bilbl, mesire]; **malšinesdiker** паклёпніцкі; **malšines-biksáv** *n* [*s.* בכתב־] пасквіль, памфлет; **malšn zajn*** (af emecn) [*s.* מלשין] узьвесьці, узводзіць паклёп, абылгаць, зьняславіць; данесьці, даносіць, даказ(в)аць, уда(ва)ць (на кагосьці), (з)рабіць данос [*sin.* varfn a falše bašuldikung, denuncirn, masern]

malve *f*, -s [*ukr./r.* мальва, *p.* malwa] *bot.* мальва; **malve lila** ружова-лілёвы

malve *m*, *pl.* malvim, (-te *f*, -s) [*s.* (מלווה(־ים →halvoe, lojve] крэдытор, пазычальнік, вернік, ліхвяр [*sin.* gelt-ojsborger, gelt-ojslajer, bal-halvoe, procentnik]; **malve-beríbis** *m*, *pl.* malvim-beribis [*s.* בריבית־] ліхвяр; чалавек, які жыве з адсоткаў (дае ў рост) [*sin.* procentnik]

• ojszen* vi a malve-beribis мець выгляд бяздушнага ліхвяра

malxes [*s.* מלכות →malke, mejlex, meluxe] 1. *n*, -n царства, каралеўства, дзяржава, урад [*sin.* kenigrajx, meluxe, regirung]; *kbl.* адна зь дзесяці сфэраў; 2. *m/n* цар, кароль, уладар, валадар [*sin.* kenig, kejser]; **málxesdiker** царскі, каралеўскі; *fig.* шыкоўны; **málxes-brojt** *n kul.* сьвяточнае печыва; **malxes-horéše/-horešóe** *n* [*s.* הרשע־/הרשעה־] злая дзяржава, імпэрыя; юдафобнае царства; **malxes-jehúde** *n* [*s.* יהודה־] гэбрэйская дзяржава, якая існавала на поўдні Палестыны (X–VI стст. да н.э.); **malxes-jisróel** *n* [*s.* ישראל־] гэбрэйская дзяржава, якая існавала на поўначы Палестыны (X–VIII стст. да н.э.); **malxes-šomáim** *n* [*s.* שמים־] "нябеснае царства"; боскае валадарства, боскія запаветы

• malxes šomaim нябеснае царства

mamce zajn* [*s.* ממציא] 1. выдумаць, выдумляць, (вы)мудраваць, змысьліць, змышляць; вынайдаваць, вынайсьці, вынаходзіць; 2. выцякаць, вынікаць [*sin.* ojstraxtn, derfindn; dringen]

mame *f*, -s (*ak./dat.* mame(n); *pos.* mames) [*sl.*] мама, маці; **mámeši** *f*, **máminke** *f*, -s, **mámenju** *f* матуля, мамуся, матухна; **mamke** *f*, -s мамка; **mámišer** мамін, матчын, мамчын; **mámešaft** *f* мацярынства; **máme-lošn** *n* [*s.* לשון־] "матчына мова"; ідыш; **mamen** мамкаць; **mámes-fartexnik** *m*, -es мамчын сынок

• mame(lex) (majne)! mamінkes! мамачкі (мае)!

• maxn in der mamen arajn (dermonen di mame) узгадваць маці (ад болю)

• nor ba der mamen in bojx яшчэ ва ўлоньні маці

• vi di mame hot gehat y чым маці нарадзіла

• im iz gut vi ba der ejgener mamen яму добра як у сваёй маткі

• a mame iz a muter – a kind iz a moskviter *glxv.* мама – матка, дзіцёнак – маскаль

• a šlexte mame iz nito *glxv.* німа кепскай маці

• der tate hot genumen di mamen, un ix darf nemen a fremdn!.. тата ўзяў маму, а я мушу браць чужую!.. (з анэкдоту)

• – Mame, oj, mame, ix halt es nit ojs, /majn gelibte kale – zi gejt šojn ojs. *flksl.* – Маці, ой, маці, я не магу гэтага перажыць, мая любая нявеста – яна ўжо памірае.

• vi ejn mame volt zej gehat як аднае маткі дзеткі (на адзін капыл; абодва роўныя; адзін чорт маляваў; адным грэбнем прычасаліся; з аднаго гнязда птушкі)

mamelige *f*, -s [*rom.* mámáligá, *p.* mamałyga, *ukr.* мамалига] *kul.* мамалыга

• a mamelige miśt men mit a drik, me śnajdt zi mit a štrik – un dernox benćt men vi a flig мамалыгу мяшаюць дручком і рэжуць вяроўкай – таму й бласлаўленьне над ёй чытаюць як муха (нудна)

mameš [*s.* ממש →bemamošes] *adv.* напраўду, сапраўды, насамрэч, навочна, дакладна, літаральна, проста-такі [*sin.* af an emes, konkret]; **mamóšes(diks)** *n* [*s.* ות־] рэальнасьць, рачаіснасьць, рачавістасьць, канкрэтнасьць; сутнасьць, вартасьць, важнасьць, значнасьць, істотнасьць, грунтоўнасьць [*sin.* konkretkajt, realkajt; vert, vixtikajt, giltikajt]; **mámešdiker** літаральны (сэнс); **mamóšesdiker** значны, істотны; заўважны, адчувальны, прыкметны; **mamóšesdikajt** *f* істотнасьць, грунтоўнасьць, адчувальнасьць, прыкметнасьць

• er hot mameš bavizn vunder ён напраўду рабіў цуды

• kejn mameš nit! глупства! дробязь!

• mameš derštik vern* задыхацца

• mameš fun unter der noz з-пад самага носа

• mamošesdike rezultatn адчувальныя вынікі

• s'hot ba im kejn mamošes nit cu ton epes (dos hot ba im kejn mameš nit) яму зрабіць нешта – раз плюнуць

mameš *m* [?] баваўняная падшэўка

mamlec zajn* (af) [*s.* ממליץ →mejlec, melice] добра казаць, (ад)рэкамэндаваць; абараніць, абараняць, апраўд(в)аць [*sin.* guts zogn, rekomendirn; fartejdikn, barextikn]

mamšex/mamšix zajn* [*s.* ממשיך →(be)mešex, hemšex] прадоўжыць, прадаўжаць, працягнуць, працягваць [*sin.* kontinuirn, forzecn, vajter firn]

mamtakim *pl.* [*s.* ממתקים] "ласункі, прысмакі"; *hum.* грошы, звонкая манэта; нікчэмны/агідны мэтал [*sin.* zisvarg; gelt, klingers]

• hobn* mamtakim-gelt мець грошы

mamtek zajn* [*s.* ממתיק] зь-, па|мякчыць, зь-, па|мякчаць; праявіць, праяўляць, даручыць, даручаць

mamzél *f*, -n [*d.* Mamsell] мамзэль, паненка

mamzer *m*, *pl.* mamzejrim [*s.* (ממזר(־ים] 1. незаконны сын, байструк, бастард, банюк; 2. *fig.* хітры/зламысны чалавек, пройда, прайдзісьвет, пракуда, праныра, гарэза, свавольнік; разумны і дасьціпны чалавек; 3. *fig.* малазначная рэч; **mamzerúk** *m*, -es байструк, выблядак; жулік, круцель; **mámzer(i)šer** разумны, галаваты, багаты на розум, хітры; пранырлівы, празухі, спрытны [*sin.* kluger, xitre; kunciker, gešikter]; **mamzeráj** *f/n*, -en свавольства, сьвінства; *argo* данос, доказ, уданьне; **mámzeriškajt** *f* хітрыкі; **mámzerte** *f*, -s, **mamzejres** *f*, -n [*s.* (ממזרת(־ן] 1. незаконная дачка, байстручка; 2. *fig.* хітрая і зламысная жанчына; разумная і дасьціпная жанчына; **mamzer-ben(-)hanide** *m* [*s.* בן־הנידה־] незаконны сын; выблядак, якога маці зачала ў нячыстыя дні; **mámzer-bilbl** *m* [*s.* בילבול־] абвінавач(в)аньне ў злачынстве; гнюсны паклёп

• der grośn iz ba im a mamzer грошы для яго сьмецьце

• ojsklern a mamzer-bilbl абгаворваць, паклёпнічаць, узводзіць гнюсны паклёп

• a mamzer ken/meg men zajn un klug muz/zol men zajn *śprxv.* байструком можаш быць, але разумным мусіш быць

• az a mame/muter śrajt af ir (afn) kind: "mamzer!", meg men

ir glejbn калі маці крычыць на свайго дзіцёнка: "байструк!", можна ёй верыць (знае матка, чыё дзіцятка)
• az es volt geven vejniker xazejrim, volt geven vejniker mamzejrim *glxv.* калі б было менш кныроў, было б і менш байструкоў
man *m* [*s.* מן] *inx.* манна (нябесная); *fig.* дужа смачная ежа, прысмакі
• friše fete grivn, vos cegejen zix in mojl azoj vi der man, vos di jidn hobn gegesn in der midber (Š.-A.) сьвежыя тлустыя шкваркі, якія растаюць у роце нібыта манна, якую гэбрэі елі ў пустэльні
man *m, pl.* -en/mener, *dim.* **mánele=mén(d)ele** *n*, -x [*d.* Mann], **mancb(i)l/mansbil** *m, pl.* -(e)n/mánslajt, **mánsparšojn** *m, pl.* -en/manslajt, **mánsperzon** *m*, -en муж(чына), мужык; чалавек; **máncb(i)lišer**, **máncbildikler** мужчынскі; **máncbilškajt** *f* мужнасьць, узмужнеласьць; **manšaft** *f*, -n каманда карабля, экіпаж; **man-un-vájb** *pl.* супругі, муж і жонка; **man-un-vájb-lebn** *n*, **man-un-vájbšaft** *f* шлюб, сумеснае жыцьцё
• [illegible] man-un-vajb šojn cen jor яны мужык і жонка [illegible] дзесяць гадоў
• [illegible] man iz cu gut far der velt, iz er (cu) šlext farn (far [illegible] vajb *glxv.* калі мужык добры для сьвету, ён благі для сваёй жонкі (у людзей гуляка, а дома сабака)
• di mancblen hakn unter ba di frojen di fligl un zogn der-nox, az jene zajnen nit kejn maloxim мужыкі падразаюць жанчынам крылы, і кажуць пасьля, што тыя зусім не анёлы
• dos vajb trogt funem man nejn xadošim, un der man trogt fun zajn vajb dos gance lebn *glxv.* жанчына носіць ад мужыка дзевяць месяцаў, а мужык носіць ад свае жонкі ўсё жыцьцё
• parnose iz inem mans mazl, kinder zajnen inem vajbs mazl *šprxv.* заробак – бацькаў лёс, дзеці – матчын
man [*mhd.* man] толькі
manatkes *pl.* [*ukr.* манатки, *p.* manatki] манаткі
mančen/manclen/mant(j)en=mončen/monclen/monten [*ukr.* мантити, *p.* mantyczyć] канькаць, клянчыць, цыганіць, мантачыць
mandehú *m* [*s.* מאן־דהוא] абы-хто [*sin.* abi ver]
• er iz dox epes ništ kejn mandehu (Š.-A.) аднак жа ён не абы-хто
mandl *m*, -en [*d.* Mandel] міндаль, міндаліна, мігдал; **mandlen** *pl.* 1. *anat.* глянды, міндаліны; 2. *kul.* печаныя або смажаныя зь цеста ўпрыгожваньні для супу; **mándl-bojm** *m, pl.* -bejmer міндальнае дрэва; **mándl-brojt** *n kul.* міндальнае печыва (яго выпякаюць два разы, ад чаго яно робіцца цьвёрдым і хрусткім); **mándl-ojgn** *pl.* вочы як міндаль
• ix hob gegesn mandlen, /ix hob getrunken vajn, /ix hob gelibt a jingele, /ix ken on im nit zajn *flksl.* я ела мігдалы і піла віно, я палюбіла мальца і не магу безь яго
mandomar *m*, -s [*s.* מאן־דאמר] той, хто гэта сказаў; чалавек, які мае дачыненьне; адпаведны чалавек, аб якім ідзе размова/справа [*sin.* der šajexdiker menč]
• faran a mandomar ёсьць такое меркаваньне, ёсьць такая думка
mandre *m*, -s [*ukr.* мандри] *pejor.* муж
mane *f*, **máne-grojpn** *pl.*, **máne-grajplex** *pl.* [*p.* manna] манна, манныя крупы; **máne-kaše** *f*, -s манная каша
maneg *m, pl.* manhigim [*s.* (מנהיג-)ים] кіраўнік, праваднік, п(р)авадыр, вож [*sin.* vegvajzer, (on)firer]; **maneg-hadór** *m, pl.* manhige-hadór [*s.* (מנהיג־) הדור] вож пакаленьня, самы вялікі чалавек свайго часу
manever *m* [*p.* manewr] ход, прыём, манэўр
mangán *m* [*d.* Mangan] *хем.* марганец
mangl *m*, -en, **magl** *m*, -en/-jes [*d.* Mangel] маглі, качалка; **manglen** качаць, магляваць, прасаваць (бялізну)
mangl *m* (in) [*d.* Mangel] недахоп, недахват, хіба, вада
• maxmes/iber mangl in cajt за недахопам часу (з-за недахопу часу)
manhigim *pl.* →maneg *m* [*s.* (מנהיג-)ים] кіраўнік, праваднік, п(р)авадыр, вож
manhojz *n, pl.* -hajzer [*d.*] вар'яцкі дом
maniforge/manifarge *f*, -s [*šp.* manifacero, maniobras?] хітрасьць, выкрут(ас); **manifórge-lošn** *n* мова злодзеяў, жаргон
• maxn maniforges ламацца, крыўляцца
• on maniforges бяз хітрыкаў, проста
manír *m/f*, -n [*d.* Manier] манера; **manírlexer** манерны; **manírlexkajt** *f*, -n манернасьць
mánišer [*d.* Manie] маніякальны
maniške=miniške *f*, -s [*ukr./r.* манишка] манішка
ma-ništáne [*s.* מה־נשתנה] "чаму іншае" (першыя словы чатырох пытаньняў пэйсаховай Агады)
• xoxem fun (der) ma-ništane arojs невялікі разумнік
manjen [*ukr.* манити, *p.* manić] маніць, прываблівaць; **mánjeniš** *n*, -n прынада
mank/mang [*d.* mank, mang] *prep.* (па)сярод, (па)між
mankét *m*, -n [*p.* mankiet] манкет, манжэта, абшлаг, закаўраш, адварот (рукава)
mankolje *f*, -s [?] манія, неадчэпная/назойлівая думка, ідэя-фікс
• er hot zix arajngenumen in kop a mankolje яму ўбіўся дур у галаву
• ir mankolje iz rejnkajt яна да вар'яцтва любіць чысьціню
ma-nóe [*s.* מה־נאה] *int.* як прыгожа! [*sin.* vi šejn!]
mant(j)en/mančen=monten/mončen канькаць, клянчыць, цыганіць, мантачыць
mantl *m*, -en, *dim.* **méntele** *n*, -x [*d.* Mantel] паліто(н), палітончык; **mántele-bájdele** *n*, -x *hum.* плашч-накідка
• itlexs mentele hot zix zajn kentele *šprxv.* кожнае палітэчка мае свой канцік (прыходзіцца шыльца к більцу)
mantočen [*p.* mantyczyć] мантачыць, марнатравіць
manxer [*d.* manch, *mhd.* manic, menic] 1. шматякасны, прынадны для ўсяго; 2. іншы, які-небудзь, якісьці, нейкі; **mánxmol** *adv.* калі-нікалі, часам
manžét *m/f*, -n [*ukr./r.* манжета] манжэта
mape *f*, -s [*p.* mapa] мапа, карта
mape *f*, -s [*s.* (מפה-)ות] кавалак тканіны, якім пакрываюць стол у сынагозе, на які кладзецца для чытаньня Тора
mapl *m*, -en, **mápele** *n*, -x, **mápl-kind** *n*, -er [*s.* (מפיל-)ען →nejfele, hamapl] выкідыш, выкідак, скідак, неданосак; *fig.* заморак, бяспомачны чалавек [*sin.* tojt gebojrn kind; švaxling, umbaholfener menč]; **mápldiker** датэрміновы, неданошаны; **maplen** [*s.* מפילן/מפלען], **mapl zajn*** скінуць, скідаць дзіця (аб цяжарнай), раджаць раней за тэрмін [*sin.* abortirn]; **maplung** *f*, -en скідваньне дзіцяці
• vest nit mapl zajn! дзіця ня скінеш! (шкоды табе ня будзе)
mapole *f*, -s [*s.* (מפלה-)ות →bal-mapojles] паражэньне, паражка, параза; правал, крах, разгром, непрыемнасьць, няўдача, благі канец [*sin.* (militerišer) durxfal; opšnit, mieser

psak, šlexter sof; *ant.* nicoxn]; **mapojles** *f*, -n [*s.* (מפולת-)] развалiна, крушня, халупа, хаціна, руіна [*sin.* ajngefaln hojz, xurve, ruine]; **mapólenik** *m*, -es, (-nice *f*, -s) паражэнца; **mapoleráj** *f* паражэнства
• a gixe mapole хуткая параза
• derlangen/brengen* a mapole нанесьці паражэньне
• filn/farzuxn dem bitern tam fun mapoles un di frejd fun nicoxn спазнаць горыч паражэньняў і радасьць перамогі
• lajdn*/xapn/nemen* a mapole пацярпець паражэньне/крах
• af a šlextn porec tor men kejn mapole nit betn *šprxv.* ня варта зычыць благому пану пагібелі (за новым каралём - дагары камлём)

mar...=mahar... *abr.* **mojrejne haráv reb** [*s.* מורנו=...מהר הרב רב] наш настаўнік рабін рэб... (тытул, зь якога звычайна пачынаюцца імёны славутых рабінаў-вучоных)

marán *m*, -en [*šp.* marrano "ядун сьвіней"] *ume.* маран, ахвяра насільнага хрышчэньня ў Гішпаніі і Партугаліі (кан. XIV–XV стст.); **maránišer** які мае дачыненьне да марана
• – Zog, maran, du bruder majner, /vu iz grejt der sejder dajner? /– In tifer hejl, in a xejder, /dort hob ix gegrejt majn sejder. (A. R.) – Скажы, маран, браце мой, дзе ты правіш сваю пасхальную вячэру? – У глыбокай пячоры, у кутку, там я праўлю маю пасхальную вячэру.

maránc *m*, -n [*p.* pomarańca] апэльсін, памаранц, памяранец; **maráncn-bojm** *m*, *pl.* -bejmer апэльсінавае дрэва
• lomir zix iberbetn, iberbetn, /kojf mir a por marancn, /lomir zix iberbetn, /lomir gejn tancn *flksl.* давай перапросімся, купі мне пару памаранцаў, давай перапросімся, давай патанцуем

maráš [*s.* מה־רעש →raš, mareš] *int.* што за шум/ліха? што ж тут такога?; **marášikajt** *f* самаздаволенасьць, самаднадзейнасьць

mítgebojrener [*d.* gebären] прыроджаны
mítgefil *m* (mit) [*d.* Mitgefühl] спачуваньне
mítgebraxter [*d.* gebracht] прынесены
• mit mitgebraxtn brojt iz men umetum a guter ojrex *šprxv.* госьць, які прыносіць хлеб, – паўсюды добры госьць (са сваім дабром за сталом)
mítgejn* (mit) [*d.* gehen] ісьці разам, суправаджаць; **mítgejer** *m* спадарожнік
mítgerisn vern* (fun) [*d.* mitreissen] *fig.* захапіцца, уцягнуцца, заразіцца
mítglejbiker/mítglojbiker *m*, -ke [*d.* Gläubiger] адзінаверац
mítglid *m*, -er, **mítglider** *m* [*d.* Mitglied] чалец, сябра, братчык; **mítglideršaft** *f* чальцоўства
míthaftikajt *f* [*d.* heftig] счапленьне, спаянасьць, згуртаванасьць
míthaltn* (mit) [*d.* halten] быць разам, супольна; **mithalteráj** *n*, **míthaltung** *f* зладжанасьць
míthelfn* [*d.* helfen] (да)памагчы, (да)памагаць, садзейнічаць; **míthelfer** *m*, -s, (-n *f*, -s) дапаможца, памочнік, памагальнік; **míthilf** *f* дапамога, (да)памаганьне
• dos glik alejn helft nit dem menčn, ven der menč helft nit mit *šprxv.* лёс чалавека не выратуе, калі сам чалавек сабе не дапаможа (божа, памажы, але і сам падбяжы; на бога спадзявайся, але і сам старайся)
míthobn* [*d.* haben] мець пры сабе
mitik/mitog *m*, -n/-s [*d.* Mittag, *mhd.* mitte tac] абед, полудзень; **mítikcajt/mítogcajt** 1. *f* поўдня, паўдня, поўдзень, полудзень, паўдзеньне; 2. *adv.* апоўдні, апаўдні; **mítikn** (esn* mitik) абедаць, палуднаваць; **mítik-ibe(r)rajs** *m*, -n, **mítik-hafsoke** *f*, -s [*s.* (ות-)הפסקה] перапынак на абед; **mítik-sude** *f*, -s [*s.* (ות-)סעודה] урачысты/званы абед, банкет, (сьвяточная) бяседа, баль; **mítog-šo** *f*, -en [*s.* (ען-)שעה] паўдзённая гадзіна
• bejsn mitik за абедам
• blajbn* cum mitik застацца на абед
• cvelf a zejger mitogcajt дванаццаць гадзінаў апоўдні
• farbetn* cum mitik запрасіць на палуднаваньне
• gebn* a mitik (praven a mitik-sude) lekoved emecn даць абед у чыйсьці гонар
• nox mitikcajt пасьля поўдня
• nox(n)/far mitik пасьля/да абеду
• vos vet zajn* cu mitik? што ў нас сёньня на палуднаваньне?
mítkejfler *m* [*s.* -כפל- →kejfl, bekejfl-kiflaim] *mat.* множнік
mítkemfer *m*, -s [*d.* Mitkämpfer] паплечнік, саратнік
mítkiem *m* [*s.* -קיום →kiem, mekujem] суіснаваньне
mítl- [*d.* mittel-] сярэдне-, між-
mitl *n*, -en [*d.* Mittel] сродак, спосаб, мера, мерапрыемства; **mítlster**, **mít(e)ler** сярэдні; **mitlen zix** уладжваца
• a mitl fun kopvejtik сродак ад галаўнога болю
• a zixer mitl надзейны сродак
• blajbn* on mitlen застацца бяз сродкаў
• er klajbt nit iber kejn mitlen (s'zajnen ba im rext/gut/košer ale mitlen) ён ня грэбуе ніякімі сродкамі
• fun mitlen vuks сярэдняга росту
• in di mitele jorn у сярэднім узросьце
• mit ale vegn un mitlen усімі сродкамі (праўдамі і няпраўдамі)
• mitele grejs сярэдняя велічыня
• miteler ojer сярэдняе вуха
• mitlster finger сярэдні палец
• onnemen* mitlen (ton* mitl) прымаць меры, рабіць захады
• onvendn ale mitlen пускаць у ход усе сродкі
• s'iz do a mitl гэта – адпаведны сродак
mítl-alter/-elter *m* [*d.* Mittelalter] сярэднявечча, сярэдневякоўе; **mítlelterlexer**, **mítl-elterišer** сярэднявечны
Mítl-Azje *f* Сярэдняя Азія
mítlejd/mítlajd *f* (mit) [*d.* Mitleid] жаль, шкадаваньне, спачуваньне, спагада
mítlfus *f* [*d.* Mittelfus] *anat.* плюсна
mítlhant *f*, *pl.* -hent [*d.* Hand] *anat.* запясьце
mítl-jidiš *n* [*d.* jüdisch] сярэднявечны ідыш (1500–1700); **mítl-jidišer** сярэднявечна-жыдоўскі

mítl(-)joriker/-jeriker [*d.* jährig] сярэдніх гадоў, сярэдняга ўзросту
mitl(-)lendišer [*d.* mittelländisch] міжземны; **mítllendjamišer** міжземнаморскі
• der Mitlendišer jam Міжземнае мора
mítl(-)mesiker/-mosiker [*d.* mittelmässig] умеркаваны, сярэдні, звычайны; **mítlmesikajt/mítlmosikajt** *f* умеркаванасьць, памяркоўнасьць, звычайнасьць
• a mitlmesiker paršojn – nit kejn grojser xoxem, nit kejn klejner nar *glxv.* пасрэдная пэрсона – не вялікі разумнік, але і не малы дурань (ні пех ні мех)
mítlojfer *m*, -s, (-n *f*, -s) [*d.* Mitläufer] *fig.* спадарожнік; **mitlojferáj** *f* спадарожніцтва
mítlpojer *m*, -n/-im [*d.* Bauer] серадняк; **mítlpojerišer** серадняцкі; **mítlpojertum** *n* серадняцтва
mítlpunkt *m*, -n [*d.* Mittelpunkt] асяродак, цэнтар
• mitlpunkt fun der erd пуп зямлі
mítlšixt *m*, -n [*d.* Schicht] сярэдні слой
mítlštand *m*, -n [*d.* Mittelstand] прамежны стан
mítlštik *f/n*, -er [*d.* Stück] сярэдні кавалак
mítlšul *f*, -n [*d.* Mittelschule] сярэдняя школа
mítlvuksiker [*d.* wachsen] сярэдняга росту
mítmenč *m*, -n [*d.* Mitmensch] (бліжэйшы) сусед
mítmesiker [*d.* mässig] сувымерны; **mítmesikajt** *f* сувымернасьць
mitn *m*, -s [*d.* Mitte] сярэдзіна, сярэдняя частка, цэнтар, асяродак; **mítndiker** прамежны, прамежкавы
• der goldener mitn залатая сярэдзіна
• in mitn naxt апоўначы
mítnemen* [*d.* nehmen] узяць, браць, захапіць з сабой
• m'nemt kejn zax nit mit (на той сьвет) з сабой нічога ня возьмеш
mítnitn *m*, *pl.* mitnitonim [*s.* (ים-)ניטען-] суабвінавачаны, суадказьнік у судзе
mítontejl *m* [*d.* Anteil] саўдзельніцтва; **mítontejlnemer** *m* саўдзельнік
mitóx [*s.* מתוך] *prep.* перад, для, дзеля, за, з(ь), з-за/праз(ь), ад, аб, паводле [*sin.* far, fun, ojs, culib, mit]
mitóx-hamájse [*s.* מתוך המעשה] *adv.* з/паводле самога апавяданьня, з расказу/аповяду [*sin.* fun der dercejlung alejn, durx der dercejlung]
mitóx-sxók [*s.* מתוך שחוק] *adv.* сьмеючыся, сьмехам [*sin.* mit gelexter, laxndik]
mítrajsn* [*d.* mitreissen] *fig.* запаліць, запальваць, натхніць, натхняць, захапіць, захапляць; **mítrajsndiker** *fig.* натхнёны, гарачы
• a mitrajsndike rede гарачая прамова
mítrajznder *m*, -de [*d.* reisen] спадарожнік
mítredn*, **mítcuredn*** [*d.* reden]
• ver es git nit cu kool, der hot nit mitcuredn ba kool *šprxv.* хто не дае ў кагал, той і ня просіць у кагалу
mítšlepn [*d.* schleppen] (па)цягнуць за сабой, у-, за|цягнуць
mítšmueser *m*, -s, (-n *f*, -s) [*s.* -שמועס-] субяседнік, суразмоўца
mítšpiler *m*, -s, (-n *f*, -s) [*d.* Spieler] саўдзельнік у гульні
mítšprexer *m*, -s [*d.* Sprecher] субяседнік
mítštimen [*d.* mitstimmen] 1. узгодніць, пагадзіць; 2. быць згодным, згадзіцца, згаджацца; **mítštimung** *f*, -en 1. згода; 2. *gram.* дапасаваньне
mítšuldiker *m* [*d.* Schuld] сувінаваты
mí(t)tancn [*d.* tanzen] прытанцоўваць; **mí(t)tencer** *m*, -s, (-n *f*, -s) кавалер (дама)
mí(t)tejln, mítcutejln [*d.* mitteilen] паведаміць, паведамляць, перада(ва)ць, апавясьціць, апавяшчаць; **mítgetejlt vern*** перадавацца, паведамляцца; **mí(t)tejlung** *f*, -en паведамленьне, апавяшчэньне
mít(-t)óg [*d.* Mittag] *adv.* апоўдні, апаўдні, паўдня; **mit-tógediker** паўдзённы, паўднёвы
• far mittog=f"m *abr.* час перад поўднем
mít-trinker *m* [*d.* Trinker] сабутэльнік
mítvilikn [*d.* willigen] зрабіць ласку, пажадаць
mítvirkn [*d.* mitwirken] дапамагчы, дапамагаць, садзейнічаць; **mítvirkung** *f*, -en дапамога, садзейнічаньне
mítvojnen [*d.* wohnen] жыць сумесна; **mítvojner** *m* сужыцель
mítvox *m*, -n [*d.* Mittwoch] серада; **mítvoxdiker** які мае дачыненьне да серады
• a proster mitvox *fig.* просты чалавек
• er iz mit a mitvox elter far dir! ён на тыдзень старэйшы за цябе
• in a prostn mitvox у простую сераду (у будзень)
• maxn mitvox šabes есьці скаромнае ў пост
• plucem in a mitvox (in mitn mitvox) раптам у сераду (як гром на небе)
mítzingen* (mit) [*d.* singen] падпяваць
miutim *pl.* →miet *m* [*s.* (-ים)מיעוט] малая частка, меншасьць
mi-voéjš umí-vamáim [*s.* מי־באש ומי־במים] "хто (б не загінуў) у агні альбо ў вадзе" (словы з малітвы аб судным дні "unsane-tojkef")
mix *ak.* (ix) [*d.* mich] мяне
Mixe [*s.* מיכה] *tnx.* прарок Міхей; кніга прарока Міхея
mixje *f*, -s [*s.* (-ות)מיחיה →balmixje, mi jixje] утрыманьне, заробак; ежа [*sin.* ojshaltung, parnose; špajz]
mixnesaim *pl.* [*s.* מכנסים] нагавіцы, штаны, майткі, порткі; сподняя частка савана [*sin.* hojzn]
mixšl *m/n*, *pl.* mixšojlim [*s.* (-ים)מ(י)כשול →maxšl, kšal-, nixšl] 1. спатыканьне, труднасьць, перашкода, завада, загваздка, замін, затрымка; 2. правал, нешчасьлівы выпадак [*sin.* štrojxlung, šterung; durxfal, akcident]
mixtev *m*, *pl.* mixtovim [*s.* (-ים)מ(י)כתב →kasve-, ksive, ksav, kakosev, ksube, kosev-, nixtev] ліст, пісьмо [*sin.* briv]
mixúc=mexúc [*s.* מחוץ →axuc, mexice] па-за (межамі), на тым баку (мяжы), звонку; акрамя, апрача, апроч [*sin.* ojser, in drojsn fun]
mizbejex *m*, *pl.* mizbejxes [*s.* (-ות)מ(י)זבח] ахвярнік, аўтáр [*sin.* altar]
• er nemt funem mizbejex arunter *glxv.* ён падбірае з ахвярніка (у ім німа нічога сьвятога)
mizdamen zajn* zix [*s.* מזדמן] зьявіцца, зьяўляцца; сустрэцца, сустракацца
mizdaveg vern* [*s.* מזדווג] пры-, зь|вяза(в)цца, спалучыцца, спалучацца [*sin.* cugebundn vern, bahoftn vern]
mizerne(r), mízerer [*p.* mizerny] мізэрны, худы, чахлы, змарнелы
mizinek/mizinik *m*, -es [*p.* mizynek, *ukr.* мизинник] апошняе дзіця ў маткі, малодшы, меншы сын, пястун, мезенец, пасьледак; **mizinke/mizinice** *f*, -s малодшая, меншая дачка
mizjúkl *n*, -ex [*ukr.* мізюк] соска, пустышка

mizmer *m*, *pl*. mizmojrim [*s*. (מ(י)זמור(-ים) →zmires, zemer, klezmer] 1. псальма, песьня, сыпеў, гімн; 2. *hum*. дамаганьне, прэтэнзіі, папіка, папрокі, дакоры, абвінавачваньне [*sin*. gezang, lojblid; ibergexazerte tajne; tajnes, bašuldikung]; **mizmojr šir lejom hašabes** [*s*. מזמור שיר ליום השבת] песьня ў гонар суботы

• s'gejt vi a mizmer ідзе як па масьле (хутка й гладка)

• visn*/kenen* epes vi a mizmer ведаць штосьці як псальму (на памяць/зубок)

• er zogt es vi a mizmer ён прагаварыў гэта як псальму (прыгожа й хутка)

mizrex *m*. **mizrex-zajt** *f* [*s*. מ(י)זרח] усход (кірунак сьвету) [*sin*. orient]; **mizrex** *m*, *pl*. mizroxim [*s*. (ים-)] выява альбо аздабленьне, якое вісіць у хаце на ўсходняй сьцяне дзеля азначэньня кірунку на Ерусалім; **mizrexdiker** усходні; **mizrex-cu** *adv*. да ўсходу; **mizrex-ejropéjišer** усходнееўрапейскі; **mizrex-kener** *m* усходазнаўца; **mizrex-kénteris** *f* усходазнаўства; **mizrex-vant** *f*, *pl*. -vent усходняя сьцяна ў хаце (кірунак на Ерусалім); *fig*. паважная асоба, эліта

• [illegible] mizrex на ўсход

• [illegible]ajter/noenter/miteler mizrex Далёкі/Бліжні/Сярэдні Усход

• gejn* mitn veg af mizrex накіроўвацца на ўсход

• [illegible] kejn majrev, draj kejn mizrex, /un di rešt – kejn dorem, /un dem bojm gelozt alejn /hefker farn šturem... (I. M.) тры (штушкі) – на захад, тры – на ўсход, астатнія ў вырай, а дрэва засталося стаяць у адзіноце пад усімі вятрамі...

• vej-vej, vos iz ništ geven af dozikn mizrex! bern, un lejbn, un vilde kec, un odlers, un fojglen, un šojfers, un menojres, un esrojgim, un šiselex mit mogn-dovedlex... (Š.-A.) вой-вой, чаго толькі не было на гэтай выяве! мядзьведзі, і львы, і дзікія кошкі, і арлы, і птушкі, і шофары, і сямісьвечнікі, і цытроны, і талерачкі з зорачкамі Давіда...

Mizroxi=merxaz ruxani 1. *m/f* [*s*. מזרחי=מרכז רוחני] "Мізрахі" ("духоўны цэнтар" альбо "ўсходні"), назоў рэлігійна-сіянісцкага руху, заснаванага Іцхакам Рэйнэсам у 1904 г.; 2. *m*, -m сіяніст

mjač *m*, -es [*ukr*. м'яч] мяч

mjačen [*p*. miąć, *d*. zermatschen?] (с)камячыць, мяць

mjatélice=metélice *f*, -s мяцеліца, завіруха, завея

mjatéž *m*, -n [*r*. мятеж] мяцеж; **mjatežnik** *m*, -es мяцежнік

mjat(k)e *f* [*ukr*. м'ята] *bot*. мята; **mjatne(r)** мятны

mjau [*r*. мяу] *int*. мяў; **mj(a)úken/mjavken/mjáuen/mjojken** [*p*. miauknąć] (м)яўкаць, каўкаць

• az es kumt arojs fun a kac, maxt es "mjau" *šprxv*. хто кашэчай пароды, той мяўкае (калі баба, дык бабуй; калі курэц, то насі люльку і тытунец)

• a kac, vos mjavket, ken kejn mojz nit xapn котка, што каўкае, мыш ня зловіць

mjaxke(r) [*r*. мягкий] мяккі

• mjaxke levoves мяккія сэрцы

m(j)édnice=mídnice *f*, -s мядніца, мядзяная міс(к)а, таз

m(j)ente *f bot*. мята

mjestečke *f*, -s [*p*. miasteczko] мястэчка

m(j)ešonžnik *m*, -s катляр

mjex *m* [*p*. miech, *r*. мех] кавальскі мех

miečarnje *f*, -s [*p*. mleczarnia] малочная крама, малачарня

mlien (zix) [*r*. млеть, *ukr*. млоїти] *kul*. млець, доўга парыцца ў закрытай пасудзіне

mlince=milinče *f*, -s [*ukr*. млинець] *kul*. блінец з сырам

mljave(r) [*ukr*. млявий] млявы; **mljoven** млець, слабнуць

mloče *m*, -s [?] юнак-добраахвотнік жыдоўскага пахавальнага брацтва

mlojcen/mlojčen=melojcen=molojcen [*p*. młocić] малаціць; **mlojce** *f*, -s цэп

mlojen=molojen=malojen (bam harcn) [*r*. млеть, *ukr*. млоїти] адчуваць мло(сна)сьць/моташнасьць

mloj-kojmóse [*s*. מלא־קומתו →mole-] *adv*. ва ўсёй сваёй вышыні, ва ўвесь рост, наўсьцяж [*sin*. in zajn fuler hejx, glajx ojsgecojgn]

• zix ufšteln mloj-kojmose станавіцца/падымацца ва ўвесь рост

mlosne(r)/mlošne(r) [*ukr*. млость] млосны; **mlósnekajt** *f* млосьць, млоснасьць

• s'iz im gevorn mlosne fun hic яму стала млосна ад гарачыні

mlóxe(ne)n=melóxe(ne)n [*s*. -מלאכה →(bal)meloxe] 1. вы-, пад|рабіць, вы-, пад|рабляць штучна, фальсыфікаваць, (з)варганіць, (с)халтурыць, (с)фальшывіць; 2. *vulg*. спраўляць натуральныя патрэбы

Mloxim (I, II) [*s*. (מלכים (א', ב' *tnx*. дзьве Кнігі Царстваў

mniške *f*, -s [*p*. mnich] 1. манашка; 2. *kul*. піражок з сырам

mnoxes [*s*. מנחות] "падарункі"; *tlmd*. назоў 2-га трактату 5-га разьдзелу (запаветы аб ахвяраваньні мукі і іншых расьлінных прадуктаў, аб філяктэрыях і аб цыцэс) [*sin*. gešanken]

mo=ma=me [*s*. מה] *int*. што? як!?

mo onu umé xajéjne=móne-mexajéjne [*s*. מה אנו ומה חיינו] што мы ёсьць, і што ёсьць наша жыцьцё?

moce- [*s*. מוצאי →mojce, nimce] "выхад, выйсьце"; напрыканцы сьвята, увечары пасьля сьвята [*sin*. der arojsgang]: **moce-jóntef** [*s*. יום־טוב] сьвяточным вечарам; **moce-šábes** [*s*. שבת] вечарам у суботу

móceven [*p*. mocować, *ukr*. моцювати] мацаваць; **mocne(r)** моцны

močalke *f*, -s [*r*. мочалка] мачалка, вяхотка

močevnik *m*, -s [*p*. mocz, *ukr*. мочити] пісуар

móčinke *f*, -s [?] яйцо ўсьмятку; **móčiker** мяккі, ліпкі, клейкі

• maxn a močinke fun epes зрабіць кашу з чагосьці

mod *f*, -n [*d*. Made] *zool*. лічынка

Modaj [*s*. מדי] *tnx*. краіна Мідзія (4 Цар. 17:6, 18:1; Б. 10:2) [*sin*. Midje]

mode *f*, -s [*d*. Mode] мода; **módišer** модны; **módiškajt** *f* моднасьць; **modistke** *f*, -s мадыстка; **módnice** *f*, -s модніца

• arójs fun der mode (ojs mode) выходзіць з моды

• in der mode у модзе

• vu a core, dort a mode *glxv*. дзе ліха, там і мода

modelke *f*, -s [*p*. modelka] натуршчыца

Modín=Mojdiin [*s*. מודיעין] Модзі(і)н/Модзі(і)м, назва гістарычнай мясцовасьці на поўначы ад Ерусаліму, дзе пачалося ў 167 г. да н.э. гэбрэйскае паўстаньне супраць грэка-сырыйцаў

modljen zix [*p*. modlić] маліцца; **modlitve** *f*, -s малітва

modne(r) [*p*. modny] дзіўны, дзівосны, камічны; **módnekajt** 1. *f* дзіўнасьць, дзівацтва; 2. *f/n*, -n капрыз, прыхамаць

• a min modne zax дзіўная рэч

• a menč mit modne geng дзівосны чалавек

• a modner cunojffal дзіўнае супадзеньне

• a modner paršojn – me špajt im in ponem un er zogt, az es gejt

a regn *glxv.* дзівак-чалавек: плююць яму ў твар, а ён кажа, што ідзе дождж (яму хоць сцы ў вочы, а ён усё кажа, што дождж ідзе; дурня б'юць, а ён кажа: у царкву вядуць)

modus *m*, -n [*d.* Modus] *gram.* лад

• faktišer modus *gram.* абвесны лад

moer *m* [*s.* מאור] сьвятло, крыніца сьвятла (звычайна як тытул славутых рабінаў) [*sin.* lixt(kval)]; **moer-hagójle** [*s.* הגולה] тытул "сьвятло выгнаньня, чужыны"; як тытул для рабіна Гершн-Мэйер-Гагойлы (960–1028)

moes [*s.* מאום →mieser, nimes, farmiesn] абрыдла, надакучыла, прыкра, кепска, блага, дрэнна [*sin.* cugegesn, umajngenem, nist šejn]

moes *pl.* [*s.* מעות] грошы [*sin.* gelt]; **moes-xítn/-xítim** *n* [*s.* חיטים/חיטין] "грошы на пшаніцу"; грошы, якія ахвяруюць, каб забясьпечыць бедных людзей мацой на Пэйсах

• az me hot moes, iz men a balebos *glxv.* хто мае грошы, той і гаспадар

• az got lozt lebn, muz er dercu moes gebn *šprxv.* калі бог дае жыцьцё, ён мусіць даць яшчэ і грошай

• dos gance moes-xitn gejt bam šiker avek af xomecdikn branfn *glxv.* у п'яніцы ўсе пшанічныя грошы ідуць на пшанічную гарэлку (латамі трасе, а апошняе на гарэлку нясе)

• on moes iz tomed a toes *glxv.* хто бяз грошай, той заўжды вінаваты

mofsim *pl.* →mojfes *m/n* [*s.* (ם-)מופת] цуд, дзіва, дзівота; узор, прыклад

mógerer [*d.* mager] худы; мізэрны, убогі; **mógerkajt** *f* худасьць, худзізна, худоба

• moger vi a hunt (in najn teg), vi a fajg/suxotnik/vanc/xort/štekn/štekl/špon худы як сабака (у пост), як фіндос/сухотнік/клоп/хорт/палка/трэска (як жэбра/чапля/аплатка/бізун/дошка/нітачка/ражон/рак/сьмерць/смык/струк)

• mogere hent худыя рукі

• a feter rov un a mogerer galex tojgn bejde nit *šprxv.* тоўсты рабін і худы поп – абодва нікуды ня вартыя

• biz der feter vert moger, gejt der mogerer cu grunt *glxv.* пакуль тлусты ссохне, то худы здохне (пакуль сыты зьліняе, дык голы сканае; пакуль тоўсты абліняе, з худога дух выскачыць; пакуль з багатага пух, то зь беднага дух)

mogn *m*, -s/mégener, *dim.* **mégele** *n*, -x [*d.* Magen] страўнік; кіндзюк, трыбух; **mógn-gešvir** *m med.* язва страўніка; **mógnvorem** *m*, *pl.* -verem гліст, рабак; **mógnzaft** *m* страўнікавы сок

• a kalje mogn хвароба на жывот, сапсаваньне жывата

• a lojzer/hartet mogn *med.* панос/запор

• afn nixtern mogn нашча, на пусты страўнік

• er hot a hartn mogn яму скрапіла жывот

• hobn* dem mogn спраўляць натуральныя патрэбы

• majn mogn ken dos nit fartrogn мой страўнік гэтага ня вытрывае

• s'ligt in mogn гэта ляжыць у страўніку (не забудзецца)

• a guter bisn lejgt zix in mogn *glxv.* добры кавалак прыдатны для страўніка

• a guter mogn ken fil fartrogn *glxv.* добры страўнік можа шмат вытрымаць

• az der bajtl iz fil (ful), iz der mogn ruik un štil *šprxv.* калі кашалёк поўны, у страўніку спакойна і ціха

• der mogn halt beser a sod, vi dos harc *glxv.* страўнік хавае сакрэты лепш за сэрца

• di ojgn zajnen greser ba im funem (vi der) mogn (vi dos mojl, vi der haldz) вочы ў яго большыя за страўнік/рот/горла (вочы па яблыку, а галава з арэх; вочы завідушчыя, рукі заграбушчыя)

• er hot a mogn vi kools bak-ojvn *glxv.* у яго страўнік як катальная печ

mogn*=megn* (gemógt) [*d.* mögen] мець правы/дазвол, магчы

mogn-dóved/-dóvid *m*, -n/-s [*s.* (ם-/ן-)מגן־דוד] "шчыт Давіда"; шасьціканцовая зорка (сымбаль юдаізму); **mogn-óves** *m* [*s.* אבות] "бацькоўскі шчыт"

• der gezintster mogn iz der "mogn-oves" найздаравейшы страўнік – "бацькоўскі шчыт" (*vrtš.* "mogn" страўнік – "mogn" шчыт)

Mo(hi)lev г. Магілёў

• got zol ophitn far berdičever negidim un far umanjer xsidim, far konstantiner mešorsim un far mohilever apikorsim, far kamenecer xadatejes un far odeser hultajes *glxv.* барані божа ад бярдзічаўскіх багацеяў і ўманскіх хасыдаў, ад канстанцінаўскіх наймітаў і ад магілёўскіх бязбожнікаў, ад камянецкіх хадайнікаў і адэскіх гультаёў

mohilkes *pl.*, **mohilnik** *m*, -es [*sl.*] могілкі, маг(і)ліцы, могільнік, магільнік

mo(ho)ríč/mohríč=maharíč=magaríč *m* [*ukr.* могорич, *r.* магарыч, могорыч] магарыч, барыш

mojce *f*, -s [*s.* (ם-)מוציא] кавалак/луста/скіба хлеба [*sin.* štik brojt]

• di gance xale gejt avek af a mojce *glxv.* уся хала пайшла на лусту хлеба (вычынка даражэй за аўчынку)

mojce zajn* [*s.* מוציא →moce-, nimce] 1. выканаць, выконваць за кагосьці рэлігійны абавязак, заступіць, заступаць; 2. выпусьціць, выпускаць (слова/гук) [*sin.* fartretn; arojslozn]; **mojce-láaz zajn*** [*s.* לעז], **mojce-šémra zajn*** (af) [*s.* שמרע] абгаварыць, абгаворваць, абмовіць, абмаўляць, пляткарыць, узводзіць паклёп, рабіць плёткі, абняславіць [*sin.* baredn]; **mojce-šnóse zajn*** [*s.* שנתו] дажы(ва)ць да будучага году; пражы(ва)ць свае гады; **mojce-zere-levatóle** *m* [*s.* זרע־לבטלה] ананіст [*sin.* onanist]

mojce-xéjn zajn* (ba) [*s.* מוצא־חן] (с)падабацца [*sin.* gefeln, ojsnemen]

mojd=mad *f*, *pl.* -n/mejdn [*d.* Mädchen, *mhd.* mait, meide] дзеўка, дзяўчына, дзяўчо

• a mojd mit a bord дзеўка з барадой (на хлопца, які робіць жаночую работу)

• farzesene/alte mojd старая дзеўка, векавуха

• an alte mojd iz zixer far a jungn tojt *glxv.* старая дзеўка ўпэўнена ў заўчаснай сьмерці

• an oreme mojd ligt in kinpet! *iron.* бедная дзяўчына раджае! (спачуваньне)

• az di mojd iz mies, zogt zi, az der špigl iz šuldik *glxv.* калі дзяўчына непрыгожая, кажа яна, што люстэрка крывое (не наракай на люстра, калі морда крывая, калі нос крывы)

• beser a junge almone, ejder an alte mojd *glxv.* лепей маладая ўдава, чым старая дзеўка

• er iz avekgegangen vi di mojd funem tanc ён сышоў як дзеўка з танцаў (кінуў нейкую справу)

• fun an alter mojd iz gevorn a jung vajbl (fun an alt mejdl vert a jung vajbl) са старой дзеўкі пераўтварылася ў маладую кабету

mojde *m*, -s [*s.* (ם-)מודה →misvade, vide] прызнаньне, споведзь; **mojde zajn* (zix)** (in, az) згадзіцца, згаджацца, прызна(ва)ць (слушным), пры-, са|зна(ва)цца (у памылках або ў злачынствах) [*sin.* cugebn, onerkenen, gebn jenem gerext]; **mojde-umisváde zajn* (zix)** [*s.* ומתוודה] прызна(ва)ць (сябе) вінаватым, цалкам не абвяргаць, шчыра прызна(ва)цца

• cvingen* emecn zix mojde zajn* змусіць кагосьці прызнацца

• nit veln* zix mojde zajn* запірацца, не прызнавацца

• x'bin mojde-umisvade я каюся, цалкам прызнаюся

• Dajn mame, zi zol in lazaret, oj, lign, /af a cvejter betele s'tu lign akegn ir. /N'az ix vel kumen cu n'ajx gevojre vern – /zolt ir zix mojde zajn, az got colt ajx far mir. *flksl.* Гваёй маці, ой, ляжаць бы ў лязарэце, а табе на другім ложачку насупраць. Ну а калі я прыйду адведаць вас – за тое, што бог вам адплаціў за мяне.

• ver s'iz zix mojde, der štroft men nit (mojde beemes poter miknas) *sprxv.* хто прызнаўся, таго не караюць (пакаянной галавы меч не сячэ)

mojde(-áuí) *m* [*s.* מודה־אני] "я дзякую" (першыя словы і назоў малітвы, якую чытаюць раніцай, падняўшыся з ложка; першая малітва, якую вучаць дзеці); **mojdim** [*s.* מודים] "мы дзякуем" (першыя словы і назоў аднае з малітваў "Šimenesre", якую чытаюць, кланяючыся да зямлі)

• mojdim biz cu der erd, šmadštik biz cum himl *šprxv.* малітва да зямлі, жульніцтва да неба (перад богам кленчыць, а людзей мэнчыць)

• vos tifer me bukt zix "mojdim", vos vajter gejt men "ojseśolem" curik *glxv.* чым ніжэй кланяецца, тым далей да канца малітвы (добра гаворыць, ды нядобра творыць; лёстачкамі дух займае, а чорта думае)

mojdie=medie zajn* [*s.* מודיע →jedie, jadn, jedeje, hojdoe] аб-, апа|вясьціць, аб-, апа|вяшчаць, паведаміць, паведамляць, асьведамляць, інфармаваць [*sin.* onzogn, meldn, lozn visn, informirn]; **mojdoe=medoe** *f*, -s [*s.* (ות-)מודעה] паведамленьне, абвяшчэньне, аб'ява; анонс, рэкляма [*sin.* onzog, meldung; anons, reklame]

mojed [*s.* מועד] *tlmd.* "сьвята" (назоў 2-га з 6-ці разьдзелаў) [*sin.* fajertog]; **mojed-kótn** [*s.* קטן] "напалову сьвяточныя дні"; *tlmd.* назоў 11-га трактату 2-га разьдзелу (запаветы аб работах, якія дазволена альбо не дазволена выконваць у напалову сьвяточныя дні, а таксама аб жалобных днях)

mojeł *m*, -s [*s.* (ים-)מוהל →mile, mal(j)e] чалавек, які выконвае абрад абразаньня, могель [*sin.* bašnajder]; **mójelmeser** *m/n*, -s нож для абразаньня; **mójelšaft** *f* пасада і функцыі могеля; **mójel-mel** *n* пыл (гнілога дрэва альбо іншага матэрыялу), у які могель кладзе адрэзаную крайнюю плоць

mojel-bišlíxes zajn* [*s.* מועל־בשליחות] ня выканаць даручэньне

mojer *m*, -n [*d.* Maure] маўр, мараканец

mójern [*d.* mauern] мураваць; **mojer** *m/f*, -n, *dim.* **májerl** *n*, -ex сьцяна, мур; камяніца, мураванка; **mójerer** *m*, -s муляр

• an ejgn mojerl асабняк, маёнтак

• me ken mojern šteln af emecn можна паспадзявацца на кагосьці

• Ix hob gebojt a mojerl, /a mojerl mit zeks fencter... /Un vifl šiduxim me hot mir geredt, /bistu geven der šenster. *flksl.* Я будавала мураванку з шасьцю вокнамі... Шмат жаніхоў мяне сваталі, але ты быў самы прыгожы.

• Jankl der mojer Янкель-мур (аб цяжкім чалавеку)

m(ój)erkop *m*, *pl.* -kep, **mójerkepl=méjerkepl=májerkepl** *n*, -ex [*d.* Mauer] марская ракавіна; *zool.* чарапашына

Mojev [*s.* מואב] *inx.* 1. Мааў (сын Лота); 2. назоў краіны на ўсходнім беразе Ярдана; маавіцяне (народ гэтай краіны) (Др. Зак. 2:10; Б. 19:37)

mojex *m*, *pl.* mojxes, *dim.* **mój(e)xl=méj(e)xl** *n*, -ex [*s.* (ות-)מוח →bal-mojex, farmojexn] мазгі, моз(а)г, глузд; галава; інтэлект, розум [*sin.* gehirn; kop; klugšaft, intelekt]; **mójexn zix** [*s.* מוחן] удум(в)аца, разважыць, разважаць, раздумваць, раздумляць, размысьліць, размышляць, ламаць сабе галаву [*sin.* zix griblen, arajntraxtn]; **mójex-cvog** *f* прамываньне мазгоў; **mójex-knejč** *m*, -n хітрыкі; развага, разважаньне, роздум; **mojexl-avójnes** *pl.* [*s.* עוון־גות] грахоўныя мазгі (на папа/ксяндза)

• a šarfer/temper/kecišer mojex востры/бесталковы/кашэчы (кароткі) розум

• an ofener mojex сьветлы розум

• brexn* zix dem mojex bam lejzn di ufgabe ламаць галаву над вырашэньнем задачы

• culejgn mojex cu epes прыкласьці розум да чагосьці (разважыць)

• di beste mojxes fun der menčhajt лепшыя розумы чалавецтва

• di šarfkajt funem mojex вастрыня розуму

• dos iz nit far zajn (švaxn) mojex гэта не ягонага розуму справа

• špaltn* emecn dem mojex раструшчыць камусьці чэрап

• cum sejxl badarf men kejn mojexl *šprxv.* розуму мазгі не патрэбны

• vu/ven me darf hobn mojex, helft nit kejn kojex *šprxv.* дзе трэба мець мазгі, не дапаможа моц (дзе сілаю ня возьмеш, там трэба розумам падтачыць; дзе ня можна сілай, бяры здогадам; ня сілаю, дык спосабам)

mojfes *m/n*, *pl.* -n/mofsim [*s.* (ים-)מופת →bal-mojfes] цуд, дзіва, дзівота; узор, прыклад [*sin.* vunderlexer cejxn, vunder; muster, bajšpil]

• nemt di mame ot di ejer, /oj, iz dos a mojfes, /zect zi uf af zej a kvoke, /hobn mir šejne ojfes (Z. R.) вось маці бярэ яйкі, ой, які цуд, садзіць на іх квочку, і мы маем прыгожых куранят

mojker *m*, *pl.* mojkirim [*s.* (ים-)מוקיר], **mojker-** [*s.* מוקיר (מוקירי־)] шанавальнік, аматар, заўзятар, прыхільнік (кагосьці/чагосьці), мэцэнат [*sin.* ophiter/libhober (fun)]

mojl *n*, *pl.* majler, *dim.* **majlxl** *n*, -ex [*d.* Maul] рот; **mójliker** ротавы; **mójlšios** *m*, *pl.* -šleser, **mójlband** *m*, *pl.* -bend(er) намордник; **mójl-rejex** *m* [*s.* ריח־] непрыемны пах з рота; **mójlštik** *m*, -n мундштук; **mójl-xolel** *m* [*s.* חלל־] ротавая поласьць

• a grojser mojl вялікі рот

• a mojl af šrojfn добра падвешаны язык (на шрубах, бяз костак)

• alc, vos a mojl ken redn усё, аб чым рот можа гаварыць
• arajnfaln* cu lajtn in di majler (in lajtiše majler) патрапіць на злыя языкі
• arajnlejgn emecn a finger in mojl класьці камусьці палец у рот
• arojsnemen* fun mojl апярэдзіць словы
• brengen* farn mojl вымаўляць, казаць
• fun mojl cu mojl з рота ў рот, на словах, вусна
• haltn* s'mojl *vulg.* заткнуцца
• hobn* a mojl af redelex мець рот на колцах (язык бяз костак)
• lebn fun hant in/cum mojl жыць з рукі ды ў рот (ледзь перабівацца)
• mitn fuln mojl на ўвесь голас, упэўнена
• nemen* in mojl arajn нешта зьесьці, перакусіць
• onnemen* a mojl mit vaser (nit kenen* efenen kejn mojl) набраць вады ў рот
• onšteln/ufcušteln mojl un ojer(n) af epes натапырыць вушы, разявіць рот (слухаць на ўсе вушы)
• redn* mit a halb(n) mojl не абяцаць, ня зьвязваць сябе абавязкам
• zajn* af alemens majler (ba alemen af di lipn) быць ва ўсіх на вуснах
• a mojl – a britan(sker) рот як у бульдога
• az me iz fojl, hot men nit in mojl *šprxv.* у гультая пуста ў роце (пачнеш ляніцца – будзеш з торбай валачыцца; станеш ленавацца, будзеш з хатулямі цягацца; гультаю хлеб на кію)
• der menč hot cvej ojgn, cvej ojern, ober nor ejn mojl *glxv.* чалавек мае два вокі, два вухі, але толькі адзін рот
• dos mojl zol zix dir šteln af a zajt! (dajn mojl zol zix ojsdrejen!) *kll.* каб табе рот скрывіла!
• got zol ophitn far gojiše hent un far jidiše kep/majler *glxv.* барані божа ад мужыцкіх рук і ад жыдоўскіх галоваў /языкоў
• fun dajn/ajer mojl in gots ojern (arajn)! з твайго/вашага рота ды богу ў вушы!
• m'ken lajt di majler nit farmaxn *glxv.* людзям раты не заткнеш (людзям губы не завяжаш (языка не прывяжаш); німа тае хусты, каб завязаць людзям вусны)

mo(j)l *m*, -n [*p.* mól] *zool.* моль

mójlber *m* [*d.* Maulbeere] *bot.* морва, шаўкоўніца

mojled *m* [*s.* מולד] "нараджэньне"; зьяўленьне маладзіка (першай квадры месяца) [*sin.* dos gebojrn]; **mojled zajn*** (на)радзіць, раджаць [*sin.* gebern, gevinen, hobn]

mójl(-)ejzl *m*, -en [*d.* Maulesel] мул

Mojlex *m* [*s.* מולך] *inx.* Молах, ідал агню (якому некаторыя старажытныя народы прыносілі ў ахвяру дзяцей) (3 Цар. 11:7)

mójlexer *m*, -s [*s.* (ס-)מולכער] кантрабандыст, шмуклер [*sin.* kontrabandist, šmugler]; **mójlexn** перавозіць кантрабанду

mójlvorf/mojlvurf *m*, -n [*d.* Maulwurf] *zool.* крот

mojre *f*, -s [*s.* (ס-)מוראַ] боязь, жах, страх [*sin.* šrek, paxed]; **mójrediker** страш(эн)ны, жудасны, жахлівы; **mójrevdiker/mójrendiker** баязьлівы, боязкі, боязны, палахлівы, пужлівы; **mojre hobn*** (far, az) баяцца, палохацца; западозрыць, падазраваць; **mojre-néfešnik** *m*, -es [*s.* -נפשׁ] жудасны чалавек

• mojre hobn vi far der kac баяцца як котку (як сабака мух, як воўк казы/сабакі/ягняці/авечкі)
• mojre hobn* vi far fajer, vi farn tojt, vi far a bejzer šviger палохацца/баяцца як агню/сьмерці, як ліхой цешчы /сьвякрові (як ваўка/гадзюкі/заразы/халеры/сьмерці, як ліхой шапкі, як чорт крыжа/ладану, як шалёнага сабакі)
• ojs mojre far a toes (mojre hobndik maxt a feler) баяцца памыліцца
• onvarfn* a mojre (af) наводзіць жах
• ot di geviksn hobn mojre far kelt вось гэтыя расьліны баяцца холаду
• x'hob mojre, ix zol dir nit deresn (nit nimes vern) я баюся, каб табе не надакучыць
• a bejze mojre af im! *kll.* ліхі жах на яго!
• far der tlie hobn menčn mer mojre, vi far got alejn *šprxv.* шыбеніцы людзі баяцца болей, чымся самога бога
• host mojre? – lejg dix in bet arajn *hum. glxv.* баішся? –кладзіся ў ложак
• – Toxterl majne, toxterl gold, /antlojf vi a fajfl funem bojgn; /x'hob mojre, der kejser vet krign dix holt, /ven er vet derzen dajne ojgn. (S. B.) – Дачушка мая, дачушка залатая, бяжы стралой з лука; я баюся, што ты цару спадабаешся, калі ён убачыць твае вочы.
• ven nit di mojre, volt geven zis di avejre *glxv.* калі б ня страх (перад пакараньнем), грэх быў бы салодкім (калі б ня страх, то б зьвёўся манах)
• zol ix azoj mojre hobn far im tojterhejt, vi ix hob mojre far im lebedikerhejt! каб я яго так баяўся мёртвага, як баюся жывога!

mojred *m*, *pl.* mo(j)rdim [*s.* (-ים)מורד →meride] паўстанец, мяцежнік, бунтар, бунтаўнік, рэвалюцыянэр [*sin.* videršpeniker, ufštendler, rebel, revolucjoner]; **mojred zajn*** бунтаваць, паўста(ва)ць, (су)праціўляцца, супрацівіцца [*sin.* revoltirn, zix bunteven, videršpenikn]; **mójrediker, mójrdišer** мяцежны, бунтарскі; **mojred-bemálxes** *m*, *pl.* mordim-bemálxes [*s.* במלכות־] чалавек, які супрацівіцца цару/ўладзе, які пакрыўджаны ўладамі

mojred zajn* [*s.* מוריד] па-, зь|меншыць, па-, зь|мяншаць
• dos iz nit majle un nit mojred (dos vet nit majle zajn un nit mojred zajn) німа патрэбы ні ўзвышаць, ні прыніжаць

mojre-dérex *m* [*s.* (מורי־) מורה־דרך] праваднік, правадыр, вож, настаўнік [*sin.* vegvajzer, lerer]

mojre-héter zajn* [*s.* מורה־היתר] вырашыць, вырашаць; дазволіць, дазваляць (паводле юдэйскіх законаў) [*sin.* paskenen; derlojbn, mater zajn]

mojre-hojróe/mojreroe *m*, -s [*s.* (-ס)מורה־הוראה] рабін, судзьдзя; гэбрэй, які можа вырашаць спрэчныя пытаньні [*sin.* rov, dajen]

mojrejne=merejne *m*, -s [*s.* (-ס)מורנו] "наш настаўнік"; вялікі вучоны, паважны чалавек, арыстакрат (часта *iron.*) [*sin.* undzer lerer, grojser gelernter, ongezeener menč, jaxsn]; **mojrejne (verabejne) haráv reb=muharár** *abr.* [*s.* הרב רבנו (ורבנו)=מוהר"ר] "наш вож і настаўнік рэб"
• derzelber "mojrejne" той самы арыстакрат

mojre-mojréjne *m*, -s [*s.* (-ס)מורה־מורינו] "настаўнік з настаўнікаў"; вялікі талмудычны аўтарытэт (часта *iron.*)

Mojre-nevúxim *m* [*s.* מורה־נבוכים] "Правадыр разгубленых" (назоў вядомай філязофскай працы Рамбама)

mojsef/mojsif zajn* [*s.* מוסיף →hojsofe, musef] набавіць, набаўляць, дада(ва)ць [*sin.* cugebn, culejgn]

mojser *n*, *pl*. mo(j)sres(n) [*s*. (ן)מותר(-ות/ותן →tvue-mojsres] 1. рэшта, астача; 2. *pl*. раскоша, пышнасьць, празьмернасьць [*sin*. ibergeblibns, iberiks; luksus]

mojser *m*, *pl*. mosrim [*s*. מוסר →masern, mesire, moser, muser, ojsmusern] даносчык, даказчык, паклёпнік, пляткар, каверзьнік, намоўнік, жыгун, мантач, абвінаваўца, скаржнік, стукач, сэксот; шантажыст; **mojser zajn*** пера-, ад|да(ва)ць [*sin*. ibergebn]; **mojser ksav ze=mukáz** *abr*. [*s*. ז(")מוכ=זה כתב מוסר] той, хто прыносіць гэты ліст; **mojser-mojdóe zajn*** [*s*. מודעה] паведаміць, паведамляць, за-, аб'|явіць, за-, аб'|яўляць, абвесьціць, абвяшчаць (адкрыта) [*sin*. derklern efntlex, meldn, onzogn]; **mojser-néfeš zajn* zix** [*s*. נפש] адда(ва)ца душой і целам, ахвяраваца, прысьвячаць жыцьцё, рызыкаваць жыцьцём [*sin*. maktev zajn]; **mojser-néfešdiker** адданы, верны

Mojše rabejnu [*s*. משה רבנו] *inx*. "(прарок) Ма(й)сей наш настаўнік"; **Mojše-grójs** *m* (Mojše grojs) жыд-зазнайка, самахвалец, гардун, надуцік; **Mojše-mexújev** *m* (Mojše mexujev) = **Mojše-mexújevnik** *m*, -es *iron*. даўжнік; чалавек, які камусьці нешта павінны (звычайна ў нэгатыўным сэнсе); **Mojše-kapójer** *m* (Mojše kapojer) чалавек, які робіць усё наадварот; **Mojše-tóv** *m* [*s*. תו], **Mojše-tóves** *m* [*s*. תחת] *argo* недасьведчаны тэатральны глядач

Mojše-rabéjnes kiele/behejmele *zool*. божая кароўка, бокашка, багоўка, кузурка, барбуха; *fig*. дурань

- Mojše rabejnu hot mit di jidn ojx nit gekont ojskumen нават сам Майсей ня здолеў з гэбрэямі паладзіць
- Mojše zux mix! Mojše-zúx-mix! шукай ветру ў полі
- ven Mojše rabejnu hot geredt mit got afn barg Sinaj, hot er ongeton ■ maske, ict zajnen ale, vos rejdn mit got, farmaskirt калі Майсей, гаспадар наш, размаўляў з богам на гары Сынай, ён надзяваў маску, цяпер усе, хто гаворыць з богам, замаскіраваныя
- – Ver vet undz Tojre zogn/lernen af der sudenju? /– Mojše rabenju, /Mojše rabenju vet undz Tojre zogn/lernen /af der sudenju! *flksl*. – Хто будзе нам чытаць Тору на пагулянцы? – Майсей, наш настаўнік, будзе нам чытаць Тору на пагулянцы!
- Vifl Mojše-rabejnes iz do af der velt? – Draj... Mojše der šnajder, Avreml der šuster un ix, Motke!.. Колькі Майсеяў у сьвеце? – Тры... Моўша-кравец, Абрамка-шавец і я, Мотка!..

mojšev *m* [*s*. מושב →farmojševter] 1. нячыстае месца, неахайнасьць, нечыстата, нечысьціня, бруднасьць, бязладзьдзе, непарадак; 2. населены пункт, абжытае месца, паселішча, вёска, сяло, сяліба; 3. каапэрацыйнае паселішча ў Палестыне (Ізраіле) [*sin*. umrejn ort, umrejnkajt, umordenung; bavojnt ort, jišev]; **mojšev-léjcim** *m* [*s*. לצים] "месца рагатуноў"; хеўра дурасьліўцаў/шаляніцаў/жартаўнікоў; грамада цынікаў; **mojšev-skéjnim /-zkéjnim** *m*, -s [*s*. (ם-)זקנים] дом для састарэлых, установа для старых людзей [*sin*. elterhejm]

- a mojšev vi ba der rebecn in bet *glxv*. бруд як у рабініхі ў ложку
- vu hint biln, dort iz a mojšev *glxv*. дзе сабакі брэшуць, там і паселішча

mojšl *m*, *pl*. mošlim [*s*. (ים-)מושל →memšole] валадар, уладар, пан [*sin*. geveltiker, heršer, maxthober]; **mojšl-bekípe** *m*, *pl*. mošlim-bekipe [*s*. (מושלים) בכיפה] моцны ўладар; валадар, які навязвае іншым сваю ўладу

mojxer *m*, *pl*. moxrim [*s*. (ים-)מוכר] прадавец, гандляр [*sin*. farkojfer; *ant*. kojne]; **mojxer-sfórim** *m*, *pl*. moxre-sfórim, **mojxer-sfórimnik** *m*, -es [*s*. (מוכרי) ספרים] кніганоша, кнігапрадавец; **Méndele Mojxer-Sfórim** Мэндэлэ Мойхэр-Сфорым, псэўданім Шолэм-Янкева Абрамовіча (1835–1917) ("der zejde" дзядуля – адзін з трох клясыкаў літаратуры на ідышы); **mojxertvúenik** *m*, -es [*s*. -תבואה] гандляр збожжам

- a mojxer-sforim iz kejn lamdn ništ, a xalfn iz kejn ojšer ništ *šprxv*. кніганоша – не талмудыст, мяняйла – не багацей (хто мяняе, той гаўно мае)

mojxes *m*, *pl*. moxsim [*s*. (ים-)מוכס] зьбіральнік падаткаў [*sin*. štajer-ufmoner]

mojxes *pl*. →mojex *m*, *dim*. **mójexl=mejxl** *n*, -ex [*s*. (ות-)מוח] мазгі, моз(а)г; галава; інтэлект, розум

mojxiex *m*, *pl*. mojxixim [*s*. (ים-)מוכיח] карнік, мараліст, навучальнік [*sin*. štrofer, moral-prejdiker, muser-zoger]

- mojxiex, štrof dix! карнік, пакарай сябе! *glxv*. (калі другіх караеш, то сам не грашы)

mojxl(!) [*s*. מוחל →mexile, bimxile] *int*. *iron*. не! дзякуй!; **mojxl zajn*** дараваць, пра-, вы|бачыць, пра-, вы|бачаць [*sin*. antšuldikn, ništ nemen far umgut; fargebn, šenken a šuld]

- git zix, zajt mojxl, a ruk будзьце ласкавы, пасуньцеся
- ix bin ir mojxl dem toes я дарую вам памылку
- mojxl di tojve! дзякуй за ласку!
- zaj(t) (mir/undz) mojxl выбачайце, прабачце, даруйце
- hostu geton a nar guts, vet er es dir kejnmol nit mojxl zajn *glxv*. зробіш дурню дабро, ён табе гэтага ніколі не даруе
- ix bin dir mojxl dajn honik un vil ništ dajn bis *glxv*. дзякуй за твой мёд, і ня трэба мне тваіх укусаў (ні рублём, ні дубьём)
- lomir zix iberbetn, iberbetn, /x'bet dix zajn mir mojxl, /lomir zix iberbetn, gib cu mir a šmejxl *flksl*. давай перапросімся, я прашу цябе не крыўдаваць, давай перапросімся, лепш усьміхніся
- ver es hot sejxl, iz im got ojx mojxl *šprxv*. хто мае розум, таму і бог вінен
- zajt mojxl, un falt mir majne trep nit arunter! выбачайце, і ня падайце з майго ганка! (кажуць, калі хочуць кагосьці пачэсна справадзіць з хаты)

mojz *f*, *pl*. majz, *dim*. **májzele** *n*, -x, **majzl** *n*, -ex [*d*. Maus] мыш

- ojszen* vi a mojz nox erdciterniš выглядаць як мыш пасьля землятрусу
- rajsn*/špiln zix mit emecn vi a kac mit a mojz гуляцца з кімсьці як котка з мышкай
- a man vi a mojz, un a vajb vi a hojz – iz nox nit glajx *glxv*. мужык як мыш, жонка як хата – гэта розныя рэчы
- a mol hot a majzl a hajzl *glxv*. надарыцца і мышцы мець хатку (кажуць, калі нехта, разбагацелы, выхваляецца сваім багацьцем)
- az di kec rajsn zix, frejen zix di majz *šprxv*. калі коткі дзяруцца, мышы весяляцца (тады багатыя рады, калі ў бедных пайшлі звады; дзе двох б'юцца, там трэці карыстае)
- di kac špilt zix mit der mojz, ober oplozn lozt zi zi ništ op *glxv*. котка гуляецца з мышшу, але ніколі яе ня выпусьціць
- er lojft vi a mojz ibern cimbl *glxv*. ён бяжыць як мыш па цымбалах

• es iz nito kejn hunt in dorf, un kejn mojz in hojz *glxv.* ані сабакі ў вёсцы, ані мышы ў хаце (аб дужа беднай мясцовасьці)
• mit di kec afn bojdem, mit di majz in di lexer! *hum.* з коткамі на гарышчы, з мышамі ў норах (з анэкдоту)
• ven di kac šloft, tancn di majz *glxv.* калі котка сьпіць, ганчаць мышы
• vos es iz klener fun a mojz, meg men trogn arojs (cu hojz) *glxv.* усё, што меншае за мыш, можна сьмела выносіць (можна сьцягнуць)

mok *m*, *dim.* **mékele** *n*, -x [? →kire] *hum.* аўстрыяк; ёлуп, балван, ідыёт

mokem *m/n*, *pl.* mekojmes [*s.* (מקום(-ות →bimkem, bemokem] *iron.* месца, паселішча, вёска, сяло, сяліба; стары горад (у Варшаве, Амстэрдаме і іншых гарадох) [*sin.* ort, jišev; altštot]; **mókem-gejer** *m*, -s разносчык, нашэньнік; **mokem-gódl** *m* [*s.* גדול] вялікае/значнае/важнае месца [*sin.* grojs ort, vixtik ort]; **mokem-kódeš** *m* [*s.* קדוש] "сьвятое месца"; малітоўны дом, малітоўня, бажніца, храм, сынагога [*sin.* hejlik ort, besmedreš, šul, templ]; **mokem-lepurónjes** *m* [*s.* לפורעניות] месца пакутаў/катаваньняў/мучэньняў [*sin.* ort fun lejdn, pajnikungs-ort]; **mokem-menúxe** *m* [*s.* מנוחה] месца супакою/адпачынку [*sin.* (op)ruort]; **mokem-míklet** *m* [*s.* מיקלט] укрыцьце, сховішча, прытулак [*sin.* azil, retungsort]; **mokem-tójre** *m* [*s.* תורה] месца для вывучэньня Торы, рэлігійны цэнтар

• er hot nit kejn mokem-menuxe ён ня мае прытулку (німа дзе галаву прытуліць)
• gefinen* a mokem-menuxe (a mokem-miklet) знайсьці прытулак/ўкрыцьце; акалацца
• zuxn a mokem-miklet шукаць укрыцьце

moker=mekór *m*, *pl.* mekojrim/mekojres [*s.* (מקור(-ות/-ים] крыніца, корань, месца паходжаньня, пачатак [*sin.* kval, opštamort, onhejb]

mol *m*, **molcajt** *m/f*, -n [*d.* Mahlzeit] абед, палуднаваньне, банкет

• maxn/gebn* a molcajt задаць баль
• nit hobn* afn mol ня мець грошай на ежу
• az me vil zix bam koved derhaltn muz men di molcajt in cvejen špaltn *šprxv.* хто хоча мець павагу, мусіць абед дзяліць напалам (быць ашчадным)

mol *m.* -n [*d.* Mole] мол

mol *n* [*d.* Mal] раз

• a mol аднойчы, некалі
• a mol iber a mol папераменна, напераменку
• an ander(š)(t) mol другі раз
• cvej mol cvej два ў два
• ejn mol avek па-першае
• ejn mol far ale mol адзін раз і назаўсёды
• kéjn mol nit! ніколі!
• mit/af ejn/a mol раптам, раптоўна
• nit a mol выпадкова
• oft mol часта
• tejl mol іншы раз, часам, падчас, у часе
• vider a mol яшчэ раз
• vos a mol šener/štarker што раз прыгажэй/мацней
• a mol iz gevezn – un hajnt iz nito *glxv.* некалі было, але зараз німа (было, але сплыло: былі рублі, ды перавяліся ў вераб'і; былі грошыкі, да прашыпкаліся)
• a nar gejt cvej mol dort, vu a kluger gejt nit kejn ejncik mol *glxv.* дурань ходзіць два разы туды, куды разумны й нагі не пакладае (разумны навучыць, а дурань намучыць)
• ejn mol iz kejn mol *glxv.* што раз, што ні разу
• me muz zix a mol maxn cum nar *šprxv.* бывае, што і дурнем неабходна прыкінуцца

mol=mojl *m*, -n [*p.* mól, *r.* моль] *zool.* моль

Móldeve *f* Малдавія (усходняя частка Румыніі); **Moldove** *f* Малдова (Бесарабія); **moldaván** *m*, -es, (-ke *f*, -s) малдаванін

mole [*s.* מלא →mloj-] 1. "поўна": п'яны [*sin.* ful, šiker]; 2. *gram.* з поўным напісаньнем (фанэтычнае напісаньне гэбрэйскіх словаў [*s.* מזרח/מיזרח, מכשול/מיכשול]) [*ant.* xoser]; 3. трыццацідзённы месяц гэбрэйскага календару; **mole-** вельмі/надта/дужа, моцна-, поўна- *part.* (служыць для ўтварэньня прэдыкатыўных прыметнікаў)

• dos flešl iz gevorn lejdik, un er iz gevorn mole (Š.-A.) пляшка апусьцела, а ён ап'янеў

mole *f* [*s.* מלא] скарочаны назоў малітвы "ejl-mole-raxmim"

molegéjren=malegéjren [*s.* מעלה־גירהן] 1. перажоўваць, жаваць жвачку; *fig.* паўтараць сказанае; 2. *n* жвачка, жуйка

mole-gázlen (af) [*s.* מלא־גזלן], **mole-hómen** [*s.* המן־] *hum.* раззлавана, горача, палка, апрыскліва, з запалам, злосна, у злосьці, са злосьцю [*sin.* cekoxt, ongecundn]

mole-gedúle [*s.* מלא־גדולה] вельмі радасны; са здавальненьнем і гонарам [*sin.* ful mit frejd; cufridn un štolc]

mole-ká(a)s [*s.* מלא־כעס] моцна раззлаваны, дужа злы; поўны злосьці/гневу

mole-ráxmim *m* [*s.* מלא־רחמים] "поўны міласэрнасьці": бог, госпад, гасподзь [*sin.* ful mit baremharcikajt, got]

mole-recíxe, molerecíxediker (af) [*s.* מלא־ריחה] моцна разьюшаны, люты, гатовы забіць; **vern*/zajn* mole-recíxe** прыходзіць у лютасьць, вар'яцца, шалець

mole-símxe (mit) [*s.* מלא־שמחה] вельмі/дужа/надта вясёлы

mole-tám, moletámejdiker [*s.* מלא־טעם] вельмі смачны, вытанчаны

• s'iz mole-tam гэта вельмі смачна (пальчыкі абліжаш, аб'ядзеньне, самы смак)

mole-trójer [*s.* מלא־] дужа сумны

mole-vegódeš (mit) [*s.* מלא־ונדוש] бітком набіты, перапоўнены ведамі

mole-xéjme (af) [*s.* מלא־חמה] моцна раззлаваны, злосны, у злосьці, са злосьцю, шалёны, поўны злосьці/гневу [*sin.* ful mit corn, štark in kaas]

• er iz gevorn mole-xejme ён ускіпеў ад гневу

mole-xéjn [*s.* מלא־חן] вельмі прыгожы, чароўны, прывабны

• farbet zi mix in kix arajn, /git mir bronfn, git mir vajn – /oj-ra-ra, oj-ra, oj-ra, /zi git mir a bulke, fiš un xrejn, /oj, a mejdl mole-xejn, /oj-ra-ra, oj-ra, oj-ra (I. M.) яна кліча мяне на кухню, дае мне гарэлкі, дае мне віна – ой-ра-ра, яна дае мне булку, рыбу й хрэну, ой, дзяўчына – сама прывабнасьць, ой-ра-ра...
• zi iz geven mole-xejn, šejn vi velt (Š.-A.) яна была чароўная, прыгожая як сьвет

molitve *f*, -s [*ukr./r.* молитва] малітва; **moljen zix** маліцца

• lejenen emecn a molitve чытаць камусьці нацыі

molken [*d.* Molke] сыроватка

moln* (gemóln) [*d.* mahlen] 1. малоць; 2. *n* памол; **molexc** *n* м(е)ліва; **molung** *f* малацьба

• az es molt zix in mil, iz in der hejm ruik un štil *śprxv.* калі млын меле, у хаце спакой і цішыня (як у гумне малоціцца, дык у хаце не калоціцца)

• cvej harte štejner moln nit *śprxv.* два цьвёрдых камяня зерне ня зьмелюць

moln*=meln (gemólt/gemóln) [*d.* malen] маляваць; **moln* zix** уяўляць сабе; **moler=meler** *m.* -s, (-n *f*, -s) мастак, рысавальнік; маляр; **mólerišer** маляўнічы; **moleráj** *f/n*, -en малярства; жывапіс; **mólbret** *f/n*, -er мальбэрт, шталюга

• molt ajx уявеце сабе

• ba a moler ken alc gemolt zajn *glxv.* мастак можа ўсё намаляваць

• mol dir ojs dem tam fun smetene *glxv.* намалюй сабе смак сьмятаны (ці чуў, кум, сонца, ці бачыў гром?)

• [illegible] nit azoj švarc, vi me molt im *šprxv.* ня так страшэн, як яго малююць (грозен, ды ня боязен)

mołna *m* [*r.* молна, *p.* mołna] мула

molóčne *t.* -s [*ukr.* молочний] малочны аддзел (у краме), малочарня; **molokosós** *m.* -n малакасос

molodjéc *m.* -es [*r.* молодец] маладзец, малайчына, малойца

m(o)lojcen=młojčen=melojcen [*p.* młocić] малаціць; **molotilke** *f.* -s малацілка

m(o)lojen=malojen (bam harcn) адчуваць мло(сна)сьць /моташнасьць

molózive *f*, **molódzines** *pl.* [*ukr./r.* молозиво, *p.* młodziwo] малодзіва

mómen *m/n.* -es [*s.* (-ות)ממון →dine-momenes, ibed-momen] грошы [*sin.* gelt]; *pl.* грашовыя справы, грашовыя працэсы; **momen-kójrex** *m/n* [*s.* ממון־קורח] "грошы Карэя"; шмат грошай (Лік. 16–18)

• cum kol – momen *glxv.* хочаш мець голас (загадваць) – плаці (пародыя на сэнтэнцыю з малітвы: [*s.* צום. קול. ממון] "пакаяньне, малітва, міласьціна")

• er vil cvej mol momen *glxv.* ён хоча адразу ўсяго (грошы і жыцьцё)

• momen bekešene, šolem bebejs *šprxv.* грошы ў кішэні, мір у хаце (як у гумне малоціцца, дык у хаце не калоціцца)

• momen iz domim *glxv.* грошы – кроў

mometliv(at)e(r) [*ukr.* момотливий, *p.* momotać] заікліві

mon *m* [*d.* Mohn] *bot.* мак; **mondl** *n*, -ex, **mónele** *n*, -x булка з макам; **món(č)iker, món(č)inker** маленечкі, малюпасенькі; **mónkepl** *n*, -ex макаўка

• hobn* brojt vi lekex, kinder – vi mon мець хлеба як пірага, дзяцей – як маку

• šitn* švarce mon (af) клясьці, абгаворваць

monárx *m.* -n манарх

• er ligt vi a monarx ён разьлёгся як цар

• ojszen* vi a monarx(e) выглядаць як манарх

monastír *m*, -n [*p.* monaster] манастыр, кляштар; **monáx** *m*, -n манах; **monaške** *f*, -s манашка

monat *m*, -áin [*d.* Monat] месяц (30 дзён); **mónatlexer** (што)-месячны; **mónatlexe** *f* мэнструацыя, месячнае, аплавы

monc *m.* -n [?] карлік; дробязь, драбяза, драбніца

mončen/monclen/monten=mančen/manclen/mant(j)en канькаць, клянчыць, цыганіць, вымантачваць

mončen [*p.* mącić?] зьмяшаць, зьмешваць

monćke *f* [*p.* mączka] цукровы пясок

móndrišer [*p.* mądry] разумны, мудры; **Mondriš** *m*, -es Мондрыш, блазен (пэрсанаж п'есы, якую ставяць на Пурым)

móne(f)šex [*s.* ממה־נפשך →mimonefšex] *int.* адно з двух, туды ці сюды; альбо..., альбо...; (а)ну, (ня)хай, калі гэта так, дык...; ладна, добра [*sin.* ejns fun di bejde, ahin oder aher, oder-oder; ojb šojn jo azoj]

• monefšex, jo – jo, nej – nej (Š.-A.) адно з двух: так дык так, не дык не

mone-jófe *f* [*s.* מנה־יפה] прыгожы кавалак, файная порцыя; значны заработак, ладная сума [*sin.* šejn štik, fajne porcje; hipšer fardinst, šejne sume]

monen (ba) [*d.* mahnen] нагад(в)аць; спагнаць, спаганяць; патрабаваць, да-, на|магацца, дабіваца; **moner** *m*, -s патрабоўца, патрабавальнік, скаржнік; крэдытор; **mónerišer** патрабавальны; **monung** *f*, -en нагадваньне, патрабаваньне, скарга, іск, позва

• der ergster moner iz der ejgener mogn *glxv.* найгоршы скаржнік – уласны страўнік

• gute coln, šlexte monen *glxv.* добрыя плацяць, кепскія патрабуюць

• gute moner zajnen šlexte coler *śprxv.* хто добра спаганяе, той кепска плаціць

• s'vet zajn di lange moneniš гэта будзе доўгая песенька

monete *f*, -s [*p.* moneta] манэта

monkalb *n*, *pl.* -kelber [*d.* Mondkalb] выблядак, пачвара, выродак

monopól *m*, -n манаполія (на продаж гарэлкі); **monopolke** *f*, -s [*r.* монополька] манаполька (у дарэвалюцыйнай Расеі дзяржаўная крама, у якой прадавалі гарэлку); пляшка гарэлкі

monsún *m*, -en [*d.* Monsun] мусон

montik/montog *m*, -n [*d.* Montag] панядзелак; **móntikdiker** панядзелкавы

• ale/jeder/jedn montik un donerštik кожны панядзелак і чацьвер (вельмі часта)

• montog iz a šverer tog *glxv.* панядзелак – цяжкі дзень (у панядзелак работы не пачынай і ў дарогу не выяжджай)

moójz-cur [*s.* מעוז־צור] "моцная скала" (першыя словы малітвы, якую сьпяваюць, калі запальваюць ханукальную сьвячу) [*sin.* štarker feldz]

• az der šeps hert "moojz-cur" zingen, un dos kalb "akdomes" zogn, meg men zejer flejš avektrogn *glxv.* калі авечка чуе ханукальную малітву, а цялё – малітву на Швуэс, можна іхнае мяса выносіць вон (бараніна пасьля Ханукі і цяляціна пасьля Швуэсу маюць непрыемны пах)

mord(er)n [*d.* morden, *mhd.* mordern] забі(ва)ць; **mord** *m*, -n, **mordung** *f* забойства

morde *f*, -s, *dim.* **mórdečke** *f*, -s [*ukr./r.* морда, *p.* morda] морда, пыса, мурло

• a gegolte morde голеная морда

• onrajbn*/onzejfn emecn a morde надраіць/намыліць камусьці морду

mórdeven [*p.* mordować, *mhd.* morden] мардаваць, мучыць, катаваць; **mordevanje** *f* мардаваньне

• es mordevet mit im vi in a gut kadoxes ён змардаваны як пасьля добрай ліхаманкі

mordim=mojrdim *pl.* →mojred *m* [*s.* (מורד(-ים] паўстанец, мяцежнік, бунтар, бунтаўнік, рэвалюцыянэр
more *f* [*d.* Mohär] *tekst.* мохэр
more-d(e)ásre *m* [*s.* מרא־דאתרא] гарадзкі рабін альбо судзьдзя [*sin.* rov oder dajen funem štot]
more-davróhom [*s.* מריה־דאברהם] "гаспадар Абрагама" (узрушаны выкрык); бог [*sin.* got]; **more-deálme-kúle** [*s.* מרי־דעלמא־כולה] уладар сусьвету, бог, госпад, гасподзь (узрушаны або зьдзіўлены выкрык) [*sin.* rebojne-šelojlem, got]
morél=marél *m*, -n [*p.* morela] абрыкос, марэля
moren [*r.* морить] марыць
• moren mit hunger марыць голадам
more-néfeš *pl.* →marnefeš *m* [*s.* (מרי) מר־נפש] раззлаваны, злобны, разгневаны чалавек
morer *m* [*s.* מרור] горкая зеляніна, якую ўжываюць на пэйсаховай бяседзе; *fig.* гаркота, горыч [*sin.* biterniš]
mores *f* [*s.* מרת] паважная жанчына, дама, мадам, паня [*sin.* harte, ongezeene froj, dame, madam]
sfire *f*, -s [*s*. ספירה(־ות), *gr*.] *kbl*. адна зь дзесяці сфэраў, якія сымбалізуюць боскія атрыбуты: "keser" [כתר], "xoxme" [חכמה], "bine" [בינה], "xesed (daas)" [(דעת) חסר], "gvure" [גבורה], "tiferes" [תפארת], "necex" [נצח], "hojd" [הוד], "jesod" [יסוד], "malxes" [מלכות]
sfires-hanócrim *f* [*s*. ספירת־הנוצרים] хрысьціянскае летазьлічэньне, каляндар
sforim *pl*. →sejfer *m* [*s*. (ספר(־ים)] кніга; **sforim-xicójnim** *pl*. [*s*. חיצונים־] апокрыфы рэлігійнай літаратуры; сьвецкая (сусьветная) літаратура
sgal=zgal *m*, -n [*s*. →sgule?] катэгорыя, уласьцівасьць
sgan-levíe=segál *abr*. [*s*. סגן־לויה=סג"ל] старэйшы з роду Левія
sgrabne(r)=zgrabne(r) [*p*. zgrabny] зграбны
sgradne(r)=zgradne(r) [?] зручны, утульны, выгадны
sgule=zgule *f*, -s [*s*. סגולה(־ות) →mesugl] сродак, лекі; магічнае бласлаўленьне; (добрая) якасьць, уласьцівасьць, вартасьць, годнасьць [*sin*. mitl, hejlmitl; ejgnšaft, majle]
• A vajbl štejt un bet, /az der rebe zol zi helfn /mit zajn hejliker tfile. /Der xosid ba der tir /štejt un vinkt cu ir: /– Du darfst, vajbele, dem rebns sgule? *fiksl*. Жанчына стаіць і просіць, каб рэбэ ёй дапамог сваёй сьвятой малітвай. Хасыд стаіць каля дзьвярэй і падміргвае ёй: – Табе патрэбна бласлаўленьне рэбэ?
s"h/sh"k=s(a)xákl=sexákl [*s*. (ן-)סך־הכל=ס"ה] 1. *m*, -en сума; балянс, падрахунак, падсумаваньне, рахуба, разьлік, вынік [*sin*. sume; bilanc]; 2. *adv*. усяго, разам, усяго толькі
siate-dišmáje *f* [*s*. סיעתא־דשמיא] дапамога зь неба, боская помач [*sin*. hilf fun himl, gots hilf]
sibe *f*, -s [*s*. (ות-)סיבה(י) →mesabev-kol-hasibes] матыў, падстава, довад, доказ, прычына; загваздка, перашкода, замін, затрымка, здарэньне, (няшчасны) выпадак [*sin*. motiv, tem, farvos; šterung, akcident]; **sibe(s)diker** прычынны

• sibe un pojel-jojce прычына і вынік
• nit on kejn sibe не без прычыны
• vejnen on a sibe плакаць бяз дай прычыны
• a bejze vajb iz di sibe fun fricajtiker altkajt *glxv.* злая жонка – прычына заўчаснай старасьці (добрая жонка – вянец, а ліхая – канец)
• fir sibes rufn arojs fricajtike elter – šrek, cores fun kinder, šlexte/bejze vajb un milxomes *šprxv.* чатыры прычыны выклікаюць заўчасную старасьць – жах, беды ад дзяцей, благая/злая жонка і войны

Sibír *n* [*r.* Сибирь] Сібір; **sibirják** *m*, -es, (-ačke *f*, -s), **sibirnik** *m*, -es сібірак; сібірнік (благі чалавек), зэк; **sibirer** сібірскі
• a gance štot šikt men kejn Sibir nit avek *glxv.* увесь горад у Сібір ня вышлюць

sic *m* [*d.* Zitz, *ukr.* ситець] паркаль; **sícener** паркалёвы
sič *m*, -n [*ukr.* сич, *r.* сыч] *zool.* сыч
sičke=sečke=šečke *f* [*p.* sieczka, *ukr.* січка] сечка
sídele=s(j)édele *f*, -s [*ukr.* сідало, *r.* седало] седала, курасадня
sídelke *f*, -s [*sl.*] іголка для вышыўкі
sider *m*, *pl.* sidurim [*s.* (ם׳-)דור(י)ס] малітоўнік; **sider-k(i)dúšn** *m* [*s.* קידושין־] *rit.* правядзеньне шлюбнага абраду, вянчаньне
• ništ arojsgejn* fun der mames sider (er gejt fun zajn mames siderl nit arojs; es štejt nit in zajn mames siderl) трымацца старых правілаў, кансэрватыўна ставіцца да жыцьця
• az der hunt hot gexapt dem bejgl, loz/zol er šojn xapn dem sider ojx *šprxv.* калі сабака схапіў абаранак, няхай ужо хапае й малітоўнік (аб неахайным вучні хедара) (прапала кароўка, няхай прападзе і вяроўка; зьеў сучку, дык еж і скурку)
• az der sider iz nit geštorbn, iz der rebe ojx nit geštorbn *šprxv.* пакуль малітоўнік жыве, і рабін будзе жыць (пісар жыве зь пяра/з каламара), а поп/ксёндз з аўтара́; вясельле, хрысьціны, мерліны – то ксянлзу/папу добрыя гадзіны)
• (der) emes iz in sider *glxv.* праўда ў малітоўніку

sidre-bréjšes *pl.* [*s.* סדרי־בראשית →sejder, sedre, sadern] законы прыроды, прыродны парадак, лад [*sin.* natur-gezecn, natirlexe ordenung]
sidún *m*, -es [*ukr.* сидень, *v.* сядун] дзіцёнак, які яшчэ не навучыўся хадзіць
siem *m*, -s [*s.* (ם-)סיום →mesajem] "сканчэньне"; сьвята з нагоды завяршэньня перапісваньня Торы альбо вывучэньня пэўнай часткі Талмуду (важнасьць такога сьвята дазваляе скасаваньне посту); сьвяткаваньне заканчэньня праекта, навучальнага тэрміну і г.д. [*sin.* opšlus]
sifre-tójres *pl.* →sejfer-tójre *f*, **s"t** *abr.* [*s.* ספר־תורה ס"ת=(ם-/ספרי־תורות)] сынагагальная Тора (напісаная на пэргаміне і скручаная ў сувой)
sige *f*, -s [?] грымаса, крывая міна, гімора
sigef *m*, *pl.* sigufim [*s.* (ם׳-)גוף(י)ס →guf, fargufn] умярцьвеньне плоці, добраахвотныя пакуты дзеля маральна-рэлігійных альбо містычных мэтаў
• praven sigufim добраахвотна пакутаваць

signacje=asignacje *f*, -s асыгнацыя
signe *f*, -s [*d.* Signa] 1. подпіс; 2. знак; **signét** *m*, -n сыгнэт, пярсьцёнак зь пячаткай
signen *m* [*s.* (י)גנון־ס, *lat.*] стыль [*sin.* stil]
siken [*p.* sykać] сыкаць, сіпець

sikn=sekn 1. *pejor.* сядзець; ляжаць, дрыхнуць; 2. *argo* знаходзіцца ў публічным доме; 3. *vulg.* (па)раджаць, выплоджваць
silek *m*, *pl.* silukim [*s.* (ם׳-)לוק(י)ס →mesalek, op-, ojs|silekn] аплата, расплата, выплат, разьлік, зьліквідаваньне доўга; вырашэньне, урэгуляваньне; грашовы пасаг, які зьмешчаны ў даверанай асобы [*sin.* bacolung]; **sílekn** (mit) за-, ад|плаціць, ад|плачваць, квіта(ва)ць; зьмяшчаць пасаг у даверанай асобы [*sin.* opcoln, dekn a xojv]
• hobn* a silek мець разьлік
• a rejner xežbn iz a halber silek *šprxv.* сумленны рахунак – палова аплаты

síle(ve)n/siljen=cíle(ve)n [*v.* сіляць, *ukr.* силити; *d.* zielen?] (на)нізаць; зацягнуць, зацягваць, прасунуць, прасоўваць (нітку); **síle-/cíle-nodl** *f*, -en шыла
síl(i)ce *f*, -s [*ukr.* сільце] сіло
siljarke *f*, -s [*ukr.* сільниця] салянка, сальніца
siljave=šiljave *f*, -s [*p.* sielawa] *zool.* сялява
silo *m*, -s [*fr.* silo] сіласная вежа; **silos** *m* сілас; **silosírn** (silosírt) сіласаваць
sim sot [*ukr.* сім сот] сямсот
• darfn* epes af sim sot kapores *hum.* патрэбны як сьляпому акуляры (як лысаму грэбень, як у мосьце дзірка)
• tojgn* epes af sim sot kapores нікуды ня варты

simen *m*, *pl.* simonim, *dim.* **símendl** *n*, -ex [*s.* (ם׳-)מן(י)ס] адзнака, метка, знак, прыкмета, рыса; сьлед, адбітак; доказ, довад [*sin.* cejxn; špur; bavajz]; **simen-dáles** *m* [*s.* דלות] знак беднасьці [*sin.* cejxn fun oremkajt]; **simen-decáx** *m* [*s.* דצ"ך־ →decax] благі знак; **simen-hamin** *m*, *pl.* simone-hamin [*s.* (סימני־) המין־] розьніца; **simen-múvek** *m*, *pl.* simonim-muvókim [*s.* (ם׳-)מוכהק־] ясны знак, характэрная рыса; **simentov** *m* [*s.* טוב־] добры знак [*sin.* guter cejxn]; **simone-náares** *pl.* [*s.* נערות־ →nare] адзнакі сэксуальнай сталасьці ў дзяўчынаў; **simone-záxres** *pl.* [*s.* זכרות־ →zoxer] адзнакі сэксуальнай сталасьці ў юнакоў
• guter/bejzer simen добры/благі знак
• lojt ale simonim відаць па ўсім, хутчэй за ўсё
• s'iz a šlexter/bejzer simen (a simen-decax) гэта благі знак
• un kejn simen nit geblibn і знаку не засталося
• vi a simen fun frajnšaft у знак сяброўства
• a lign mit a simen/vortcejxn *glxv.* на хлусьні – знак
• ale simonim gejen unter, nor der simen dales blajbt *šprxv.* усё прыкметы мінаюцца, апрача прыкметы беднасьці
• az me švajgt, iz a guter simen, az me iz ajnštimik *glxv.* маўчаньне – добры знак аб згодзе
• – Oj, a šejne kale, /šejn iz zi vi gold, /a simen hot ir ale, /az ix hob zi gevolt. *flksl.* – Ой, прыгожая маладая, яна прыгожая, як золата, па ўсіх знаках яна такая, якую б я хацела мець.

sim(in)je *f* [*ukr.* сім'я] каноплі, канаплянае семя
simxe *f*, -s [*s.* (ת׳-)מחה(י)ש →mesamejex, bal-simxe, besimxe-rabe, somejex-] вясёласьць, радасьць; забава, пацеха, урачыстасьць, сямейнае сьвята [*sin.* frejd; private fajerung]; **Simxes-Tójre** *m* [*s.* שמחת־תורה →sedre] Сімхас Тора (сьвята, якое адзначаецца на наступны дзень пасьля Сукэсу ў гонар заканчэньня гадавога чытаньня Торы); **simxes-tójre-fon** *f*, -en сьцяг, які носяць дзеці на гэта сьвята; **simxes-tójre-epele** *n*, -x яблычак, які ўпрыгожвае сьвяточны сьцяг; **simxes-bejs-hašoéjve** *f* [*s.* שמחת־בית־השואבה(י)ש] "радасьць ад калодзежа"; вельмі радаснае сьвяткаваньне, якое адбывалася ў двары сынагогі ў час Сукэсу; **simxes-mícve** *f*

[*s.* תּ־מיצווה(ו) שימח] сямейныя сьвяткаваньні, якія зьвязаны з выкананьнем рэлігійных запаветаў (абразаньне, канфірмацыя і інш.); **simxe-vesósn** *f* [*s.* ־וששון →sosn-vesimxe] радасьць і вясёласьць, сьвяточны настрой [*sin.* frejd un lustikajt, jomtojvedike frejd]; **simxe-šel-mícve** *f* [*s.* ־של מיצווה] радасьць ад добрага ўчынку, ад выкананьня запавету

• a ponem vi a Simxes-Tojre-epele прыгожы твар (як сьвяточны яблычак)

• der held fun der simxe віноўнік урачыстасьці

• vos iz af im di simxe? чаго ён так узрадаваўся?

• vos iz mit dir di simxe? чаго ты так радуешся?

• a grojse simxe (iz) af a klejner vajl(e) *šprxv.* вялікая радасьць – на кароткі мір

• af jenems simxe hot men tomed/štendik a gutn apetit *šprxv.* усе ласыя пагуляць на чужым сьвяце (добра сьпяваць галáм за чужым сталáм)

• az me frejt zix mit jenes simxe, derlebt men di ejgene *šprxv.* хто радуецца чужому шчасьцю, дажыве свайго

• dem jidns simxe iz mit a bisl šrek *glxv.* жыдоўская радасьць заўжды трохі са страхам

• fun a simxe vert men fet *glxv.* ад радасьці тлусьцеюць

• Fun simxe trern flisn, /lozt mix haldzn, kušn, /rut ajx ojs ba mir di bejner, /majne hercnsgest! /Ir vet ba mir krign tsale fargenign, /ir vet nit visn fremde tišn, /nor di muters kest! (E. Z.) Ад радасьці льюцца сьлёзы, дайце мне вас абняць, пацалаваць, адпачнеце ў мяне, мае дарагія госьці! Вы атрымаеце ў мяне асалоду, вы ня будзеце сядзець за чужымі сталамі, але толькі за матчыным!

• me zoln gejn af simxes! (halevaj af simxes!) каб мы хадзілі толькі на сьвяты!

• s'zol(n) (nor) zajn simxes ba jidn! каб у жыдоў была (толькі) весялосьць!

• vos di simxe hejbt zix on špeter, dojert zi alc lenger *šprxv.* чым пазьней сьвята пачнецца, тым даўжэй будзе цягнуцца

• vos klener der ojlem, iz greser di simxe *glxv.* чым меншы натоўп, тым большае сьвята

sin=s *m/f*, -en [*s.* (־ען)־שׂין] "сын", літара гэбрэйскага альфабэту

sinagoge *f*, -s [*d.* Synagoge, *gr.*] сынагога; **sinagogaler** сынагагальны

Sinaj *m* [*s.* סיני →ojker-horim] *tnx.* гара Сынай; *fig.* вялікі знаўца рэлігійнай літаратуры; **sínajdiker** у сынайскай традыцыі, традыцыйны (аб напевах); **sínaj-nígn** *m*, *pl.* sínaj-nigúnim [*s.* (־ים)־ניגון] старая традыцыйная мэлёдыя, якая прынята для навучаньня або малітвы

• majn nešome iz ojx af dem barg Sinaj geštanen *glxv.* і мая душа на гары Сынай была (і мой квасок не з трасок; і мая душа ня ў пні; і мая душа ня лішняя; і мы ня з гліны зьлепленыя)

sine *f* [*s.* (־ות)־שׂנאה(י) →sojne] варожасьць, нянавісьць, непрыязьнь, непрыхільнасьць [*sin.* fajntšaft, has]; **sines-jisróel** *f* [*s.* שׂנאת־ישׂראל(י)], **sines-cíen** *f* [*s.* ־ציון] антысэмітызм, юдафобія; **sines-xínem** *f* [*s.* ־חנם(י)] дарэмная варожасьць, беспрычынная нянавісьць [*sin.* umziste fajntšaft]

• a blik mit sine варожы погляд

• filn a sine cu emecn варожа ставіцца да каго-небудзь

• varfn* a sine af emecn пачаць ненавідзець, адчуваць варожасьць

• a miese mojd iz a sines-xinem *šprxv.* брыдкая дзеўка – беспрычынная нянавісьць (яе ніхто ня любіць, хоць яна нікому нічога благога не зрабіла)

• vegn sines-xinem iz dos bejs-hamigdeš xorev gevorn *glxv.* з-за беспрычыннай варожасьці Ерусалімскі Храм разбурылі

Sine Sansine Semanglóf [*s.* סיני סנסיני סמנגלוף →Senoj Sansenoj Semanglof] *kbl./folk.* Сіна, Сансіна, Шэманглоф; імёны трох анёлаў, якія ахоўваюць парадзіх і немаўлят ад княгіні дэманаў Ліліс (выкарыстоўваюцца ў якасьці надпісаў на амулетах)

sinepizme=cinepizme *f*, -s [*fr.* sinapisme] гарчычнік

sínik/sinják/sínjek *m*, -es [*p.* siniak, *ukr./r.* синяк] сіняк

sinke *f* [*ukr./r.* синька] сінька

siog *m*, -im [*s.* (־ים)־סיג] агарожа; **siog(-latójre)** *m* [*s.* ־לתורה] рэглямэнтацыя дзейнасьці паводле Торы; *fig.* парэнчы, поручні; рамкі закону

sipak *m*, -es [*ukr.* сіпак] вымагальнік, шантажыст

sipe *f* [*r.* сыпь] сып(ка) (на целе), высыпка

• a sipe dir in ponem! *kll.* сыпку табе на твар!

sipen [*r.* сипеть] сіпець

siper *m*, *pl.* sipurim [*s.* (־ים)־סיפור(י)] апавяданьне, расказ, гісторыя, казка, байка, прыпавесьць, фрашка [*sin.* dercejlung, majse]; **siper-hamájse** *m* [*s.* ־המעשה] расказ, гісторыя, сюжэт, інтрыга, фабула, здарэньне, прыгода (у кнізе/фільме); **siper-nífle** *m*, *pl.* sipure-niflóes [*s.* ־נפלא (סיפורי־נפלאות)] цудоўнае/дзіўнае апавяданьне [*sin.* vunderlexe dercejlung]; **Sipure-májses** *pl.* [*s.* סיפורי־מעשיות] назоў кнігі апавяданьняў рэбэ Нахмэна Брацлавэра, якія перапісаў на ідышы і гэбрэйскай мове ягоны вучань Нахмэн Штэрнгарц (выданьне 1817 г.)

sipke(r) [*p.* sypki, *ukr.* сипкий] сыпкі, сыпучы

• sipke cores *hum.* ліхая навала

sirep/siróp=serep *m*, -n [*d.* Sirup, *p.* syrop] сыроп

sire(r)=šare(r) [*ukr.* сірий] шэры, шáры

sir-habóser *m* [*s.* סיר־הבשר] *inx.* кацёл зь мясам, аб якім гэбрэі сумавалі ў пустэльні пасьля ўцёкаў з Эгіпту; азначэньне для малых уцех, ад якіх людзі часам знаходзяцца ў моцнай залежнасьці (Вых. 16:3)

sirke/sjarke=širke *f*, -s [*p.* siarka, *ukr.* сірка] сер(к)а

sirnikl *n*, -ex [*ukr.* сірник] сярнічка, запалка

sirodój *m* [*ukr.* сиродій] сыradой

s(i)róvetke/sívorotke=ser(ó)votke *f* [*ukr.* сироватка, *r.* сыроватка, *p.* serwatka] сыроватка

sirxe *f*, -s [*s.* (־ות)־סרכא(י) →šajles-horeje] нарост альбо рана на лёгкім забітай скаціны, паводле якой мяса гэтай скаціны можа лічыцца трэфным; псота, пашкоджаньне, непаладка, дэфэкт, брак, загана

• a klejne sirxe un umzist di tirxe *šprxv.* маленькая загана – і ўся праца дарэмная

sisre-tójre *pl.* [*s.* סיסרי־תורה(י)] таямніцы Торы, патаемныя веды; *hum.* сакрэты, загадкі

siten [*lit.* sýti?] намотваць на шпулю

sitke *f*, -s [*p.* siatka; sitko, *ukr.* сітка] сіта; сетка (рыбалоўная)

sítnice *f* [*p.* sitny, sitkowy, *ukr.* ситний] сітніца, сітны хлеб; **sitne(r)=šitne(r)** сітны

sitre-áxre *f* [*s.* סיטרא־אחרא(י)] "чужы бок"; нячысты бок, пекла, д'ябал і злыя духі, злыя сілы; **sitre-bíše** *f* [*s.* ־בישא] кепскі (благі, дрэнны) бок [*sin.* di šlexte zajt]; **sitre-dismóle** *f* [*s.* ־דשמאלא] левы (нячысты, благі) бок [*sin.* di linke zajt]; **sitre-mesovúse** *f*, **sam** *abr.*, **samex-mém** *m* [*s.* ־מסאבותא=ס"מ=סמך־מם] "нячысты бок"; нечысьць [*sin.* di umrejne zajt]

sive(r) [*p.* siwy, *ukr.* сивий] сівы; **sivak** *m*, -es [*p.* siwek, *ukr.* сивка] сівак, дэраш (аб кані); **sivuxe** *f* [*p.* siwucha] сівуха, самагонка
sivn *m* [*s.* סיו(ן)] сіван, дзявяты месяц гэбрэйскага календару (травень-чэрвень)
sixe *f*, -s [*s.* שיחה(-ות)] размова, гутарка, гаворка; нефармальная размова хасыдзкага рэбэ [*sin.* šmues]; **sixes-nóšim** *f* [*s.* שיחת־נשים (־שיחות) →nošim-] жаночая размова; **sixes-xúlin** *f/pl.* [*s.* (־שיחות) חולין־] будзённая размова, якая не зьвязана з рэлігіяй або навучаньнем
sixsex *m*, *pl.* sixsuxim [*s.* סכסוך(-ים)] сутычка, спрэчка, непаразуменьне, канфлікт, дыспут [*sin.* konflikt, disput, cuzamenštojs, štrajt]
• arajnbrengen* emecn in a sixsex сутыкнуць ілбамі
• ajnregulirn dem sixsex адрэгуляваць канфлікты
sjamer [*d.* siamesisch] сіямскі
sjatke=šatke *f*, -s [*p.* siatka] сетка (для валасоў)
sječke=sičke *f* [*p.* sieczka] сечка
s(j)enik=šenik *m*, -es сяньнік; **sjenožénc=sanozénc=senezénc=šanozénc** *m*, -n сенажаць
sjeračke *f* [*p.* szaraczek] шарачак (шэрае таннае сукно)
s(j)erm(j)enge=sermige/sermjege *f*, -s [*p.* siermięnga, *r.* сермяга] сярмяжка, сьвітка
sjetke=šatke *f*, -s [*r.* сетка] сетка
s(j)ur-búr=šur(um)-búr(um) [*r.* шурум-бурум, *nd.* schurrmurr] 1. *m* шурум-бурум, сыр-бор, блытаніна, гармідар, нялад, разгардзіяш; старызна, непатрэбшчына; зброд; 2. *adv.* сьпехам, сьпешна, похапам, бязладна
sjurtúk *m*, -n/-es [*r.* сюртук] сурдут
sjusjuken [*p.* siusiu, *r.* сюсюкать] сюсюкаць
skabke *f*, -s [*ukr.* скабка] скабка, стрэмка
skadrón=eskadrón *m*, -en [*fr.* escadron] эскадрон
skale *f*, -s [*d.* Skala] шкала
skale=skelje *f*, -s [*p.* skała] скала
skalen [*r.* скалывать] скалываць
skalik=škalik *m*, -es [*r.* шкалик] шкалік
skał(j)ečen [*p.* skaleczyć, *ukr.* скалічити] па-, с|калечыць, зьнявечыць, зьнявечваць
skalke *f*, -s [*ukr.* скалка] трэска, стрэмка, скабка
skandál *m*, -n [*d.* Skandal] скандал; **skandalíst** *m*, -n, (-ke *f*, -s) скандаліст; **skandaljezer** скандальны; **skandalizírn** (skandalizirt) скандалі(зава)ць; **skandál(j)even** чыніць скандалы
• a skandal in der velt! скандал у сьвеце!
• a skandaljezer fal скандальны выпадак
• dos iz skandaljez! гэта абуральна!
• uffirn zix skandaljez скандальна сябе паводзіць
skarb *m*, -n [*p.* skarb, *ukr.* скарб] скарб; **skarbove(r)** [*p.* skarbowy] старамодны, традыцыйны
• a skarbover nign *rel.* традыцыйная мэлёдыя
• ■ skarbover stil казённы стыль
skarlatín *m/f*, **skarlatine=škarlatine** *f* [*fr.* scarlatine] *med.* шкарлятына
skarmúč *m*, -es, **škarmic/škarmúc=škormic** *m*, -n [*it.* cartoccio, *d.* Schirmmütze?] скрутак, пакунак, мяшэчак
skárpet(k)e=škárpet(k)e *f*, -s, **skarpét** *m*, -n [*p.* skarpetki] шкарпэтка
skasírn (skasírt) [*p.* skasować] (с)касаваць
skat *m*, -n [?] расколіна, шчэрба, шкода, загана, хіба
skavučen=skovučen [*ukr.* скавуліти] скавытаць
skaz *m*, -n, **skaze** *f*, -s [*p.* skaza] сказа, шкода, глум, (за)вада, загана, хіба; **skazirter** (са)псуты, псуваны, папсаваны, скажоны
skazke *f*, -s [*r.* сказка] 1. *hist.* перапіс насельніцтва (у царскай Расеі); 2. казка
skejnim=zkejnim *pl.* →zokn *m* [*s.* (זקנים-)] стары, старац; **skejne=zkejne** *f*, -s [*s.* (זקנה-ות)] старая жанчына, баба
skelje=skale *f*, -s скала
skepter=(s)cepter *m*, -s скіпэтр, бэрла
skibe *f*, -s [*p.* skiba, *ukr.* скиба] скіба
skidke *f*, -s [*ukr./r.* скидка] скідка, зьніжка
skice *f*, -s [*d.* Skizze] шкіц, накід, эскіз, нарыс; **skicírn** (skicirt) рабіць шкіцы, накіды; **skíciker** хуткі, эскізны
skile *f* [*s.* סקילה →arbe-mises-bezdn] закідваньне камянямі (адно з чатырох цяжкіх рэлігійных злачынстваў паводле Геморы) [*sin.* farštejnikung]
skirde *f*, -s [*r.* скирда, *ukr.* скирта] сьцірта, тарпа; **stírdeven** 1. сьціртаваць; 2. *n* сьціртаваньне
sklad *m*, -n [*p.* skład, *ukr./r.* склад] склад; **składnik** *m*, -es гуртаўнік
składke *f*, -s [*p.* składka, *ukr./r.* складка] 1. складанка, складчына; 2. складка, зморшчка, фальбона
skladne(r) [*p.* składny, *ukr.* складний] статны, складны, ладны, зграбны
skł(j)ep *m*, -n/-es [*p.* sklep, *ukr./r.* склеп] склеп; крама; **skł(j)epove(r)** работнік склепа/крамы
skljepenje *f*, -s [*p.* sklepienie] скляпеньне; **skljépeven** выводзіць скляпеньне
sklotnje *f* [*p.* skłocić, kłótnia] склока, сварка, звадка; **skločnik/skłotnik** *m*, -es склочнік
• farkoxn a sklotnje *fig.* заварыць кашу
skner(úk) *m*, -es [*p.* sknera, *ukr.* скнара] скупы, скупянда, жмінда, скнара
skobe *f*, -s, **skob(e)l** *m*, -s/-en, *dim.* **skóblikl** *n*, -ex [*ukr./r.* скоба, *p.* skobel] скаба
skobke *f*, -s [*ukr./r.* скобка] дужка
skocl/s'kocl [?]
• skocl kumt! заходзьце, калі ласка! якая нечаканасьць!
skočne *f* [*ukr.* скочна, *č.* skocna] "скочна", жыдоўскі народны танец
skompanejen [*p.* kompania] паяднаць, аб'яднаць, злучыць, згуртаваць
skone=zkone *f* [*s.* זקנה →xsimes-zokn] *hum.* барада; **skonim=zkonim** *pl.* →zokn *m* [*s.* (זקנים-)] барада
skónesdiker=sakónesdiker [*s.* סכנות-] небясьпечны
skorbút *m* [*d.* Skorbut] *med.* скарбут, цынга
skore-pomošč *f* [*r.* скорая помощь] хуткая дапамога
• oj, in Vilne iz faran a skore-pomošč, oj vej iz mir, /me zol brengen dajn mamelen ahin, /un az me vet zi brengen in bolnice, /vet zi nit fodern mir kejn cirung un kejn gelt *flksl.* ой, у Вільні ёсьць хуткая дапамога, ой, ліха мне, хай тваю маці адвязуць туды, і калі яе прывязуць у бальніцу, яна ўжо не запатрабуе ні строяў і ні грошай
skór(ink)e=škórinke *f*, -s [*ukr.* скорина] скарынка
• dem oremans jejcer-hore iz a skorinke brojt *glxv.* спакуса для бядулі – скарынка хлеба
skosne(r) [*p.* skos, *ukr.* скосити] косы, крывы, скрыўлены
skot *m* [*p.* skot, *ukr./r.* скот] скот; **skotobojne** *f*, -s бойня, разьніца
skóvrede/skóv(o)rode/skóver(e)de *f*, -s [*p.* skowroda, *ukr./r.* сковорода] патэльня
• šteln af hejse skoverdes *fig.* класьці на гарачую патэльню

skri(č)en (mit) [*ukr.* скреготати, *p.* skrzytać] 1. скрыг(ат)аць; 2. *n* скрогат, скрыгатаньне; **a skriče ton*** шаргануць

skrinje *f*, -s, *dim.* **skrinke** *f*, -s [*p.* skrzynia, *ukr.* скриня] скрыня

• ba a kluger gospodinje iz tomed ful in der skrinje (in dem kastn) *šprxv.* у разумнай гаспадыні заўжды поўна ў скрыні

skripen [*p.* skrzypieć, *ukr.* скрипіти] 1. скрыпець; 2. *n*, **skrip** *m*, -n/-es скрып; **a skripe ton*** скрыпнуць; **skrípe(n)diker** скрыпучы; **skriperáj** *f* скрыпеньне

• a šlexte rod skripet cum/am ergstn *šprxv.* кепскае кола скрыпіць горш

• az me šmirt on di reder, skripet zej nit *šprxv.* калі колы змазаць, яны не скрыпяць (па змазе конь вязе; хто шмаруе, той едзе)

skri(ž)en [*ukr.* скреготати] скрыга(та)ць

skróbe(ve)n=škroben [*p.* skrobać, *ukr.* скребти] скрэбці, шкробаць

skrofl *m* [*d.* Skrofel, *p.* skrofuly] *med.* залатуха

skrux *m*, -es [*p.* skrucha] скруха, туга; **skruxen** наганяць тугу

skučne(r) [*r.* скучный] нудны, маркотны

skvernjak *m*, -es [*r.* скверный] скупы, скупянда, жмінда, скнара

[illegible] мястэчка Сквіра (Украіна)

• [illegible] iz itlexer a xosid, in Jarmolinec iz itlexer a ganev *glxv.* [illegible]віры – кожны хасыд, у Ярмолінцах – кожны злодзей

[illegible] stroj [*r.* сквозь строй] *adv. hist.* скрозь строй (палач-[illegible] дысцыпліна ў царскім войску)

• [illegible]/ trajbn* skvoz stroj ісьці/гнаць скрозь строй

slav(ján)išer [*d.* slawisch] славянскі; **slav** *m*, -n славянін; **slavízm** *m*, -en славізм у ідышы

slid/sljad/sljed=šlad *m*, -n/-es [*ukr.* слід, *p.* ślad] сьлед

• der slid fun a hoz afn šnej сьлед зайца на сьнезе

• kumen* afn slid натрапіць на сьлед

slimak=šlimak=šljomak *m*, -es [*p.* ślimak, *ukr.* слимак] смоўж, сьлімак

sline/sljune *f* [*p.* ślina] сьліна; **slínediker** сьлінявы; **slinen /sljunen** сьлініць

• di sline rint im fun mojl (s'gejt im iber di sline iber di lipn) у яго цякуць сьлінкі па вуснах

slixe *f*, -s [*s.* סליחה(-ות) →jomim-neroim] выбачэньне, прабачэньне, дараваньне [*sin.* fargebung]; адна з адмысловых пакаянных малітваў, якія чытаюцца ў апошні дзень месяца элула, ад Рош-Гашоны да Ём-Кіпуру і ў постныя дні; кніга з гэтымі малітвамі; *vulg.* паклёп, данос, скарга; **slíxenen** *vulg.* данесьці, даносіць, даказ(в)аць, уда(ва)ць (на кагосьці) [*sin.* masern, denuncirn]; **slíxener** *m*, -s даносчык, даказчык, намоўнік, жыгун [*sin.* moser, denunciant, ojsgeber]; **slixe-umexíle** *f* [*s.* ומחילה] выбачэньне, прабачэньне, дараваньне [*sin.* antšuldikung un fargebung]; **slíxes-cajt** *f* час, калі чытаюцца адмысловыя пакаянныя малітвы

• ix bet ba dir slixe-umexile af dem (Prc.) я прашу цябе выбачыць мне за гэта

• a kose mit a luex, un a slixe mit a fajercajg *glxv.* каса з календаром, а малітва з крэсівам (боб з гарохам, гарох з капустаю/буракамі мяшаць)

• az me gejt cu slixes, blajbn in der hejm di ruxes *glxv.* калі ўсе ідуць маліцца ў сынагогу, дома застаюцца чэрці (моладзь і слугі)

sl(j)edstve *f*, -s [*r.* следствие] сьледзтва, дазнаньне; **sl(j)edovatel** *m*, -es сьледчы; **sljédeven** рабіць сьледзтва; ісьці сьледам

sljepak *m*, -es [*ukr.* сліпак] *pejor.* сьляпак

sljesarnje *f*, -s [*r.* слесарня] сьлясарня

sljote *f* [*p.* słota] слота, слата, хлюпа, халепа

• in drojsn iz a sljote на двары слота

Slobodke мястэчка Слабодка (Украіна)

• zoln verem praven a xasene in dajn bojx un ajnladn ale zejere krojvim – fun Ihupec biz Slobodke! *kll.* каб чэрві ладзілі вясельле ў тваім жываце і запрасілі ўсіх сваіх сваякоў – ад Егупца да Слабодкі!

sloj *m*, -es, *dim.* **slojik/slojek** *m*, -es, **slojikl/slojekl** *n*, -ex [*p.* słój, słoja, słoik, *ukr.* слоїк] слой, слоік (посуд)

sloj *m*, -es [*p.* słój, *r.* слой] слой, пласт

slombón *m*, -es, **šlabán** *m*, -en [*p.* szlaban] рагатка, каза, шлагбон, мытня

slonine *f* [*p.* słonina] саланіна

slóžines *pl.* [*sl.*] адстой, піўны асадак, брага, саладзіны

slučaj *m*, -es [*ukr./r.* случай] выпадак

slup *m*, -es, *dim.* **slupik** *m*, -es [*p.* słup] слуп, стоўб

slušen [*p.* słuchać, *ukr.* слухати, *r.* слушать] слухаць, слухацца

slux *m*, -n/-es [*p.* słuch, *ukr./r.* слух] чутка, плётка

služen [*p.* służić, *ukr.* служити] служыць (таксама аб сабаку); **službe** *f* служба

• er hot šojn zajn "službe" opgedint ён ужо сваю "службу" адслужыў

smahe=šmaje *f* [*p.* smaga, *ukr.* смага] смага

• s'gejt im iber di smahe iber di lipn яму смажыць

smákeven [*p.* smakować] смакаваць

smal(j)en [*p.* smalić, *ukr.* смолити] смаліць; паліць (папіросы); **smálene/smáline** *f*, -s смаліна, гар

• s'šmekt mit smalene пахне гарам

smaravóz=šmaravóz *m*, -n [*p.* szmarowacz, *ukr.* шмаровидло] змазчык; шмаравоз, мурза, бруднюха

smarken=smorken [*p.* smarkać, *ukr.* сморкати] смаркаць; **smark=smork** *m*, -es, **smorkexc** *n* [*p.* smark] сопель, вазгры, смаркач, смаркавіньне; **smarkate(r)=šmarkate(r)** смаркаты, вазгрывы, саплівы; **smarkáč** *m*, -es *pejor.* смаркач, малы, шчанюк

• orem iz kejn šand (abi nit smarkate) *glxv.* беднасьць ня сорам (абы толькі не смаркаты)

smate=šmate *f*, -s [*p.* szmata, *ukr.* шмат] шматок, ануча, вяхотка

smax=semáx/semex *m*, -n [*s.* סמך(-ן)] грунт, база, фундамэнт, аснова, падстава, падваліна, нагода, зачэпка [*sin.* grunt, baze, fundament]

• af velxn smax? на якой падставе?

• afn smax fun... на падставе...

• nito kejn smax cu baklogn zix німа падставы скардзіцца

• on a šum smax без усялякай падставы

• s'iz ba undz faran a fuler smax (mir hobn a fuln smax) мы маем усе падставы

• s'iz do a smax cu mejnen... тут ёсьць падстава меркаваць...

• s'iz faran a genuger smax cu mejnen ёсьць усе падставы меркаваць

• zajn* der smax far... зьяўляцца грунтам для...

smejen [*r.* сметь] сьмець, адважвацца, асьмельвацца

smeren/smiren [*ukr.* смирити] сьміраць, супакойваць, заспакойваць, уціхамірваць, угамоўваць, утаймоўваць

smete *f*, -s [*r.* смета] каштарыс

smétene=šmétene *f* [*p.* śmietana, *ukr./r.* сметана] сьмятана; **smetanke** *f* сьмятанка, вяршкі

• aropnemen* di gance smetene un lozn* far jenem di zojermilx/sirovetke зьняць усю сьмятану (зьлізаць вяршкі) і пакінуць камусьці сыраквашу/сыроватку

• az me nemt arop di smetene – blajbt di zojer milx *šprxv.* калі сабраць сьмятану – застаецца кіслае малако

smik *m*, -n/-es, **smiček/smičik/smicik** *m*, *pl.* smičkes [*p.* smyk, *ukr.* смик] смык, смычок; **smiken** граць на скрыпцы

• er iz alt fufcik jor mit a smiček (ariber) яму пяцьдзясят з хвосьцікам

• gejn* cum smik *fig.* перажыць непрыемны выпадак

• nemen* emecn cum/afn smik *fig.* зрабіць камусьці вымову

• vi a fidl on a smiček, vi a balegole on a bajč *glxv.* як скрыпка бяз смыка, як фурман бяз пугі

smik *m*, -n/-es [?] *kul.* мамалыга, густая каша

smiken [*ukr.* смикати?] зацяжэць (аб жывёлах); *pejor.* зацяжэць, зачаравацець, панесьці, заступіць плодам

smirno! [*r.* смирно!] *int.* зважай!

smitnik/sm(j)etnik=šm(j)etnik *m*, -es [*p.* śmietnik, *ukr.* сміт-ник] сьметнік

• vos me zet nit najerhejt in kastn, zet men alterhejt in smitnik *šprxv.* чаго новым ня ўбачыш у куфры, убачыш старым на сьметніку (аб бедняку, які жыве з абноскаў)

smixes *n* [*s.* סמיכות] 1. **smixe** *f* [*s.* סמיכה] пасьведчаньне на сан рабіна; 2. сувязь, належнасьць, адносіны, свояцкасьць [*sin.* farbindung, šajxes, onkereniš]; **smixes-hapárše(s)** *f/n* [*s.* (-יות)הפרשה →poreš, parše] сувязь паміж папярэднім і наступным разьдзеламі Торы; лягічная сувязь, адносіны

• krign* smixe атрымаць сан рабіна

• vos far a smixes-haparšes? якая сувязь?

smjale(r)=šmjal(n)e(r) [*p.* śmiały] сьмелы, адважны, бязбоязкі

smjatke *f*, -s [*r.* всмятку] яйка ўсьмятку

smo(č)ken/smokčen/smokcen=šmočken/šmokcen/šmocken (mit) [*ukr.* смоктати, *p.* smoczek, *d.* schmatzen] смактаць, цмокаць, чмокать, чаўкаць; **smočik** *m*, -es соска

smoder=šmoder *m*, -s [*d.* Schmadder] 1. слота, слата, хлюпота; 2. *fig.* неахайны, хлюндра

smole *f*, -s [*ukr./r.* смола, *p.* smoła] смала; **smol(j)arnje** *f*, -s смалярня; **smoljer** *m*, -s, **smoljar** *m*, -es смаляр; **smólekop** *m*, *pl.* -kep *hum. pejor.* шавец, шэўчык, шаўчук

smorken=smarken смаркаць; **smork=smark** *m*, -es, **smorkexc** *n* сопель, вазгры, смаркачы, смаркавіньне

smoren [*ukr.* шморгати] шморгаць (носам), порскаць, пыркаць, чмыхаць

smoród(z)ine *f*, -s [*r.* смородина] смуродзіна, парэчкі

smótreven [*r.* смотреть] аглядаць; **smotr** *m*, **smotre** *f*, -s агляд, парад; **smótrines** *pl.* [*r.* смотрины] розгляды, агледзіны, сугляды; **smotritel** *m*, -es [*r.* смотритель] дазорац, нагляднік, даглядач

smrod *m* [*p.* smród] смурод

smutne(r) [*p.* smutny, *ukr.* смутний] смутны, сумны

snaper *m*, -s [?] чалавек, які хутка псуе вопратку; няхлюй, нязграй, заткала, шмаравоз, плюндра

snarjád *m*, -n [*r.* снаряд] снарад

snast *m*, -n [*ukr.* снасть] шкілет, касьцяк; худы, хударлявы, шчуплы, сухі, сухарлявы чалавек, худак;

• er iz šojn gevorn a snast fun a menć ад яго застаўся адзін цень

sne *m* [*s.* סנה] *inx.* палаючы цёрн, у выглядзе якога бог зьявіўся Майсею

snjetke *f*, -s [*r.* снеток] *zool.* сьняток

snjošken [*lit.* šniõkšti?] цмокаць (цалаваць)

snop *m*, -es [*p.* snop, *r.* сноп] сноп

• gebn* a fal vi a snop зваліцца як сноп

• snop lixt сноп сьвятла

snuk=šnuk *m*, -n [*d.* Schnauze, *mhd.* snuz] лыч, рыла, храпа; хобат

sobake *f*, -s [*ukr./r.* собака] сабака

Sobeski=Sabecki [*p.* Jan Sobieski (1629–1696)] Ян Сабескі (польскі ваявода і кароль)

sobranje *f*, -s [*r.* собрание] збор, сход

sod *m*, *pl.* sojdes [*s.* (-ות)סוד →bal-sod, besod] сакрэт, тайна, таямніца, містэрыя [*sin.* sekret, misterje, gehejmeniš]; **sod-sójdes(dik)** *adv.* вельмі сакрэтна, над вялікім сакрэтам

• haltn* sod трымаць у сакрэце

• nit maxn kejn sod fun epes не рабіць з чагосьці сакрэту

• ojsgebn* dem sod выдаць сакрэт

• (on)fartrojen emecn a sod даручыць камусьці сакрэт

• praven sojdes сакрэтнічаць

• a sod iz nor unter fir ojgn (un unter fir ojern) *šprxv.* сакрэт існуе толькі сярод чатырох вачэй (і чатырох вушэй) (удвух рада, утрох здрада)

• az me varft dem sod arajn in jam, varft im der jam arojs *šprxv.* закінь сакрэт у мора, мора выкіне яго назад (шыла ў мяху не схаваеш; грэх не схаваеш у мех, ня ўтопчаш у балота)

• ba a nar un ba a kind iz kejn sojdes ništo (far a nar iz kejn sod nit faranen) *šprxv.* у дурня і ў дзіцяці німа сакрэтаў (п'яное і малое найлепшу праўду скажа; дзіця і п'яны праўду гавораць; дурань языка на прывязі не трымае)

• der sod ligt af der gas *glxv.* сакрэт ляжыць на вуліцы

• dos ponem zogt ojs dem sod *šprxv.* твар выдае сакрэт (відаць па вачох, хто ходзіць на начох)

• ganovim hobn sojdes *glxv.* злодзеі маюць сакрэты

• gringer iz hern a sod, ejder hitn a sod *glxv.* лягчэй пачуць сакрэт, ніж захаваць яго

• jede harc hot sojdes *glxv.* кожнае сэрца мае сакрэты

• vu a sod, dort iz a ganejve *glxv.* дзе сакрэт, там і крадзеж (дзе шмат прысмак, там і зграя сабак; дзе мёд, там і мухі)

• zog der/dem vajb ■ sod un šnajd ir op/ojs di cung (far a vajb iz kejn sod ništo) *šprxv.* скажы жанчыне сакрэт, але адрэж ёй язык (скажы бабе па сакрэту, ■ баба ўсяму сьвету; скажы адной курыцы, а тая ўсёй вуліцы; калі сказаў бабцы, то так як усёй грамадцы)

sod *m*, *pl.* -n/seder, *dim.* **sedl** *n*, -ex [*ukr./r.* сад, *p.* sad] сад; **sódenik** *m*, -es садоўнік

sode *f*, -s [*d.* Soda] сода; **sóde(-)vaser** *f/n* [*d.* Wasser] содавая вада

soer-/soir-lazózl *m*, -en [*s.* (-עז)שעיר לעזאזל →azozl, lazozl] казёл адпушчэньня, якога паводле Торы ахвяруюць за гэбрэйскі народ (Ляв. 16:8); *fig.* бязьвінная ахвяра, пакараная за чужы грэх [*sin.* kapore-hindl]

• zajn* a soer-lazozl быць казлом адпушчэньня

sof=sov=s *m/f*, -n [*s.* (-)תו] "соў", літара гэбрэйскага альфабэту

sof *m*, -n [*s.* (-)סוף →onsofiker] канец, канчатак, (ус)край, шчэнт, пасьледак; рэзультат, вынік; каюк, садухі, капец [*sin.* end, šlus, ojsloz, rezultat]; **sof-kól-hadójres** *m* [*s.* כל הדורות] канец усяму сьвету, вечнасьць; **sof(-)k(o)l(-)sóf** (cum sof) *adv.* нарэшце, урэшце, у рэшце рэшт, у канцы канцоў; **sofk(o)l(-)sófiker** канчатковы; **sof-jór** 1. *m* канец году; 2. напрыканцы году; **sóf-stadje** *f* апошняя стадыя; **sóf-stancje** *f*, -s апошняя станцыя, тэрмінал; **sof-vóx** 1. *m*, -n канец тыдня, выхадныя дні; 2. напрыканцы тыдня; **sof-xójdeš** [*s.* חודש] 1. *m* канец месяца; 2. напрыканцы месяца

• a sof! хопіць! досыць!

• bizn sof fun ale cajtn да сканчэньня вякоў, павек, да канца сьвету
• gebn*/maxn emecn a vistn/švarcn sof даць камусьці ў косьці; аблаяць, абразіць, зьняважыць кагосьці (даць салёнкі; гароху засыпаць)
• hobn* a bitern/bejzn/vistn/švarcn/finctern sof мець благі канец (быць аблаяным/абражаным/зьняважаным)
• maxn a sof (cu) рабіць канец, ліквідаваць
• maxn/gebn* a švarcn sof вы-, аб|лаяць, насварыцца
• nemen* a sof скончыцца
• on a sof (un on an ek) канца-краю німа
• vos vet zajn der sof? які будзе вынік? чым гэта скончыцца?
• x'hob getraxt, getraxt un sofkolsof cugetraxt я думаў, думаў і нарэшце прыдумаў
• a sof an ek як канец – дык канец
• a sof cu di cores! канец клопату!
• alc iz gut, ojb der sof iz gut (az der sof iz gut, iz alc/ales gut) *glxv.* усё добра, што мае добры канец (канец усёй справе вянец)
• nu šlof mer nit, jidele, /max dajne ojgn uf, /un fun dem ...es-lidele /zol šojn zajn a sof! (L. G.) ну, ня сьпі болей, ... расплюшчы свае вочы, і хай ужо песьня аб вы...ні скончыцца!
• sof odem lemise, sof behejme lešxite, sof sojxer leplejte, sof ganev letlie *šprxv.* канец чалавека – сьмерць, канец скаціны – рэзьніца, канец гандляра – уцёкі, канец злодзея – шыбеніца (колькі б воўк не валок, павалакуць і ваўка; і злодзей да пары крадзе; суджана бычку на лычку, а цялушачцы на вяровачцы)

sofek *m, pl.* sfejkes [*s.* (ספק-ות) →mesupek, onsofekdiker, farsofekter, sfek-sfejke] сумнеў, сумненьне [*sin.* cvejfl]; **sófekdiker** сумнеўны; **sófekn (zix)**, **hobn* sfejkes** сумнявацца [*sin.* kvestjonirn, cvejflen]
• a sofek blojer, sofek švarcer garnitur гарнітур ці то сіні, ці то чорны
• a sofek groj, sofek šmucik tixl ці то шэрая, ці то брудная насоўка
• dos iz a grojser sofek гэта выклікае шмат пытаньняў
• dos iz ojser sofek гэта не падлягае сумненьню
• kejn brekele sofek (on (a) sofek) ні кроплі сумневу
• mevatl maxn ale sfejkes вырашыць усе сумненьні
• s'hobn im nit gelozt ruen di sfejkes сумненьні не давалі яму супакоіцца
• s'iz a grojser sofek, ci er vet kumen наўрад ці ён прыйдзе
• s'iz nox a grojser sofek (in a grojsn sofek) гэта яшчэ пад вялікім пытаньнем
• sofek..., sofek... а(ль)бо..., а(ль)бо...; ці..., ці...
• šteln epes unter/in a sofek ставіць што-небудзь пад сумнеў
• zajn* in sofek, ci... сумнявацца/вагацца, ці...

sof(k)e *f*, -s [*fr.* sofa] сафа, кушэтка

sofres *n* [*s.* סופרות →sojfer] прафэсія перапісчыка, перапісваньне кніг; **sófrišer** які належыць перапісчыку або ягонай працы

soif *m, pl.* seifim [*s.* (סעיף-ים)] параграф [*sin.* paragraf]

sojbl *m*, -en [*ukr./r.* соболь, *p.* soból] *zool.* собаль; **sójblner** сабаліны, сабалёвы
• sojblner futer сабалінае футра

sojdes *pl.* →sod *m* [*s.* (סוד-ות)] сакрэт, тайна, таямніца, містэрыя; **sojden zix** сакрэтнічаць [*sin.* zix šušken, šepčen]; **sójdesdiker**, **sójdesfuler** таямнічы, (па)таемны, сакрэтны; **sójdesdikajt** *f*, **sójdesfulkajt** *f* сакрэтнасьць; **so(j)de-sójdes** *pl.* [*s.* סודי־סודות] вялікія сакрэты, таямніцы; **so(j)d-sójdes** *adv.* пад вялікім сакрэтам, зь вялікім даверам; **sojdes-hatójre** *pl.* [*s.* התורה־] *tnx.* таямніцы, містычныя веды, кабалістыка

soje *f* [*d.* Soja] *bot.* соя

sojfer *m, pl.* sofrim [*s.* (סופר-ים) →sejfer, sofres] "пісар"; каліграф, перапісчык (адмыслова Торы, малітваў, філяктэрыяў і мэзузаў) [*sin.* (iber)šrajber, kaligraf]; **sojfer-móher** *m* [*s.* מהיר־] спрытны пісар (які хутка піша), пісака [*sin.* gixšrajber, flinker šrajber]; **(sojfer-)stám** *m, pl.* sofrestam [*s.* (סופרי־) סת"ם־] перапісчык, які піша на пэргаміне Тору, малітвы, філяктэрыі й мэзузы

sójgern [*s.* סוגרן] *argo* зачыніць, зачыняць, закры(ва)ць [*sin.* farmaxn, faršlisn]

sojles *m/n* [*s.* סולת] 1. крупчатка, крупчастая мука, пшанічная мука вышэйшага гатунку; 2. *fig.* цьвет, краса, лепшая частка; эліта, арыстакратыя [*sin.* zemlmel, rejn vajs mel; dos beste, dos fajnste; elit, besere menčn, aristokratn]

sojmex zajn* (zix) (af) [*s.* סומך] абаперціся, абапірацца, спас(ы)лацца, грунтавацца [*sin.* zix onšparn, zix farlozn, hobn cutroj, zix šticn]; **sojmex-nóflim** *m* [*s.* נופלים־] "памагаты/дапаможца тым, хто падае"; азначэньне для бога

sojne *m, pl.* sonim, (-te *f*, -s) [*s.* (שונא-ים) →sine] вораг, непрыяцель [*sin.* fajnd]; **sojne-jisróel** *m, pl.* sonej-jisróel [*s.* (שונאי־) ישראל־] антысэміт, юдафоб; (dem) **sojnes** варожы; **sojne-béce** *m* [*s.* (שונאי־) בצע־] чалавек, які ня гоніцца за грашыма і пазьбягае некашэрных заробкаў [*ant.* oj(h)ev-bece]; **sojne-cíen** *m* [*s.* (שונאי־) ציון־] антысэміт, юдафоб [*sin.* jidnfajnd, antisemit]
• blutiker sojne кроўны/люты вораг
• majne sonim (zoln azoj lebn)! *kll.* каб гэтакае жыцьцё маім ворагам!
• sojne-cien! sojne-jisroel! *kll.* усё найгоршае (аб чым зараз узгадалі) нашым ворагам!
• sonim afculoxes (af cepikeniš) на злосьць ворагам
• zajn*/vern* emecn a sojne быць ворагам каму-небудзь
• zajn* sonim cvišn zix быць ворагамі паміж сабой
• a bruder a sojne iz a sojne afn lebn брат-вораг ёсьць вораг на ўсё жыцьцё (німа горшага ката над роднага брата)
• a gutn frajnt bakumt men umzist, a sojne muz men zix kojfn (kejn umzister sojne iz nito, me bacolt far im) *šprxv.* добрага сябра атрымліваюць задарма, за ворага ж трэба плаціць
• af majne sonim gezogt gevorn! *kll.* кляцьба ворагам маім!
• af sonej-jisroel gezogt gevorn! *kll.* кляцьба антысэмітам!
• aza jor/mazl af majne sonim! *kll.* ворагам маім такі лёс!
• beser der sojne zol ba mir guts zen, ejder ix ba im šlexts *glxv.* хай лепш вораг бачыць ува мне добрае, чым я ў ім благое
• di grojse sonim vern noente mexutonim *šprxv.* найвялікшыя ворагі робяцца блізкімі сватамі
• ejn got un azojfil sonim! (ejn got af ale sonim) *glxv.* бог адзіны, але столькі ворагаў!
• hit mix got fun majne frajnt, fun majne fajnt/sonim vel ix mix alejn ojshitn (fun a sojne ken men zix alejn farhitn, fun a gutn frajnd zol got farhitn; got, bahit mix fun majne gute frajnd, fun majne sonim vel ix mix šojn alejn farhitn) *šprxv.* сьцеражы мяне, божа, ад маіх сяброў, ад маіх ворагаў я засьцерагуся сам
• jeder jidn sojne hejbt zix uf hojx *glxv.* кожны антысэміт падымаецца высока

• nit kejn mezumonim, nit kejn šejn ponem, ober a sax sonim *glxv.* німа грошай, німа прыгажосьці, але шмат ворагаў (аб старой дзеўцы)

sojrer-umójre=ben-sojrer-umójre *m* [*s.* (בן־)סורר־ומורה] свавольнік, пракуда, пракуднік; упарты, непакорны, кепскі, благі, дрэнны, аблудны сын

sojser zajn* **(zix)** [*s.* סותר →stire] супярэчыць, аспрэчваць, канфліктаваць [*sin.* zajn in videranand mit, zajn in kegnzac cu, opfregn, ništ mitštimen]

• zejere interesn hobn zix sojser geven іхныя інтарэсы сутыкнуліся

sojte *f*, -s [*s.* (-ות)סומה] жонка, якую мужык падазрае ў няверпасьці; няверная жонка; *ilmd.* назоў 5-га трактату 3-га разьдзелу (запаветы аб няверпай жонцы)

sojve *m*, -s [*s.* (-ם)סובא →zojlel-vesojve] абжора і п'яніца

sojve=sovje *f*, -s накрыцьцё, апона; саван

• a sojve zol ix dir maxn! *kll.* каб я табе саван пашыў/пашыла!

sojvl zajn* [*s.* סובל →savlen] (вы)цярпець, перанесьці, пераносіць, вытрымаць, вытрымліваць [*sin.* fartrogn, tolerirn]

sojxer *m*, *pl.* soxrim, (-te *f*, -s) [*s.* (-ים)סוחר →misxer, sxojre, saxern, saxraj, farmisxerung] купец, гандляр [*sin.* hendler]

• a sojxer mit a kolir/glanc купец з глянцам

• a sojxers a zun купецкі сын

• a ganev blajbt a ganev, a sojxer blajbt a sojxer, un a nar blajbt a nar *šprxv.* злодзей застаецца злодзеем, гандляр – гандляром, а дурань – дурнем (як чорта ні хрысьці, усё адно: "у балота пусьці"; не чакай падзякі ад прыблуднага сабакі)

• a sojxer tor kejn hunt nit zajn un a hunt a sojxer – avade išt *glxv.* купец ня мае права быць сабакам, ■ сабака купцом – тым больш

• a volveler/tajerer sojxer танны/дарагі гандляр

• ale soxrim zajnen ganovim, ober nit ale ganovim zajnen soxrim *glxv.* усе купцы – злодзеі, але ня ўсе злодзеі – купцы

• itlexer sojxer lojbt zajn sxojre *šprxv.* кожны гандляр хваліць свой тавар (кожны цыган сваю кабылу хваліць; кожны стралец сваю стрэльбу хваліць; кожны пастух сваёй пугай хваліцца; жаба квокча, сваё балота хваліць)

• Ix vel a zemerl dir zingen, gotenju! /Ix vel dir zingen fun dajn sojxerl: /fort a sojxerl in veg baginen. /– Sojxerl, majn sojxerl, vu forstu? /– Ix for, ix for /gots bidne menčn cu badinen. /– Sojxerl, majn sojxerl, vos firstu? /– Ix fir, ix fir /dem šorhabor mit dem levjosn, /gots kinder lajdn, nebex, hunger, /vet af der velt zajn simxe vesosn. (M. B.) Я прасьпяваю табе песьню, божухна! Я буду сьпяваць пра твайго гандляра: едзе гандляр зранку у дарогу. - Гандляр, мой гандляр, куды едзеш? – Я еду абслугоўваць божых бедных дзяцей. – Гандляр, мой гандляр, што ты вязеш? – Я вязу дзікага быка зь левіяфанам, божыя дзеці церпяць, нябогі, голад, каб на сьвеце была радасьць.

solidne(r)/solider [*d.* solid, *p.* solidny] паважны, грунтоўны

solitér *m*, -n [*fr.* solitaire] 1. *zool.* салітэр, тасемнік; 2. *kart.* пасьянс

sok *m*, -n [*p.* sok] 1. сок; 2. варэньне; **sókiker** сакавіты, сакавы, сочны, сачысты

soldát *m*, -n, (-ke *f*, -s) [*r.* солдат] салдат, жаўнер; **soldatske(r)** салдацкі, жаўнерскі

solitre=salitre=selitre *f xem.* салітра, салетра

solko dejtox [*s.* סלקא דעתך] ці можаш сабе ўявіць (што маецца на ўвазе сказаць)?

solnečnik *m*, -es [*p.* słonecznik] *bot.* сланечнік

sólnice/sólničke/sólnicke *f*, -s [*p.* solnica, solniczka] салянка, сальніца

solomjanke *f*, -s [*p.* słomianka] саламяная цыноўка

solovéj *m*, -en/-es, **solovejčik** *m*, -es [*r.* соловей] *zool.* салавей

soltis *m* [*p.* sołtys] *hist.* солтыс (сельскі староста)

som *m*, -en [*ukr./r.*] *zool.* сом

somejex-bexélke [*s.* שמח־בחלקו →mesamejex, bal-simxe, be-simxe-rabe, simxe; xejlek, xilek, xaluke] "здаволены сваёй часткай"; чалавек, які здаволены сваім лёсам, сваёй доляй

• zajn* a somejex-bexelke задавольвацца малым

sond *m*, -es [*p.* sąd] суд

sondek *m*, -s [*p.* sandacz] *zool.* судак

sonim *pl.* →sojne *m* [*s.* (-ים)שונא] вораг, непрыяцель; **sonej-jisróel** *pl.* →sojne-jisróel *m* [*s.* (שונאי) ישראל] антысэміт, юдафоб

sónišnik *m*, -es [*ukr.* соняшник] *bot.* сланечнік

sop! [*ukr.* цоб] *int.* но! цоб! (на вала/каня)

sope *f*, -s [*d.* Schöpfer?] апалонік

sopen=sapen сапець, сапці; сыкаць, сіпець; **sópediker** задыханы

• sopen vi a gandz сіпець як гусь (як асыпідка/гадзюка/зьмяя)

sopke *f*, -s [*r.*] сопка

Sore [*s.* שרה] *mx.* Сара, Сор(к)а (жонка патрыярха Абрагама)

• az "Sore" iz cen, iz "Rifke" elf калі "Сора" – дзесяць, дык "Рыўка" – адзінаццаць (невук блытае імя "Sore" з "asore" [*s.* עשרה] "дзесяць")

Sore Bas-tójvim [*s.* שרה בת־טובים] наймя вядомай аўтаркі малітваў для жанчынаў Соры Бас-Мордха з Сотэнэва (пачатак XVIII ст.); легендарны вобраз жанчыны, якая дапамагае жанчынам і дзецям

sored *m*, *pl.* sridim [*s.* (-ים)שריד] рэлікт, перажытак; астача, астатак, рэшта [*sin.* lebn-geblibener; iberblajb]; **sored-upólet** *m* [*s.* ופליט] які застаўся жыць; астача, астатак, рэшта (часта нэгатыўна)

• kejn sored-upolet nit geblibn! ані рэштачкі не засталося!

soref *m*, *pl.* srofim [*s.* (-ים)שרף →jain-soref] сэрафім; наймя хасыдзкага рэбэ Стрэліскера (памёр у 1826 г.)

sore-hamálxes *pl.* →sar-hamálxes *m* [*s.* (שרי) שר־המלכות] прыдворны, які займае высокую пасаду

sores/soris *m*, *pl.* s(e)risim [*s.* (-ים)סריס →srises, mesares] еўнух, скапец, кастрат [*sin.* kastrirter, faršniterer, ejnux]

sorevéc *m* [*p.* surowiec?] хлебны квас

sorim *pl.* →sar *m* [*s.* (-ים)שר →srore] 1. уладар, валадар, (га)спадар, пан, прынц, князь; міністар; 2. анёл, які ахоўвае на нябёсах асобных людзей альбо нацыю

s(o)roke=saroke *f*, -s *zool.* сарока

s(o)rótvetke=sirótvetke/sivorotke *f* сыроватка

sort *m*, -n [*d.* Sorte] сорт, гатунак

sosne *f*, -s [*p.* sosne, *ukr./r.* сосна] *bot.* сасна; **sosnove(r), sósnene(r)** сасновы; **sósne-vald** *m*, *pl.* -velder (sosnove vald) сасновы бор/лес

sosn-vesímxe *m* [*s.* ששון־ושימחה →simxe-vesosn] юбілей /гадавіна й радасьць, вялікая радасьць

• es iz sosn-vesimxe бязьмерная радасьць

sosulke *f*, -s [*r.* сосулька] лядзяш, лядзень, лядзяк, бірулька

sot *m*, -es [*r.* сот] соты

sotes=s'hot es

• sotes iz arojs fun mode "сотэс" выйшла з моды (кажуць чалавеку, які часта гаворыць: "s'hot es")

sotn *m* [*s.* שטן →mastn?] сатана, шатан, бес, д'ябал, прынц пекла; *fig.* хітры чалавек [*sin.* tajvl, farfirer]; **sotn-(ha)mekátreg** *m* [*s.* מקטרג(ה)־] сатана ў ролі абвінаўцы на боскім судзе; паклёпнік, пляткар, плётнік; **sotn-hamášxes** *m* [*s.* המשחית־] зьнішчальны д'ябал, разбуральны дух
• er iz der sotn, er iz der jejcer-hore un er iz der malex-hamoves ён – сатана, ён – д'ябал, ён – анёл сьмерці
• mitn sotn tor men zix nit špiln *šprxv.* зь бесам не гуляюцца
• un az der rebe zingt /dem hejlikn nign, /blajbt der sotn a tojter lign *flksl.* і калі рэбэ сьпявае сьвяты напеў, сатана застаецца ляжаць мёртвым
sotn=šotn *m*, -s [*d.* Schatten] цень; **sótndiker=šótndiker** цяністы
sotnje *f*, -s [*r.* сотня] *hist.* (казацкая) сотня; **sotnik** *m*, -es *hist.* сотнік; **sotske** *m*, -s *hist.* соцкі
so(u)s *m*, -n [*fr.* sauce] *kul.* соўс, падліва, падліўка
sov=sof=s *m/f*, -n [*s.* (ן-)תוו] "соў", літара гэбрэйскага альфабэту
sove *m* [*s.* סבא] стары, дзед [*sin.* alter, zejde]
sove *f*, -s [*p.* sowa, *r./ukr.* сова] *zool.* сава
sovetn(-)farband *m* [*d.*] *hist.* Савецкі Саюз
sovje=sojve *f*, -s [?] накрыцьцё, апона
sov(j)est *n* [*r.* совесть] сумленьне; **sóvjestne(r)** сумленны
soxe *f*, -s [*r./ukr.* соха, *p.* socha] саха
• in der soxe ligt di mazl-broxe *šprxv.* саха дае дастатак
soxnút *f* [*ivr.* סוכנות] агенцтва; "гэбрэйскае агенцтва для Палестыны" (створана ў 1929 г.) [*sin.* agenc]
soxrim *pl.* →sojxer *m*, (-te *f*, -s) [*s.* סוחר →misxer, sxojre] купец, гандляр; **sóxrišer** гандлярскі, купецкі; **soxreráj** *f/n* гандаль, бізнэс [*sin.* handl, hendleriše profesje]; **sóxrimtut** *n* купецтва
spad *m*, -n [*p.* spad, *r./ukr.* спад] спад
spakúln=špakúln *pl.* [*d.* Spekulum?] акуляры
spalnje *f*, -s [*r.*] спальня
sparže *f*, -s [*it.* sparagio, *r.* спаржа] *bot.* спаржа
spec *m*, -n, (-n *f*, -s) [*r.* спец] спэц(ыяліст), док, мэт; **specieler** спэцыяльны, адмысловы
speke *f* [*ukr.* спека, *p.* spieka] сьпёка
spekt *f*, -n, **spekte** *f*, -s [*p.* inspekt] парнік; **spéktn-ugerkes** *pl.* парніковыя агуркі
spekulírn=špekulírn (spekulírt/špekulírt) [*d.* spekulieren] спэкуляваць, махляваць; **spekulánt=špekulánt** *m*, -n, (-ke *f*, -s) спэкулянт, махляр; **spekulativer** спэкуляцыйны, махлярскі; **spekulacje=špekulacje** *f*, -s спэкуляцыя, махлярства
spice *f*, -s [*sl.*] сьпіца
spidnjak *m*, -es [*ukr.* спідній] жоран (сподні камень)
spilšlive(r) [*r.* вспыльчивый?] гарачлівы; **spilšlívekajt** *f* гарачнасьць
spine *f*, -s, *dim.* **spinke** *f*, -s [*p.* spina, *ukr./r.* спина] сьпіна; сьпінка (крэсла)
spinke=šponke/šponge=špajke *f*, -s [*p.* spinka] шпонка, зáпінка
spirt/spírit(us)=špirt *m* [*d.* Spiritus] сьпірт; *fig.* гарачы, нястрымны чалавек; **spirtovke** *f*, -s сьпіртоўка
spižarnje=špajzarnje=špizarnje *f*, -s [*p.* spiżarnia] скрыня/шафа для ежы, камора, клець, сьпіжарня, кладоўка, стопка
spješne(r) [*p.* spieszny] сьпешны, прысьпешаны, прыскораны
splav *m*, -n/-es [*p.* spław, *ukr./r.* сплав] сплаў (лесу)
spl(j)etnje *f*, -s [*r.* сплетня] плётка
spodek/spodik *m*, -s [*p.* spodek] высокая футровая шапка
• gejn* in spodek *fig.* верхаводзіць
• drejen/duln emecn a spodik *fig.* дурыць камусьці галаву
• a jid mit a grojsn spodik, ober a trejfe harc *šprxv.* жыд у вялікай шапцы, але з трэфным сэрцам (хоць вялікая фігура, ды дура; хоць пусты мяшок, а золатам шыты)
• az dos vajb gejt in spodik, gejt der man in pantofl (zi gejt in spodik) *šprxv.* калі жонка ходзіць у шапцы, дык мужык у пантоплях (бедная тая дамова, дзе вала бадзе карова; дзе баба панам, там чорт камісарам)
• zi gejt in spodik/hojzn *glxv.* яна ходзіць у шапцы (носіць порткі; верхаводзіць)
spodek/spodik *m*, -s, **spodke** *f*, -s [*p.* spodek] сподак
spódnice *f*, -s [*p.* spodnica] спадніца
• a šlimazlnice farlirt di spodnice *glxv.* недарэка губляе спадніцу
• jo, dos klejd iz šejn – vi zet ober di spodnice ojs? *glxv.* так, вопратка прыгожая – але як выглядае спадніца?
• ven di vajb trogt di hojzn, vašt der man di spodnices *glxv.* калі жонка носіць нагавіцы, мужык мые спадніцы (бедная тая дамова, дзе вала бадзе карова; дзе баба панам, там чорт камісарам)
spokojne(r) [*p.* spokojny] спакойны, супакойны, ціхамірны, рахманы
spološen [*ukr.* сполошити] спалохаць, спудзіць; **spološen zix** успалашыцца, спалохацца
spom(n)jenten zix [*p.* spamiętać] запомніцца, запамінацца, утрымлівацца ў памяці
spor *m*, -n, **spore** *f*, -s [*d.* Spore] спора
sporen (zix) [*r.* спорить] спрачацца, сьпірацца
sposob *m*, -n/-es [*r.* способ, *p.* sposób] спосаб, чын, парадак, манер
(s)potiken zix (in) [*p.* spotykać się] спатыкнуцца, спатыкацца
• a ferd af fir fis spotiket zix, bifrat a menč af cvej (af ejn cung) *šprxv.* конь на чатырох нагох спатыкнецца, чалавек адным языком памыліцца (конь на чатырох нагах – і той спатыкаецца; і хітры ліс у пастку трапляе; і ў цесьце можна палец вывіхнуць)
sprave *f*, -s [*p.* sprawa, *ukr.* справа] справа; **spravnik** *m*, -es [*r.* исправник] *hist.* спраўнік (паліцэйскі чын у царскай Расеі)
spravečne(r) [*p.* sprawić] рыначны (кошт)
spraven zix (mit) [*ukr.* справитися] справіцца, спраўляцца; **spravne(r)** [*p.* sprawny] спраўны
• nit spravne(r) няспраўны
• ix volt zix nit spraven, ven du zolst nit geven cuhelfn я б ня здолеў справіцца, калі б ты не дапамог
spravke *f*, -s [*r.* справка] даведка
(s)pritne(r)/spirtne(r)=špirtne(r) [*p.* sprytny, *ukr.* спритний] спрытны; **sprit** *m* спрыт; **sprítnekajt** *f* спрытнасьць
spronzke/spron(d)žke *f*, -s [*p.* sprzączka] спражка
spru(n)žine/sprenžine=šprunžine *f*, -s, *dim.* **spru(n)žinke** *f*, -s [*p.* przężyna] спружына
spulke=špul(k)e *f*, -s [*d.* Spule] шпуль, шпуля, шпулька
sračke *f*, -s [*v.*] *vulg.* срачка, мыт(уха), ганячка, гнётка, панос; **srač** *m vulg.* срач, гаўно; погань, агіда, брыд(от)а, гнюснасьць
srejfe *f*, -s [*s.* שר(י)פה(-ות) →nisref, far-, on-, (ce)sarfe(ne)n; arbe-mises-bezdn] пажар; спаленьне; адно з чатырох сьмяротнакарных злачынстваў [*sin.* brand, untercindung; farbrenung]; **sréjfediker** полымны, які палымнее; **sréjfe-melder** *m*, -s вартаўнік, які сочыць за пажарнай бясьпекай
• a srejfe! гарым! пажар!
• az dos mazl gejt, vojnt men noent fun der xasene un vajt

fun der srejfe *šprxv.* каму шчасьціць, той жыве побач зь вясельлем і далёка ад пажару (шчасьліваму і ў сьне шчасьце сьніцца; каму месяц сьвеціць, таму й зоры ўсьміхаюцца; шчасьліваму – шчасьце)
• nox a srejfe vert men rajx *šprxv.* пасьля пажару багацеюць
sridim *pl.* →sored *m* [*s.* (-ים)שריד] рэлікт, перажытак; астача, астатак, рэшта; **sride-plétje** *pl.* [*s.* שרידי־פליטה] нешматлікія ўратаваныя [*sin.* di vejnike geratevete]
srisim *pl.* →sores/soris *m* [*s.* (-ים)סריס] еўнух, скапец, кастрат; **srises** *n* [*s.* ת-] кастрацыя, імпатэнцыя [*sin.* kastrirtkajt, impotenc]
sročne(r) [*r.* срочный] тэрміновы
• me zol rufn cu dir sročne a dokter, un az jener vet kumen, zol men im zogn, az me darf šojn nit! *kll.* каб да цябе хутка выклікалі доктара, але калі той прыйдзе, сказалі, што ён ужо не патрэбны!
sróde-post=srode post *m* [*p.* środoposcie] сярэдзіна посту (чацьвертая нядзеля Вялікага посту)
srofim *pl.* →soref *m* [*s.* (-ים)שרף] сэрафім; **srofim-veojfánim** *pl.* [*s.* ואופנים] сэрафімы і херувімы
srok *m*, -n [*r.* срок] тэрмін
sroke=saroke *f*, -s [*p.* sroka] сарока
• grojs vi a sroke af a xazer *glxv.* вялікі як сарока на парсюку (кавалер – старому кату па калена)
srore *m*, *pl.* -s/srorim, (-te/-ste *f*, -s) [*s.* (-ים/-ות)שרירה →sar] уладар, валадар, (га)спадар, пан; вяльможа, саноўнік [*sin.* har, grojser porec; hojxer baamter]; **srórišer** панскі; вяльможны, саноўны
• a sroriše banemung фанабэрыстасьць, ганарыстасьць, пагарда
• lebn vi a srore жыць як пан
• srorišer cugang cum injen барскія адносіны да справы
• vi di srores, azoj iz der mešores *glxv.* якія паны, такія й парабкі (які пан, такі й будан/жупан; якія мы гаспадары, такія й нашыя двары; якая Агатка, такая ў яе і хатка)
• di halbe velt lebt vi srores, di andere lebt in cores *glxv.* палова сьвету жыве па-панску, другая палова – у няшчасьці
s'rov=dos-róv=dos rov [*s.* רוב →rabim, nisrabe] *adv.* па большай частцы, па большасьці, у большасьці выпадкаў, большай часткай, большасьцю, збольшага, пераважна
sróvetke=seróvotke=siróvetke/sívorotke=soróvetke *f* сыроватка
sroxe *f*, -s [*s.* (ס-/ות-)סרחה →sarxn, masriex] смурод [*sin.* geštank]
st', 'st=host/vest
s"t *abr.* **sejfer-tójre** *f*, *pl.* sifre-tojres [*s.* ס"ת=ספר־תורה (ס-/ספרי־תורות)] сынагагальная Тора (напісаная на пэргаміне і скручаная ў сувой)
-st- [*d.* -st] *suf.* -эй(шы), -ей, -ш(ы), най- (утварае прыметнікі, прыслоўі й назоўнікі найвышэйшай ступені)
• jingster малодшы, меншы; grester найвялікшы; (dos) šenste найпрыгажэйшае
stable=stoblje *f*, -s прыступка, папярочка (на драбінах)
stacje *f*, -s [*p.* stacja] станцыя; **stacjonírn** (stacjonírt) раскватароўваць
stade *f*, -s [*p.* stado, *ukr./r.* стадо] статак, чарада, стада; **státedíker** стадны
stadole=stodole *f*, -s стайня, стадола, хлеў; ёўня, асець, рэя, сушня, гумно
s(')tajč [*d.* was ist das deutsch] *int.* што значыць? як жа гэта?; **stájčiker** фанабэрысты, ганарысты, напышлівы
staje *f*, -s [*r.* стая] зграя
stajen [*p.* stawać, *ukr.* ставати] ставаць, хапаць, быць у дастатковай колькасьці
• dos vet stajen гэтага будзе ставаць
• nit stajen не ставаць, згубіцца, зьнікнуць
• nit stajen unter di hent зьнікнуць, уцячы з-пад рук
• s'vet nit stajen far alemen на ўсіх ня хопіць
• vos di ojgn glustn, stajet ništ di kešene *glxv.* вочы прагнуць, але бракуе грошай
staler, stalne(r)=štalne(r) [*p.* stały, *ukr.* сталий] сталы
stalírn zix (stalírt) [*p.* ustalić] усталяваць, стабілізаваць
stalke=stilke=stołke *f*, -s столка, рэдзь; (ву)сьцілка
stalovanje=stołovanje *f*, -s бэлька
stam [*s.* סתם →min(h)astam, mistame] *adv.* наагул, проста так, так сабе, без асаблівай думкі; няпэўна, неазначана, звычайна [*sin.* azoj zix, glat, on a bazundern mejn, on a specjeln zinen; umbaštimt, gevejntlex]
• dos iz stam a bux гэта проста кніга
• er iz stam a menč ён звычайны чалавек
• er kojft nit stam bixer ён не купляе абы-якіх кнігаў
• er redt stam azoj ён вярзе бязглузьдзіцу
• stam a menč redt ništ kejn latajn звычайны чалавек на лаціне не размаўляе
• stam azoj так сабе
• stam in der velt arajn redt er nit ён на вецер словаў не кідае
• stam verter набор словаў
stam *abr.* **sforim - tfiln - mezuzes** [*s.* ס"ת=ספרים - תפילין - מזוזות →sojfer-stam] перапісчык, які піша на пэргаміне Тору, малітвы і мэзузы
stan *m*, -es [*r.* стан] *hist.* паліцыйная акруга ў царскай Расеі; **stanovój** *m*, -es [*r.* становой] *hist.* станавы прыстаў
stancje *f*, -s [*p.* stancje] 1. станцыя; 2. кватэра
• haltn* stancje кватараваць
stángret *m*, -n [*p.* stangret] фурман, возьнік, вазак
stanik *m*, -es, **stánikl** *n*, -ex [*p.* stanik] станік, ліф
stanje *f*, -s [*p.* stajnia] стайня
stanók *m*, -es [*r.* станок] станок, варштат
star(aj)en zix [*p.* starać się, *r.* стараться] (па)старацца; **staranje** *f*, -s стараньне, стараннасьць, дбаньне
• er volt nit geven azoj nariš, ven er staret zix nit arojsvajzn zajn xoxme ён ня быў бы такім дурнем, калі б не стараўся выказваць сваёй мудрасьці
(s)tarčen/sterčen=štarc(e)n/štarčen (af) [*p.* sterczeć, *ukr.* стирчати] тырчаць (аб валасох/пер'і); **stárčendiker=štárc(e)ndiker** адтапыраны, які тырчыць
• starčendike ojern адтапыраныя вушы
starizne *f* [*p.* starzyzna, *ukr.* старизна] старызна
staroste *m*, -s [*sl.*] староста
starozímnik *m*, -es [*sl.*] стары мудрэц
starše(r) [*sl.*] старшы; **staršiná** *m*, -en *hist.* староста, старшына
starux *m*, -es [*p.* staruch] стары, дзед; **staruxe** *f*, -s [*ukr./r.* старуха] старуха
staške *f*, -s [*p.* fistaszek, *it.* pistacchio] земляны гарэх, арахіс; **stáškešmir** *f* арахісавы алей
stat(eč)ne(r)=štatečne(r) [*p.* stateczny] сталы, паважны; **stat** *m* прыстойнасьць, сталасьць, паважнасьць; **státkeven=štátkeven zix, statečne vern*** [*p.* statkować] пасталець, зрабіцца сталым; **statéčnekajt** *f* сталасьць, паважнасьць; **statek/statik=štatek** 1. *m* стрыманасьць, сьціпласьць; 2. *m*, -es прыстойны, гожы чалавек

• vern* a statek стаць статным, пасталець, узмужнець
statút=štatút *m*, -n [*d*. Statut] статут
stav *m*, -n [*p*. staw, *ukr*. став] стаў
stavidle *f*, -s [*p*. stawidło] засаўка
stavke *f*, -s [*sl*.] стаўка (у гульнях)
staž *m*, -n [*fr*. stage] стаж
st(e)arín *m* [*fr*. stéarine] стэарына; **stearínener** стэарынавы
stelevate(r) [*r*. сутуловатый?] сутулаваты, гарбаваты, сагнуты
stel(j)e *f*, -s [*ukr*. стеля] столь
• a hojxe stelje высокая столь
• derlangen mit der hant biz der stelje дастаць рукой да столі
• rajsn* di stelje драць столь (ад роспачы)
• trefn* mit a finger in der stelje трапіць пальцам у столь
• nemen* fun der stelje узяць са столі (выдумаць з галавы; высмактаць з пальца; выкалупаць з-пад кіпця)
stelmax=štelmax *m*, -n, **stélmaxer** *m*, -s [*p*. stelmach] карэтнік, стальмах, сталяр; **stélmaxerišer** сталярны
stelnik=štelnik *m*, -es [*sl*.?] соты
stempe/stepke=stupe=štupe *f*, -s [*p*. stępa, *ukr./r*. ступа] ступа
stempeven [*mnd*. stampe?] намочваць (прасуючы бялізну)
stempl=štempl *m*, -en [*d*. Stempel] штэмпель, пячатка; *перан*. гаўро; **stémpljeven=štémpeln/štemplen** штампаваць, ставіць пячатку; клеймаваць
stencl=štencl *m*, -en [*eng*. stencil] трафарэт, шаблон
stender=štender *m*, -s [*d*. Ständer] пюпітар, падпора, месца для чытаньня ў сынагозе
stenge *f*, -s [*p*. wstęga] (і)стужка
stenken [*p*. stęknąć?] мармытаць, бурчаць
step *m*, -es/-n [*ukr*. степ] стэп; **stépišer** стэпавы; **stépevnik** *m*, -es, (-nice *f*, -s) стэпавік
sterlec/sterlet *m*, -n [*r*. стерлядь, *d*. Störling] *zool*. сьцерлядзь
stern(j)e *f*, -s [*r*. стерня] іржышча, іржэўнік
sterte *f*, -s [*p*. sterta] сьцірта, тарпа; **stérteven** сьціртаваць
sterve=scjerve=ščerve *f*, -s [*ukr*. стерво, *p*. ścierwo] сьцерва, подлы чалавек
stéxeven=štéxeven [?] (аб)мяняць, вы-, аб|меньваць, выменяць
stežke/steške/stečke=scježke=šteške *f*, -s [*ukr*. стежка, *p*. ścieżka] сьцежка; **stéžkele** *n*, -x дарожка, палавік
• Ject iz farvaksn di steżke /fun undzer libn špacirn... /Adje, adje, majn tajer lebn, /xasene hobn ken ix nit mit dir. *flksl*. Цяпер зарасьлі сьцежкі, дзе мы гулялі... Бывай, бывай, мой даражэнькі, выйсьці за цябе я не магу.
stibun *m*, -es [*ukr*. стеблина] расьліна, якая пайшла расьці ў сьцябло; *fig*. байбус, лагіза, мяжджула, дзыга, дрын
stičke *f*, -s [*r*. стычка] сутычка
stide *f*, -s [?] радзімка
stigoter *m*, -s [?] скандаліст, супраціўнік
stil=štil *m/f*, -n [*d*. Stiel] тронак, калодка; ручка, дзяржанне, дзяржальна, асадка
stilke=stalke=stolke *f*, -s столка, рэдзь; (ву)сьцілка
stimes-hagójlel *n* [*s*. סתימת־הגולל] засыпаньне/закрыцьцё долу/магілы
stinke=štinke *f* [*p*. stynka, *d*. Stint] *zool*. корушка, стынка, сьняток
stirdes=štirdes *n* [*lit*. spirtis?] упартасьць, свавольства, нораў; **stirdiš/sterdiš** (mit stirdes) *adv*. насуперак; **stírdišer /stérdišer** свавольны, упарты, яршысты; **stírdiškajt** *f* упартасьць, свавольства, непаслухмянасьць
• gejn* mit/af stirdes kegn emecn дзейнічаць насуперак камунебудзь, упарціцца, упірацца
stire *f*, -s [*s*. (-ות)סתירה →sojser, nister?] процілегласьць, супрацьлегласьць, супраціўнасьць, супрацьпастаўленьне, разлад, рознагалосьсе, супярэчнасьць [*sin*. videranand, kegnzac, ništ-ojsgeštimtkajt]; **stíre(s)diker** процілеглы, супрацьлеглы, супраціўны, супрацьпастаўлены, супярэчлівы; **stíre(s)dikajt** *f* супярэчлівасьць
• kumen* in a stire увайсьці ў супярэчнасьць
stis *m* [?] крызіс, безадкладнасьць
stisak=stusák *m*, -es [*ukr*. стусан] грымак, кухталь
stisk=scisk *m*, -es [*p*. ścisk, *ukr*. стиск] сьціск
stixéj/stixi(j)e *f* [*r*. стихия] стыхія; **stíx(éj)išer** стыхійны; **stixéjiškajt** *f* стыхійнасьць
stoblje=stable *f*, -s [*d*. Stabelle?] прыступка, папярочка (на драбінах)
stoček/stočik/stocik *m*, -es [*p*. stoczek] вітая васковая сьвечка
stoček/stočik *m*, -es [*p*. stoczek, stok] пень; капыл
stodole=stadole *f*, -s [*p*. stodoła, *ukr*. стодола] стайня, стадола, хлеў; ёўня, асець, рэя, сушня, гумно
stoj! [*r*.] *int*. стой!
sto(j)g=štojg *m*, -n [*p*. stóg, *r*. стог] стог
stojke *f*, -s [*ukr./r*.] стойка, прылавак
stojp/stolb *m*, -es [*r*. столб] слуп
• vaksn* in stojp расьці ў сьцябло
stol(j)er *m*, -s, **stoljar** *m*, -ljáres [*p*. stolarz] сталяр; **stoljeráj** *f/n* 1. сталярства; 2. **stoljarnje** *f*, -s сталярня; **stóljerišer, stoljarske(r)** сталярны
• stoljerišer klej сталярны клей
• farnemen* zix mit stoljeraj сталярнічаць
• a/der menč iz nor vi a stoljer – hajnt lebt er un morgn štarbt er *glxv*. чалавек як сталяр – сёньня ён жыве, а заўтра памірае
• Bin ix mir a stoljerl, /ruft men mix reb Fišl, /x'max a tir, a fencterl, /a benkele, a tišl. /Tanct un zingt majn zegele, /šnajdndik di bretlex, /bapucn vet dox undzer mi /derfelex un štetlex. (Z. B.) Я сталяр, клічуць мяне рэб Фішл, я раблю дзьверы, вокны, лавы, сталы. Танчыць і сьпявае мая пілка, рэжучы дошачкі, наша праца аздобіць вёсачкі й мястэчкі.
• cvišn ale šuster iz der bester šnajder Josl der stoljer (er maxt a hitl, ligt es afn kop vi henčke) *glxv*. сярод усіх шаўцоў лепшы кравец Ёсель-сталяр (ён робіць шапку, кладзе на галаву як пальчатку)
stolke=stilke=stalke *f*, -s [*v*.] столка, рэдзь; (ву)сьцілка
stolovanje=stalovanje *f*, -s [*ukr*. стелина?] бэлька
• az me lejgt zix nit gegesn, cejlt men di stolovanjes хто кладзецца спаць ня еўшы, лічыць бэлькі пад столяй
ston *m*, -en [?] стан, талія; падол, прыпол
• eng in ston вузкі ў таліі
stop! *int*. стоп!; **stoper** *m*, -s [*p*. stoper] сэкундамер
stopnje *f*, -s [*p*. stopień] прыступка
storož *m*, -es [*r*. сторож] стораж, вартаўнік, дазорац
stos *m*, -n [*p*. stos] 1. купа, куча; штабэль, пагон (дроваў); 2. *kort*. назоў гульні
stračen [*p*. stracić] страціць, змарнатравіць
stradanje *f* [*r*. страдание] пакута
• vu že nemt men aza getrajen menčn, /er zol visn, vos in majnem haren iz, /in majnem haren iz dox a stradanje, /majn stradanje iz dox gor umzist *flksl*. дзе ж мне ўзяць такога дарагога чалавека, які б ведаў, што з маім сэрцам, у маім сэрцы адны пакуты, але мае пакуты дарэмныя

straden zix [*r.* стралать; *fr.* astraindre?] напружвацца, стараца
stragan *m*, -es, **stragl** *n*, -es [*p.* stragan] крамка, ятка, латок
strajk=štrajk *m*, -n [*d.* Streik] страйк, забастоўка; **strajkn=štrajkn** страйкаваць, баставаць; **strajker=štrajker** *m*, -s, (-ke *f*, -s) страйковец
strapkes *pl.* [*ukr.* страпи?] зубцы, зубчасты фрыз
strašen (mit) [*p.* straszyć, *ukr.* страшити] страшыць, пужаць, палохаць, пагражаць, гразіць; **strašne(r)** *hum.* страшны, жахлівы; **straš** *m*, -n, **strašidle** *f*, -s страшыдла, пудзіла; **strašunek/strašunik** *m*, -nkes пагроза
• er strašet, az er vet avekforn ën пагражае ад'ездам
• ix hob nit kejn mojre far dajne strašunkes я не баюся тваіх пагрозаў
• nox di bakošes zajnen bakumen strašunkes за просьбамі пайшлі пагрозы
• straše di vancn! палохай клапоў!
strax *m*, -n [*sl.*] страх, жах, торап, сполах, гас
straxírn (straxírt) [*r.* страховать] страхаваць; **straxirung** *f* страхаваньне; **straxovke** *f*, -s страхоўка; **srtaxíropcol** *m*, -n страхавы ўнёсак; **straxír-agent** *m*, -n страхавы агент
• brenen zolstu afn fajer (on straxovke, af ejgn holc)! *kll.* каб ты на агні гарэў (без страхоўкі, на ўласных дровах)!
straž *m*, **straže** *f*, -s [*p.* straż, *r.* стража] старожа, варта; **stražnik** *m*, -es стражнік, вартаўнік
stražak *m*, -es [*p.* strażak] вартаўнік; пажарны
strelke *f*, -s [*r.* стрелка] стрэлка
stremen *m*, -es, **stremenje** *f*, -s [*ukr.* стремено, *p.* strzemię] стрэмя
strempl *n*, -ex, **stromplje** *f*, -s [?] лядзяш
stri *m*, -en [*ukr.* стрій] 1. строй, спосаб, чын, парадак, манер; 2. дух
• xapn dem stri зразумець спосаб, схапіць манер
strígeven [*p.* fastrigować] (фа)стрыгаваць
strihe *f*, -s [*ukr.* стрига?] касá; матыка, капаніца
strikter [*d.* strikt] строгі, дакладны
strimke(r) [*ukr.* стримкій] стромкі, стройны
strixe/strexe *f*, -s [*ukr.* стріха, *p.* strzecha] страха
strižon *m*, -en [*ukr.* стрижень] стрыжань (скулы)
str(j)apče *m*, -s [*r.* стряпчий] *hist. hum.* страпчы, адвакат
• gots strapče (gots-štrapče) *pejor./iron.* руплівец, дбайнік; крывадушнік, бажона, сьвяцец, дэвотка
• kools strapče *pejor.* інтрыган, круцель, баламуцень
stroclen zix [*d.* strotzen?] франціць, фарсіць
stroge(r) [*ukr./r.* строгий, *p.* srogi] строгі; **strógekajt** *f* строгасьць
stroj *m* [*r.* строй, *p.* strój] строй, шых, парадак, лад; **strojen** 1. строіць, шыхаваць; 2. будаваць; 3. *muz.* настройваць; **strojer** *m*, -s *muz.* настройшчык
• štejn in stroj стаяць у страі
• strojen di vonces разгладжваць вусы
• gejn*/trajbn* durx/skvoz stroj *hist.* ісьці/гнаць скрозь строй (пакараньне ў расейскім царскім войску)
strokač *m*, -es [*ukr.* строкатий] стракаты (конь)
stroke *f*, -s/-kn [*r.* строка] пятлічны шнур, завязка
stróm-holovój/-halevój [*ukr.* стрімголов, *r.* стремглав] *adv.* стрымгалоў
• lojfn* strom-holovoj бегчы стрымгалоў
stromke=štromke *f*, -s [*v.*] стрэмка, скабка
stronge *f*, -s [*p.* pstrąg] *zool.* стронга, фарэль
strostine=troščine *f*, -s [*p.* trzcina, *ukr.* тростина] трысьціна; чарот, трысьнёг
strož *m*, *pl.* strežer, (-ke *f*, -s), **struž** *m*, -n/-es, (-ke *f*, -s) [*p.* stróż] сторож, вартаўнік, дазорац
struč(k)e/strucke *f*, -s [*ukr./r.* струк] стручок
strudl *m*, -en [*d.* Strudel] *kul.* пірог з начынкай
strulkes *pl.* [?] гульня ў цыркі/бабкі
strune *f*, -s [*p.* struna] струна
• glajx vi a strune прамы як струна
strup *m*, -n/-es [*p.* strup, *r./ukr.* струп] струп; **strupevate(r)** струпаваты
stružke/struške *f*, -s [*p.* strużka] стружка
stučne(r)=štučne(r) [*p.* sztuczny] штучны
• stučne karakul штучны каракуль
stuken [*ukr.* стукати, *p.* stukać] стукаць, грукаць; **stúkike** *f* *kort.* назоў гульні
stupáj! [*r.* ступай!] марш! ідзі! тупай!
stupe=stempe/stepke=štupe *f*, -s [*ukr./r.* ступа] ступа
stupenjen [*sl.*?]
• er iz stupenjet gevorn ën аслупянеў/здранцьвеў
stuplen=štuplen [*d.* Stoppel] праколваць, дзіравіць, рабіць маленькія дзірачкі
stupnje *f*, -s [*ukr./r.*] ступня
stusák=stisak *m*, -es грымак, кухталь
subjékt *m*, -n [*d.* Subjekt] *gram.* дзейнік
• subjektlozer zac *gram.* безасабовы сказ
subotnik *m*, -es [*r.* субботник] суботнік (сэктант юдэахрысьціянін)
subrétn/subretke *f*, -s [*fr.* soubrette, *p.* subretka] субрэтка
substantiv *m*, -n [*d.* Substantiv] *gram.* назоўнік
sud *m*, -n [*ukr./r.*] суд; **sudjá** *m*, -s/-en судзьдзя; **sudjen (zix)** судзіць
• mirovoj sud *hist.* міравы суд
sude *f*, -s [*s.* (סעודה(-ות →šalešsudes] банкет, (сьвяточная) бяседа, баль [*sin.* molcajt, banket]; **súdeven** банкетаваць, баляваць; правіць, ладзіць бяседу; **sude-hamafsékes** *f* [*s.* המפסקת] апошняя вячэра напярэдадні Ём-Кіпуру, пасьля якой больш нельга есьці; **sudes-havróe** *f* [*s.* (סעודות) סעודת הבראה] абед, які прыносіць добры сябра жыду, які толькі што вярнуўся з хаўтураў (паводле звычаяў першы абед пасьля хаўтураў павінны быць з чужой ежы); **sudes-mícve** *f* [*s.* (סעודות) מיצוה] урачыстая бяседа з нагоды вяселья, абразаньня, канфірмацыі юнакоў і некаторых іншых сьвятаў; **sudes-púrim** *f* [*s.* פורים] урачыстая бяседа напрыканцы дня сьвяткаваньня Пурыму
• maxn/gebn* a sude задаць баль
• praven sudes правіць банкеты, ладзіць бяседы
• rajbn*/pucn a/di sude есьці зь вялікім апэтытам, жэрці, лопаць, трэскаць, лыгаць
• a sude kejad hamjelex (a sude af tiš un af benk) *glxv.* банкет на ўвесь сьвет (на стале і на лавах)
• beser a sude, ejder a xasene *glxv.* лягчэй справіць бяседу, чымся вясельле
• max pošeter di šabesdike sude un kum nit on cu fremder hilf рабі простым суботні стол і не хадзі па чужую дапамогу
• vu a sude, dort iz a ganejvim? *glxv.* дзе пір гарой, там і злодзеі (дзе шмат прысмак, там і зграя сабак; дзе мёд, там і мухі; абы падла – вароны назьлятаюцца)
sudek *m*, -es [*ukr./r.*] *zool.* судак
sufiks *m*, -n [*d.* Suffix] суфікс
sufit *m*, -n [*p.* sufit] суфіт, скляпеньне

sug *m*, -im [*s*. (סוג-)סוגים] сорт, гатунак, кляса, катэгорыя [*sin*. sort, klas, kategorje]
sugerírn (sugerírt) [*d*. suggerieren] намаўляць, пераконваць, гіпнатызаваць
sugje *f*, -s [*s*. (סוגיא-)סוגיות] тэма для дыскусіі з Геморы, талмудычныя дэбаты, праблема
suk=senk *m*. -es [*ukr./r.*] сук; **suk(ev)ate(r)=senkevate(r)** сукаваты
sukcés *m*, -n [*p*. sukces] посьпех
suke *f*, -s [*s*. (סוכה(ו)-ות)] буда(н), шата, шацёр, шалаш (бяз даху, які ставяць на восем дзён Сукэсу) [*sin*. bajdl]; *tlmd*. назоў 6-га трактату 2-га разьдзелу (запаветы аб сьвяткаваньні Сукэсу); **Sukes** *m* [*s*. סוכות(ו) →xag-goosif] Сукэс. Кучкі (гэбрэйскае рэлігійнае сьвята (ураджаю), якое сьвяткуецца 15 тышры на працягу 8 дзён); **súkes-diker** які мае дачыненьне да Сукэсу; **súke-šer** *f folk*. неіснуючая рэч (азначэньне для рэчы, якой не існуе, акрамя толькі дурань верыць у яе існаваньне)
• jejn* nox ■ suke-šer марна траціць сілы
• ... filn vi a jovn in suke адчуваць сябе як жаўнер у шаце (на здымка)
• ... meg im šikn nox a suke-šer *glxv*. яго можна пасылаць нахты прынесьці (выпраўляць па смажаны лёд; шукаць ветру ў полі, бацьку з маткай)
• Sukes est men gut, un me šloft šlext *glxv*. на Сукэс добра есьці, але спаць кепска (у будане)
• un az ■ kumt der liber Sukes /vider af dos naj, /nito kejn esreg, nito kejn šxax, /aj, aj, aj... *flksl*. і калі настае любы Сукэс зноў, німа цытрына, німа яловых галінак, ай, ай, ай...
• zaj ■ menč, vestu zicn in suke *glxv*. будзь чалавекам, будзеш сядзець у будзе (так маці суцяшае дзіцёнка-гарэзу)
suke *f*, -s [*p*. su(cz)ka, *ukr./r*. су(ч)ка] сука; **sučke** *f*, -s сучка; **sukin sin** *m vulg*. сукін сын
sukjenke=šukjenke *f*, -s [*p*. sukienka] сукенка; **suknje** *f* [*p*. suknia, *ukr*. сукня] сукня; доўгая жаночая накідка
sumatoxe *f*, -s [*r*. суматоха] мітусьня, шум, сумятня, сумяціца, гармідар, вэрхал
sume *f*, -s [*d*. Summe] сума; **sumarer** сумарны; **sumírn** (sumírt) падсумоўваць
sumne(r) [*ukr*. сумний] сумны; **sum** *m*, **súmnekajt** *f* сум, журба
• s'iz mir sumne мне сумна
suneske *f*, -s [?] падстаўка для ног
sup *m*, -n [*d*. Suppe] *kul*. суп, зупа
superlatív *m*, -n [*d*. Superlativ] *gram*. найвышэйшая ступень
supones *pl*. [*r*. супонь, *ukr*. супоня] супоні
sur-/sjur-búr=šur(um)-búr(um) 1. *m* шурум-бурум, сырбор, блытаніна, гармідар, нелад, разгардзіяш; старызна, непатрэбшчына; зброд; 2. *adv*. сьпехам, сьпешна, похапам, бязладна
surdút=serdut/serdet *m*, -n [*p*. surdut] сурдут
surogát *m*, -n [*d*. Surrogat] сурагат
sus *m*, -im [*s*. (סוס-)סוסים] *iron*. конь [*sin*. ferd]
• az me hot nit kejn sus, muz men gejn cu fus *šprxv*. хто ня мае каня, мусіць хадзіць пеша
suslik *m*, -es [*r*. суслик] *zool*. сусьлік, суслак
sutane *f*, -s [*d*. Sutane] сутана
sutulevate(r) [*r*. сутулый] сутулаваты; **zajn*/gejn* sutulevate** сутуліцца
suxár/suxer=sexer *m*, -es [*p*. suchar, *ukr*. сухар] сухар
suxežile/suxožile *f*, -s [*ukr*. сухожилля] *anat*. сухажыльле
suxogorle *f* [*ukr*. сухо - горло] *med*. сухое горла, ларынгіт
suxot(k)e *f* [*p*. suchoty, *ukr*. сухоти] *med*. сухоты; **suxotnik** *m*, -es, (-nice *f*, -s) сухотнік
• hobn* suxote мець сухоты (пародыя на "hobn* xarote")
• xarote iz suxote *glxv*. каяньне – сухоты
svarbe=švarbe *f*, **esrim-v(e)árbe** *pl*. [*s*. עשרים־ואַרבּע] "24" (азначэньне для Танаху, які складаецца з 24 кніг)
sveter/sviter *m*, -s [*p*. swet(e)r, *ukr*. светр, *r*. свитер] сьвітэр, швэдар
svičen [*p*. ćwiczyć, świadczyć, *d*. zwicken?]
• svičen (emecn) in di ojgn 1. абвяргаць; 2. хлусіць
svičen [*p*. ćwiczyć] навучаць, рыхтаваць, гатаваць
svinják *m*, -es, **svinjake** *m*, -s [*p*. świniak] парсюк, кныр; **svinke=švinke** *f* [*p*. świnka, *ukr./r*. свинка] *med*. сьвінка, за́ўшніца
sviščen/svisčen=šviščen [*p*. świstać, *ukr*. свистати] 1. сьвістаць; 2. *n*, **svisč** *m*, -n, **svisče** *f*, -s, **sviščeráj** *f* сьвіст (губамі); **svišč=švifč** *m*, -n 1. рэзкі сьвіст, сьвісток; 2. гультай; нікчэмны чалавек; **a svišče ton*** сьвіснуць
svi(š)čern [*d*. zwitschern, *p*. świstać, *ukr*. свистати] шчабятаць, цілікаць, цьвілікаць, цьвіркаць; **sviščeráj** *f* шчэбет, шчабятаньне, ціліканьне, цьвіліканьне, цьвірканьне
svite *f*, -s [*p*. świta] сьвіта
svite *f*, -s [*fr*. suite] *muz*. сюіта
svit(k)e *f*, -s [*ukr*. свит(к)а, *p*. świt(k)a] сьвіт(к)а (вопратка)
svive *f*, -s [*s*. (סביבה-)סביבות] 1. асяродзьдзе, асяродак, акружэньне, атачэньне, суседзтва, навакольле, (в)аколіца; 2. кола людзей, таварыства, грамадзтва, грамада, кумпанія; 3. духоўная атмасфэра [*sin*. umgegnt, šxejnes, di noent, der arum; menčnkrajz, gezelšaft, kompanje; gajstike atmosfere, milje]
• s'hot im faršlungen/farzojgn di svive яго паглынула/засмактала асяродзьдзе
• šafn* arum zix ■ svive fun ejgene menčn стварыць асяродак адданых людзей
svjenčen/svjencen=švjenčen [*p*. święcić] асьвяціць, асьвячаць (паводле хрысьціянскай традыцыі); **sv(j)ente nigde** [*p*.] сьвятыя ніколі
• s'vet arojskumen af sv(j)ente nigde гэта будзе на сьвятыя ніколі (на сьвятыя Міколы або ніколі; на сьвяты Адам; на тое лета, пасьля абеду, гэтакаю парою)
svjendžen [*p*. swędzić] сьвярбець; **svjendžarnjes** *pl*. сьверб, сьвярбячка
svojske(r) [*v*.] свойскі
• svojske arbet свойская работа (рэч сваёй работы)
svoloč *m*, -es [*r*. сволочь] зброд
svond *m* [*p*. swąd] чад
s'vor [*d*. wahr] *bndv*. пэўна, вядома, безумоўна
svore *f*, -s [*s*. (סברא-ות)=סברה →masber, bal-svore, hasbore] дапушчэньне, гіпотэза, здагадка, меркаваньне; думка, плян [*sin*. mejnung, hipoteze; gedank, plan]; **svórele** *n*, -x жарт, жарцік
• af kejn svore ništ ані думкі, ніякім чынам
• es iz a svore мабыць, падобна, пэўна, магчыма
• es volt geven a svore, az... было б няблага, каб...
• ongenumen in der svore, az... лічачы, што...; калі дапусьціць, што...
• (s'iz) (do) a svore, az... ёсьць меркаваньне, што...; з гэтага вынікае, што...
svor(e)n *m*, -s [*p*. sworzeń, *ukr*. шворінь] шворан (у павозцы)
sxakl=saxákl=sexakl=s"h [*s*. ס"ה=(ען-)סדר הכל] 1. *m*, -en сума;

баланс, падрахунак, падсумаванье, рахуба, разьлік, вынік [*sin.* sume; bilanc]; 2. *adv.* усяго, разам, усяго толькі

sxar *m*, -n [*s.* (ן-)שכר →sxires] плата, узнагарода (за добры ўчынак) [*sin.* balojnung, bacoln; *ant.* ojneš]; **sxar-batóle** *m* [*s.* בטלה] кампэнсацыя за згублены час; **sxar-límed** *m* [*s.* לימוד] плата за навучаньне (у школе або ў хедары); **(sxar-)halíxe** *m* [*s.* (שכר)הליכה] плата за дарогу, дарожныя выдаткі [*sin.* bacolung farn gang, balojn farn veg]; **sxar-melóxe** *m* [*s.* מלאכה] працоўныя грошы, узнагарода за працу, заробак [*sin.* arbetslojn, arbetgelt]; **sxar-tírxe** *m* [*s.* טירחה/טרחא] узнагарода за працу [*sin.* balojnung far der mi]; **sxar-veójneš** *m* [*s.* ועונש] узнагарода і пакараньне пасьля сьмерці [*sin.* balojnung un štrof noxn tojt]

- šiler far sxar-limed вучань за плату
- (az) Jeraxmiel der zemšer maxt an ojvn, krigt er sxar-limed *glxv.* Ерахміэл-кушнер кладзе печ, атрымлівае ж ён плату за навучаньне
- dem rebn sxar-limed colt der rebojne-šelojlem *šprxv.* за навучаньне рэбэ плаціць сам бог
- far švajgn kumt a mol mer sxar, vi far redn *šprxv.* за маўчаньне часам больш плацяць, чым за словы

Sxarje=Zxarje [*s.* זכריה] *tnx.* (прарок) Захарыя; Кніга прарока Захарыі

sxax *m* [*s.* סכך →suke] лапкі, галіны хвоі (якія гэбрэі выкарыстоўваюць для пакрыцьця шаты на Кучкі); **sxax-bojm** *m*, *pl.* -bejmer *bot.* хвоя, яліна

sxie=zxie *f*, -s [*s.* (ות-)זכיה →zojxe, mezake] рэдкі гонар, пашана, павага, прывілей

sxires *n/pl.* [*s.* שכירות →sxar] пэнсія, заработак, заробак, узнагарода, утрыманьне [*sin.* lojn, gehalt]; **sxir-jóm** *m* [*s.* שכיר־יום] падзёншчык, наняты на адзін дзень [*sin.* tog-arbeter, gedungener afn tog]

- az der xazn hot vejnik sxires, derlejgt men im a por zingers *glxv.* калі ў кантара малы заробак, яму дадаюць двох сьпевакоў (замест грошай)

sxojr-/zxojr-brís [*s.* זכור־ברית] "памяць саюзу" (першыя словы і назва некаторых пакаянных малітваў, якія чытаюцца напярэдадні Рош-Гашоны); пярэдадзень Рош-Гашоны

sxojre *f*, -s [*s.* (ות-)סחורה →sojxer, misxer, farmisxerung] тавар; матар'ял, матэрыял; *iron.*/*fig.* нелюдзь; **sxójrediker** таварны; **sxójredikajt** *f* таварнасьць; **sxójre-mangl** *m* таварны голад; **sxójre-ojstojš** *m* тавараабмен; **sxójre-umzac** *m* тавараабарот; **sxójre-virtšaft** *f* таварная гаспадарка

- sxojre af der vog тавар на вагу
- a cugelegene/farlegene sxojre ляжалы тавар
- a gangbare sxojre ходкі тавар
- a gute sxojre iz ale mol gut *glxv.* добры тавар заўжды добры
- a hun, vos krejet, a goj, vos redt jidiš, un a jidene, vos lernt Tojre, iz nit kejn gute sxojre *šprxv.* курыца, якая кукарэкае, гой, які размаўляе на ідыш, жыдоўка, якая вучыць Тору, - гэта ўсё кепскі тавар (воўк гадаваны, непрыяцель яднаны і жыд хрышчоны - усё роўна)
- a sxojre tor nit mies vern *glxv.* тавар не павінен псавацца
- a šejne mejdl iz a karante štikl sxojre *glxv.* прыгожая дзяўчына - ходкі тавар (мае вялікі попыт)
- a štikl sxojre – azojns vi azelxs! *glxv.* штука тавару - што так што гэтак! (як ні круці – выдатная якасьць!)
- az me hot sxojre, hot men kejn mojre *šprxv.* хто мае тавар, той нічога не баіцца
- di ergste sxojre iz "loj" *glxv.* найгоршы тавар, калі німа ніякага
- dos iz kejn gelt nit, un jenc iz kejn sxojre nit (nit kejn gelt un nit kejn sxojre) *glxv.* гэта ня грошы, а гэна не тавар
- gute sxojre lojbt zix alejn *glxv.* добры тавар хваліць сябе сам (за добрым таварам і дурань будзе панам)
- nit kejn Tojre nit kejn sxojre *glxv.* ні Тора ні тавар
- s'iz a sxojre (a rixtike)! сапраўдны тавар! тавар дык тавар!

sxorim=zxorim *pl.* →zoxer *m* [*s.* (ים-)זכר] самец, мужчына; блядун

sxum *m*, -im/-en [*s.* (ים-/ען-)סכום →beheskem, haskome, muskem, maskem] *mat.* сума, сукупнасьць, лік, (агульная) колькасьць, аб'ём [*sin.* sume, col]; **sxúmiker** колькасны; **sxum-hakójlel** *m* [*s.* הכולל־ →sax-hakojlel, saxakl] агульны лік, агульная сума, колькасьць [*sin.* algemejne sume, arumnemendike col]

- der sxum jedies/kentenišn колькасьць/запас ведаў
- sxumike colverter *gram.* колькасныя лічэбнікі
- a nes, vos der tate hot dem dales, faršpart er sxum cu coln *glxv.* дзіва, што тата бедны, ён плаціць ня будзе
- farn tojt ken men zix nit bahaltn, un far sxum ken/tor men nit antlojfn *šprxv.* ад сьмерці не схаваешся, ад разьліку не ўцячэш (ад сьмерці не адперці; доўг не вяроўка – не парвеща)

sxus=zxus *m*, *pl.* -n/-im/zóxies(n) [*s.* (ן-/ים-)זכות] заслуга (рэлігійная або маральная), прывілей; права, фавор; **sxuse /zxuse jogn (olejnu)=zi"e** *abr.* [*s.* זי"ע=(עלינו) זכותו יגן] яго заслуга хай нам дапаможа; **sxusim/zxusim jogn (olejnu)** [*s.* זכותם יגן (עלינו)] іхняя заслуга хай нам дапаможа



Š=šin *m/f*, -en [*s.* (ען-)שין] 1. "шын", літара гэбрэйскага альфабэту; 2. лічба 300

š-š-š!, **ša!** *pl.* šat(s)!, **(šá-)kíč!**, **šá-štíl!** [*d.* sch, *p.* sza, *r.* ша, тшшш..., *v.* цссс...] *int.* ш-ш-ш! ша! цыць! ціха! цішэй! цішыня!; **(šá-)kíč** *adv.* вельмі ціха, спакойна; **šá-štíler** дужа ціхі, спакойны, маўклівы

- ša ša! ціха, ціха!
- zol zajn ša! трэба маўчаць!
- Ša-ša, es zol zajn štil, /der rebe gejt fun šil (šul), /ša-ša, er iz šojn do /in a guter šo. /Ša-ša, nor, xsidim zet, /di rebecn, zi gejt, /ša-ša, nor, kukt ajn, /vi zi šmejxlt fajn. *flksl.* Ша-ша, ціха, рэбэ ідзе з сынагогі, ша-ша, ён ужо тут у добрую гадзіну. Ша-ша, ціха, падзівецеся хасыды, рабініха, яна ідзе, ша-ша, ціха, пабачце, як яна файна ўсьміхаецца.

ša=šag *m*, -n шаг, паўкапейкі (манэта)

šaar *m, pl.* šeorim [*s.* (ים-)שער →šar-] 1. брама, вароты; 2. загаловачны, тытульны аркуш [*sin.* tojer; titlblat, šaarblat fun a bux]; **šaare-dmóes** *pl.* [*s.* שערי־דמעות] "вароты сьлёз"; нябесныя вароты, праз якія прымаюцца малітвы тых, хто плача [*sin.* tojern fun trern]; **šaare-ráxmim** *pl.* [*s.* ־רחמים] "вароты міласэрнасьці"; нябесныя вароты; *iron.* турма [*sin.* tojern fun baremherckajt/himl; tfise]; **(mem-tes) šaare-túme** *pl.* [*s.* (מ"ט) שערי־טומאה] *khl.* "49 babarotaў нечысьціні"; ступені маральнага падзеньня; **ša(a)re-tfíle** *pl.* [*s.* ־תפילה] "вароты малітвы"; нябесныя вароты, праз якія прымаюцца малітвы [*sin.* tojern fun gebet]; **šaar-hoášpe** *m* [*s.* ־האשפה] "вароты сьмецьця"; адны з варотаў былых Ерусалімскіх муроў; нячыстае месца [*sin.* tojer fun mist; umrejn ort]

šabaš *m*, *abr.* **šb"s=šabes** *m* [*s.* שב"ס] шабаш; грошы, якія даюць музыкам у якасьці чаявых на вясельлі або ў іншых выпадках; **šabašnik/šábesnik** *m*, -es вялікі суботні кандэлябар; закуток у печы, дзе можна захоўваць у цяпле суботнюю ежу

šábern, **šábreven** [*s.* ?שברן] *argo* чыніць крадзеж з узломам, рабаваць, красьці, выкрадаць; **šaber** *m*, -s фомка (зладзейскі ломік); **šáber-koxer** *m*, -s майстар, які робіць прылады для ўзлому

šabes *m*, *pl.* šabosim [*s.* (ים-)שבת] шабас, субота (сьвяты дзень адпачынку) (Вых. 31:14–17); *tlmd.* назоў 1-га трактату 2-га разьдзелу (запаветы аб субоце); **šábesdiker** суботні; **š(a)béjsenaxt(s)** *m*, -n, [*s.* ־שבתע]. **šábescunaxt(s)** *m*, -n суботні вечар; **šabes afdernáxt**, **š(a)béjsenaxts=špéjsenaxt(s)**, **šábes(-)cu(-)náxts**, **šabes cu naxt(s)** *adv.* суботнім вечарам, у суботу ўвечары (адвячоркам); **šábesnik** *m*, -es 1. (камуністычны) суботнік; 2. **šabašnik** *m*, -es вялікі суботні кандэлябар; закуток ў печы, дзе можна захоўваць у цяпле шабасовую ежу; **šabes-bréjšes** *m* [*s.* ־בראשית] першая субота пасьля Сукэсу, калі чытаюць "Brejšes" (Быцьцё); **šábes(-)goj** *m*, *pl.* -goim, (-e *f*, -s) [*s.* (ים-)גוי־] няжыд, які ў суботу робіць для жыда забароненую працу (запальваньне сьвечак і г.д.); жыд, які не прытрымліваецца суботы; **šábes-hiter** *m* жыд, які прытрымліваецца суботы; **šabes-hagódl** *m* [*s.* ־הגדול] субота перад Пэйсахам; **šabes-jóntevdiker** [*s.* -יום־טוב־] шабасова-сьвяточны, урачысты; **šabes-kójdeš** *m* [*s.* ־קודש] (сьвятая) субота; **šábes-lixt** *n* сьвяча, якую запальваюць адвячоркам у пятніцу, каб прачытаць блаславеньне на запальваньне сьвячэй; **(šabes-)mevórxim** *m* [*s.* ־מברכים] субота, у якую чытаюць блаславеньне на пачатак месяца; **(šabes-)náxmu** *m* [*s.* ־נחמו] субота пасьля "tišebov"; **šábes-ojps(t)** *n* фрукты або цукеркі, якія даюць дзецям на шабас; **šabes-šabósn** *m* [*s.* ־שבתון] найсьвяцейшая субота, сьвята Ём-Кіпур; **šábes-štex/-štep** *pl.* шырокія штышкі, якія робяць, калі нешта сьпяшаюцца зашыць адвячоркам у пятніцу да надыходу шабасу; **šabes-šíre** *m* [*s.* ־שירה →oz-jošer] субота, у якую чытаюць у сынагозе "bešalax" (16-ты разьдзел Торы, у якой знаходзіцца гімн, які сьпявалі гэбрэі разам з Майсеем пасьля пераходу цераз Чырвонае мора); **šabes-šírelex** *pl.* суботнія сьпевы; **šabes-šúve/-čúve** *m* [*s.* (־)שובה(ת)] субота напярэдадні Ём-Кіпуру; **šábes-tanc** *m*, *pl.* -n/-tenc вясельны танец; **šabes-xazón** *m* [*s.* ־חזון] субота перад "tišebov"; **šabes-zúntik** *m*, -n выхадныя дні (субота-нядзеля)

- a gast af šabes шабасовы госьць (нежаданы/нечаканы); бядняк, запрошаны на сьвяткаваньне суботы
- far šabes! таму! (нецярплівы адказ на пытаньне "far vos?" чаму?)
- gut šabes! *hum.* добры дзень вам у шляпу!
- gut šabes, er iz do! на табе, і ён тут!
- gut šabes, na dir! вось табе і на!
- haltn* ergec šabes недзе спыніцца, каб правесьці/адсьвяткаваць шабас
- max šabes derfun/dermit! спраўляй з гэтым шабас! (аб нявартай рэчы)
- maxn a štox/šnit in šabes arajn працаваць перад самым надыходам шабасу
- maxn šabes рыхтавацца да шабасу, ладзіць шабас
- maxn šabes-štex халтурыць, сьпехам/похапам выконваць работу
- maxn šabes far zix *hum.* адасобіцца, дзейнічаць на ўласны розум
- mit šabes-lošn высакамоўна, напышліва
- šabes-hagodl un kúrc-frajtik дзьве несумяшчальныя рэчы
- az me fort in šabes, zict men in der voxn in der hejm *glxv.* хто мяркуе ехаць у суботу, той у будні сядзіць дома
- cešter nit dem fridn fun hejlikn šabes, /di štile, di hejlike ru; /me zet nox nit šajnen in himl kejn štern, /oj, vart nox a regele cu (H. R.) ня руш міру сьвятой суботы, цішыні, сьвятога пакою; ячшэ ня бачна на небе зьзяньня зорак, ой, пачакай яшчэ трошкі
- haltn šabes iz gringer, vi maxn šabes *glxv.* правесьці шабас лягчэй, чым рыхтавацца да шабасу
- jeder šabes mit zajn mazl *glxv.* кожны шабас мае свой лёс (для бедных)
- nox šabes dinstik (šabes noxn kaltn kugl) *glxv.* пасьля суботы ў аўторак (у суботу пасьля халоднага кугеля; на тое лета, пасьля абеду, гэтакаю парою; калі не цяпер, дык у чацьвер; заўтра аб гэтай пары; на сьвятое ніколі)
- s'iz majn šabes un majn vox гэта мая шабасовая і будзённая (адна вопратка на ўсе выпадкі; у чым у пасьцелі, у тым і ў касьцелі)
- šabes geredt – fir voxn fraj *glxv.* у суботу дамовіліся – чатыры тыдні вольныя (у суботу нельга рабіць справы, таму й даецца чатыры тыдні на адступнае)
- šabes hot a ponem fun jenem velt *glxv.* шабас мае адбітак таго сьвету
- šabes iber der gancer velt! *glxv.* шабас на ўсім сьвеце! (цішыня і спакой)

• "šabes" lernt er, "makes" ken er *glxv.* "шабас" ён вучыць, "скулу" ведае
• šabes-šire varft men di fejgelex kaše *glxv.* на "šabes-šire" кідаюць птушкам кашу (час моцных маразоў)
• šabes-štex haltn nit *glxv.* суботняе шво лёгка парацца
• šabes-xazon kojlet men a hon, šabes-naxmu kojlet men a ku *glxv.* у суботу перад постам рэжуць пеўня, у суботу пасьля посту рэжуць карову
• ver es grejt zix nit on erev šabes, der hot nit af šabes *glxv.* хто не рыхтуецца да сустрэчы шабасу, той сустракае яго з пустымі рукамі (хочаш есьці калачы, не ляжы на пячы)
• zolst zajn gebenčt vi a šabes-lixt – brenen fun ojbn un šmelcn fun untn! *kll.* каб ты быў блаславёны як шабасовая сьвяча – гарэў зьверху і плавіўся ўнізе!

šabes *abr.* **šb"s** *m*, **šames - badxn - sarver** [*s.* שב"ס] 1. служка - бадхэн - кельнэр (тры асобы, неабходныя на вясельлі); 2. скрынка для чаявых для гэтых трох памагатых на вясельлі
• ven cvej mejsim gejen tancn, ver varft in šabes arajn? *glxv.* калі беднякі ладзяць вясельле, хто ж падасьць памагатым?

šablje=sablje *f*, -s [*ukr.* шабля, *p.* szabla] шабля

Šabsaj-Cví [*s.* שבתי־צבי →šebs] Шабсай/Сабатай Ц(э)ві (ілжэмэсія XVII ст.); **šabsaj-cvienik** *m*, -es сябра гэбрэйскай сэкты Шабсая Ц(э)ві; *fig.* бажона, сьвяцец, дэвотка

šac *m abr.* **šeliex-ciber** *m*, *pl.* šlixe-/šluxe-cíber [*s.* ש"ץ=שליח־(ציבור/שליחי־)] прадстаўнік кагалу; чалавек, які моліцца на падмостках; хазан, сынагагальны кантар

šacn [*d.* schätzen] (а)цаніць, ацэньваць; **šac** *m* 1. ацэнка, каціроўка, каштоўнасьць; 2. скарб; **šacer** *m* ацэншчык, знавец, знаўца; **šáciker** прыблізны; **šácbarer** цэнны, каштоўны; **šacung** *f*, -en ацэнка; **šácgelt** *n* частка пасагу, якую маладая перадае сваім сяброўкам або беднякам; **šáckamer** *f*, -n скарбніца; **šácmaj(n)ster** *m*, -s скарбнік, казначэй
• on a šac неацэнны
• šac majner! мой даражэнькі!
• šacn vi geherik emecn належна ацаніць кагосьці (аддаць даніну)

šadaj [*s.* שד"י] адно з імёнаў бога, якое звычайна пішуць на вонкавым баку мэзузы; **šadaj kra sotn** [*s.* קרע שטן] "божа, разарві сатану"; *folk.* замова ад злых духаў (гэтымі літарамі пачынаецца 118-ая псальма [*s.* שד"י קר"ע שט"ן])
• az "šadaj" ken zix on a glezl nit bagejn, vi zol zix der zindiker menč bagejn? *šprxv.* калі бог ня можа абысьціся бяз шклянкі, як жа быць грэшнаму чалавеку (праз шкельца ў мэзузе праглядае слова "šadaj")

šadár *m abr.* **šluxe-derabónen** [*s.* שד"ר=שלוחא־דרבנן] чалавек, якога накіравалі зьбіраць грошы для ешывы, для вучняў у Палестыне альбо на іншыя мэты

ša(d)tn (па)шкодзіць

šadxn=šatxn *m*, *pl.* šadxonim/šatxonim, (-te *f*, -s) [*s.* (-ים)שדכן →šidex] сват, зводнік; **šádxenen=šátxenen** сватаць; **šádxenen zix** (cu emecn) сватацца (да кагосьці); **šadxones=šatxones** *n* [*s.* -ת] сватаньне, сватаўство, зводніцтва; узнагарода за ўдалае сватаўство; **šadxónišer=šatxónišer** сватаўскі, які мае дачыненьне да свата; **šadxónes-gelt** *n* сватаўскія грошы
• šadxenen zix cu a mejdl сватацца да дзяўчыны
• a boxer tor kejn šadxn nit zajn, a hunt tor kejn kacev nit zajn (vi a hunt ken kejn kacev nit zajn, azoj ken a boxer kejn šadxn nit zajn; a boxer a šadxn, a mojd a bobe – kenen ništ zajn) *šprxv.* нельга быць хлопцу сватам, а сабаку мясьніком (а дзяўчыне бабкай) (воўк – не пастух, а сьвіньня – не агароднік; ня вер казлу ў капусьце, а ваўку ў авечках; пусьці воўка да гавец; воўка за пастуха наняць)
• a šadxn iz vi a mil *glxv.* сват як млын (увесь час круціць языком)
• a šadxn muz zajn a ligner *glxv.* сват мусіць хлусіць
• ba a šadxn zajnen ništo kejn miese kales *glxv.* у свата ўсе нявесты прыгожыя
• dem šadxn štroft got nit far zajne ligns *glxv.* бог не карае свата за яго хлусьню
• oj, šadxn, šadxn, a ruex in dir, /oj, vos hostu gehat cu mir, /x'hob dir bacolt far dajne šadxones, /un du host mix gekojlet on a raxmones *flksl.* ой, сват, сват, чорт на цябе, ой, што ты са мной зрабіў, я табе заплаціў за сватаўства, а ты мяне зарэзаў бязь літасьці

šaf *m*, **šafe** *f*, -s, *dim.* **šafke** *f*, -s, **šáfkele** *n*, -x [*p.* szafa, *ukr.* шафа] шафа

šaf *m/n*, *pl.* -n/šefer, *dim.* **šefl** *n*, -ex, **šéfele** *n*, -x [*mhd.* schaf] чоп(ік), вядро

šafír=sapír=safír *m*, -n [*p.* szafir, *s.*] *min.* шафір, сапфір; **šafírener** шафіравы, сапфіравы

šafn* (gešáfn) [*d.* schaffen] 1. (с)тварыць, ствараць; 2. даста(ва)ць, знайсьці; 3. загад(в)аць, заказ(в)аць; **šafn* zix** (mit) распарадзіцца, распараджацца, заняцца, займацца; **šaf** *m* загад; **a šaf ton*** загадаць; **šafer** 1. *m*, *pl.* -s/šafares творца, стваральнік; шафар, шапар, кіроўца, аканом; 2. *m*, -s, (-n *f*, -s) творца, аўтар; **šáferišer=šéferišer** стваральны, вынаходлівы; **šafexc** *n*, -n справа, даручэньне; **šafung** *f*, -en стварэньне; творчасьць; **šáfungs-lejdn** *pl.*, **šáfungs(-)vejen** *pl.* творчыя пакуты
• nit hobn* cu šafn ня несьці ніякай адказнасьці
• šafn* gelt знайсьці грошы (фінансаваньне)
• šafn* (zix) a dire знайсьці (сабе) жытло

šafót=ešafót *m*, -n [*fr.* échafaud] эшафот

-šaft [*d.* -schaft] *suf.* -ства, -цтва, -насьць, -ньне й інш. (утварае назоўнікі жаночага роду са значэньнем зьбіраньня, стану, роду дзейнасьці, выніку, сваяцтва паміж людзьмі й інш.)
• lereršaft настаўніцтва; libšaft любоцьце, каханьне; jesojmešaft сіроцтва

ša(g) *m*, -n [*ukr./v.*] шаг, паўкапейкі (манэта)

šaj [*s.* ש"י] трыста дзесяць (310); **šaj ójlemes/ojlomes** [*s.* ש"י עולמות] *kbl.* 310 міроў, якія падрыхтаваны ў якасьці ўзнагароды для праведнікаў

šajb *f*, -n, *dim.* **šajbl** *n*, -ex [*d.* Scheibe] шайба

šajen zix (cu) [*d.* scheuen] саромецца, быць нясьмелым, баяцца, вагацца; **šájevdiker** сарамлівы, нясьмелы

šajer=šejer *m*, -n/-s [*d.* Scheuer] сьвіран, клець, гумно, восець, асець, ёўня, сушня

šájern [*d.* scheuern] шараваць, чысьціць (мэталёвы посуд); **a šajer ton*** пашараваць, пачысьціць; *fig.* (па)варушыць
• šajern di gehirn варушыць/шавяліць мазгамі

šajét *m* [*p.* sajeta, *it.* saietta] *tekst.* саета, саржа

šajex (zajn*) (cu) [*s.* שייך →šajxes] належаць, датычыцца, мець дачыненьне, быць зьвязаным; **šájexdiker** належны, які належыць, адпаведны, адпавядальны, зьвязаны; які датычыцца, мае дачыненьне [*sin.* geheriker, farbundener]

• ništ šajex не патрэбна, не на месцы
• nit šajex cu farlejkenen грэшнай справай
• šajex cu rejdn/zogn лёгка сказаць, гэта ня жарты, німа словаў
• vos iz do šajex cu redn німа чаго казаць!
• vos iz šajex cu mir што датычыцца мяне

šajges-árje *f* [*s.* שאגת־אריה] ільвіны роў, рык(аньне); назоў вядомай кнігі "пытаньняў-адказаў", а таксама прынятае азначэньне для яе аўтара (Ар'е-Лэйба бэн-Ошэр Гінцбург [*s.* ר' אריה־לייב בן־אשר גינצבורג], Менск, 1695–1785, Мэц)

šajke *f.* -s [*r.*] шайка, банда, хеўра

šajle *f.* -s [*s.* (-ות)שאלה →mešael-] (за)пытаньне (адносна рытуальнай чысьціні), пытаньне да рабіна; **šajles-(u)čúves** *f.* **šu"t** *abr.* [*s.* תשובות(ו)=שו"ת] "пытаньні-адказы", кніга, з дапамогай якой рабін вышуквае адказы на талмудычныя пытаньні; **šajles-horéje** *f* [*s.* שאלת־הריאה] пытаньне аб кошары лёгкага забітай скаціны; **šajles-nóšim** *f* [*s.* נשים־] "жаночае пытаньне"; пытаньне [illegible] законаў аб жаночай чысьціні ў сувязі з мэнструацыяй; **šajles-čúve** *f* [*s.* תשובה־] запытаньне рабіна [illegible] знакамітых рабінаў; **šajle-umájle** *f*, *pl.* šajles-umajles [*s.* (-ות)ומעלה־] якое-небудзь пытаньне (тут, папэўна, "majle" ёсьць скажэньнем слова "majne" [*s.* (-ות)מענה] адказ)

• a šajle! якое пытаньне! ды нягож! атож! чаму не?
• nit maxn kejn šajles-umajles не задаваць ніводнага пытаньня
• paskenen šajles вырашаць (складаныя) пытаньні ў рабіна
• ver es fregt ■ sax šajles, bakumt a sax čuves *šprxv.* хто шмат задае пытаньняў, таго й б'юць

šajn *m.* -en [*d.* Schein] пасьведчаньне

šajne=hešajne=hojšajne *f.* -s [*s.* (-ות)הושענא →Sukes] 1. малітвы, якія чытаюцца ў сёмы дзень Сукэсу/Кучак і якія пачынаюцца і канчаюцца словам "hojšajne" дапамажы ж; 2. галінка вярбы, якую прывязваюць да пальмавай галіны; **(hoj)šajne-rábe** *f* [*s.* רבה־] сёмы дзень Сукэсу

šajnen [*d.* scheinen] сьвяціць, зьзяць; **šajn** *f.* -en сьвет, сьвятло, бляск; **a šajn ton*** зазьзяць, засьвяціць; **šájnbarer** бачны, зьнешні, паказны; **šájnbarkajt** *f* бачнасьць, зьнешнасьць, выгляд; **šájn(end)iker** які сьвеціцца, зьзяе; **šajndl** *n iron.* краса, пекната, аздоба; прыгожая рэч; **šájndling** *m.* -en каштоўнасьць, пэрла; **šájnbild** *m.* -er дыяпазытыў; **šájnflek** *m.* -n блік; **šájnturem** *m.* -s маяк

• derzen* di lixtike šajn убачыць сьвятло (нарадзіцца на белы сьвет)
• lixtike šajn дзённае сьвятло
• maxn šajn (oncindn* di šajn) запаліць сьвятло
• šajnen vi a najer зьзяць як новы
• šajnen vi Xaim Ber af der linker zajt зьзяць як Хаім Бэр на левы бок
• šajnike ojgn вочы, якія зьзяюць
• vi es šajnt (як) відаць/здаецца
• di zun šajnt far alemen/itlexn umzist *glxv.* сонца зьзяе для ўсіх заларма
• di zun šajnt glajx af orem un rajx *šprxv.* сонца зьзяе аднолькава для бедных і для багатых
• es šajnt vi di velt (vi zibn zunen) зьзяе як сусьвет (як сем сонцаў)

šajore *f.* -s [*s.* (-ות)שיירה] рад, шэраг, чарада, караван [*sin.* rej, karavan]

šajsn* (gešisn/gešájst) [*d.* scheissen] *vulg.* сраць, дрыстаць; **šajser** *m vulg.* сруль, бзьдзюль

šajt *m/n.* -n, **šájtholc** *m*, *dim.* **šajtl** *n.* -ex [*d.* Scheit] пален(ц)а

• cores vi holc, un holc nit kejn šajtl (un mit vos ajncuhejcn dem ojvn iz nito) гора як дроваў, але дроваў ні паленца (німа чым распаліць у печы)
• ejn šajtl holc maxt nit varem dem ojvn *glxv.* адным паленам печы не натопіш (адна галавешка і ў печы гасьне, а дзьве і ў полі гараць)
• nit kenen* (cehakn) kejn šajtl ivre ня ведаць гэбрэйскую мову, быць неадукаваным (пень пнём; ні бэ ні мэ, ні кукарэку; ні бэ ні мя, ні божае імя; ні цэ ні бэ)

šájter(hojfn) *m.* -s [*d.* Scheiterhaufen] вогнішча, агонь, касьцёр

• oncindn* a šajter раскласьці вогнішча

šajtl *n.* -en [*d.* Scheitel] *anat.* цемя

šajtl=šejtl *n.* -ex [*mhd.* scheitel] парык (у замужніх жыдовак)

šajxes *f/n.* -n [*s.* (-ן)שייכות →šajex, bešajxes] належнасьць, дачыненьне, адносіны, зносіны, стасункі, стаўленьне, сувязь [*sin.* baciung, farbindung, cuzamenhang]; **hobn* (a) šajxes** (cu) датычыцца; **šájxes-sistem** *f.* -en сыстэма зносінаў

• dos hot cum injen kejn šajxes nit (dos hot kejn šum šajxes nit cum injen) гэта ня мае дачыненьня да справы (справы ня тычыцца)
• ix hob cu dem kejn šajxes nit я ня маю да гэтага дачыненьня (мяне гэта ня тычыцца)
• vos iz šajxes? што здарылася?

šákele *n.* -x [*lit.* šakà] палена, бервяно; *fig.* вавула, цюхцей, мяжджула, лежань

šaken [→ša] шыкаць; **a šake ton*** шыкнуць

šáker-/šeker-vekózev *m*, *pl.* škorim-uxzóvim [*s.* (-ים)שקרובזב] хлусьня і фальш, абсалютная хлусьня (лухта непадсяваная)

šakl=šehákl *m.* -en [*s.* (-ן)שהכל] бласлаўленьне на вадкасьці (акрамя віна), а таксама на зьмешаныя стравы

šakle-vetárje *f.* -s [*s.* (-ס)שקלא־ומריא] абмеркаваньне, дыскусія; перамовы, перагаворы [*sin.* diskusje; farhandlung, unterhandlung]

šakren *m*, *pl.* šakronim, (-te *f*, -s) [*s.* (-ים)שקרן →šeker, šaveseker, mešaker, faršakre(ne)n] ілгун, хлус, манюка [*sin.* ligner]; **šákrenen** ілгаць, хлусіць, маніць; **šákres-maxer** *m.* -s [*s.* שקרות־] ашуканец, ашукальнік, падшывальнік, абакула, круцель, вілаводнік, чмурыла, махціц, манцёль

šal *m.* -n [*d.* Schall] гук (трубы); **šaln** (in) гучаць, трубіць, грымець, раздавацца (аб гуках); **a šal ton*** грымнуць (аб песьні); **šalung** *f* гудзеньне, дудзеньне

šal *m/f.* -n, *dim.* **šalxl** *n.* -ex, **šalik** *m.* -es [*lit.* šãlikas, *eng.* shawl] шаль, шалік

• Vejnt di mame: – Icik, krojn, /ze, um gotes viln, /nem zix mit a šalikl, /kenst zix nox farkiln. (I. M.) Плача маці: – Іцык, багацьце маё, паслухай, дзеля бога, вазьмі шалік, ты ж можаш яшчэ застудзіцца.

šalapáj/šalopáj *m.* -es [*r.* шалопай] шалапай

šaláš *m.* -n [*ukr./r.* шалаш] будан

šalate=salate *f*, **šalátn** *pl.* [*d.* Salat] салата

šalátn-/šalótn-šames *m* [*s.* שמש־] пасланец, пабягач

• vos bistu mir do far a šalatn-šames? у якую авантуру ты мяне ўцягваеш?

š(a)laxmones/šalexmones *m/n* [*s.* שלח־מנות →mišlojex-mones, mešalejex, mešulaxes, mišlaxes, mešulex, šlixes, šlax, šeliex] падарунак, гасьцінец на Пурым; салодкае печыва або

напой, якімі абменьваюцца жыды на Пурым; *hum.* плёткі, якія перадаюцца з вуснаў у вусны

• Ix vel a zemerl dir zingen, gotenju! /Ix vel dir zingen fun dajne jidelex: /lojfn jidelex, mit frejd, baginen. /– Jidelex, gots jidelex, vu lojft ir? /– Vos hejst, vos hejst? /Dos land fun jontev cu gefinen. /– Jidelex, gots jidelex, vos kojft ir? /– Vos hejst, vos hejst? /Dos kojfn mir dox šalexmones, /gots menčn grejtn zix af jontev, /cetrogn mir der velt matones! (M. B.) Я прасьпяваю табе песьню, божухна! Я буду сьпяваць пра тваіх жыдоў: яны радасныя бягуць зранку. – Жыдэ, божыя дзеці, куды вы бяжыце? – Што за пытаньне? Знайсьці сьвяточную краіну. – Жыдэ, божыя дзеці, што вы купляеце? – Што за пытаньне? Божыя дзеці рыхтуюцца да сьвята, купляюць падарункі, каб разьнесьці па ўсім сьвеце!

• mit a kac šikt men (nit) kejn šalexmones (nit) з коткай не пасылаюць падарункі (воўк – не пастух, а сьвіньня – не агароднік; паслалі сабаку па табаку: ані табакі, ані сабакі)

šalef *m* [?] вясёлы, жвавы, спрытны хлопец (няжыд), жэўжык, зухё

šalemójz/šalamójz *m*, -n [?] 1. штуковіна; драбніца, дрэнь, хлам; 2. дзівак, вар'ят; **šalemójzn/šalemej(d)žen/šalemej(d)zen=salemejdžen** мармытаць, бубніць, бурчаць; расьпяваць

šaleš(s)udes *m/n*, -n [*s.* (ך-)שלו(ו)שׁ־סעודות →šoleš, šlišes, mašleš, mešuleš; sude] трэцяя суботняя бяседа (вячэра)

• a proster/voxediker šalešudes *fig.* звычайны чалавек, звычайная рэч

• ix zol azoj visn fun a bejzn šalešudes я гэтага зусім ня ведаю

• Ver s'iz nit geven, /ver s'hot nit gezen /tajere Malkele, /vejst nit, vos s'iz šejn, /vejst nit, vos s'iz xejn, /tajere Malkele – hobn den di imes (umes) /aza šabes-cimes, /tajere Malkele? /Farmogn zejere sudes /aza šalešsudes, /tajere Malkele? (N. Š.) Хто ня бачыў, хто ня ведае Малкелэ – дарагая Малкелэ, хто ня ведае, якая яна прыгожая, хто ня ведае, якая яна прывабная, дарагая Малкелэ – ці можа хто іншы зрабіць такі суботні цымус, дарагая Малкелэ? Ці такую суботнюю бяседу, дарагая Малкелэ?

šalet=čolnt *m/n* [*altfr.* chalt, *šp.* caliente, calido] *kul.* чолнт, мясное рагу (суботняя страва зь мяса і фасолі або бульбы і зеляніны)

šalféj *m*, **šalvie** *f* [*p.* szałwia, *r.* шалфей] *bot.* шалвея, шалфей

šáliven/šáljeven [*p.* szalować, *ukr.* шалювати] шаляваць; **šalivke/šaljevke=šílevke** *f*, -s шалёўка; **šal(j)evanje** *f* шалёўка (дзеяньне)

šalke=salke *f*, -s [*p.* sala] салька, вышкі, мезанін

- šier nit a kinstler ніякі не мастак
- šier nit fargesn (*abr.* šn"f) ледзьве не забыўся, P. S. (postscriptum)

šies *pl.* [*s.* שהיות] забароненыя паўзы ў час маленьня; адклад(в)аньне, адтэрміноўка, затрымка, замарудж(в)аньне, прамарудж(в)аньне, зацяжка, зацягваньне, цяганіна [*sin.* farzamung, oplejgeniš]
- on šies без прамаруджваньня, без зацяжкі
- maxn (lange) šies зацягваць, марудзіць, вагацца
- ništ maxn kejn šies не замаруджваць, не зацягваць

šif *f*, -n [*d.* Schiff] судна, карабель; **šifl** *n*, -ex лодка, човен; **šifer** *m*, -s марак, лодачнік; **šífbarer**, **šífiker** суднаходны; **šífbarkajt** *f*, **šífikajt** *f* суднаходнасьць; **šif(le)n** перавозіць на карабле; **šif(le)n zix** катацца, вазіцца на лодцы; хадзіць на караблі; **šifn** *n* катаньне на лодцы; **šifbojeráj** 1. *n*, **šífbojung** *f* суднабудаваньне; 2. *f*, -en суднабудаўнічая майстэрня, верф; **šífbrux/šífbrox** *m* караблекрушэньне; **šífbroxiker** *m* пацярпелы караблекрушэньне; **šífdek** *m/f*, -n палуба; **šífdiner** *m* матрос; **šíffor** *f* паездка на караблі; **šíffortke** *f*, -s элюмінатар; люк; **šífgang** *f*, **šiferáj** *f/n* суднаходзтва; **šífloder** *m*, -s докер; **šífmaj(n)ster** *m* штурман; **šífslajt** *pl.* экіпаж карабля; **šífžurnal** *m*, -n карабельны журнал
- af der šif на борце карабля
- lajdn* šifbrox пацярпець караблекрушэньне
- a šif mit zojer-milx iz im untergegangen!.. у яго карабель з кіслым малаком затануў!.. (кажуць, калі нехта бярэ да сэрца драбязу)
- er hot onbakumen zorg mitn frišn šif *hum. glxv.* яму ізноў клопат з новым караблём (аб чалавеку, які штораз скардзіцца на новы клопат)
- Lebn jam štejt a šifele, /dos šifele iz nit ful un nit lejdik... /Oj, azelxe mejdele, vos špilt a libe, /farfaln iz zi šojn af ejbik. *flksl.* Каля мора стаіць човен, човен ня поўны і ня пусты... Ой, дзяўчына, якая любіць, загінула назаўжды.
- zajne šifn zajnen im untergegangen! *iron.* ягоныя караблі патанулі!

šifer [*d.* schief] косы, крывы, укосны; **šifkajt** *f* касіна

šifer *m* [*d.* Schiefer] шыфэр, лупняк

šifer *m*, -s [*fr.* chiffre] шыфр, код; **šifrirter** шыфраваны; **šifrírn** (šifrírt) шыфраваць

šifles *n* [*s.* ש(י)פלות →šofl, mašpl, faršoflter] ніз(к)асьць, заняпад, прыніжанасьць, забітасьць, прыгнечаны стан, непаўнаважнасьць, ніжэйшая ступень, благая якасьць [*sin.* niderikajt, gefalnkajt, deršlognkajt]; **šífles-kompleks** *m* комплекс непаўнаважнасьці

šiflod=šuflod *m/n*, *pl.* -n/-leder, *dim.* **šúfledl** *n*, -ex шуфляда

šifxe *f*, -s [*s.* (את-)פחה(י)ש] служанка, служка, служэбніца, прыслужніца, чалядніца, наймічка, нявольніца, раба, прыгоньніца [*sin.* dinst, šklafn]

Šifxe-balšémtov [*s.* שבחי־בעל־שם־טוב], **Šifxe-habéšt** *abr.* [*s.* הבעש"ט] "Хвала (Ізраэля) Бал-Шэмтова"; назоў папулярнай хасыдзкай кнігі

šigoen *m*, *pl.* šigonen/šigojnes [*s.* (ות-/ין-)געון(י)ש →mešuge] вар'яцтва, шаленства, духоўнае хваляваньне, зьбянтэжанасьць, дзівацтва; манія; капрыз, прыхамаць, заскок, дур, дурасьць, дурота [*sin.* mešugas, gajstike cerudetung; manje, mankolje; kapriz]; **šigóen-groz** *n bot.* блёкат

• a menč mit a šigojnes чалавек з заскокамі

• itlexer menč hot zix zajn šigojen *glxv.* кожны чалавек мае сваё дзівацтва

šik *m* [*d.* Schick] шык

šikanírn (šikanirt) [*d.* schikanieren, *fr.* chikaner] прыдзірацца, чапляцца; **šikane** *f*, -s прыдзірка, прычэпка, прычапка

šikec-mešójmem *m* [*s.* שיקוץ־משומם] *pejor.* бажок, ідал, кумір [*sin.* gec]

šíken [*d.* шыкать] шыкаць

šíker *m*, *pl.* šikurim, (-te *f*, -s), **šikornik** *m*, -es, (-nice *f*, -s) [*s.* (ים-/ות-)כור(י)ש →faršikern] п'яніца, п'янюга, выпівоха [*sin.* šinker]; **šíkern** 1. п'янстваваць, піць; 2. *n*, **šíkerkajt** *f*, **šikres** *n* [*s.* ברות(י)ש] п'янства; **šíkerer** п'яны, ап'янелы; зьбянтэжаны, звар'яцелы [*sin.* barojšter, cexušter, cemišter; *ant.* nixterer]; **šíker(erhéjt)** *adv.* сьп'яна, у п'яным выглядзе; **šíkres-fiber** *m med.* белая гарачка

• a farfalener šikornik горкі п'яніца

• fargesn* zix in šikres забыцца ў п'янстве

• haltn* in ejn šikern піць у запой

• mešuge ci šiker вар'ят ці п'яны

• šiker vi goj/pojer/xazer/Simxes-Tojre п'яны як гой/мужык/сьвіньня/Сімхас-Тора (як зямля/гразь/дурны; напіўся/упіўся як батлей/п'яўка/бочка/землямер/сабака/шавец, як камар крыві)

• šikere pojerim п'яныя мужыкі/сяляне

• az cvej zogn – šiker, darf der driter zix lejgn šlofn *glxv.* калі двох/трох скажуць, што п'яны, то кладзіся/лажыся спаць

• az me bacolt nit dem šenker farn branfn, vert men cvej mol šiker *glxv. hum.* хто ня плаціць шынкару за гарэлку, п'янее ўдвая

• bist šiker – to gej šlofn калі ты п'яны – дык ідзі спаць

• der šiker iz geštorbn, der šenker iz fardorbn *šprxv.* п'яніца памёр – шынкар заняпаў

• – Du zolst nit fargesn fun veg šikn brivelex, /a šiker vern du zolst nit fun vajn. /– Ix hob kejn tropn nit nemen in mojl arajn, /oj, šiker nor fun dajn kuš nor zajn. *flksl.* Не забывай з дарогі слаць мне лісты й не п'яней ад віна. – Я ні кроплі ў рот ня браў, я п'яны ад твайго пацалунку.

• fun a šiker in der jugnt vert an oreman af der elter *šprxv.* п'яніца ў маладосьці – жабрак на старасьці (гарцы ўвяduць у старцы; п'яніца – нядбайніца; п'янства да добрага не давядзе; ня пі гарэлкі гарнушкам, бо будзеш з голым брушкам)

• ix bin nox dervajle nit šiker я, між іншым, яшчэ ня п'яны

• ven a šiker hot nit kejn branfn, red er xoč fun branfn *glxv.* калі ў п'яніцы німа гарэлкі, дык ён хоць пагаворыць пра яе (што каму дапякае, той пра тое і гукае; што каму рупіць, той пра тое і жупіць; каму баліць, той і крычыць/студзіць)

šíkeven zix [*p.* szykować się] рыхтавацца

šiklen [*d.* schielen] касіць вачыма, жмурыцца, мружыцца; **šíkldik** *adv.* скоса; **šíkldiker** касы

• šikldike ojgn касыя вочы

šikl-hadás *m* [*s.* שי(י)קול־הדעת →(be)daas, bardaas, bendaas] абдумваньне, (аб)меркаваньне, разважаньне

šikn [*d.* schicken] 1. (nox) пас(ы)лаць; 2. *n*, **šikung** *f*, -en пасылка (дзеяньне); **a šik ton*** (nox) паслаць; **šík-jingl** *m/n*, -ex хлопчык на пабягушках

• šikn zix ejner dem andern пасылаць адзін аднаму, мяняцца

• a hunt šikt a hunt – a rov šikt a rov сабака пасылае сабаку, а рабін – рабіна (з анэкдоту)

• m'ken im šikn noxn malex-hamoves яго можна пасылаць за сьмерцю

• nit azoj šikt zix, vi es redt zix ня так хутка робіцца, як гаворыцца (часта выкарыстоўваецца ў казках)

šikse *f*, -s, *dim.* **šiksl** *n*, -ex, **šíkslke** *f*, -s [*s.* שקצה. שיקסע. *p.* siksa →šejgec, škoc] *pejor.* сікша, дзяўчына-нежыдоўка; нахабная дзяўчына; **šíksenik** *m*, -es бабздыр, бабнік

• az es iz nito kejn mejdn, tanct men mit šikses *glxv.* калі німа дзяўчат, танчаць зь сікшамі (як німа мяса, то і грыб закраса; на бязьлюдзьдзі і дзяк чалавек)

šikres *n* [*s.* קרות(י)ש →šeker, šakren] мана, хлусьня, няпраўда, брахня, фальсыфікацыя [*sin.* lign, felšung]

šikxe *f* [*s.* כחה(י)ש] 1. забыцьцё, амнэзія [*sin.* dos fargesn, amnezje]; 2. каласкі, якія застаюцца ў полі пасьля жніва (паводле Торы іх трэба пакідаць бедным людзям)

šikzal *m*, -n [*d.* Schicksal] доля, лёс, талань

šil=šul *f*, -n [*d.* Schule] 1. школа; 2. сынагога, бажніца; **šiler** *m*, -s, (-n *f*, -s) вучань, школьнік; **šílerišer** вучнёўскі; **šileráj** *f* вучнёўства

šíldern [*d.* schildern] апіс(в)аць, маляваць, адлюстроўваць, адлюстраваць; **šild** *m/f*, -n 1. шчыт, тарча, заслона; 2. вывеска, шыльда; **šílderung** *f*, -en апіс(в)аньне, малюнак, выява, адлюстраваньне; **šílddriz** *fanat.* шчытападобная залоза; **šíldformiker** шчытападобны; **šíldkret/šíldkro(j)t** *m*, -n [*d.* Schildkröte] *zool.* чарапаха

šílemen [*s.* למען(י)ש →mešalem] (з)аплаціць, аплачваць [*sin.* bacoln]

šílevke=šalivke/šaljevke *f*, -s шалёўка

šílge(r)lex *pl.* [?] *kul.* чатырохкутныя або круглыя маленькія піражкі

šíling(er) *m* [*mhd.* schillinc, *p.* szeląg] шэлег (манэта, трэцяя частка польскага гроша)

• (der)kenen* vi a bejzn šilinger ведаць як ліхі шэлег

• nit hobn* kejn cebroxenem šilinger ня мець за душой ані зломанага шэлега

• nit vert kejn cebroxenem šiling(er) зломанага шэлега (тры грошы) ня варты

• a vort iz vert a šilinger, švajgn iz vert cvej *glxv.* слова каштуе шылінг, маўчаньне – два (маўчок – пятачок, а два – грывеньнік; гаварыць – серабро, маўчаць – золата)

• me ken im vi a bejzn šiling(er) *glxv.* яго добра ведаюць як ліхога шэлега (як ліхую шапку; ведаць як аблупленую казу/кабылу, як аблупленага каня/сабаку) [*p.* znaja go jak lichy szeląg]

šiljave=siljave *f*, -s [*p.* sielawa] *zool.* сялява

šilšl *m* [*s.* לשול(י)ש] *med.* панос, дыарэя [*sin.* lojzer mogn, djareje]

šiltn*=šeltn* (gešóltn) [*d.* schelten] (пра)клясьці, праклінаць; **šiltn* zix** сварыцца, лаяцца; **šílteniš** *n*, -n, **šíltvort** *n*, *pl.* -verter, **šiltung** *f* праклён
• šiltn* mit (di) tojte/lecte kloles моцна лаяцца, сьмяротна клясьці (апошнімі словамі)
• šiltn* vi mark-jidene, vi afn fišmark лаяцца як жыдоўка на кірмашы, як на рыбным рынку (крычыць як базарніца; кляне як з ксёнжкі бярэ)
šiluje/šiljue *m*, -s [?] свавольнік, пракуда, гарэзьнік, жэўжык, няўрымсьцік
Šimen [*s.* שמעון] *tnx.* Шыман/Сымон (адзін з дванаццаці сыноў Якуба); назоў роду, які паходзіць ад Сымона
Šimen Bar-Jexáj [*s.* שמעון בר־יוחאי] Шыман Бар-Ехай, вялікі рэлігійны вучоны (II ст.) (паводле традыцыі ён зьяўляецца аўтарам кнігі "Zojer")
Šimenesre/Šimanesre=Šmojne-ésre *f*, -s [*s.* שמ(ו)נה־עשרה] Шмона-Эсра (18 блаславеньняў, якія прамаўляюцца гэбрэямі кожны малебен двойчы)
• ojsgejn* Šimenesre адыходзіць на некалькі крокаў назад пад канец малітвы
• ojsštejn Šimenesre прамовіць блаславеньні (зрушыцца зь месца)
• štejn* Šimenesre прамаўляць блаславеньні (стаяць на месцы)
• curik gejt men nor ba Šimenesre (ba "ojse-šolem") *glxv.* назад дарогі німа (узяўшыся за гуж, не кажы, што ня дуж; калі ўлез у дугу, не кажы "не магу")
• dos lebn iz vi a Šimenesre: me štejt un me štejt, biz me gejt ojs *šprxv.* жыцьцё як "Шмона-Эсра": цягнецца і цягнецца, пакуль ня скончыцца
šimerice=šemerice=cemerice *f bot.* чамярыца, чэмер
šimer(ír)n=šemerírn (šimerírt/šemerírt) [*d.* schimmern] бліскаць, зіхацець, мігцець; **šimer** *m* бляск, бліск(аньне), зіхаценьне, міг(а)ценьне; **šimerírndiker=šemerírndiker** які зіхаціць, бліскучы
• šimerirn far di ojgn мітусіцца ў вачох
• vajs šimern сьвітаць, віднець, днець
šimfen [*d.* schimpfen] лаяцца, сварыцца
• az der rebe šimft, /un az der rebe šimft, /šimfen ale xasidimlex, /bu-bu-bu... *flksl.* калі рэбэ сварыцца, сварацца ўсе хасыдзікі, бу-бу-бу...
šiml *m* [*d.* Schimmel] цьвіль, бросьня, плесьня; **šímldiker** цьвілы, заплясьнелы, забросьнелы; **šimlen** цьвісьці, плесьн(яв)ець, бросьнець
• lang biz cum himl, un štinkt nox šiml *glxv.* далёка да неба і сьмярдзіць яшчэ цьвільлю
šiml *m*, -en [*d.* Schimmel] белы конь
Šimšn-hagíber *m*, -s [*s.* שמשון־הגבור] *tnx.* "сонейка"; Самсон-асілак/-волат (Суд. 13–16)
• kinder megadl cu zajn muz men hobn Kojrexs ašires un Šimšn-hagibers gvure *šprxv.* каб выгадаваць дзяцей трэба мець багацьце Карэя і моц Самсона-волата (дзеці расьціць – ня яйцамі трэсьці)
šin *m/f*, -en [*s.* (שין-)ען] 1. "шын", літара гэбрэйскага альфабэту; 2. лічба 300
• šteln dem pintl afn šin ставіць кропку над "і" ("шын" з кропкай дае літару "сін")
šínbejn *m*, -er [*d.* Schienbein] *anat.* галёначная костка
• der foderšter/grojser/hinteršter šinbejn *anat.* вялікая/малая галёначная костка
šindl *f*, -en/-ex [*d.* Schindel] гонта, драніца; **šíndlener** гонтавы; **šindler** *m*, -s, **šíndl-šleger** *m* гонтар; **šíndndax** *m*, *pl.* -dexer гонтавы дах
• afn bojdem šloft der dax, /cugedekt mit šindelex; /un in vigl ligt a kind, /naket, gor on vindelex (B. Š.) на гарышчы сьпіць дах, крыты драніцай, а ў калысцы ляжыць дзіцё, голае, зусім безь пялюшак
šindn* (gešúndn) [*d.* schinden] лупіць, зьдзіраць; **šinder** *m*, -s скуралуп, жывадзёр, гіцаль; абдзірала; **šinderáj** *f*, -en скуралупства
• šindn* di hojt/fel зьдзіраць/лупіць скуру
• fun ejn oks vestu kejn cvej feln nit šindn *šprxv.* дзьве скуры з аднаго вала не дзяруць
šine *f*, *pl.* šinuim [*s.* (ש(י)נוי(-ים) →mešane, mešune] зьмена, перамена, перайначваньне, пераўтварэньне [*sin.* enderung, iberanderšung]; **šine-mókem** *m* [*s.* מקום־] перамена месца; **šinešém** *m* [*s.* שם־] зьмена імя
šine *f*, -s [*d.* Schiene, *p.* szyna] шына
šinél *m/f*, -n [*r.* шинель] шынэля
šinke *f*, -s [*d.* Schinken, *p.* szynka] шынка
šintez/šintest *m* [?] *euph.* д'ябал, нячысьцік, чорт; прайдзісьвет, прайдоха
šipe *f* [*md.* schüppe] *kort.* віны (віновы)
• er iz ništ kejn šipe zibele ён не абы-хто
• šipe zibele *fig.* "віновая сямёрка"; кволы/недалужны/мізэрны чалавечак, дахляк
šipen [*r.* шипеть] шыпець; **šípediker** *lingv.* шыпячы
šipetilnik *m*, -es [?] падлец, падлюга, падлюка, паганец, паскуда, нягоднік
šipiljave(r)/šipeljave(r)=šepeljave(r)=ščipilave(r)=štipeljave(r) шапялявы
šipn *pl.* [*d.* Schuppen] рыбная луска, лузга, шалуда
šiprigl *m*, -en [*d.* Riegel] завалка, засаўка
šipúj/šipue *m*, *pl.* šipuim [*s.* (ש(י)פוע(-ים) →mešupe] схіл, спуск, строма, круча, уцёс, спад, пакат [*sin.* bargzajt, arophang; bargarop, šifkajt]
šir=šier *m*, *pl.* šiurim [*s.* (ש(י)עור(-ים)] 1. мера, абмежаваньне, мяжа, граніца; 2. урок/лекцыя з Талмуду
šir=šier (nit) *adv.* ледзь(ве), чуць, амаль, блізка (не)
• er iz šir nit gefaln ён блізка не зваліўся
• šir nit ufesn* emecn mit di ojgn уесьціся ў кагосьці вачыма
šir *m*, *pl.* širim [*s.* (שיר(-ים)] песьня, сьпеў, верш [*sin.* lid]; **šire** *f*, -s [*s.* (שירה(-ות) →oz-jošer, sabes-šire] *rel.* хвалебны сьпеў; гімн, які сьпявалі гэбрэі разам з Майсеем пасьля пераходу цераз Чырвонае мора; **Šir-(h)ašírim** *m* [*s.* שיר־השירים] *tnx.* Песьня Песень Саламонава (чытаецца на Пэйсах); *fig.* хвалебны сьпеў, гімн, высокая паэзія [*sin.* lojbgezang, himn, hojxe poezje]; **šir-(h)amájles** *m*, -n [*s.* (המעלות(-ן)־] *tnx.* "песьня ўзыходжаньня"; першыя словы і назоў псальмаў 119–133; *kbl.* паперка, на якой напісана альбо надрукавана 120-ая псальма й іншыя кабалістычныя словы, і якая паводле вераваньня ахоўвае ад злога духу парадзіх і немаўлят (звычайна вісіць у хаце на сьцяне); *fig.* непатрэбная, нічога нявартая папера альбо дакумэнт; *hum.* старая паперка; *hum.* данос, доказ, паклёп, уданьне; **širim-vetišbóxes** *pl.* [*s.* ותשבחות־] хвалебныя гімны і пахвала, перабольшанае ўсхваленьне
• klejner šir-haširim другі верш Песьні Песень (Песьн. 1:2) [→jišokejni]

• zogn šire услаўляць бога

širaim *pl.* [*s.* שיריים] рэшткі, астаткі, аб'едкі, недаедкі; *xsd.* рэшткі ад рабінавага стала; ежа, якую пакаштаваў рэбэ і якая надзяляецца між вучнямі ў якасьці магічнага сродку [*sin.* iberblajbexcer, reštlex]

• xapn širaim (ba) *xsd.* атрымліваць порцыю ежы, якую пакаштаваў рэбэ; *fig.* быць другарадным вучнем, эпігонам

širc=šerc *m*, -n фартух

širemen [*d.* schirmen] засланіць, засланяць, затуліць, затуляць; **šir(e)m** *m*, -s [*d.* Schirm] парасон

širke=sirke *f*, -s [*p.* siarka, *ukr.* сірка] сер(к)а

širme *f*, -s [*d.* Schirm] шырма

šisl *f*, -en, *dim.* **šísele** *f*, -x [*d.* Schüssel] міс(к)а, таз

• (koolše) šisl *hum.* агульная каса, салодкі кавалак, карыта

• a bisl un a bisl vert a fule šisl *glxv.* патрошку, патрошку і поўная міска (па капельцы – мора, па травінцы – стог; снап да снапа і будзе капа; крыха да крыхі – зьбярэцца торба; жменя да жменя, то будзе поўная вярэня)

• beser gut un a bisl, ejder šlext un a fule šisl *glxv.* лепш добрага, але мала, чымся благога, але поўную міску (лепш крышачку, абы добрага; хоць крышку, ды смачнага)

• in šisl kon ništ zajn mer, vi in top *glxv.* у місцы ня можа быць болей, чым у гаршку

• ver esn/zupn ale fun ejn šisl мы ядзім/сёрбаем усе з аднае міскі

• umetum iz gut (hobn) hilf, nor nit ba der šisl *glxv.* усюды добра мець дапамогу, але не каля міскі

• vojl iz dem, vos er kumt cu a grejter šisl *glxv.* добра таму, каго поўная міска чакае

šisn* (gešósn) (af, in, mit) [*d.* schiessen] страляць; **šiser** *m*, -s стралок; **šiseráj** *f/n*, -en 1. страляніна; 2. **šísplac** *m*, *pl.* -plecer стрэльбішча; **šíserišer** які страляе; **šíslox** *m/f*, *pl.* -lexer стрэляная рана; **šíselex-dékelex** *pl.* скрытнічаньне

• a šiser! *vulg.* сруль! бзьдзюль!

• rebe korev! šist ir frier, vorem ir zajt elter братка даражэнькі! страляйце першым, бо вы старэйшы (так некалі сьмяяліся з жыдоўскіх жаўнераў, якія баяліся ўзяць у рукі стрэльбу)

• s'kumt im der far draj jor hengen un fir jor šisn *iron.* яму належыць тры гады вісець і чатыры гады страляць (нічога яму не належыць)

šiše s(e)dorim=šas *m/n*, -n *abr.* [*s.* שישה סדרים=ש(")ס(-ן) →sejder] шэсьць разьдзелаў Мішны і Талмуду; выданьне альбо асобнік Талмуду

šiše-néjres *m* [*s.* שישה־נרות] шасьцісьвечнік [*sin.* zeks-rerndiker lajxter]

šiši *m* [*s.* ש(י)שי] "шосты"; гэбрэй, якога шостым заклікаюць да чытаньня Торы ў сынагозе (адзнака асаблівай павагі) [*sin.* zekster]

• gebn* emecn šiši заклікаць кагосьці шостым да чытаньня Торы

šišim [*s.* ש(י)שים] шэсьцьдзесят (год) [*sin.* zexcik (jor)]

• er iz šojn vajt ariber di šišim яму ўжо далёка за шэсьцьдзесят

šišim riboj [*s.* שישים ריבוא] *mx.* шэсьцьсот тысячаў (600 000), колькасьць гэбрэяў, якія выйшлі з Эгіпту; *fig.* вялікі натоўп; агульны сход усяго народу

šiške *f*, -s [*ukr./r.* шишка] шышка; **šiškevate(r)** шышкаваты, гузаваты

• er iz a grojse/hojxe šiške *fig.* ён вялікая шышка

šite *f*, -s [*s.* שיטה(-ות)] мэтад, спосаб; сыстэма; напрамак, (на)кірунак, тэндэнцыя, школа, дактрына [*sin.* metod; sistem; rixtung, tendenc, šul]

šítern zix [*mhd.* schiteren] рэдка расьці/вырастаць; (па)радзець, (па)радчэць; **šíterer** вадкі, рэдкі; **šíterkajt** *f* вадкасьць; **šítertejg** *n* рэдкае цеста для бліноў

• der ojlem iz šiterer gevorn натоўп парадзеў

• hobn* šitere finger мець дзіравыя пальцы (марна траціць; раскідаць грошы)

• in der elter šitern zix di hor fun kop у старасьці на галаве валасы радчэюць

• šiter un biter рэдкі і горкі

• šiter vi vaser рэдкі як вадá (рэдкае як пойла/невад/рэшата/разгіні)

• azelxe/azojne zol men gedixt zejen, un šiter zoln zej ufgejn *kll.* каб такіх густа сеялі, да рэдка сходзілі (мала ўсходзілі)

šitin-níšmin [*s.* שיתין־נשמין] "шэсьцьдзесят разоў уздыхнуўшы"; мінута, хвіліна [*sin.* a kurce vajle]

šitkóvener [*p.* żyto, *ukr.* жито] жытні, аржаны

• šitkovn brojt аржаны хлеб

šitn* (gešótn/gešít) (mit) [*d.* schütten] сыпаць; **šít(evd)iker**, **šítbarer** сыпкі; **šítevdikajt** *f*, **šítbarkajt** *f* сыпкасьць

• šitn* grojpn in zup сыпаць крупы ў суп

• s'šit a šnej валіць сьнег

• šitn* mit šarfvertlex/fajer/zidlerajen сыпаць жартачкамі /перуны, лаяцца

• šitn* zix vi cigene bobkes, vi zamd (un erd) сыпацца як казіныя гарошкі, як пясок (і зямля) (як труха; сыпле як арэхамі/бобам, як з торбы; балбоча як індык/цецярук)

• es šit zix fun im vi fun a lexerdikn zak *glxv.* зь яго сыплецца як зь дзіравага меха

šitne(r)=sitne(r) [*p.* sitny, *ukr.* ситний] сітны

šiurim *pl.* →ši(e)r *m* [*s.* ש(י)עור(-ים)] 1. мера, абмежаваньне, мяжа, граніца; 2. урок/лекцыя з Талмуду

šive *f* [*s.* ש(י)בעה] "сем" дзён жалобы пасьля пахаваньня родзіча (седзячы ў хаце без абутку на падлозе альбо на нізкім услончыку); **šive-jámim/-jámen** *pl.* [*s.* ־ימים] сем марэй, увесь сусьвет, усе бакі сьвету; **šive-medure(j)-g(eh)énem** [*s.* ־מדורי־גיהנום] сем кругоў пекла; блуканьне па пакутах; **šive-tuve-hoír** *pl.* [*s.* ־טובי־העיר] "сем найлепшых гараджан"; шаноўныя людзі гораду

• zicn* šive (nox) спраўляць сем дзён жалобы

• durxgejn* ale šive medurej gehenem прайсьці праз усе пакуты, блукаць па пакутах

• Af morgn geven iz der himl farcogt, /dos vintl bam tajxl hot kadiš gezogt. /Dos vintl cum erštn – ir tate cu lect, /es hot zix der tate bald šive gezect. (J. A.) Назаўтра неба стала змрочным, вецярок ля ракі спраўляў хаўтуры. Вецярок першы – яе тата апошні, хутка тата ўжо правіў жалобу.

• me zol šojn nox dir zicn šive! *kll.* каб па табе ўжо спраўлялі жалобу!

• ven frejen zix di xejder-jinglex? – az der rebe zict šive *glxv.* калі радуюцца вучні хедара? – калі іх рэбэ сядзіць у жалобе

šiver=šiber *m*, -s [*d.* Schiefer] стрэмка, скабка; **šíver-tovl** *m*, -en шыфер (ліст); **šíverštejn** *m* шыфер (камень)

šives-cíen *f* [*s.* שיבת־ציון] вяртаньне ў Сіён, калектыўнае вяртаньне гэбрэяў у Палестыну

šives-jemej-hamíšte *pl.* [*s.* שיבעת־ימי־המישתה →ševe-broxes] банкеты на працягу сямі дзён пасьля вясельля

šivim [*s.* שב(י)עים] семдзесят (гадоў) [*sin.* zibecik (jor)]; **šivim-lóšn/-lešójnes** [*s.* (ות-)לשונ־] "семдзесят моваў"; шмат моваў усе мовы сьвету; **šivim-úmes** [*s.* אומות־] "сямнаццаць нацыяў": усе народы сьвету; **šivim-mólcajt** *m/f.* -n сьвяткаваньне сямідзесяцігодзьдзя

• er iz šojn ariber di šivim яму ўжо за семдзесят

šivisi *m.* -s [*s.* (ס-)שויתי] надпіс, які звычайна знаходзіцца ў сынагозе насупраць катэдры для кантара (*mx.* "šivisi adojšém lenegdi tomed" [*s.* שויתי ה' לנגדי תמיד] я ўяўляю бога перад сабой кожны раз)

šivje *f* [*s.* שביה] палон, арышт; **šívjenik** *m.* -es палонны, арыштант

šivoser-betámez *m* [*s.* שיבעה־עשר־בתמוז →tišebov] 17-ты дзень месяца тамуза. посны дзень у памяць аб разбурэньні Ерусалімскіх муроў бабілёнцамі (Навухаданосар, 586 г. да н.э.) і рымлянамі (Тытус, 70 г.), пачатак трохтыднёвага жалобнага посту перад "tišebov"

šivre-kéjle *f.* -s [*s.* (ס-)שב(י)רי־כלי] (разь)бітая, (раз)ламаная рэч, разваліна; *fig.* развалюха; кволы, разьбіты, хворы чалавек; **šivre-lúxes** *pl.* [*s.* לוחות־] *tnx.* кавалкі скрыжаляў, якія разьбіў Майсей (Вых. 32:19)

• a šivre-kejle tor men in štub nit haltn *šprxv.* бітую рэч у хаце ня варта трымаць

šivres-(ha)lév ■ [*s.* לב(ה)־ברות (י)ש →lev, belev-, abireslev], **šivrelév** *pl.* [*s.* ש(י)ברי־לב] згрызота, непрыемнасьць, прыкрасьць, сардэчны боль [*sin.* harcvejtik, harc-klemeniš]

šix *pl.* →šux *m*, *dim.* **šixl** *n*, -ex чаравік; **šixales** *pl.* вялікія чаравікі; **šíx-gešeft** *n* гандаль абуткам; **šíxpucer=šúxpucer** *m*, -s чысьцільшчык ботаў

šixt *m.* -n, **šixte=šexte** *f*, -s [*d.* Schicht] слой, пласт; **šíxtiker, šíxtvajzer, šíxtnartiker** слаісты

šixves-zére *f* [*s.* ש(י)כבת־זרע →zere] семявывяржэньне, семязьліцьцё, семясьцяканьне

škaf *m.* -es [*r.* шкаф] шафа

škale *f*, -s [*ukr./r.*] шкала

škalik=skalik *m.* -es [*r.* шкалик] шкалік

škape *f*, -s [*p.* szkapa] кабыла

škarlatín *m*, **škarlatine=skarlatine** *f* [*p.* szkarlatyna] *med.* шкарлятына

škarmic/škarmúc=škormic *m*, -n, **skarmúč** *m*, -es [*it.* cartoccio. *d.* Schirmmütze?] скрутак, пакунак, мяшэчак

škárpet(k)e=skárpet(k)e *f*, -s, **škarpét** *m*, -n [*ukr.* шкарпетка, *p.* skarpetka] шкарпэтка, панчоха

• a škarpetke iz kejn beged nit (skarpetke a beged!) *glxv.* шкарпэткі – не адзежа (брыль не адзежа – сырапоня ня ежа)

• di bobe hot zix gemit in di škarpetkes *hum.* старая баба мае гумор у шкарпэтках (аб чалавеку, якому незаслужана пашчасьціла)

škatulke *f*, -s, **šketl** *n*, -ex, **škétele** *n*, -x [*d.* Schatulle, *p.* szkatula] шкатулка, куфэрак

škie *f.* -s [*s.* (ות-)שקיעה] 1. **škies-haxáme** *f* [*s.* שקיעת־החמה] захад сонца [*sin.* zunfargang]; 2. *fig.* скон, заняпад, дэкаданс [*sin.* zunfargang, zun-untergang; untergang, dekadanc]

• un volt ir zen bam šejdn /in roze škie bejdn, /lipn vi merelex, /ojgn, ful trerelex, /un – beser gorništ rejdn (H. G.) у гадзіну разлукі, з захадам сонца, яе вусны як моркаўкі, вочкі, поўныя сьлязінак і – лепш прамаўчаць

škiv *m*, -n [*r.* шкив] *texn.* шкіў

šklaf/šklav *m*, -n, (-n *f*, -s) [*d.* Sklave] раб, нявольнік; **šklafiše**r нявольніцкі, рабскі; **šklaferáj** *f/n* рабства, нявольніцтва; **šklafn** цяжка працаваць, гнуць сьпіну, гарбаціць; **šklaferišer** рабалепны; **šklaferišk**ajt *f* рабалепства; **šklafn-trajber** *m*, -s, (-ke *f*, -s) гандляр рабамі

škoc *m*, -im [*s.* (שקצים) שק(א)ץ →šikse], **škocim** *pl.* →šejgec *m* [*s.* (שקצים) ש(י)נ(ע)ץ] *pejor.* (вясковы) хлапец-няжыд; нахабны хлапец, нахабнік, басалай, шыбенік, ёлупень; шалапут, гарэза, галуза; **škócim(lex)** *pl. kul.* катлеты (выцягнутай формы); **škócišer** гарэзьлівы, свавольны, гарэзны, распусны, раздурны; **škóceven** дурэць, сваволіць, галузаваць, гарэзаваць

• škocim mit mon *kul.* пячэньне з макам і мёдам

▪ az škocim mit mon iz ■ majxl, iz Pipivke a tajxl *glxv.* калі макавае пячэньне – ежа, дык Піпаўка – рэчка (брыль не адзежа – сырапоня ня ежа)

škode *f*, -s [*p.* szkoda] шкода

škole *f*, -s [*p.* szkoła] (нежыдоўская) школа

školim *pl.* 1. →šekl *m* [*s.* (ים-)שקל] шэк(е)ль (старая гэбрэйская манэта); чальцоўскі ўнёсак у сіянісцкай арганізацыі; 2. *tlmd.* назоў 4-га трактату 2-га разьдзелу (запаветы аб ахвяраваньні грошай у храме)

škontírn (škontírt) [*d.* diskontieren] дыскантаваць, адлічаць з вэксаля; **škontíst** *m*, -n дыскантыст

škorim *pl.* →šeker *m* [*s.* (ים-)שקר →šakren] хлусьня, мана

škórinke=skór(ink)e *f*, -s [*ukr.* скорина] скарынка

• ba mir iz ojx drajcn gildn a funt škorinkes! мне таксама трыццаць залатовак каштуе фунт скарынак! (я таксама бедны!)

škrab/škrob *m*, -es [*p.* szkrab] стаптаны чаравік, атопак; *fig.* слабы, стары, хваравіты, трухлявы чалавек; **škrábediker** слабы, стары, трухлявы

• a škrab ken šojn škrabediker nit vern *šprxv.* стаптаны чаравік больш ня стопчацца

▪ dem hon muz men ojx a škrab onhengen *glxv.* і пеўню трэба атопак навязаць (маладога распусьніка трэба жаніць, каб ён не цягаўся па дзеўках, як певень)

škroben/škraben=skróbe(ve)n [*p.* skrobać, *ukr.* шкребти] скрэбці, шкробаць

škrof(u)l *m* [*d.* Skrofel] *med.* залатуха; **škróflidiker, škrofelične(r)** залатушны

škrup(e)l *n*, -en [*d.* Skrupel] *farm.* скрупул (аптэчная мера вагі =1,296 г)

škure *f*, -s [*ukr./r.*] шкура; **škurnik** *m*, -es шкурнік

• alte škure старая шкура

šlabán *m*, -en, **šlabánt** *m*, -n, **šlabojm** *m*, **slombón** *m*, -es [*p.* szlaban] рагатка, каза, шлагбон, мытня

šláberiker, šlabre(r) [*d.* schlapp, schlabb(e)rig, *mhd.* slaf] слабы, нядужы, кволы, друзлы, вялы (аб мускулах); **šláberik vern*** слабець

šlabizírn (šlabizírt) [*d.* schlabbern?] чытаць зь цяжкасьцямі, запінацца, пыкацца

šlad=slid/sljad/sljed *m*, -n/-es [*p.* ślad] сьлед

šlafer [*d.* schlaff, *mhd.* slaf] слабы, кволы, нядужы, хворы; **šlafkajt** *f*, -n слабасьць, вяласьць, млявасьць, занядужаньне, хвароба

• arumgejn* arum a šlafn хадзіць за хворым

• šlaf vi a getejter/štroj, vi a klejn kind слабы як нябожчык /салома, як малое дзіця

šlager *m*, -s [*d*. Schlager] шлягер

šlájdern [*d*. schlaudern] шпурляць, швыраць; **šlajder** *m/f*, -s кідок; **a šlajder ton*/gebn*** шпурнуць

šlajen *m*, -s [*d*. Schlei] *zool*. лін(ок)

šlajen=šljajen zix шлындаць, валындацца, швэндацца, валачыцца, сноўдацца, бакуняцца

šlajfn*=šlejfn* (geślífn/geślájft) [*d*. schleifen] шліфаваць, тачыць, вастрыць; граніць; **šlájfštejn=šléjfštejn** *m*, -er брусок, тачыла, шліфавальны камень; **šlájfredl** *n* шліфавальнае кола, тачыла

• šlajfn* dos cingl часаць/малоць/мяньціць языком

šlajm *m*, -en [*d*. Schleim] 1. сьлізь, склізь; 2. глей; **šlájmiker** сьлізкі; **šlájmhojt** *f*, -n *anat*. сьлізьніца, сьлізістая абалонка; **šlájmdriz** *f anat*. сьлізістая залоза; **šlájmzup** *f* [*sid*] панцак (суп), крупнік

šlajsn* (geślísn) [*d*. schleissen] абдзіраць, церабіць; **šlájsern šlájserke** *f*, -s жанчына, якая церабіць пер'е (абдзірае [illegible]нага пер'я пух)

[illegible]* geśern церабіць пер'е

[illegible] **zix** (geślíxn/geślájxt) [*d*. schleichen] паўзьці, красьці; **šlajxndiker** поўзкі

šlag *m/n*, *pl*. šlek/šleg, *dim*. **šlekl** *n*, -ex [*d*. Schlag] [illegible] удар (сардэчны), паралюш, падвей; ліха, гора, няшчасьце; 2. злосьнік, злы, зьедлівы чалавек; **šlákririker** разьбіты паралюшам

• er hot bakumen/gekrogn dem šlak яго хапіў удар

• a šlak fun zajn libn nomen мізэрны, убогі чалавек

• a vajb a šlak fartrajbt afile dem malex-hamoves *šprxv*. ліхая жонка прагоніць нават анёла сьмерці

• ajnnemen zolstu a šlak! *kll*. каб цябе паралюш/паляруш трэснуў/узяў! бадай цябе паляруш парушыў!

• bagrobn zolstu vern fun got un fun lajt, /host mir nazičet a vajb a šlak, /a vajb a šlak iz dox zejer biter, /oj, gi' mir an ejce, viazoj vert men fun ir poter *flksl*. каб цябе пахавалі бог і добрыя людзі, ты мне назычыў злую жонку, а злая жонка зусім горкая, ой, дай параду, як мне яе пазбавіцца

šlak=šlag *m/n*, *pl*. šlek/šleg, *dim*. **šlekl** *n*, -ex [*d*. Taubenschlag] галубоўнік, галубятня

šlak *m* [*mhd*. slach] цяльпук, няўклюда, небарака, недарэка; надакучлівы чалавек

šlak *m* [*d*. Schlack] шлак, дзындра

šlák-puronjes *m* [*s*. פּוּרעָנוּת] зьядліўца, зьядлівы чалавек

šlaks *m*, -n, **šláksregn/šlágsregn** *m*, -s [*d*. Schlagregen] лівень, залева, улева; **šláksiker** моцны, спорны (дождж)

šlal (mit) [*s*. שלל] многа, шмат, маса, вялікая частка, колькасьць, сума грошай; процьма, плойма, безьліч, цьма [*sin*. a sax, grojse col, grojse sume]

• a šlal mit gold/gelt безьліч золата/грошай

• a šlal mit najs процьма навінаў

• in vald iz geven a šlal mit švomen у лесе было шмат грыбоў

šlam *m* [*d*. Schlamm] гразюка, ціна, глей, мул; **šlámiker** глеісты, мулаваты

šlándreven=šljondern/šljóndreven [*d*. schlendern, *r*. шляндать, шлёндать] цягацца, шлындаць, валындаць, швэндацца, бадзяцца, валачыцца, сноўдацца, бакуняцца

šlang *m/f*, *pl*. -en/šleng, *dim*. **šlengl** *n*, -ex [*d*. Schlange] зьмяя, вужака, зьмей; **šlángišer**, **šlángiker** зьмяіны, вужачы; **šlángartiker** зьмеепадобны

• a giftike/farbisene šlang *fig*. ядавітая/кусачая зьмяя (пра чалавека)

• papirene šlang папяровы зьмей

• a bejz gevisn iz a šlang in harcn *šprxv*. злое сумленьне – зьмяя ў сэрцы

• a vajb a šlang fartrajbt afile dem malex-hamoves *šprxv*. жонка-зьмяя прагоніць нават анёла сьмерці

• az du antlojfst fun a šlang, zux nit kejn retung ba a volf *šprxv*. калі ты бяжыш ад зьмяі, не шукай паратунку ў ваўка

• dem bestn fun di šleng cebrex dem kop *glxv*. лепшай са зьмеяў раздушы галаву (німа гаду бязь яду)

• nox dem bis fun a šlang iz der štrik śreklex *šprxv*. пасьля ўкусу зьмяі і вяроўка жахлівая (настрашыў мех, дык і торба страшна; напужаная варона і вераб'я баіцца; ратаваны з вады конь і лужыны баіцца; біты сабака кія баіцца)

šlanker [*d*. schlank] спраўны, зладжаны, стройны, ладны, зграбны; **šlankajt** *f* спраўнасьць, зладжанасьць, стройнасьць, зграбнасьць

• a šlank mejdl зграбная дзяўчына

• a šlanke topolje стромкая таполя

• do kumt ir antkegn a boxer a šlanker, /mit lokn mit švarce vi pex; /er flamt mit di ojgn un entfert ir lustik, /un entfert ir: trala-la-la... (Z. Ś.) вось ідзе ёй насустрач спраўны хлопец, з чорнымі як смала кудзеркамі, з палаючымі вачыма, ён весела ёй адказвае: траля-ля-ля...

šlapen=šl(j)open/šljapen шлёпаць

šlax [*s*. שלח →šeliex, š(a)laxmones, šlixes, mešalejex, mešulaxes, mišlaxes, mešulex, mišlojex-mones] "пашлі (ад сябе людзей)"; назоў 37-га разьдзелу Торы (Лік. 13–16) [*sin*. šik]; **šlaxmones=šalaxmones/šalexmones** *m/n* [*s*. מנות־] падарункі, якімі абменьваюцца сябры і суседзі на Пурым

šlaxte=šljaxte *f* шляхта; **šl(j)axetne(r)** шляхетны

šlaxtn [*d*. schlachten] забіваць, рэзаць; **šlaxt** *f*, -n бітва, бой(ка); **šlaxter** *m* разьнік, рэзьнік; **šláxtfe(j)iker** баяздольны; **šláxtfe(j)ikajt** *f* баяздольнасьць; **šláxtfeld** *n*, -er поле бітвы; **šláxtfon** *f* баявы сьцяг; **šláxthojz** *n*, *pl*. -hajzer бойня, разьніца; **šlaxtler** *m*, -s, **šláxtman** *m*, *pl*. -lajt баец, баяка, ваяка, вой; **šláxt-arojsflug** *m*, -n баявы вылет

šléfern [*d*. schläfern] драмаць, усыпляць; **šlefer** *m*, -s, (-ke *f*, -s) вялікі соня (хто любіць доўга спаць); **šléferiker** дрымотны, санлівы, сонны; **šléferikajt** *f* дрымотнасьць, санлівасьць; **šléfiker** снатворны; **šle(f)fil** *f*, -n снатворны сродак

• es šlefert mix мяне на сон хіліць

• az me lejgt zix hungerik, štejt men uf šleferik *śprcv*. хто лажыцца галодным, устае сонны (галоднага вока і сон не бярэ)

šleger=šloger *m*, -s [*d*. Schläger] задзіра, баец; граміла, хулі-ган; **šlegeráj** *f*, -en бойка; **šlégerišer** агрэсіўны, ваяўнічы

šleje *f*, -s [*p*. szleja, *ukr./r*. шлея] шляя; **šlejke** *f*, -s шлейка, падцяжка

šlejer *m*, -s [*d*. Schleier] шлэер, вэлюм, валент, валь, вэлен, вэлян, намітка (у замужніх жыдовак); заслона, апона, накрыўка; **šléjern** вуаліраваць

• aropnemen* dem šlejer fun epes прыўзьняць апону над чымсьці

• nit gefeln* emecn in šlejer *hum*. быць камусьці не да спадобы (у шлэеры)

• šlofn* in šlejer спаць у шлэеры/шапку

• a šlimazlnice šloft in šlejer *glxv*. няхлюйка сыпіць у шлэеры

• er vejst nit, ver es hot im gešlejert *glxv*. ня ведае, хто на яго

вэлюм надзеў (ведае курыную сюсю, дый тую ня ўсю)
• ix hob dix lib draj mol in šlejer *glxv.* ты мне падабаешся, калі на табе вэлюм у тры рэдзі
• – Šviger, a gut helf ajx, /ci di šnur gefelt ajx? /– Gefeln i' zi mir zejer, /a šejne šnur in šlejer. *flksl.* – Свякроў, добрай вам помачы, ці да спадобы вам нявестка? – Яна мне вельмі спадабалася, прыгожая нявестка ў вэлюме.

šléjerl *n*, -ex [*d.*?] *zool.* лічынка

šlejf *f*, -n [*d.* Schlafe] вісок, скронь; **šléjfbejn** *m*, -er *anat.* скроневая костка

šlejf *m*, -n [*d.* Schleife] вузел, бант, пятля, пятліца, пяцелечка, гафтка; **šlejfn** рабіць петлі, вязаць вузлы
• maxn a šlejf завязаць бантам
• maxn a knip mit a šlejf рабіць выкруты/выверты, пусьціцца на хітрыкі

šlejfn*=šlajfn* (gešlífn/gešlájft) шліфаваць, тачыць, вастрыць; **šlejfer** *m*, -s шліфавальнік, тачыльшчык, заточнік; **šléjfštejn=šlájfštejn** *m*, -er брусок, тачыла, шліфавальны камень

šlé(j)gišer [*mhd.* sliht, slach?] выпадковы, хуткі, лёгкі

šlejke *f*, -s [*ukr./r.*] шлейка

šlejm *m* [*d.* Schleim] 1. сьлізь; 2. глей, мул; **šléjmiker** 1. сьлізісты; 2. глеісты, мулаваты

šlejmes *n* [*s.* שלי(י)מות →bišlejmes] дасканаласьць [*sin.* ganckajt, fulkumkajt, perfektkajt]; **šléjmesdiker** дасканалы
• kumen* cu šlejmes дасягнуць дасканаласьці
• di fulste šlejmes верх дасканаласьці

šlejxn [*d.* schleichen] паўзьці, красьціся, падкрадацца

šlek *pl.* →šlak *m*, *dim.* **šlekl** *n*, -ex ліха, удар

šlemíl *m*, (-te *f*) [*d.* Schlemihl, *s.*], **šlemoxem** *m*, (-te *f*) небарака, няўклюда, гаротнік, бядуля, нешчасьлівы чалавек; **šlemílikajt** *f* няшчасьце, нядоля

šléndern zix [*d.* schlendern] зьмяіцца, віцца; бадзяцца, туляцца, сноўдацца, шлёндраць; **šlénderke** *f*, -s курва, шлюндра, шлюха, плёха, вяхотка; **šlénderl** *n*, -ex *bot.* павой, бярозка

šleng *pl.* →šlang *f*, -en, *dim.* **šlengl** *n*, -ex зьмяя, зьмей; **šléng(ld)iker** зьмяісты, зьвілісты, завілісты; **šlenglen=šlinglen zix** зьмяіцца, віцца (аб дарозе/рацэ/дыме), выкручвацца/віцца вужакай

šlepn [*d.* schleppen] цягнуць, цягаць, валачы(ць); везьці, вазіць (на конях); **a šlep ton*** пацягнуць, таргануць; **šlep** 1. *f*, -en, **šlepe** *f*, -s шлейф; 2. *m*, -n торк, штурх, штуршок; **šlépeniš** *n*, -n цеганіна, валока, валакіта; **šleper** *m*, -s, (-ke *f*, -s), **šlepure** *m*, -s жабрак, валацуга; **šleperáj** *n* бадзяньне, валацужніцтва; **šlépediker** валацужны, бадзяжны; **šlép-kraft** *f* цягавая сіла; **šlepetran(t)e** *m*, -s абадранец; **šlép-xaje** *f*, -s [*s.* (חיות-)חיה] уючная жывёла
• kejner hot dix aher nit gešlept far di arbl ніхто цябе сюды не цягнуў за рукаў
• kojm vos er šlept zix (šlept (mit) di fis) ён ледзь ногі цягае
• šlepn emecn ba der hant, far der cung, ba/far di ojern цягнуць кагосьці за руку/язык/вушы
• šlepn vi a kac a mojz цягаць як котка мыш (як воўк ягня, як чорт Марку па пекле)
• šlepn vi an ejzl, vi a ferd цягаць як асёл/конь (як конь на млыне, як вол ярмо, як дурань дзьверы, як мурашка)
• šlepn zix vi a padle/šnek/čerepaxe цягнуцца/паўзьці як падла/смоўж/чарапаха (бы старэчая пуга, як вуж/восень, як муха на сыроватцы/смале)
• a biter/fincter/šlepedik/klogedik mazl af dir! *kll.* каб табе ліхая доля склалася! (доля б цябе ня знала!)
• a gutn šlepn di hint avek *šprxv.* добрае сьцягнуць сабакі
• az ir vet, kinder, dem goles šlepn, /ojsgemúčet zajn, /zolt ir fun di ojsjes trejst/kojex šepn, /kukt in zej arajn! (M. V.) калі вы, дзеці, на чужыне будзеце цягацца, зьняможаныя, вы ў гэтых літарах суцяшэньне/моц знойдзеце, толькі зазірнеце ў іх!
• der dales šlept zix nox noxn oreman (nox dem oreman šlept zix der šlimazl) *šprxv.* нястача/няшчасьце цягнецца за бедаком

šleser *pl.* →šlos *m* 1. *dim.* **šlesl** *n*, -ex замок; 2. замак, замчышча; **šlesl** *n*, -ex маланка (засьцёжка)
• ibergedrejt šlesl *fig.* ветрагон, узьвей-вецер, галуза, гіцаль, пустадом, ветрам падшыты; *hum.* вар'ят

šleser=šloser=šliser *m*, -s сьлесар

šlexter (érgerer, ergster) [*d.* schlecht] злы, кепскі, благі, дрэнны; **šlexts** *n*, -n, **šléxtikajt** *f*, -n, **šléxtkajt** /зло, шкода, ліха, гора, няшчасьце, непрыемнасьць; злы/шкодны ўчынак; **šlextskajt** /злосьць, кепская/благая/дрэнная рыса характару; **šléxtharciker** бессардэчны, бязьлітасны, які мае злое сэрца; **šlext-ójg** *n* злое вока, (с)урок(і)
• a šlexter ksav/simen/menč/nomen/veter благі почырк/знак /чалавек, дрэннае імя/надвор'е
• a šlexts злы чалавек
• biz gor šlext зусім блага
• coln (mit) guts far šlexts плаціць дабром за зло
• do iz gor nit azoj šlext тут ня так ужо й дрэнна
• es halt šlext mit im у яго кепскія справы
• filn zix šlext (mir iz šlext) блага адчуваць сябе (мне блага)
• ojszen* šlext блага выглядаць
• rejdn* šlext блага/няправільна гаварыць
• s'volt nit šlext geven ict epes esn няблага было б цяпер чаго-небудзь паесьці
• šlext farštejn* кепска разумець
• šlext vi der tojt кепска як сьмерць (хоць ты сеўшы плач; хоць тапіся, у пельку/вір галавою, у палонку)
• šlexte kavone злы намер
• šlexte cajtn благі час
• a šlext vajb iz erger vi der tojt *glxv.* кепская жонка горш за сьмерць (добрая жонка – вянец, а ліхая – канец)
• beser dos šlexte fun gutn, ejder dos gute fun šlextn лепш благое ад добрага, ніж добрае ад благога
• epes šlexts vet der ruex nit nemen *glxv.* благога і чорт не бярэ
• gutskajt ton a menč – fartraxt zix nit, šlexts im ton – hundert mol fartraxt zix добрае чалавеку ня ўзгадваецца, благое - сто разоў
• ven me zol got danken far di gutes, volt nit zajn kejn cajt cu baklogn zix af di šlextes *glxv.* калі б трэба было дзякаваць богу за добрае, не ставала б часу, каб паскардзіцца на благое

šlexter [*d.* schlicht, *mhd.* sleht] просты
• šlexte cadek просты цадэк [ץ] (пішацца на канцы слова)

Šlezje *f* [*d.* Schlesien] Сылезія/Шлезія

šlic *m*, -n [*d.* Schlitz] шліц; праразь

šlider *m*, -s [*d.*?] шоры

šliex=šeliex=šoliex *m*, *pl.* š(e)lixim/šluxim [*s.* (שלי(ח)-ים/שלוחים] ганец, пасланец, кур'ер, вястун; прадстаўнік, дэлегат

šlif [*d.* Schliff] 1. *m* шліфоўка, паліроўка; 2. *m*, -n грань; **šlifštejn** *m*, -er тачыльны камень, брусок, тачыла

šlife *f*, -s [*p.* szlifa, *d.* Schleife] эпалет, пагон, палік, наплечнік
šlifke *f*, -s [*p.* szlifa?] спражка на поясе
šlifn [*d.* schlüpfen] сьлізгануць, шмыгнуць
šlik=šluk *m*, -n [*d.* Schluck] глыток
šlile *f*, -s [*s.* (שלילה(-ות)] адмаўленьне
šlimak=šljomak=slimak *m*, -es [*p.* ślimak, *ukr.* слимак] смоўж, сьлімак
šlimer [*d.* schlimm] кепскі, благі, дрэнны; **šlím-šlimazl** 1. *m/n* гора горкае, горкае ліха; 2. *m*, -en абсалютны няўдачнік, няўклюда зь няўклюдаў
šlim(m)azl 1. *m*, *pl.* -en/-s/šlimazolim, (-dike *f*), **šlimazlnik /šlimezalnik/šlimezarnik** *m*, -es, (-nice *f*, -s) [*d.* schlimm, Schlamm, *p.* szlam, szlamazarny, *s.* (שלי(ם־)מזל(-ען/-ס →mazl] няшчасны чалавек, шлімазар(нік), няўмека, няздара, няўдачнік, бруднюха, мурза, лахудра, няўклюда, няклюда, гаротнік, гарун, бядуля; 2. *n*, **šlimázldikajt** *f*, **šlimezalneráj** *f/n* ліха, няшчасьце, няўдача, нешанцаваньне; **šlimázldiker** гаротны, няшчасны, нешчасьлівы, няшчасны, няўдачны, няўклюдны
• [illegible] šlimazl на маё няшчасьце
• [illegible] šlimazl на няшчасьце, на жаль
• [illegible] undz šlimazl нам не шанцуе
• [illegible] majner! гора ты маё!
• [illegible] vandert ojs (ojsgevandert) ale lender un kumt [illegible] (ahejmgekumen) on hojzn un on hemder *šprxv.* няздара вандруе па ўсіх краёх, але вяртаецца дахаты без нагавіц і кашулі
• a šlimazl zol men nit gebojrn vern af der velt *glxv.* гаротніку ня варта было б і нараджацца на сьвет
• az a šlimazl gejt tancn, cerajsn zix ba di klezmers/klezmorim di strunes *glxv.* калі няўклюда ідзе танчыць, рвуцца ў музыкаў струны (як нам жаніцца, то і ноч малая; каму месяц сьвеціць, а ад сіраты хаваецца; беднаму і вецер у вочы)
• az di baleboste iz a šlimazlnice/šlimezalnice, iz di kac a brie *šprxv.* калі гаспадыня – няўмека, дык котка – гаспадыня
• cum šlimazl darf/muz men ojx hobn mazl *glxv.* і няўдачніку патрэбна таксама шчасьце
• di lixtike velt iz fun šlimazl farštelt *glxv.* сьвет зьзяе, але няшчасьце засьціць
• efn brejter uf di tir! (max uf di tir!) – dos šlimazl gejt *glxv.* адчыняй шырэй дзьверы – няшчасьце ідзе (бяда па бядзе як па нітачцы йдзе; калі бяда ходзіць, з сабою ўсю радню сваю водзіць)
• ejnems mazl iz an anderns šlimazl *glxv.* чужое шчасьце – другому ліха (чужая доля пад бокам коле; чужое дабро бярэ за рабро)
• er iz a šlimazl, zol er onhejbn handlen mit taxrixim, volt men ufgehert štarbn *glxv.* няўдачнік – варта толькі яму пачаць гандляваць саванамі, перастануць паміраць людзі
• fun a šlimazl vert men nit rajx *glxv.* ліхам не забагацееш
• šlimazl vet dir feln! ліха табе будзе бракаваць!
• šlimazl, vu(hin) šlepstu/gejstu zix? – cum oreman! *glxv.* ліха, куды ты цягнешся? – да няздары! (куды, воўча, ідзеш? – па сірочае)
• ven a šlimazl kojlet a hon, gejt er, drejt er a zejger, štejt er! *glxv.* калі небарака рэжа пеўня, той уцякае, калі ён накручвае гадзіньнік, той стаіць
šlingen* (gešlungen) [*d.* schlingen] глытаць; **šling=šlung** *m*, -en [*d.* Schlund, *mhd.* slinc, slunc] 1. глотка, зеў; 2. глыток; **šlinger** *m*, -s, (-ke *f*, -s) абжора, жрун, аб'ядайла, прорва; **šlíngerišer** пражорлівы, жарлівы, ненажэрны, ненаедны; **šlíng-un-šláng=šling un šlang** *adv.* пустапасам
• arumgejn* šling-un-šlang *hum.* гультаяваць, лодырнічаць, латраваць (граніць брук; брынды/байбы біць)
• šlingen* emecns verter глытаць чужыя словы
• šlingen* di luft/trern/verter глытаць паветра/сьлёзы/словы
• šlingen* mit di ojgn паглынаць/есьці вачыма
• šlingen* vi hejse lokšn, vi kreplex глытаць як гарачыя локшыны, як калдуны (хапае як воўк/сабака)
• hot fun nign zix vajn gegosn, /hot er zup nox gešlungen, /vunder iber vunder hot mit im getrofn, /ven er hot gezungen, ot azoj gezungen: /ćiri-bim, bam, bam... (L. M.) віно цякло з напеву, ён жа супам давіўся, дзіва дзіўнае зь ім здарылася, калі ён сьпяваў такі напеў: чыры-бім, бам, бам...
• šling štiker, vestu vern diker *glxv.* глытай кавалкі – будзеш тоўсты
šlingl *n*, -ex [*d.* schlingen?] *kul.* лівер, сальцісон
šlinglen=šlenglen zix зьмяіцца, віцца (аб дарозе/рацэ/дыме), выкручвацца/віцца вужакай
šlipjes *pl.* [*p.* ślipka] вочкі, зіркі
šlisarnje *f*, -s [*p.* ślusarnia] сьлясарня
šlisn* (gešlósn) [*d.* schliessen] 1. замкнуць, замыкаць, зачыніць, зачыняць; 2. заключыць, заключаць; завяршаць; 3. *n*, **šlisung** *f*, -en закрыцьцё; заключэньне (дагавору /міру); **šlisl** *m*, -en 1. *dim.* **šlísele** *n*, -x ключ; 2. замчышча; 3. зямля хасыдзкага рэбэ; **šliser** *m*, -sares 1. **šloser** *m*, -s сьлесар; 2. **šlisler** *m* турэмшчык; **šlíslbejn** *m*, -er *anat.* ключыца; **šlíscetl** *m/n*, -en/-ex кантракт, мэмарандум, умова; **šlíslox** *m/f*, *pl.* -lexer замочная шчыліна; **šlíslštejn** *m*, -er замковы камень; **šlísl-vort** *n*, *pl.* verter ключавое слова
• puster šlisl адмычка, адмыкач, зладзейскі ключ
• šlisn* in kejtn закаваць у ланцугі
• zajn* neenter cum šlisl *fig.* быць бліжэй да карыта
• a goldener šlisl efnt ale tirn *glxv.* залаты ключык адчыняе ўсе дзьверы (грошы камень б'юць)
• a harc iz a šlos: me darf dem rixtikn šlisl *glxv.* сэрцу, як і замку, патрэбны сапраўдны ключык
• – Vajl du bist azoj jung un šejn – /vi že kumstu o'dos visn? /– Vajl ix bin nox jung un šejn, /vil ix kejn šidex nit šlisn. *flksl.* – Калі ты гэткая маладая ды прыгожая, скуль жа ты гэта ведаеш? – Пакуль я яшчэ маладая ды прыгожая, я не хачу каб мяне сваталі.
šliš *m* [?] крэпкая гарэлка
šlišes *n* [*s.* שלישות →šalešudes, mašleš, mešuleš, šlojše-] функцыя даручніка, пасярэдніка, фактара, арбітра; арбітраж; закладная сума; залогавы дакумэнт; **šlíšes-gelt** *n* закладная сума; **šliši** *m* [*s.* שלישי] "трэці"; чалавек, якога трэцім паклікалі да чытаньня Торы ў сынагозе (лічыцца асаблівым гонарам); **šlišim** *pl.* →šoleš *m* [*s.* (שליש(-ים)] "трэці"; давераная асоба, якая ўтрымлівае гарантыйную суму або залог; даручнік, паручнік; пасярэднік, фактар, арбітар, трэці бок
• gebn* emecn šliši паклікаць кагосьці трэцім
• mir zajnen šliši bešliši мы траюрадныя браты/сёстры
• ejn ojg in šiši, dos andere in šliši *glxv.* адно вока сюды, другое туды (з аднаею сракаю на ўсіх кірмашох)
šlite *f*, -s [*s.* (שליטה(-ות)] улада, валадарства, уладарства, уладаньне, панаваньне, моц, сіла; узьдзеяньне, уплыў

[*sin.* maxt, heršaft; virkung, haŝpoe]
• hobn* šlite (af, iber) мець уладу, узьдзейнічаць
• ix hob nit kejn šlite iber zej я ня маю ніякай улады над імі
• šlite iber zix прысутнасьць духу

šlite=šelite *abr.* **šejixje leojrex jomim tojvim oméjn** [*s.* שליט"א=שחיה לאורך ימים טובים אמן] дабрага здароўя яму на доўгія гады, амін (ладаецца пасьля імя шаноўнай асобы)

šlitn *m*, -s/-tenes, *dim.* **šlítele** *n*, -x, **šlítl** *n*, -ex; **šlit** *m*, -n [*d.* Schlitten] сані; **šlitlen** 1. (zix) катаць, вазіць (на санях); 2. *n* катаньне (на санях); **šlitveg(s)** *m*, -n санная дарога
• a gut(n) šlitn! a gut(n) šlitveg(s)! гладкай дарогі! зь лёгкім ветрам!; *iron.* адным меней!
• a vogn iz a zejger – a šlitn iz a pejger *glxv.* воз – гадзіньнік, сані – мярцьвяк (так некалі казалі фурманы)
• der vogn rut (zix op) vinter, der šlitn rut (zix op) zumer, dos ferd – kejnmol ništ *šprxv.* воз адпачывае ўзімку, сані адпачываюць улетку, конь – ніколі
• - Ix bin geforn kejn zeks. /– Farvos nit zibn? /– X'hob gekojft a šlitn. /– Vos maxt der šlitn? /– Ver cešnitn, – maxt der šlitn. *flksl.* – Я паехаў у шостае. – Чаму ня ў сёмае? – Я купіў сані. – Як кажуць сані? – Бадай цябе распаласавалі, – кажуць сані.
• nit mit kejn vogn, nit mit kejn šlitn *glxv.* ні возам, ні санямі

šlixim=šluxim *pl.* →š(o)liex/šeliex *m* [*s.* (שליח(-ים/שלוחים] ганец, пасланец, кур'ер, вястун; **šlixes** *n*, -n [*s.* (?-)שליחות] пасланьне, даручэньне; місія, роля; дэлегацыя [*sin.* gang, ufgabe fun a šeliex; misje, role; delegacje]
• ojsfiln dos šlixes выканаць сваю місію
• a malex ken ojx kejn cvej šlixes nit ton *šprxv.* нават анёл за два заданьні не бярэцца (за сем работ бярэцца, а ні адна не ўдаецца; разам дзьвюх сарок за хвост не ўтрымаеш)

šljáfrok *m*, -n, **šlófrok** *m*, *pl.* -rek шляфрок, спальны халат
šl(j)ajen zix [*r.* шляться] шлындаць, валындацца, швэндацца, валачыцца, сноўдацца, бакуняцца
šljak *m*, -n [*p.* szlak] шляк; бардзюр
šljame *f*, -s [*p.* szlamy] шлямкі (зь лісінага футра)
šljape *f*, -s [*ukr./r.*] шляпа, капялюш
šljar(k)e *f*, -s [*p.* szlarka] аборка, фальбона, брыж, валан
šlját(-)fajl *f*, -n [*d.* Schlichtfeile] *texn.* напільнік
šljax *m*, -n [*p.* szlach, *ukr./r.* шлях] шлях
• Un hajnt, az mir gejen bejde špacirn, /der šlax iz gevorn far undz brejt... /Nor der zol kejnmol fun kejn guter velt nit visn, /ver se hot undzer libe cešejdt... *flksl.* І сёньня, калі мы йдзем з табой гуляць, шлях стаў нам шырокі... Хай ня ведае шчасьця той, хто наша каханьне разлучыў...

šljaxote/šljuxote *f* [*p.* słota] слота, слата, хлюпа, халепа
šl(j)axte *f* [*p.* szlachta] шляхта; **šl(j)axčic/šljaxtič** *m*, -es шляхціц; **šljaxecke(r)** шляхетны
• ver es iz gebojrn af groxovine un iz geviklt mit a plaxte, der gehert nit cu der šljaxte *glxv.* хто нарадзіўся на саломе і спавіты хусткай, той ня мае дачыненьня да шляхты (калі худ, ня лезь на кут; калі ў кепскім кажусе, не садзіся на куце) [*p.* grochowina, płachta]

šljáxthubl *m*, -en [*d.* Schlichthobel] *texn.* фуганак
šljomak=šlimak=slimak *m*, -es смоўж, сьлімак
šljóndern/šljóndreven=šlándreven цягацца, шлындаць, валындаць, швэндацца, бадзяцца, валачыцца, сноўдацца, бакуняцца; **šljonder** *m* валацуга, брында, плюндра, лахудра, задрыпа, няхлюй; **šljonderáj** *f/n* нядбаньне, нядбальства, нядбайнасьць, заняханьне, неахайнасьць
šl(j)open/šl(j)apen [*r.* шлёпать] шлёпаць
• šljopen in der blote шлёпаць па гразі

šljox *m*, -es [*ukr./r.* шлюха?] няхлюйка, нязграйка, плюндра
šl(j)ub *m* [*p.* ślub] шлюб
šljupke *f*, -s [*r.*] шлюпка
šl(j)ure/šl(j)ore *f*, -s [*lit.* šliure] пантопля; старызна, непатрэбшчына
šljuxe *f*, -s [*ukr./r.*] шлюха
šljuz *m*, -n, **šluze** *f*, -s [*p.* śluz(a), *mhd.*] шлюз

šlofn* (hot/iz gešlófn) (mit) [*d.* schlafen] спаць; **šlof** *m* сон, сьпячка; **šlófele/šlófenju** *n* спаткі, люленькі; **šlófndiker/šlófediker** які сьпіць, сонны; **šlófloz(ik)er** бяссонны; **šlóflozikajt** *f* бяссоньніца; **šlófalker** *m*, -s алькоў, бакоўка, алькерык; **šlófbank** *f*, *pl.* -benk тапчан; **šlófcimer** *m/n*, -n, **šlóf-xéjder** *m*, *pl.* -xadorim [*s.* (חדר(-ים] спальня; **šlófhajzke** *f*, -s лецішча, да́чка; **šlófhemd** *n*, -er начная сарочка; **šlófkrankajt** *f* сонная хвароба; **šlófmicl** *n*, -en/-ex начны каўпак, каптур; **šlóf(ge)trunk/šlóftrank** *m*, -en снатворнае зельле, снатворны сролак; наркоз; **šlófrok** *m*, *pl.* -rek, **šljáfrok** *m*, -n шляфрок, спальны халат
• der šlof nemt nit emecn сон не бярэ кагосьці
• gej šlofn! ідзі спаць! (ідзі/выбірайся прэч!)
• harter šlof моцны сон
• lejgn šlofn emecn укладваць спаць кагосьці
• lejgn zix šlofn класьціся спаць
• redn* fun šlof гаварыць праз сон
• šlofn* vi a gehargeter/tojter/graf, vi šabes noxn čolnt, vi nox a bod/cimes спаць як забіты/нежывы/граф, як у суботу пасьля мяснога рагу, як пасьля лазьні/цымусу (як пяньку/каноплі/пшаніцу/венікі прадаўшы, як пасьля кірмашу, як маку наеўшыся, як заяц/дзіцятка)
• az der rebe šloft, /un az der rebe šloft, /šlofn ale xasidimlex. /... ... *flksl.* калі рэбэ сьпіць, сьпяць усе хасыдзікі ... ...
• az me hot a sax cu ton, lejgt men zix šlofn (gejt men fun ale meloxes in bod arajn) *glxv.* хто мае шмат чаго рабіць, кладзецца спаць (уцякае ад справаў у лазьню)
• der šlof iz a ganev *glxv.* сон – злодзей
• der šlof iz der bester dokter *glxv.* сон – найлепшы лекар
štadlen *m*, *pl.* štadlonim, (-te *f*, -s) [*s.* (שתדלן-)ים →mištadl, ojsštadlenen, hištadles] хадайнік; **štadlones** *n* [*s.* ות-], **štadlónimšaft** *f*, -n хадайніцтва, заступніцтва, лобі; **štádlenen (zix)** (far) хадайнічаць, лабіраваць
• a krumer šeliex un a štumer štadlen *glxv.* кульгавы ганец і нямы хадайнік (глухі сказаў: паслухаем, а сьляпы – пабачым)
štafét [*d.* Stafette] 1. *f*, -n эстафэта; 2. **štifét** *m*, -n кур'ер, пасланец
• – Toxterl majne, toxterl gold, /es vet kejn štafetn nit šikn; /ix vil nit der kejser zol hobn dix holt, /un flext dir a koltn, a dikn. (S. B.) – Дачушка мая, дачушка залатая, ён не пашле пасланцоў; я не хачу, каб ты цару спадабалася, я спляту табе тоўсты каўтун.
štafír *m*, -n [*d.* staffieren] пасаг
štajer *m*, -n [*d.* Steuer] падатак; **štájern** плаціць падатак; **štájerdiker** падатковы; **štájer-farhalt** *m* затрымка выплаты падаткаў; **štájern-coler** *m*, -s падаткаплацельнік; **štájeropcol** *m*, -n падатковы ўнёсак; **štájer-(uf)moner** *m*, -s зьбіральнік падаткаў
• gebn* emecn cu štajer ахвяраваць камусьці
• ver es git nit cu štajer, tor nit in der kaše arajnšpajn *šprxv.* хто не заплаціў падатак, той ня мае й права ў кашу пляваць (ня можа ўплываць на нешта)
štájern zix [*d.* steuern] перашкаджаць, весьці барацьбу, змагацца
štajfer [*d.* steif] цьвёрды, нягібкі, моцны, тугі; **štajfkajt** *f* цьвёрдасьць, моц, нягібкасьць; **štajfn** умацаваць, умацоўваць, (з)рабіць цьвёрдым; **štájflajvnt** *f/n*, -n цырата
• a štajfkajt in rukn прастрэл у хрыбце
• zajn* štajf ba zix мець гонар
• gezunt un štajf zolstu zajn! *kll.* будзь здаровы і нягнуткі! (каб ты спруцянеў!)
štajg *f*, -n, **štage** *f*, -s [*mhd.* stic] клетка; **štájgbetl** *n*, -ex дзіцячы ложак
• az me zect a fejgele in štajgele arajn, vejst men nit, ci laxt es, ci vejnt es калі птушку садзяць у клетку, невядома, ці сьмяяцца, ці плакаць
štajgn* (iz geštígn/geštójgn/geštájgt) [*d.* steigen] 1. расьці, узрастаць, пад-, узь|няцца, падымацца, узьнімацца; 2. *n* падняцьце, падыманьне, узрастаньне; **štajg** *m*, **štajgung** *f* рост, уздым; **a štajg ton*** узрасьці, падняцца; **štajg** *f*, -n, **štajger** *m*, -s падножка, прыступка; **štájgndiker** узрастаючы, узыходны; **štájgeniš** *f* узыходжаньне; **štájgrod** *f/n*, *pl.* -reder маятнік
• di zun hot a štajg geton сонца паднялося
• štajgn* in emecn ojgn узвысіцца ў чыіхсьці вачох
• durx švajgn ken men nit štajgn *glxv.* моўчкі высока не падымешся
• – Ix vel dir a lejter šteln, /er zol cum himl štajgn, /nor du zolst mir zibn kinder hobn /un a mejdl blajbn. *flksl.* – Я пастаўлю табе лесьвіцу, якая будзе даставаць да неба, але ты мусіш мне нарадзіць сямёра дзяцей, але застацца дзяўчынай.
štajler=štejler [*d.* steil] круты, стромкі, абрывісты; **štajlkajt** *f* крутасьць, стромкасьць
štakét=štaxét *m*, -n штыхет, штыкет
štal *m/f*, -n, *dim.* **štelxl** *n*, -ex [*d.* Stall] хлеў, абора, стайня; **štál-cóje** *f* [*s.* צואה], **štalmist** *n* гной
• a štub darf hobn a baleboste, un a štal darf hobn a balebos *šprxv.* у хаце патрэбна гаспадыня, а ў стайні – гаспадар (без гаспадара гумно плача, а без гаспадыні хата; па гаспадару плача клець, а па гаспадыне плача печ)
• az me ganvet arojs/avek di/dos ferd, farmaxt/faršlist men (eršt) di štal (az me hot arojsgeganvet di ku, maxt men dernox di štal cu) *šprxv.* калі скралі коней/карову, тады толькі замыкаюць стайню (німа чаго замыкаць стайню, як коні пакралі; пасьля бойкі кулакамі ня машуць; як твой бацька коні /валы краў, то хлявы замыкаў, а ты і хаты ня хочаш)
štalne(r)=stalne(r) [*p.* stały, *ukr.* сталий] сталы
štalt *m*, -n [*d.* Gestalt, *mhd.* stalt] кшталт, пастава, постаць;

štáltiker, **štaltne(r)** [*d.* stattlich] кшталтны, выкшталтаваны, самавіты, мажны, статны, станісты, стройны, зграбны, складны, ладны; **štáltnekajt** *f* стройнасьць, зграбнасьць, складнасьць

štam *m*, -en [*d.* Stamm] 1. ствол, пень; 2. род, пакаленьне, племя; **štamen** (fun) паходзіць, быць родам; **štámiker** стваліcты; **štambojm** *m*, *pl.* -bejmer радавод; **štámfoter** *m*, -s продак; **štám-gemejnde** *f*, -s радавая абшчына; **štámgast** *m*, *pl.* -gest заўсёднік, сталы наведвальнік

štamajze *f*, -s, **štém-ajzn** *m*, -s стамеска

štamlen [*d.* stammeln] заікацца, мямліць; мармытаць, лепятаць; **štamler** *m*, -s, (-n *f*, -s) мямля, заіка; **a štaml ton*** прамямліць; **štámldiker** гугнявы, незразумелы; **štámleniš** *f* заіканьне; мармытаньне, лепет

štámp(eve)n, **štampírn** (štampírt) [*d.* stampfen] штампаваць; **štamp** *m*, -n штамп

štand *m*, -n [*d.* Stand] стан; саслоўе; **štándiker** саслоўны; **štándiškajt** *f* саслоўнасьць; **štándhaftiker** устойлівы, трывалы, трывушчы, выносьлівы; **štándhaftikajt** *f* устойлівасьць, трываласьць, выносьлівасьць; **štándpunkt** *m*, -n пункт гледжаньня

- cu štand brengen* рэалізаваць, ажыцьцяўляць
- cu štand kumen* рэалізоўвацца, ажыцьцяўляцца
- nit in štand (cu) ня ў стане
- zajn* in štand (cu) быць у стане

štang *m/f*, -en, *dim.* **štengl** *n*, -ex [*d.* Stange] шост, жардзіна, дронг, кол, друк; стрыжань

- unter di fir štangen пад вясельным балдахінам

štapl *m/f*, -en, **štablje** *f*, -s [*d.* Stufe, *mhd.* stapfel] ступень, прыступка, сходзень; **štáplartiker** ступеньчаты, прыступкавы; **štaplung** *f*, -en *lingv.* ступені параўнаньня (прыметнікаў)

štar *m*, *pl.* štores/štorim [*s.* (שטר-/-ות/-ים)] камэрцыйны /гандлёвы дакумэнт, кантракт, умова; вэксаль [*sin.* komercjeler dokument, kontrakt, farkojfakt; veksl]; **štar-kabóle** *m* [*s.* קבלה] расьпіска, квітак; **štar-mexire** *m* [*s.* מכירה] дакумэнт продажу, купчая; **štar-xoci-zóxer** *m* [*s.* חצי־זוכר] дакумэнт, які дае дачцы права на атрыманьне часткі спадчыны (але паводле закону права на спадчыну мае толькі сын); **štar-xójv** *m*, -es [*s.* (-חוב/-ות)] вэксаль, пазыковая расьпіска

štar *m*, -n [*d.* Star] *zool.* шпак; **štárnšlak** *m*, -n шпакоўня

štarbn* (iz geštórbn) [*d.* sterben] 1. па-, у|мерці, па-, у|міраць, сканаць (здырдзіцца, скалець, апруцянець, галавой налажыць); 2. *n*, **štarb** *m* сьмерць; каюк, садухі, капец; **štárbndiker** які памірае; **štárbiker** сьмяротны; **štárbikajt** *f* сьмяротнасьць

- (azoj) vi ejner vil nit štarbn як памірацьніхто ня хоча
- er štarbt nox ir (štarbn*/ojsgejn* far jenems trit) ён безь яе жыць ня можа
- maxn a štarb *hum.* памерці
- nit štarbn* mitn ejgenem tojt (štarbn* nit mit zajn tojt; er vet mit zajn tojt nit štarbn) памерці не сваёй сьмерцю (ён сваёй сьмерцю не памрэ)
- štarbn* fun dem ken men nit ад гэтага не памрэш
- štarbn* fun/far hunger памірацьз голаду
- štarbn* mit a gringn tojt памірацьлёгкай сьмерцю
- štarbn* vi a cadek/šojte памірацьяк цадзік/дурань
- a gut menčele, er vet mit zajn tojt nit štarbn! *glxv.* харошы чалавечак, гэты сваёй сьмерцю не памрэ!
- a junger ken (štarbn), an alter muz (štarbn) *šprxv.* малады можа (умерці), а стары мусіць
- azoj lang me lebt, tor men nit redn, az me štarbt, ken men nit redn *glxv.* пакуль жывеш, нельга скардзіцца, але калі памрэш, дык ужо ня зможаш
- cu štarbn hot men ale mol cajt *šprxv.* каб памерці, час знойдзецца
- cvej brider zajnen mir gevezn, /hobn mir gehandlt mit bejner; /ejner iz geštorbn, /iz geblibn ejner *flksl.* нас было двое братоў, мы гандлявалі косткамі; адзін памёр, я застаўся адзін
- der menč iz cum štarbn geborn *glxv.* чалавек нараджаецца, каб памерці (раз радзіла маці, раз трэба паміраці; як ні круці, а прыйдзецца памярці)
- esn iz der lebn, štarbn iz der tojt *šprxv.* есьці – жыцьцё, галадаць – сьмерць
- me zol gornit derlebn cu štarbn *glxv.* каб не дажыць да сьмерці (няхай не прыждаць сьмерці)
- mit dem štarbn bagrobt men zix nor *šprxv.* памерлага толькі хаваць
- štarbn štarbt men nor ejn mol *šprxv.* не бываюць дзьве сьмерці, а раз трэба памерці (што будзе, то будзе, ■ дзьве сьмерці ня будзе; адна казе сьмерць)
- štarbt men jungerhejt (in der jugnt), iz es af der elter vi gefinen *glxv. hum.* як памрэш маладым – у старасьці як знойдзеш (памрэш маладым, старасьці не дазнаеш)
- zint dos štarbn iz ufgekumen, iz men mit dem lebn nit zixer *glxv. hum.* з таго часу, як сьмерць зьявілася, зьнікла ўпэўненасьць у жыцьці

štarc *f*, -n, **šterc** *m*, **štercl** *n*, -ex покрыўка, века, вечка

štarc(e)n/štarčen=starčen [*p.* sterczeć, *ukr.* стирчати] тырчэць, тарчаць; **štárc(e)ndiker/štárciker=stárčendiker** адтапыраны, які тырчыць; **štarcik** *adv.* старчаком, тарчма

štarn (af) [*d.* starren] утаропіцца; пільна, уважліва ўзіраца; аслупянець; **štarer** нерухомы, уважлівы (позірк)

štarker [*d.* stark] моцны, сільны, дужы; **štarkn (zix)** мацаваць, мацнець, станавіцца моцным; **štarkajt** *f*, -n моц, сіла; **štarker** *m* асілак, здаравяка, грузчык; **štarkexc** *n*, -n умацавальны напой; **štarkung** *f* падмацаваньне, падмацоўваньне; **štárkhaftiker** трывалы, выносьлівы, загартаваны; **štárkhaftikajt** *f* трываласьць, выносьлівасьць, загартаванасьць, стойкасьць

- (haltn* zix) štark vi an ejerkixl (трымацца) моцна як яечны пірог
- štark haltn* fun zix трымацца з гонарам
- štark – mojer-ajzn моцны – мур-жалеза
- štark vi a mojer моцны/дужы як сьцяна/мур (як камень /камёлак/лёд/сыр/цьвік)
- štark vi a Šimšn-hagiber дужы/моцны як Самсон-асілак (як камень/мур/мядзьведзь/бугай/зубр/вол/тур/чорт)
- štark vi an ibergebrenter štroj моцны як гарэлая салома (моцы як у бурбалцы на вадзе; дужы як сьвіньня ў лужы)
- der štarker iz tomed gerext *šprxv.* дужы заўсёды мае рацыю (хто дужшы, той пружшы)
- in cvejen iz štarker (un in drajen halt es) удвох – мацней (што два, то не адзін)
- me darf zajn štarker fun ajzn трэба быць мацнейшым за жалеза

• ništ der, vos hot, – iz štark, nor der, vos iz štark, – hot *šprxv.* ня той, хто мае – дужы, але той, хто дужы, – мае

štat *m* [*d.* Staat] абычайлівасьць, прыстойнасьць, добрыя паводзіны; раскоша, пышнасьць; **štatne(r)** статны, ладны

• firn (a grojsn) štat шыкоўна жыць (на шырокую нагу)

• haltn* štat прытрымлівацца правілаў прыстойнасьці

štat *m*, -n [*d.* Staat] штат, дзяржава; **štátišer** дзяржаўны; **štátsman** *m*, *pl.* -mener дзяржаўная асоба

• di Farejnikte Štatn Злучаныя Штаты (Амэрыкі)

štat *m* [*mhd.* stât] штат, пэрсанал

• arajnnemen* in štat прыняць у штат

štátiker, **štatečne(r)=stat(eč)ne(r)** [*p.* stateczny] сталы, паважны; **štátkeven=státkeven zix**, **štatečne=statečne vern*** [*p.* statkować] пасталець, зрабіцца сталым; **štatek=statek** 1. *m* стрыманасьць, сьціпласьць; 2. *m*, -es прыстойны, гожы чалавек

štatut=statút *m*, -n [*d.* Statut] статут

štaxern [*d.*?] таргавацца, сьпірацца за цану

štaxet=štakét *m*, -n [*d.* Stacket, *p.* sztachety] штыхет, штыкет; **štaxetn** *pl.* штыкетнік

štegl *n*, -ex, **štégele** *n*, -x [*mhd.* stec] сьцежка

• on a veg un on a šteg прэч без дарогі і бязь сьцежкі

• štegl пратаптаць сьцежку

štejgerišer [*d.*?] гульлівы, жартаўлівы, дурасьлівы, сваволны, гарэзьлівы

štejg=štojg=sto(j)g *m*, -n [*d.* Stiege, *p.* stóg] стог

štejger *m*, -s [*mhd.* steic] (по)быт; манер(а), вобраз, спосаб, лад, чын; **štéjgerišer** (по)бытавы; **a štejger** напрыклад, прыкладам, да прыкладу, на ўзор; **štéjgern** бытаваць; **štéjger-badingungen** *pl.* бытавыя ўмовы; **štéjgerrext** *n* звычайнае права

• af zajn štejger на ўласны манер, уласным чынам

• der štejger lebn лад жыцьця

• frum af zajn štejger набожны на ўласны манер

• haltn* af a štejger трымаць фасон

• šteln af a štejger даводзіць да ладу (накіроўваць на праўдзівы шлях)

• vi der štejger iz як звычайна, як сьлед, як мае быць

• zingen* štejger сьпяваць пэўным чынам

• jeder ejner af zajn štejger *glxv.* кожны на свой лад (хто да чаго здатны)

• vi me štelt zix dem štejger, azoj gejt der zejger *šprxv.* які ў доме лад, так і гадзіньнік цікае

• x'bin arojs fun kriminal /mit a šejnem štejger; /der eršter počontek; /a goldener zejger *flksl.* я адышоў ад крыміналу добрым чынам; першы заробак; залаты гадзіньнік

štejler=štajler круты, стромкі

štejn *m*, -er, *dim.* **štejndl** *n*, -ex [*d.* Stein] камень; **štejner** *pl.* камяні, каменьне, крушня; **štéjne(r)ner** каменны; **štéjn(erd)iker**, **štéjndldiker** камяністы; **štejnen** закідаць каменьнем; **štejneráj** *f*, -en, **štejnbrexeráj** *f*, -en каменяломня; **štéjnbok** *m* 1. горны казёл; 2. *astr.* Казярог; **štéjnbrexer** *m* каменябоец; **štéjnbrux** *m*, **štéjnšlom** *m* шчэбень, друз; **štéjnhaker** *m*, -s, **štéjnteser** *m* каменячос; **štéjnkojl** *m/f*, -n каменны вугаль; **štéjnmil** *f*, -n каменедрабілка; **štéjnodler** *m*, -s *zool.* беркут; **štéjnrajxer** надзвычай багаты; **štéjnšnajder** *m*, -s разьбяр па каменю; **štéjnšlejfer** *m*, -s тачыльшчык; **štéjnšveml** *n*, -ex *bot.* баравік; **štéjn-tkufe** *f*, -s [*s.* (תקופה-)ות] каменны век; **štéjnzalc** *f/n* каменная соль

• elnt vi a štejn адзін як камень (як зязюлька/пень, як месячык у небе, як таполя сярод поля, як былінка ў полі, як кол пры дарозе, як той калок, як колас на іржышчы; ні племя ні роду, як камень у воду)

• gezunt vi a štejn здаровы як камень

• hobn* a harc vi a štejn мець каменнае сэрца

• lejgn emecn štejner afn harcn *fig.* класьці камусьці камень на сэрца

• lejgn emecn štejner in veg (a štejn in veg) ствараць камусьці перашкоду (класьці камень на дарозе)

• nit lozn* a štejn af a štejn не пакінуць каменя на камені

• s'iz mir arop a štejn fun harcn *fig.* у мяне камень з сэрца зваліўся

• štejn rajx жудасна багаты

• a štejn fun der vant zogt ejdes *šprxv.* і камень у сьцяне сьведчыць

• a štejn zol fun dir vern! *kll.* бадай ты скамянеў!

• beser mit xaxomim štejner trogn, ejder mit naronim trinken vajn *šprxv.* лепш з разумнымі цягаць камяні, чымся з дурнямі піць віно

• beser volt af dajn ort a štejn arojs fun dajn mames bojx! *kll.* лепей бы твая маці нарадзіла камень!

• der glajxster veg iz ful mit štejner *glxv.* самы прамы шлях камяністы

• me muz zix a mol maxn dos harc fun štejn *šprxv.* часам трэба рабіць сэрца з каменя

• vu es falt a štejn, treft er dem jidn (treft er mix alejn) *glxv.* калі падае камень, дык трапляе абавязкова на жыда (дык мне на галаву)

• štejner dir afn harcn (in di bejner)! *kll.* каменьне табе на сэрца (у косткі)!

štejn* (mir/zej štejen; iz geštanen) (af, ba, iber, in, far, antkégn, derbáj) [*d.* stehen] стаяць; знаходзіцца ў стане эрэкцыі (пра пэніс); **štéje(n)diker**, **štéjiker** стаячы, які стаіць; **štéjendikerhéjt** *adv.* стоячы; **štéjnvasern** *pl.* (a štéjnendik vaser) стаячыя воды

• di sxojre in a štejn нехадавы тавар

• di šifn štejen in hafn караблі стаяць у гавані

• er štejt af dr'erd ён (моцна) стаіць на зямлі (не залежыць ад грошай) (*vrtš.* "štejn" стаяць – "(ba)štejn" залежаць)

• me stejt kop af kop галава на галаве, яблыку німа дзе ўпасьці

• s'štejen štarke frest стаяць моцныя маразы

• s'štejt a grojse hic стаіць вялікая сьпёка

• štejendik vet mer arajn стоячы болей улезе (адказ на пытаньне: чаму ты ясі стоячы?)

• štejn* af di ejgene fis цьвёрда стаяць на нагох

• štejn* af di kni укленчыць

• štejn* ba der maxt быць у моцы

• štejn* emecn in veg стаяць у кагосьці на шляху

• štejn* glajx vi er volt ajngešlungen a štekn/bezem стаяць як аршын/мятлу праглынуўшы (стаіць як слуп/стоўп /стаўбун/кол/шула)

• štejn* iber emecn стаяць над душой

• štejn* inem cetl знаходзіцца ў сьпісе

• štejn* nox epes імкнуцца за нечым, намагацца чагосьці

• štejn* štol un ajzn far emecn (af emecns zajt) стаяць гарой за кагосьці (на чыімсьці баку; прымаць чыйсьці бок)

• štejn* vi a (lejmener) gojlem стаяць як (гліняны) балван (як лунь/ёлуп/дуб/заткала/калода/на́тарчань/пень, як

пудзіла гарохавае, як дурань/курыца (на вясельлі), як дойная карова)
• štejn* vi an opgešmisener стаяць як пабіты (як у ваду спушчаны, як чапля абмокла)
• vi štejt es mit im? як у яго ідуць справы?

štejsl=štojsl *n*, -en [*d*. Stössel] ступ(к)а
• dos ejberšte fun štejsl таўкач, мяла; *fig. iron*. самы неабходны, значны, важны; вытанчаны, вычварны
• er mejnt, az er iz dos ejberšte fun štejsl ён мяркуе, што ён важная асоба (выскачыў Карпечка з запечка; кавалер – кату па каўнер)

štekn [*d*. stecken] 1. (in) тыкаць, тыцкаць, соваць; 2. тырчаць; **a štek ton*** тыкнуць, тыцнуць, сунуць; **šték-šux** *m*, *pl*. -šix, **štéklač** *m*, -n пантофля, шлёпанцы
• blajbn* štekn in a blote залезьці/завязнуць у гразь
• do muz epes štekn у гэтым нешта ёсьць
• hobn* cu štekn (in epes) быць завязаным, заангажаваным (у нечым)
• štek zix nit! ня сунь носа!
• štekn di noz (in) соваць/утыкаць нос
• štekn emecn a hant сунуць камусьці руку
• štekn geblibener заблёкаваны, зацiснуты
• štekn zix in an anderns ejsek лезьці ў чужую справу

štekn *m*, *pl*. -s/štékenes, *dim*. **štek(nd)l** *n*, -ex, **štékele** *n*, -x [*d*. Stecken, Stock] кій, палка, трысьціна, ляска, друк, віціна; **štekanes** *pl*. вялікія палкі, рагацча; **štékljid** *m*, -n *pejor*. жыд-спэкулянт, махляр, перакупшчык (XIX ст.)
• šteln di frage mitn štekn in der brejt ставіць пытаньне рубам
• šteln emecn šteklex in di reder устаўляць камусьці палкі ў колы
• a štekn hot/mit cvej ekn *šprxv*. у кіі два канцы і абодва б'юць (грошык такі: у ім два бакі; мае манэта і той бок, і гэты; такая справа – і ўлева, і ўправа)
• a štekn in der hant helft mer, vi di cung in mojl *šprxv*. палка ў руцэ больш дапамагае, чым язык у роце (ня слухаеш ківа, паслухаеш кія)
• abi a štekn/kloc, a hunt vet zix (vet men) šojn gefinen *glxv*. абы кій, сабака ўжо знойдзецца (быў бы азадак, а лазы знойдзецца; абы сьпіна – пуга знойдзецца)
• Az a jingele zet an alef, an alef, /zog że, zunenju, viazoj że maxt es? /– Aj-aj. /– Un nox a tajć? Viazoj że maxt es? /– A štekele. /– Vi że maxt es inejnem? /– Aj-aj, a štekele, aj, a štekele, aj-aj, a štekele, zog mir że, zunenju. *flksl*. Калі хлопчык бачыць літару "алэф", скажы ж, сыночак, як жа яна вымаўляецца? – Ай-яй. – А яшчэ патлумач? Як жа яна вымаўляецца? – Палачка. – Як жа сказаць разам? – Ай-яй, палачка. Ай-яй, палачка, скажы ж мне, сыночак.
• az me varft a štekn in der vant, blajbt er štekn *šprxv*. колькі палку ня кідай у сьцяну, яна не пераменіцца (прыбяры сьвіньню хоць у золата, яна ўсё адно ў хлеў пойдзе; жаба і з залатога трона ў балота скача)
• vu me git a vorf a štekn, gefint men a hunt *šprxv*. куды ні кінь палку, трапіш у сабаку (кінь на сабаку, то хлопцу /дзеўцы/пану/сваяку/жыду ў сраку)
• vi du zolst nit varfn dem štekn, hot er alc cvej ekn (blajbt er alc mit cvej ekn) *šprxv*. як ні кідай кій, ён будзе мець два канцы (у кіі два канцы і абодва б'юць)

šteler *m* [*mhd*. steler] злодзей; адважны, сьмелы, газардоўны чалавек; **štelung** *f* крадзеж, крадзьба

štelmax=stelmax *m*, -n [*p*. stelmach] карэтнік, стальмах, сталяр

šteln [*d*. stellen] 1. (па)ставіць, стаўляць; 2. *n* пастаноўка (пытаньня/праблемы); **šteln zix** (far, kegn) ставіцца; стаць, станавіцца; **štel** 1. *m*, -n, **štele** *f*, -s пасада, месца; 2. *m*, -n пастава, постаць; 3. *f*, -n, *dim*. **štelxl** *n*, -ex ларок, кіёск, шапік; 4. *f*, -n вынятка, выпіска, вытрымка (цытата); **šteler** *m*, -s 1. самаўпэўнены чалавек; 2. *plgr*. вярстальнік; **štelnik** *m*, -es прадавец, гандляр, кіяскёр; **štelung** *f*, -en (vegn, cu, benegeje) 1. адносіны, установка; 2. пастаноўка; 3. стаўленьне, пазыцыя, погляд, адносіны (да нечага); **štél-batejlung** *f*, **štél-cegebung** *f* кумаўство, раздача добрых месцаў; **štél(-)fartreter** *m*, -s, (-n *f*, -s) намесьнік
• afn (af der) štel адразу, у момант, зараз жа, тут жа
• der tajx hot zix geštelt рака стала/замерзла
• er zol zix afile šteln afn kop хай ён хоць на галаве стаіць (хоць лопні)
• geštelt vern* in gefar/sakone знаходзіцца ў небясьпецы
• onnemen* a štelung прымаць пазыцыю
• se štelt im gorništ nit op яго анішто ня спыніць
• šteln a frage af/cum bahandlen ставіць пытаньне на абмеркаваньне
• šteln a tiš/štub/denkmol/punkt ставіць стол/хату/помнік /кропку
• šteln af ejn kort (alc in kon) ставіць на адну карту (усё на кон)
• šteln af di fis ставіць на ногі
• šteln af zix узяць на сваю адказнасьць
• šteln alc af di fislex ставіць усё на ножкі
• šteln cum nar выстаўляць дурнем, абдурваць
• šteln emecn in šotn, in a prikre lage ставіць кагосьці ў цень, у прыкрае/няёмкае становішча
• šteln fis пусьціцца наўцёкі/наўцекача (даць драла/драпака/лататы; майнуў, аж пяткі забрашчалі, аж зямля закурэла)
• šteln in (a) sofek ставіць пад сумнеў
• šteln vi a tnaj паставіць умову, абмежаваць умовай
• šteln zix af di fis наступаць на ногі
• šteln zix afn kop, af di kni, af der vax станавіцца на галаву/каленькі/варту
• šteln zix cu der maxt набірацца моцы
• me ken nit visn, vi a veg štelt zix *šprxv*. нельга ведаць, што ў дарозе здарыцца (калі назад вернешся) (так некалі казалі балагулы) (кажан ведае, калі выбіраецца, а ня ведае, калі вернецца)
• vi me štelt zix, azoj štejt men *šprxv*. як паставіш сябе, гэтак і стаяць будзеш

štelnik=stelnik *m*, -es [*sl*.?] соты

štém-ajzn *m*, -s, **štamajze** *f*, -s [*d*. Stemmeisen] стамеска

štempl=stempl *m*, -en [*d*. Stempel] штэмпель, пячатка; кляймо, таўро; **štémpeln/štemplen=stémpljeven** штэмпеляваць, штампаваць, ставіць пячатку; клеймаваць; **štempler** *m* клеймяр; **štémpl-kišele** *n*, -x падушачка з атрамантам для пячаткі

štencl=stencl *m*, -en [*eng*. stencil] трафарэт, шаблён

štender=stender *m*, -s [*d*. Ständer] пюпітар, падпора, месца для чытаньня ў сынагозе

štendik [*d*. ständig] *adv*. заўжды, заўсёды; **šténdiker** пастаянны, сталы, заўсёдашні, заўсёдны; **šténdikajt** *f* працягласьць

• af štendik назаўжды, назаўсёды
• štendik grejt! заўжды гатоў!
• vi štendik як заўжды
• a štendiker grošn iz beser fun a zeltn kerbl *šprxv.* сталы грош лепш за рэдкі рубель (лепш верабей у руцэ, чым жораў пад небам)

štengl *n.* -ex [*d.* Stange] сьцябло, быліна, бадыль; гронка; **šténgldiker** сьцябловы, сьцябліністы; **štenglen zix** ісьці ў сьцябло

štepn [*d.* steppen] с-, пра|шы(ва)ць, (пра)страчыць; **štéper** *m.* -s, (-ke *f.* -s) загатоўшчык, падшывальшчык; **štepexc** *n* прашыўка, прастрочка; **štepl** *n.* -ex шывок, штабок

• štepn a koldre прашываць коўдру

štepsl *m/n.* -en [*d.* Stöpsel] штэпсэль

šter *m.* -n [*d.* Stör] *zool.* асяцёр

štérblexer [*d.* sterblich] 1. *m.* -te сьмертная істота; 2. сьмертны; **štérblexkajt** *f* сьмяротнасьць

štercl *m.* **štercl** *n.* -ex, **štarc** *f.* -n [*d.* Stürze] покрыўка, века, вечкі; **štércele** *n.* -x *bot.* насенная скрыначка

• untern štercl пад сакрэтам
• a top mit a štercl гаршчок зь вечкам (з аднаго гнязда птушкі, які ехаў, такі стрэў; Шэрачка з Машэрачкай)

štern *m.* -s [*d.* Stirn] лоб; **štérnbejn** *m anat.* лобная косьць; **štérnband** *m. pl.* -bender, *dim.* **štérnbendl** *n.* -ex жаночая павязка на лоб (ва Ўсходняй Эўропе); **štérntixl** *n.* -ex хустка на лоб (для замужніх жыдовак ва Ўсходняй Эўропе); **štérn-xolel** *m.* -s [*s.* (ם-)חלל] *anat.* лобная пазуха

• a kuperner štern *fig.* "мядзяны лоб"; нахабнік, басалай
• afn štern ongešribn на лбе напісана
• faršrajb zix afn štern! напішы сабе на лобе!
• hojxer/tifer štern высокі/нізкі лоб
• knejčn dem štern маршчыць лоб

štern *m. dim.* **šterndl** *n.* -ex [*d.* Stern] зорка; **štérndiker** зор(ач)ны, зоркавы; **štérnartiker** зоркаладобны; **Štérnber** *m astr.* Вялікі (малы) Воз; **štérn-grupe** *f.* -s сузор'е; **štérn-kuker** *m.* -s, (-n *f.* -s) летуценьнік; **štérn(-)zeer** *m.* -s, (-n *f.* -s) астраном, астроляг; **štérn-zeeráj** *n* астраномія, астралёгія

• falndiker štern зьнічка
• lajxtn/šajnen vi di štern зьзяць як зоркі
• ir mazl zol lajxtn/šajnen vi a štern in himl (vi zi lajxt un šajnt)! каб яе шчасьце зьзяла зоркай у небе (як яна зьзяе)!

štern [*d.* stören] перашкаджаць, замінаць; **štern zix** саромецца; сь-, у|ціскацца; **šter** *m.* -n, **šterung** *f.* -en загвазднка, перашкода, замін, затрымка; **šterer** *m.* -s, (-ke *f.* -s) шкоднік, парушальнік, дэзарганізатар; **štérerišer** які перашкаджае, замінае

• s'volt nit geštert не пашкодзіла б
• vilst nit, her nit: ober dem andern šter nit! *glxv.* ня хочаш, ня слухай: але другому не перашкаджай!
• Zog ix cu majn mamen: – Her, /zolst mir nor nit štern, /vel ix, mame, ejns un cvej, /bald a fojgl vern... (I. M.) кажу я маці: – паслухай, ты толькі не перашкаджай мне, я хутка, раз-два, абярнуся птушкай...

šterxen=šturx(e)n/šturken=štorxen штурхаць; **šterx=šturx** *m.* -n штуршок

šteške=stežke *f.* -s [*ukr.* стежка, *p.* ścieżka] сьцежка

štet *pl.* →štot *f* горад; **štetl** *n.* -ex [*mhd.* stetel] мястэчка; **štétlšer, štétldiker** местачковы

• a najes in štetl! навіна ў мястэчку! (Амэрыку адкрыў!)
• baštejn* emecns/zajn (dos) štetl (er ken zajn štetl alejn baštejn: ix ken baštejn majn štetl) абыходзіцца бязь іншай /ягонай дапамогі (ён можа пастаяць за сябе; я сам магу справіцца з абставінамі)
• fun ejn štetl з аднаго мястэчка (свае людзі)
• a behejme un a vajb fun ejn štetl zol men nit nemen *glxv.* не купляй зблізка кароўкі, ані з аднаго сяла жонкі (хоць сава, абы з другога сяла)
• vos hert zix in štetl? што новага чуваць? якія навіны?

štexelírn (štexelírt) [*d.* stechen?] дражніць, цьвяліць

štéxeven=stéxeven [?] (аб)мяняць, вы-, аб|меньваць, выменяць; **štex** *m* абмен

štexn* (geštóxn) [*d.* stechen] (за)калоць; **štex** *pl.* →štox *m.* -n 1. укол; 2. штабок, штышок, шывок; **štéx(ed)iker, štéxldiker, štéxndiker** калючы (з калючкамі); **štéxeniš** *f/n.* -n калючасьць; *med.* колікі; **štexer** *m* шыла; **štexl** *n.* -ex, **štéxlke** *f.* -s калючка, джала; **štexler** *m.* -s *zool.* вожык; **štéxbetl** *n.* -ex калючы ложак; **štéx(l)drot** *m/n.* -n калючы дрот; **štéxmeser** *m/n.* -s штылет, кінджал; **štéxvort** *n.* *pl.* -verter, **štexvertl** *n.* -t(e)lex колкасьць, кпіны, шкелі, зьдзек; **štéxvund** *f.* -n колатая рана; **štéxl-xazer** *m.* *pl.* -xazejrim [*s.* (ים-)חזיר] *zool.* дзікабраз

• oplozn* štexvertlex (rejdn* mit štexvertlex) яхіднічаць, пад'ялдыкваць
• štexldike bejmelex калючыя дрэўцы (хмызьняк)
• štexn* emecn (in) di ojgn (mit) калоць камусьці вочы
• štexn* vi mit nodlen/špilkes калоць як іголкамі/шпількамі (як шылам)
• zajn* af štexmesers быць на нажох
• der emes štext di ojgn *šprxv.* праўда вочы коле (праўду людзі ня любяць)
• di jugnt - dos iz a buton fun rojz, di elter – a buton fun štexlkes *glxv.* маладосьць -- бутон ружы, старасьць – бутон калючак
• es štext/bajst im der hober (der hober štext im) *glxv.* яму колецца авёс (яму сьвярбіць, вочы разгарэліся)
• s'zeen zix on di vajse štex *glxv.* шыта белымі ніткамі
• s'zol dix onxapn a štexeniš un a brexeniš, a rajseniš un a bajseniš! *kll.* а бадай на цябе колікі і ламота, скульле і кароста!

štiber *pl.* →štub *f*, *dim.* **štibl** *n.* -ex хата, дом; **štibl** *n.* -ex *xsd.* малельны дом, бажніца; **štibler** *m* хатнік; **štíbl-man** *m.* *pl.* -lajt *xsd.* наведвальнік бажніцы

štiblét=štiv(e)lét *m.* -n [*d.* Stiefelette, *it.* stivaletto] штыблет, бацінак, камаш

štíbreven [?] падтрымліваць, падпіраць; **štibre** *f.* -s падтрымка, падпорка

štícn [*d.* stützen] падтрым(лів)аць, дапамагчы, дапамагаць; **štícn zix** (af) а(ба)перціся, а(ба)піраца; **štic** *m.* -n падтрымка, дапамога, субсідыя; **štice** *f.* -s, **šticung** *f* падтрымка, падтрыманьне, дапамога; **šticer** *m.* -s, (-n *f.* -s) мэцэнат, спонсар; памочнік, памагальнік, памагаты, памагач; **štíciker** падтрымлівальны, дапаможны; **šticpunkt** *m.* -n пункт, кропка апоры

• gefinen* štice знайсьці падтрымку

štidl *n.* -en/-ex [*d.*?] вушак, касяк

štie *f* [*s.* שתיה →šasjenen] трунак, пітво, выпіўка (аб гарэлцы) [*sin.* dos trinken, der trunk]; **štien** п'янствaваць, піць

[*sin.* trinken, šikern]

štifbruder *m*, *pl.* -brider [*d.* Stief-] зводны (няродны) брат; **štífšvester** *f* зводная (няродная) сястра; **štíf(-)foter** *m*, -s, **štíftate** *m*, -s вотчым, айчым; **štífmuter** *f*, -s, **štífmame** *f*, -s мачаха, мачыха, мацоха; **štífzun** *m*, *pl.* -zin пасынак; **štíftoxter** *f*, *pl.* -texter падчарыца, падчарка; **štífkind** *n*, -er пасынак, падчарыца

- a šejne zun – zi varemt vi a štifmame *glxv.* прыгожае сонца – яно грэе як мачаха
- a štifmuter – git šiter *glxv.* мацоха – дае толькі рэдкае (пасынку альбо падчарцы)
- a štifmuter git dem štifkind dos eršte fun tej un dos lecte fun kave *glxv.* мачаха дае пасынку выпаласкі гарбаты і асадкі кавы
- a štifmuter iz a štox-muter *glxv.* мачаха мачахаю (матка дзеці пуша, а мачыха суша)
- azoj vi es iz nito kejn bezem on riter, azoj iz nito kejn gute štifmuter *šprxv.* німа мятлы без прутоў, як і німа добрай мачыхі (хто мачаху мае, той гора знае; не какохне няродная маці па чужому дзіцяці)
- far a guter štifmuter štejt a goldene štul in ganejdn *šprxv.* для добрай мачахі залатое крэсла ў раі (але дагэтуль пустое)
- got iz a foter, dos mazl – a štiffoter *glxv.* бог – бацька, шчасьце – айчым
- in ganejdn iz nox nito kejn štul far a guter štifmuter *šprxv.* у раі яшчэ німа крэсла для добрай мачыхі

štifét=štafét *m*, -n кур'ер, пасланец

štifn [*d.* stiften?] сваволіць, гарэзаваць, дурэць; **štifer** *m*, -s, (-ke *f*, -s) гарэза, свавольнік, шыбеньнік, шалапут, балаўнік, дурасьлівец, шаляніца; **štif** *m* жарт; **a štif ton*** выкінуць штуку; **štiferáj** *f/n*, -en жартаваньне, балаўства, свавольства, дурыкі, шкелі, кпіны; **štíferišer** свавольны, гарэзьлівы, дурасьлівы, гульлівы, раздурны

- štif nit! не дурэй!
- a jingl a štifer hot a gut kepl *glxv.* хлопец-гарэза мае добрую галаву
- štif un lax – un hit op di zax! *glxv.* дурэй і сьмейся – але справу не забывай! (гульня, ды не штодня!; перш папрацуй, а тады патанцуй; была нядзеля і мы дудзелі, цяпер серада – працуй, грамада; калі – на лянок, калі – у танок)

štift *m*, -n [*d.* Stift] штыфт, цьвічок

štig *f*, -n [*d.* Stiege] ступень

štiglic/štiglec *m*, -n [*d.* Stieglitz] *zool.* шчыгол

štik [*d.* Stück] 1. *f/n*, -er, *dim.* **štikl** *n*, -ex штука, кавалак; 2. п'еса; 3. *pl.*, *dim.* **štikl** *n*, -ex штукі, хітрыкі, замашкі, свавольства; **štiklen** крышыць; **štíkervajz/štíklexvajz** *adv.* кавалкамі; **štíkarbet** *f* паштучная работа, зьдзельшчына; **štíkarbeter** *m*, -s, (-n *f*, -s) зьдзельшчык; **štíkram** *f*, -en пяльцы; **štík-štík(e)lex** *pl.* кавалачкі, друзачкі

- a štik cajt трохі часу, невялікі тэрмін
- a štikl glik кавалачак шчасьця
- a štíkl lamdn трохі нешта ведае
- cerajsn* af/in štiker падраць на кавалачкі
- cerajsn* zix af štiker разьдзірацца на кавалкі (распляскацца на блін(ец), як праснак; жылы напінаць; са скуры вылузвацца/выпінацца/прэгчыся)
- er iz a štikl dokter ён нешта разумее ў мэдыцыне
- fojle/hintiše štik подлы, паскудны, ганебны выбрык
- fun ejn štik з аднаго кавалка
- hobn* a štikl deje паўплываць (на нечта)
- max nit kejn štik! не выпрабляйся!
- maxn fojle/trejfene štik круціць, махляваць, штукарыць, фокусьнічаць
- na dir aza min štikl! вось табе і на!
- ot hostu dir aza min stikl! вось табе і маеш!
- prave(t) nit kejn štik! бяз фокусаў!
- rajsn* af/in (štik)-štiklex драць на кавалачкі/друзачкі
- rajsn* fun zix štiker раскайвацца, каяцца
- rajsn* štiker (fun) цягнуць жылы, вымотваць кішкі/духі
- s'falt štikervajz пáдае кавалкамі
- štik in štik кавалак у кавалак (адзін у адзін)
- štik nar! кавалак дурня!
- štikl arbet кавалак працы
- štikl brojt кавалак хлеба (заробак)
- a štikl mazl iz vert merer, vi a ton gold *glxv.* невялікае шчасьце важыць больш за тону золата (за грошы шчасьця ня купіш)
- dos beste štikl/epl xapt ojs der hunt/xazer *glxv.* лепшы кавалак/яблык хапае сабака/сьвіньня
- vos mieser dos štik, alc greser dos glik *šprxv.* чым паскудней кавалак, тым большае шчасьце (хоць бы сьвіньня лыса, абы грошай міса; хоць бы дзеўка ня коха, абы грошай панчоха; хоць бы каза бела, абы пасаг мела)

štik *m*, -es, **štike** *f*, -s [*ukr.* штик, *mhd.* stich] штык, штых

štike *f* [*s.* שתיקה →bištike] маўчаньне; ціха! [*sin.* švajgeniš, dos švajgn; štil!]; **štike kehojdoe (damje)** [*s.* (דמיא) כהודאה] маўчаньне – знак згоды

štikn [*d.* ersticken] душыць, ціснуць, глушыць; **štikn zix** задыхацца, душыцца; **štík(nd)iker**, **štíkediker** душны, удушлівы, задушлівы; **štíkeniš** *n* даўка, удушша, цісканіна, таўкатня; **štíkgaz** *m*, -n удушлівы газ

- štikn zix far gelexter душыцца ад сьмеху
- se štikt im der hust яго душыць кашаль
- a štikik hejser tog душны сьпякотны дзень

štikn [*d.* sticken] 1. вышы(ва)ць, гафтаваць; 2. *n* вышываньне, вышыўка; **štikeráj** *f*, -en, **štikexc** *n* вышыўка

- štikn mit glozperl вышываць бісерам

štíkštof *m* [*d.* Stickstoff] азот

štil *f*, **štilkajt** *f* [*d.* Stille] цішыня, ціша, супакой, суціш, немань; **štiler** ціхі; **štiln** супакоіць, супакойваць, заспакоіць, заспакойваць, уціхамірыць, усьцішыць, угамаваць, суняць, сунімаць; **štíl(ink)erhéjt** *adv.* паціху, спадцішка, ціхачом, цішком, ціхенька, ціхутка; **štílinker** 1. *m*, -te, (-ke *f*) ціхоня; 2. ціхенькі; **štíl(-)lebn** *n*, -s натюрморт; **štílštand** *m*, -n замірэньне, застой, супакой; **štílšvajgn*** 1. маўчаць; 2. *n*, **štílšvajgeniš** *n* глыбокая цішыня, маўчаньне; **štílšvajgndiker** маўклівы, бязмоўны

- a minut štilšvajgn хвіліна маўчаньня
- in a štil у цішы
- redn* štil ціха гаварыць
- štil vi a kotínke/lemele, vi zajdener jungermančik ціхі як котачка/ягня, як далікатны малады чалавек (як ababак, як стаячая вада)
- štil vi šabes noxn tiš, vi in kejver ціха як у шабас пасьля бяседы, як у магіле
- štiler vaser ціхая вадá
- štiln a kind супакойваць/суцяшаць дзіцё

• štiln dem hunger спатоліць голад
• štiln dem vejtik суняць боль
• az me ken nit, vi me vil, muz men zicn štil *šprxv.* калі ня можаш, як хочаш, мусіш сядзець ціха
• az me vil, ken men nit zicn štil *glxv.* хто прагне, спакойна не пасядзіць (ахвота горш няволі)
• far a štil vaser, far a štiln hunt un far a štiln sojne darf/zol men zix hitn *glxv.* трэба сьцерагчыся ціхай вады, ціхага сабакі і ціхага ворага (у ціхім балоце чэрці растуць; ціхая сьвіньня глыбока рые; ціхая вада грэблю рве; маўчалівы сабака з патайка хапае)

štil=stil *m/f.* -n [*d.* Stiel] тронак, калодка; ручка, дзяржанне, дзяржальна, асадка

štilét *m*, -n [*d.* Stilett] штылет, кінджал

štilne(r)=ščilne(r) шчыльны

štim *f*, -en, **štime** *f*, -s [*d.* Stimme] голас; **štimen** 1. (far) галасаваць; 2. ужы(ва)цца, ладзіць; 3. (mit) адпавядаць, сугучэць, супадаць; 4. настройваць; **štímiker** [illegible] звонкі (зычны); **štimung** *f*, -en настрой, гумор; **štimungsfuler** перапоўнены пачуцьцямі, эмацыянальны; **štimbejg** *m*, -n мадуляцыя (голасу); **štímbender** *pl.* галасавыя зьвязкі; **štímbudke** *f*, -s кабіна для галасаваньня; **štímcetl** *m/n*, -en/-ex выбарчы бюлетэнь; **štimkastn** *m*, -s, *dim.* **štímkestl** *n*, -ex скрынка/урна для галасаваньня; **štímloz(ik)er** безгалосы, маўклівы; **štímrext** *n* права голасу

• a lid af cvej štimen песьня на два галасы
• opgebn* di štim галасаваць, аддаваць голас
• štim af jo/nejn голас за/супраць
• zajn* ba der štim быць у голасе
• Ani holaxti bajaar vešomati bas-kol. /Dos hejst: ix bin gegangen in vald /un derhert a štim, avade fun himl: /- Katjerina molodica, podi sjuda! *ftksl.* гэта азначае: я ішоў па лесе і пачуў голас, безумоўна, зь неба: – Кацярына-маладзіца, хадзі сюды
• zej štimen vi a kac un ■ hunt *glxv.* яны ладзяць/жывуць /любяцца, як кот з сабакам (каты дзяруць)

štimp=štump *m*, -n затрымка, (пера)шкода, страта

štimure=štumure *f*, -s *pejor.* маўклівец, маўклівы, неразгаворлівы чалавек

štinke=stinke *f*, -s [*p.* stynka, *d.* Stint, Stinksalm] *zool.* стынка, корушка

• maxn a magazin/fabrik fun gehakte/gezeente štinke-knejdlex рабіць краму/фабрыку з рубленых клёцак са стынкі (рабіць справу на пустым месцы)

štinken* (geštunken) (mit) [*d.* stinken] сьмярдзець; **štinkexc** *n* смурод; **štinker** *m*, -s, (-n *f*, -s) сьмярдзючка, сьмярдзючы чалавек; **štínke(n)diker** сьмярдзючы; **štínkfas** *f/n*, *pl.* -feser *fig.* сьмярдзючая бочка (пра чалавека)

• štinken* vi txojr сьмярдзець як тхор/тхарына (як здыхліна/падла/казёл, як сабака псінаю)
• az di baleboste iz a štinkern, iz di kac a fresern/našern *glxv.* калі гаспадыня няхлюйка, дык і котка ненажэра
• der fiš štinkt fun kop *šprxv.* рыба сьмярдзіць ад галавы
• fun šiker un fun šenker štinkt mit branfn *glxv.* ад п'яніцы і ад шынкара сьмярдзіць гарэлкай

štipeljave(r)=šepeljave(r) шапялявы

štir *m* [*d.* Stier] бык

štircn [*d.* stürzen] скінуць, скідаць, зьвергнуць, зьвяргаць

štirdes=stirdes *n* [*lit.* spirtis?] упартасьць, свавольства, нораў

štirnen/štíre(ne)n [*d.* stieren] вылупіць (вочы), пільна ўглядацца

štirnik *m*, -es [*p.* sternik, *ukr./r.* стерно] стырнік, стырнавы, плытнік, плытагон

štitíc=štutíc *m*, -n скрынка, футарал

štiv(e)lét=štiblét *m*, -n штыблет, бацінак, камаш

štivl *m/pl.* [*d.* Stiefel] бот; **štival(j)es** *pl.* [*it.* stivale] вялікія боты, чобаты; **štivl-pucer** *m*, -s чысьцільшчык ботаў

• linker štivl левы бот (тавар, які не прадаецца); *fig.* няздольны, няздатны чалавек
• az me zict in der hejm, cerajst men nit di štivl (kejn štivl) *šprxv.* седзячы ў хаце, боты не парвеш
• di štivl viln esn *glxv.* боты хочуць есьці (бот разявіў зубы – есьці/кашы хоча)
• me derkent dem porec nox di štivl *glxv.* знаць пана па халявах (шляхціц па бабцы, пан па тытуле, дабрадзей па шкатуле)
• zaj mir nit kejn feter un cerajs mir nit di štivl *glxv.* ня будзь маім дзядзькам і не дзяры мае боты (ня гладзь і не дзяры, і не кусай)

štix [?]

• xasene gehat af gix un geblibn in štix *glxv.* ажаніўся хутка, а ўліп назаўсёды (тры дні гайды/лады, а на век бяды; ажаніцца ня ўпіцца; жонку бяры не на год, а на век; ажаніўся той перамяніўся; заручыўся – усцаўся, ажаніўся – усраўся; а як воўча ажаніла, так і вушы апусьціла)

štixl *n*, -ex [*d.* Schtich] гравюра (на мэтале); разец

štóciker [*d.* stotzig] круты, абрывісты, прыткі, стромкі, стромы; **štócikajt** *f* крутасьць, стромкасьць

štof *m*, -n [*d.* Stoff] 1. рэчыва, субстанцыя, матэрыя; 2. тканіна, матэрыя, матэрыял; **štófener** з матэрыі/тканіны, шаўковы, ядвабны; **štóflexer** рэчыўны; **štófn-ojstojč** *m* абмен матэрыі

štof *m*, -n [*nd.* Stôf] штоф; мера аб'ёму (дзясятая частка вядра; 1,54 л)

štojb *m/n*, -n, *dim.* **štojbl/štajbl/štejbl** *n*, -ex, **štéjbele=štójbele** *n*, -x [*d.* Staub] пыл; **štójbiker** пыльны; **štojbn=štejbn** пыліць; **štójbartiker** пылападобны, пылаваты; **štójb(-)fodem** *m*, *pl.* -fedem/-fedim *bot.* тычынка; **štójb-kišele** *n*, -x *bot.* пыльнік; **štójbzojger** *m*, -s, **štójbmašin** *f*, -en пыласос; **štójbšufl** *m/f*, -en, **štójbšajvele** *n*, -x шуфлік для сьмецьця

štojg=štejg=sto(j)g *m*, -n [*p.* stóg, *r.* стог] стог

• štojgn hej стагі сена

štojnen (fun) [*d.* staunen] (зь)дзівіцца, зьдзіўляцца; **štójnendiker** зьдзіўлены; **štojnung** *f* зьдзіў(леньне), уражаньне

• s'nemt ba im op dos lošn far štojnung ён губляе мову ад зьдзіўленьня

štojs *m*, -n [*d.* Stoss] стос (паперы)

štojsn* (geštójsn) [*d.* stossen] 1. пхаць, штурхаць, басьці, бароць; 2. таўчы; **štojsn* zix** 1. штурхацца, пхацца; 2. (az) здагад(в)ацца, скеміць, сьцяміць; **štojs** *m*, -n штуршок, штурхель, высьпятак, грымак, кухталь; парыў (ветру); **a štojs ton*/gebn*** штурх(а)нуць, пхнуць; **štojser** *m*, -s штурхач, таўкач; **štójseniš** *f/n*, -n, **štojseráj** *f* штурханіна; **štojsl=štejsl** *n*, -en ступ(к)а; **štójsndiker** бадлівы, барлівы; **štójsvajz** *adv.* чэргамі (страляць)

• me ken zix štojsn можна сьцяміць
• štojsn* vaser in a štejsl таўчы ваду ў ступе

• a šiker badarf men nit cu štojsn (er štojst zix alejn) *glxv.* п'янага ня трэба штурхаць (ён сам сябе штурхае)
• az dos kind švajgt, štojst zix di muter nit, az es iz hungerik *šprxv.* дзіцё маўчыць, маці не схамянецца, што яно галоднае (дзіця ня плача, маці не здагадаецца)
• er štojst zix mikojex štojs *glxv.* ён скеміў, адкуль штурхель (аб чалавеку, які лічыць, што толькі ён здагадаўся, у чым справа)
• er štojst zix, vu der fidl hengt *glxv.* ён скеміў, дзе скрыпка вісіць (дурань)
• štojs (az me štojst) dem nar in (a) štejsl, zogt er, az me mejnt gor nit im, nor dem fefer *glxv.* калі таўкуць дурня ў ступе, ён кажа, каб ніхто блага не падумаў, што гэта зусім ня ён, а перац (дурня б'юць, а ён кажа: у царкву вядуць)
• vibald der bok hot herner, štojst er zix šojn ojx *glxv.* казёл бадзецца, таму што мае рогі

štok *m* [*d.* Stock, *mhd.* stoc] паверх

štok *m.* -n [*d.* Stock] палка, кій, ламака, ляска, трысьціна, віціна
• iber štok un (iber) štejn цераз палкі й каменьне (прабоем, напралом, стрымгалоў, кулём)

štok [*d.* stock-] *adv.* цалкам, зусім; **štók-blinder=štok blinder** [*d.* stockblind] зусім сьляпы; **štók(-)fincterer=štok fincterer** [*d.* stockfinster] непраглядны; **štók-fincter=štok fincter, štók-naxt=štok naxt** *adv.* зусім цёмна, цемра апраметная; **štók-tojber=štok tojber** [*d.* stocktaub] зусім глухі
• s'iz štok-fincter (štok naxt) апраметная цемра

štókajl *f.* -n [*d.* Eule] *zool.* сава

štókfiš *m* [*d.* Stockfisch] *zool.* траска

štol *m/n* [*d.* Stahl] сталь; **štólener** сталёвы; **štól(eve)n** сталяваць, сталіць; **štolke** *f.* -s стальное пяро; **štólgiser** *m* сталеліцейшчык; **štólgiserišer** сталеліцейны; **štolgiseráj** *f* сталеліцейная; **štólkoxer** *m* сталявар; **štol-un-ájzn** (štol un ajzn) *adv.* надзейна, грунтоўна, моцна, трывала; непахісна
• zajn* štol un ajzn стаяць гарой

štolc *m*, **štolckajt** *f* [*d.* Stolz] гордасьць, гонар, пыха, фанабэрыя; **štolcer** (mit) горды, ганарлівы, ганарысты; **štolcírn** (štolcirt) (mit), **štolc zajn*** гардзіцца, ганарыцца; **štólcndiker** чапурысты, важны, надзьмуты
• štolc vi a ceder in Levonen горды як ліванскі кедар (ганарысты як шляхцюк/пан; гонару як у багатага свата, як у засьцянковай шляхцянкі, што ў сьвіньні блох)
• mit gelt tor men nit štolcirn, vajl me ken es glajx farlirn *glxv.* грашыма нельга ганарыцца, бо іх лёгка можна страціць
• nariškajt un štolc vaksn af ejn holc *šprxv.* дурота і пыха растуць на адным дрэве

štolc *m*, -n. **štolce** *f*, -s [*d.* Stelze] хадулі, дыбы
• gejn* af štolces хадзіць на хадулях

štolkarc=šturkác *m*, -n [?] факел, паходня

štoln *pl.* [*mhd.* stolle] падстаўкі, слупы, ножкі (стала)
• ver es hot mejdlex, hot di fis gešvoln, ver es hot zin, hot di fis afn štoln *glxv.* у каго дочкі, у таго пухнуць ногі (шукаючы жаніхоў), а ў каго сыны, той сядзіць на покуці (як дочкі падрасьлі, то хату растрасьлі)

štólpern, štómpern [*d.* stolpern] спатыкацца, цяжка ісьці

štón *m* [*p.* szton] фішка

štone=haštone *f* [*s.* (ה)שתנה(-ות) →mašin, šeten] мача, сікі, сцулі, сцакі, брулі; **štonen** мачыцца, бруіць, сцаць, пускаць мачу, бурыць

štonen [*d.* stöhnen] стагнаць

štoper *m*, -s [*hol.* stopper] штопар, гляйсар

štopke *f*, -s [*d.* Stöpsel] пробка, корак, затычка

štopn (mit) [*d.* stopfen] набіць, (на)пхаць, (на)пхнуць, напіхаць; **štopn zix** напхацца, шмат зьесьці, нажрацца, нажэрціся, нажырацца; **štópiker** напханы; **štoper** *m*, -s абжора, ненасыць, жрун, аб'ядайла, прорва
• štopn emecn vi a gandz, vi an indik af Pejsex карміць гасьці як гусю, як індыка на Пэйсах (як на зарэз/забой)
• štopn gendz адкормліваць гусей
• štopn mit lokšn *fig.* вешаць локшыны на вушы, забіваць баки
• štopn un kropn набіць і напхаць (добра накарміць)

štopsl *n*, -ex [*d.* Stoppel] акурак, недакурак; **štopslex** *pl.* іржэўнік, салома

štor *f/m*, -n [*d.* Star, *p.* stora] 1. **štore** *f.* -s фіранка, штора; 2. *med.* катаракта

štor *m*, -n [*d.* Star] *zool.* шпак; **štór-šlak** *m*, -n шпакоўня

štorc *m*, -n [*d.* Sterz, *p.* sztorc?] край, бераг, руб; **štorcl** *n*, -ex астатак, кончык, рэшткі

štorcem/štórcóm [*p.* sztorcem] *adv.* тарчма, стаўма
• štejn* štorcom стаяць стаўма
• šteln zix štorcom станавіцца тарчма

štor(e)m=šturem *m*, *pl.* -s/štormen [*d.* Sturm] бура, штурм, навальніца

štores/štorim *pl.* →štar *m* [*s.* (שטר(-ות/-ים] камэрцыйны, гандлёвы дакумэнт, кантракт, умова; вэксаль

štorx *m*, -n [*d.* Storch] *zool.* бусел, бацян

štorxen/štorken=šturx(e)n [*p.* szturchać, *ukr.* штурхати] штурхаць

štot *f*, *pl.* štet, *dim.* **štetl** *n*, -ex [*d.* Stadt] горад; месца ў бажніцы/сынагозе; **štótišer, štótiker** гарадзкі; **štótšaft** *f*, -n гарадзкое кіраваньне, муніцыпалітэт, мэрыя; **štót-bal(e)bos** *m*, *pl.* -bal(e)batim [*s.* (בעלי־בתים) בעל־הבית] мешчанін, шаноўны чалец кагалу; **štót-farzorger** *m*, -s *iron.* гарадзкі кіраўнік, кіраўнік кагалу; **štótgortn** *m*, *pl.* -gertner гарадзкі сад; **štót-jojec** *m*, -im [*s.* (-ים)יועץ־] гарадзкі саветнік; **štót-mešúgener** *m* [*s.* משוגענער־] гарадзкі вар'ят; **štótplac** *m*, *pl.* -plecer гарадзкі пляц; **štótrot** *m*, -n гарадзкое кіраваньне, урад, кагал; **štóttejl** *m*, -n гарадзкі квартал; **štótzejger** *m*, -s гарадзкі гадзіньнік
• a štot (in šul/mizrex) найманыя месцы ў сынагозе
• ganc štot (цалкам) увесь горад
• hinter der štot (па-)за горад(ам)
• in center štot у цэнтры гораду
• štotišer ajnvojner гарадзкі жыхар
• an umglik in štot! *iron.* няшчасьце ў горадзе!
• di gance velt iz ejn štot *glxv.* увесь сьвет – адзін горад
• di štot (dos štetl) gejt af redlex *glxv.* горад/мястэчка ходырам ходзіць (дым каромыслам)

štot(s)=onštót [*d.* anstatt] узамен, наўзамен, замест, дзеля

štox [*d.* Stich] 1. *m*, -n укол; 2. *m*, *pl.* štex штабок, штышок, шывок; **a štox ton*** падкалоць, падчапіць, зьяхіднічаць, пад'ялдыкнуць; **štóxmuter** *f*, -s мачыха; **štóxvort** *n*, *pl.* -verter колкасьць, кпіны, шкелі, зьдзек
• a štox in harc(n) укол у сэрца
• šabesdike štex шырокія штышкі, якія робяць, калі нешта сьпяшаюцца зашыць адвячоркам у пятніцу да надыходу суботы
• zicn* on a štox arbet сядзець бяз справы
• a štox maxt a lox *šprxv.* укол робіць дзірку (рынуў слаўцом як пярцом)

• Di zun hot zix bahaltn, /ir šajn iz šojn nito... /Ix nej un nej, /ix ze, ix ze, /di naxt, zi iz šojn do. /Jeder štox mit der nodl /tut mir a štox in harc, /kejner vejst nit majn pajn un majn šmarc... (M. V.) Сонца села, сьвятла ўжо німа... Я шыю і шыю, я бачу, ужо настала ноч. Кожны ўкол іголкай коле мне ў сэрца, ніхто ня ведае маёй пакуты і майго болю...
• er hot gemaxt a štox in šabes arajn *glxv.* ён прыфастрыгаваў суботу (аб чалавеку, які замарудзіўся з надыходам суботы, як кравец, які не пасьпеў дашыць)
• kert men zix aher, treft men ■ ber, kert men zix ahin, git a štox a bin *šprxv.* павернешся сюды, трапіш на мядзьведзя, павернешся туды, трапіш на пчалінае джала (куды ні кінь – усюды клін; едзе скора – усьлед гора, едзе ціха – усьлед ліха)

štoxim *pl.* →šetex *m* [*s.* (שטח-)שטחים] 1. плошча, тэрыторыя, кавалак зямлі, прамежак, прастора, абшар; паверхня, роўніца, плаз; 2. галіна, сфэра, абсяг, мяжа, рубеж, тэма

štrafírn (štrafírt) [*d.* strafen] штрафаваць, караць; **štraf** *m*, -n штраф, пакараньне, кара

štrajt *m*, -n [*d.* Streifen] стужка, пас, паласа

štrajk=strajk *m*, -n [*d.* Streik] страйк, забастоўка; **štrajkn=strajkn** баставаць, страйкаваць; **štrajker=strajker** *m*, -s, (-ke *f*, -s) страйковец; **štrájkndiker** які бастуе

štrajml/štrájmhitl *n*, -ex/-en [*d.* Streim=Streifen?] футровая сьвяточная шапка

• fun kejn xazerišn ek (fun a xazer-švencl) ken men kejn štrajml nit maxn (fun an ek fun a xazer ken men nit maxn a štrajml) *šprxv.* са сьвінячага хваста шапкі ня сшыеш
• az der rov gejt in štrajml, gejt di rebecn in spodik *šprxv.* калі рабін ходзіць у футровай шапцы, дык і рабініха ходзіць у шапцы (калі рабін займаецца толькі справамі, ягоная жонка верхаводзіць дома)

štrajtn* (geštritn/geštrájt) [*d.* streiten] спрачацца, змагацца; **štrajt** *m*, -n, **štrajtung** *f* барацьба, бой, спрэчка; **štrájtbarer** спрэчны; **štrajter** *m* барацьбіт, баец; **štrájtndiker** які спрачаецца; **štrájtmaxer** *m* скандаліст(а); **štrájt-frage** *f*, *pl.* -fragn спрэчнае пытаньне; **štrájtzojmen** *pl.* насеньне разладу

štrajxer *m*, -s [*d.* streichen?] кушнер

štrajxn* (geštrixn/geštróxn) [*d.* streichen] выкрасьліць, выкрэсьліваць; **štrajxn* zix** (in, mit) ганарыцца, пышыцца, фанабэрыцца, выстаўляцца

štrajxn zix (cu, arum) [*d.* streichen?] намагацца, сіліцца, рабіць высілкі; заляцацца, дабівацца (кагосьці)

štral *m*, -n [*d.* Strahl] прамень; **štraln** праменіць, зьзяць, бліскаць, мір(а)цець; **štráliker** праменны, праменісты; **štrálndiker** прамяністы, зьзяючы; **štrálnartiker** праменепадобны; **štralung** *f*, -en выпраменьваньне

štram→gram-štrám *m* [*mhd.* gerime] пісаніна (пра кепскія вершы)

štrand *m*, -n [*d.* Strand] марскі бераг, узьбярэжжа, пляж; **štrandn** сесьці на мель

štrebn (cu) [*d.* streben] імкнуцца; **štrebung** *f*, -en (cu) імкненьне

• di štrebung zajn kliger fun der gancer velt iz di greste nariškajt *šprxv.* імкненьне быць разумнейшым за ўвесь сьвет ёсьць найвялікшае глупства

štrekn [*d.* strecken] вы-, пра|цягнуць, вы-, пра|цягваць; **štreke** *f*, -s аллегласьць, прастора

• štrekn dem haldz (dos lebn) (far) падстаўляць шыю, ахвяраваць жыцьцём (за нешта) (галаву/руку на страчэньне даваць)
• me muz zix štrekn nox di ekn/dekn *glxv.* выцягвайся паводле хваста/накрыўкі (ведай, каток, свой куток; калі худ, ня лезь на кут; калі ў кепскім кажусе, не садзіся на куце; з сабачым хвастом у воўчы табар; ня лезь, жаба, туды, дзе коней куюць)

štreln [*mhd.* straelen] часаць

štremung *f*, -en [*d.* Strömung] плынь (кірунак)

štrenger [*d.* streng] строгі, суровы; **štrengkajt** *f*, -n строгасьць

• a štrenger blik/lerer строгі погляд/настаўнік
• štrenge porjadkes/porondkes строгія парадкі

štricl *n*, -ex [*d.* Striezel] *kul.* пляцёнка, пірог з парэчкамі (са смуродзінай)

štrik *m/f* [*d.* Strick] вяроўка; **štrikl** *n*, -ex вяровачка, матузок, абор(к)а; **štrikn** 1. плесьці, вязаць (пруткамі); 2. *n*, **štrikeráj** *f/n* вязаньне, пляценьне (дзеяньне); **štrikexc** *n* вязаньне, пляценьне; **štriker** *m*, (-n *f*, -s) вязальнік; **štríkvarg** *n* вяроўкі, вязаньне; **štrík(l-)drejer** *m*, -s вераўчанік, вяровачнік; **štríklejter** *m*, -s вяровачная лесьвіца

• af štrikl на вяровачцы/павадку
• a štrik dir afn haldz! *kll.* вяроўку табе на шыю!
• cu a bejzn hunt a kurcn štrik *šprxv.* злому сабаку кароткі павадок
• in štub fun a gehangenem – dermon nit kejn štrik (ver es hot a gehangenem in der mišpoxe, far dem tor men kejn štrik nit dermonen) *šprxv.* у хаце павешанага – ня ўзгадвай пра вяроўку
• mer soxrim, mer glik – mer ganovim, mer štrik *šprxv.* больш гандляроў, больш шчасьця – больш злодзеяў, больш шыбеніц
• oder a glik, oder a štrik (far vemen a glik, far vemen a štrik) альбо/каму шчасьце, альбо/каму вяроўка (ці пан, ці прапаў; ці паскачаш, ці паплачаш; кошцы сьмех, а мышцы гелэхтэр)
• Volt ix gehat štrikelex, /volt ix mit zej cien. /Volt ix gehat fligelex, /volt ix mit zej flien... *flksl.* Калі б у мяне былі вяровачкі, я б імі цябе да сябе прывязала. Калі б у мяне былі крылцы, я б да цябе паляцела.
• vu der štrik iz din, dort(n) rajst er zix *šprxv.* дзе вяроўка тонкая, там і рвецца (дзе коратка, там рвецца, дзе балюча, там б'ецца; на бяду і розум адняло; дзе баліць, там і вытнешся; на балючае вока ўсё парушына ляціць)

štrimp/štrimf *pl.* →štrump/štrumf *m* панчоха

štrix *m*, -n [*d.* Strich] штрых, рыса; **štrixlen, štrixírn** (štrixírt) штрыхаваць

• guter/šlexter štrix добрая/благая рыса

štrof *f*, -n, **štrofung** *f* [*d.* Strafe] штраф, кара, пакараньне, спагнаньне; **štrofer** *m* карнік, мараліст; **štrofn** штрафаваць, караць; ушчуваць; **štróferišer** карны, які карае; **štrófndiker** штрафны; **štrófmitl** *n*, -en мера пакараньня, кара; **štrófrejd** *f/pl.* вымова, ушчуваньне; **štrófkvit** *m*, -n штрафны квіток

• az got vil ejnem štrofn, nemt er ba im dem sejxl avek (ven got vil štrofn a menčn, nemt er ba im op dem sejxl) *šprxv.* як бог чалавека хоча ўкараць, то ўперад розум адбярэ (як захоча бог уляпіць, то ўлепіць: розум адніме і вочкі асьлепіць)

• got colt nox di majles, un štroft nox di xesrojnes *šprxv.* бог плаціць за дабро, але карае за хібы
• got zol mix nit štrofn far di rejd! хай бог мяне не карае за гэтыя словы!
• vemen got hot lib, dem štroft er *šprxv.* каго бог любіць, таго й карае (каго бог любіць, таму крыжык даець)
• vilstu štrofn a cvejtn – vaś frier ojs di ejgene hent *šprxv.* хочаш пакараць другога, вымый спачатку ўласныя рукі (другіх мые, а сваіх сопляў пад носам ня бачыць)

štroj [*d.* Stroh, Streu] 1. *m*, -en, *dim.* **štrójele** *n*, -ex саломіна; 2. *f* салома; **štróje(r)ner** саламяны; **štrójdax** *m*, *pl.* -dexer (štrójener dax) саламяны дах, саламяная страха; **štrójzak** *m*, *pl.* -zek сяньнік

• a štroj afn noz саломіна на носе (кажуць, калі чалавек запнуўся, згубіў думку)
• a štroj in ojg (in di ojgn) 1. саломіна ў вока; 2. *vulg.* сэксуальныя зносіны
• firn štroj kejn Micraim вазіць салому ў Эгіпт (у калодзеж вады ня льюць, а ў лес дроў не вязуць; езьдзіць у Тулу са сваім самаварам)
• kajen štroj жаваць салому (малаціць пустую салому; з тошчага да ў парожняе пераліваць)
• štrojene almone *hum.* саламяная ўдава
• ufhengen* af a ibergebrentn štroj *iron.* павесіць на перагарэлай саломіне
• a štroj dir in ojg un a špon dir in ojer, un zolst nit visn, vos frier arojscucien! *kll.* саломіну табе ў вока і трэску табе ў вуха, і каб ты ня ведаў, што раней вымаць!
• beser a štrojener man, vi zejdene/goldene kinder *šprxv.* лепей саламяны мужык, ніж ядвабныя/залатыя дзеці
• der, vos trinkt/trenkt zix, xapt zix on far (bodaj/afile in) a štrojele (on a šarf fun a šverd) (az me trinkt zix, xapt men zix on on a štroj) *šprxv.* як топішся, то і за саломіну (за лязо мяча) схопішся (хто топіцца, за брытву хопіцца; калі топіцца, то няхай за сваю сраку ўхопіцца)
• gib im štroj cu kajen дай яму саломы пажаваць (ёлуп, балван, ідыёт)

štrojs *m*, -n, **štrójsfojgl** *m*, *pl.* -en/-fejgl [*d.* Strauss] *zool.* страўс; **štrójsener** страўсавы; **štrójsfeder** *f*, -n страўсавае пяро

štrojx *m*, -n [*d.* Strauch] куст

štrojxlen (zix), geštrójxlt vern* [*d.* straucheln] спат(ы)кнуцца, спатыкацца; **štrojxl** *m*, -en удар; **štrójxl(dik)er** спатыклівы, пашкоджаны; няроўны, з калдобінамі (пра дарогу); **štrojxlung** *f*, -en спатыканьне, цяжкасьць, перашкода, завада; **štrójx-gedixteniš** *f* зарасьнік, хмызьняк; **štrójxl-štejn** *m*, -er камень спатыкненьня

štrom *m*, -en [*d.* Strieme] шрам, рубец, пісуга, пісюга

štromen [*d.* strömen] цячы, струменіцца, ліцца, плысьці; **štrom** *m*, -en 1. плынь, цячэньне, паток, струмень; 2. ток; **štróm(end)iker** шпаркаплынны, шпаркабежны, праточны, цякучы; **štrom-aróp** *adv.* за вадой; **štrom-arúf** *adv.* проці вады; **štrómbekn** *m*, -s басэйн ракі, вадазбор; **štrómšvel** *f*, -n парог (на рацэ); **štrómkrajz** *m*, -n *elektr.* ланцуг

• der ojlem halt in ejn štromen натоўп валіць
• gein*/švimen* mitn/kegn štrom плысьці за вадою (супроць вады)
• rajsn* dem štrom плысьці супраць плыні

štromke=stromke *f*, -s [*v.*] стрэмка, скабка

štros/štroz/štrus/štruz *m*, -n [*d.* Strasse] вуліца, маставая, брук, шаша; **štrósnrojber** *m* вулічны злодзей

štrox *m*, -n [*d.* Strich] штрых, рыса

štrudl *m*, -en [*d.* Strudel] *kul.* штрудэль, рулет (слаёны салодкі пірог з фруктовай начынкай альбо несалодкі зь мясам ці рыбай)

štrump/štrumf *m*, *pl.* štrimp/štrimf [*d.* Strumpf] панчоха

• zeks brider zajnen mir gevezn, /hobn mir gehandlt mit štrimf; /ejner iz geštorbn, /iz geblibn finf *flksl.* нас было шасьцёра братоў, мы гандлявалі панчохамі; адзін памёр, нас засталося пяць

štub [*d.* Stube] 1. *f*, *pl.* štiber, *dim.* **štibl** *n*, -ex хата, дом, будынак; 2. *f*, *pl.* -n/štiber пакой, камора; **štúbiker** 1. хатні; 2. *m*, **štúb(-)menč** *m*, -n нехта з хатніх, жыхар дома, свой чалавек, сябра сям'і; **štúbikung** *f* прыручэньне жывёлаў; **štúbikn** прыручаць; **štúbdinst** *f*, -n пакаёўка; **štúbfirern** *f*, -s гувэрнантка, кіраўнічая дома; **štúbzax** *f*, -n хатняя рэч; **štúbzicer** *m*, -s, (-n *f*, -s) дамасед

• a fajer zol zix arajnxapn cu dir in štub! *kll.* а бадай твая хата згарэла!
• a štub darf hobn a man, un a man darf hobn ■ vajb *šprxv.* у хаце патрэбны мужык, а мужыку патрэбна жонка
• a štub darf hobn a menčn *glxv.* у доме мусіць быць чалавек
• a štub mit a(n) alker/kamer! (štub un alker/kamer! fun štub in kamer!) блізенька! паблізу!
• der xoxem bojet a štub, un der nar cebrext zi *šprxv.* разумны будуе хату, а дурань бурыць яе
• di štub halt zix af der baleboste *glxv.* дом трымаецца на гаспадыні
• di štub iz im nit cu der hant *glxv.* хата яму не з рукі (не знаходзіць сабе месца)
• in kejn jidišer štub zol men dos nit zen! каб ніводна жыдоўская хата гэтага ня бачыла!
• me tor im nit arajnlozn in kejn jidišer štub для яго ўсе дзьверы зачынены
• mit im kert men ojs di štub *glxv.* ім можна падмятаць хату (зь яго можна віць вяроўкі)
• nit cu esn, nit cu trinken, nor in štub cu zicn ня піці, ня есьці, толькі ў хаце сядзеці
• – Oj, v'azoj že vet mir der rebe helfn? /Ci gebn vet er mir den dem, vos ix hob lib? /Oj, cu dem, vos ix hob lib, 'el ix zix lozn forn, /un kumen vel ix glajx cu im in štub. *flksl.* – Ой, як жа мне рэбэ дапаможа? Ці дасьць ён мне таго, каго я люблю? Ой, я пайду да таго, каго кахаю і ўвайду да яго проста ў хату.
• Smilavič un Minsk iz a štub un kamer Сьмілавічы паблізу ад Мінска

štučne(r)=stučne(r) [*p.* sztuczny, *ukr.* штучний] штучны

študen *f* [*d.* Stute] кабыла

študírn (študírt) [*d.* studieren] вывучаць, вывучыцца; **študje** *f*, -s штудыя, вывучэньне; **študírndiker** які вучыцца, вучнёўскі, навучэнскі; **študirung** *f* вывучэньне; **študír-hojz** *n* школа для вывучэньня Талмуду

štufe *f*, -s [*d.* Stufe] кляса, разрад, ступень; **štúfesvajz=štúfnvajz** *adv.* паступова, крок за крокам; **štúfnvajzer** паступовы

štukatúr(ke)/štukature *f*, -s [*r.* штукатурка] тынкоўка; **štukatúre(ve)n** тынкаваць

štúkeven [*p.* sztukować] штукаваць, ушгукоўваць; **štu(č)ke** *f*, -s, *dim.* **štúčkele** *n*, -x штука, выбрык; **štúke-maxer** *m* штукар, блазен, блазьнюк, прыкідвальнік

• maxn štukes рабіць/чыніць штукі, выкінуць штуку

štul *m/f*, -n [*mhd.* stuol] стул, крэсла; **štúlgang** *m* "стул"; вялікая патрэба, спаражненьне

• hobn* štulgang спаражняцца

• az der rov gejt arojs fun der šul, meg zix itlexer zecn af zajn štul *šprxv.* калі рабін выходзіць з сынагогі, дык кожны можа сесьці на яго крэсла

• ven dos mazl kumt, štel im a štul *glxv.* калі шчасьце прыходзіць, стаў яму крэсла

štulpn *pl.* [?] пакамечаныя, сапсаваныя манжэты

štumen [*mhd.* stummen] нямець, маўчаць; **štumer** 1. *m*, -me, (-me *f*) нямы/немы чалавек, нямко; 2. маўклівы, нямы; **štumen** маўчаць, змоўкнуць; **štúmeniš** *f*, **štumkajt** *f* немата, немасьць; **štumak** *m*, -es *pejor.* нямко; **štumelale** *f*, -s, **štumure=štimure** *f*, -s *pejor.* маўклівец, маўклівы, неразгаворлівы чалавек; **štúm-lošn** *n* [*s.* לשון־] мова мімікі/жэстаў, на мігі/мігах; **štúmdiker tojber** *m* [*d.* Taubstummer] глуханямы

• a štume cung бязмоўнае існаваньне

• a štumer forvurf нямы папрок

• [illegible]* štum заставацца моўчкі

• [illegible]* af štum-lošn размаўляць на мове жэстаў

• štum vi di vant, vi a fiš, vi der tojt немы як сьцяна/мур [illegible]сьмерць (маўчыць як немы/нямко/нямэй/анямелы/рыба/сом/слуп/сыч)

• a ligner iz glajx cu a štumen – bejde zogn nit dem emes *šprxv.* хлус што нямы – абодва не гавораць праўды

• a štum vajb šelt nit mitn mojl, nor mit di hent *glxv.* нямая жонка кляне ня ротам, а рукамі

• ale štume viln redn a sax (a štumer hot lib a sax rejdn) *glxv.* усе нямыя прагнуць гаварыць шмат

• Don gegnt on der pastuške /un lozt štum di ojgn arop; /Donje, faršemt tut a šmejxl /un lozt štil arunter dem kop (H. R.) Дон сустракае пастушку і, анямелы, апускае вочы долу; Доня сарамліва ўсьміхаецца і ціха апускае галаву

štúmp(ik)er (af) [*d.* stumpf] тупы; **štump=štimp** *m*, -n затрымка, (пера)шкода, страта; **štúmpikajt** *f* тупасьць

• di hak iz štumpik сякера тупая

• er iz štumpik ён тупы

štund(e) *f*, -n [*d.* Stunde] гадзіна

• gebn* štundn даваць урокі

štunk *m* [*d.* Stunk] *vulg.* абасранец, засранец, шмаравоз, заткала

štupe=stempe/stepke=stupe *f*, -s [*p.* stępa, *ukr./r.* ступа] ступа

štupl *m/f*, -en [*d.* Stoppel] рабацінка; маленькая выемка, дзірачка (у мацы); шорстка, шарсьціньне; **štuplen=stuplen** праколваць, дзіравіць, рабіць маленькія дзірачкі

• štuplen ba der cung *fig.* язык сьвярбіць

štupn [*mhd.* stupfen] штурхаць, (па)піхнуць, (па)піхаць, пхаць, соваць, засоўваць; **štup** *m*, -n штуршок, высьпятак, таўхель, таўхень; **a štup ton*** (па)піхнуць, штурхануць; **štúpeniš** *n*, **štuperáj** *f* цісканіна, таўкатня, штурханіна, таўканіна; **štuper** *m* папіхач; **štúp-šo** *f*, -en [*s.* (ען-)שעה־] гадзіна пік; **štúpvegl** *n*, -ex тачка

• štupn di hent, vi me darf nit распускаць рукі, дзе ня трэба

• štupn di noz (in) соваць/утыкаць нос

• vuhin štupstu zix? куды ты пхнешся?

• er laxt – der nar štupt im *glxv.* ён сьмяецца – дурань яго штурхануў (па чом пазнаць дурнога, як ні па сьмеху ёга)

• štup mix, ix vil nit *hum.* пхай мяне, бо я не хачу (і хочацца і колецца)

• Štup že, štup že /štup dem lošik; /štup im, štup im gixer. /Der rebe alejn štupt ojx dem lošik, /štup im, štup im gixer. *fiksl.* Піхай жа жарабё, піхай яго хутчэй. Сам рэбэ таксама піхае жарабё, піхай яго хутчэй.

šturem=štorem *m*, -s, **štúrem(-)vint** *m*, -n [*d.* Sturm] бура, штурм, ураган, навальніца; **štúremdiker**, **štúrmišer**, **štúremfuler** бурны, імклівы; **štúremen**, **štúrmeven**, **šturmírn** (šturmírt) штурмаваць, бушаваць; **štúremfojgl** *m*, *pl.* -en/-fejgl *zool.* буравесьнік

• a šturem in a gloz vaser бура ў шклянцы вады

• (ajn)nemen* mit šturem браць штурмам

• az me zejt vint – šnajdt men šturem *šprxv.* пасееш вецер – пажнеш штурм

• šturem-vint un regn-šnej – /kejn zax nit gešrokn, /un di mame in der hejm /gevart hot mit a flokn (C. M.) шалёны вецер і дождж са сьнегам – нішто яго не спалохала, і маці ў хаце чакала з кіем

šturkác=štólkarc *m*, -n факел, паходня

šturmak *m*, -es [*p.* szturmak] няўклюда, пясьляк, стары дурань

šturman *m* [*mhd.* stürman] штурман

• alter šturman стары штурман (стары хрэн)

šturx(e)n/šturken=štorxen=šterxen [*p.* szturchać, *ukr.* штурхати] штурхаць; **šturx=šterx** *m*, -n/-es штуршок; **a šturx(e) ton*** штурхнуць

štus *m/n*, -im, **štuseráj** *f/n*, -en [*s.* (ים-)שטות] глупства, дурыкі, лухта, бязглузьдзіца [*sin.* nariškajt, umzin]; **štúsiker** бязглузды, бессэнсоўны

štutíc=štitíc *m*, -n [*d.* Schutztasche?] скрынка, футарал

šub *m*, -n [*d.* Schuppe?] луска

šúbenik=šíbenik *m*, -es шыбенік

šúb(ic)e *f*, -s [*r.* шуба] кажух, футра

šuc *f*, -n [*d.* Schutz] заступніцтва, апекаваньне, ахова, абарона; **šúcfe(j)iker** абароназдольны; **šúcfe(j)ikajt** *f* абароназдольнасьць; **šúcgebit** *n*, -n запаведнік; **šúcgrub** *m*, *pl.* -griber, **šúcgrobn** *m*, -s акоп; **šúclozer** безабаронны; **šúc-mitl** *n*, -en сродак абароны

• in šuc fun der naxt пад аховай ночы

šudak *m*, -es [?] сядак, падарожнік, пасажыр

šufl *m*, -en, **šufle** *f*, -s [*d.* Schaufel, *p.* szufla] шуфель; **šuflen** шуфляваць

šuflod=šiflod *m/n*, *pl.* -n/-leder, *dim.* **šúfledl** *n*, -ex [*d.* Schublade, *p.* szuflada] шуфляда

šufre-dešúfre [*s.* שופרא־דשופרא →mešufre-dešufre] найпрыгажэйшае, прыгажэйшае з прыгажэйшага, лепшае зь лепшага [*sin.* dos šenste funem šenstn, dos beste funem bestn]

šuft *m*, -n [*d.* Schuft] падлюка, паганец, паскуда, агіднік, нягоднік, басалай

šuk(j)enke=sukjenke *f*, -s [*p.* sukienka] сукенка

šul=šil *f*, -n [*d.* Schule] 1. **šule** *f*, -s школа; 2. сынагога, бажніца; **šuln** навучаць, вучыць; **šulung** *f*, -en адукацыя, навучаньне; **šúl-bank** *f* школьная лаўка, парта; **šúlbux** *m/n*, *pl.* -bixer школьны падручнік; **šúlfeld** *n*, -er школьная тэрыторыя; **šúlgelt** *n* грашовы збор у сынагозе; **šúlklaper** *m*, -s, **šúlrufer** *m*, -s сынагагальны служка, які грукае ў дзьверы і гукае людзей на малітву; **šúlmejnster** *m* настаўнік; **šúlvezn** *n*, -s школьная справа

• a šo far šul-klapn час склікаць у сынагогу (запозна)

• di kalte šul вялікая сынагога
• vajberše šul жаночая частка ў сынагозе
• iber di zindike lokšn hob ix di libe hejlike šul fargesn *glxv.* за грахоўнымі локшынамі я й любую сьвятую сынагогу забыла
• mit a jidn iz nor gut in šul arajn cu gejn (kduše cu śpringen) *śprxv.* з жыдам добра толькі ў сынагогу хадзіць (разам маліцца)
• vos neenter cu der šul, alc vajter fun got *śprxv.* чым бліжэй да сынагогі, тым далей ад бога

Šulamis [*s.* שולמית] *tmx.* Суламіта (Шуламіт) (Песьн. 7:1)

šuld *f*, -n [*d.* Schuld] віна, правіннасьць, доўг; **šúldiker** 1. *m*, (-ke *f*) вінавайца, віноўнік, абвінавачаны, вінаваты чалавек, даўжнік; 2. вінаваты, павінны; **šuldik zajn*** быць вінаватым, завінаваціцца; **šúldikajt** *f*, -n вінаватасьць; **šúldikn** (аб)вінаваціць, абвінавачваць; **šúldakt** *m*, -n абвінаваўчы акт; **šúld-anerkenung** *f* прызнаньне віны; **šúldbank** *f*, *pl.* -benk лава падсудных; **šúldšafiker** кампраметуючы

• aropvarfn* di šuld af emecn перакінуць віну на кагосьці
• di gance velt iz im šuldik увесь сьвет яму вінаваты
• er iz mir šuldik gelt ён мне вінаваты грошы
• gefinen* far šuldik прызнаваць вінаватым
• got di nešome šuldik [*p.* bogu ducha winien] нявінны (як немаўля), цалкам невінаваты (ні сном ні духам)
• haltn* far šuldik вінаваціць
• iber emecns šuld па чыёй-небудзь віне
• nemen* af zix di šuld браць на сябе віну
• nit blajbn* šuldik kejn entfer за словам у кішэню ня лезьці
• s'iz nit zajn šuld (er iz do nit šuldik) гэта не ягоная віна
• ver iz šuldik in dem? хто ў гэтым вінаваты?
• zajn šuldikajt iz dervizn (s'iz dervizn, az er iz šuldik) ягоная віна даказана/відавочна

šule *f* [?] сок

šulik=žulik *m*, -es [*r.* жулик] жулік

šul(j)er *m*, -s [*p.* szuler] шулер, шэльма; **šúlerišer** шулерскі

šulxn *m*, -s [*s.* (ם-)לחן(ש)] стол, канторка для чытаньня Торы ў сынагозе; **Šulxn-órex** *m*, -s [*s.* (ם-)ערוך] "Падрыхтаваны стол"; назоў статуту/кодэксу, які рэгламэнтуе жыцьцё артадаксальнага гэбрэя (складзены Язэпам Каро (1488–1575) і надрукаваны ў 1555 г.); *pl.* чатыры часткі статуту: "ojrex-xaim" [*s.* אורח־חיים], "jojre-deje" [*s.* יורה־דעה], "evn-hoezer" [*s.* אבן־העזר], "xojšn-mišpet" [*s.* חושן־משפט]; *iron. fig.* складаны звод правілаў, заблытаны кодэкс; **šulxn-órex-jid** *m* гэбрэй, які шчыра выконвае ўсе нормы статуту

• a guter rov muz kenen dem finftn šulxn-orex ojx добры рабін мусіць ведаць таксама і пятую частку статуту (абыходжаньне зь людзьмі)
• itlexer jid hot zajn Šulxn-orex un zajn šigoen *glxv.* кожны жыд мае свой статут і сваё вар'яцтва (як хто хоча, так па сваім бацьку плача; усялякі гад на свой лад; у кожнага кавалера свае манеры; кожны кравец сваім кроем, а кожны кеп сваім строем)

šum [*s.* שום →bešum-ojfn] без(ь), бяз(ь), (ані), ніяк [*sin.* on, kejn]

• kejn šum zax (nit) зусім нічога
• on (a) šum, kejn šum ніяк, ніякі, нічога
• on šum bavorenišn безагаворачна
• zej hobn ba im kejn šum vert ni(š)t ён іх ні ў грош ня ставіць

šum *m* [*p.* szum, *ukr./r.* шум] шум; **šumen** шумець; **šumne(r)** шумны

• a šum in kop шум у галаве

šund *m*, **šúnd-literatur** *f* [*d.* Schund] *pejor.* чытаніна, чытво, макулятура, жоўтая, бульварная літаратура, пашляціна; **šúnd-prese** *f* жоўтая прэса; **šúnd-roman** *m*, -en бульварны роман; **šúnd-šrajber** *m*, -s бульварны пісака

šupn zix [*d.* schuppen] лупіцца; **šup** *f*, -n [*d.* Schuppe] луска; **šupn** *pl.* кашута, перхаць; **šúpn-figldike** *zool.* лускакрылыя

šupn [*d.* Schub, *mhd.* schupf] таўхаць, штурхаць, п(і)хаць; **šup** *m* штуршок

• zix gebn* a šup імкнуцца наперад

šure *f*, -s [*s.* (ות-)שורה →kešure] рад(ок) [*sin.* linje in a tekst; rej]; **šúre-grizl** *n* узор сказа, які настаўнікі выдавалі вучнёўкам у часе навучаньня грамаце; **šúresvajz** *adv.* радкамі, радок

• di glajxe šures bejmer роўныя рады дрэваў
• di unteršte šure выніковая рыса, вынік
• gebn* di cvelf šure даваць развод
• in a šure ў радок
• in der unteršter šure у выніку
• lejenen cvišn di šures чытаць паміж радкоў
• az di eršte šure iz krum gešribn, tojg di gance (der gancer) briv af kapores *glxv.* калі першы радок крыва напісаны, нікуды ня годны ўвесь ліст (які пачатак, такі канчатак)

šurek *m* [*s.* (ך-)שורק →kubuc, melupn; nekude] дыякрытычны знак (ֻ), які ў гэбрэйскіх тэкстах азначае галосную літару "u" (ставіцца ўнізе зычнай літары, пасьля якой павінна гучаць гэта галосная)

šurke *f*, -s [*d.* Schurke] агіднік, нягоднік, басалай; гультай, абібок, лайдак, брында, лабатрос, латруга

šuršen=šoršen [*ukr.* шуршати] 1. шуршэць, шамацець, шоргаць, шастаць; 2. *n* шамаценьне, шоргат, шастаньне

šur(um)-búr(um)=šar-bár=s(j)ur-búr [*r.* шурум-бурум, *nd.* schurrmurr] 1. *m* шурум-бурум, сыр-бор, блытаніна, гармідар, нелад, разгардзіяш; шурабуркі, старызна, непатрэбшчына, драбяза; зброд; 2. *adv.* сьпехам, сьпешна, похапам, бязладна; **šur-bur-kíle** *f* назоў гульні; **šur-bur-vemafle-łájses** [*s.* ומפליא־לעשות →mafle-lajses] *hum.* вялічэзныя фокусы, разумныя выдумкі, вымудры; на скорую руку, сьпехам

• der gancer šur-bur hot zix ongehojbn iber... адкуль усё ліха ўзялося (праз што каша заварылася)
• maxn šur-bur рабіць абы-як, халтурыць

šus *m* [*d.* Schuss] *tekst.* уток

šuster *m*, -s, (-ke *f*, -s) [*d.* Schuster] шавец; **šusteráj** *f/n* шавецтва, шавецкае рамяство; **šúster(i)šer** шавецкі; **šústern** шыць абутак; **šusterúk** *m*, -es, **šusčak** *m*, -es *pejor.* шаўчук; **šúster-gas** *f*, -n шавецкая вуліца

• arajn(gejn*) in (der) šuster-gas губляць своеасаблівасьць, спрашчацца
• šusterše čveklex шавецкія цьвікі, тэксы
• a kop vi a minister, hent vi a šuster *šprxv.* галава як у міністра, рукі як ў шаўца (на галаве строй, а каля сракі хоць з лапатаю стой)
• a menč iz geglixn cu a šuster – a šuster darf hobn a vajb un a menč ojx (un a menč darf ojx hobn a vajb) *glxv.* чалавек падобны да шаўца – шаўцу патрэбна жонка і чалавеку таксама
• ale šusters gejen borves *šprxv.* шавец бяз ботаў (шавец

у падзёртых ботах ходзіць; ганчар у чаропках есьці варыць, а шавец у атопках ходзіць; каваль безь сякеры, шавец босы; каваль безь сякеры і без нажа сядзіць)
• az a jid ken nit vern kejn šuster, trojmt (er fun) vern a profesor *glxv.* калі жыд ня можа стаць шаўцом, ён марыць, каб стаць прафэсарам
• ix bin ojx nit kejn šuster! *glxv.* і я таксама не шавец! (і мая доля не шчарбатая; і мы не абораю хлеб кроім; і мая хата не карчма)
• Ix vel ▪ zemerl dir zingen, gotenju! /Ix vel dir zingen fun dajn šusterl: /gejt a šusterl in veg baginen. /– Šusterl, majn šusterl, vu gejstu? /– Ix gej, ix gej /far vajb un kind af brojt fardinen. /– Šusterl, majn šusterl, vos nejstu? /Ix nej, ix nej /far menčn oreme čobotes; /gots kinder gejen, nebex, borves. /un di velt iz ful mit blotes. (M. B.) Я прасьпяваю табе песьню, божухна! Я буду сьпяваць пра твайго шаўца: сабраўся шавец зранку ў дарогу. – Шавец, мой шавец, куды ты ідзеш? – Я іду жонцы й дзіцяці на хлеб зарабіць. – Шавец, мой шавец, што ты шыеш? – Я шыю для бедных людзей чобаты; божыя дзеці, нябогі, ходзяць босыя, ▪ ў сьвеце поўна гразі.
• šuster, blajb ba dajn meloxe *glxv.* шавец, глядзі сваю справу (не ў сваё карыта ня лезь; ня лезь на чужое седала; у чужыя сані не садзіся; не ў свае штаны не ўбірайся)

šuš(k)en [*ukr.* шушукати, *r.* шушукать] шушукаць, шаптаць; **šuške** *f* шэпт; **a šuške ton*** шушукнуць, шап(я)нуць; **šúškendik** *adv.* шэптам; **šúškeniš** *f*, **šuškeráj** *f*, -en шушуканьне, шэпты

• šušken in ojer arajn шапянуць на вуха
• me redt un me redt, un me šušket zix *glxv.* і пагавораць, і пашушукаюцца (гавараць, гаманяць, але ня ведаюць, дзе званяць; гаварыў, гаварыў – і прымовіў)

Šušn-habíre *f* [*s.* שושן־הבירה →šojšanes-] "лілея"; *tmx.* Сузы, пэрсыдзкая сталіца (Эст. 1:2); **šúšn-purim** *m* [*s.* פּורים־] "сускі Пурым"; дзень пасьля Пурыму (малое сьвята) (Эст. 9:16)

• a šlexter Purim iz a guter šušn-purim *glxv.* кепска ў Пурым – добра пасьля Пурыму (беднякі ўсё сьвята зьбіраюць міласьціну, ▪ ўжо сьвяткуюць пасьля)

šu-šu-šu *int.* шу-шу-шу (кажуць, калі казычуць дзіцёнка)
šu"t *abr.* **šajles-(u)čúves** *f* [*s.* שאלות־(ו)תשובות=שו"ת] кніга, з дапамогай якой рабін вышуквае адказы на талмудычныя пытаньні
šut *m*, -en [*r.* шут] блазен
šutef *m*, *pl.* šutfim, (-te *f*, -s) [*s.* שותף(־ים) →bešutfes] суўладальнік; саўдзельнік, супольнік, кампаньён, партнэр [*sin.* mitfarmoger, mitbazicer; mitbatejlikter]; **šutfes** *n* [*s.* -ות] суўладаньне; саўдзел, саўдзельніцтва, супольнасьць, сумеснае дзеяньне, талака; **šútfišer**, **šútfes(dik)er** супольны, агульны; **šútfišaft** *f* супольнасьць

• ▪ šutef cu di cores сябра па няшчасьцю
• af šutfes на паях
• zajn* a šutef (mit, cu) (maxn šutfes) удзельнічаць
• a dokter un a kvores-man zajnen šutfim *glxv.* доктар і далакоп – супольнікі
• a šutef iz vi a grablje *glxv.* супольнік – што граблі (усё грабе да сябе)
• šutfes iz gut – a make! *glxv.* разам добра – трасцу! (хто жыве ў купе, у таго не баліць у пупе; дзе дружна і хаўрусна, там ня грузна; дружны табун і ваўкоў не баіцца)
• šutfes iz gut nor mitn vajb *glxv.* разам добра толькі з жонкай

šute(r)=šote(r) [*ukr.* шутій] бязрогі
šux *m*, *pl.* šix, *dim.* **šixl** *n*, -ex [*d.* Schuh] чаравік, бацінак; **šuxn** абу(ва)ць; **šúxbendl** *n*, -ex шнурок; **šúxberštl** *n*, -ex шчотка для ботаў; **šúxlefl** *m* лыжачка для надзяваньня ботаў; **šúxpucer=šíxpucer** *m*, -s чысьцільшчык ботаў; **šúxvarg** *n* абуцьце, абутак; **šúxvarger** *m*, -s гандляр абуткам; **šú(x)vaks** *m* вакса

• arajngejn* in emecn šix увайсьці ў чужое становішча, улезьці ў чужую скуру
• gejn* in der mames šix хадзіць у матчыных чаравікох
• a šux un a klejd *fig.* чаравік і сукенка
• a nar darf hobn a sax šix *glxv.* дурню трэба мець шмат абутку (за дурной галавой сьпіна баліць, нагам неспакой; скупы двойчы плоціць, а дурны двойчы ходзіць)
• di šix fun oremans kind vaksn mitn fisl *glxv.* чаравікі ў бядняцкіх дзяцей растуць разам з нагамі
• kojfstu šix far zix, to mest zej nit af fremde fis *glxv.* калі купляеш сабе чаравікі, дык не прымярай іх на чужыя ногі
• m'gejt šojn in zajne šix ужо ходзяць у ягоным абутку (даўно памёр)
• ojb der šux past, kenst im trogn *glxv.* калі чаравік пасуе, можаш яго насіць
• ot di šix trogn/nicn zix gor kejnmol nit op гэтым чаравікам німа зносу

švab *m*, -es [*d.* Schwabe] шваб, немец
švager *m*, -s [*d.* Schwager, *p.* szwagier] швагер, швагра
švajger=švejger *m*, -s, (-ke/-n *f*, -s) [*d.* Schwaiger] малачар, малочнік
švajgn* (gešvígn) [*d.* schweigen] 1. маўчаць; 2. *n*, **švajg** *m*, **švájgeniš** *f/n*, **švajgns** *n* маўчаньне; **švajger** *m*, -s, (-ke *f*, -s) маўчун, маўклівец; **švájge(v)diker**, **švájgndiker** маўклівы; **švájgndik(erhéjt)** *adv.* моўчкі, маўкліва; **švájge(v)dikajt** *f* маўкліваць; **švájggelt** *n* хабар

• švajgn* vi di vant маўчаць як сьцяна
• švajgn* vi in a bod (vi in bod afn pol), vi a vant/hunt, vi di cung volt in kimpet gelegn, vi er volt aropgešlungen di cung маўчаць як у лазьні на палу, як сьцяна/мур/сабака, як язык праглынуўшы (маўчыць быццам яму каровы язык аджавалі, як безьязыкі, як вады ў рот/губы набраўшы, як воцату выпіўшы, як камень пры дарозе, як немы/нямко/нямэй/анямелы/рыба/сом/слуп/сыч)
• a švajgndiker nar iz a halber xoxem *glxv.* дурань, які маўчыць, напалову мудры
• az a nar švajgt, vejst men nit, ci er iz a nar, ci a xoxem *glxv.* калі дурань маўчыць, невядома, ці ён дурань, ці разумны
• az der rebe švajgt, /un az der rebe švajgt, /švajgn ale xasidimlex, /ša... ša... *flksl.* калі рэбэ маўчыць, маўчаць усе хасыдзікі, ша..., ша...
• der, vos švajgt, mejnt ojx epes *glxv.* хто маўчыць, той таксама аб нечым думае
• eltern lernen ojs di kinder rejdn, un di kinder lernen ojs di eltern švajgn *šprxv.* бацькі вучаць дзеці гаварыць, а дзеці вучаць бацькоў маўчаць
• host du (hostu) – halt, vejst du (vejstu) – švajg, kenst du (kenstu) – tu! *glxv.* маеш – трымай, ведаеш – маўчы, можаш – рабі!
• redn iz šver, un švajgn ken men nit *glxv.* гаварыць цяжка,

але й маўчаць німа як
• rejdn iz zilber, švajgn iz gold (redn iz gut, švajgn iz beser) *šprxv.* слова – срэбра, маўчаньне – золата
• šejn švajgn iz šverer/šener, vi šejn rejdn *šprxv.* добрае маўчаньне цяжэйшае/прыгажэйшае за добрую гаворку
• švajgn iz gut, redn iz nox beser *šprxv.* маўчаць добра, але гаварыць яшчэ лепш
• vegn dem max(t) a švajg! аб гэтым – ані слова!

švajn *m*, -en [*d.* Schwein] *pejor.* сьвіньня; **švajneráj** *f/n*, -en сьвінства

švalb *f*, -n, *dim.* **švelbl** *n*, -ex, **švélbele** *n*, -x [*d.* Schwalbe] *zool.* ластаўка
• di erste švalb першая ластаўка
• afn furl ligt dos kelbl, /ligt gebundn mit a štrik, /hojx in himl flit dos švelbl, /frejt zix drejt zix hin un krik (A. C.) на вазу ляжыць цялё, ляжыць зьвязанае вяроўкай, высока ў небе лётае ластаўка, радуецца, мітусіцца туды-сюды
• di švalbn hobn dos bejs-hamikdeš gelošn (un di špinen hobn fajer getrogn) *folk.* ластаўкі Ерусалімскі Храм пагасілі (а павукі агонь прынесьлі)
• ejn švalb brengt nox mit zix nit der zumer (ejn švalb ken kejn zumer nit maxn) *šprxv.* першая ластаўка (першы шпак) лета/вясны ня робіць (адзін вырай вясны ня робя)

švál(j)óm=čvaljóm [*p.* cwałem] *adv.* наўскач, наўгалёп, на ўсю моц

švalnje *f*, -s [*p.* szwalnia] швальня

švam=švom=švum *f*, -en губка

švan *m*, -en [*d.* Schwann] *zool.* лебедзь; **švánen(-)lid** *n* лебядзіная песьня

švanc *m*, *pl.* švenc, *dim.* **švencl** *n*, -ex [*d.* Schwanz] 1. хвост; 2. *vulg. euph.* канец, шышка, дудучка, пеўнік, стручок, мазюка, пумпыська, чэлес; 3. *fig.* дурань, дурдола, ёлуп; **švancevate(r)** *vulg.* хуеваты, дурны; **švanc-melámed** *m*, *pl.* -melámdim, (-ke *f*, -s) [*s.* (מלמד-ים)] дурны настаўнік
• beser a ber on a(n) švanc/ek, ejder a švanc/ek on a ber *glxv.* лепш мядзьведзь без хваста, чымся хвост безь мядзьведзя
• der švanc funem xelemer xazns indik *glxv.* хвост індыка хэлмскага кантара (сёмая вада на кісялі; нашага парабка кумаў сват; стрэчнай бабкі родны Хведар; пан гарэў, а чорт ногі пагрэў, іскра пала і радня стала)
• vilst nit vartn? vel ix dir šitn zalc afn švancl *hum. glxv.* ня хочаш пачакаць? я табе насыплю солі на хвост (кажуць нецярпліваму; дзецям кажуць, што можна злавіць птушку, калі насыпаць ёй на хвост солі) (на хвост солі насып, дык і зловіш)

švángern=švéngern, švanger vern* [*d.* schwanger] чараваць, цяжэць, цяжарацъ, зацяжарваць; **švángere** цяжарная; **švángeršaft** *f*, -n цяжарнасьць; **švángern-hojz** *n*, *pl.* -hajzer радзільны дом
• zi švangert яна цяжарная

švarbe=svarbe *f*, **esrim-v(e)árbe** *pl.* [*s.* עשרים־וארבע] "24" (азначэньне для Танаху, які складаецца з 24 кніг)

švarcer [*d.* schwarz] 1. чорны; 2. *m* нэгар; 3. *m*, -s кантрабандыст, шмуклер; **švarcn** 1. чарніць, пляміць; 2. **švarc vern*** чарнець; **švarckajt** *f* чарната; **švárclexer** чарнаваты; **švarc** 1. *n kort.* віны; 2. *f argo* ноч, цемра; **švárcápl** *n*, -en, **švarcl** *n*, -ex [*d.* Augapfel] *anat.* зрэнка, вочны яблык; **švárcarbet** *f* чорная работа; **švárc(-)arbet(o-r)er** *m*, -s чорнарабочы; **švárcbodn** *m*, **švárcerd** *f* чарназём; **švárc(-)brojt** *n* чорны хлеб; **švarcjámiker** [*s.* -ימ-] чарнаморскі; **švarc(-)jór** *m*, -n (švarc(er) jor) [*d.* der Schwarze] 1. ліхалецьце, няшчасьце, чорны год; 2. нячысьцік, чорт; **švárckincler** *m*, -s чорны маг, чарадзей; фокусьнік; **švárckunst** *f*, **švárckincleráj** *n* чорная магія; **švarc(-)méjenik** *m*, -es [*s.* -מאה] *hist.* чарнасотнік (чалец антысэмiцкай арганізацыі "Чорная сотня" ў царскай Расеі); **švarc(-)méjediker, švarc(-)méjišer** *hist.* чарнасоценны; **švárc-ojgiker** чарнавокі; **švárc-šabes** *m* [*s.* שבת] "чорная субота"; шабаш, оргія; чорны дзень; **Švárc-tume** *n* [*s.* טומאה] *pejor./hum.* г. Белая Царква (Украіна); **švárcvald** *m*, *pl.* -velder ліставы, лісьцяны лес; **švarc-xéjn(evd)iker** [*s.* -חנ] чарнявы, смуглы, мілавідны, прыгожы, прывабны; **švárczeer** *m*, -s пэсыміст, смутнагляднік
• arbetn* af švarc выконваць левую работу, халтурыць
• di tojz/malke (dos mejdl) švarc віновы туз, віновая дама
• maxn emecn a švarcn sof рабіць камусьці чорнае жыцьцё
• maxn emecn a švarc-šabes учыніць камусьці скандал
• šrajbn* af švarc пісаць чарнавік
• švarc af vajs чорным па белым
• švarc vi a halke/žuk/murašnik/murin/cigajner чорны як галка/жук/мурашнік/мурын/цыган (як арап/гаман/грак/крук/вуж/катляр/смаголь/смоўж/чорт)
• švarc vi di brand/erd, vi majn lebn/harc чорна/цяжка як язва/зямля, як маё жыцьцё/сэрца (як ноч)
• švarc vi haleveške/mon/pex/smole/kojl/saže, vi di sopuxe чорны як галавешка/мак/смала/смоль/вугаль/сажа/сопуха (як махнатка/бізун/дзёгаць/подмазка/засланка/комін/сукно)
• švarcapl fun ojg найдаражэйшы (чалавек) (як зрэнка)
• švarcn di/dem grenec нелегальна перасякаць мяжу
• švarcn zix dos ponem ачарніць сябе
• a švarcjor af dir (af dajn/zajn kop)! *kll.* ліха табе (на тваю/яго галаву)!
• ba naxt zajnen ale ki/kec švarc *glxv.* ноччу ўсе каровы/каты чорныя (паначы ўсе каты шэрыя/буйныя)
• der švarcjor vejs! чорт ведае!
• der švarcjor zol im nemen! (nemen zol dix der švarc-jor!) *kll.* чорт/трасца яго/цябе бяры!
• der švarc-jor nemt im nit! чорт яго не бярэ! (ліха не баіцца)
• der švarc-jor zol dix avektrogn! *kll.* чорт цябе схапі! (бадай цябе кадук схапіў!)
• gej cum švarc-jor! *kll.* ідзі ты к чорту (д'яблу/нячысьціку/рагацiку)!
• er hit es op vi dos švarcapl funem ojg (vi dos ojg in kop) ён гэта сьцеражэ/пільнуе як вока ў лобе (шануе/песьціць як сваё вока)
• er zet ojs vi a švarc-jor in milx gekoxt (vi a švarc-jor in der vajser milx, vi a švarc-jor in a cilinder) ён выглядае, як чорт, звараны ў малацэ (як чорт у цыліндры)
• far an oreman iz švarc-jor ojx genug *šprxv.* бедняку ліха таксама не бракуе (беднаму ўсюдых бедна)
• švarc gejt kejn mol nit ojs der mode *šprxv.* чорнае ніколі не выходзіць з моды
• švarclox iz harclox *šprxv.* ліха кладзецца на сэрца
• xoč švarc, nor a gut harc (me meg zajn a švarc, abi hobn

a gut harc) *glxv.* хоць і чорны, але з добрым сэрцам (хоць кашуля чорная, але сумленьне чыстае; хоць рукі чорныя, ды работа белая)

švarcue *f*, -s [*r.* швартов, *hol.* zwaartouw] швартоў

švarmen *pl.* [*d.* Schwärm] рой, процьма, плойма, безьліч

• švarmen flign рой мух

švat *m* [*s.* שבט →Tu Bišvat, Xamišoser Bišvat] шват, пяты месяц гэбрэйскага календару (студзень-люты)

• in švat trinkt zix der oks on zat *glxv.* у шваце вол нап'ецца вады ўволю (час разводзьдзя)

• švat šenkt nit dos zajnike *glxv.* са шватам не да панібратаў

švax=ševex *m*, *pl.* švoxim [*s.* (ים-)שבח →lišvax] (па)хвала, усхваленьне, хвальба, камплімэнт [*sin.* lojb, kompliment]

• dercejlen emecns švoxim распавядаць аб чыіхсьці заслугах

• zogn/dercejlen emecn švoxim (noxzogn/opgebn* cu/emecn a švax) выхваляць кагосьці, казаць камусьці камлімэнты

švaxer [*d.* schwach] слабы, кволы, нямоцны, нядужы, някрэпкі, недалужны; **švaxer vern*** лягчаць; **šváxinker** *m* нядашчы, кволы, хілы чалавек; **šváxlexer** слабаваты; **švaxkajt** *f*, -n (cu) слабасьць, немач, кволасьць; **švaxn=švexn** паслабіць, паслабляць; **švaxling** *m*, -en заморак, [illegible] чалавек; **šváxkepiker** хворы на галаву, [illegible]; **šváxmutiker** маладушны; **šváxmutikajt** *f* маладушнасьць; **šváxvíliker** слабавольны; **šváxvílikajt** *f* слабавольле; **šváxzinikajt** *f*, **šváxkepikajt** *f* прыдуркаватасьць

• a švax ojg слабое вока

• a švax strunele слабая струнка

• er hot ejnike švaxkajtn у яго ёсьць маленькія слабасьці

• s'xapt a švaxkajt немач хапае/бярэ

• švax vi nox a krenk, vi a flig, vi a klejn kind слабы як пасьля хваробы, як муха, як малое дзіця

• a menč iz (a mol) štarker fun ajzn un (a mol) švaxer fun a flig /štroj (a menč iz vi a flig) *glxv.* чалавек (часам) мацнейшы за жалеза, а (часам) слабейшы за муху/саломіну

• me falt nit, vajl me iz švax, nor vajl me mejnt, az me iz štark *glxv.* падаюць не ад слабасьці, але таму, што лічаць сябе за моцных

• Mit a mol gevorn iz zi švax un zejer krank, /af majne hent geštorbn iz zi, af a gasnbank. /Un az ix hob zi farlojrn, /hob ix alc ongevojrn, /zol der tojt šojn kumen ojx cu mir. (H. J.) Раптам яна зусім аслабела й моцна захварэла, яна памерла на маіх рукох, на вулічнай лаўцы. І калі я яе згубіў, я страціў усё, хай ужо сьмерць прыйдзе да мяне.

• mit di jorn alc vern švaxer di cejn un der zikorn *glxv.* з гадамі ўсё слабейшыя зубы і памяць (волас сівее – розум слабее)

švebl *m* [*d.* Schwefel] сер(к)а; **švébldiker** серны; **švébele** *n*, -x, **švébl-štekl** *n*, -ex запалка, сярнічка; **šveblen** акунаць у серу; **švébl-vaserštof** *m хем.* серавадарод; **švébl-zojers** *n*, **švébl-zajerkajt** *f* серная кіслата

• dar vi a švebele худы як запалка

• unterlejgn a švebele падкладаць запалку (саломы ў агонь падкладаць; прыску/жару падсыпаць)

• a švebele cindt zix glajx on un vert gix farlošn *šprxv.* сярнічка запальваецца адразу, але і хутка гасьне

• mit ejn švebele ken men farbrenen a gance štot *šprxv.* адной запалкай ільга спаліць увесь горад (аднаго Юрку ўпусьцілі, а ўся хата заюрылася)

švebn [*d.* schweben] лунаць, вісець у паветры, пырхаць; **a šveb ton*** пырхнуць; **švébndiker** лунаючы, які лунае; **švébšprejt** *f*, -n кілім-самалёт

• švebn in (di) luftn/volkns/himlen/ojlemes hoeljojnem лунаць у аблоках/нябёсах/надхмар'і

• Es šajnt di levone, es glancn di štern; /di naxt švebt af barg un af tol... /Dos altičke bixele ligt far mir ofn, /ix lejen es un lejen es tojznter mol. (S. F.) Зьзяе месяц, зіхацяць зоркі, ноч лунае па гарам і далінам... Старэнькая кніжыца ляжыць перада мною разгорнутая, я чытаю й чытаю яе ў тысячны раз.

Švedn *n* [*d.* Schweden] Швэцыя; **šved** *m*, -n швэд; **švédišer** швэдзкі; **švediš** 1. *n* швэдзкая мова; 2. па-швэдзку

švéger(i)n *f*, -s [*d.* Schwägerin] швагерка, залвіца, залоўка

švejcár *m*, -n [*r.* швейцар, *d.* Schweizer] швэйцар

Švejc(arje) *f* [*d.* Schweiz] Швэйцарыя; **švejcer** 1. швэйцарскі; 2. *m*, (-n *f*, -s) швэйцарац

švejger=švajger *m*, -s, (-ke/-n *f*, -s) малачар, малочнік

švejs *m*, -n [*d.* Schweiss] пот(ы); **švéjsiker** потны

• mit(n) blutikn/bitern švejs з крывавым/горкім потам

• s'gist zix fun im der švejs (er vert bagosn mit švejs) зь яго ліецца пот

• s'hot im bašlogn a švejs яго кінула ў пот

• s'hot im gekost blut un švejs гэта каштавала яму поту і крыві

• gebenčt iz der grošn, vos iz mit švejs bagosn *šprxv.* блаславёны той грош, які потам паліты (чым цяжэй, тым даражэй)

• iz dir hejs, krix in švejs – iz dir kalt, lojf in vald *glxv.* горача – пацей, холадна – бяжы ў лес

švejsn [*d.* schweissen] *texn.* (зь)літаваць, зварыць, зварваць; **švejser** *m* зваршчык; **švejsung** *f texn.* зварка; **švéjsbrener** *m*, -s літавальная лямпа; **švéjsgecajg** *n* зварачны інструмэнт

švel *m/f*, -n [*d.* Schwelle] парог

• nit ariberlozn* iber der švel не пусьціць на парог

• nit aribertretn* emecns švel парог не пераступіць (нагі ня будзе; ані кроку на парог)

• zajn* af der švel funem kejver быць на краі магілы (сьмерць у вочы, у зубы пазірае)

• ven jeder balebos kert cu ba zajn švel, volt umetum geven rejn калі б кожны гаспадар падмятаў ля свайго парога, паўсюдна было б чыста

šveln* (gešvóln) [*d.* schwellen] пухнуць, узьнімацца

švenc *pl.* →švanc *m* 1. хвост; 2. *euph.* канец, шышка, дудучка, пеўнік, стручок, мазюка, пумпыська, чэлес; 3. дурань, дурдола, ёлуп; **švenceráj** *n* дурніна, дурота, дурасьць, глупства

švencjen=šv(j)enčen=svjenčen [*p.* święcać] сьвя(н)ціць, асьвячаць

švéngern=švángern чаравацець, цяжэць, цяжараць, зацяжарваць; **švénger-klejd** *n*, -er адзеньне для цяжарнай

švenken* (gešvénkt/gešvonken) [*d.* schwenken] 1. паласкаць; 2. *n*, **švenk** *m*, -en паласканьне; **švenkexc** *n*, -n паласканьне (вадкасьць)

• švenken* di menuse *fig.* паласкаць вантробы (шмат піць)

• švenken* dos mojl, gret паласкаць рот/бялізну

švente=švjente *f*, -s [*p.* święto] хрысьціянскае сьвята

šver *m*, -n [*d.* Schwäher, *mhd.* swer] сьвёкар; цесьць; **šver-un-švíger** *pl.* сваты

• a gutn šver iz šver cu hobn, a šlextn šver iz šver cu bagrobn

glxv. добрага сьвёкра цяжка займець, благога – цяжка пахаваць
• az me hot xasene mitn šver (az me tut mitn šver), šloft men mit dem (mitn) ber *glxv.* хто жэніцца на цясьцёвых грашох, сьпіць зь мядзьведзем
• az me kukt arojs/ojs afn švers štivl, gejt men borvos *glxv.* хто заглядаецца на цясьцёвы боты, ходзіць босы
• itlexer ejdem iz a štik šver *šprxv.* кожны зяць падобны да свайго цесьця
• majn šver iz geštorbn, majn šviger matert zix *iron.* мой цесьць памёр, мая цешча мучаецца (кажуць у адказ на прымус пабажыцца; *vrtš.* "švern" бажыцца – "šver" цесьць)

šverd *f*, -n [*d.* Schwert] меч, шабля
• arajnlejgn di šverd in ir šejd укласьці меч у ножны
• der bux un di šverd iz gešafn gevorn ejncajtik *glxv.* кніга і меч былі створаны адначасова
• Gej ix mir arajn cu majn gelibter froj, /gefin ix mir ejns un cvej, /af der vant hengen šverdn, /ejns un cvej un draj. /gib ix mir a freg majn gelibter froj: /– Vos far a šverdn dos iz? /Entfert zi mir: – Brok-meser, /majn muter šikt mir dos. Oj, brok-meser mit blanke hent, /oj, oj, vej, majn harc tut mir vej, /az ix bin dox dajn man, – /ax, vos darfstu zej? *flksl.* Заходжу я да сваей любімай жонкі й бачу, раз-два, на сьцяне вісяць шаблі, адна і дзьве, і тры. Я пытаюся ў сваей любімай жонкі: – Што гэта за шаблі? Яна адказвае: – Нажы-секачы, мая маці мне іх прыслала. Ой, нажы-секачы са сьветлымі ручкамі, вой-ёй-ёй, у мяне схапіла сэрца, калі я твой мужык, – ах, навошта яны табе?

šverer [*d.* schwer] цяжкі; **švérlexer** цяжкаваты; **švérikajt** *f*, -n цяжкасьць, труднасьць; **šverkajt** *f*, -n цяжар; **švérbaveglexer** непаваротлівы, нязграбны, нехлямяжы, няспрытны; **švérbrexiker** упарты, заўзяты, настойлівы, упорлівы; **švercúngiker** коснаязыкі, гугнявы; **švercúngikajt** *f* коснаязыкасьць, гугнявасьць; **švérkraft** *f* сіла, цяжар; **švérlájbiker** грузны, цяжкаважны; **švérmutiker** пахмурны, смутны, сумны; **švérpunkt** *m*, -n цэнтар цяжару; **švervógiker** цяжкаваговы, цяжкаважны; **švervógikajt** *f* цяжкаваговасьць, цяжкаважнасьць
• a šver harc/gemut цяжка на сэрцы/душы
• a šver pekl цяжкая ношка
• a švere krenk/štrof цяжкая хвароба/кара
• a šverer šlof, gang цяжкі сон, шлях
• dos gejt ba im cu šverlex гэта яму дужа цяжка даецца
• mit a šver harc зь цяжкім сэрцам
• ojb s'vet ajx nit zajn šver калі вам ня будзе цяжка
• onkumen* šver (zajn* emecn šver) (cu) быць цяжкім (для кагосьці)
• šver maxn emecn dos harc засмуціць кагосьці
• šver af ojer тугавухі
• šver vi a štejn, vi ajzn/blaj цяжкі як камень/жалеза/сьвінец (як ванзэлак/гляк/калода/волава/гліна/гнёт/памák)
• šver vi di Tojre, vi kries-jamsuf цяжка як Тора, як разьдзяленьне Чырвонага мора
• švere gelt вялікія грошы
• švere cajtn цяжкія часы
• ba a švern vogn iz gring cu gejn cu fus (lebn a švern vogn iz gut cu fus cu gejn) *glxv.* каля цяжкага воза лёгка ісьці пешa
• Ba der šverster arbet /štejt Dovids bild far mir... /Ix nej un nej, /ix ze, ix ze /gliklex iz er mit ir! /Nor vos iz zi do šuldik – /zi hot dox ojx a harc... /Efšer fílt zi dem ejgenem šmarc! (M. V.) За цяжкай працай перада мной паўстае вобраз Давіда... Я шыю і шыю, я бачу, што ён шчасьлівы зь ёй! Але чым яна вінавата – яна таксама мае сэрца... Мабыць яна адчувае ўласны боль!
• dos ejgene pekl iz nit šver *glxv.* свая ношка ня важка (свая сярмяжка нікому ня цяжка; свая табака не пяршыць)
• fremds ligt šver in mogn *šprxv.* чужое ў страўніку мулее (чужым багацьцем сыты ня будзеш; чужое ня цешыць і ня грэе)

švern* **(zix)** (gešvó(j)rn) (cu, ba) [*d.* schwören] 1. бажыцца, прысягаць, прысягацца; 2. *n* бажба, прысяганьне
• švern* ba bord un pejes (in tales un kitl) бажыцца барадой і пэйсамі (у талесе і сьвяточным халаце) (клясьціся родам і плодам)
• švern* zix mit tojte švues даваць сьмяротную клятву
• švern* zix vi a markjidene бажыцца як жыдоўка на кірмашы
• af dem, vos me švert, iz oft punkt farkert *šprxv.* хто бажыцца, часта хлусіць (хто часта бажыцца, той мала праўды кажа)
• far zix un far der kac ken ix švern! за сябе і за гэту котку я магу пабажыцца! (магу ручацца толькі за сябе)
• got hot gešvojrn, in der velt zol gornit vern farlojrn *glxv.* бог прысягнуў, што ў сьвеце нічога ня згубіцца
• – Oj, majn hentele ken ix dir gebn, /un ix šver dir cu, az ix hob dix emes lib, /un ix šver dir cu, az ix vel dix nit farbajtn, /oje, biskele dem finctern grub. *flksl.* Ой, маю ручку я магу табе даць, і клянуся, што я цябе сапраўды люблю, і клянуся, што я цябе не прамяняю, ой, да самай цёмнай магілы.
• švern iz erlex, haltn iz šverlex *glxv.* бажыцца – сумленна, трымаць слова – цяжка

švester *f* [*d.* Schwester] сястра; сястра-сядзелка; **švesterkind** *n*, -er стрыечны брат; стрыечная сястра; **švesteráj** ▪ занятак сястры-сядзелкі; **švésteršaft** *f* сястроўская сувязь, сястроўства; **švéster-lebn** *f* (зварот) сястрыца, кума; **švéstern-toxter** *f*, *pl.* -texter сястрына дачка, пляменьніца; **švéstern-zun** *m*, *pl.* -zin сястрын сын, пляменьнік
• ix hob gehat a švesterl, a kind fun der natur, /mit mir cuzamen zix gešlept hot zi a gancn jor, /mit ir geven iz mir fil gringer, /lajxter vern flegt der hinger (hunger), /ven ix fleg a kuk ton nor af ir (H. J.) у мяне была сястрычка, дзіцёнак па натуры, разам са мной яна цягалася цэлы год, зь ёй мне было шмат лягчэй, лягчэй было цярпець голад, толькі паглядзеўшы на яе

švex=švax *m* [*d.* Schwäche?] выпіўка, баль, банкет; **švexn** баляваць, банкетаваць, піць, п'янстваваць
• maxn a švex выпіць чарку

švexn=švaxn [*d.* schwächen] паслабляць

šviblen [*d.* wimmeln, kribbeln?] кішэць
• afn plac hot gešviblt mit menčn пляц кішэў людзьмі
• šviblen un griblen (mit) (es šviblt un griblt) аж кішыць, бязладзьдзе, раздрай

švicer [*d.* Schwätzer] *m*, -s пустазвон; **šviceráj** *f* пустазвонства

švicn [*d.* schwitzen] пацець, прэць; **švicer** *m*, -s, (-ke *f*, -s) чалавек, які моцна хвалюецца (і пацее); хвалько, зухвал, самахвал; фарсун, фігурант, франт; **švíc(-)bank** *m*, *pl.* -benk палок (у лазьні); **švic** *f*, -n, **švíc(-)bod** *f*, *pl.* -beder лазьня

• a švicer крыкун, гарлач, бузацёр
• gebn* (af) cu švicn даць патагонны сродак
• švicn on malines пацець без малінаў
• švicn vi in (a) bod пацець як у лазьні (спацеў як мыш/шчур)
• bistu/kumstu in bod, darfstu švicn *glxv.* прыйшоў у лазьню – пацей

švifč=svišč *m*, -n [*r./ukr.* свист, свищ] 1. рэзкі сьвіст; 2. гультай: нікчэмны чалавек

šviger *f*, -s [*d.* Schwieger] сьвякроў, сьвякруха; цешча
• a bejze šviger trajbt cum get *šprxv.* злая сьвякруха гоніць да разводу (сьвякроў – пся кроў; сьвякруха добра не бывае, усё ліхая ды ліхая)
• a šviger mit a šnur forn nit af ejn fur *šprxv.* сьвякруха зь нявесткай ня езьдзяць на адным возе (агонь з вадою ў адной хаце не жывець)
• a šviger un a šnur in ejn hojz zajnen, vi cvej kec in ejn zak *šprxv.* сьвякруха зь нявесткай у аднае хаце, як два каты у адным мяху (сьвякруха і нявестка – сялу павестка)
• [illegible] šviger un a šnur gehert an ajzerner tir *šprxv.* паміж сьвякрухай і нявесткай патрэбны жалезныя дзьверы (сьвякроў любіць нявестку, як сабакі дзеда)
• [illegible] glikexster menč af der velt iz geven Odem-horišn – er [illegible] nit gehat kejn šviger найшчасьлівейшым чалавекам у сьвеце быў Адам – ён ня меў цешчы
• Viazoj že ken ix forn. /šviger, mit ajx, /az ix hob zix nit gezegnt /mit majn tatn glajx. *flksl.* – Як жа я магу ехаць, сьвёкар, з вамі, калі я не разьвіталася з маім бацькам.

švii *m* [*s.* שביעי →ševe-; alie] "сёмы"; чалавек, якога сёмым выклікаюць чытаць Тору ў сынагозе [*sin.* zibeter]; **šviis** [*s.* שביעית →šmite] *tlmd.* "сёмыя"; назоў 5-га трактату 1-га разьдзелу (запаветы аб сёмым годзе); **švii-šel-péjsex** *m* [*s.* ־של־פסח] сёмы дзень Пэйсаху
• gebn* emecn švii выклікаць кагосьці сёмым чытаць Тору

švimen* (iz gešvumen) [*d.* schwimmen] 1. плысьці, плыць, плаваць; 2. *n*, **švimung** *f* плаваньне; **švimeráj** 1. *n* плаваньне; 2. *f*, -en, **švímbasejn** *m*, -en плавальны басэйн; **švimer** *m*, -s плывец; **švímendiker** які плавае, плывучы; **švímiker** плаўны; **švímfe(j)iker** здольны плаваць; **švímerl** *n*, -ex (па)плавок; **švimkes** *pl.* плаўкі, купальнік; **švímflus** *m*, -n плаўнік; **švímhajtl** *n*, -ex плавальная перапонка
• lozn* švimen пускацца ў плаваньне
• švimen* mitn/kegn štrom плыць за вадою, супраць вады
• švimen* vi fiš плаваць як рыба
• švimike konsonantn *lingv.* плаўныя зычныя
• bešasn švimen darf men švajgn, derfar kenen (take torn) di vajber nit švimen у час купаньня трэба маўчаць – з гэтае нагоды жанчыны ня могуць плаваць
• der grester švimer ken zix trenken (der grojser švimer vert cum sof dertrunken, un der grojser kleternik vert derharget) *glxv.* найлепшы плывак можа ўтапіцца (а лепшы скалалаз можа загінуць) (добры фурман адразу воз пераверне)
• – Oj vej, mame, kačkes švimen, /ven vet šojn majn liber kumen? /– Oder hajnt, oder morgn, /m'darf zix gornit azoj zorgn. – Ой-вэй, маці, качкі плаваюць, калі ж прыйдзе мой каханы? *flksl.* – Можа сёньня, можа заўтра, зусім ня трэба так гараваць.

švindlen [*d.* schwindeln] 1. круціцца, кружыцца; 2. мільгаць, мільгацець; 3. круціць, жульнічаць, махляваць, ашукваць, шахраваць; **švindl** *m*, -n, **švindleráj** *f*, -en хлусьня, падман, ашуканства, жульніцтва, махлярства, круцельства; **švindler** *m*, -s, (-n/-ke *f*, -s) ашуканец, ашукальнік, падшывальнік, абакула, круцель, вілаводнік, манюка, чмурыла, махціц, махляр, шахрай; **švíndlerišer** жульніцкі, махлярскі, ашуканскі, круцельскі; **švíndldiker** галавакружны, мігатлівы; **švíndl-trep** *f*, -n, **švíndl-štig** *f* сьпіральная лесьвіца
• az me kukt in/fun der hojx, xapt a švindl *glxv.* хто лунае ў надхмар'і, таго чакае ашуканства
• es švindlt mir in kop (far/in di ojgn) галава круціцца (цёмна ў вачох)
• der emes iz der grester švindl *šprxv.* праўда – найвялікшая хлусьня
• himl un erd un švindl! *glxv.* неба і зямля і падман! (аб нячыстым на руку гандляры)

švíndzuxt *f* [*d.* Schwindsucht] *med.* сухоты; **švíndzixtiker** 1. *m*, -ke сухотнік; 2. сухотны

švingen* (gešvíngt/gešvungen) [*d.* schwingen] махаць (вяслом/касой)

švinke(s)=svinke *f* [*p.* świnka, *ukr./r.* свинка] *med.* сьвінка, заўшніца; **švintux** *m*, -es [*p.* świntuch] сьвінтух; **švinske(r)** сьвінскі, сьвінячы

švirtus *m* [?] калаўрот у калодзежы/студні

šviščen=sviščen [*p.* świstać, *ukr.* свистати] сьвістаць; **šviščeráj** *f/n* сьвіст; шчэбет, шчабятаньне, ціліканьне, цьвіліканьне, цьвірканьне

švižbes *pl.* [*p.* świerzby] сьверб, сьвярбеж, сьвярбячка, кароста

švižik *m*, -es [?] *argo* дзяцюк, хлопец, хлапчук

šv(j)enčen=svjenčen [*p.* święcić] асьвяціць, асьвячаць (паводле хрысьціянскай традыцыі); **šv(j)ente** *f*, -s хрысьціянскае сьвята; **švjentem duxam** [*p.* świętym duchem] *hum.* сьвятым духам
• lebn švjentem duxam жыць сьвятым духам

Švo=malke-Švó *f* (di malke Švo) [*s.* שבא(־מלכה)] *tnx.* царыца Шэба (Саўская)

švo *m/f*, -en/-s [*s.* שווא(-ס/-ען) →šejve; nekude] дыякрытычны знак (ְ), які ў гэбрэйскім пісьме азначае беглую галосную літару "е" (ставіцца ўнізе зычнай літары, пасьля якой павінна гучаць гэта галосная)

švoger *m*, -s [*d.* Schwager] швагер; **švogeréc** *m*, -n/-es *pejor.* сваячок, родзіч

švójltog *m* [*d.* schwöl?] *pejor. iron.* раскоша, шыкоўны дзень

švo(j)m=švum=švam *m/f*, -en, *dim.* **šveml** *n*, -ex, **švémele** *n*, -x [*d.* Schwamm] грыб; губка; **švómiker**, **švómartiker** 1. грыбападобны; 2. губчаты, губкаваты, наздраваты, порысты, сітаваты
• azoj fil vi švemlex noxn regn шмат як грыбоў пасьля дажджу
• gein* klajbn švemlex хадзіць за грыбамі, зьбіраць грыбы

švorem *m*, -s [*d.* Schwarm] рой; **švormen** раіцца

švorim *pl.* [*s.* שברים →tkue, tkie] кароткія адрывістыя гукі шофара

švotim *pl.* →šejvet *m* [*s.* שבט(-ים)] род, пакаленьне, племя, клан, сям'я; **švótim-sistém** *f* радавы строй

švoxim *pl.* 1. →švax=ševex *m* [*s.* שבח(-ים)] хвальба; 2. апавяданьні аб дзеяньнях і цудах праведнікаў
• fun di švoxim hob ix zix farlojrn я разгубіўся ад пахвалы
• zogn švoxim emecn выхваляць, услаўляць кагосьці (курыць фіміям)

švue *f*, -s [*s.* שבועה(-ות) →mašbie] сьвятое абяцаньне, клятва, бажба, прысяганьне, прысяга [*sin.* hejliker cuzog, dos švern]; **švue-švúes** *pl.* урачыстая клятва, клятва клятваў

• brexn* di švue парушыць клятву
• di (bundiše) švue бундаўскі гімн
• di švue fun pojle-cien сіянісцкі гімн
• hejlike/falše švue сьвятая/фальшывая клятва
• (op)gebn* a švue (cuzogn mit a švue) даваць клятву, прысягаць

terepeščen [*r.* трепетать, *p.* trzepotać] трапятацца, дрыжэць, дрыгацець, трымцець
teres=túr(lik)es
Terkáj *f/n* [*d.* Türkei] Турцыя; **terk** *m*, -en, (-n/-inje *f*, -s) турак; **terkiš** *n* турэцкая мова; **térkišer** турэцкі
• terkiše (švic)bod турэцкая лазьня
• terkiše vejc кукуруза
• zicn* af terkiš сядзець па-турэцку
• er hot im opgeton af terkiš *glxv.* ён зрабіў яму па-турэцку (абдурыў; сьвіньню падлажыў)
• red xoč toteriš un terkiš! *glxv.* гавары хоць па-татарску або па-турэцку! (ніхто не дапаможа)
terkiz=turkiz *m* [*d.* Türkis] біруза; **térkizer** зроблены з бірузы; **térkizkoliriker** бірузовы (колер)
térkltojb/tértltojb=túrkltojb=tirkltojb *f*, -n [*d.* Turteltaube] *zool.* турок, туркаўка; **terklen=torklen=tirklen** [*d.* turteln] туркатаць, буркатаць, буркаваць
térmice *f*, -s [?] масьніца, памасьнічына, дошка
termín *m*, -en [*d.* Termin] тэрмін; **terminiker** тэрміновы
terne *f*, -s [*ukr.* терен, *r.* тёрн] цёрн, цярноўнік
terpen=čerpen [*r.* терпеть, *ukr.* терпіти] цярпець, зносіць, трываць, вытрымліваць
terpen [*ukr.* терпнути] церпнуць, дрантвець, дубець, пруцянець, дзервянець
• der fus terpet mir у мяне нага задубела
terpentín=tarpentín *m*, -en [*d.* Terpentin] тэрпэнтына, тарпатына
terpke(r) [*p.* cierpki, *ukr./r.* терпкий] церпкі, даўкі, кіслы; **terpkajt** *f* даўкасьць, кіслата
tertl-mértl *n* [?] гульня ў карты, папулярная ў жыдоўскім асяродзьдзі напрыканцы XIX ст. у Расеі
térxe(ne)n/téxern [*ukr.* тирхати?] 1. халтурыць, кепска выконваць работу; партачыць у шытве; пэцкаць, шмараваць, брудзіць; 2. *vulg.* мець палавыя зносіны, любацца, цяці
tes=t *m/f*, -n [*s.* (ת-)טית] 1. "тэс", літара гэбрэйскага альфабэту; 2. лічба 9
tesen/tešen [*ukr.* тесати, *r.* тесать] часаць (бервяно); **teser** *m*, -s

1. цясла; 2. **tesl(j)er=česler** *m*, -s цесьля, цясьляр, плотнік; **tesleráj** *n*, -en цясьлярства; **tesljarske(r)** цясьлярскі, плотніцкі

• хоč tese in im fleker яму хоць кол на галаве чашы

• farnemen* zix mit tesleraj займацца цясьлярствам

téstikl *m*, -en [*fr.* testicule, *lat.*] *anat.* яечка; **téstikl-enbajtl** *m/n*, -en/-ex *anat.* машонка, шмонка, семяньнік, ядры, яліты, шуляты, муды

tétiker [*d.* tätig] дзейны, чынны; **tétikajt** *f*, -n дзейнасьць, чыннасьць

teusim *pl.* →toes *m*, -n [*s.* (ים-/ן-)טעות] памылка

teve *f*, -s [*s.* (ס-)טבע →beteve] нораў, натура, характар, тэмпэрамэнт; прывычка, звычка, спосаб, манера [*sin.* natur; xarakter, temperament; gevojnhajt]

• a nariše teve дурацкая звычка

• hobn* ■ teve (cu) мець звычку

• ix ken gut zajn teve (zajn teve iz mir gut bakant) я добра ведаю ягоны нораў

téxeser *pl.* →toxes *m* [*s.* (ער-)תחת] зад(ніца), срака, гузно, дупак. какаўка, дупа

texter *pl.* →toxter *f*. *dim.* **téxterl** *n*, -ex дачка

tfejlim *pl.* →tofl *m*, -en [*s.* (ים-/ען-)טפל] неістотнасьць, пругараднасьць, няважнасьць, дадатак

tfile *f*, -s [*s.* (ות-)תפלה →mispalel, bal-tfile] малітва, зварот да бога [*sin.* gebet cu got, dos davnen]; **tfile ton*** маліцца; **tfil** *m*, -in, **tfiln** *pl.* [*s.* (ין-)תפיל] філяктэрыі; **tfiln-zekl** *n*, -es мяшэчак для філяктэрыяў; **tfíle-klejd** *n*, -er рыза; **tfile-becíber** *f* [*s.* ציבור] калектыўны малебен, набажэнства пры наяўнасьці мінъену [*sin.* kolektiv gebet]; **tfiles-hadérex** *f* [*s.* תפילת הדרך] малітва, якую чытаюць, зьбіраючыся ў дарогу; **tfile-záke** *f* [*s.* זכה] "чыстая малітва" (малітва, якую чытаюць напярэдадні Ём-Кіпуру на ноч)

• lejgn tfiln надзяваць філяктэрыі, маліцца ў філяктэрыях

• az der rebe Elimejlex /iz gevorn ejn mol frejlex, /iz gevorn zejer frejlex Elimejlex, /hot er ojsgeton di tfiln, /un hot ongeton di briln, /un gešikt nox di fidler di cvej *flksl.* як аднойчы рэбэ Элімэйлэх разьвесяліўся, зрабіўся вельмі вясёлым Элімэйлэх, ён зьняў філактэрыі, і надзеў акуляры, і паслаў за двума скрыпачамі

• di tfile gejt aruf un di broxe gejt arop *šprxv.* малітва ўзыходзіць, а бласлаўленьне сыходзіць

• vajse tfiln un švarce cices *glxv.* белыя філяктэрыі і чорныя цыцэс (аб неахайным чалавеку)

tfise *f*, -s [*s.* (ות-)תפיסה →tafsn, tojfes, tofes, bal-tfise] 1. зьняволеньне, турма, арышт, няволя; 2. успрымальнасьць, разуменьне [*sin.* turme, arest, gefenkenis; feikajt cu farštejn, banem]; **tfísenik** *m*, -es зьняволены, арыштант; **tfise-betuex** *m*, *pl.* -betuxim [*s.* (ים-)בטוח] зьняволены, які мае пэўныя прывілеі; **tfise-farvalter** *m*, -s начальнік турмы

• ajnzecn in tfise пасадзіць за краты

• Cu dajn bruder hob ix gornit, oj vej, gornit, /vajl er zogt, az er iz nit šuldik in dem. /In kijever tfise zol er zicn /un zol nit kejn menčn far zix. /Az cu kejn libe, bruder, zolstu zix nit mišn, /oj vej, col im, oj, gotenju, far mir. *flksl.* Твайму брату я не жадаю ліха, вой, таму, што ён кажа, што ён не вінаваты ў гэтым. Хай ён сядзіць у кіеўскай турме ў адзіночцы. У любоў, браце, ня трэба мяшацца, вой, адплаці яму, божухна, за мяне.

• er hot ■ gute tfise, er iz a bal-tfise ён мае ўспрымальны розум (хапае на ляту)

• tfise iz azoj vi mise *šprxv.* турма як сьмерць

tfoxim *pl.* →tefex *m* [*s.* (ים-)טפח] *tlmd.* шырыня далоні (мера даўжыні, каля 15 см)

tfu! [*p.* tfu] *int.* цьфу!

• tfu zolstu vern! пляваў я на цябе!

• tfu, tfu, tfu! цьфу, цьфу, цьфу! няўрокам кажучы/гаворачы! ненаслоў будзь сказана!

tfuces(-hoórec/-jisróel) *pl.* [*s.* (תפוצות־הארץ/־ישראל)] мясцовасьці, у якія перасяліліся гэбрэі; гэбрэйскія калалы ва ўсім сьвеце

• in ale tfuces-hoorec паўсюдна, усюды, па ўсім сьвеце

thom *m*, -en [*s.* (ען-)תהום] прорва, бездань, бяздоньне, тхлань [*sin.* opgrunt, grojse tifkajt]; **thómiker** бяздонны

• der guf iz a švom, di nešome a thom *šprxv.* цела – губка, душа – бяздоньне

thores=ta(a)res [*s.* מהרות] *mšn.* "чысьціні, нявіннасьці"; назоў шостага і апошняга разьдзелу і 5-га трактату ў ім (запаветы аб пэўных выпадках нечысьціні і чысьціні) [*sin.* rejnkajtn]

ticer *m*, -s [*r.* тычить, *p.* tyci?] *argo* зладзейчык, зладзяня

tičen/tic(j)en=tucen (mit) [*ukr.* тыкати, *p.* tykać] тыкаць, тыцкаць; **a tiče ton*** тыкнуць, тыцнуць

tičke *f*, -s [*ukr.* тичка, *p.* tyczka] тычка

tičke *f*, -s [*r.* туч(к)а] хмарка, *fig.* зграя (сабак)

tifer [*d.* tief] глыбокі; **tif** *f*, -n глыбіня (вады); **tífeniš** *f/n*, -n глыбокае месца, глыбіня (вады); **tifkajt** *f*, -n глыб(іня); **tífland** *n* упадзіна, яміна; **tífziniker** глыбакамысны, глыбакадумны; **tifzin** *m*, **tífzinikajt** *f* глыбакамыснасьць, глыбакадумнасьць; **tíf-tif** *adv.* да глыбіні душы

• a tifer brunem/zifc/analiz глыбокі калодзеж/ўздых/аналіз

• di tif funem tajx глыбіня ракі

• fun tifn harcn ад усяго сэрца

• in der tif у глыбі, на глыбіні

• tif in der naxt глыбока ўначы

• tif in harcn у глыбіні душы

• tif vi der jam/brunem глыбока як мора/студня (пра меркаваньне)

• tife vorclen/videršpruxn глыбокія карані/супярэчнасьці

• tifer in velder iz tifer der sod, /vos nor di štilkajt kon haltn; /x'hob mojre cu zogn – nor efšer hot got /dortn zajn nign bahaltn (V. J.) глыбока ў лясох ёсьць глыбокая таямніца, якую можа толькі цішыня захоўваць; баюся сказаць – толькі можа бог там свой сьпеў хавае

• zol er dort tifer in dr`erd lign! *kll.* каб ён глыбей у зямлі ляжаў!

tiferes *m* [*s.* תפארת] прыгажосьць, бліскучасьць, раскоша, пышнасьць, хараство; *kbl.* адна зь дзесяці сфэраў [*sin.* šejnkajt, praxt]

tifle *f*, -s [*s.* (ות-)פלה(ת')] *pejor.* царква, касьцёл [*sin.* kirx, klojster]

tiger *m*, -s, (-ixe *f*, -s) [*d.* Tiger] *zool.* тыгр

tigl *m*, -en [*d.* Tiegel] 1. тыгель, плавільнік; 2. гаршчок, чыгун

tik=to [*ukr.* тик] *bndv.* то, дык

tik *m*, -n [*ukr.* тик, *p.* tik] удар, тык

tik *m* [*r./ukr.* тик, *hol.* tijk] *tekst.* цік

tiken=tuken [*ukr.* тыкати, *p.* tykać] тыкаць, торкаць, тыцкаць

tikn *m*, *pl.* tikunim [*s.* (ים-)תקון(ת') →takone, mesakn] 1. папраўка, паляпшэньне, выпраўленьне; 2. узвышэньне, узьвялічваньне, ачышчэньне душы; 3. збор малітваў, канон; 4. *hum.* гарэлка [*sin.* ojsbeserung, farrixtung; derhejbung, ojslajterung; tfiles-

zamlung, kanon; branfn]; **tikn-tóes** *m*, -n [*s.* (ן-)תּעוּת] *plgr.* выпраўленьне памылак, сьпіс заўважаных памылак; **tikn-(lejl-)švúes** *m* [*s.* (לילׄ)שבועות] пэўныя ўрыўкі з Торы, якія чытаюцца ў першую ноч Швуэсу; **tikn-xcós** *m* [*s.* חצות] шэраг малітваў і плачаў, якія чытаюцца апоўначы ў памяць аб разбурэньні Ерусалімскага Храма

• krign*/gefinen* a tikn атрымаць належнае месца ў гісторыі

• trinken* tikn выпіваць ў сынагозе на ўгодкі па бацькох

tikn=tuk(e)n акунуць, акунаць

tik(tákev)en [*d.* ticken, *fr.* tic tac] 1. цікаць, чыкаць, тыхкаць; 2. *n*, **tiktak** *m* ціканьне (гадзіньніка)

tikune-zójer [*s.* תיקוני־זוהר] назоў часткі кнігі "Zojer"

tikve *f*, -s [*r.* тыква] гарбуз

til *m* [*p.* tył, *ukr.* тил] тыл; **tilek/tilik** *m*, -lkes заднік (абутку); тыл, зад; крыж (у каня)

tílikn [*d.* tilgen, *mhd.* tiligen] вы-, зь|нішчыць, вы-, зь|нішчаць

tilige=telige *f*, -s калёсы, драбіны, драбы, воз

tilim/thilem *m*, **tílim-bux** *m/n*, *pl.* -bixer [*s.* תהי)לים] *inx.* псалтыр; **tíleml** *n*, -ex псалтыр невялікага фармату для штодзённага чытаньня

• a kapitl tilim псальма

• zogn/rajbn*/hakn/brokn tilim чытаць псальмы адну за адной

• fun tilim zogn tut der bojx nit vej, ober zat ken men nit vern *śprxv.* ад псальмаў жывот не забаліць, але і сытым ня будзеш

• Fremd bin ix nit, /ir kent mix ganc git, /ix hob dokumentn a sax! /Majn pas dem altn /halt ir bahaltn, /alejn in der šafe ba ajx. /Di bibl di fajne, /di iz dox majne, /nit emes, fillajxt, vos ix zog? /Un dos tileml vos, nejn? /Lejent ir alejn /iber far ajx ale tog. (A. G.) Я не чужы, вы мяне добра ведаеце, я маю шмат дакумэнтаў! Мой стары пашпарт вы схавалі ў сваёй шафе, прыгожая Біблія таксама мая, ці мо няпраўда тое, што я кажу? І псальмы, што, можа не? Вы перачытваеце самі сабе штодня.

• tilim štopt *glxv.* псальмы скрапляюць (жывот)

• (ven) tilim volt geven (zol zajn) a refue, volt men es farkojft/gekojft in der aptejk (Š.-A.) калі б псалтыр быў лякарствам, ім бы гандлявалі ў аптэцы

• vi kumt tilim cu gešvilexc? *glxv.* ці пасуюць псальмы пухліне? (звычайна родзічы чытаюць у сынагозе за хворага псалтыр)

tilko [*ukr.* тільки] *adv.* толькі

tíl-tel [*s.* תּל־ →tel]

• maxn til-tel крытыкаваць; губіць, разварацiць, разбурыць

tiltl-hadérex *m* [*s.* לטול־הדרך)טי)] дарожныя клопаты; напружаньне, якое зьвязана з паездкай

timenice *f*, -s [*ukr.* тім'я, тіменица] кароста, лішай, пархі, шолудзі (звычайна ў дзяцей)

timján *m* [*r.* тимьян, *p.* tymianek] *bot.* чабор

timxe *m*, -s [*s.* (ם-)תימחה] мянушка для армяніна [*sin.* armener]

• er iz a timxe *glxv.* ён армянін

tinef *m* [*s.* טינוף →tinojfes] 1. гразь, бруд, сьмецьце, барахло, хлам; недабраякасны тавар, тандэт; экскрэмэнты, гаўно; 2. гідкі, ганебны, паскудны, плюгавы чалавек;

tinek *m*, *pl.* tinojkes, *dim.* **tinójksl** *n*, -ex [*s.* (ות-)תינוק →tinojkes-] немаўля(тка), грудное дзіцё [*sin.* zojgkind, klejn kind]

• iz in hojf a tinek geven – a jingele azojns (Prc.) у двары было немаўля – такі малютка-хлапчаня

tinfe *f*, -s [*p.* tynf, *d.* Tympf] старапольская манэта (36 грошай)

tink *m/f* [*p.* tynk, *ukr.* тинькъ] тынк; **tínkeven** тынкаваць

tínk(e)ler vern* [*mhd.* tunkeln] цямнець, цьмянець, гаснуць

tinken*=tunken* (getunken/getúnkt) [*d.* tunken] мачаць, акунаць

• tinken hejst nit trinken мачаць і піць – розныя рэчы

tinojfes *n*, -n [*s.* (ן-)טינוף →tinef] 1. адкіды, астачы, барахло, хлам, адкіды, астачы, гразь, бруд, сьмецьце; экскрэмэнты, гаўно; 2. плюндра, задрыпа, няхлюй, нязграй, заткала, шмаравоз [*sin.* šmuc, ekskrementn, gemejne zax, opfal]

tinojkes-šel-bejsrábon *pl.* [*s.* תינוקות־של־בית־רבן →tinek] школьнік, вучань хедара [*sin.* šulkinder, xejder-jinglex]

• me nemt tinojkes-šel-bejsrabon fun xejder arojs, ništo kejn rebe-gelt cu coln (Prc.) вучня забіраюць з хедара: німа грошай, каб плаціць настаўніку

tínterl *n*, -ex [*d.* Tinte?] ухаба, выбоіна, калдобіна

tint *m/f*, -n [*d.* Tinte] атрамант, чарніла; **tinter** *m*, -s, *dim.* **tínterl** *n*, -ex; **tíntfas** *n*, **tínt(h)orn** *m*, -s атрамантніца, чарніліца; **tintler** *m*, -s (-n/-ke *f*, -s) пісака; **tint(l)en=tentlen** мазаць, пэцкаць

• lign in tint апынуцца ў цяжкім матэрыяльным становішчы

• dajne ejgelex zajnen tinterlex. /un dajne bekelex iz best papir. /dajne hentelex zajnen pendelex – /šrajbn zolstu ofte briv cu mir *flksl.* твае вочкі – чарнільніцы, твае шчочкі – лепшая папера, твае ручкі – пер'я, пішы мне часьцей лісты

• tint trikent šnel ojs, trern ništ атрамант высыхае хутка, слёзы – не

tipe *f*, -s [*s.* (ות-)טפה(י)מ] кропля семені (спэрма) [*sin.* zomentropn]; **tipe-min-hajám** *f* [*s.* מן־החים] кропля ў моры [*sin.* tropn fun jan, zejer vejnik]; **tipe-srúxe** *f* [*s.* סרוחה] "сьмярдзючая кропля" (кропля семені, якая сымбалізуе чалавечае нізкае паходжаньне)

tipeš *m*, *pl.* tipšim [*s.* (ים-)טפש(י)מ] дурань, кеп [*sin.* nar]; **tipše** *f*, -s [*s.* (ות-)טפשה(י)מ] дура, кепка; **tipšes** *f* [*s.* ות-] дурасьць, глупства

• er iz a gebojrener tipeš (er iz a tipeš fun gebojrn on) ён прыроджаны дурань

• a tipeš rexnt alemen far tipšim дурань лічыць усіх за дурняў

• vejn ništ, du tipše ejne (M.M.-S.) ня плач ты, дура

típišer [*d.* typisch] тыповы; **típiškajt** *f* тыповасьць

tir *f*, -n [*d.* Tür] дзьверы; **tírhiter** *m*, **tírvexter** *m* парт'е, брамнік, вартаўнік пры варотах; **tirgleki** *n*, -ex званок на дзьвярох

• brexn*/rajsn* zix in an ofener tir ламацца/біцца ў адчыненыя дзьверы

• vajzn* emecn di tir паказваць камусьці на дзьверы

• (nit) visn*, vu a tir efnt zix (cu efenen) (ня) ведаць, дзе дзьверы адчыняюцца (ведаць усе сакрэты)

• vojnen tir cu tir (mit) жыць дзьверы ў дзьверы

• an oreman štejt ba der tir *glxv.* бядняк стаіць пад дзьвярыма

• es gejt im durx tir un (durx) tojer/fencter *glxv.* яму выходзіць празь дзьверы і праз браму/вакно (калі вядзецца, то і на трэску прадзецца)

• Lomir zix iberbetn, iberbetn, /vos štejstu ba der tir? /Lomir zix iberbetn, /gib a kuk af mir. *flksl.* Давай перапросімся, што ты стаіш ля дзьвярэй! Давай перапросімся, паглядзі на мяне.

tir *m*, -n [*d.* Tier] жывёл(ін)а; **tirgortn** *m*, -s заасад

tiran *m*, -es [*p.* tyrać] чалавек, які хутка зношвае вопратку

tirde *f*, -s [*s.* (ות-)מדרה(י)מ →tored, fartoreter] занятак, клопат, турбота [*sin.* bašeftikung, zorg]

tiré *m/n*, -en [*fr*. tiret] працяжнік

tiref *m*, *pl*. tirufim [*s*. (-ים)מירוף →meturef] зьбянтэжанасьць, вар'яцтва, дур(асьць) [*sin*. gajstike cemišung, mešugas]; **tiref-diker** звар'яцелы, ашалелы, асатанелы; **tiref-hadá(a)s** *m* [*s*. הדעת] вар'яцтва, замарачэньне, ашаламленьне, зацямненьне сьвядомасьці; *med*. змрочны стан

tirkltojb=térkltojb=túrkltojb *f*, -n *zool*. туркаўка; **tirklen=terklen=torklen** туркатаць, буркатаць, буркаваць

tirkóz *m*, -n, **turkiz=terkiz** *m* біруза

tirxe *f*, -s [*s*. (-ות)טרחה/טרחה →tarxenen, matriex, cuzamenterxen] праца, напру(д)жаньне, натуга, фатыга, турбаваньне, клопат; работа [*sin*. mi, onštrengung; arbet]

• s'iz umzist di tirxe (Š.-A.) гэта марны клопат

• s'iz a cu grojse tirxe? ці не завялікі клопат?

• an avejre di tirxe марная праца (больш заходу, як карысьці; такая работа – ні ў чэсьць ні ў ласку)

tisxadeš [*s*. תתחדש] *int*. з абновай! (віншаваньне з нагоды ...зяваньня новай вопраткі) [*sin*. zolst banajen!]

tiš [*s*. Tisch] стол; **tiš(l)er** [*mhd*. tischer] *m*, -s сталяр; **tišleráj** *f* ...ярства; **tíščajg** ■ сталовая бялізна; **tišgešir** *n* сталовы ...рад; **tišgret** *n* сталовая бялізна; **tíškestl** *n*, -ex шуфляда; **tišlomp** *m*, -n настольная лямпа; **tíš-nign** *m*, *pl*. -nigunim ...(ים-)נגון] застольны напеў, застольная мэлёдыя; **tištex/tíštux** *m/n*, *pl*. -er/-tixer абрус, настольнік, скацерць; **tíštexl** *n*, -ex сурвэтка; **tíšzalc** *f* сталовая соль

• dekn dem/cum tiš накрыць на стол

• gejn* cum tiš ісьці да стала (садзіцца есьці)

• praven/firn tiš *xsd*. весьці за агульным сталом дыскусію сярод вернікаў; дыскутаваць з вучнямі

• untern tiš пад сталом (пры замкнутых дзьвярох, без агалоскі)

• arbetn (es tut zix dort) af tiš(n) un af benk *glxv*. працаваць на стале і на лавах (дым стаіць каромыслам)

• es iz do/nito mit vemen (cu) gejn cum tiš (cum tiš cu gejn) *glxv*. тут ёсьць/німа з кім сесьці за стол (з кім пагутарыць)

• fun ejn tiš vert men nit zat *šprxv*. з аднае стравы не насыціцца

• vilstu hobn fiš, lejg dos gelt afn tiš *glxv*. хочаш мець рыбу, кладзі грошы на стол

• zej kenen gejn untern tiš špacirn! яны могуць ісьці пад стол гуляць! (пра невысокую пáру)

tišbi *m* [*s*. תשבי] азначэньне для прарока Ільлі

tišbojres *f/n* [*s*. תשבורת] *mat*. дроб; лік з дробамі [*sin*. broxcoln, frakcje-coln]

tišboxes *pl*. [*s*. תשבחות] хвалебныя сьпевы, гімны [*sin*. lojbgezangen]

• di fojglen hobn gezungen šire, di binen gežumet tišboxes (Ptc.) птушкі сьпявалі хвалебныя песьні, пчолы гудзелі гімны

tiše [*s*. תשעה] дзевяць [*sin*. najn]; **tišebóv** *m* [*s*. תשעה באב →šivoser-betamez] дзявяты дзень ава (дзень посту ў памяць аб зруйнаваньні першага і другога Ерусалімскіх Храмаў у 586 г. да н.э. і ў 70 г.); азначэньне для жалобнага настрою; **tíše-najncik** вельмі шмат, тысячы

• a ganc jor borves, un tišebov in zokn *glxv*. увесь год босы, але ў пост у шкарпэтках

• tišebov hobn di flej a jarid *glxv*. постам у блох кірмаш (таму што жыды сядзяць у шкарпэтках на зямлі)

• zejer trojerik iz geven, tišebov iz geven in štub (Š.-A.) было вельмі сумна, жалобны настрой панаваў у хаце

tišen/tješen (zix) [*ukr*. тішити, *p*. cieszyć] цешыць, пацяшаць

• tišen zix mit der hofenung цешыць сябе надзеяй

tišim [*s*. תשעים] дзевяноста (гадоў) [*sin*. najncik (jor)]

tíškeven [*s*/.?] *argo* хаваць, утойваць, таіць, скрываць

tišonce/tisjači [*p*. tysiąc] тысячы

tišre *m* [*s*. תשרי] тышры, першы месяц гэбрэйскага календару (верасень-кастрычнік)

titl *m*, -en, **títúl** *m*, -n [*d*. Titel] 1. загаловак; 2. тытул; **títlblat** *m* тытульны аркуш

Tites/Titus haroše [*s*. טיטוס הרשע] рымскі імпэратар Тытус, які зруйнаваў Ерусалім у 70 г.

• a roše vi Tites ліхадзей як (імпэратар) Тытус

• zajn* a Titus *fig*. быць ліхадзеем

• Tituses vereml zol dir arajn in kop! *kll*. каб Тытусаў чарвяк улез табе ў галаву! (паводле легенды, чарвяк завёўся ў галаве рымскага імпэратара Тытуса як пакараньне за спаленьне Ерусалімскага Храма)

titún=tutún/tutín *m* [*p*. tytoń, *ukr*. тютюн] тытун

tivjes *n* [*s*. טבעות] натуральнасьць, натуральная рэч, зьява [*sin*. natirlexkajt, natirlexe deršajnung]

tixer *pl*. →tux *n* хуста, палатніна, лайніна; **tixl** *n*, -ex хуст(ач)ка, насоўка; ануча; **tíxernik** *m*, -es анучнік

• gelbzajdene tixlex "жоўтыя ядвабныя хустачкі"; *fig*. прастытуткі, "подсьцілкі", "вяхоткі"

• a mejdl iz vi a zejdn tixl – az es vert nor a flek, vestu (kon men) es mit zibn zejfn nit ojsvašn *šprxv*. дзяўчына, як дзедава насоўка, – варта толькі зьявіцца пляме, у сем вод /мылаў не адмыеш

tixje [*s*. תחי'/תחית →šetixje] хай яна жыве (словы, якія дадаюцца пасьля ўзгадваньня жанчыны)

tíxtiker [*d*. tüchtig] энэргічны, чынны, дзейны, актыўны; **tíxtikajt** *f* энэргічнасьць, чыннасьць, дзейнасьць, актыўнасьць

tizlik=tuzlik *m*, -es кароткае паліто, шубка, кажушок

tjanučke *f*, -s [*r*. тянучка] тягучка

tjop(k)en [*ukr*. тьопати] цёпкаць (нагамі), тупаць, шлёпаць (па гразі)

tjox(k)en/tjoken [*ukr*. тьохкати] ёкаць, грукаць, сьціскаць (аб сэрцы); **tjox** *m*, -n, **tjoxke** *f*, -s ёканьне, сьціскальне, стук(ат) (сэрца); **a tjoxke ton*** ёкнуць

• s'hot mir a tjoxke geton dos harc (es tjoxket mir in harcn) маё сэрца ёкнула

tjuken [*ukr*. тюкати] цюгакаць

tjul *m* [*d*. Tüll, *fr*. tulle] цюль, гуля; **tjúlener** цюлевы

t(j)urme *f*, -s турма, вязьніца, засьценак

tkie *f*, -s [*s*. (-ות)תקיעה →švorim, true] гук шофара, дудзеньне ў шофар; працяглы гук шофара; **tkie-grójle** *f* [*s*. גדולה] вельмі доўгі і працяглы гук шофара, які гучыць напрыканцы дудзеньня

• far tkies hot der xazn nekies *glxv*. перад дудзеньнем у шофар кантар сера (ён мусіць мець чыстую душу і цела)

tkies-káf *m*, -n [*s*. (-ן)תקיעת כף] сьвятое абяцаньне, выказанае падаваньнем рукі

• gebn* tkies-kaf даваць абяцаньне

tkifes *n* [*s*. תקיפות] рашучасьць, моц, мочнасьць, энэргія, уплывовасьць; аўтарытарызм, дэспатыя [*sin*. antšlosnkajt, festkajt, energie; heršeriškajt, ojtoritarizm, mutvilikajt]; **tkífesdiker** аўтарытарны, дэспатычны; **t(a)kifim** *pl*. →takef/takif *m* [*s*. (-ים)תקיף] пан, уладар, валадар, верхавод; уладны, фанабэрысты, ганарысты, горды, уплывовы чалавек, *fig*. туз

tkufe *f*, -s [*s*. (-ות)תקופה] эпоха, век, эра, пэрыяд; пара

году; раўнадзенства, сонцастаяньне [*sin.* period, cajtopśnit, ерохе]; **tkufes-nísn** *f* [*s.* תקופת־ניסן] канец зімы і пачатак вясны; веснавы час; **tkufes-téjves** *f* [*s.* תקופת־טבת] канец восені і пачатак зімы; зімовы час; **tkufes-tíšre** *f* [*s.* תקופת־תישרי] канец лета і пачатак восені; восеньскі час; **tkufes-tómez** *f* [*s.* תקופת־תמוז] канец вясны і пачатак лета; летні час

• di goldene tkufe залаты век

• di tkufe falt – lejg di hak af di ejer! раўнадзенства прыйшло – кладзі сякеру на яйкі! (з анэкдоту) (*folk.* лічылася, што трэба ў раўнадзенства пакласьці кавалачак жалеза на бочку з вадой)

tkume *f* [*s.* תקומה] выжываньне, збавеньне, выратаваньне, вызваленьне, ажыўленьне, адраджэньне; спадзяваньне на збавеньне [*sin.* ufrixtung, ufleb]; **tkúmediker** доўгатэрміновы, працяглы, даўгачасны

• hobn* a tkume захавацца, ачуцца, акрыяць

tle [*s.* טלה] *astr.* Казярог (месяц нісан) [*sin.* baran]

tlie *f*, -s [*s.* (תליה-)ות →taljen, tole] шыбе(ль)ніца; **tlíe-humor** *m* гумар шыбельніка

• vi fun a tlie zix opgerisn як з шыбеніцы/ланцуга сарваўся

• fun velxer tlie hot er zix opgerisn? зь якой шыбеніцы ён сарваўся?

• afn ganev vart di tlie (dos štrikl) *šprxv.* злодзея чакае шыбеніца (і злодзей да пары крадзе; колькі б воўк ні валок, павалакуць і воўка; адрыгнуцца ваўку авечыя слёзы)

• der xoxem sejxelt zix afile fun der tlie arop *šprxv.* мудрэц разумнее нават ад шыбеніцы

• di cung firt a mol dem menčn cu der tlie *šprxv.* язык і да шыбеніцы давядзе (языку дай волю, завядзе ў няволю; празь язык галаву съцінаюць)

tlíen (zix) [*p.* tleć, *ukr.* тліти] тлець; **tlíendiker** тлеючы

• a fajer tliet агонь тлее

• in im tliet nox a funk lebn у ім яшчэ тлее жыцьцёвая іскра

tliken/tluken [*p.* tłuć, tłuk] біць, удараць, (вы)цяць; **tliken zix** цягацца, валачыцца, бадзяцца, швэндацца, шлындаць; **tlik/tluk** *m*, -es 1. удар; 2. шлюха, шлюндра, плёха, шлында, курва

tlís(gang) *m*, -n [*p.* kłus, *ukr.* клус] рысь (хадá); **tlis(e)n** (gejn* tlísgang) ісьці/бегчы рысьсю/трушком

tlo=klo *f*, -en [*d.* Klaue] капыт; **tlóediker** капытны

• cekalječen dem ferd a tlo bam šmidn закаваць каня ў каваля

tlumáč *m*, -s [*p.* tłumacz, *ukr.* тлумач] тлумач, пераклад(аль)нік

tlumik/tlumek/tlumok/tlomek=klumik/klumek *m*, *pl.* -es /klumkes [*ukr.* клумок, тлумок, *p.* tłumok] клунак, хатуль

• az me hot lib dem gast, šanevet men zajn tlumik *glxv.* паважаеш госьця, шануй і яго клунак/гасьцінец

• az me vil nit (hot fajnt) dem oreman, varft men arojs zajn tlumik *šprxv.* калі бядак не пажаданы, дык выкідваюць ягоны клунак

tmeim *pl.* →tome *m* [*s.* (טמא-)ים] нячысты, д'ябальскі, чартоўскі (чалавек/прадмет); разбэшчаны чалавек; сутэнэр

tmie *f* [*s.* תמיה →bitmie] зьдзіўленьне [*sin.* farvunderung]

tmimes *n*, **tmímesdikajt** *f* [*s.* תמימות →bitmimes] бязьвіннасьць, непавіннасьць, наіўнасьць, прастадушнасьць, няхітрасьць, шчырасьць, чыстасардэчнасьць, адкрытасьць [*sin.* umšuldikajt, naivitet, ufrixtikajt]; **tmímesdiker** наіўны, нявінны, няхітры, прастадушны

tmixe *f* [*s.* תמיכה] грашовая дапамога, падмога, помач, падтрымка [*sin.* gelthilf, unteršticung]

tmunes-ós *n* [*s.* תמונת־אות] форма літары

• ništ kenen* kejn tmunes-os ня ўмець чытаць, быць непісьменным

• ništ krign* kejn tmunes-os не атрымаць жаднай літары (ані ліста/вестачкі)

• biz afn hajntikn tog ništo fun zej kejn tmumes-os (M.M.-S.) да сёньняшняга дня ад іх німа ані вестачкі

tmure [*s.* תמורה] *tlmd.* "замена"; назоў 6-га трактату 5-га разьдзелу (запаветы аб замене аднае ахвяры на іншую і аб скаціне, якая прыдатная альбо непрыдатная для ахвяраваньня) [*sin.* farbajtung]

tnaj *m*, *pl.* tnoim [*s.* (תנאי-)ם →tane, bitnaj, masne, getnaj, altnaj] умова [*sin.* bading]; **tnáj-cejxns** *pl.* умоўныя адзнакі; **tnáj-get** *m* [*s.* גט] развод, які канаючы мужык дае сваёй жонцы, пасьля якога тая не павінна вызваляць швагра ад абавязку браць яе за жонку (такі развод лічыцца нядзейсным у выпадку, калі мужык застаецца жыць); **tnáj-fraj** *f* вызваленьне на (пэўных) умовах; **tnáj-frajer** вызвалены на (пэўных) умовах; **tnaj-kójdem-lemájse** *m* [*s.* קודם־למעשה] неабходны/патрэбны стан, неабходная ўмова; **tnoim** 1. *pl.* шлюбны кантракт /дагавор; 2. *m*, -s заручыны, урачыстая бяседа з нагоды падпісаньня шлюбнага кантракту [*sin.* knas-mol]

• avekšteln a tnaj (šteln als tnaj) (па)ставіць умову, абмежаваць умовай

• bafrajen af tnaj вызваляць на (пэўных) умовах

• er gejt ajn af ale ajere tnoim ён згодны на ўсе вашыя ўмовы

• hobn* far tnaj-kojdem-lemajse дапушчаць

• mitn tnaj, az... з умоваю, што...

• ojsnemen* a tnaj абумоўліваць

• opšikn di tnoim парушыць шлюбны кантракт

• šrajbn* tnoim складаць шлюбны кантракт

• beser di tnoim cerajsn, ejder di ksube *glxv.* лепш скасаваць заручыны, чым шлюб

• – Kejn knasmol konen mir nit maxn, /x'hob an eltere švester fun mir... /– Kejn tnoim konen mir nit šrajbn –/ix štej nit on dajn mamen far kejn šnur. *flksl.* – Заручынаў у нас быць ня можа, я маю старэйшую сястру... – Брачны кантракт пісаць мы ня можам – я не падыходжу тваёй маці ў нявесткі.

tnue *f*, -s [*s.* (תנועה-)ות] 1. міґі, рух цела, жэст, манера; грымаса, міна; 2. *gram.* гэбрэйскі дыякрытычны знак [*sin.* bavegung, žest; mine, grimase; hebreišer vokal-cejxn, nekude]

• fojle tnues лянівыя рухі

• maxn tnues грымасьнічаць, строіць рожы

• šlexte tnues дрэнныя манеры

to=tik [*p.* to] *hndv.* то, дык

• to farvos gejt er nit? дык чаму ж ён ня йдзе?

• to red/švajg! дык кажы/маўчы!

• to ven vestu kumen? дык калі ты прыйдзеш?

• to vos? ну дык што?

• to zol zajn azoj хай будзе так

• bistu gekumen in a štot, to leb lojt zajne gezecn *glxv.* калі ты прыйшоў у горад, то жыві па ягоных законах (у чужой царкве не папраўляй сьвечак)

točen [*p.* toczyć, *ukr.* точити] тачыць (што-/каго-небудзь); **toči(d)le** *f*, -s тачыла

• točen emecn vi a vorem точыць кагосьці як чарвяк (як шашаль)

todl *m* [*d.* Tadel] ганьбаваньне, папрок, вымова

toes *m, pl.* -n/teusim [*s.* (טעות-/ן-/ים) →umtoesdiker, betoes, toje] памылка [*sin.* umrixtike mejnung; grajz, feler, farzen]; **tóesdiker** памылковы; **toje zajn* zix** [*s.* טועה] (hobn* ■ toes) памыліцца, памыляцца, схібіць; **toes-hadfús /-hatfús** *m*, -n [*s.* (הדפוס-/ן-)] памылка друку, абдрук

- alpi toes памылкова
- hobn* a toes in xežbn зрабіць памылку ў разьліках
- hobn* toes in pšat няправільна нешта зразумець
- lebn in toes памыляцца
- maxn a toes зрабіць памылку
- optišer toes аптычны падман
- tojte hobn ništ kejn toes *šprxv.* толькі нябожчыкі не памыляюцца

tof=tov=t *m/f*, -n [*s.* (תוו/תיו-/ן-)] 1. "тоў", літара гэбрэйскага альфабэту; 2. лічба 400

tofes [*s.* תפוס →tafsn, tojfes, (bal-)tfise] арыштаваны, пасаджаны, увязьнены [*sin.* arestirt, ajngezect]

- ajnzecn tofes засадзіць за краты

tofl *m, pl.* -en/tfejlim [*s.* (טפל-/ען-/ים)] неістотнасьць, другараднасьць, няважнасьць, дадатак; **tófldiker** неістотны, другарадны, няважны; **tofl-mókem** *m/n* [*s.* מקום] стары квартал, старое места

tog *m, pl.* teg [*d.* Tag] дзень; **tóg(ed)iker, togtéglexer** штодзённы, звычайны; **togtéglexkajt** *f* штодзённасьць, звычайнасьць; **togn** 1. (рась)сьвітаць, на сьвет займацца, разьвідняць, разьвіднець, днець, шарэць; 2. дняваць; 3. згасаць, зьнікаць; **tóg-arbet** *f* падзённая праца; **tóg(-)arbeter** *m*, -s падзёньнік, падзёншчык; **tógblat** *n, pl.* -bleter, **tógcajtung** *f*, -en штодзённая газэта; **tógbux** *m/n, pl.* -bixer дзёньнік; **tog-dájges** *pl.* [*s.* (דאגה-/ות)] штодзённы клопат; **tóghejm** *f*, -en дзіцячы садок; **tóglixt** *n* 1. сьвітаньне; 2. дзённае сьвятло; **tóglojn** *m* [*d.* Tagelohn] дзённы заробак, штодзённая плата; **tog-ójs tog-ájn (tog-ájn tog-ójs)** *adv.* кожны дзень, штодня; **tógšajn** *f* дзённае сьвятло

- a bljask/brazg/štik af tog сьвітаньне, золак
- a gancn/libn tog увесь дзень
- a grojser tog un gejt ojx avek вялікі дзень, але таксама праходзіць
- ■ gutn tog! дабрыдзень! дзень добры!
- af a švern/šlextn/švarcn tog на цяжкі/благі/чорны дзень
- ale tog штодня, кожны дзень
- afn andern tog на другі дзень
- ba tog удзень
- biz in (bizn) vajsn tog (arajn) да сьвету, на досьвітку
- di najn teg дзевяць дзён посту (1–9 ава) [→tišebov]
- drajmol in a tog тры разы на дзень
- ejn tog ibern andern церазь дзень
- es togt (šojn)! es vert tog! (ужо) днее/сьвітае!
- far tog(s) на золку/досьвітку/сьвітаньні, ранкам, раніцой, нараніцу, сьвітанкам
- farn tog на працягу дня
- gance(ne) teg цэлымі днямі
- gecejlte etlexe teg лічаныя дні
- grojser/heler tog (цалкам) увесь дзень
- halber tog паўдня, полудзень, поўдзень, паўдзеньне
- hejbn*/lojbn in tog arajn узносіць да нябёс
- iber axt tog dinstik у аўторак на наступным тыдні
- in ejn šejnem tog у адзін прыгожы дзень (аднаго дня)
- in mitn heln tog сярод белага/яснага дня
- lebn a (frejlexn/gutn/lixtikn) tog жыць цяперашнім днём, мець шчасьлівы час, жыць прыпяваючы
- mitn tog glajx як толькі сьвет, як заднее
- tog far/af/nox tog дзень за днём
- tog fun gebojrn дзень нараджэньня
- togn un nextikn дняваць і начаваць
- vartn af emecn tog af tog чакаць кагосьці з дня на дзень
- vos a tog штодня
- Don gejt tog-teglex in klajzl, /un Donje tog-teglex in step. /Don hot cvej pejelex švarce, /un Donje cvej goldene cep. (H. R.) Дон штодня ходзіць у сынагогу вучыцца, а Доня штодня ў стэп. У Дона дзьве чорныя пэйсачкі, а ў Доні дзьве залатыя касы.
- es vet kumen af im/emecns a tog (es felt im a tog) прыйдзе й на яго час
- vos a tog iz men neenter cum grub *šprxv.* штодзень усё бліжэй да магілы
- zajne teg zajnen gecejlte ягоныя дні зьлічаны (пара да двара; век скончыўся; капец прыйшоў; сік, пердзь – недалёка сьмерць)

toher *pl.* tehojrim [*s.* (טהור-/ים) →tare, thores, metaer, mestoher] ясны, чысты; нявінны, непавінны, бязьвінны, непарушны [*sin.* rejn, lojter; umšuldik; *ant.* tome]

toj *m*, -en [*d.* Tau] расá; **tójele** *n*, -x расінка; **tójiker** росны; **tójfrost** *m*, -s шэрань

tojb *f*, -n, (-ixe *f*, -s), *dim.* **tajbl** *n*, -ex, **tájbele** *n*, -x [*d.* Taube] голуб; **tójbener** галубіны; **tójbnpost** *f* галубіная пошта; **tójbnšlak** *m, pl.* -n/-šlek [*d.* Taubenschlag] галубятня

- štile tojb *fig.* ціхі голуб (аб чалавеку)
- a vajbele iz a tajbele un a tajvele *glxv.* жоначка – галубка і чарцяня (баба зь пекла родам; чорт і баба – адна рада)
- er iz štil vi a tojb ён ціхі як голуб
- gebrotene tajbelex/tojbn flien nit in mojl arajn (er vil, gebrotene tojbn zoln im flien in mojl arajn) *šprxv.* пячоныя галубы не ляцяць да губы
- tojbn štejen ba majn fencter, /vajse tojbn cvej, /efenen vel ix dem fencter, /efenen far zej (Z. V.) галубы стаяць ля майго вакна, двое белых галубоў, я адчыню вакно, адчыню для іх
- zej lebn (cvišn zix) vi (di) tojbn, un rajsn zix (arum) vi (di) hint/kec *glxv.* яны жывуць паміж сабой як галубы, але дзяруцца як сабакі/каты

tojber [*d.* taub] 1. глухі 1. *m*, -te глухі чалавек; **tojbkajt** *f* глухата; **tójblexer** глухаваты; **tójb-štúmer** [*d.* taubstumm] 1. *m*, -me глуханямы чалавек; 2. глуханямы; **tojb vern*** (а)глухнуць

- a tojb gesl глухі завулак
- a tojb vinkl глуш, глушыня
- a šul far tojbe школа для глухіх
- er iz tojb af an/ejn ojer ён глухі на адно вуха
- er iz tojb vi di vant ён глухі як сьцяна
- (s')iz tojbštil глуха
- kejner iz nit azoj tojb, vi jener/der, vos vil nit hern *glxv.* німа больш глухога, чым той, што ня хоча слухаць
- vos a tojber derhert nit, dos traxt er zix ojs *glxv.* што глухі не дачуе, тое дадумае

tojčen (zix) [*ukr.* товкти] таўчы, пхнуць, пхаць, штурхаць; *fig.* кіпяціцца, варыцца, бурліць, бушаваць

toje zajn* zix [*s.* טועה →umtoesdiker, betoes, toes] па-, аб|мыліцца, па-, аб|мыляцца, (з)рабіць памылкі, схібіць

tojem zajn* [*s.* טועם] пакаштаваць, паспытаць, паспра-

баваць, нешта зьесьці [*sin.* farzuxn; esn epes]; **tojem-tám zajn*** [*s.* טעם] пакаштаваць, паспытаць, паспрабаваць

tojen *m*, *pl.* tojanim [*s.* (-ים)טוען] патрабоўца, патрабавальнік, скаржнік, абвінаваўца [*sin.* moner, onkloger]

tojer *m*, -n [*d.* Tor, Tür] брама, вароты; **tójer-vexter** *m*, **tójerman** *m*, *pl.* -lajt брамнік, вартаўнік пры варотах

• farślogn* dem bol inem tojer arajn забіць мяч у вароты

• lebn dem tojer (ba di tojern) каля брамы/варотаў

• untern tojer (in tojer-durxgang) у варотах

• ale tojern zajnen farmaxt, nor der tojer fun raxmim blajbt ofn *śprxv.* усе брамы зачынены, апрача брамы жалю

• arajn – iz der tojer in turme ganc brejt, arojs – mesukn šmol *śprxv.* шырокія вароты ўвайсьці, ды вузкія выйсьці (да астрогу латво знойдзеш дарогу)

• di tojern fun trern zajnen kejn mol nit faršlosn *śprxv.* сьлёзнай брамы не замкнеш

tojfes zajn* [*s.* תופס/תופש →tafsn, (bal-)tfise, tofes] зразумець, у-, сь|цяміць, скеміць [*sin.* banemen, farštejn, bagrajfn]

• tojfes zajn* dem zinen fun di verter улавіць сэнс словаў

• gring tojfes zajn* *fig.* хапаць на ляту

tojfn [*d.* taufen, *mhd.* toufen] хрысьціць; **Tojf-hóge** *f* Вадохрышча; **tojfung** *f*, -en хрышчэньне, кшчэньне, хрэст, хрост; **tójfmolcajt** *m/f* хрысьціны, хрэзьбіны, ксьціны; **tójf-foter** *m*, -s хросны бацька; **tójfmuter** *f*, -s хросная маці; **tójftoxter** *f*, *pl.* -texter хросная дачка; **tójfzun** *m*, *pl.* -zin хросны сын; **tojf-kórev** *m*, *pl.* -krojvim [*s.* (-ים)קרוב] кум; **tojf-krójve** *f*, -s [*s.* (-ות)קרובה] кума

tojg=tejg *n*, -n цеста

tojger *m* [*s.* תוגר] турак; Турцыя [*sin.* der terk, Terkaj]

tojgn* (er tojg(t); getójgt) (cu, af) [*d.* taugen] гадзіцца, падыходзіць; быць годным/вартым; **tójg(evd)iker**, **tójgbarer**, **tójglexer** (пры)годны, прыдатны; **tójg(evd)ikajt** *f*, **tójgbarkajt** *f*, **tójglexkajt** *f* (пры)годнасьць, прыдатнасьць; **tójgenixc/tójgenixts** *n*, -n [*d.* Taugenichts] нікчэмны, нязлатны, няварты чалавек; лайдак, гультай, абібок; **tojger** *m* годны, спраўны, патрэбны, прыдатны чалавек

• dos tojg afn fajer гэта гадзіцца толькі ў агонь

• es tojg cu gorništ (tojgn* af klogn, in kop cu šisn/gebn) нічога/нікуды ня варты (варты жалю)

• ot der štof tojg af a klejd гэта тканіна падыходзіць на сукенку

• s'tojg af kapores (in dr'erd arajn) нікуды ня годнае жыццё (хоць у зямлю кладзіся)

• tojgn* cum ejsek гадзіцца для справы

• vos tojg di xoxme? ці варта чаго гэтая мудрасьць?

• vos tojg dir dingen? колькі табе каштуе арэнда?

• a tojgenixc iz arajngefaln in der onfirung un korčet fun zix a held *glxv.* нікчэмны трапіў у кіраўніцтва і корчыць зь сябе гэроя (ніц ужо не парадзіш, калі погань моц узяла; выродзілася як пава, але дурная слава)

• Nor dem, vos ix hob lib, ken ix šojn nit nemen, /cu vos že tojg mir majn lebn af der velt? /Ject, az ix hob šojn, mamenju, nit kejn mazl, /iz dox majn fajnkajt farśtert. *flksl.* Толькі за таго, каго люблю, я выйсьці не магу, навошта ж трэба мне жыць на сьвеце? Цяпер, матухна, калі ўжо мне німа шчасьця, прыгажосьць мая прападае.

• on a mazl tojg gor nit *glxv.* бяз шчасьця нічога ня зробіш

• ver es tojg nit far zix, der tojg nit far jenem *glxv.* шануйся сам, калі хочаш, каб другія шанавалі

• vos tojg der guter kop, az di fis kenen im nit trogn? *glxv.* чаго варта добрая галава, калі ногі ня здолеюць яе насіць? (нашто нам тыя бандалеты, калі страляць ня ўмеем?)

toj(h)u-vovój(h)u/tojevoje *m* [*s.* תו־ובוהו(ת)] першапачатковы хаос, гармідар, бязладзьдзе, разгардзіяш, бабілёнскае стоўпатварэньне [*sin.* xaos]

• a tojevoje fun bixer, ojsgemišt un cevorfn (Prc.) кніжны хаос – усё перамешана і параскідана

tojk *m*, -n [*p.* tok, *ukr.* тік] ток (памяшканьне для малацьбы)

tojmim [*s.* תאומים] *astr.* Блізьняты [*sin.* cviling]

Tojre [*s.* (-ות)תורה →min-hatojre] 1. *f* Тора, Пяцікніжжа; у шырокім разуменьні – гэбрэйскае рэлігійнае вучэньне, рэлігійныя веды; 2. *f*, -s дактрына, тэорыя, навука; *iron.* здольнасьць, здатнасьць, майстэрства, навык; выкрут, штукі, хітрыкі, фокус [*sin.* doktrine, teorje, lernung; feikajt, kunc]; **tójres-lokšn** *f hum./iron.* сьвятая праўда; веды, думка, філязофія; бязглузьдзіца, недарэчнасьць (пародыя на "Tojres-Mojše"); **Tojre-min-(h)ašomáim** [*s.* מן השמים] закон зь неба, боскі закон; **Tojre-šebalpé** *f* [*s.* שבעל פה] "вуснае рэлігійнае вучэньне"; талмудычная літаратура; **Tojre-šebiksáv** *f* [*s.* שבכתב] "рэлігійнае вучэньне ў рукапісе"; Пяцікніжжа; **Tojres-Mójše** *f* [*s.* משה] запаветы, вучэньне Майсея, Пяцікніжжа; **Tojre-kúle** *f* [*s.* כו(ו)לה] уся Тора, усе веды; **tojres-xáim** *f* [*s.* תורת חיים] жывая дактрына/навука; жыцьцяздольны закон; **tojre ugdule bemokem exód** [*s.* תורה וגדולה במקום אחד] веды і веліч, якія ідуць разам; адукаваны і багаты жыд

• a grojse Tojre! *iron.* валікая навука!

• dos iz a klejne Tojre гэта ня дзіва

• es štejt in der Tojre гэта напісана ў Торы

• lernen Tojre вывучаць законы юдаізму (Талмуд)

• nit kejn tife Tojre няхітрая навука

• onnemen* (mejnen, az) epes far tojres-lokšn лічыць нешта за чыстую манэту (наіўна прыняць што-небудзь напавер)

• tife Tojre прамудрасьці

• di Tojre hot nit kejn breg, nit kejn grunt *glxv.* Тора бязьмежная, бяздонная

• emes vi tojres-lokšn *glxv.* брахня (праўда такая як вош кашляе; праўда як на вярбе ігрушы (як у рэшаце вада); журавель на хвойцы)

• emes vi Tojres-Mojše (es iz Tojres-Mojše (emes); es iz Tojre emes) *glxv.* абсалютная/чыстая праўда (не падлягае сумневам, як вучэньне Майсея)

• er iz geven a jid a cacke, tojre ugdule bemokem exod (Š.-A.) ён быў ня жыд, а цацка, і адукаваны, і багаты – усё разам

• mit Tojre vert men in ergec nit farfaln *glxv.* з Торай нідзе не прападзеш

• Tojre iz di beste sxojre *flksl.* Тора/навука – лепшы тавар

• tojre iz kepele, kaše iz tepele *glxv.* веды – галава, каша – гаршчок

• tojre on meloxe iz nit kejn mazl-broxe *śprxv.* веды без рамяства – невялікае шчасьце

• tojre un sxojre, un gepucte štivl *glxv.* веды і тавар, і навакаваныя боты

• un az der rebe zogt /far dem ojlem Tojre, /hern ale xasidimlex /mit grojse mojre *flksl.* калі рэбэ чытае перад натоўпам Тору, усе хасыды слухаюць зь вялікім жахам

• vu Tojre, dort iz xoxme/kroxmal (un vu xoxme, dort iz lemeške/kraxmal/kroxmol; un rejner dżegexc) *śprxv.* дзе Тора, там мудрасьць/крухмал (а дзе мудрасьць, там і дурань/крухмал; і чысты дзёгаць)

tójsefes *m* [*s.* תוספות →bale-tojsefes] "дадатак" (істотны камэнтар да Талмуду, складзены ў XII–XIV стст.) [*sin.* cugobn]

tojšn (af) [*d.* tauschen] (аб)мяняць, абменьваць; **tojš** *m*, -n, **tojšung** *f*, -en абмен

tojšev *m*, *pl.* tojš(o)vim [*s.* (תושב-)ים] старажыл, карэнны, аселы жыхар [*sin.* štendiker ajnvojner, ajngezesener, hejmišer]; **tójšvim-lebn** *n* аселы склад жыцьця; **vern* tojšvim** пасяліцца

tojt *m*, -n [*d.* Tod] сьмерць; каюк, садухі, капец; **tojter** 1. *m* мярцьвяк, нябожчык; 2. мёртвы, памерлы, здохлы; **tójterhéjt** *adv.* мёртва, будучы мёртвым; **tojtkajt** *f* зьмярцьвеласьць; мёртвая цішыня; мерцьвячына; **tojtn=tejtn** зьмярцьвіць, забі(ва)ць, усьмерчваць; **tójt(n-)bet** *f/n*, -n сьмяротны ложак; **tójt-blaser** сьмяротна бледны; **tójtbrengiker**, **tójtgeferlexer** сьмяротны; **tójtfal** *m*, -n выпадак сьмерці; **tójtgeborener** мёртванароджаны; **tójtklap** *m*, *pl.* -klep сьмяротны ўдар; **tójt-kranker=tojt kranker** сьмяротна хворы; **tójtpunkt** *m*, -n мёртвы пункт; **tójt-šikerer=tojt šíkerer** [*s.* -ש(י)כור] п'яны да непрытомнасьці; **tójtšlog** *m* сьмяротны ўдар; **tójtšlogn*** [illegible] да паўсьмерці; **tójt(-)šrek** *m/f* сьмяротны жах; **tójtštilkajt** *f* мёртвая цішыня; **tójtštrof** *f*, -n пакараньне сьмерцю; **tójt(-)urtejl** *m*, -n сьмяротны прысуд

- [illegible] cum tojt да сьмерці
- [illegible] emecn dem tojt назаляць, надакучаць камусьці
- [illegible] zix dem tojt налажыць на сябе рукі
- [illegible] tojt nit lebedik ні жывы ні мёртвы
- ojszen* vi a tojter (hunt/koter/šlajen) выглядаць як здохлы (сабака/кот/лін)
- tojte štilkajt мёртвая цішыня
- tojt hungerik/mid сьмяротна галодны/стомлены
- tojt mit di bejner сьмерць з косткамі (вельмі кепска)
- ton* emecn cum tojt (in tojt arajn) не даваць камусьці жыцьця (атручваць жыцьцё)
- zix tojt-nojtn моцна напружвацца
- a guter tojt iz beser, vi a šlext lebn *šprxv.* добрая сьмерць лепш за кепскае жыцьцё
- a tojter maxt kejn krig nit on *šprxv.* нябожчыкі ня лаюцца (нябожчыкі ўсе добрыя)
- a tojtn trogt men nit curik *glxv.* нябожчыка назад не панясуць
- a zisn tojt zolstu hobn: a mašin mit cuker zol dir iberforn! *kll.* а бадай табе салодкая сьмерць: каб цябе машіна з цукрам пераехала!
- az me hot nit kejn brojt, iz erger vi der tojt *šprxv.* калі ня маеш хлеба, гэта горш за сьмерць (німа горшай балесьці, як хочацца есьці)
- der tojt iz afn noz (s'ligt im der tojt afn noz) *glxv.* сьмерць на носе
- der tojt iz far im vejnik сьмерць – для яго мала
- dos mieste/ergste lebn iz beser fun (dem) šenstn/bestn tojt *šprxv.* кепскае жыцьцё лепш, чымся прыгожая сьмерць
- far tojt zol zix nit glustn *glxv.* нельга быць прагным перад сьмерцю
- farn tojt glust zix *glxv.* перад сьмерцю ўсе прагныя
- got git nit dem tojt in di hent *šprxv.* бог не дае сьмерць у рукі (трэба яшчэ добра намучыцца)
- on a tojtn muz fargesn vern *šprxv.* што зарыта, то забыта (усё забыта, што зямлёю прыкрыта)
- zolst zix matern bizn tojt! *kll.* каб ты пакутаваў да сьмерці!

tojv (*pl.* tojvim) [*s.* (טוב-)ים →mejtev, letojve, baltojve, bas-tojvim, bentojvim, tuve(j)-] добры, лагодны, ласкавы; **tojv-detójv** [*s.* דטוב] вельмі/дужа/надта добры; **tojve** *f*, -s [*s.* (טובה-)ות] услуга, паслуга, дабро, ласка, літасьць [*sin.* guts, nucn, profit; gefelikajt, laske; *ant.* roe]; **tojves-haklál** *m* [*s.* טובת־הכלל] агульнае дабро, калектыўны інтарэс; **tojves-hanóe** *f* [*s.* הנאה־] выпадковая/дадатковая выгада/карысьць

- a šejne tojve ton* *hum.* удружыць, зрабіць ласку, аказаць паслугу
- er hot derfun a tojve яму ўсё на карысьць
- ot dos iz ejn mol a tojve! вось гэта зрабіў ласку!
- tu mir a tojve! зрабі ласку!
- a fremder oreman tut dem hejmišn kejn tojve nit *šprxv.* чужы бядняк свайму ласкі ня зробіць (ён забірае ягоную частку)
- a jid ken nit ojshaltn kejn rov tojve *glxv.* жыд ня здатны на вялікую ласку
- az cvej šlogn/krign zix, kumt dem dritn arojs a tojve *šprxv.* дзе двох сварацца, там трэці карыстаецца (дзе двох зваду вядзе, там трэці крадзе)
- az got tut a tojve, barimt er zix nit (far kejnem) *šprxv.* калі бог робіць ласку, ён ні перад кім не выхваляецца
- gut iz a jidn a tojve cu ton *hum. glxv.* прыемна жыду ласку зрабіць (кажуць, згуляўшы з кімсьці жарт)
- trog nit kejn tojves iber fremde hajzer *glxv.* не насіся з дабром па чужых хатах
- zibecn iz keminjen "tojv" [*s.* טוב] *glxv.* сямнаццаць паводле лікавага значэньня – "дабро"

tojvaas-bepé *f* [*s.* תובעת־בפה →balpe, pe-el-pe] нахабная жонка, якая дамагаецца ад мужыка сэксуальных зносінаў

tojveje *m*, *pl.* tojvim [*s.* (תובע-)ים →tvie] абвінаваўца, скаржнік, ісьцец, пазывальнік/пазывач у суд [*sin.* onkloger, moner]; **tojveje-bepé zajn*** [*s.* בפה־] дамагацца на словах

tojvl zajn* [*s.* טובל →tvile, tvul-, optojvlen] акунуць, акунаць; *rit.* рабіць ачышчэньне праз акунаньне ў вадзе [*sin.* ajntunken]; **tojvlen** *rit.* ачышчаць праз акунаньне ў вадзе, абмываць

- tojvl zajn* di nešome *hum.* абмыць душу (выпіць чарку)
- vifl ir zolt ništ a šerec tojvl zajn, blajbt er alc umrejn *šprxv.* колькі б вы зьмяю ў ваду не акуналі, яна ўсё роўна застанецца нячыстай

tójxexe *f*, -s [*s.* (תוכחה-)ות] *tnx.* адзін з разьдзелаў, у якіх пералічаны жахлівыя кары, якія чакаюць гэбрэяў у выпадку невыкананьня боскіх запаветаў; сьпіс праклёнаў; шэраг няшчасьцяў/бедаў

- di (gance) tojxexe hot zix af im ojsgegosn на яго звалілася ліха
- ojsgisn* af emecn di (gance) tojxexe (ojsšitn* di tojxexe af emecns kop) моцна клясьці/лаяць кагосьці

tojxn *m*, -s/-im [*s.* (תוכן-/ס-)ים] зьмест [*sin.* inhalt]; **tojxn-hoinjónim** *m* [*s.* הענינים־] зьмест [*sin.* inhalt-farcejxeniš, liste]

tojxn [*d.* tauchen] ныраць, даваць нырца; **tojxer** *m*, -s, (-n *f*, -s) нырэц

tojz=tejz *f*, *pl.* tajz [*d.* Daus, *mhd.* tûs] *kort.* туз

- di eršte tojz iz simen dales *glxv.* першы туз – знак галечы

tojznt *m*, -er [*d.* Tausend] тысяча; (der) **tójzntster**, **tójzntiker** тысячны; **tójznter** *m*, -s тысяча рублёў; **tojzntl** *n*, -ex тысячная частка; **tójzntjoriker** тысячагадовы; **tójznterléj** тысячным чынам

- farmogt azoj fil tojznter! каб вы мелі тысячы тысячаў!

tok *m/f*, -n, *dim.* **tekl** *n*, -ex [*mhd.* tocke] цацка, лялька

tok(e)n [*p.* toczyć, *ukr.* точити] тачыць; **tok** *f*, -n такарны варштат; такарная работа; **toker** *m*, -s токар; **tokeráj** *f*, -en 1. такарства; 2. **tokarnje** *f*, -s такарня; **tókerišer** такарны; **tóker-verkštel** *m*, -n такарны варштат

tol *m*, *pl*. -n/teler, *dim*. **tolxl** *n*, -ex [*d*. Tal] даліна, дол, лог; **tóliker** далінавы, логавы
• in der tifkajt fun der naxt, /lign barg un tol fartraxt, /xolemen xalojmes (A. G-t) глыбока ў начы ляжаць задуменныя гара і даліна, сьняць сны
tolčok *m*, *pl*. tolčkes [*r*. толчок] таўкучы рынак
toldes [*s*. תולדות] "радавод" (назоў 6-га разьдзелу Торы) (Б. 25:19–28:9) [*sin*. di gebirtn, di gešixte]
tole 1. *m* [*s*. תלוי →tlie, taljen] "павешаны"; расьпяты, укрыжаваны; *pejor*. укрыжаваны Ісус Хрыстос [*sin*. gehangener, gekrejcikter]; 2. (on, in) залежна [*sin*. ophengik, gevendt]; **tolebedóver** [*s*. תלוי־בדבר] залежна ад чагосьці, неабсалютна
• arufšlepn af zix dem tole начапляць на сябе шмат розных аздобаў, прыаздобіцца, выстранчыцца
• es iz tole on im гэта залежыць ад яго
tóleke *f*, -s [*ukr*. толока] талака
toler *m*, -s [*d*. Taler] талер, даляр
• a por toler трохі грошай
toleránc *f*, **tolerantkajt** *f* [*lat*. tolerantia] талеранцыя, талерантнасьць; **toleranter** талерантны; **tolerantler** *m* прымірэнец; **tolerantleráj** *f* прымірэнства; **tolerírn** (tolerírt) цярпець, трываць, ставіцца талерантна
tolk *m*, -n/-es [*ukr./r*. толк] толк, сэнс, розум, толк; лад, пуцьцё, глузд, панталык; **tólkeven** тлумачыць; **tólkiker, tolkove(r)** разумны, разважны, спрытны
• dergejn* a tolk (in) дайсьці да сэнсу/ладу
• kenen*/derrredn* zix cu a tolk mit emecn паразумецца з кімсьці
• maxn a tolk (in/fun) прыводзіць да ладу
• me ken ba im nit dergejn kejn tolk ад яго нельга дабіцца толку
• mit a tolk з сэнсам/толкам, да ладу
• nit cu kejnem tolk kumen* не прыйсьці да ладу
• on a tolk бяз ладу/сэнсу/толку
• redn* mit a tolk гаварыць да ладу
• visn* a tolk in epes разумецца на нечым
tolkáč *m*, -es [*r*. толкач, *ukr*. товкач] таўкач
tolmač/tolmeč *m*, -es, **tólmečer** *m*, -s [*d*. Dolmetscher, *mhd*. tolmetschen, *p*. tłumacz, *ukr*. товмач] тлумач, пераклад(аль)нік; **tolmačen** (па)тлумачыць, перакласьці, перакладаць
tolpas *m*, **talepus** *m*, -es пузаты, чараваты чалавек
tolpn *m* [*p*. (sól) tołpiasta?] кавалак, камлыга, брыла, ком
• tolpn zalc камлыга солі
tombek/tombik *m*, **tombak** [*d*. Tombak] 1. *n* тамбак; 2. *m*, -es масянзовы гузік; **tómbak(ov)ener=témbekove(r)** тамбаковы, масянзовы
• a tombakene kejt тамбаковы ланцуг
tómbank=túbank *m*, *pl*. -benk, **tónbank** *f*, *pl*. -benk [*d*. Tonbank] прылаўка, стойка
tome 1. *m*, *pl*. tmeim [*s*. (-ים)טמא] нячысты, чартоўскі, д'ябальскі (чалавек/прадмет); разбэшчаны чалавек; сутэнэр; 2. *rit*. нячысты [*ant*. košer, toher]; **tómenik** *m*, -es, (-nice *f*, -s) паганы, паскудны, агідны, брыдкі, гнюсны, плюгавы чалавек
tomed/tomid [*s*. תמיד →bitmides] *adv*. заўжды, кожны раз [*sin*. štendik, ale mol]; *tlmd*. "заўсёдная ахвяра"; назоў 9-га трактату 5-га разьдзелу (запаветы аб служэньні коганаў у Ерусалімскім Храме)
• a gutn tomed! усяго добрага! бывайце здаровы!
• cu lib ton kost tomed tajer рабіць прыемнае каштуе заўжды дорага
• nit tomid alcejns не заўсёды аднолькава (не заўсяды, як на дзяды)
• vi tomed як заўжды
tomer [*s*. תאמר] "ты б мог сказаць"
tomer [?] 1. *adv*. мо(жа), мабыць, мусіць, бадай (што); у выпадку, калі; 2. *m*, -n нечаканасьць, выпадковасьць
• ix hob mojre, tomer vet zi faln я баюся, раптам яна ўпадзе
• tomer ejn mol in a jojvl нарэшце, гады-ў-рады
• tomer farkert? што калі наадварот?
• tomer iz karg geven у дадатак да ўсяго
• tomer treft zix epes на ўсялякі выпадак
• un ojb, un tomer a калі раптам
• beser "tomer", ejder pomer *glxv*. лепш "мабыць", чымся памерці (лепш дзесяць разоў цяжка хварэць, як адзін раз лёгка памярэць)
• "tomer" iz geven a jidene, iz zi šojn lang geštorbn ("tomer" iz a jidene) *glxv*. Тамар была гэбрэйкай, але даўно ўжо памерла (кажуць, калі нехта часта паўтарае слова "tomer" (*vrtš*. "tomer" "мабыць" – "Tomer" [*s*. תמר] "Тамар")
Tomer [*s*. תמר] *tnx*. г. Тамар(а) (на паўднёвай частцы Юдэі) (Ез. 47:19, 48:28)
ton*=tun* (ix tu, du tust, er/ir tut, mir/zej tuen; getón/getún) (mit, antkégn) [*d*. tun] рабіць, чыніць
• dos hot mit ajx nit cu ton гэта вас ня тычыць
• es tut zix majsim! вось такія справы! (які вэрхал/гармідар!)
• geredt un geton сказана – зроблена
• hob mit im nit cu ton! не вадзіся зь ім!
• hobn* mit emecn cu ton мець/весьці разам з кімсьці справу
• krign* epes cu ton атрымаць работу
• ton* emecn culib рабіць камусьці прыемнае/жаданае
• ton* an arbet, gešeft рабіць работу, справу
• ton* an ojg af emecn зірнуць на кагосьці
• tu, vi du farštejst рабі, як ты разумееш
• vos tustu? што ты робіш?
• vos tut zix do? што тут робіцца?
• vos tut zix mit dir/im? што з табой (зь ім) робіцца?
• az me hot nit vos cu ton, nemt men zix cu koolše zaxn (šlogt /klapt men zix kop in der vant) *glxv*. калі німа чаго рабіць, бяруцца за кагальныя рэчы (б'юцца галавой аб сьцяну)
• es tut zix nit (azoj gut), vi es redt zix *glxv*. хутка гаворыцца, ды паціху робіцца (лёгка сказаць, ды далёка дыбаць)
vi [*d.* wie] *adv.* як; **vi-nit-ví** *adv.* як-ні-як; **ví-(s')nit-íz=vi nit iz, ví-es-íz=vi es iz** *adv.* як-небудзь, якась, яксьці, неяк; **vi-rúft-/héjst-men-es** *m* як бо яго завуць; паскудны чалавек; *euph.* зад(ніца), азадак
• der štejger, vi mir redn як мы кажам, як гаворыцца
• glajx vi як быццам, усё роўна як, нібы
• mir veln vi-s'nit-iz ojshaltn! якась вытрымаем!
• tog vi naxt і дзень і ноч
• vajs vi šnej белы як сьнег
• vi a dokter ken ix es ajx nit derlojbn як доктар я вам гэтага не магу дазволіць
• vi amšnelstn (vi vajt meglex gixer) як мага хутчэй
• vi arúm(ert) як, якім чынам
• vi cum gixstn як мага хутчэй
• vi es zol nit zajn як бы там ні было, якась, неяк
• vi fil як шмат

• vi kumt ir aher? як вы сюды трапілі?
• vi meglex як мажліва
• vi nor як толькі
• vi nor x'hob zix ufgexapt, azoj (bald) hot zix gelozt hern a klung як толькі я прачнуўся, адразу пачуўся званок
• vi nox як яшчэ, але што значыць
• vi rajx er iz які ён багаты
• vi šejn! як прыгожа!
• vi vójl хаця, хоць, нягледзячы на..., не зважаючы на..., дарма, што...
• vi vu/ven/ver як дзе/калі/хто

vianóx, viazój=vi azój, viarúm [*d.* wieso] *adv.* як, якім чынам; **viazój-s'nit-íz** *adv.* як-небудзь, якась, яксьці, неяк

• viazoj hot ir undz gefunen? як вы нас знайшлі?
• – Viazoj ken ix cu dir gejn, /viazoj ken ix mit dir redn, oj vej, /az lib hob ix dix, dem grunt fun majnem harcn, /nor nemen, dušenju, konen mir zix nit. *flksl.* – Як я магу да цябе прыйсьці, як я магу з табой гаварыць, вой, калі любаю цябе да глыбіні майго сэрца, але пабрацца, душа мая, мы ня можам.

vibald=vi bald [*d.* wie bald] *adv.* паколькі, раз, як толькі

• vibald du farštejst dajn nariškajt, bistu a kluger! *glxv.* калі толькі ты разумееш сваё глупства, ты разумны!
• vibald nejn, iz vos ken men maxn *glxv.* як німа, дык німа (той дарма, дык што ж зробіш; калі ёсьць – разыдзецца, як німа – абыдзецца; як не, дык і не)

vibjeg *m*, -es [*p.* wybieg] выбегі, хітрыкі, выкрут, выкру(н)тас, вываротка, подступ, падход
viboje *f*, -s [*p.* wybój] выбоіна, калдобіна
vibor *m*, -s [*sl.*] выбар
vic *m*, -n, *dim.* **vicl** *n*, -ex [*d.* Witz] жарт, анэкдот; **vícikajt** *f* дасьціпнасьць, жартаўлівасьць; **viclen zix** жартаваць; **vicler** *m*, -s, **vicling** *m*, -en балбатун, балака, комік, жартаўнік, жартаўлівы чалавек; **víclerišer, víciker** жартаўлівы, жартоўны; **víclid** *f/n*, -er (a vícike lid) жартоўная песьня

• a viclerišer ton жартаўлівы тон
• šitn* mit a vicl сыпаць жартачкамі
• vicike kupletn жартаўлівыя куплеты
• fun azojne vicn ken men onhejbn cu švicn *glxv.* ад такіх жартаў у пот кідае

vič(k)e/vic(k)e *f*, -s [*ukr.* витва, *p.* witwa] віціна, дубец, лазовы парастак, атожылак, вербалоз, вецьце
vid *m*, -n [*p.* wid(ok)] від, выгляд; **vidok** *m*, -es відок, краявід

• ganevski vid выгляд як у злодзея

vidatek/vidatik *m*, -tkes [*p.* wydatek] выдаткі, расходы, страты
vide=viduj *f*, *pl.* viduim [*s.* (ים-)ידוי(ו)י →misvade, mojde] "прызнаньне (у памылках альбо ў злачынствах)"; споведзь, каяньне, пералік уласных грахоў і памылак; назоў розных малітваў, якія чытаюцца ў пэўных выпадках і перад сьмерцю

• az me hot a mies vajb, muz men ale naxt vide zogn *glxv.* хто мае непрыгожую жонку, мусіць усю ноч каяцца
• az me lebt on xežbn, štarbt men on vide *šprxv.* хто жыве без рахунку, памірае бяз споведзі

vider *m*, -s [*d.* Widder] баран
vider- [*d.* wider-] *pref.* супраць-, проці-
vider- [*d.* wider-] *knv.* ад-; супраць-, проці- (паказвае на: 1. адбітак; 2. супрацьдзеяньне)
víder- [*d.* wieder-] *knv./pref.* ад-, уз(ь)-/ус(ь)- (паказвае на: 1. вяртаньне назад; 2. аднаўленьне, паўтарэньне)
vider(amól)=vider a mol [*d.* wieder] *adv.* (і)зноў, яшчэ раз

• vider un ober зноў і зноў
• vider že і зноў жа, зь іншага боку
• fun vanen di kale kumt arojs, dort gejt zi vider arajn *glxv.* адкуль маладая выйшла, туды ізноў вернецца (зь якой сям'і выйшла, у такую ж і трапіць)
• ojs xosn, vider a boxer *glxv.* з жаніхоў зноў у хлопцы (кажуць, калі справа не задалася)
• ša, štil, maxt ništ kejn gerider, /der rebe gejt šojn tancn vider; /ša, štil, maxt ništ kejn gevald, /der rebe gejt šojn tancn bald *flksl.* ша, ціха, не рабеце тлуму, рэбэ зноў ідзе танчыць, ша, ціха, не рабеце гвалту, рэбэ ўжо хутка ідзе танчыць

videranánd [*d.* wieder] 1. *adv.* (і)зноў, яшчэ раз; 2. *m*, -n рознагалосьсе, разлад; **videranándiker** супярэчлівы
vídercn (fun) [*d.* zuwider?] надакучыць, надакучваць, апрыкрыць, абрыдзець, абрыднуць, ачамярэць

• es viderct mir fun dem гэта мне надакучыла

víderdervejlung *f* [*d.* erwählen] перавыбары
víderfarejnikung *f* [*d.* Wiedervereinigung] узьяднаньне
vídergeburt *m* [*d.* Wiedergeburt] адраджэньне
vídergefil *n* [*d.* Gefühl] прыкрасьць, агіда, нялюбасьць
víderholn [*d.* wiederholen] паўтараць
víderkern (zix) [*d.* wiederkehren] варочацца назад; каяцца
víderklang *m*, -en [*d.* Klang] рэха, водгульле
víderkol *n*, *pl.* -kojles [*s.* (ות-)קול-] рэха, водгульле [*sin.* exo. viderklang]
videršpénikn (kegn) [*mhd.* widerspenigen] (су)праціўляцца, су-, с|працівіцца, упірацца, пярэчыць; **víderšpén(d)iker** 1. *m*, (-n *f*, -s) свавольнік, упарты, непакорны чалавек; 2. упарты, непакорны; **víderšpenikajt** *f*, **víderšpénikung** *f* упартасьць, непакорнасьць
víderšprexn* (cu) [*d.* widersprechen] (су)пярэчыць; **víderšprex(nd)iker, víderšprexlexer** супярэчлівы; **víderšprexikajt** *f*, **víderšprexlexkajt** *f* рознагалосьсе, супярэчлівасьць; **víderšprux** *m*, -n супярэчнасьць; **víderšpruxfuler** поўны супярэчнасьцяў
víderštand *m*, -n [*d.* Widerstand] супраціўленьне
víderštejn* [*d.* widerstehen] проці-, супраць|стаяць
víderšteln [*d.* stellen] проці-, супраць|паставіць, проці-, супраць|пастаўляць; **víderšteln zix** супраціўляцца
vidertam *m*, -en [*s.* (ען-)טעם-] прытарнасьць, прыкрасьць, агіда
vídertref *m*, -n [*d.* Treff] узьяднаньне
víderufbli *m*, -en [*d.* aufblühen] новы росквіт
víderufkum *m* [*d.* aufkommen] адраджэньне
víderuflebn *n*, **víderuflebung** *f* [*d.* Wiederaufleben] уваскрэсеньне, уваскрашэньне, адраджэньне
víderúfšteln [*d.* aufstellen] аднаўляць, адбудоўваць; **víderúfštelung** *f* аднаўленьне, адбудаваньне
vídervaksung *f*, -en, **vídervuks** *m*, -n [*d.* Wachsen, Wuchs] 1. атава, самасейка, маладняк; 2. адраджэньне
víderviln *m*, -s [*d.* Widerwillen] агіда; нялюбая, прыкрая рэч, справа
víderzen [*d.* Wiedersehen]

• af viderzen! да пабачэньня!

vi(d)le *f*, -s [*p.* widły] вілы

vidmen [*d.* widmen] прысьвеціць, прысьвяціць, прысьвячаць; **vidmung** *f*, -en прысьвячэньне
vídmenen=vimlen zix [*d.* wimmeln, *mhd.* wimmen] кішэць, хутка размнажацца; **vídm(en)ung** *f* разрастаньне, размнажэньне, распладжэньне; **vídmeniš** *f/n*, -n кішэньне; *zool.* паразыт
vidre *f*, -s [*p.* wydra, *ukr.* видра] *zool.* выдра
viduj=vide *f*, *pl.* viduim [*s.* (ים-)ווידוי →misvade, mojde] споведзь (паміраючага)
• ojshern* emecns viduj спавядаць паміраючага
vie=vihe=vike *f*, -s/-n [*ukr.* вія; віко] вейка
viernox [*d.*?] *adv.* як, што значыць
vifl=vi fil [*d.* wieviel] колькі; **vifler** *m*, -s каэфіцыэнт, паказальнік; **víflter**, **vífldiker** каторы, які (за рахункам); **vífl-es-íz**, **vífl-(s')nit-íz** колькі-небудзь, некалькі, колькі ня ёсьць; **vifl-vér** *m*, -n лік (у гульні)
• a vifltl? якая частка?
• af vifl паколькі
• af vifl ix vejs/ken наколькі я ведаю/магу
• cum vifltn mol да каторага разу
• der viflter? – der driter каторы? – трэці
• der viflter iz hajnt? які сёньня дзень?
• er vejs(t) punkt azojfil, vifl du ён ведае роўна столькі ж, як і ты
• es vifl du vilst! колькі ж табе трэба!
• vifl halt (vifl iz) der zejger? каторая гадзіна? колькі часу?
• vifl bistu alt? колькі табе гадоў?
• Ken dos zajn den, az majn xolem /hot mix opgenart? /Ken dos zajn, du zolst ništ kumen? /Vifl teg ix vart... (Z. S.) Ці можа такое быць, каб мой сон мяне падмануў? Ці можа такое быць, што ты больш ня прыйдзеш? Колькі дзён я чакаю...
vign [*d.* wiegen] 1. калыхаць; 2. *n* калыханьне; **vig** *f*, -n калыска, калыбель, калыбка, зыбка; **a vig ton*** пакалыхаць; **vígbret** *f*, -er гушкалка, арэлі; **víglid** *f/n*, -er калыханка; **vígštul** *m/f*, -n калыска, крэсла
• a kind in vig vejs fun dem! нават дзіця ў калысцы ведае гэта!
• az me hot kinder in di vign, lozt men (zol men lozn) lajtn cufridn *glxv.* хто мае дзіцё ў калысцы, той добра ладзіць зь людзьмі
• az dos vajb gejt in di hojzn, muz der man vign dos kind *šprxv.* калі жонка носіць нагавіцы, мужык мусіць калыхаць дзіця (дзе баба жондзіць, там хата блондзіць)
• zict dos fejgele in štajgele, /kukt arojset afn cvajgele, /vos es vigt zix afn bejmele, /vu gevezn iz ir hejmele *flksl.* сядзіць птушка ў клетцы, пазірае на галінку, якая гушкаецца на дрэве, дзе быў калісьці яе дом
vign*=vegn* (gevégt/gevójgn) (уз)важыць, узважваць
vigode *f*, -s [*p.* wygoda] выгада
vígrišne(r) [*ukr.* виграшний] выйгрышны
• vigrišner bilet выйгрышны білет/квіток
vihon *m*, -es [*p.* wygon] выган
vike *f* [*p.* wyka, *ukr./r.* вика] *bot.* віка
viklen [*d.* wickeln] спаві(ва)ць, завінуць, завінаць, (за)хутаць, захінуць, захінаць; **viklen zix** 1. віцца; 2. хутацца, захінацца; **víkele** *n*, -x пялёнка, полка, пялюшка; **vikl** *m*, -en віток (дроту); **viklung** *f*, -en віток, абмотка; **víklkind** *n*, -er дзіця, немаўля; **víklkrajz** *m*, -n абарот (вакол зямлі); **víkl-šnur** *f*, -n абмотка; **víkltrep** *f*, -n вітыя сходы, вітая лесьвіца
• fun di vikelex зь пялюшак
• viklen af vate пялегаваць, песьціць
• zajn* in di vikelex *fig.* знаходзіцца ў пачатковым стане
víkrojke *f*, -s [*ukr.* викройка] выкрайка
viksn=veks(le)n=vaksn васкаваць, вашчыць
vikuex *m*, *pl.* vikuxim [*s.* (ים-)כוח(וי)ו →misvakejex, balvikuex] дыспут, дыскусія, спрэчка, дэбаты, палеміка [*sin.* diskusje, polemik, debate, disput]
• a hejser vikuex гарачая спрэчка
• firn vikuxim (a vikuex) спрачацца
• hobn* a štikl vikuex паспрачацца (нейкі час)
• mit a nar tor men kejn vikuex nit hobn *šprxv.* з дурнем нельга спрачацца (з дурным сварыцца, як з вадою біцца)
vilang=vi lang [*d.* wie lang] як доўга
vilder [*d.* wild] 1. *m* дзікун; 2. дзікі; **vílde(r)niš** *f*, -n пустэча, дзікае месца; **vildkajt** *f*, -n дзікасьць; **víldeven** 1. **vild vern*** дзічэць, шалець, буяніць, вар'явацца, лютаваць; 2. ■ разгул, буянства, дзікі ўчынак; **vildling** *m*, -en, **víldbejml** *n*, -ex дзічка; **víldflejš** *n* 1. **víldvarg** *n* дзічына; 2. дзікае мяса, гнойны нарост, пухліна; **víld-fremder** дзіка/цалкам чужы; **víldgroz** *n*, -n, **víldkrojt** *n* пустазельле; **víldviliker** дэспатычны, самаўладны; **víldviln** *m* дэспатыя, самаўладзтва; **víldšvajn** *n zool.* дзік, вяпрук
• der pogrom vildevet пагром лютуе
• s'iz af im ongevaksn vildflejš на ім нарасло дзікае мяса (ад раскошы)
• vild vi a tiger дзікі як тыгра
• vilde xaje дзікун, дзікая жывёла
vílevke *f*, -s [*ukr.* виливок] вылівак (яйка са слабой шкарлупінай)
vilgoč/vilgod/vilgot *f* [*p.* wilgoć] вільгаць; **vilgotne(r)** вільготны
Vilie *f* рака Вяльля (Беларусь, Літва)
• di Vilie brent nit *glxv.* Вяльля не гарыць
• me ken mit a špendl di Vilie ništ faršparn *glxv.* нельга трэскай Вяльлю запрудзіць
• s'brent di Vilie! *iron.* Вяльля гарыць!
viljen [*ukr.* виляти, *p.* wilać] віляць
vilke *f*, -s [*ukr.* вилки] вілкі, вілы, рагач; **viles** *pl.* вілы
vilkir *m* [*d.* Willkür] самавольства, свавольства, самадурства; **vílkirlexer** самавольны
vilkumer [*d.* willkommen] жаданы
viln *m*, -s [*d.* Wille(n)] воля, хаценьне, жаданьне, намер, замер; **víl(nd)iker** згодны, гатовы; **vílikajt** *f* згоднасьць, гатоўнасьць; **víliklex** *adv.* ахвоча, ахвотна, з ахвотай; **vílndik-nit-vílndik** *adv.* воляй-няволяй; **vílnhaftiker** валявы; **vílnloz(ik)er** бязвольны; **vílnlozikajt** *f* бязвольле, бязвольнасьць; **vílnskraft** *f* сіла волі
• guter viln добры намер
• mitn ejgenem viln паводле ўласнага жаданьня
• ven ajer viln iz калі вы жадаеце
• on gots viln rirt zix nit kejn flig af der vant *šprxv.* бяз боскай волі і муха на сьцяне не паварушыцца
Vilne *f* г. Вільня; **vilner** віленскі; **vilenčik** *m*, -es віленскі жыд; *fig.* рацыяналіст, вальнадум(ец)
vilne(r) [*d.* wollig?] пушысты, пухкі, пухлявы; пышны
vílšener [*ukr.* вільховий, вільшаний] альховы

vimlen=vídmenen [*d.* wimmeln] кішэць, капашыцца; **vímleniš** *n* кішэньне, капашэньне
• afn plac hot gevimlt mit menčn пляц кішэў людзьмі
vimogajen [*ukr.* вимагати, *p.* wymagać] вымагаць
vimorozek/vimorozik *m* [*sl.*] вымаразкі, вымаражаны лікёр
vímpern [*d.* wummern?] выць, галасіць, скуголіць, скавытаць, стагнаць, екаташ, енчыць; **vímperniš** *n* выцьцё, галашэньне, скуголеньне, скавытаньне, кныханьне, вяканьне, стэнканьне, зыканьне
Vin ■ [*d.* Wien] г. Вена; **viner** *m* аўстрыйская манэта
• far viner bakumt men diner *glxv.* за грошы знойдзеш і слугу (абы грошы, то й роднага бацька купіш)
vincik [*d.* winzig] *adv.* мала; **vínciker** *adv.* менш, меней; **víncikajt** *f* малаважнасьць, нязначнасьць
• vinciker fun alc менш за ўсё
• vincik iz a šejgec! Вінцук – басалай (*vrš.* "vincik" мала – "Vincik" Вінцук)
• vos vinciker me fregt, iz als gezunter *glxv.* чым менш пытаеш, тым здаравей (болей знай, ды меней бай)
vínč(eve)n* (gevúnčn), **vínš(eve)n*** (gevúnšn) [*d.* wünschen, *p.* winszować] віншаваць, (па)жадаць, зычыць; **vínčnsvert** *adv.* пажадана; **vinčung** *f*, -en, **vínčeniš** *f*, -n, **vinčevanje/vinševanje** *f*, -s віншаваньне, пажаданьне; **vínčbrunem** *m*, -s цудадзейная крыніца; **vínč(-)fingerl** *n*, -ex цудадзейны пярсьцёнак
• fun vinčn vert men nit rajx *glxv.* ад пажаданьняў багатым ня станеш (за дзякуй пірага ня купіш, футра ня справіш; дзякуй не зьясі)
• s'iz a sojne nit cu vinčn! (dem grestn sojne nit cu vinčn!) (найгоршаму) ворагу не пажадаеш!
• vos du vest zix vejniker vinčn, vet dir alc vejniker feln *šprxv.* чым меней жадаеш, тым меней табе бракуе
vind [*d.* wind, *mhd.* wunt] *int.*
• vind iz mir! гора мне!
• vind un vej (iz) (cu/emecn) гора і бяда (камусьці) [*d.* wind und weh]
• vind un vej! (az vind, az vej...) авохці! ліха/гора і бяда!
vinde *f*, -s [*d.* Winde] *texn.* пад'ёмнік, калаўрот, ліфт
vindlen [*d.* windeln] спаві(ва)ць, абверчваць, хутаць, захінаць; **vindl** *n*, -ex, **víndele** *n*, -x пялёнка, полка, пялюшка; **vindung** *f*, -en абарот, абарачэньне (вакол зямлі); **víndltrep** *f*, -n вітыя сходы, вітая лесьвіца
• arojsgejn* fun di vindelex вырасьці зь пялёнак
vinik *m*, -es [*ukr.* винник] браварнік, вінакур
vinken* (gevunken) [*d.* winken] кіўнуць, ківаць; міргануць, міргаць; намякнуць, намякаць, намінуць, намінаць; **vink=vunk** *m*, -en ківок, кіў; **vínkeniš** *f* ківаньне, міганьне
• Volt ix gehat a fingerl, /volt ix mit dem vinken. /Volt ix gehat a bexerl, /volt ix fun dem trinken. *flksl.* Калі б я мела пярсьцёнак, я б ім цябе паманіла. Калі б у мяне быў келіх віна, я б зь яго піла.
vinkl *m/n*, -en, *dim.* **vínkele** *n*, -x [*d.* Winkel] кут, вугал; **vínkldiker** кутні, кутавы, вуглавы, рагавы; **vínklbrox** *m*, -n *med.* грыжа, кіла; **vínklštejn** *m*, -er краявугольны камень
• hobn* an ejgn vinkele мець свой уласны куток
vint *m*, -n, *dim.* **víntl** *n*, -ex, **víntele** *n*, -x [*d.* Wind] вецер; **víntiker** ветраны; **víntldiker** прадзімны; **víntlozer** бязьветраны; **víntblum** *f*, -en, **víntfang** *m*, -en, **víntrojz** *f*, -n, *dim.* **víntrejzele** *n*, -x *bot.* курасьлеп; **vínt(-)brox/-brux** *m* буралом, парыў ветру; **vínthon** *m*, *pl.* -hener, **víntfendl** *n*, -ex флюгер, бандзера, ветрачок, сьцяжок; **víntmil** *f*, -n вятрак, ветраны млын; **víntpokn** *pl. med.* ветраная воспа, вятранка; **víntšojflen** веяць (збожжа); **víntšojfl** *m*, -en веялка; **vínt-štil** *m* бязьветранасьць
• es blozn naje vintn дзьмуць новыя ветры
• krign* vint злавіць вецер/хвалю
• kukn, vuhin der vint blozt трымаць нос па ветры
• maxn a vint пускаць пыл у вочы
• rejdn* afn vint гаварыць на вецер
• dem oreman iz tomid der vint in di ojgn *šprxv.* беднаму і вецер у вочы (багатаму чорт дзеці калыша, а беднаму з калыбкі выкідае)
• vos me fardint mitn vint, gejt avek mitn rojx *šprxv.* што набылося ветрам, пайшло з дымам (як прыйшло, гэтак і пайшло; прыйшло махам – пойдзе ветрам-прахам; вада дала – вада ўзяла)
víntbro *f* [*d.* Wimper, *mhd.* wintbrâ] *anat.* вейка
vinter *m*, -s/-n [*d.* Winter] зіма; **víntern** 1. зімаваць; 2. *n*, **vínterung** *f* зімоўка; **vínterdiker** зімні, зімовы; **vínterer** *m*, -s зімоўшчык; **vintern** зімаваць; **víntercajt, vínterleb** *adv.* узімку; **vínterbajl** *m/f*, -n адмарожанае месца; **vínter(-)brojt** *n*, **vinter-tvues** *pl.* [*s.* תבואות] азіміна, рунь; **vínter-farzéj** *m* азімая сяўба; **vínter-naxt** *f*, *pl.* -next зімовая ноч; **vínteršlof** *m* зімовая сьпячка
• a harber/bejzer vinter суровая/злая зіма
• lang vi a vinternaxt доўга як зімовая ноч
• ot iz ba im zumer, ot iz ba im vinter то ў яго лета, то ў яго зіма
• vinterdike malbušim зімовая вопратка
• az me zingt in zumer, vejnt men in vinter *šprxv.* хто сьпявае ўлетку, плача ўзімку (хто ўлетку халадуе, той узімку галадуе)
• cvej mol ■ jor iz šlext dem oreman: zumer un vinter *glxv.* два разы на год кепска бедняку: улетку і ўзімку
• in a vinterdiker naxt zoln dir rajsn di cejn, un in a zumerdikn tog zolstu gejn cu kind! *kll.* каб табе ў зімовую ноч зубы дралі, а ў летні дзень радзімец браў!
• vinter iz cvej mol in der vox šabes *glxv.* узімку два разы на тыдзень субота (здаецца, што тыдзень у два разы карацейшы, таму што дні дужа кароткія) (зімовы дзянёк, што камароў насок)
• vos es gejt avek vinter af hejcung, gejt avek zumer af narišкajtn *glxv.* што ідзе зімой на ацяпленьне, тое ідзе летам на глупствы
violeter=fioleter [*fr.* violett] фіялетавы, фіялкавы, лілёвы
viper=vaper=vjeper *m*, -s *zool.* дзік, вяпрук
viper *m*, -s, **víperšlang** *f*, *pl.* -en/-šleng [*d.* Viper] *zool.* гадзюка
víperedkes *pl.* [*p.* wyprzodki, *r.* выпередки] выпарадкі
• lojfn* af viperedkes бегчы навыпарадкі
vipuske *f*, -s [*p.* wypustka] бераг, ускраек, кант, руб (у вопратцы)
viražne(r) [*p.* wyrazny] выразны
virblen (zix) [*d.* wirbeln] віхрыцца, круціцца, кружыцца (аб завірусе), віцца (аб пыле); **virbl** *m*, -en, **vírbl-vint** *m*, -n віхор, віхар, вір; **vírbl-šturem** *m*, -s сьмерч
vircn [*d.* würzen] *kul.* прыпраўляць; **vircung** *f kul.* прыправа

virde=verde *f*, -s [*d.* Würde] годнасьць; **vírdikajt** *f*, -n гонар, годнасьць; **vírdiker=vérdiker** годны, варты
• štendik baci zix zorgevdik cu der virde fun dajn vajb заўжды стаўся ўважліва да пачуцьця годнасьці ўласнай жонкі
vire *f*, -s [*šp.* guiar, *altfr.* guier] лінейка; лінія (на паперы); **víre(ve)n** лінеіць
virkn (af) [*d.* wirken] (па)ўзьдзейнічаць, (па)ўплываць, (з)рабіць уплыў; **virk** *m*, -n, **virkung** *f*, -en узьдзеяньне, уплыў; **vírkevdiker**, **vírkndiker** дзеючы, дзей(с)ны, эфэктоўны; **vírklexer** сапраўдны; **vírklexkajt** *f*, -n сапраўднасьць; **vírkungsfuler** уплывовы; **vírkzamer** дзейсны, чынны, актыўны; **vírkevdikajt** *f*, **vírkzamkajt** *f* дзей(с)насьць, чыннасьць, актыўнасьць
• virkn af di nervn дзейнічаць на нэрвы
• virkn af emecn, hobn* a virkung паўзьдзейнічаць, зрабіць уплыў на каго-небудзь
• zajn* unter emecns virkung знаходзіцца пад чыімсьці ўзьдзеяньнем
víródek/vírodok *m*, -dkes [*p.* wyrodek] вырадак
virok *m*, -en [*p.* wyrok] вырак, прысуд
virt *m*, -n, (-n *f*, -s) [*d.* Wirt] гаспадар; **vírtslajt** *pl.* гаспадары, уласьнікі; **vírtšaft=vértšaft** *f*, -n гаспадарка; **vírtšaftlexer** гаспадарчы; **vírtšaft(l)er** *m*, -s, **vírtšaft-tuer** *m*, -s гаспадарнік; **vírt(šaft)lozer** безгаспадарчы; **vírtšaftlozikajt** *f* безгаспадарчасьць; **vírtshojz** *n* гасьцініца, карчма, заезны двор
virvar *m* [*s.*?] бабілёнскае стоўпатварэньне, гармідар
• s'hot zix gehert a virvar fun lešojnes чуўся разнамоўны гоман
viržutke *f*, -s [*p.* wyrzutek?] шлюха, шлюндра, плёха, плёшка, вяхотка, шлында
visipke *f*, -s [*p.* wysypka] *med.* (вы)сыпка
viskrob/viškrab *m*, -es [*p.* wyskrobek] выскрабак, паскробак (рэшткі цеста ў дзежцы для закваскі); **viskrobik/viškrabik** *m*, -es падскробак (апошняе дзіця ў маткі), малодшы/меншы сын, мезенец
visn* [*d.* wissen] 1. (ix vejs, du/ir vejst, er vejs(t), mir/zej vejsn; gevúst) ведаць, знаць; 2. *n* веданьне, веды; **vísikajt** *f* сьвядомасьць; **vísiker** сьвядомы; **vísndiker/vísevdiker** які ведае/знае; **vísnšaft** *f*, -n навука; **vísnšaftler** *m*, -s, (-n *f*, -s), **vísnšaft-man** *m*, *pl.* -mener навуковец, вучоны; **vísnšaftlexer** навуковы; **vísnšaftlexkajt** *f* навуковасьць; **vísngiriker**, **vísndurštiker/vísndorštiker** дапытлівы, цікаўны; **vísngirikajt** *f*, **vísndurštikajt/vísndorštikajt** *f* дапытлівасьць, цікаўнасьць
• af vifl ix vejs наколькі я ведаю
• du zolst visn zajn (az) ты мусіш ведаць
• gebn*/ton* cu visn (lozn* visn) даць зразумець
• gej vejs! адкуль мне ведаць! ідзі зразумей!
• maxn zix nit visndik (vegn) прыкідвацца, што ня ведаеш (разыграць/строіць дурня)
• nit visn* fun bejz/šlexts ня зьведаць зла/ліха
• nit visn* fun kejn cores ня ведаць ліха
• nit visn* fun kejn kuncn/xoxmes не разумець жартаў
• nit visn*, vi dem kop cu haltn ня ведаць, як галаву трымаць
• (nit) visn*, vu ajn un vu ojs (ня) ведаць, як і куды
• nit visn*, vu cu faln ня ведаць, куды па́даць (куды зьвярнуцца)
• on majn visn на мой розум
• vejs ix vos! я ведаю?! глупства!
• ver vejst vos бог ведае што
• visn* a mos ведаць меру
• visn* af di finger ведаць як свае пяць пальцаў
• visn* počom funt lixo ведаць, пачым фунт ліха
• visn* vi a ku fun montik/mitvox ведаць як карова панядзелак/сераду (ведае курыную сюсю, ды тую ня ўсю)
• visn*, vos s'tut zix ba jenem in top ведаць, што ў чужым гаршку варыцца
• visn*, vu a tir efnt zix ведаць, куды дзьверы адчыняюцца (усе хады і выхады)
• x'hob ober gevust! я так і ведаў! так і ёсьць!
• x'vejs? ці я ведаю?
• az me vejst alejn, fregt men nit andere *šprxv.* хто ведае сам, у другіх не пытае
• dos vejsn šojn ale, /az Roxele iz a kale /un Jankl iz der xosn, /hobn zej zix bejde gešlosn *flksl.* усе ўжо ведаюць, што Рохэлэ стала нявестай, а Янкель жаніхом, яны аб'ядналіся
• (ejn) got vejs! (der ejberšter vejs! (got) der lebediker vejs! vejs der lebediker!) (адзін) бог ведае!
• er vejst nit, vu got vojnt ён ня ведае, дзе бог жыве
• me zol nit visn derfun! каб мы гэтага ня ведалі!
• nit alc, vos me vejst, meg men zogn *šprxv.* ня ўсё, што ведаеш, можна казаць
• nit visn, vi der kac dem ek cu farbindn *glxv.* ня ведаць, як кошцы хвост завязаць (ня ведаць, як зрабіць)
• vilst alc visn, vestu zix alt vern (ver es vil alc visn, der vert gix alt) *glxv.* хочаш усё ведаць – хутка састарышся
• vilst visn, nem a tux un viš! хочаш ведаць, бяры хустку і выцірай! (*vrtš.* "visn"– "višn" выціраць/ведаць – літвацкі дыялект)
vispe *f*, -s [*p.* wyspa] выспа, востраў
vistave *f*, -s, **vístavke** *f*, -s [*p.* wystawa, *r.* выставка] выстава, выстаўка
viste [?]
• af viste зь ліста
• špiln af viste іграць зь ліста (музычны твор)
víst(ik)er [*d.* wüst] 1. пустэльны, пустынны, пусты, бязьлюдны; 2. жаласны, варты жалю, няшчасны, мізэрны; **viste** *f*, -s, **vísteráj** *f*, **vísteniš** *f*, -n пустэльня, пустэча, бязьлюднае месца; **vistkajt** *f*, -n пустэча, пустата; **vísteven** пуставаць
• a viste almone/kale няшчасная ўдава/нявеста
• a vister sof благі канец
• vist un ler гола і пуста
• vistiker paxdn! жаласны трус!
• hobn* a vistn sof мець благі канец
• a vist/fincter/bejz bagegeniš zol dix trefn! *kll.* а бадай цябе нячысьцік напаткаў (ліха напаткала)!
• Špacirn zajnen mir bejde gegangen, /der šljax iz geven far undz šmol... /Nor vet se hot dix fun mir opgeredt, /arajn zol er in dem vistn gospital. *flksl.* Гуляць мы разам хадзілі, шлях быў нам вузкі... Але той, хто разлучыў цябе са мной, хай трапіць у пракляты шпіталь.
viške/v(j)aške=voške *f*, -s вожкі, лейцы
višn [*d.* wischen] вы-, у|церці, вы-, у|ціраць; **viš** *m*, -n 1. выціраньне; 2. пацёртасьць, пляма; **višer** *m*, -s швабра,

шчотка; шклоачышчальнік; **višl** *n*, -ex клок, жмут, шкумат, пук; **víšfeder** *f*, -n мяцёлка зь пер'я; **víšpapirl** *n*, -ex паняровая сурвэтка

• X'hejs Jisrolik, /nor ven kejner zet nit, /viš ix štil zix /fun ojg arop a trer. /Nor fun majn trojer /beser az men redt nit, /cu vos dermonen /un maxn harc zix šver. (L. R.) Я завуся Ісролікам, і калі ніхто ня бачыць, я паціху выціраю сьлязу з вачэй. Але аб маім смутку лепш не гаварыць, навошта ўзгадваць і рабіць сэрцу больна.

višnik=višnjak *m* [*p.* wiśniak] вішняк, вішнёўка

viter *m*, *pl.* viturim (af) [*s.* (ים-)תורים(וי)ו →mevater] уступка, уступаньне, добраахвотнае адмаўленьне (ад чагосьці); кампраміс [*sin.* noxgebeniš, dos mevater zajn (af epes), kompromis]

víte(ve)n zix (mit) [*p.* witać] вітацца

vitičke/vitiške *f*, -s [*v.* вітка, *p.* witka] шпуля, шпулька

vitišer [*p.* wituscny, *r.* ветошный, *d.* wütig?] 1. няшчыры, сьвядомы ўяз розуму (звычайна аб жанчыне); 2. *argo* чэсны, сумленны, прыстойны; **vítiše** *f* 1. жанчына, якая не карыстаецца павагай; 2. *argo* жанчына, якая ня мае дачыненьня да злачыннага сьвету

vitrine *f* [*fr.* vitrine] вітрына

vitriól *m xem.* [*p.* witriol] (мядзяны) вітрыёл, купарвас

vitrix *m*, -n [?] балванка для ключа

viveske *f*, -s [*ukr.* вивіска, *r.* вывеска] шыльда, вывеска

vívodek *m* [*ukr.* виводок] вывадак, кодла

vixeč/vjaxeč/vjexeč *m*, -n/-es [*p.* wiecheć, *ukr.* віхоть] вехаць, вяхотка, мачала; *fig.* ануча (аб чалавеку)

vixer *m*, -s [*p.* wicher, *ukr.* вихор] віхор, віхар; **vixern** віхрыць, круціць

• gixer vi a vixer хуткі як віхар

vixn(j)e=vexne *f* [*ukr.* вивих, звих, *p.* zwichnięcie] вывіх, зьвіх

vixovanek/vixovanik *m*, -es, (-anke *f*, -s) [*p.* wychowanek] выхаванец

víxtiker [*d.* wichtig] важны, значны; **víxtikajt** *f*, -n важнасьць, значнасьць; **víxtikster** (най)важнейшы

• dos same vixtikste самае галоўнае

• haltn* far vixtik (cu) надаваць вагі

• nit vixtik няважна, нязначна

• vixtik vi brojt far a hungerik важны як хлеб галоднаму

vize *f*, -s [*d.* Wiese] луг, выган, папас, аселіца

vízele *n*, -x [*d.* Wiesel] 1. *zool.* ласка; 2. *hum.* нізкарослы чалавек (пеўню да костак)

vizír *m*, -n [*d.* Visier] візір, прыцэл

vizje *f*, -s [*p.* wizja] уяўленьне, прывід, здань(нё)

vizl(-)tir *m*, -n [*d.* Wisent, *mhd.* wisentier] *zool.* бізон

vjaken [*r.* вякать] вякаць

vjanen/vjalen [*ukr.* в'янути, в'ялий] вянуць; **vjale(r)** зьвялы

vjatrek/vjatrik *m*, -es [*p.* wiatrak] вятрак, ветраны млын

vjaz *m*, -n [*ukr.* в'язь] сувязь, (зь)вязка; **vjazanje** *f* вязаньне, зьвязваньне

vjažen zix (cu) [*ukr.* в'язати, *p.* wiązać] навязвацца, (пры)чапляцца; **vjažún** *m*, - es прычэпны, навязны, неадступны чалавек; кавалер

v(j)edme *f*, -s вядзьмарка

vjeper=viper=vaper *m*, -s [*ukr.* вепр(е)р, *p.* wieprz] вяпрук, кабан, кнораз; **vjeprek/vjeprik** *m*, -es абжора, жрун, аб'ядайла, прорва

v(j)erbe *f*, -s *bot.* вярба

vjexe *f*, -s [*p.* wiecha, *r.* веха] веха, вяха, вітка, тычка

vjo(-o)! [*p.* wio! *ukr.* вйо!] *int.* но! (пануканьне коней); **vjoken** панукваць, падганяць

vjondzlen=vendzlen вэндзіць, капціць, задымляць

vjorst *m/f*, -n [*ukr./r.* верста, *p.* wiorsta] вярста; **vjórsteven** 1. вярстаць; 2. *n* вёрстка

vjosle=vesle *f*, -s [*p.* wiosło, *ukr./r.* весло] вясло

vjuge *f* [*r.* вьюга] завіруха, завея, мяцеліца

vjun *m*, -es [*ukr.* в'юн] *zool.* уюн; вугар

• drejen zix vi a vjun вярцецца як уюн

vk' *abr.* **vekedojme=uxdojme** [*s.* וכ'=וכדומה] і гэтак далей

vklad *m* [*r.* вклад] уклад, фундуш

vlad *m*, -n [*s.* (ך-)לד(ו)ו] зародак, заплодак, дзіця ў чэраве маці [*sin.* fetus]

vločke/vlučke/vličke=bločke/blucke=bločke=bličke *f*, -s [*p.* włoczka] гарус (мяккія ваўняныя ніткі); **vlóčkener=blúčkener/blúckener=blíčkener** гарусны

vo-=v(a)-=ve-=u- [*s.* -ו] *pref.* і

voble *f*, -s [*r.*] вобла

vodén=vos den *adv./bndv.*

• ele voden? але (што) ж?

vodke *f*, -s [*r.*] водка, гарэлка

voejre [*s.* וארא] "яўляўся я" (назоў 14-га разьдзелу Торы) (Вых. 6:2–9)

voésxanen [*s.* וארתחנן] "і маліўся я" (назоў 45-га разьдзелу Торы) (Др. 3. 3:23–7:11)

vofn *m/n*, -s [*d.* Waffe] зброя; **vófnlozer** няўзброены; **vófnštilštand** *m*, -n, **vófnru** *f* замірэньне; **vófn-treger** *m*, -s збраяносец; **vófnšild** *m*, -n шчыт, тарча, заслона

vog *f*, -n [*d.* Waage] вага, вагі; **vógiker** важкі; **vógikajt** *f*, -n важкасьць; **vógfrajer** бязважкі; **vógšol** *f*, -n [*d.* Waagschale] шаля; **vógšoln** *astr.* Шалі (месяц хэшван); **vog-un-mós** *f*, -n норма, узор, стандарт

• af der vogšol на шалях

• cunemen*/farlirn* vog набіраць/губляць вагу

• cvej kilogram di vog дзьве кілі вагі

• farkojfn epes af der vog прадаваць што-небудзь на вагу

• sxojre af der vog тавар на вагу

• a falše vogšol hot got alejn ojx fajnt *śprxv.* фальшывыя вагі і богу не да спадобы

voglen [*d.* vagieren?] 1. блукаць, бадзяцца, вандраваць; 2. *n*, **vogl** *m*, **vógleniš** *n*, -n блуканьне, бадзяньне; **vogler** *m*, -s, (-n *f*, -s) бадзяга, валацуга, шандыга, туляга, хадзяка, шлында, маталыга; **vóglkind** *n*, -er беспрытульнік, безназорны, беспрытульны дзіцёнак

• ojb voglen un vandern /iz mir bašert, /to zol zajn gevandert /af jamen un erd, /vajlu (I. M.) калі вандраваць і бадзяцца мне суджана, дык хай ужо на моры і па зямлі

vogn *m*, *pl.* -s/vegn/végener, *dim.* **veg(nd)l** *n*, -ex, **végele** *n*, -x [*d.* Wagen] воз, калёсы, драбіны, цялега

• šteln dem vogn far di ferd ставіць калёсы ўперад коней

• zecn zix in fremdn vogn садзіцца на чужыя калёсы (у чужыя сані)

• a tap (ton) in vogn šat (kejnmol) ništ *glxv.* памацаць у возе ня шкодзіць (купіў не купіў, а патаргаваць можна; дагнаў не дагнаў, а прабегчы можна; спроба - не хвароба)

• Maćek hot kejn vogn, Kuba hot kejn ferd *glxv.* Мачык ня мае калёсаў, Куба ня мае каня

vojen [*p.* wyć, *ukr.* вити] 1. выць; 2. *n* выцьцё
• vojen vi a hunt/volf выць як сабака/воўк (у піліпаўку)
• az me git a zec ejn hunt, vojen ale *šprxv.* ударыш аднаго сабаку, завыюць усе
• az a hunt vojet, iz ejner geštorbn *šprxv.* калі сабака вые, нехта памёр
vój(e)ven (mit) [*p.* wojować, *ukr.* воювати] ваяваць; **vojake** *m*, -s ваяка; **vojénščine** *f* ваеншчына
vojl *n*, **vojlkajt** *f* [*d.* Wohl] дабро, дабрабыт, дастатак; **vójl(eriš)er** (véjlerer) добры, бравы, слаўны
• vojle nešomes добрыя душы (людзі)
• a vojle jidene добрая жыдоўка
• a vojler boxer/jung/menč добры хлопец/чалавек
• az vojl iz cu im! як добра яму! які ён шчасьлівы!
• er vejs vojl, az... ён добра ведае, што...
• vojl vi bam tatn in vajngortn добра як у таты ў вінаградніку (як у мамы гасьцяваць, як у небе/раю, як у пана бога за печчу)
• vojl vi di velt добры, шчасны, шчасьлівы
• zix lozn* vojlgejn (vojl gejn) пусьціцца ў гулі, загуляць
• zol (es) dir/ajx vojl bakumen! смачна зьесьці! усяго табе /вам добрага!
• cum vojlzam на здароўе
• ir iz do gut un vojl ёй тут вельмі добра
• az der talmed iz a vojler, iz der rebe ojx a vojler *glxv.* калі вучань добры, дык настаўнік таксама добры
• est un trinkt un lozt zix vojl gejn піце і ежце і добра гуляйце
• vojl iz dem, vos zict in der hejm *glxv.* добра таму, хто сядзіць дома
• x'hob gehat a šadxndl, /a vojler menč iz er geven, /hot er mir gebraxt a vajb, /vos vejst kejn xoxmes nit (E. K.) быў у мяне зводнічак, ладны чалавек ён быў, ён прывёў мне жонку зусім бяз розуму
• zol (es) dir/ajx vojl bakumen! каб гэта табе/вам на карысьць!
vójlajngeordnter [*d.* eingeordnt] добраўпарадкаваны; **vójlajnordenung** *f* дабрабыт, дастатак, багацьце, добраўпарадкаванасьць
vójldenkendiker [*d.* denken] з добрымі думкамі
vójl-dercíerišer, vójldercójgener [*d.* erziehen] добра выхаваны
vojler-júng *m*, *pl.* vojle-júngen [*d.* jung] добры хлопец; задзіра, задзірака; **vojl(-)júng(er)išer** малайцаваты, зухаваты, бравы; **vojljúngeriškajt** *f* малайцаватасьць, зухаватасьць
• a vojler-jung ligt štendik in der erd *glxv.* добраму хлопцу месца ў магіле/пекле
vójlgebójter [*d.* wohlgebaut] статны, складны, ладны, зграбны
vójlgeborener [*d.* Wohlgeboren] высакародны, шляхетны
vójl(-)gelernter [*d.* gelernt] адукаваны, дасьведчаны
vójlgenejgter [*d.* wohlgeneigt] прыхільны; **vójlgenejgtkajt** *f* прыхільнасьць
vójlgerotener [*d.* wohlgeraten] удачны, удалы, трапны
vójlgerux *m* [*d.* Wohlgeruch] духмянасьць, водар
vojlkénevdiker [*d.* können, kennen] адукаваны, асьвечаны; **vojlkénevdikajt** *f* адукаванасьць, асьвечанасьць; **vójlkener** *m*, -s (-n *f*, -s) (добра)адукаваны, асьвечаны чалавек
vójlklang *m*, **vójlklangevdikajt** *f* [*d.* Wohlklang] мілагучнасьць; **vójlklangevdiker, vójlklingevdiker, vójlklingendiker** мілагучны
vójl-lerner *m*, -s [*d.* lehren] добры/старанны (гэбрэйскі) вучань
vójlmutiker [*d.* mutig] дабрадушны, лагодны
vójlšmekndiker [*d.* wohlschmeckend] смачны, прыемны на смак
vójlštand *m* [*d.* Wohlstand] дабрабыт, дастатак, багацьце, добраўпарадкаванасьць
vójltat *m*, -n [*d.* Wohltat] дабрадзейства, дабрачыннасьць; **vójl(-)tetiker, vójltuiker** дабрачынны, дабратворны, цнотны, цнатлівы; **vójltetikajt** *f*, -n дабрачыннасьць; **vójltuer** *m*, -s, (-n *f*, -s) дабрадзей, дабрачынец, дабрачынны, дабрадзейны, цнотны, цнатлівы чалавек; **vójltuerišer** дабрачынны, дабрадзейны
vójltik *m*, **vójltog** *m*, -n [*mhd.* woltac] 1. здавальненьне, прыемнасьць, асалода, дабро, выгада, дастатак, камфорт, росквіт; 2. добрае харчаваньне; **vójltikn** 1. добра харчавацца; 2. да(ва)ць сабе здавальненьне; **vójltiger/vójlteger** *m*, -s сібарыт; чалавек, які жыве ў раскошы
• vern* mešuge (nit visn* vos cu ton) far vojltik шалець з раскошы
vójlton* zix [*d.* wohltun] цешыцца, раскашавацца
vójlzajn ■ [*d.* Wohlzein] дабрабыт, дастатак, багацьце, добраўпарадкаванасьць
• cum vojlzajn! на здароўе!
vojnen [*d.* wohnen] жыць, бытаваць; **vojn** *m*, -en жыхарства, месца жыцьця; **vojner** *m*, -s, (-n *f*, -s) жыхар; **vojnung** *f*, -en памяшканьне, жыльлё, жытло, кватэра; **vójncimer** *m/n*, -n жылы пакой; **vójnort** *m/n*, *pl.* -erter, **vójnplac** *m* месца жыхарства; жыльлёвая плошча; **vójnrext** *n* права на жыхарства; **vójn-šetex** *m* [*s.* שטח] жылплошча
• ejner bojt, un der anderer vojnt (ver es bojt, un ver es bavojnt) *šprxv.* адзін/хто будуе – другі/хто жыве
• ix lax, vajl ix hob nit vu cu vojnen я сьмяюся, таму што ня маю дзе жыць (з анэкдоту)
• nebn dem zun iz gut cu zicn, un nebn dem muter iz gut cu vojnen *šprxv.* побач з сынам добра сядзець, побач з маці добра жыць
• un der tate mit der mamen – /Xanele mit mir, /šojn a lange cajt inejnem /vojnen ale fir (Z. R.) і тата, і маці – Ханэлэ і я, ужо доўгі час жывем разам учацьвярых
vojt *m*, -es [*p.* wójt] войт
vokatív *m* [*d.* Vokativ] *gram.* клічны склон
vokál *m*, -n [*d.* Vokal] *lingv.* галосны гук
vokzál=foksál *m*, -n [*r.* вокзал] вакзал
vol *f* [*d.* Wolle] воўна, шэрсьць, сукно; **vólener** ваўняны; **vólcajg** *n*, **vólštof** *m* ваўняная/шарсьцяная тканіна, сукно
volek *m*, -es [*ukr.* волок, *p.* włok] волак, браднік, брэдзень, невад
• farvarfn* dem volek закінуць невад
Volex *m* [*ukr.* волох, *p.* Wołoch] 1. Валахія (Румынія); 2. **vólexl** *n*, -ex вясёлы жыдоўска-валаскі народны танец
• a volexl lomir zingen,/ a volexl lomir šrajen! валаскую мэлёдыю давайма сьпяваць, валаскую мэлёдыю давайма крычаць!
volf *m*, *pl.* velf, (-ixe *f*, -s), *dim.* **velfl** *n*, -ex, **vélfele** *n*, -x [*d.* Wolf] воўк; **vólfišer=vélfišer** воўчы; **vólfhunt** *m*, *pl.* -hint

ваўкадаў; хорт; **vólfcon** *m*, *pl*. -cejner ікла, кел; **vólfcejndl** *n*, -ex кавалак косткі, які нагадвае воўчы зуб (некалі давалі дзецям, калі ў іх пачыналі рэзацца зубы)
• a staje/tičke velf зграя ваўкоў
• a volfišer apetit воўчы апэтыт
• a klejn kind iz a xazer, a grojs kind iz a volf *šprxv*. малое дзіця – сьвіньня, вялікае – воўк (гадуй дзеці, будзеш бяду меці)
• a volf farlirt zajne hor, ober ništ zajn natur *šprxv*. воўк кожны год ліняе, але нораву не мяняе
• a volf in a šepsenem pelc (im šepsn felxl) *glxv*. воўк у авечай шкуры
• az me lebt cvišn velf, muz men hojln vi a volf *glxv*. сярод ваўкоў жыць – па-воўчы і выць (шыць – з шаўцамі, выць – з ваўкамі)
• der volf xapt di cigelex, biz der ruex xapt im alejn *šprxv*. воўк хапае казьлянят, пакуль чорт ня схопіць яго самога (воўк браў – і ваўка ўзяло; кусаюць і камары да нары)
• hodeve a volf vi lang, kukt er alc in vald arajn *šprxv*. воўка як ні гадуй – усё ў лес пазірае (воўчая натура ў лес глядзіць; воўка ў плуг, а ён – у луг; натура – ня пунька, не пераставіш)
• xapt dem volf far dem, vi er varft zix ■f di šof *šprxv*. ваўкоў пужаюць, дзеля таго яны авец цягаюць (не за тое воўка б'юць, што шэр, а за тое, што авечку зьеў)

vol(f)kelák/vólkulak=vovkelák *m*, -n/-s [*p*. wilkołak, *ukr*. вовкулак, *r*. волколак] *folk*. ваўкалак(а), пярэварацень, скідзень
volik [*r*. войлок, *p*. wojłok] 1. *m*, -es валёнак; 2. *n* лямец
• er hakt volikes ён сячэ валёнкі (гародзіць мох з балотам; гаворыць ні ў плот ні ў азярод; пляце празь дзявята ў пята; чаўпе смалянога дуба)

Volín ■ Валынь; **voliner** валынскі, з Валыні
volje *f*, -s [*p*. wole] вальлё, вальляк, зоб
volkn *m*, -s, **volke** *f*, -s, *dim*. **vélkele** *n*, -x, **volkndl** *n*, -ex [*d*. Wolke] воблак, хмара; **vólkndiker** хмарны, воблачны; **vólkndikajt** *f* хмарнасьць, воблачнасьць; **vólkenen** зацягвацца хмарамі; **vólknbrux/vólknbrox** *m*, -n лівень, залева; **vólknlozer** бясхмарны, бязвоблачны; **vólknkracer** *m*, -s хмарачос, гмах, шматпавярховік
• a hojfn volkns кучка аблокаў
• a grojser volkn un a klejner regn *glxv*. зь вялікае хмары малы дождж (вялікі вор, ды малы збор; вярба таўстая, ды ў сярэдзіне пустая; вялікая луста, а ў сярэдзіне пуста; зь вялікага грому малы дождж)

volne(r) [*p*. wolny] павольны
• volne tut zix beser павольна робіцца лепш

volojčen [*ukr*. волочити, *p*. włóczyć] валачы(ць)
volost *m*, -n [*r*. волость] воласьць, гміна
voltn (ix/er volt, du volst) [*mhd*. wollen] дапаможны дзеяслоў для ўтварэньня ўмоўнага ладу
• er volt es geton ён гэта зрабіў бы
• ix volt geśribn я пісаў бы
• ojb er volt gekent калі б ён мог
• ven du volst visn калі б ты ведаў
• ven dos mojl zol nit badarfn cu esn, volt der kop in gold gegangen *šprxv*. хадзіў бы ў злоце, каб не дзіра ў роце (каб ня елі, ня пілі, то б у золаце хадзілі; каб ня піў ды ня еў, то залатога б каня меў)
• volt der menč nor azojfil vert geven, vi got ken helfn *šprxv*. ці варты чалавек таго, каб бог яму дапамагаў
• vos volt bam menčn tajerer geven fun šlof, ven es zoln nit zajn di bejze xalojmes? *glxv*. ці было б што даражэйшае ў чалавека за сон, калі б ня злыя сны?

vólveler (vélv(e)ler) [*d*. wohlfeil] танны; **volvl/vélv(e)ler vern*** (па)танець; **vólvelkajt** *f* таннасьць
• kostn volvl танна каштаваць
• kojfn far volvl купіць за бесцань/бясцэнак
• volvl vi boršt танны як боршч
• volvl flejš esn di hint *šprxv*. таннае мяса сабакі ядуць
• vos volvl iz tajer *glxv*. што танна, тое і дорага

von! [*r*.] *int*. вон! прэч!
vonce=vons(e) *f*, -s, **vonc** *f*, -n, *dim*. **vóncele** *n*, -x [*d*. Wanze] вус; **vónciker, voncevate(r)** вусаты
• er hot nox milx af di vonces y яго яшчэ малако на вусох /вуснах (не абсохла)

vondke=ventke/vendke *f*, -s [*p*. wędka] вуда
vonen zix [*d*. wannen?] клубіцца, шугаць (аб дыме)
vonxen [*p*. wąchać] нюхаць
vorcl *m*, -en, *dim*. **vercl** *n*, -ex [*d*. Wurzel] 1. корань; 2. бародаўка; **vórcldiker** каранёвы; **vorclen** (in) караніцца; **vórclfruxt** *f*, -n каранеплод; **vórclštang** *m*, -en *bot*. карэнішча
• a vercl xrejn карэньчых хрэну
• bam same vorcl каля самага кораня
• bizn vorcl да самага кораня
• lozn*/šlogn* (tife) vorclen пускаць (глыбокія) карані

vorčen [*r*. ворчать] бурчаць; **vorč** *m*, -n, **vórčeniš** *n* бурчаньне, буркатня; **vorčún** *m*, -es/-en буркун; **vórčern** *f*, -s буркуха; **vórčendiker** бурклівы; **a vorče ton*** буркнуць, прабурчаць
• an alter a vorčun стары буркун
• vorčen vi a bejze šviger бурчаць/дудукаць як ліхая сьвякроў(ка)/цешча (як кіла/буркала/сабака/стары)

vorek *m*, -rkes, **vóreček/vórečik** *m*, -čkes [*p*. worek] ворак, мяшок, торба
vorem *m*, *pl*. verem/verim, *dim*. **véreml** *n*, -ex [*d*. Wurm] чарвяк, рабак; **vóremartiker** чэрвепадобны
• onkumen* mit grine verem *fig*. дастацца потам і крывёю
• a vorem krixt arajn in xrejn un mejnt, az kejn zisers iz af der velt nito (az der vorem zict in xrejn, mejnt er, az es iz gor kejn zisers af der velt nit faran) *šprxv*. чарвяк залязае ў хрэн і мяркуе, што німа нічога саладзейшага ў сьвеце (хто ня еў пячэні, той вантробе рад)
• az me cetret a vorem, krimt er zix ojx *glxv*. хто наступае на чарвяка, крывіцца й сам таксама
• banaxt iz dos a lajxt-žukl, batog – pošet a vereml *glxv*. уначы гэта сьветлячок, удзень – проста чарвяк (анёлам ляцеў, а чортам сеў)
• dos vereml nart op, un nit der fišer oder di ventke *šprxv*. прынаджвае не рыбак і ня вуда, але чарвячок (ня конь вязе, але дарога, ня бог памагае, але пуга)
• di rojtste epl hot a vorem *glxv*. самы чырвоны яблык чарвівы
• er šrajbt, vi der vorem točet *glxv*. ён піша, як чарвяк точыць (прыгожыя круглыя літары)
• in a šejnem epl gefint men amol a vorem *glxv*. і ў прыгожым яблыку знойдзецца чарвяк (гожэ яблычко, да ў сярэдзіне чарвяк)

• itlexer vorem hot zajn lox *šprxv.* кожны чарвяк маё сваю дзірку (у кожнай лісіцы свой хвост)
• s'točn/s'esn im verem *glxv.* яго точаць чарвякі (кожны мае свайго моля, што яго грызе)
• verem zoln dix ufesn! (esn zoln dir verem!) *kll.* а бадай цябе рабакі зьелі! (няхай цябе чэрві апануюць!)

vorem/vorum=vor(i)n [*d.* warum] *adv.* бо, таму што
• "far vos" iz kejn kaše nit, un "vorem" iz kejn terec nit *šprxv.* "чаму" – не пытаньне, а "таму" – не адказ

vór(e)nen (far, kegn) [*d.* warnen] пера-, за-, а|сьцерагчы, пера-, за-, а|сьцерагаць (ад, супраць), папярэдзіць, папярэджваць; **vórenendiker** перасьцерагальны; **vorn** *m*, -s, **vórenung** *f*, -en, **vóreniš** *f*, -n перасьцярога, папярэджаньне, заўвага, паведамленьне, апавяшчэньне; **vorndl** *n*, -ex папераджальны сыгнал; **vórnvort** *n*, *pl.* -verter папераджальнае слова
• mit a kurcer vorenung зараз-жа, у кароткі тэрмін

vorer=varer, **vórhaft(ik)er** [*d.* wahr(haft)] праўдзівы, сапраўдны, правільны, слушны; **vor** *m/f* ява, сапраўднасьць; **vorhajt=varhajt** *f*, -n, **vórhaftikajt** *f* праўда, ісьціна, праўдзівасьць, сапраўднасьць; **vórcejxn** *m*, -s [*d.* Wahrzeichen] прыкмета, адзнака; **vóršajn(d)lex=váršajnlex** [*d.* wahrscheinlich] *adv.* мабыць, падобна, пэўна, магчыма, маўляў, мо(жа); **vóršajn(d)lexer=váršajnlexer** праўдападобны, імаверны, магчымы, пэўны; **vor(-)vort** *n* праўдзівае слова; **vórzogn** прадказваць, прадракаць; **vórzoger** *m*, -s, (-n *f*, -s) вяшчун, прарок; **vorzogeráj** *n* прадказаньне, прараканьне, праройства; **vórzogerišer** вешчы, прарочы
• a vor vort праўдзівае слова
• af der (afn) vor наяве, увачавідкі
• far vor запраўды, дапраўды, папраўдзе
• a bejze šmue iz vor (flit vajt) *šprxv.* злыя словы – праўда (ляцяць далёка)
• kejn vor vort kumt fun zajn mojl nit arojs жаднага праўдзівага слова ад яго не пачуеш

voret *f* [*d.* Wahrhajt?] ісьціна, праўда

vorf *m*, -n [*d.* Wurf] кідок; **a vorf/varf ton*** кінуць
• er git a vorf ejn ojg af im ён кінуў позірк на яго
• s'hot mitamol a vorf geton di mašin in a zajt раптоўна машыну кінула ўбок

vorken [*ukr.* воркати] 1. буркаваць; 2. *n* буркаваньне
• vorken vi a tojb буркаваць як голуб
• In majn štiln ejnzam cimer /vorkn veln zej, /vorkn veln in majn cimer /vajse tojbn cvej. /In der naxt fun švern umet /vorkn veln zej, /in der naxt fun švarcn umet, /vajse tojbn cvej. (Z. V.) У маім ціхім адзінокім пакойчыку яны будуць буркаваць, будуць буркаваць у маім пакойчыку двое белых галубоў. Уначы ад цяжкага смутку яны будуць буркаваць, уначы ад чорнага смутку, двое белых галубоў.

vorn=vorem *adv.* бо, таму што
• vorn vos? ну, дык што?

vórnečke=várničke *f*, -s *kul.* макаронныя вырабы ў выглядзе матылькоў (звычайна падаюцца разам з грэцкай кашай, грыбамі і цыбуляй)

vorobéj *m*, -en, **vorobejčik** *m*, -es [*r.* воробей] *zool.* верабей

voron *m*, -es [*ukr./r.* ворон] *zool.* крук, груган; **v(o)rone** *f*, -s *zool.* варона

vorse *f* [*ukr.* ворса] ворс(а)

vort *n*, *pl.* verter [*d.* Wort] слова; **vórtlexer** слоўны, вусны, на словах; 2. даслоўны, літаральны; **vort-ba-vórt-iberzecung** *f*, -en літаральны/даслоўны пераклад; **vórtbildndiker** *gram.* словаўтворны; **vórtbildung** *f gram.* словаўтварэньне; **vórtcejxn** *m*, -s пароль; **vórtenderung** *f gram.* словазьмяненьне; **vort frier** *n*, *pl.* verter frier прадмова; **vórtgebrojx** *m* словаўжываньне; **vort-ájn** 1. *m gram.* пачатак слова; 2. *adv.* на пачатку слова; **vort-ín** 1. *m gram.* сярэдзіна слова; 2. *adv.* у сярэдзіне слова; **vort-ójs** 1. *m gram.* канчатак слова; 2. *adv.* на канцы слова; **vórtnemer** *m*, -s, (-n *f*, -s) выступовец, выступоўца; **vórtsman** *m*, *pl.* -lajt чалавек слова; **vórtšpil** *f/n*, -n гульня словаў, жартаслоўе, каламбур; **vórt-štelung** *f gram.* парадак словаў; **vort-vértlexer** дакладны (слова ў слова); **vórtzoger** *m*, -s, (-n *f*, -s) зьвястун, заклікач
• a krumer vort крывое слова
• a vort-menč чалавек слова
• af majn vort слова гонару
• dos/a vort bakumt... слова мае...
• dos vort ligt afn špic cung (af der cung) слова верціцца на языку
• glejbn emecn afn vort (az) верыць камусьці на слова
• hobn*/nemen*/gebn*/betn* a/dos vort мець/браць/даваць /прасіць слова
• mit ejn vort адным словам
• mitn harbn vort жорстка, патрабавальна
• nit hobn* kejn verter німа словаў
• nit lozn* kejn vort ojsrejdn не дазваляць вымавіць слова
• rejdn* verter гаварыць ясна і зразумела
• vort in/ba/far vort слова ў слова, дакладна
• xapn/haltn*/nemen* emecn bam vort злавіць кагосьці на слове
• zogn cum vort казаць дарэчы
• a gut vort farnemt an ort *glxv.* добрае слова займае месца
• a gut vort kost kejn gelt (nit) un brengt tomid ajn *šprxv.* добрае слова грошай не каштуе, але заўжды карысна (добрае слаўцо лепш, чым піўцо)
• a vort far a vort слова за слова (зуб за зуб)
• a vort iz a vort! даў слова – трымай!
• dos vort inem mojl iz a har, funem mojl – (iz es) a nar (ejder me zogt arojs s'vort, iz men a har, dernox iz men a nar) *šprxv.* слова ў роце – уладар, з роту – дурань (маўчок – пятачок, а два – грыўня; меней гаварыць – сабе ўрадзіць)
• ejder dos vort kumt arojs fun dajn mojl bistu der balebos, dernox iz er der balebos *šprxv.* перш чым слова выйдзе з твайго роту, ты – гаспадар, пасьля – яно гаспадар (выказанае слова да губы ня вернеш)
• fun a vort vert nit kejn lox in kop *šprxv.* ад слова дзіркі ў галаве ня будзе
• ništo kejn verter dercu німа словаў да гэтага
• verter zol/muz men vegn un nit cejln *glxv.* словы трэба ўзважваць, а не лічыць

vos [*d.* was] што, чаго; **vóser(er)** які, каторы; **vóserkajt** *f*, -n колькасьць; **vos-(s')nit-iz**, **vos-es-iz** што-небудзь, штосьці, нешта; **vóser-nit-íz** які-небудзь, якісьці, нейкі
• (a) vosere 50 bixer каля 50-ці кнігаў
• cu vos? навошта? (дзеля) чаго?

• gut, vos er iz do добра, што ён тут
• in voser štub er zol nit arajnkumen у якую б хату ён ні зайшоў
• nit visn*, af voser velt m'iz ня ведаць, на якім сьвеце знаходзішся
• nito vos cu zen! німа на што глядзець!
• nor vos толькі што
• nox vos? яшчэ што? навошта?
• vos a mol šener/kelter/švexer штораз прыгажэй/халадней/горай
• vos a tog штодня
• vos den? натуральна! зразумела!?
• vos cum gixstn як мага хутчэй
• vos es zol ništ zajn чаго ня мае быць
• vos estu ništ? чаму ты не ясі?
• vos far a...? што за...?
• vos gixer як мага хутчэй
• vos gixer, alc beser чым хутчэй, тым лепей
• vos iz? чаго?
• vos lenger..., dos mer чым далей..., тым болей
• vos me zol ništ zogn чаго нельга казаць
• vos mer.... vos/alc mer чым болей..., тым усё болей
• vos mir hobn, un vos undz felt што мы маем, і чаго нам бракуе
• vos s'zol nit zajn што б ні было
• - vos? – trinken noz! – што? – вушы нашто?! (хуёў сто!)
• vos tut men do? што тут зробіш?
• voser a cen каля дзесяці
• voser a date hobn mir hajnt? які сёньня дзень?
• voser a veter што за надвор'е
• voser bux zol nit zajn якая б ні была кніга
• x'vel dir vos zogn я табе нешта скажу
• zol ix gejn, ci vos? я мушу ісьці, ці што?
• a balebos iz šojn vos *glxv.* гаспадар – гэта ўжо нешта
• vos ba jenem iz šejn un gut *glxv.* у кагосьці ўсё прыгожа і добра (у чужым баку вочы па кулаку; у чужым роце і зубоў болей; у чужым хляве і блыха валом здаецца)
• vos s'hot gezolt zajn cu mir, zol ojsgejn cu dajn kop! *kll.* каб усё наканаванае мне ліха ды на тваю галаву!

vosek *m, pl.* vosíkn/vosikim [*s.* (ים-/ין-)תיק(ו)ו] старанны, руплівы, адданы, верны, сталы чалавек [*sin.* flajsiker, getrajer, langjoriker]; **vosíkn/vosikim** *pl.* жыды, якія на досьвітку ўстаюць маліцца і вучыцца
• ufštejn vosikn уставаць досьвіткам на малітву

vóščines/vóščenes *pl.* [*ukr.* вощина, *p.* woszczyna] вуза, вашчына

voške=vaške=viške *f*, -s [*r.* вожжа, *ukr.* віжка] вожкі, лейцы

vov=v/u *m/f*, -n [*s.* (ן-)(ו)או(ו)ו] 1. "воў", літара гэбрэйскага альфабэту; 2. лічба 6; **vov jud** [*s.* וי] у ідышы дыфтонг "oj"

vover *m*, -s [?] *kort.* шасьцёрка

vovkelák=volfkelák/vólkulak *m*, -n ваўкалак(а), пярэварацень, скідзень

vox *f*, -n [*d.* Woche] тыдзень; **vóx(ed)iker** будзённы, будні; **vóx(ed)ikajt** *f*, -n будзённасьць; **vóxndiker**, **vóxntlexer**, **vóx-vexntlexer** штотыднёвы; **vóxnblat** *f, pl.* -bleter тыднёвая газэта, тыднёвік; **vóxngelt** *n* тыднёвы заробак; **vóxnlang** *adv.* цэлымі тыднямі; **vóxntog** *m, pl.* -teg (a vóxediker tog) будзень
• a voxediker malbeš (voxedike klejder) будзённая вопратка
• di draj voxn трохтыднёвы жалобны пост перад "tišebov" [→šivoser-betamez]
• voxedike teg будні
• a voxedike, šojn cu voxedike zax будзённая, занадта будзённая рэч
• a voxediker gang звычайная/штодзённая рэч
• A gut vox der velt der gancer, /a gut vox! /Tate gib Havdole vajn /a bisl nox! /Mame t'morgn vider zorgn /in der krom... /Klingen gleker, klingen glokn – /bim un bom!.. (M. B-n) Добрага тыдня ўсяму сьвету, добрага тыдня! Тата, дай яшчэ трошкі гаўдольнага віна. У маці заўтра зноў клопаты ў краме... Зьвіняць званочкі, зьвіняць званы: бім-бом!..
• az der šabes-kojdeš gejt ahin, kumt di libe vox aher *šprxv.* не пасьпела субота скончыцца, зноў будні пачаліся (зноў клопат)
• vos me handlt in šabes, gejt in der voxn curik *glxv.* што зробіш у суботу, на тыдні скасуеш (у суботу нельга займацца справамі)

voxer=vuxer *m*, **voxeráj** *f* [*d.* Wucher] барыш; ліхвярства; **vóxerer** *m*, -s, (-ke *f*, -s), **vóxernik** *m*, -es, (-nice *f*, -s) ліхвяр; **vóxern** займацца ліхвярствам, даваць грошы на процанты

voxke(r) [*ukr.* вогкий] вільготны

vozgen zix (mit) [*r.* возжацца] важдацца, важгацца, мець клопат; **vózgeniš** *n* клопат, важданьне

vozne *m*, -s [*p.* wóźny] кіраўнічы, кіраўнік (маёнтка)

vozovnje *f*, -s [*p.* wozownia] вазоўня

vrak *m*, -n [*eng.* wreck] крах, крушэньне

vred *m/f* [*r.* вред] шкодны, брыдкі, гідкі, агідны чалавек

vrone=vorone *f*, -s варона

vu (*dat.* vanen/vanet) [*d.* wo] *adv.* 1. дзе; адкуль, скуль; 2. пакуль; **vú-(s')nit-íz=vu nit iz**, **vú-es-íz=vu es iz (nit)** *adv.* дзе б ні, дзе-небудзь, дзесьці, недзе; **vú-nit-vú=vu ništ vu** *adv.* дзе-нідзе
• mir veln vu-nit-iz ibernextikn мы дзе-небудзь пераначуем
• vu arumert? якім шляхам? праз што?
• vu nor, vu es zol (s'zol) nit zajn дзе б тое ні было
• vu vojnt ir? дзе вы жывяце?
• vu že nemt men a dokter a gutn, /er zol mir gebn a refue cu majn harc, /er zol mir gebn a recept, oj vej, a gutn, /er zol zajn cu majnem šmarc *flksl.* дзе мне ўзяць добрага лекара, каб ён даў мне лекаў для сэрца, каб ён даў мне рэцэпт, вой, добры, які дапамог бы ад маёй хваробы

vuahér [*d.* woher] адкуль

vuhín [*d.* wohin] 1. (vu ahin) *adv.* куды; 2. *m*, -en месца прызначэньня; **vuhín-es-íz**, **vuhín-(s'iz-)nit-íz** *adv.* куды-небудзь, кудысьці
• vuhin dos harc/ojg, ahin di fis *šprxv.* дзе сэрца/вока, там і ногі (дзе баліць, там ручка, а дзе міла, там вочка; у каханкі смаляныя лаўкі; каханьне – не блінцы, а закахаўшыся – канцы)
• ejner hot nit in zin, der anderer hot nit fun vuhin *glxv.* у аднаго і ў думках німа, а ў другога німа адкуль узяць (аб міласьціне)

vuks *m*, -n [*d.* Wuchs] рост, узрастаньне; **vúksiker** рослы, высокі, высокага росту; **vúksšixt** *f*, -n *bot.* камбій, мязга, твор

vunč/vunš *m*, -n [*d.* Wunsch] пажаданьне

vund *f*, -n [*d*. Wunde] рана; **vúndiker** паранены; **vúndflejš** *n* дзікае мяса, пухліна
• an ofene vund жывая рана
• af a (kejn) vund tor men kejn zalc nit šitn (šit nit kejn zalc af di vundn) *šprxv*. на рану ня варта соль сыпаць (гоенае раны ня трэба дражніць/квяліць)
• er iz, vi cu a vund cuculejgn яго хоць да скулы прыкладай
• er zict/ligt in gehakte vundn ён увесь у пасечаных ранах (кеіска пан Грыгоры: што далей то горай)
• di cajt brengt vundn un hejlt vundn *šprxv*. час прыносіць раны і гоіць раны (час найлепшы лекар)

vunder *m*, -s [*d*. Wunder] дзіва, цуд; зьдзіўленье; **vúnderbarer, vúnderfuler, vúnderlexer, vúnderšejner** дзіўны, цудоўны; **vúndern** дзівіць, зьдзіўляць; **vundejrim** *pl. hum*. цуды, дзівы
• es vundert mix гэта мяне зьдзіўляе
• ix vunder zix af dir я дзіўлюся на цябе
• lojfn* kukn afn vunder бегчы глядзець на цуды
• majne kinder zajnen gots vunder! мае дзеці – божы цуд!
• m'tor zix af kejn zax nit vundern ня трэба зьдзіўляцца
• s'iz nit kejn vunder гэта ня дзіва
• vunder iber vunder дзіва дзіўнае, цуд з цудаў
• zajn* emecn a vunder зьдзіўляць кагосьці
• a blinder hot lib cu hern ale vunder *šprxv*. сьляпы любіць слухаць цуды
• af kejn zax tor men zix nit vundern *glxv*. німа нічога дзіўнага на сьвеце

vunk=vink *m*, -en [*d*. Wink] ківок, кіў; **a vunk ton*** кіўнуць
• afn vunk з паўслова
• cu a klugn iz genug mit a vunk, cu a nar darf men a štekn *šprxv*. разумны разумее кіў, дурань – кій (добры і слова паслухае, а ліхі і кія – не; ня слухаеш ківа, паслухаеш кія)
• er farštejt zix deruf vi a blind ferd af dem vunk *glxv*. яму гэта як сьляпому каню ківок (разумее як баран на Біблii)
• ver es farštejt nit afn vunk, cu dem nemt men a štekn *šprxv*. ня слухаеш ківа, паслухаеш кія

vuraxem *m* [*s*. והוא־רחום] першыя словы і назоў малітвы, якую чытаюць кожны панядзелак і чацьвер раніцай і ўвечары
• ejner hot hanoe fun hartn kez, a cvejter - fun lang "vuraxem" un a driter – fun a tir cum *šprxv*. gas адзін атрымлівае асалоду ад цьвёрдага сыру, другі – ад доўгай малітвы, а трэці - ад дзьвярэй на вуліцу

vuršt=voršt *m*, -n [*d*. Wurst] каўбаса; **vuršteráj** *f*, -en каўбасная крама

vut *m* [*d*. Wut] разьлютаванасьць, разьюшанасьць

vzjatke *f*, -s [*r*. взятка] хабар

vzore *f*, -s [*p*. wzor] узор, шаблён

X=xes *m/f*, -n [*s.* (ן-)חית] 1. "хэс", літара гэбрэйскага альфабэту; 2. лічба 8

x=xof *m/f*, -n [*s.* (ך-)כף] "хоф", літара гэбрэйскага альфабэту; **lange(r) xof** [*s.* ך] літара "х", якая пішацца напрыканцы слова

x' *abr.* **xaver** *m*, *pl.* xavejrim, (-te *f*, -s) [*s.* (-ים)חבר=ח'] сябра, таварыш

x'=ix [*d.* ich] я

• x'ze ■ бачу

• x'volt gevolt я б хацеў

xabád *abr.* **xoxme - bine - daas** *kbl.* [*s.* חכמה - בינה - דעת -] 1. *kbl.* мудрасьць - розум - сьвядомасьць (крэатыўныя сфэры боскасьці); 2. хасыдзкі напрамак, заснавальнікам якога зьяўляецца рэбэ Шнэйер Залман зь Лядаў: **xabádnice** *f*, -s хасыдзкая сынагога; **xabadnik** *m*, -es хабаднік (хасыд, які прытрымліваецца гэтага напрамку); **xabader** хабадніцкі (які належыць да хасыдзкага напрамку)

xabáj=xibe [*p.* chyba] *bndv.* хіба

xabanik *m*. -es [*p.* chabanina, *r.* хабал?] бабздыр, бабнік, бабахот, бабалюб

xabár *m* [*ukr./r.* хабар, *p.* chabar] хабар; **xabarnik** *m*, -es, (-nice *f*, -s) хабарнік

• gebn*/nemen* xabar даваць/браць хабар

xaber *m* [*p.* chaber] *bot.* васілёк, валошка

xacár-hamálxes *m*, *pl.* x(a)cejres-malóxim [*s.* חצר־המלכות (חצרות־מלכים) →xocer] царскі двор; **x(a)cejres** *pl.* →xocer *m* [*s.* (חצר(-ות] двор, дзядзінец

x(a)cice *f*, -s [*s.* (חציצה(-ות] "прамежнае"; *rit.* любая рэч, якая знаходзіцца паміж жаночым целам і вадой і якая такім чыным робіць абмываньне нядзейсным

x(a)cifes *n* [*s.* חציפות →xocef, xucpe, mexucef] нахабнасьць, нахабства, бессаромнасьць, дзёрзкасьць, нагласьць; **x(a)cufe** *f*, -s [*s.* (חצופה(-ות] сараматніца, нахабніца, басалайка; распусьніца, блудніца, лярва, абузьніца, валачашчая; **x(a)cufim** *pl.* →xocef *m* [*s.* (חצוף(-ים] сараматнік, нахабнік, басалай, нахабны, нахальны, бессаромны, дзёрзкі чалавек; распусьнік, блуднік

xadatáj=xodatáj *m*, -es [*r.* ходатай] хадак, хадайнік, пасярэднік; **xadatajstve=xodatajstve** *f* хадайніцтва, пасярэдніцтва; **xadatájstveven** хадайнічаць

xad-bedóre *m*, -s [*s.* (ס-)חד־בדרא →lexud; dor, midor ledor] адзіны ў раду, адзіны ў свой час

xad-gádje *f*, -s [*s.* (חד־גדיא(-ות] "казьляня, козачка" (апошняя песьня з Агады, якая сьпяваецца на Пэйсах), *fig.* турма, арышт [*sin.* cigele; tfise, turme, arest]

• drej mir nit kejn kop mit dajne xad-gadjes! не дуры мне галавы сваімі казьлянятамі!

• farzecn in xad-gadje *hum.* пасадзіць у турму/"казу"

• "xad-gadje" štejt tomed af ejn mekex *hum.* казьляня заўжды аднолькава каштуе (з Агады: [*s.* תרי־זוזי] дзьве залатоўкі)

xadorim *pl.* →xejder *m/n* [*s.* (ים-)חדר] 1. пакой; 2. хедар (гэбрэйская першапачатковая рэлігійная школа); 3. *fig.* мастацкая альбо рэлігійная школа, палітычнага альбо духоўнага напрамку

xadošes *pl.* [*s.* חדשות →nisxadeš, xojdeš] навіны [*sin.* najes]

xadošim *pl.* →xojdeš *m* [*s.* (חדשים) חודש] месяц (трыццаць дзён); **xadóšimlang** *adv.* месяцамі

xadrág *abr.* **xejrem-derabénu-géršom** *m* [*s.* חדר"ג=חרם־דרבנו־גרשם →bexadrag] такую абрэвіятуру некалі пісалі на канвэртах, каб нагадаць аб праклёне, які рабін Гершн-Мэйер-Гагойла (960–1028) усклаў на тых, хто чытае чужыя лісты без дазволу, а таксама хто бярэцца больш як з аднае жонкай або разводзіцца бяз жончынай згоды

xadre-xadórim *pl.* [*s.* חדרי־חדרים →xejder] унутраныя пакоі, патаемнае месца

xafui roš=ovl-vaxafui-róš [*s.* (אבל ו)חפוי ראש] "засмучоны і з пакрытай галавой"; моцна засаромлены

Xage [*s.* חגי] *tnx.* (прарок) Агей; Кніга прарока Агея

xag-hoósif *m* [*s.* חג־האסיף →Sukes] "зьбіраньне сьвята" (азначэньне для сьвята Сукэс); **xag-habikúrim** *m* [*s.* חג־הביכורים →Švues] "сьвята першых фруктаў" (азначэньне для сьвята Швуэс); **xag-hamáces** *m* [*s.* חג־המצות →Pejsex] "сьвята мацы" (азначэньне для сьвята Пэйсах); **xagoes** *pl.* →xoge *f*, -s [*s.* (חגא(-ות] хрысьціянскае сьвята

xagige [*s.* חגיגה] *tlmd.* "сьвяточныя ахвяры, сьвяткаваньне"; назоў 12-га трактату 2-га разьдзелу (запаветы аб ахвярах і аб паломніцтве ў сьвятыя месцы на сьвяты Пэйсах, Швуэс і Сукэс)

xail/xajel *n*, *pl.* xajoles/xajolim [*s.* (חי(י)ל(-ים/-ות] процьма, полчышча, войска [*sin.* armej, militer]; **xáil-man** *m*, *pl.* -lajt ваяка, жаўнер

• vilde xajoles дзікая зграя

xaj=nexáj [*p.* niechaj, *ukr.* нехай] *int.* (ня)хай

xaj *m* [*s.* חי →xajes, orxajen, lexaim, otxajen] "жывы"; жывое стварэньне, жывая істота, жывёла [*sin.* lebedik]; **xaj** [*s.* חי/ח"י] васямнаццаць (гэта лічбавае значэньне лічыцца шчасьлівым); **xáj-gelebt** (ня)хай жыве жыцьцё!; выдатны (дзіўны) час

• es iz geven xaj-gelebt гэта быў дзіўны час

• xaj gelebt! няхай жыве жыцьцё!

xaje *f*, -s, *dim.* **xájele** *n*, -x [*s.* (חיה(-ות →farxaješter, balexaim-, balxaj] зьвер, жывёл(ін)а (звычайна дзікая); **xá(j)išer** [*s.* -חיהש/-חייש] жывёльны, зьвярыны, зьверскі, дзікі, грубы [*sin.* vilder, grober, brutaler]; **xájele** *n*, -x насякомае, кузурка, жамяра; **xájelex** *pl.* маладняк (аб дзікіх жывёлах); **xáje-nogl** *m*, *pl.* -negl кіпцюр, кіпець, пазур; **xajeróe** *f*, *pl.* xajes-róes [*s.* (רעה(-ות] дзікі, злы зьвер, дзікая і шкодная істота

• a xajiše sine зьвярыная лютасьць

• vern* vi a vilde xaje зьвярэць

• xajišer instikt жывёльны інстынкт

Xaje-ódem *m* [*s.* חיי־אדם] "Жыцьцё чалавека"; папулярная кніга Аўрома Данцыга (1748–1820), у якой сьцісла апісаны запаветы з "Šulxn-orex"

xaje-ójlem *f* [*s.* חיי־עולם] вечнае жыцьцё, жыцьцё на тым сьвеце; **xaje-Sóre** [*s.* חיי־שרה] "жыцьця Сарынага" (назоў 5-га разьдзелу Торы) (Б. 23:1–25:18)

xajes *m/n* [*s.* חיות →xies, xaj, orxajen, lexaim] жыцьцё [*sin.* lebn]

• ejn štikl xajes iz mir geblibn кавалачак жыцьця мне застаўся

• lib hobn* emecn dos xajes mit der nešome любіць кагосьці ўсёй душой (горача любіць)

• xajes ništ zixer! ні ў якім разе! (небясьпека для жыцьця, няўпэўненасьць у жыцьці)

• afn bojdem štejt a vig, /vigt zix dort a špin in ir; /cit er fun mir dos xajes ojs, /un dem dales lozt er mir (B. Š.) на га-

рышчы стаіць калыска, у ёй калыхаецца павук; ён выцягвае зь мяне жывыя сілы, а мне пакідае галечу

xaješó *f*, -en [*s*. (ען-)חיי־שעה →šo] матэрыяльная асалода, часовае з(а)давальненьне, суцеха на гадзіну

xajet *m*, *pl*. xajotim [*s*. (ים-)ט(י)חי] кравец [*sin*. šnajder]

xajev *m*, *pl*. xajovim [*s*. (ים-)ב(י)חי →xojv, xiev, mexajev, mexujev, hisxaves, misxajev-benafše, farxojvter, nisxajev, balxajev] вінавайца, абвінавачаны, вінаваты чалавек [*sin*. suldiker]; **xájever** (cu) абавязаны, адказны, павінны, вінаваты; **xájev-míse** [*s*. מיתה] вінаваты ў злачынстве, якое падлягае пад сьмяротную кару

• akegn majn ferdl hob ix mix gefilt epes xajev (Ś.-A.) перад маім конікам я адчуваў сябе вінаватым

xajune=xe(j)une *f* [*s*. חיונה] заробак, пражыцьцё [*sin*. ojshaltung, parnose]

xaj-vekájem [*s*. חיי־וקיים] "ён жыве і не зьмяняецца"; азначэньне для бога; слоўная формула, якую традыцыйна дадаюць пасьля імя ізраільскага цара Давіда

• a proster xaj-vekajem просты дурань (скаціна); просты /звычайны чалавек

• es helft nit, xoč šraj: "xaj-vekajem!" (xoč cerajs zix) *glxv*. гэта не паможа, хоць гвалт/крычма крычы (хоць парвіся)

• šraj xaj-vekajem, az tir un lodn zajnen farmaxt (Prc.) крычы гвалт, калі дзьверы і аканіцы зачынены

xájvolt=xalt [*p*. niechaj, *ukr*. нехай] *adv*. (ня)хай, бадай, ану

x(a)kire *f*, -s [*s*. (ות-)חקירה →xojker, mexker] дасьледаваньне; мудраваньне, мудрагельства, разважаньне, развага, філязофія; **x(a)kiren (zix)**, **xákrenen (zix)** мудраваць, мудрагеліць, разважаць, удумвацца, аргумэнтаваць, філязафаваць; **xakren** *m*, *pl*. xakronim, (-te *f*, -s) [*s*. (ים-)חקרן] летуценьнік, мрыйнік, мысьляр, філёзаф, філязоф [*sin*. filosof, denker, gribler]; **xakrónišer** летуценны

xal zajn* (af, um) [*s*. חל] адносіцца, прыстасоўвацца, дапасоўвацца (да чагосьці/кагосьці); прыпадаць, прыходзіцца на пэўны дзень/тэрмін [*sin*. bacien zix, onvendn zix; ojsfaln]

• Roš-Hašone ken kejn mol ništ xal zajn um frajtik Рош-Гашона ніколі ня можа прыпадаць на пятніцу

xalajen=xoljen/xolajen [*s*. חליען] *pejor*. хварэць, быць хворым, валяцца ў ложку

xalamíd/xalaméj [*r*. хламида, *gr*.?] халамід

• jid xalamid! *vulg*. жыд-халамід (бедны, абадраны)

xalás *f*, -n, **xala(n)es** *f* [*s*. (ות-)חלאה(ו) →xojle, maxle] хвароба, немач; *fig*. улюбёная тэма [*sin*. krenk, krankajt]

xalát *m*, -n [*p*. chałat, *ukr./r*. халат, *terk*.] халат, лапсардак; **xalatnik** *m*, -es, (-nice *f*, -s) цыравальнік

xalave=xól(j)ev(k)e *f*, -s халява

xale *f*, -s [*s*. (ות-)חלה] 1. хала, суботні пірог, вітая пшанічная булка (на Рош-Гашону выпякаюць таксама круглай формы або ў выглядзе вяровачнай лесьвіцы); кавалак цеста; 2. *tlmd*. назоў 9-га трактату 1-га разьдзелу (запаветы аб перадачы кавалка цеста ад замесу когану)

• xale nemen* *rel*. цырымонія спальваньня на агні маленькага кавалачка цеста перад выпечкай халы, чытаючы пры гэтым адпаведныя бласлаўленьні (як успамін аб цесьце, якое аддаецца когану)

• az me zuxt xale, farlirt men dervajl(e) dos brojt *šprxv*. шукаючы пірага, і хлеб згубіш (лепш хлеб з вадою, чым пірог зь бядою)

• es šlogn zix ale far di štikele xale *glxv*. усе б'юцца з-за кавалка халы

• iber an ongehojbener xale iz nit gut kejn hamojce cu maxn *glxv*. над пачатай халай блага чытаць бласлаўленьне

• kejn brojt, kejn flejš, kejn xale, /an ojsgevejkte kale, /Icik hot šojn xasene gehat! *flksl*. ані хлеба, ані мяса, ані халы, змарнелая нявеста, Іцка ўжо ажаніўся!

• vos vilstu - xale mit kez, ci xale on kez? (*vrtš*. "xalemitkes un xaleonkes") што ты хочаш – халу з сырам, альбо халу бяз сыру? (з фрашкі)

xalef *m*, *pl*. xalofim [*s*. (ים-)חלף] рэзьніцкі нож [*sin*. šextmeser]

• a cung vi a xalef язык як рэзьніцкі нож (як брытва, як дзедава пуга, як цэп літоўскі)

• cuštejn* cu emecn mitn xalef cum haldz прыставаць да кагосьці з нажом да горла

• der xalef ligt im afn haldz яму ўжо нож прыстаўлены да шыі (хуткая помста)

xalemój(e)d=xolemój(e)d=xul-hamójed *m*, **xuh"m** *abr*. [*s*. חול־המועד=חוה"מ] "будні сьвята" (пэрыяд паміж двума першымі і апошнімі днямі Пэйсаху або Сукэсу)

xalemejznik *m*, -es [*r*. халамыга?] бадзяга, валацуга, шандыга, туляга, хадзяка, шлында, маталыга, басяк; няздатны, бязрукі чалавек

xálešn [*s*. חלשן →xalošes, xulše, xoleš, far-, ojs-, op|xalešn, gexalešter] (с)траціць/губляць прытомнасьць; (с)аслабнуць, (с)траціць сілы, занядужаць, лохнуць; прагнуць, таміцца, заняпасьці, занепадаць [*sin*. farlirn dos bavustzajn; vern opgešvaxt; lexcn, ojsgejn nox epes]

• im xalešt dos harc ён галодны

• me ken fun im/ir xalešn ад яго/яе можна страціць прытомнасьць

• xalešn esn, trinken… прагнуць, моцна хацець есьці, піць…

• xalešn nox/cu epes тужыць, нудзіцца, прагна жадаць нечага

• zi xalešt an epl ёй хочацца яблыка

xalfn *m*, *pl*. xalfonim [*s*. (ים-)חלפן] мяняйла, ліхвяр, квотнік, банкір [*sin*. geltveksler, gelttojšer, bankir]; **xalfones** *n* [*s*. ות-] абмен грошай, ліхвярства, банкірства

x(a)lice *f* [*s*. חליצה →mejabem, jibem] цырымонія, паводле якой бязьдзетная ўдава вызваляе свайго швагера ад абавязку ўзяць яе за жонку (цырымонія складаецца са сьцягваньня абутку з нагі швагера)

• gebn* xalice emecn вызваліць швагера ад абавязку ўзяць удаву за жонку

• nemen* xalice вызваліцца ад гэтага абавязку

xaljastre *f*, -s [*p*. hałastra] гурт, натоўп, зброд

xaloim=xojlem=xeloim/xeliim *pl*. →xojle *m* [*s*. חולה(-ים) (/חול(י)אים)] хворы чалавек

xalojmes *pl*. →xolem *m* [*s*. (חלום(-ות] сон

xalokim *pl*. →xejlek [*s*. (חלק(-ים] частка, доля

xalolim *pl*. →xolel *m* [*s*. (חלל(-ם] поласьць, пазуха

xalošes *n* [*s*. חלשות →(far)xalešn, xulše, xoleš] непрытомнасьць, страта прытомнасьці/разуменьня, абмарачэньне, нячуласьць; агіда, брыдкае пачуцьцё, адурэньне, ачмурэньне, брыдкая рэч [*sin*. ekl, migl]; **xalóšesdiker** паганы, паскудны, брыдкі, агідны; **xalóšes-tropn(s)** *pl*. нашатырны сьпірт (для ўдыханьня)

• (a) xalošes! жах!
• biz xalošes да адурэньня, да ачмурэньня
• blajbn*/faln* in xalošes (xalošes faln*) страціць/згубіць прытомнасьць, зьнепрытомнець
• zajn* xalošes гідзіцца, гадзіцца, адчуваць агіду
• Du host mir cugezogt briv cu šrajbn – /du host mir nit gešribn... /Ven ix zol visn di cajt fun dajn kumen – /volt ix xalošes geblibn. *flksl.* Ты паабяцаў мне пісаць лісты – ты мне не напісаў... Калі б я ведала час твайго прыезду, я бы страціла прытомнасьць.

xalt=xajvolt=(ne)xáj volt *adv.* (ня)хай, бадай, ану; **xalstu=(ne)xáj volstu**
• xalt ix beser gegangen ahin лепей бы я туды пайшоў

xalture *f* [*p.* chałtury, *v.* хаўтуры, *lat.*] халтура; **xalturne(r)** халтурны; **xaltúreven** халтурыць; **xalturnik** *m*, -es халтуршчык

xalúc=xolec *m*, *pl.* xalucim [*s.* (חלוץ(-ים], **xaluce** *f*, -s (חלוצה(-ות] перасяленец (у Палестыну)

xaluke *f*, -s [*s.* חלוקה(-ות) →xejlek, xilek, somejex-bexelke, mexulek, mexulek, maxlojkes] дзяльба, падзел; грашовая дапамога бедным людзям у Палестыне [*sin.* cutejlung, ojstejlung]; **x(a)luke-déjes** *pl.* [*s.* דעות] разнагалосьсе, нелады, разлады, сваркі, звады

xalušim *pl.* →xoleš *m* [*s.* (חלוש(-ים] слабы, хваравіты

xalup(k)e *f.* -s [*p.* chałupa, *ukr./r.*] халуп(к)а; **xalupnik** *m*, -es, (-nice *f.* -s) надомнік

xalva/xalve *f* [*terk.*] халва

Xam [*s.* חם] "гарачы"; *tnx.* Хам (адзін з трох сыноў Ноя) (Б. 9:18)

xam *m*, -en [*p.* cham, *ukr./r.* хам, *s.* חם] хам; **xámske(r), xámišer, xamúlišer** хамскі; **xameruk** *m*, -es грубы, просты, недалікатны чалавек, кацапюга, невук, цюхцей; **xámiškajt** *f* хамства; **xamul(j)e** *m/f*, -s хамула

xamer/xamój(e)r *m*, *pl.* xamejrim/xamojrim [*s.* (חמור(-ים] асёл; *fig.* грубіян, хам(ула), дурань [*sin.* ejzl; nar, ignorant]; **xámer(i)šer/xamójrišer** дурны, бязглузды, бязмозглы, дурнагаловы, тлумны; **xámer-ejzl** *m*, -en сладастрасьнік, юрліўца, бабнік, бабздыр, блядун, кабель
• es (ge)vendt zix, vu der xamer štejt (ajn) *glxv.* альбо "асёл" альбо "віно" – залежыць ад таго, дзе стаіць (залежыць ад абставінаў) (*vrtš.* "xamer" [*h.* חמור] асёл – "xamar" [*ar.* חמר] чырвонае віно) (štejt er in štal, iz er an ejzl, štejt er in keler, iz er rojter vajn калі стаіць у стайні – гэта асёл, калі стаіць у склепе – гэта чырвонае віно)

xámern [*r.* хамать?] дрыхнуць, спаць бяз проспы

xamiše xumše-tójre *pl.* [*s.* חמש(ה) חומשי תורה] пяць кніг Торы ("Brejšes", "Šmojs", "Vajikro", "Bamidber", "Dvorim")

x(a)miši *m* [*s.* חמישי] "пяты"; чалавек, якога пятым паклікалі да чытаньня Торы ў сынагозе
• gebn* xamiši выклікаць (кагосьці) пятым чытаць Тору
• krign* xamiši атрымаць гонар пятым чытаць Тору

x(a)mišim [*s.* חמישים] пяцьдзясят (год) [*sin.* fufcik (jor)]
• er iz šojn ariber di xamišim яму ўжо шосты дзясятак

Xamišoser/Xamišosor (Bišvát) *m* [*s.* (בשבט) חמש(ה) עשר →Tu Bišvat, švat] Ту-Бішват (15 дзень месяца швата), гэбрэйскае сьвята Новы год дрэваў (час красаваньні пладовых дрэваў у Палестыне)
• Xamišoser bišvat hobn di jinglex dos naxtgejn zat *glxv.* пасьля сьвята дрэваў ня трэба ўжо дзецям ісьці ў хедар адвячоркам

xamítišer хаміцкі (аб мове)

Xananje [*s.* חנניה] *mx.* Хананія (Нээм. 7:2)

xáneles éjgelex [*s.* -חנה] *bot.* анюціны вочкі, браткі

xandrá *f* [*r.* хандра, *gr.*] нуда, маркота, немарасьць

Xandríkeve *f* Хандрыўка, Задрыпанка; *fig.* забытая богам мясьціна

xandronje *f*, -s [?] лухта, глупства, недарэчнасьць

xánfe(ne)n* (zix) (cu) [*s.* חנפה(נע)ן →arojs-, unter-, ojs|xanfenen] лісьлівіць, лісіць, лясьціць, нізкапаклоньнічаць, запабягаць, падлашчвацца, паддобрывацца, падлізвацца [*sin.* zix culekn]; **x(a)nife/x(a)nufe** *f*, -s [*s.* חניפה (חנופה(-ות)/] лісьлівасьць, падлізваньне [*sin.* šmejxleraj, unterlekeraj]; **xanejfim** *pl.* →xojnef *m*, *pl.* xonfim, (-te *f*, -s) [*s.* (חונף(-ים/חניפים], **xanfn** *m*, *pl.* xanfonim [*s.* (חנפן(-ים], **x(a)nífe(s)nik** *m*, -es, (-nice *f*, -s), **x(a)nífušnik** *m*, -es, (-nice *f*, -s) лісьлівец, нізкапаклоньнік, падхалім, падлізьнік; **xanífesdiker** лісьлівы
• maxn a xanife(le) палісьлівіць, палесьціць
• xanfenen* mit zise rejdelex лесьціць салодкімі прамовамі (рассыпацца дробным макам)
• az me mejnt di toxter, xanfet men di muter *glxv.* хто думае пра дачку, празнушчаецца перад маткай
• emese frajnt xanfenen nit *glxv.* сапраўдныя сябры не лісьлівяць
• es iz nit aza šand cu ganvenen, vi cu xanfenen *glxv.* не такі сорам красьці, як лісьлівіць

Xánike/Xáneke/Xánuke *m* [*s.* חנוכה →zojs-xanuke] "аднаўленьне"; гэбрэйскае сьвята Ханука [*sin.* banajung]; **xánike/xánuke-gelt** *n* грошы, якія даюць дзецям альбо беднякам у якасьці падарунка на Хануку; **xánike/xánuke-lixtl** *n*, -ex ханукальная сьвечка; **xánike/xánuke-lomp** *m*, -n, **xánike/xánuke-lempl** *n*, -ex ханукальны ліхтар (падсьвечнік для 8 сьвечак, плюс адна сьвечка для запальваньня); **xanukes-/xanukas-habáis** *m* [*s.* חנוכת הבית] навасельле, уходзіны, улазіны
• praven/maxn xanukes-habais спраўляць улазіны
• ix vinč ajx a gliklexn Xanike! жадаю вам шчасьлівай Ханукі!
• es iz nit majn cig un nit majn xanike-lixtl *glxv.* гэта не мая каза і не мая сьвечка (не маё гарыць – ня мне тушыць; то не мая кароўка ўгрузла; я не я і хата не мая; а мне да таго ні сьпераду ні ззаду)
• s'iz nit majn cig un nit majn xanike-lixtl! гэта не мая каза і не мая ханукальная сьвечка!
• Xanike un Purim vern di oreme lajt jesurim *glxv.* на Хануку і на Пурым бедным людзям раскоша (яны атрымоўваюць ад багатых міласьціну: "xanike-gelt", "purim-gelt")

xap(kem)-láp(kem)=xopkem-lópkem [*p.* chap, łap, *ukr.* хап] *adv.* хап-лап, сьпехам (абы як)
• fun xap-lap cebrext men zix dem kop *glxv.* "хапам-лапам" скруціш сабе галаву (хто сьпяшыць, той і спатыкаецца (той людзей сьмяшыць); сьпехам нарабіў сьмеху)
• rajx ken men nor vern fun "xap-lap", ober nit fun "kap-kap" *šprxv.* разбагацець можна толькі ад "хап-лап", але не ад "кап-кап"

xapn [*p.* chapać, *ukr.* хапати] 1. хапаць, хватаць, (з)лавіць, злапаць; 2. арыштоўваць; 3. сьпяшацца; 4. *n*, **xapung** *f*, -en злаўленьне, (з)лоў; **xapn zix** (az, cu) схапіцца, схамя-

нуцца; **xap** *m*, -n 1. хап, захоп, а(б)хоп, абыйм; 2. імгненная думка, азарэньне; 3. рэзкі рух, паварот; **xap!** *int.* хап!; **a xap ton*/gebn*** схапіць; **gebn* zix a xap** ускочыць, схамянуцца, пачаць; **xápiker** пахаплівы, хапатлівы, сыпсшны; **xápeniš** *f/n* хапёж, сьпешка, пасьпех, хапаньне; **xaper** *m*, -s 1. злодзей, кішэньнік; 2. **xapún** *m*, -es *hist.* лоўчы (чалавек, які ў часы рэкрутчыны займаўся па даручэньні кагалу лоўляй навабранцаў зь бядней-шай часткі жыдавы; Расея, 1825- 55 гг.); **xaperáj** *f*, -en хапаніна; **xáperišer** прагавіты, хцівы; **xáperlex** *pl.* гарэлкі (гульня); **xápndik (zix)** *adv.* сьпехам, насьпех; **xápgrub** *m*, *pl.* -griber лоўчая яма; **xápštajgl** *n*, -ex пастка; **xáptirl** *n*, -ex пастка

- do xapt er a štejn fun der erd тут ён хапае камень зь зямлі
- finf finger mit a xap пяць пальцаў з "хапам"
- geojnišer xap (dos iz a xap fun a goen) геніяльная думка
- xap zix nit! не хапайся! не сьпяшайся!
- xapn a kuk кінуць позірк, зазірнуць
- xapn a mecie танна набыць
- xapn a šmues перакінуцца словам
- xapn a vort vi a hunt a bejn схапіць слова як сабака костку (перакінуцца словам)
- xapn af curik падацца назад
- xapn ba der hant схапіць за руку
- xapn dem otem перавесьці дух
- xapn epes vi hejse lokšn/bulbes хапаць як гарачыя локшыны, як гарачую бульбу (сьпяшаецца як шавец да карчмы (на кірмаш за ботамі), як на пажар)
- xapn fligп лічыць вароны (хапаць мухі)
- xapn vi farn tojt хапаць як перад сьмерцю
- xapn zix farn kop схапіцца за галаву
- az me xapt, git men iber di hent *glxv.* хто хапае, таму даюць па рукох
- di xolere zol dix xapn! *kll.* хай цябе халера! халеру табе ў косткі/бок!
- xapt zix arojs a nariškajt, vestu es curik nit xapn *šprxv.* ляпнеш глупства, назад ня вернеш (выказанага слова да губы ня вернеш; з свайго языка спусьціш – на чужым ня зловіш; сьліны не падымеш, а слова ня вернеш)
- ver es vet xapn, dem vet men klapn *šprxv.* хто будзе хапаць, таго будуць біць

xaráščeven [*ukr.* халащати] лягчаць, спакладаць

xarč *m* [*ukr.* харч, *terk.*] харч(ы); **xarčevnje** *f*, -s карчма, харчоўня

xaref *m*, *pl.* x(a)rifim [*s.* חריף(-ים)] праніклівы, дасьціпны, кемлівы, трапны чалавек, вучань [*sin.* šarfziniker menč, šarfer lerner]; **x(a)rifes** *n* [*s.* חריפות-] праніклівасьць, дасьціпнасьць, кемлівасьць; трапная думка; **x(a)rifesdiker** праніклівы, тонкі, дасьціпны, кемлівы, трапны

xarejdim *pl.* →xored *m* [*s.* חרד(-ים)] гэбрэй, які строга прытрымліваецца традыцыяў, прававер, крайні артадокс; **xaréjdišer** які строга прытрымліваецца традыцыяў

xarobe=xorobe *f*, -s [*p.* choroba] хварэць; **xaroben** хварэць

x(a)rójs(i)es *n* [*s.* חרוסת] *kul.* салодкая паста бурага колеру, якая робіцца з гарэхаў, фруктаў, спэцыяў і віна (ядуць на Пэйсах у памяць аб гліне, якую выкарыстоўвалі гэбрэі ў Эгіпце на будаўніцтве пірамідаў)

- me mejnt nit di xarojses, nor di arbe-kojses *glxv.* думае не аб рытуальнай ежы, але аб чарцы

x(a)romes *pl.* [*s.* חרמות] страшныя праклёны, кляцьба [*sin.* švere kloles, faršiltungen]; **x(a)romim/x(a)romes** *pl.* →xejrem *m*, -s [*s.* חרם(-ות/-ס/-ים →maxrem] *rel.* анатэма, праклён; выгнаньне, выключэньне, адлучэньне (ад юдаізму)

x(a)rote *f* [*s.* חרטה] (рас)каяньне, пакаяньне, шкадаваньне; **xaróte-rede** *f*, -s пакаянная прамова; **xarote hobn*/krign*** (af) раскайвацца, каяцца, шкадаваць

- ix hob bald take xarote gekrogn я адразу ж пашкадаваў
- af nit gejn un af nit forn hot men kejn xarote nit (af "nejn" zol men kejn xarote nit hobn) *glxv.* як не хадзіў ды ня езьдзіў, дык і каяцца німа чаго
- cvej mol hot men nit xarote *šprxv.* два разы ня каюцца
- Fun grojs dosade lejg ix zix, mamenju, šlofn /mit bejde hentelex cukopn... /Ix špil a libe, un ix hob xarote /un ken curik šojn ojx nit xapn. *flksl.* У вялікай роспачы я кладуся, матуля, спаць – абедзьве ручкі пад галаву... Я люблю, я каюся, але назад ужо ня вернеш.
- nox di xupe iz špet di xarote *glxv.* пасьля вянца позна каяцца
- rebe Note hot tomed xarote *glxv. hum.* рэбэ Нота заўжды каецца
- sejxl un xarote kumen štendik cu špet *glxv.* розум і раскаяньне прыходзяць заўжды запозна (каяньне позна ходзе; харошая мысьля прыходзіць апасьля; розум прыходзе па шкодзе; мудры лях па шкодзе; па часе розум мае)
- xarote (hobn) iz nit majse-sojxer/soxriš *glxv.* раскаяньне - гэта справа не для гандляра

xarpe *f*, -s [*s.* חרפה(-ות) →mexaref-, bexarpe] сорам, няёмкасьць, ніякаватасьць, сарамлівасьць; ганьба, зьнявага, абраза [*sin.* šand, gefil fun šemen zix, buše: balejdikung, bizojen]

- a xárpene buše! які сорам!
- s'iz a xarpe un a buše/šande сорам і ганьба
- beser a vejtik in harc(n), ejder a xarpe in ponem *glxv.* лепей боль у сэрцы, чымся ганьба ў твар
- er nemt zajn xarpe un dekt zajn buše dermit cu *glxv.* ён бярэ свой сорам і пакрывае ім сваю ганьбу
- ganvenen iz a gresere xarpe, vi opgebn *glxv.* красьці – большы сорам, чым аддаваць

xart=xort *m*, -n хорт (сабака)

xartumim *pl.* [*s.* חרטומים] *tnx.* чарадзей і чарнакніжнік у Эгіпце

xaruce *f*, -s [*s.* חרוצה(-ות)] разумная і здольная жанчына; **xarucim** *pl.* →xorec *m* [*s.* חרוץ(-ים)] старанны, руплівы і здольны чалавек; дасьціпны чалавек

Xarvojne [*s.* חרבונה] *tnx.* Харбона (Эст. 7:9)

xas=xos zajn* (af) [*s.* חס] шанаваць, шкадаваць; мець міласьць, літасьць, спачуваньне, спагаду, жаласьць [*sin.* raxmones hobn, šaneven]

xasán-/xosn-denán [*s.* חתן-דנן] "гэты жаніх" (формула шлюбнага дагавору); *hum.* чалавек, аб якім мы вядзем гаворку; **xasán-hajóvl** *m* [*s.* חתן-היובל] юбіляр [*sin.* jubilar, bal-jojvl]

xasene *f*, -s [*s.* חתונה(-ות) →mexutn, misxatn, balxasene] 1. вясельле, шлюб(овіны), шлюбаваньне; 2. *fig.* скандал, сцэна, мітусьня, сумятня; **xás(e)nke** *f*, -s *pejor./hum.* вясельле; скандал, сцэна; **xásene-derlojb** *m*, -n дазвол на шлюб; **xásene-gehate(r)** жанаты; замужняя; **zajn* xásene-gehate(r)** быць замужам/жанатым; **xásene-opmax** *m* шлюбны дагавор/кантракт; **xasene-plójte** *f*, -s

[*s.* (-ות)פּליטה] уцёкі маладых; **xasanim** *pl.* →xosn *m* [*s.* (-ים)חתן] жаніх, малады; **xásene hobn*** (mit, far) (а)жаніцца, пабрацца, шлюбавацца
• gemište xasene зьмяшаны шлюб
• onarbetn/farkoxn a xasene заварваць кашу, сеяць разлад /смуту
• opšpiln emecn a xasene закатаць камусьці сцэну
• praven a xasene ладзіць вясельле
• xapn zix xasene hobn выскачыць замуж
• xasene maxn (mit) (а)жаніць; *fig.* псаваць, разбураць, рабіць канец
• az me maxt a mejdl nit xasene, maxt zi zix alejn xasene *glxv.* калі дзеўку не выдаюць замуж, яна сама выходзіць
• biz der xasene vet zix es farhejln *glxv.* пакуль жаніцца, усё загаіцца
• di gance xasene hot zix ongehojbn iber... адкуль усё ліха узялося (праз што каша заварылася)
• mit a kind af a xasene un mit a vajb af a jarid iz šlext cu gejn *šprxv.* зь дзіцём на вясельле і з жонкай на кірмаш ёлата хадзіць
• tanc nit ejncajtik af cvej xasenes (me ken nit tancn af cvej xasenes af ejnmol) *glxv.* не танцуй адначасова на двух вясельлях (з аднаею сракаю на ўсіх кірмашох)
• Un kejn xosn vil ix nit, /vajl ix darf im nox nit hobn. /Un az me hot jung xasene - /vert men jung bagrobn. *flksl.* Ніякага жаніха я не хачу, таму што ён мне яшчэ не патрэбны. А таго, хто ззамаладу бярэ шлюб, рана й хаваюць.
• vos far a klezmer, aza xasene *glxv.* які музыка, такое й вясельле (якая песьня, такія і скокі; як будуць граць, так будзем скакаць)
• xasene hobn doert a šo, un cores hot men dos gance lebn *šprxv.* вясельле доўжыцца гадзіну, а ліха – усё жыцьцё (заручыўся – усцаўся, ажаніўся – усраўся; а як воўчэ ажаніла, так і вушы апусьціла)
• zolst hobn hanoje fun dajn xasene-sude un zix dervargn mitn lectn bisn! *kll.* каб ты атрымліваў асалоду ад свайго вясельнага банкету, але падавіўся апошнім кавалкам!

x(a)sidizm *m* [*s.* -חסיד] хасыдызм
xásl(j)ere *f* [*s.* חתלורץ/חתליערץ/חאסלערץ →xasene] *pejor.* вясельле
xásme(ne)n* [*s.* (נע)חתמ →xosem, xojsem, xsime, far-, kegn-, op|xasme(ne)n, ufgexasmeter] 1. падпіс(в)аць; 2. прыпячат(в)аць, ставіць пячатку; запячат(в)аць [*sin.* unteršrajbn; opštemplen; farziglen]
x(a)sodim *pl.* →xesed *m* [*s.* (-ים)חסד] 1. дабрата, міласэрнасьць, спачуваньне, спагада, ласка(васьць) [*sin.* gutskajt, genod, tojve]; 2. *khl.* адна зь дзесяці сфэраў
xas(-)vešólem! [*s.* חס־ושלום], **xas(-)vexolíle!**=**x"v** *abr.* [*s.* וחלילה=ח"ו] *adv./int.* барані/крый божа! каб гэта ня здарылася! каб толькі гэтага не было! [*sin.* opgehitn zol men vern! zol got ophitn! ništ gešen zol es!]
• ale "xas-vešolems" zajnen meglex *glxv.* чакай ліха з усіх бакоў (дзе кінь там клін, дзе пала – там прапала; адтуль гарачо, адтуль балячо)
Xašmenoim *pl.* [*s.* חשמונאים] *tnx.* Макавеі (бацька і пяцёра сыноў) і іхныя нашчадкі [*sin.* makabim, makabejer]
x(a)šudim *pl.* →xošed *m* [*s.* (-ים)חשוד] той, на каго падае падазрэньне; абвінавачаны
x(a)šuvim *pl.* →xošev *m* [*s.* (-ים)חשוב] шаноўны, ганаровы чалавек, (па)важная асоба; **x(a)šives** *n* [*s.* חשיבות] (па)важнасьць, вага, гонар, годнасьць, пашана, павага, чэсьць
xašxes *n*, -n [*s.* (-ן)חשכות] цемра, цемень [*sin.* fincterniš]; **xášxesdiker** цёмны
• a xašxes - di ojgn zix arojscunemen цемень – хоць вочы выкалі
• a mojredik xašxes непраглядная/жахлівая цемень
xate *f*, -s, *dim.* **xatke** *f*, -s [*p.* chata, *ukr./r.*] хата; **xate-pókriške=xate pókriške** пад сакрэтам, прыватна, патаемна, потай, цішком, моўчкі, маўчком, рот на замок
xatef *m/f* [*s.* חטף →nekude] дыякрытычны знак "švo" ў гэбрэйскай мове, калі ён злучаны разам з "komec", "pasex" альбо "segl", утварае галосныя ў слабой пазыцыі: **xatef-kómec** [*s.* קמץ־], **xatef-pásex** [*s.* פתח־], **xatef-ségl** [*s.* סגול־]
xates/xatojs-neúrim *pl.* [*s.* חטאת־נעורים →xotosi] грахі маладосьці [*sin.* jugntzind]; **xatoim** *pl.* →xet *m*, *dim.* **xetl** *n*, *pl.* xatóimlex [*s.* (-ים)חטא] грэх
Xave [*s.* חו(ו)ה] "якая дае жыцьцё"; *tnx.* Ева (Б. 3:20)
• Odem naket, Xave borves *glxv.* Адам голы, Ева босая
• zi iz cikave vi di muter Xave *glxv.* яна цікаўная як маці Ева
xaver *m*, *pl.* xavejrim, (-te/-torn *f*, -s) [*s.* (-ים)חבר →xevre, xavure, xover, misxaber, far-, ojs-, uf|xavern, x"x] сябра, сябар, таварыш, дружа; чалец [*sin.* frajnd; mitglid; her]; **xáver(i)šer** сяброўскі, таварыскі; **xáveršaft** *f*, **xáverišKajt** *f* сяброўства, таварыства; **xávern zix** (mit) сябраваць; **xavejre** *f*, -s [*s.* (-ות)חברה] сяброўка (адмыслова ў сіяністычным працоўным руху); **xaver-ledéje** *m*, *pl.* xavejrim-ledéje [*s.* לדעה־] аднамысны, аднадум, саратнік, паплечнік
• vern* xaver/xavejrim (mit) пасябраваць
• zajn* mit emecn xaver-láver/-láp/-páver/-báver быць з кімсьці ў сяброўскіх адносінах
• a guter xaver iz gut af der un af jener velt *šprxv.* добры сябра і на гэтым і на тым сьвеце добры
• A mejdl, vi zi – un zi hert a gevejn: /– Ix bin a jesojme, ix bin do alejn, /o, kum, šejne mejdl, un zaj nebn mir. /un zajn vel ix, mejdl, a xaverte dir. (J. A.) Дзяўчына, падобная на яе – і яна чуе плач: – Я сірата, я тут адна, о, хадзі сюды, прыгожая дзяўчына і будзь са мной, я буду тваёй сяброўкай.
• az me hot a šejne vajb, iz men a šlexter xaver хто мае прыгожую жонку, той кепскі сябра
• xaveršaft iz štarker vi bruderšaft *šprxv.* сяброўства мацней за братэрства
• zog mir, ver zajnen dajne frajnt/xavejrim, vel ix dir zogn, ver bistu *glxv.* скажы мне, хто твае сябры, я табе скажу, хто ты ёсьць

xaves-dáas *m*, -n [*s.* (-ן)חוות־דעת] выказваньне, думка, меркаваньне знаўцы [*sin.* arojszogung, mejnung furn a zaxkener]
Xavkuk [*s.* חבקוק] *tnx.* (прарок) Абакум; Кніга прарока Абакума
xavruse *f*, -s [*s.* (-ות)חברותא →bexavruse] хаўрус, група, суполка, банда, таварыства [*sin.* gut-bruderšaft; grupe, bande, xaljastre]; **xavrúsediker** хаўрусны, таварыскі; **xavrúsedikajt** *f* хаўруснасьць, таварыскасьць
• zajn* in a xavruse fun emecn быць у хаўрусе з кімсьці

• culib xavruse за кумпанію
• in a xavruse fun manceblen у мужчынскім хаўрусе
• mit a guter xavruse afn šarf fun a šverd *glxv.* у добрай кумпаніі (добра нават) на вастрыі мяча (у цеснаце, ды ня ў крыўдзе; дзе цесна, там пацешна; цясnота – не крывота)
• fun xavruse vegn hot zix šojn ejner ufgehangen *glxv.* за кумпанію і жыд/цыган павесіўся/задавіўся (для кампаніі цыган даўся павесіць)
• xavruse iz nor gut mit zajn ejgn vajb *glxv.* добры хаўрус толькі з уласнай жонкай

xavure *f*, -s [*s.* (-ות)חבורה →xevre, xaver, xover, misxaber, farxavern] хеўра, кумпанія, кола сяброў, таварыства [*sin.* kompanje, gezelšaft]

xaxaken, xaxočen=xoxočen [*ukr.* хохотати, *hsrb.* khakhač] рагатаць, гігікаць, бакі рваць; **xáxeniš** *n* хохат, рогат; **xa-xá!** *int.* гі-гі-гі! ха, ха, ха!

xaxome *f*, -s [*s.* (-ות)חכמה], **xaxejmes** *f*, -n [*s.* (-ן)חכמת →misxakem] разумніца, мудрая, адукаваная жанчына; **xaxomim** *pl.* →xoxem *m* [*s.* (-ים)חכם] мудрэц, разумны чалавек; вучоны; **xáxme-(ha)ležánke** *pl.* [*s.* -(ה)חכמי] *iron.* мудрацы на ляжанцы, гультаі, няўмекі, абібокі; **xaxme-hatálmud** *pl.* [*s.* התלמוד] мудрацы, якія ўзгадваюцца ў Талмудзе; **xaxme-jisróel** *pl.* [*s.* ישראל] гэбрэйскія дасьледнікі новых часоў; гэбрэйскія гісторыкі, філёлягі й іншыя навукоўцы ў Нямеччыне ў XIX ст.

xazajstve=xozajstve *f* [*r.* хозяйство] гаспадарка

xazák [*s.* חזק →xizek, maxzek, mexazek, (be)xazoke, hizxazkes] "умацуй сябе" (канчатковае слова напрыканцы кожнай біблейскай кнігі, якое ў сынагозе заклікач прамаўляе пасьля імя чалавека, якога ён заклікае да чытаньня Торы)

xazál *pl. abr.* **xaxomejnu zixrojnem levroxe** [*s.* חז"ל=חכמינו זכרונם לברכה] "хай будзе бласлаўёная памяць нашых мудрацоў/вучоных"; стваральнікі Мішны і Геморы

xazer *m*, *pl.* xazejrim, (-te *f*, -s) [*s.* (-ים)חזיר →orxazerlen] 1. кабан, парсюк, сьвіньня, сьвінчо; сьвінтух; 2. **xázerflejš** *n* сьвініна; **xázerl** 1. *n*, *pl.* -ex/xazéjrimlex парасё, парася, кабанчык; 2. *n med.* сьвінка, завушніца; 3. *n*, -ex *hist.* расейскі рубель; пяці-/дзесяцірублёўка; **xázer(i)šer** сьвіны, сьвінячы; сьвінскі; **xazerevate(r)** *pejor.* сьвінскі, сьвінушны (выгляд); **xazeráj** *f/n*, -en сьвінства [*sin.* šmuc; miese avle, ummorališe uffirung; kargšaft]; **xázerlen zix** парасіцца; **xazerine** *f*, -s неахайная жанчына, брундзюха, плюндра; **xazérnik** *m*, -es, (-nice *f*, -s) 1. жыд, які есьць трэфнае [*sin.* trejfnjak]; 2. гандляр сьвіньмі; **xazerúk** *m*, -es *fig.* сапраўдная сьвіньня, сьвінчо, сьвінюк; **xázerte** *f*, -s скупая жанчына, скупердзяйка; **xázer(-)hor** *pl.* шчаціньне; **xázerfets** *n*, **xázeršmalc** *f/n* сала, здор; **xazéjrimcixtler** *m* сьвінавод, сьвінагадовец; **xazéjrimcixtlerišer** сьвінагадоўчы; **xazéjrimcuxt** *f* сьвінагадоўля; **xázer-milx** *f* грудное малако; **xázer-muter** *f*, -s сьвінаматка; **xázer-nisl** *n*, -ex сьвіны арэх, жолуд; **xázer-šleger** *m* сьвінны рэзьнік; *fig.* грубы чалавек; **xázer-/xazéjrim-štal** *m/f*, -n сьвіны хлеў; вельмі бруднае месца

• a milner xazer *fig. hum.* млынарова сьвіньня (аб чалавеку, які мае ўсяго празьмерна)
• a šmuciker xazer *fig.* брудная сьвіньня (аб чалавеку)
• fajnt vi a jid xazer ненавідзець як жыд сьвініну
• hobn* xazejrimlex мець парасят, апарасіцца
• maxn fun epes a xazerišer fus моцна запэцкаць штосьці
• pasn vi a xazer a zotl пасаваць як сьвіньні завушніцы/пацеркі/набэдрыкі (як карове сядло/падсядзёлак/паўшоры)
• šitn* perl far xazejrim сыпаць пэрлы перад сьвіньнямі
• xazerše fislex сьвіныя ножкі
• xazeršer bejn сьвінячая костка
• a gvir iz a xazer *glxv.* багацей – сьвінтух (паніч – сьвіны лыч)
• az me est (šojn) xazer, zol rinen fun/iber (der) bord (zol men esn fetn, zol es šojn rinen ibern mojl; az est xazer, iz fetn) *glxv.* калі ўжо есьці сьвініну, дык каб па барадзе цякло
• bistu šojn a hunt, zaj že nit kejn xazer (zaj že xoć kejn xazer nit) будзь ужо лепш сабакам, чымся сьвіньчом
• der xazer iz trejfe, ober der mekex iz košer *glxv.* сьвіньня трэфная, але кошт кашэрны
• der xazer štelt dos košere fisl arojs (xazer-fisl košer!) *glxv.* сьвіньня выстаўляе кашэрную ножку (кажуць аб кепскім чалавеку, які лічыць сябе за добрага)
• fun a xazer a hor iz ojx gut *glxv.* са сьвіньні хоць шчаціньне і тое добра
• me ken kejn xazer nit zajn, az me hejst gejn, muz men *glxv.* нельга быць сьвіньнёй, калі клічуць, мусіш ісьці
• nito azoj orem, vi a hunt, un azoj rajx, vi a xazer *šprxv.* німа бяднейшага за сабаку, німа багацейшага за сьвіньню
• ven a xazer volt gehat herner (der xazer zol hobn herner), volt di velt kejn kiem/ru ništ gehat *glxv.* калі б сьвіньня мела рогі, сьвет бы не існаваў (сьвет бы ня меў супакою) (каб сьвіньні рогі, не саступіла б з дарогі (арала б дарогі); ведаў бог, што ня даў сьвіньні рог, яна ўвесь сьвет пабала б)
• xazer! host gelt? – zaj majn mexutn! *glxv.* парсюк! маеш грошы? – будзь маім сватам! (хоць бы сьвіньня лыса, абы грошай міса)
• zol ■ xazer/hunt visn, vos a hunt/xazer ken! хай сьвіньня /сабака ведае, што сабака/сьвіньня можа!

xázern [*s.* חזרן →xazore, maxzer, maxzir-, xojzer] паўтарыць, паўтараць; перачыт(в)аць; пераказ(в)аць [*sin.* iberlejenen, iberzogn]

• "xazer iber" iz trejfe паўтарэньне – трэфнае (*vrtš.* "xazern" [*s.* חזרן] паўтараць – "xazer" [*s.* חזיר] сьвіньня)

xazn *m*, *pl.* xazonim, (-te *f*, -s) [*s.* (-ים)חזן] хазан, сынагагальны кантар [*sin.* kantor, zinger]; **xazones** *n* [*s.* -ות] кантарства, прафэсія кантара, кантарскае мастацтва; літургічны сынагагальны сьпеў; **xazónišer** кантарскі

• ojszen* vi a xazn on an omed (farn omed; on mešojrerim) выглядаць як кантар без амбоны (на амбоне; бязь пеўчых)
• xazoniše muzik кантарская сынагагальная музыка
• zajn*/blajbn* vi xazn on a kol/kamerton застацца як кантар бяз голасу/камэртона
• a guter xazn tor zix nit šmadn *glxv.* добраму кантару німа сэнсу мяняць веру
• a xazn af der elter bilt vi a hunt un frest vi a ferd *glxv.* састарэлы кантар выe як сабака і жарэ як конь
• a xazn est far dem davenen *glxv.* кантар сілкуецца перад малітвай (за малітвы) (*vrtš.* "far" перад – "far" за)
• a xazn nemt gelt far šrajen un a rov far švajgn *šprxv.* кантар бярэ грошы за крычаньне, а рабін за маўчаньне
• a xazn on a kol iz vi a šof on vol *glxv.* кантар бяз голасу, што авечка бяз воўны

• a xazn zogt cvej mol *glxv.* кантар кажа два разы (аб блаславеньнях "Šimenesre", якія прамаўляюцца двойчы: ціха і голасна)
• ale xazonim zajnen naronim, ober ništ ale naronim zajnen xazonim *glxv.* усе кантары дурні, але ня ўсе дурні кантары
• az me iz in kas/brojgez afn xazn, špringt men nit kejn kideš (šrajt/entfert/zogt men nit kejn "omejn") *glxv.* хто злуе на кантара, не падскоквае ў час малітвы (не выкрыквае "амін")
• lojtn ponem – darf er zajn a xazn, lojt der štime – darf er zajn a grojser xoxem *glxv.* паводле твару – быць яму кантарам, паводле голасу – вялікім разумнікам (на ліцо – яйцо, а ўсярэдзіне – баўтун)
• nox ■ šlextn xazn iz gut cu davenen *glxv.* пасьля кепскага кантара добра сьпяваць малітвы (другому кантару)
• vi azoj der xazn zingt, krigt er alc "in tatn arajn" (zingt a xazn gut, zogt men gevejntlex: "a ruex in zajn tatn arajn, oj, hot er šojn gezungen!", zingt er šlext, kumt dox avade: "a ruex ■ tatn arajn" *glxv.* як кантар ні сьпявай, усё адно праклён атрымае (калі кантар сьпявае добра, звычайна кажуць: "бадай яго чорт пабраў, ой, ужо скончыў пяяць!", калі ж ён сьпявае блага, пэўна скажуць: "бадай яго чорт пабраў (з такімі сьпевамі)!"

xazoke *f.* -s (af) [*s.* (חזקה(-ות →bexazoke, mexazek, maxzek, hizxazkes, xizek] прэтэнзія, патрабаваньне, права на валоданьне/званьне, прывілей, прыярытэт (на права арэнды); прынятае меркаваньне [*sin.* privilegje, prioritet; ongenumene mejnung]
• hobn* xazoke мець прывілеі
• krign* xazoke атрымаць прывілеі
• di xazoke af der arende gejt iber in zajn mišpoxe fun tates cu kinder (M.M.-S.) права на арэнду пераходзіць у яго сям'і ад бацькоў да дзяцей
• af cdoke iz ojx do xazoke і на дабрачыннасьць таксама ёсьць прывілей

xazore *f.* -s [*s.* (חזרה(-ות →maxzir, xazern, xojzer, bexazore] вяртаньне (тавару гандляру); вярнуты тавар [*sin.* curikšikung]; **xazores-hašác** *f* [*s.* חזרת־הש"ץ] паўтарэньне кантарам альбо тым, хто моліцца, блаславеньняў "Šimenesre"
• gebn* xazore *fig.* адказваць

xcejres=xacejres *pl.* →xocer *m* [*s.* (חצר(-ות] двор, дзядзінец

xcice=xacice *f.* -s [*s.* (חציצה(-ות] "прамежнае" (любая рэч, якая знаходзіцца паміж жаночым целам і вадой для рытуальнага абмываньня і якая такім чыным робіць абмываньне нядзейсным)

xcifes=xacifes *n* [*s.* חציפות →xocef, xcufe] нахабнасьць, нахабства, бессаромнасьць, дзёрзкасьць, нагласьць [*sin.* umfaršemtkajt, ojsgelasnkajt]

xcos *m.* -n [*s.* (חצות(-ן →xoce] 1. поўнач; апоўначы; 2. малітва і плач, якія чытаюць апоўначы (традыцыя падымацца апоўначы дзеля навучаньня і малітвы ў памяць аб разбурэньні Ерусаліму)
• oprixtn/praven xcos падымацца апоўначы дзеля навучаньня і малітвы

xcufim=xacufim *pl.* →xocef *m* [*s.* (חצוף(-ים] сараматнік, нахабнік, басалай, нахабны, нахальны, бессаромны, дзёрзкі чалавек; распусьнік; **x(a)cufe** *f.* -s [*s.* (חצופה(-ות] сараматніца

xedve *f* [*s.* חדווה] радасьць, шчасьце; добры, сьвяточны настрой [*sin.* frejd, gehojbene štimung]; **xédvediker** шчасьлівы

xefc(i)es *pl.* [*s.* חפצ(י)ות] прыхамаць, норавы, капрызы, выбрыкі [*sin.* kaprizn, farvelenišn]
• a menč mit xefcies чалавек з норавам

xejder *m/n*, *pl.* xadorim [*s.* חדר(-ים →xadre-, bexedre-xadorim] 1. пакой; 2. хедар (гэбрэйская першапачатковая рэлігійная школа); 3. *fig.* мастацкая альбо рэлігійная школа палітычнага або духоўнага напрамку [*sin.* cimer; religjeze šul; klajzl, politiše rixtung, gajstike šite, kinstleriše oder literariše šul]; **xéjder-jingl** *m/n*, -ex вучань; **xejder-mejúxed** *m* [*s.* מיוחד־] асобны пакой; **xejder šéjni** [*s.* שני־] пабочны пакой у сынагозе; **xejder-lifním-mixéjder** [*s.* לפנים־מחדר] ва ўнутраным пакоі, далёка і адасоблена ад усіх; **xejder-mesúkn** *m*, *pl.* xadorim-mesukónim [*s.* (מתוקן(-ים־] рэфармаваны хедар, мадэрнізаваная рэлігійная дзіцячая школа
• er iz mit im fun ejn xejder! яны зь ім з аднаго хедара!
• ojszogn fun xejder прабалбатацца, прагаварыцца
• itlexs xejder hot zix zajn nar *šprxv.* кожны хедар мае свайго дурня (німа балота бяз чорта, а вёскі бяз злодзея; у кожным родзе ёсьць курва і злодзей)
• me hot im genumen in xejder arajn *glxv.* яго забралі ў хедар (моцна пакаралі)
• me tor ništ ojszogn/arojszogn/dercejlen funem xejder (sojdes fun xejder tor men nit ojszogn) *glxv.* ня варта брахаць на хедар (свайго сьмецьця на чужы сьметнік не вынось; з хаты сьмецьця не вынось на чужы падворак)

Xejfe *f* [*s.* חיפה] г. Хайфа

xejfec *m*, *pl.* xfejcim/xfocim, *dim.* **xéjfecl** *n*, *pl.* xféjcimlex [*s.* (חפץ(-ים] рэч, прадмет [*sin.* (štub)zax; vertfuler objekt]
• a tajer xejfecl каштоўная рэч, штучка
• a vertfuler xejfec вялікая каштоўнасьць

xejlek *m/n*, *pl.* xalokim [*s.* (חלק(-ים →xaluke, xilek, somejex-bexelke, mexalek, mexulek, maxlojkes] частка, порцыя, доля, удзел, уклад, пай; лёс, кон, шчасьце [*sin.* (on)tejl, cuštajer, bajtrog; gojrl, mazl]; **xejlek-leojlem-hábe** *m* [*s.* לעולם־הבא] доля гэбрэяў на тым сьвеце, расплата пасьля сьмерці
• drit/fert... xejlek трэцяя/чацьвертая... частка
• gebn* emecn a xejlek (пра)клясьці, вылаяць, насварыцца, даць камусьці дыхту/часу
• hobn* a xejlek (in) мець/атрымліваць сваю частку
• du host šojn dajn xejlek pulver opgešmekt ты ўжо сваю порцыю пораху панюхаў (ужо адваяваў)
• er hot bakumen zajn* xejlek (bakumen* a xejlek; šlogn* zix in a xejlek) ён атрымаў сваё (па заслугах)
• šmek af dajn xejlek un gej avek *glxv.* панюхай сваю частку і ідзі прэч

xejlev *m/n* [*s.* חלב] ялавічны, казіны альбо авечы тлушч, тук (згодна з запаветамі яго нельга спажываць, таму ён выкарыстоўваецца для сьвечак); **xéjlevdiker, xéjlevner** зроблены з туку, тучны, тлушчавы, сальны; **xéjlevdrize** *f*, -s *anat.* тлушчавая залоза
• a xejlevn lixt сальная сьвяча
• az an orem-boxer vert an apikojres, est er (uf) a xejlevne lixt (a xejlev/lixt mit čvekes; bejgl mit xejlev) *šprxv.* калі ешыботнік становіцца бязбожнікам, ён і сальную сьвечку (тук/сьвечку зь цьвікамі; абаранак з тукам) зьесьць

• az di cig iz afile lojter xejlev, iz zi fort nor a cig *šprxv.* каза ёсьць каза, нават калі на ёй адзін тлушч (ня быць казе на вазе)
• gebenčt iz der grošn, vos iz gešmirt mit xejlev *glxv.* блаславёны той грош, які памазаны салам (грошы за тавар, якім жыдам нельга гандляваць)
• Maj ko mašme lon dos lixtl? /Vos že lozt es mir cu hern? /S'kapet un es trift ir xejlev, /un s'vet bald fun ir nit vern. /Azoj cank ix do in klajzl, /vi a lixtl, švax un tinkl (tunkl), /biz ix vel azoj mir ojsgejn /in der štil, in mizrex-vinkl... (A. R.) Які сэнс мае сьвечка? Што ж я магу ад яе пачуць? Капае й капае яе сала, і хутка яе ня стане. Так сама і я тлею за вучобай, як сьвечка, слабая і цьмяная, пакуль не змарнею ў цішы, ва ўсходнім куточку сынагогі...

xejn *m*, -en [*s.* (עֵין-)חֵן →misxanen, orxejn, baxejnter] прыгажосьць, грацыя, зграбнасьць, чароўнасьць; сымпатыя, прываба, шарм; міласьць, літасьць, ласка(васьць), ветлівасьць, прыязнасьць, прыязьлівасьць [*sin.* šejnkajt; simpatje, rejc; genod, lajtzelikajt]; **xejndl** *n*, -ex камічны выраз твару або жэст, какецтва, крыўляньне; **xéjn(dl)en zix** (cu) падлашчвацца, падлізвацца, фліртаваць, манерыцца, крыўляцца; намагацца, каб спадабацца камусьці; выстранчацца; фанабэрыцца, задавацца, выхваляцца, фарсіць; **xéjnevdiker** сымпатычны, мілавідны, прыгожы, прывабны [*sin.* šejner, cuciendiker]; **xéjndler** *m*, -s, (-ke *f*, -s) какэтка; **xéjn-gribele** *n*, -x ямачка на шчакох або на падбародку; **xéjn-flesterl** *n*, -ex мушка (на твары); **xéjn-pintl** *n*, -ex, **xéjn-brodevke** *f*, -s радзімка
• gefinen* xejn ba emecn шукаць у кагосьці прыхільнасьці, спагадлівасьці
• hobn* dem zibetn xejn быць вельмі прывабным, сымпатычным
• maxn xejn (emecn) заляцацца, фліртаваць
• maxn xejndlex (cu) манэжыцца, фігураваццa, строіць вочкі
• a xejn vi frišer xrejn *glxv.* мілы як сьвежы хрэн
• az me tut a štekn on šejn, hot er ojx xejn *šprxv.* апрані добра палку, і яна будзе прыгожа выглядаць (прыбяры пянька – стане за панка)
• ejn mol iz šejn, cvej mol hot nox xejn, draj mol hakt men ojs di cejn (draj mol brext men šojn haldz un bejn; dem dritn mol git men in di cejn) *glxv.* адзін раз прыгожа, два разы яшчэ прывабна, а ад трэцяга аскома на зубох
• jidišer xejn iz umetum šejn *glxv.* жыдоўская прывабнасьць усюды прыгожая (пародыя на гэту прымаўку: "jidišer xrejn iz umetum biter" жыдоўскі хрэн паўсюдна горкі)
• mazl un xejn kojft men nit in kreml *glxv.* шчасьце і прыгажосьць у крамцы ня купіш (на таргу долі ня купіш)
• Ver s'iz nit geven, /ver s'hot nit gezen – /tajere Malkele! /Vejst nit, vos s'iz šejn, /vejst nit, vos s'iz xejn, /tajere Malkele – /efnt zi di bremen. /Meg di zun zix šemen, /tajere Malkele! /Flamen ire ojgn: /štejt a velt gebojgn, /tajere Malkele. (N. Š.) Хто ня бачыў, хто ня ведае Малкелэ – дарагая Малкелэ! Хто ня ведае, якая яна прыгожая, хто ня ведае, якая яна прывабная, дарагая Малкелэ - як яна павядзе брывамі. Славай засьціць сонца, дарагая Малкелэ! Полымя яе вачэй: увесь сьвет схіляецца, дарагая Малкелэ.
• xejn gejt iber šejn *šprxv.* прывабліваць лепш за прыгажосьць

xejn *abr.* **xoxme-nistéres** *f* [*s.* חכמה־נסתרות=ח"ן] патаемныя веды, эзатэрызм
xejref-néfeš *m* [*s.* רוח־נפש(ה')] усталяваньне/уладкаваньне жыцьця [*sin.* dos ajnšteln s'lebn]
xejrem *m*, *pl.* -s/x(a)romim/x(a)romes [*s.* חרם(-ות/-ם/-ים) →maxrem, muxrem, ad-xorme, bexejrem] *rel.* анатэма, праклён, выгнаньне, выключэньне, адлучэньне (ад юдаізму) [*sin.* anatem, ojsšlisung]; **xejrem-derabénu-géršom** *m*, **xadrág** *abr.* [*s.* חרם־דרבנו־גרשם=חדר"ג] праклён, які рабін Гершн-Мэйер-Гагойла (960–1028) усклаў на тых, хто чытае чужыя лісты без дазволу, хто бярэцца больш як з аднае жонкай альбо разводзіцца бяз жончынай згоды; **xéjrem-kvitl** *n*, -ex дакумэнт, па якім прымаюцца на сябе абавязкі аб выплаце штрафу ў якасьці кампэнсацыі за рытуальны праклён
• (arajn)lejgn in xejrem адлучыць, выключыць з кагалу
• (aruf)lejgn a xejrem af emecn праклясьці кагосьці
фанцыбэр 'чыстае срэбра, выжыга (выжыгалася з парчы і галуноў)' [*jid.* fajnzilber]: старая спадніца і вая хіба на фанцыбэр згадзіцца

фарфалі [*jid.* farfl]; мама к сьвяту фарфалі гатовіць

фе(й)фер [*jid.* fefer]: я даў яму фе(й)феру за гэта

ферцык [*jid.* forc]: відалі мы многа ферцыкаў такіх

фура: жыдоўская фура

фуцерка 'лёгкая футраная паддзёўка, якую звычайна насілі жыды' [*jid.* futer]

фэрд (Язэп Драздовіч), **афэрдала** (Глыбоччына) [*jid.* ferd]: фэрдала, нафэрдала *ftksl.*

хала [*jid.* xale]: жыды ўжо халы напяклі; ой, які жыд зухвалы, /ня хоча есьць у шабас халы; /еў з хлебам цыбулю, /любіў вельмі сваю матулю

халадайка: Ён быў у чорнай аксамітнай ярмолцы, у шабасовай халадайцы з шапкай у руцэ. (Зьмітрок Бядуля)

халдэй 'жыд', **халдэйскі/халдыйскі**: цэлы век свой халдэем ходзіць; халдэй халдэем абарваўся; чаго ты халдэем выйшла на вуліцу?; халдэі гэтыя кожнага ашукаюць; ня вер халдэю; стыдна дзеўцы халдэйкаю хадзіць; вот халда, дак халда! "Панскі жыдэк" сьпяваў нейкую песьню на халдыйскай мове. (Зьмітрок Бядуля)

халдэхас 'апранаха'

халэмус 'канец, капут' [*jid.* xalojmes]: тут табе і содухі, і халэмус будуць

хам [*jid.* Xam (сын Ноя)]

хамец [*jid.* xomec]: Хамец, хамец, ідзі вон! – Хамец, хамец, хадзі ў хату! То не я казуў: – Ідзі вон, – а сабака брехуў: хамец, хамец, ідзі пад пец, маца, маца, хадзі сюда (хадзі ў хата)

хаўрус, хаўрусьнік, хаўрусаваць [*jid.* xavruse]: у цябе зь ім хаўрус

хаіць, з-, аб-, ад|хаіць [*jid.* xaj]: адхаілі душу; адхаілі мы свае жываты за вольнасьцю; не адхаівайся, яшчэ ня ўсё прапала

хедар [*jid.* xejder]

хлюндра, плюндра, флюндра 'няхлюйка' [*jid.* flonder, *d.* Flunder]: падбрындалася як флюндра

хеўра, росхеўрыс 'разыходжаньне' [*jid.* xevre]: даскуліла дужа прываротнаяя хеўра

ціпка 'зацірка' [*jid.* cipkelex]

цугундэр [*jid.* cuhunder]: жыл – цугундэр, ему нечага верыць; узялі, павялі на цугундэр

цукернік 'печыва, якое пяклі й прадавалі жыды' [*jid.* cukernik]: цукернік лепей чымся пернік

цымбалы: жыдоўскае вясельле без цымбалаў не бываець

цымус, цымас [*jid.* cimes]: ты спадзяваўся на цымус жыдоўскі, да не гатовілі яго для цябе; а ей! там то ўжо цымас; А ў бабкі старой самы цымус, самы лой (У. Някляеў)

цыцалы 'фрэнзьлі' [*jid.* cices]

цэханка [*jid.* cejxn]: жыдоўчынкі ў цэханкі іграюць

чопавое *hist.* 'падатак ад чопа за піваварэньне і вінакурства': чопавага ня ўсё аддаў рэндар; а ты з нас браў, /а ты з нас драў: /маставое, брукавое, /а пагалоўшчына, а батраччына; браў ты з нас і драў ты з нас і крупавыя, і млынавыя, і мякіну, і сьмяціну; браў ён з нас /і драў ён з нас: /калавоім, шмулавоім, /айчызну, паншчызну, /рэкруцізну драў (батлейка)

ша [*jid.* ša]: ша, дзеці, не крычэце, не свавольце

шабас/шабус, (па)за-, ад-, пера-, (пра)шабасаваць, шабасоўка 'гарэлка; полька (танец)', **шабасны, шабасовы** [*jid.* šabes]: жыд круціць і шабасу не глядзіць; перасьвяткаваўшы шабас, паедзіць; жыды тут астанавіліся шабасаваць, зашабасавалі; жыды яшчэ не адшабасавалі; [illegible] скора перашабасуюць, тагды паедзім; шабасоўкі [illegible] даў чарку; ой, ты шабас не дзіві, высэй ногі падымі [illegible] не я скачу, бяда скача, [illegible] ты, шабас, не дзівуй, відзіш [illegible] і клопат муй; сталапеў і шабас!; шабас зайшоў; хто [illegible] несе гукае? – шабас жонку шукае; за граші/пянендзы шабас!; жыды ўжо пазашабасавалі; тры суботы з жыдам прашабасавалі на дарозе; шабасныя сьвечы

шабаш, (за)шабашыць [*jid.* šabaš]: шабаш табе даваць на веру, бо круціш; закурым, зашабачым, на тым сьвеце чорта ўбачым

шафаваць [*jid.* šafn]: шафаваць чужым дабром

шах(ір)-мах(ір), шахер-махер, шахармахарства 'ашуканства' [*jid.* šaxer-maxer]: пусьціўся на шахір-махір; шахмах і нічога не асталась; туды шах, сюды мах

шахірыньне, с-, пра-, (рас)шахірыць [*jid.* šaxern]: чаго ты тут шахірыш; увесь кубел перашахірыла, нідзе не нашла стужкі; шахірыш грошы, покуль усі расшахірыш; дасьць табе бацька за шахірыньне грошай на шалы-балы; якое было багацьце, усё прашахірэна; усё расшахіраваў, што ад бацькі засталося; можа, ён тут сшахірыў што – было абгледзіць яго; прашахірыў зборшчык падатковыя грошы

шахраваць 'ашукваць', **шахер, шахраваньне, шахрай** (слова стала нават беларускім прозьвішчам) [*jid.* šaxern, šaxraj]: не шахруй коло мяне; ён у картах шахруіць

швах [*jid.* švax]: справы швах!

школа 'сынагога', **школішча** [*jid.* šul]: жыды ў школе крычаць; аж угледзеў сем жыдоўскіх школаў (атрымаў моцны ўдар); даў на тры школы (Зарок, афяра на сынагогу з прычыны хваробы блізкага чалавека. Такі звычай ("даць на яўрэйскую школу") быў вядомы ў дарэвалюцыйнай беларускай вёсцы. Меркавалася, што калі ня свой, дык, можа, чужы бог дапаможа. Выслоўі. Мінск, 1979.); адважны жыд то й у школе бзьдзіць; трэба хоць акрасьці жыдоўску школу; убіўся ў жыдоўску школу; галасуюць як у жыдоўскай школе; крычаць, паднялі гоман як жыды ў школе; Школьная вуліца; жывець подле жыдоўскага школішча; школьны жыд (вартаўнік); школьная гарожа

шлімазул 'недарэка' (С. Грахоўскі), **сьлімазарнік, (за)сьлімазурыцца, сьлімазурны** [*jid.* šlimazl]: сьлімазарненькій якій твой хлопчык; куды ты лезіш, сьлімазарнік?; гдзе табе, сьлімазарніку, гэта зьдзелаць; сьлімазарнае дзіця; ня шыеш, а толькі сьлімазурыш палатно; досыць табе сьлімазурыць кніжку/шыцьцё; засьлімазурыла палатно; дзіця сьлімазурыцца возграмі; досыць табе сьлімазурыцца кала гэтай работы; абатры гэтага сьлімазурніка; сьлімазурнік гэты ня зьдзелаець харашо; сьлімазурніцу гэту яшчэ не пара выдаваць замуж; проч, сьлімазурніца, ты толькі порціш работу; сьлімазурны хлопчык; сьлімазурная работа; сьлімазурнымі рукамі бярэшся за бялізну

шлэер [*jid.* šlejer]: ня хочаш у нас жыць, будзеш шлэеры жыдоўкіны мыць; абвязалась шлэерам як жыдоўская нявеста, штоб не загарэць; жыдоўкі шкляною галкаю выкачываюць свае шлэеры

шлэпар [*jid.* šleper]: шлэпар ты!

шлэх [*jid.* šlext]: сам лепшэнькае выбраў, а мне ўсё шлэх аставіў; шлэху гэтаму ніколі не ўступлю; калі б хто добры гаварыў, а то шлэх; ты проціў мяне шлэх

шлюндра [*jid.* šlumper]: жыды ўсе шлюндрамі ходзюць

шляк 'сардэчны ўдар' [*jid.* šlak]: нехай іх шляк трафіць!

шм- [*jid.* šm-]: шмаравоз, шмаравідла, шмэндрык

шмалец 'топлены гусіны тлушч' [*jid.* šmalc]: каша са шмальцам

шнапс [*jid.* šnaps]: хваціў шнапсу

шолам 'шубутны' [*jid.* šolem?]: гэта шолам, а не чалавек

шоўмэр [*jid.* šojmer]: я не люблю шоўмэраў

штафірівацца [*jid.* štafir]: штафіравацца перад жаніхамі /люстрам; досыць табе штафіравацца

шустэр [*jid.* šuster]: шустэр гэтый скора расшустаець бацькіна дабро

шын(о)к, шынкаваць, шынкарка [*jid.* šenk]: пайшлі ў шынк гарэлку піць; дзяржаць шынк

шэйгец 'малы хлопец' [*jid.* šejgec]

шэлупейка 'ермулка': жыды ўсе ў шэлупейках ходзюць

юда, юдашка, юдоўка, юдаства, юдзіць, юдашыць [*jid.* jid]: юдоўка чортава абманула мяне; а вон ходзіць юдзіць, юдзіць Васіля, думае, мо шо той біцца будзе

II

КАРОТКІ СЛОЎНІЧАК ІМЁНАЎ

(якія таксама сталі часткай абедзьвюх моваў)

Ejner redt rusiš/pojliš vi a jid, der anderer redt jidiš vi a goj.
(Адзін размаўляе па-руску/-польску як жыд, другі па-жыдоўску як гой.)

Абра(га)м: трапіць да Абрама на піва; пара да Абрагама на піва; да Абрагама на піва паехаць/пайсьці; авечкі пасьвіць да Абрагама пайсьці; у школу не хадзіў, богу не маліўся, гдзе Янкель і Абрам, няхай і ты будзеш там (батлейка); згінуў Абрам: нейдзе хапун яго схапіў; ідзі к таму Абраму, што жывець на рагу

Адам: Адам-кні! (*vrtš.* Адам – адамкні)

Андрэй: Андрэй, лэйг ан эй, гайнт эйнэ, моргэн цвэй; Андрэй, лэйг ан эй, ніт эйнэ, нор цвэй, ніт цвэй, нор драй, ах, скарэй, давай, давай

Афоня-злодзей (Апанас) [*jid.* Fonje ganev/kvas *hum./pejor.* 'кацап, маскаль; прадстаўнік улады (у царскай Расеі)']: **az Fonje hejbt on cu gejn, hejbt on a kalter vint cu vejen** (як Фоня ў дарогу, дык сівер дзьме); **ojslejzn fun Fonjes hent** (вызваліцца з Афоніных рук)

Бася: У балоце пад кустом /Цяцера нясецца. /Хаім Басю (жыд жыдоўку) любець. /Аж ярмолка трасецца.

Борах, Борух: Борух сьпіць, а шчасьце само пад вароты яму лезець; цягаецца як Борах па дварох; ходзіць "бу-бу-бу" як борахава кіла; чысты борах, распусьціў валасы; борах борахам абадраўся; мужык з кіем вялікім, а яўрэй крычыць голасам дзікім, Іцка, Борух сьпявае... (батлейка)

Бэ(й)ля 'неахайная жанчына' [*jid.* Bejle]: настаяшчая бэйля, ні пра што ні дбая; набраўся як бэ(й)ля

Бэрка [*jid.* Ber]: лёгкі Бэрачка; чэсны як Бэркавы штаны на леву сторану; па сяле езьдзе Бэрка крамнік

Вінцук: **vincik iz a šejgec!** Вінцук – басалай (*vrtš.* "vincik" мала – "Vincik" Вінцук)

Вэлвэл: Мэйшэ Вэлвэлу пытае: – Чаму каза кароткага хваста мае? І, як яна ў полі йдзець, уніз яго, апушчаным, нясець? А назад йдучы, ужо задзіраець? Вэлвэл ведае і адпавядае: – Назад йдучы хваста задзіраець, бо ваўка пад хвастом ужо маець, назад йдучы, ваўка не баіцца, гатова нават зь сястрой пабіцца, і на лазьзё лезець, грызець, бо за ваўком ня трэба глядзець...

Гаман/Геман: усі крычаць на яго як на гамана; напалі як на гамана якога; пападзісь толькі ў рукі гаману гэтаму; папіхаюцца мною як гаманам; б'юць як жыды Гамана; біці як Гамана; таўчуць яго бы Гамана; чорны як Гаман; злы як Геман які

Гандзя: [*jid.* handzje] *fig.* лялька: **gešlejerte handzje** фарсуха

Гінда: Гінда ты сьляпая

Гірша: Гірша з Моўшам добра жыў, Гірша кроіў, Моўша шыў, Гірша з Моўшам дровы сек. Гірша Моўшу хуй адсек; ня будзя Гіршы, дык будзя чорт іншы

Ёсель: татухі-мамухі, Ёселі-Моселі, гуц-гуц! (батлейка); лёгенькі Пятрочак, лёгенькі Ёсечка; **Joške/Josele pandre /pandrik** *pejor.* расьпяты Хрыстос; **Jojzl** *pejor.* Ісус (Хрыстос); расьпяцьце, абраз

Зуська: дванаццаць з поўначы прабіла, прывёз на базар Зуська мыла і пачаў таргаваць

Іван [*jid.* Ivan] няжыд; селянін; *pejor.* кацап, кацапюга, невук, цюхцей; неадукаваны жыд

Ірад: жыдоўка-ірадка абманіла мяне; жыды-ірады, нехрысьць

Іткa: каму Іткa брыдка, мне хораша

Іцак, Іцка: – Іцак, Іцак! /Дзёгаць выцек – /Кап, кап, /цурр - руру! (Р. Барадулін. Нагбом); у нас Іцка аплятае гаршкі

Кацярына: **a najes, Katerinke iz mes** навіна, Кацярынка памерла (старая гэта ўжо показка)

Куба: **Maček hot kejn vogn, Kuba hot kejn ferd** Мачык ня мае калёсаў, Куба ня мае каня

Лэйба 'гультай': адкажы мне, Лэйба мой любы, колькі месяцаў таму назад нарадзілася тое дзіця (батлейка)

Лэйзар: аблілася, ахлапалася як Лэйзарава карова; з Лэйзарам прывітаўся/бачыўся (пабыў у карчме, напіўся)

Малка: каб ты сабе Малку за жонку браў, ніколі б бяды і гора ня знаў

Мацей: **Motje meg, Fotje tor nit** Моцю льга, Фоцю нельга

Мэер: зарабіў як Мэер на Кузьме

Мікіта: **az ox un vej iz cu dem dorf, vu Mikite iz der vojt** гора тае вёсцы, дзе Мікіта войтам; **a klog cu di jorn, az Mikite iz a staroste** бяда, калі Мікіта – староста

Мірка: на дочкі сарочкі, а сыночку шапочку, Гэлька як бэлька, Мірка як гірка і Іткa ня брыдка

Мойша, Моўша: ой, Моўша, Мойшка, ты праз сваю адвагу згінеш; Сьцяпан! не дасмаж каўбасы, бо прыйдзе Моўшка ласы; Мэйшэ вузэ, ды гробэ пуза, галава, як цабер, не павернеш ніт агін ніт агэр

Мэйсушэлах: зжыўся як Мэйсушэлах, састарэўся як Элімэйлах

Мэндаль, мендаль 'хітры ашуканец; дурны, някемлівы, нездагадлівы': ай, гвалт! жыды Мэндаля б'юць! (незвычайная і сьмешная навіна); у куточку на пруточку вісяць Мэндалевы яйцы *rtnš.* (клубок нітак)

Рохля: рохля рохляю ходзіць – ня ўмыецца, не прычэшацца; матчына рохля!

Саламон: хітры/разумны як саламонавыя порткі

Сора/Сур(к)а: хваліла цябе Сора сягоньня і ўчора, казала, як не забудзе, то й заўтра будзе (і мы, калі не забудзем, то хваліць будзем); хваліла цябе і Сора ўчора зь вячора і Абрам каля крам; (ня)хай будзе гэтак, як Сора/Роха казала: Сора дае, Іван бярэ (дурань дае, разумны бярэ); наша Сора то шые, то пора, а ўсё ніткам гора; як Сора казала, так Мэндаль запішаць

Сруль *pejor.* [*jid.* Srol, Srul, Jisroel (мужчынскае імя)?]

Хаім: казаў Хаім: памахаім; казаў Хаім: пакалыхаем, і матка ў ахвотка, каб Аўрагам не рабіў тарарам, тут і там!; Хаім, уцякаім; Хаім, што мы з табой маем?; жыдоўскае вясельле: трэці дзень гуляе ўсё мястэчка, і Хаімку пасылаюць па другую пляшку

Хацкель/Хацкаль: я табе не Хацкель; Хацкаль ты!; іх бін цыр кайн фэйгэлэ, кайн пташэчка, нор Хацкеля брат!

Хая: Жыдовачка Хая: і сцае, і срае, і пацеры чытае (сцае, срае і грэскі зьбірае)

Хвёдар: ходзіць жыдок ходарам перад панам Хвёдарам

Церах [*jid.* Terax]: **ho-ho! prišol Terax na derex!** го-го! дайшоў Церах да розуму!

Шлёма: шанцуе, як Шлёме на арэндзе; як бог да Шлёмкі, гэтак і Шлёмка да бога; сядзі, Шлёма, удома; выйграў як Шлёма на арэндзе

Шмуйла: разлажыўся як Шмуйла з абразамі; ходзіць абквэцаны як Шмуйла

Шурка [*jid.* Šurke] 'гультай, абібок, лайдак, брында, лабатрос, латруга': **a gut-morgn dir, pan Jurke, /a gut-morgn dir, pan Šurke, /a gut-morgn dir, Ivan, /dajn flinke kljače /lojft vi a ban,/ fun Svincjan /kejn Koltenjan, /borex hašem, borex undzer prace** *fksl.*

Шымко: Шымко лупаты, вядзі кабылу дахаты

Юда: Архіпка на скрыпка, Юда на дуда сыгралі цуда, цуда, адда, да, дада...; а ў Юды чорны муды; а ты, Юдко, скачы хутко (батлейка)

Юрка [*jid.* Jurke] Юрка, бабыль, "дзярэўня": **hern emecns vi dem Jurke** не зьвяртаць увагі на кагосьці; **švajgn vi Jurkes hunt** маўчаць як Юркаў сабака (у Юркі й сабакі німа); **ojszen/citern vi jurkes hunt** выглядаць/дрыжаць як юркаў сабака

Элімэйлах: зжыўся як Мэйсушэлах, састарэўся як Элімэйлах

Ягайла: **a najes, krol Jagjele iz mes** навіна, кароль Ягайла памёр (казаная казка; сьпяваная песьня)

Янкель: убіўся як Янкель у касьцёл; – Гвалт, гвалт! гвалт!!! – Што за гвалт, га? – Жыды Янкеля б'юць... – А Янкель што, ня жыд? – А б'юць ткі... ах... ах...; ня йдзі да Янкеля ў краму – ён абакульнік

ליאכאוויקע (מינסק)

III

Выдатны ўзор жывой беларускай гаворкі зь "ідышызмамі" прыводзіць Сакрат Яновіч зь Беласточчыны:

"Як цяпер разумею, крынкаўцы густа перакідваліся ў гутарцы жыдоўскімі словамі зь ідыш. Юрлівага кавалера, шчыпайлу дзяўчат празывалі "маладым шванцам". Сварлівы тып – гэта "фэкі чалавек". Ненадзейны тавар – "шайс". Камбінатар – "шанцоўнік". Асобы зь лёгкім языком – "мэхляр" або "фукс" (шукаць фукса). Байкі гарадзіць наіўным – гэта "дурыць майсамі". Вось прыкладныя фразы: – Чаго гэты фукс ад цябе хоча, га? Які гэта шайс ён табе прынёс? Ой, фэкі чалавек! Майсамі дурыць галаву. Хай пільнуе лепей свайго маладога шванца, якому салодкая Фэля зробіць гевалт, гешэфт поткаю... І будзе кіндрык на пацеху (кіндар кучаравы)."

Жыды, нават ведаючы славянскія мовы, прынамсі, ставіліся да іх іранічна-абразьліва: "joldiš", "jevoniš", "foniš","belošn jevones/fonje", "po gojiške". Ня дужа шанавалі яны й гойскі ідыш: "gebroxn/geharget jidiš", "kalvarier dajč". Але гэта не замінала беларусам гергетаць на ідышы і нават сьпяваць. Яны, як ня дзіўна, і дагэтуль яшчэ сьпяваюць. Вось дзьве песьні, якія 11 верасьня 1983 г. запісаў Генадзь Лойка ад Станіславы Іванаўны Рымко ў вёсцы Малявічы (або ў Калоніі ці Старадубраўцы, што паміж Шчучынам і Мастамі, на дарозе з Ружанкі ў Каменку):

***

Lebn majn fencter in majn gortn
Vaksn blumen ale sortn.
Kinder blumen nit gerisn,
Vajl me darf zej nor bagisn.
Ot a žulik ongekumen,
Ale blumen cugenumen.

***

Zict a mejdl, lejent a blat –
Zogt men on, vos Brajnke zix gešmadt.
Avrom, majn man, špan dem ferd in vogn,
Lomir bejde kajn "sili/selo" (?) unterforn.
Vi zej zajnen kajn "selo" gekumen,
Ot azoj Brajnken af di knies gefunen.
Brajnkele, du majn, kum cu mir cugejn,
Ix vel dir gebn, vos du vilst nor alejn.
Ix darf nit hobn dajne xalasn mit dajn nedan,
Makarevič der šejgec iz dox majn man.

Словы, якія прыводзяцца ў гэтым слоўнічку, маюць рознае паходжаньне, але лучыць іх сумеснае жыцьцё беларуса і жыда. Безумоўна, гэта далёка ня поўны збор, хутчэй гэта толькі ўзор. Таксама вялікая частка лексыкі зьяўляецца агульнай для абодвух народаў:
у беларускай – цэгла, дах, дрот, друк, дрыліх, цыбуля, цьвік, каўнер, клюбы, клямары, крама, крамар, кушнер, рына, рэй, рэшта (урэшце, нарэшце), зэдаль, мур, рыдлёўка, латруга (лотр), шынок, ніт, фарба, цалёўка, цукар, наладовываць, танцаваць, радзіць, рыхтаваць, шпацыраваць...
у ідышы: tate, mame, babe, laske, lapcje, bulbe, večere, veverke, sažlke, samohon, suxote, torbe, kiške, kolt(u)n, polke, bajke, derkač, žabe, živice, žalejen, havken, pojzen, polen, pojen, topčen, xapn...

Ніхто зараз дакладна ня скажа, зь якой мовы гэтыя словы прыйшлі ў беларускую (зь нямецкай альбо зь ідышу) альбо ў ідыш (зь беларускай, украінскай, польскай, лускай, чэскай...), але пра некаторыя запазычаныя беларускія словы ў ідышы ўсё ж ільга гаварыць з упэўненасьцю, да таго ж у ідышнай лінгвістыцы існуе нават тэрмін "*v*ajsrusiše redenišn" (беларуская гаворка):

abedrik набедрыкі, набэдрыкі (конская зброя)
apinujen zix апынуцца
hametne(r) гаматны, нехлямяжы, нязграбны
juške юшка (у печы)
kalejen калець, мерзнуць; **farkalejeter** скалелы
kamornik каморнік
kečken [*v.* кешкацца] лашчыць, мілаваць, галубіць
kutnice [*v.* кутніца] кіньдзюк, сычуг
kljok клёк, касьцявы мозг
kraž краж, плаха
krop *bot.* кроп
kublik кублык (від жаночай прычоскі)
madzgen, **madžgen** мадзгаць, вэдзгаць
matl(j)e мятлух, мятлушка
muraške, **mureške** мурашка; **murašnik**, **murešnik** мурашнік
nametke наметка, намітка
njamken [*v.* нямкаць] цокаць языком, цмокаць
ojsmagljeven вымаглеваць, выпрасаваць (бялізну)
onzoljen назаляць; **ongezoljeter** назойлівы, надакучлівы
pročkes упрочкі
stromke стрэмка
sumne(r) сумны; **sum** сум
šarien (af tog) шарэць, сьвітаць, днець
zejde [*v.* дзеду!] дзед
žvave(r) жвавы
-uk – зьняважлівы паляшуцкі суфікс **-ук** (шаўчук, краўчук, бандарчук, кавальчук...):
šusteruk шаўчук; **kamcenjuk** скнара, скупянда

Безумоўна, гэтых словаў у ідышы значна болей. Яшчэ, для ўзору, колькі прыкладаў літвацка-ліцьвінскіх ды жыдоўска-славянскіх "локшынаў":

hakn a morde, az di cejner zoln treščen даць у морду, каб зубы затрашчалі
a volveler privarik! танны прыварак/навар!
a vixtike šmate! *iron.* важная ануча! наўда вялікая!
visn počom funt lixo ведаць па чым фунт ліха
zupe di krupe, krige di kraft суп з крупамі, гаршчок моцны
abi ix bin gezunt (abi ja zdruv) абы я быў здаровы
vestu zajn in kas, vestu trinken kvas! *iron.* будзеш злаваць – будзеш піць квас!
lebn sventim duxom жыць сьвятым духам
sam sapožnik/pan сам сабе сапожнік/пан
straše di vancn! палохай клапоў!
zajn a gance pani-matke быць паважнай асобай
faln in di ahlobljes *fig.* падаць у аглоблях (аб стомы)
cacki na jolki! цацкі на яліне! (шышкі/грушы на вярбе)
mozoljen umzist dem cung дарэмна мазоліць язык
af kazjone propitanje! на казённыя харчы!
bose komande босая каманда
besimxe-babe (пародыя на "besimxe-rabe")
kormenen mit terucim карміць абяцанкамі
grob vi a budke/bečke тоўсты як будка/бочка
koxn zix vi a šuster in bulbe-kaše *iron.* гарачыцца як шавец у камякох
kalt vi a ščavje халодны як шчаўе
nit kejn xux nit kejn dux ні хуху ні духу (аб печцы, якая ледзь гарыць)
kejn dux nito і духу німа
panske x(v)arobe панская хвароба
štrojene pane/panjenke кіссйная/саламяная пані

zajn mit emecn panibrat(iš) быць з кімсьці запанібрата
ix bet ajx iber ajer laske я прашу ў вас прабачэньня (вашай ласкі)
er hot šojn zajn službe opgedint ён ужо сваю службу адслужыў
opłozn di lejces адпусьціць лейцы
s'vet arojskumen af svente nigde гэта будзе на сьвятыя ніколі (на сьвятыя Міколы або ніколі)
genug cu bohomoljen! досыць багамоліць/балбатаць!
s'vet arojs bokom выйдзе бокам
blajbn bez hene, bez smene застацца безь нічога
a brat fun di breter брат з братоў (*vrš.* "brat" брат – "bret" дошка)
puste gajve пустая фанабэрыя
a gešlogener gastinec выбіты/укачаны гасьцінец
a gancer ja-tebe-dam наўда вялікая (фігурант, боты ў рант)
ganevski vid выгляд як у злодзея
gezogt gevorn af trascen! сказана на трасцу! (аб перабольшваньні шчасьця)
es iz nit varem fun dobre rejdele, nor fun dobre mejnele цёпла не ад добрых словаў, а ад добрага намеру
hašivejnu nazad! варочай назад! паварочвай аглоблі!
ojszidlen vi dem poslednem (merzavec) аблаяць як апошняга (паскудніка)
ove-tove – di ku iz a krove як ні круці – корова ёсьць карова
ox un mox un es vakst nox *hum.* вох і мох і яшчэ й расьце
"vajove Homen", maxt Raše: – Čort jeho prinjos (der švarc-jor hot im ahergebraxt) "і Гаман увайшоў", Рашы тлумачыць: – Чорт яго прынёс
ejner – u Lisi, der anderer – u Strisi хто ў лес, хто па дровы

Словы зь ідышу трапілі нават у беларускія дзіцячыя лічылкі:

***
Шытыль-пытыль, шэндыль-мэндыль!

***
Анцы, цванцы,
Трычы, рычы,
Эны, бэны,
Мэны, вэк!

***
Она, дуна, рэс,
Кіндэр, віндэр, рэс.
Она, дуна, раба,
Кіндэр, віндэр, жаба.

***
А ты, шындаль-біндаль, што пашындаль,
Гарцу-барцу з калаґрынцу – кох!

פינסק

IV

Blojz vinter,
Ven s'iz der besalmen
Farfrojrn,
A šnejveg vert tetik.
Er firt
In di noentste štetlex,
Vos hejsn:
Azariči,
Pariči,
Kojčici,
Svisloč.
(P. Plotkin. Štejner dercejln.)

На жаль, у мясцовай тапаніміцы вялікага сьледу жыды не пакінулі. Гэта – Жыдова Буда (неіснуючая з 1935 г. вёска Клімавіцкага павету Магілёўскай губерні), Жыдчэ (вёска ў Пінскім уезьдзе, Менскай губерні), Жыдачоў (горад на Львоўшчыне), Жыдычын (сяло на Валыні), Жыд(ы)кі (Жыдыкай, вёска ў Мажэйкскім раёне, Літва), Жыдкайміс і Жыдзейканы (Жыдавішкіс, вёскі ў Троцкім уезьдзе, Віленскай губерні). На Камянеччыне жыды заснавалі тры сельскагаспадарчыя калёніі ў вв. Сарава, Лотава, Абрамава (біблейскія імёны Сара, Лот, Абрагам). На Меншчыне – Аронава Слабада. Але ў розных кутках Беларусі можна знайсьці вёскі, назвы якіх утвораны ад гэбрэйскіх імёнаў: Абрамава, Абрамаўцы, Адамаўка, Адамава, Верамеічы, Верамеева, Гаўрылаўка, Гаўрылаўцы, Давыдкавічы, Давыдаўка, Данілевічы, Данілавічы, Елізаравічы, Захарычы, Захаркі, Ількавічы, Ісакавічы, Ісакаўцы, Майсеевічы, Майсееўка, Міхееўка, Міхевічы, Міхейкі, Міхневічы, Міхноўка, Мішкавічы, Самсонаўка, Самуйлава, Юдзіна, Юдаўка, Юдзічы, Якубовічы, Якавішкі, Якімавічы, Якімаўка, Ялізава, Янава, Янавічы, Яроміна, Ярэмічы... Ёсьць вёскі Суботнікі, Суботы... Напэўна, ня менш на́званаў можна адшукаць у мікратапаніміцы – Жыдоўскае поле, Жыдоўскі луг, Жыдоўскі город, Жыдоўскі лес, Жыдоўскі шлях, Жыдоўская грэбля, Жыдоўскі брод, Жыдоўскі канец, Жыдоўска(я) яма, Кагальны калодзеж, Школішча... Народная этымалёгія тлумачыць назву мястэчка Невель як гэбрэйскае "nevel" арфа (цара Давіда) [*h.* נבל] – на жаль, гэта ня так.

Часта зьмянялася (перакладалася на ідыш) першая частка ў падвойных назвах гарадоў, мястэчак і вёсак – Новы-, Стары-, Вялікі-: Naj-Dubrove (Новая Дуброва), Naj-Zipkev (Навазыбкаў), Naj-Seversk, Naj-Šepelič, Naj-Bixev (Новы Быхаў), Alt-Bixev (Стары Быхаў), Grejs-Sele (Вялікае Сяло), Grejs-Brestovič, Grejs-Rite (Вялікарыта)

У большасьці выпадкаў у ідышы захоўваецца беларускае вымаўленьне ў назвах гарадоў, мястэчак і вёсак ("аканьне", шчылінны "г"): Abčihe (Абчуга), Abolés (Абольцы), Amčislav (Амсьціслаў), Asipovič (Асіповічы), Astravec (Астравец), Astrin (Астрына), Ašveje (Асьвея), Azarič (Азарычы), Babovne (Бабоўня), Babrojsk/Babrujsk (Бабруйск), Barkulabev (Баркулабава), Behomle (Бегамля /Бягомель), Brahin (Брагін), Brisk (Берасьце/Берасьця), Dalhinev (Даўгінаў), Daškávke (Дашкаўка), Drahičin (Драгічын), Hajne (Гайна), Hajšin (Гайшын), Halubic (Галубічы), Hancevic (Ганцэвічы), Haradec (Гарадзец), Haradečine (Гарадзечна), Haradok (Гарадок), Harodej (Гарадзея), Hom(e)l/Homle (Гомель), Horadne/Harodne (Горадня), Horval (Горваль), Hresk (Грэск), Ihumen (Ігумень, Чэрвень), Kabilnik (Кабыльнікі), Kapulje (Капыль), Knjahinin (Княгінін), Kruhle (Круглае), Lahišin (Лагішын), Lahojsk (Лагойск), Mahilne (Магільна), Malodečne (Маладэчына), Mazir (Мазыр/Мозыр), Mjor (Мёры), Mo(hi)lev (Магілёў), Navahradek/Navar(e)dok (Навагрудак), Rádiškevič (Рáдашкавічы), Rahin (Рагінь), Rebzevič (Рубяжэвічы), Rohečov (Рагачоў), Samaxvalevič (Самахвалавічы), Skrihelov (Скрыгалаў), Slabodke (Слабодка), Smargon (Смаргоні), Stejpc (Стоўпцы), Stučín (Шчучын), Taločin (Талачын), Valožin (Валожын), Varnjan (Варняны), Žaludok (Жалудок).

Ёсьць у ідышы й свая назва для Беларусі – Rajsn...

Мястэчкі, мястэчкі, мястэчкі... Панямоньне, Падняпроўе, Падзьвіньне, Палесьсе...

"Farbrent zol vern di stancje Baranovič!" (Гары яна гарам, тая станцыя Баранавічы!) – піша Шолам-Алэйхэм. Але й жыдоўскія прыказкі не абмінулі геаграфію Беларусі: "Орша, Шклоў і Магілёў, Стары Быхаў, Рагачоў"; Сураж, Веліж і Парыж; "fun Minsk biz Pinsk un Motele af šabes" (ад Мінску да Пінску, а ў Мотыль на шабас); "a šmic in Janovic – hajda in bod arajn!" (хлысь у Янавічы – гайда ў лазьню!); "ojsšteln di ojgn/kukers vi der brisker malex-hamoves" (выратаваць вочы як берасьцейскі анёл сьмерці); "hern vi in Puxovič di megile" (слухаць як у Пухавічах сьвятое пісаньне); "s'vet gor blajbn Trok on zojermilx un lvje on smetene!.." (*iron.* застануцца Трокі зусім бяз кіслага малака, а Іўе безь сьмятаны!..); "ošmener šljaxticn" (*iron.* ашмянскія шляхцюкі); "bjalistoker tej" (беластоцкі (кепскі) чай); "želudker konovodes" (жалудоцкія канаводы); "čerejer levone" (чарэйскі месяц); "polocker likes" (полацкія завулкі); "rožankover mexile-betcr" *iron.* (рожанкоўскі просьбіт); "kapuljer naronim un klecker ganovim" (капыльскія дурні і клецкія злодзеі); "a kapuljer oncuhereniš mit a buxce in zajt" (капыльскі (празрысты/тоўсты) намёк і таўхель у бок); "nu iz in Lukoml" (ну – у Лукамлі); "di Vilie brent nit" (Вяльля не гарыць); "s'brent di Vilie!" (*iron.* Вяльля гарыць!); "me ken mit a špendl di Vilie ništ faršparn" (нельга трэскай Вяльлю запрудзіць); "opton af rajsiš" зрабіць па-беларуску (утнуць штуку); "s'iz rajsiše vaser" *iron.* (гэта – беларуская вадá).

Паводле жыдоўскіх прозьвішчаў можна вывучаць мястачковую беларуска-жыдоўскую геаграфію:

Азерскі (Азяры),
Альхоўскі (Альхоўцы),
Альшанскі (Гальшаны),
Амдурскі, Андурскі (Індура),
Амханіцкі (Амхінічы),
Амчыслаўскі (Амсьціслаў, *jid.* Amčislav),
Антопальскі (Антопаль),
Арлянскі (Ворля),
Аршанскі (Орша),
Асіноўскі (Асінаўка),
Асоўскі (Асоўцы),
Астравянец (Астравец),
Астрамецкі (Астромічы),
Астроўскі (Востраў),
Ашмянскі, Ашмянец (Ашмяна),
Баркоўскі (Баркі),
Барысавец (Барысаў),
Баярскі (Баяры),
Беластоцкі (Беласток),
Бельскі (Бельск),
Беразень, Берзін (Беразіна, *jid.* Berezin),
Брагін, Брагінскі, Рагінскі (Брагін),
Браслэвэр, Браслаўскі (Браслаў),
Брыскер, Брыскін, Брэскі, Брэскін (Берасьце, *jid.* Brisk d'Lite),
Быстрыцкі (Быстрыца),
Быхаўскі (Быхаў),
Валожынэр (Валожын),
Васілевіцкі (Васілевічы),
Вейнаў (Вейна),
Відэмлянскі (Відамля),
Віленскі, Вільнэр (Вільня),
Віцебскі (Віцебск),
Вішнёў (Вішнева),
Вобальскі, Вобалец (Вобаль),
Вольпін (Волпа),
Высоцкі (Высокае),
Галаўчынэр (Галоўчын),
Гарадзецкі, Гарадніцкі (Гарадок),
Глускер, Глускін (Глуск),
Глыбокін (Глыбокае),
Гомельскі (Гомель),
Грабаўшчынэр (Грабаў?),
Гразоўскі (Грозаў?),
Гроднэр, Градзенчык (Горадня),
Дабрушын, Дабрусін (Добруш),
Даўгапольскі (Даўгапольле),
Даўгінавэр (Даўгінава),
Дзяньдзельскі, Дзяньцельскі (Дзятлава, *p.* Żdzięcioł),

Друян (Друя),
Дрыбінскі (Дрыбін),
Дрэчын (Дзярэчын, *jid.* Drečin),
Дубравіцкі, Дуброўнэр (Дуброўна),
Журбінскі (Журбін),
Жухавічэр (Вялікія Жухавічы),
Жырмунскі (Жырмуны),
Жытлоўскі, Жэтлоўскі (Дзятлава, *jid.* Žetl, Žitl),
Забалоцін (Забалацьце),
Зарэцкі, Зарэцэр (Зарэчча),
Заслаўскі (Заслаўе),
Імханіцкі (Амхінічы),
Індурскі (Індура),
Камайскі (Камаі),
Камянецкі (Камянец),
Карлін, Карлінэр, Каралінскі (Каралін, цяпер частка Пінску),
Карэліц (Карэлічы),
Касоўскі (Косава),
Кахановэр (Каханава),
Клецкін (Клецк),
Клімавіцкі (Клімавічы),
Клічаўскі (Клічаў),
Клявіцкі (Кляўцы?),
Кобрын, Кобрынскі, Кобрынэр, Кобрынец (Кобрынь),
Койдэнавэр, Каданэр (Койданава),
Копысскі (Копысь),
Косаўскі (Косава),
Краснэр (Краснае),
Крупкін (Крупкі),
Крывіцкі (Крывічы),
Крычаўскі, Крычэвэр (Крычаў),
Лапіцкі (Лапічы),
Леплеўскі (Лепель),
Лёзнэр (Лёзна),
Лідзкі (Ліда),
Лінтуп (Лынтупы),
Ліпскі (Ліпа, Ліпск?),
Лоеўскі, Лойеў (Лоеў),
Любавіцкі (Любавічы),
Любан, Любанскі (Любань),
Любчанскі (Любча),
Ляльчук (Лельчыцы),
Ляхавіцкі (Ляхавічы),
Магілевэр, Молівэр (Магілёў),
Магільнэр, Магільніцкі, Магілянскі (Магільна),
Мінскі (Менск),
Мірскі, Міраў (Мір),
Навагрудзкі (Навагрудак),
Навадворскі (Новы Двор),
Наваселецкі (Навасёлкі),
Неманскі (Нёман),
Оршэр (Орша),

Падліпскі (Падліпкі),
Падлускі (Падлужжа),
Пажэжынскі (Пажэжына),
Палонскі (Палонка),
Парэцкі (Парэчча),
Пастаўскі (Паставы),
Пінскі, Пінчук (Пінск),
Плешчыцэр (Плешчаніцы),
Полацкі (Полацак),
Пружанскі, Пружан (Пружана),
Прылуцкі, Прылук (Прылукі),
Рагачовэр, Рагачэр (Рагачоў),
Радашкевіч (Рáдашкавічы),
Радунскі (Радунь),
Радуцкі (Радута),
Ражанскі (Ражанка),
Ракаўскі (Ракаў),
Розінэр, Разіноэр, Ружанскі (Ружаны, *jid*. Rozinoj),
Рудзенскі (Рудзенск),
Рудніцкі (Рудня),
Рэчыцкер (Рэчыца),
Скідэльскі (Скідаль, Скідзель),
Склоўскі, Скловэр (Шклоў),
Слабоднік (Слабада),
Слонімскі (Слонім),
Слуцкі (Слуцк),
Смаргонскі, Шмаргонэр (Смургоні),
Сьмілавіцкі (Сьмілавічы),
Сосенскі, Соснэр (Сосенка),
Старобінскі, Старобінэр (Старобін),
Столін, Столінскі (Столін),
Сураскі, Суражскі (Сураж),
Сьвірскі, Сьвірноўскі (Сьвір),
Татарскі (Татарка),
Трасьцянецкі (Трасьцянец),
Тураўскі, Туравэр (Тураў),
Турэцкі (Турэц),
Ходас (Ходасы, Хадасы),
Хомскі (Хомск),
Хацемлянскі (Хоцімск),
Целеханэр (Целяханы),
Цымкоўскі (Цімкавічы),
Чарналескі (Чарналесьсе),
Чавускі, Чаўсэр (Чавусы),
Чарэйскі (Чарэя),
Чачэрскі (Чачэрск),
Чэрыкавэр (Чэрыкаў),
Шарашэўскі, Шэрэшэўскі (Шэрашава),
Шклоўскі, Шкловэр (Шклоў),
Шацкі, Шацкер (Шацк),
Яноўскі (Янава),
Ясіноўскі (Ясень)...

... альбо рамёствы й занятак жыдоў на Літве:

Агульнік,
Алейнік,
Аптэкар,
Бакалейнік,
Балагол,
Баншчык,
Батвінік,
Бляхер,
Бондар, Бэнднэр,
Бортнік,
Бровэр,
Брукаж,
Брыгадны,
Буднік,
Вадавоз, Вадаёос,
Вапняж,
Васкабойнік,
Вінакур, Вінараў,
Вучыцель,
Гамарнік,
Ганчар,
Гарабейнік,
Гарбар,
Гарнік,
Гарэлік,
Гольнік,
Гонтар,
Гуральнік,
Гэндлер,
Дзягцяр,
Друкер,
Дуднік,
Жалязьняк,
Загальскі,
Златар, Злотнік,
Зэйгарнік,
Зямцоў,
Ігольнік,
Каваль,
Калесьнік,
Камісар (кіраўнічы маёнткам),
Канвісэр,
Капялюшнік,
Карабельнік, Карабейнік,
Карчмар,
Катляр,
Квасьнік,
Кілімнік,
Кравец,

Крамар. Крамін,
Красільнік,
Краўчык,
Крахмальнік,
Кузьнец,
Купец,
Кучар,
Кушнір,
Лазьнік,
Лекар,
Лікворнік,
Люстэрнік,
Магазыншчык,
Малочнік,
Малярчук,
Медавар,
Меднік,
Мельнік,
Мірошнік,
Млынар,
Музыкант,
Мукамел,
Мулер,
Мучнік,
Мытнік,
Мэханік,
Паграбенік,
Падрадчык,
Паперны,
Партны,
Пасечнік, Пасечны,
Пасманік,
Пастолаў,
Паташнік-Стрэльнік,
Пачтарук,
Пашэрсьцьнік,
Пекар,
Перавозьнік,
Пераплётчык,
Півавар,
Пільшчык,
Плаўнік,
Плотнік,
Плужнік,
Пляшэчнік,
Правізар,
Пячнік,
Пячэнік,
Раменік,
Рамізьнік,
Рольнік,

Руднік,
Рыбак,
Рымар,
Рэзьнік,
Саладоўнік,
Сапожнік,
Скрыньнік,
Смаляр,
Стараста,
Столер,
Стралец,
Стругач,
Стрыхер, Стрыхаж,
Стэльмах,
Сукенік, Сукнавальнік,
Сьлесар,
Сьпівак,
Сьцякольшчык,
Талесьнік,
Тандэтнік,
Тартаковэр,
Ткач,
Токар,
Трубнік,
Тыпограф,
Фабрыкант,
Фактар,
Фарбэр,
Фарфурнік,
Фурман,
Футэрнік,
Фэльдчэр,
Хвойнік,
Хмельнік,
Цагельнік,
Цесьлер,
Цукернік,
Цымбаліст,
Цырульнік,
Цэхмайструк,
Цюцюнік,
Шапашнік,
Швец,
Шкляр,
Школьнік,
Шкроб,
Шпітальнік,
Шынкар,
Ювэлір,
Юрыст
Ярмольнік...

... альбо беларускую фаўну:

Акунёў, Бабёр, Баброў, Бараноўскі, Барсук, Бык, Варонін, Верабейчык, Вэвёрка, Вэвюрка, Галкін, Галубоўскі, Глушэц, Голуб, Журавель, Заяц, Зайчык, Зязюлін, Казлоўскі, Карасік, Карп, Карпаў, Кобец, Кролік, Крук, Кулік, Куніца, Лашак, Ліс, Лісіц, Лось, Лосеў, Окунь, Плоткін, Рак, Расамаха, Рысь, Сабалеўскі, Салавейчык, Сарока, Сарокер, Сокал, Шчукін, Шчупак...

... альбо проста беларускую мову:

Агрэст, Агурок, Бабін, Бакаляр, Балоцін, Барада, Басок, Белавусаў, Беленькі, Блінчэўскі, Боршчык, Бублік, Булкін, Бярозкін, Віхор, Гармідэр, Гарэлік, Грубіян, Гуз, Гузік, Дазорац, Дзёгаць, Дубавіцкі, Жалейка, Жаніхоўскі, Жаўнераў, Жытніцкі, Зудзілін, Кабак, Кавалерчык, Каліка, Калцінюк, Калядны, Капшук, Капялюш, Карачунскі, Картопель, Картуз, Каўтун, Качаргінскі, Кіт, Крупнік, Круцель, Крываруцкі, Крывашэй, Крывулін, Кульбак, Куцэногі, Лапата, Локшын, Маразовіч, Мармур, Мураванчык, Мястэчкін, Мяцеліца, Падмаза, Плаўнік, Правідла, Прыблуда, Прыгонікер, Прымак, Разумны, Рыжыкаў, Рэдзька, Сапун, Сірота, Сіўчык, Скобла, Скурка, Сьляпак, Смолкін, Старажылец, Сьвярдзель, Сьляпняк, Трылесьнік, Фанабэрыя, Халяўскі, Хват, Хітрык, Цьвік, Цыбулеўскі, Цыбуля, Чарняк, Шляхтэр, Ядваб...

АД ШЭНЁЎ ДА ПРУЖАНЫ
з росказаў цёткі Ноны
(занатаваў Уладзімер Ракіцкі)

Езжу гэтак далёка, гэтак доўга,
а ад Шэнёў да Пружаны – дзесяць капеек,
у мяккім – трынаццаць.

У. Ракіцкі

По сярэдзіні села быў пляц, которы называўса Курэлем. На Курэлі заўшэ на сьвята зьбіралосо много людзей, "біліса ў яйца"...

Гам жэ на Курэлі стоялі тры жыдоўскіе хаты, у одной жыў Шлёма (Гальперын) і ёго маці Бэйля. Жонку Шлёмы звалі Пешка, і дочку воны мелі Малку – маленькая, рокоў пяць-шэсьць было ёй. Брат Шлёмы, Мовша, жыў з своею жонкою, і дочка была ў іх Гітля. Мовша быў балагола, развозіў усе і возіў, а Бэйля торговала ў корчме. Торговала хлебом свое выпэчкі, крупамі, соль продавала, газу, запалкі і табак. Много чого можна было там купіці, навэць колі ты грошэй не меў, то Бэйля давала на довер, ано ў цітрадзь свою запісвала і ніколі нікому не отказвала. Вэчорамі мужыкі зьбіраліса ў корчме, зімою, колі воны доўгіе, то і сядзелі там доўго. Шлёма выпісваў жыдоўскую газэту, то ёго дочка, малая Малка, чытала гэту газэту і одразу ж перэказвала ўсім, шо там было напісано. Так у Шэнях дознаваліса, шо ў сьвеці робіцца.

Шлёма мог і пострыгчы, але за грошы. Одного разу Мікола Засім попросіў, коб пострыг ёго.

– Э, чым, босота, плаціці будзеш? – попытаў Шлёма.

– А, от давай, покі будзеш стрыгчы, то я тобе вершыка складу.

Згодзіліса. І, ано Шлёма скончыў, устае Мікола і чытае:

Яго ножны стукі, стукі,
А як возьмэ брытву ў рукі,
Як шарне туды-сюды,
Так не стане барады.

Хахочэ ўся корчма.

У трэйцёй хаці жыў коваль Овэль. Вон меў сына Хайма і дочку Нэху. Хайм не стаў ковалем, а меў гіншы гешэфт. Другім ковалем на селе быў Козёл Фома.

У пана Дзяконского было много земле, гэто од Крывулі, од самого полотна аж до Шэрэшова, усе ёго было. Меў вон землю і ў Ружанской пушчы і землю за Вэлікім Селом. Стары Дзяконскі лечыўса ў Варшаві і ў 1920 годзі продаў Волю і Бекешоўку немцу Драгайму. Драгайм лес вырэзаў у 1926 годзі, а землю продаў пэрэкупшчыкам. Гэту землю і ешы не вырэзаны лес купіў прамысловец з Бярозы Фінгельштэйн. Бекешоўку і Волю до 1939 года вон розпродаваў ужэ нашым людзям.

Уся Пружана топіласа дровамі. Гэто ж на кажды комін колькі дроў трэба было. Лесопілкі мелі жыды, воны закупалі лес на корню ў обшарнікоў і заготоўлялі осьмухі (1/8 частка кубічнага сажня дроў, сажэнь быў роўны 2м 10 см). Одного разу такі купец Ляцкі, наймаючы шанёўцоў, зорваў цэну за вывозку осьмухі. Усе село зробіло забастоўку і не хоцело проці двух злотых за

осьмуху, возіці по одному з половіною. Але одзін згодзіўся і на такіе грошы. Ляцкі і кажэ: "От, Мікола, можэ возіці, ёму выгодно, а вам не. Але вон розумнейшы за вас".

Вывэрнуўшы кожухі і завязаўшыса хусткамі, хлопцы пэрэпынілі того Міколу і попэрэрэзвалі ўжэ ў хамутах. Тут Ляцкі обачыў, што не можэ цягаціса з усімі і згодзіўся на два злотые за осьмуху, як і было. А коб заготовіці дрова, то за одну осмуху плацілі по злотому. На заготоўку ў лес ходзілі і молодые хлопцы, але воны не выроблялі только, як дорослые, которые моглі за дзень заготовіці по штэры-шэсьць осьмух, а молодые ано по дзьве. От, то про іх і говорылі: "По золотому і харчы з(у) дому".

Хто хоцеў найняціса до кого на роботу, то шоў до Белых Лавок і там ждаў, колі хто з жыдоў поклічэ, чы дрова порэзаці, чы хлева поладзіці, чы лёду наколоці для леднікоў, поладзіці моста, а то і просто ў шабэс ростопіці самовара чы печ. Бо ў гэты дзень воны не моглі навэць запалкі браці ў рукі. Было гэтэ чаканьне "под лаўкамі", як у той байцы з работнікамі на вінаградніку.

У Пружані была одна лесопілка, у Зэйды Круцеля, піўзавод у Померанца, гарбарня была ў Макарэвіча. Была ні одна кузьня, валюшная, маслобойня, мелосо тры паровых млына, сыроварні жыды трымалі на хуторах. А ўжэ краўцоў і шаўцоў не полічыці. Былі сярод іх і мэшчане, але колі ты хоцеў шось по-людску пошыці чы роскроіці, то шоў до Штамера.

Пружаны былі жыдоўскім мястэчкам. Торговалі з каждого окна Белых Лавок, торговалі по ўсіх Пружанах. Торговалі товаром дзяржаўным, быў такі цэнтар "Рольнік" і, конечно ж, прыватная вялікая лаўка Камінского, у Равіцкого была оптовая лаўка абутку. Нашые людзі з Шэнёў робілі не только ў Пружані, а наймаліса на роботу ў Беловежу і Ружанскую пушчу. Осушалі болота, дробілі каменьне на дорогі. Чэчко Ігнат, Чэчко Андрэй, Чэчко Володзя, Чэчко Васіль дробілі каменьне ўруч. Обмотвалі онучамі ногі і імі трымалі на наковальні камэня, по которому і білі молотом, а потом ногамі ссовалі ўжэ роздробленэ каменьне. Валікого камэня колоў Адамовіч Васіль, по-хатнёму Сепко. А рваў камэня Клемэз. Позьней гэтые дробільшчыкі замест онуч сталі на ногі надзеваці гумовые бахурэ, которые сталі шыці ў Пружанах і про якіе казалі, што "кажды белорус мае свой аўтобус". Гэто былі гумовые лапці, зшытые з мотоцыклетных опон. Іх сталі обуваці і на сенокос і ў поле на жніво – лапцей з лыка ужэ не носілі, бо "кожны белорус меў свой аўтобус".

Шане не моглі жыці бэз Пружаны, а Пружана не могла быці бэз Шэней. Жыды жылі своім кагалом і ў іх быў рабін. Рабін чытаў Тору, судзіў і радзіў усе іх справы. Усе сёла былі подзелены між імі і ано назначаны ім чалавек мог зьбіраці там онучы чы торговаці, чы купляці короў і целят. Рабін робіў монопольку, помагаў бедным і заступаўся за богатых.

У шабэс бронь божэ коб жыд узяўса за ножа чы за запалкі. Ні можна было і сало ім есьці, але былі і сярод іх, шо елі, бо дзе ж было сілы ўзяці, як цяжко робіў. Колі до цябэ ў хату прыходзіў жыд, то вон заўшэ здымаў шапку. Але колі вон попросіт воды і будзе яе піці, то зноў надзене шапку. Жыд заўшэ ест і п'е з покрытою головою. У суботу воны ніц не робілі, і німожна было нікуды рухаціса, але колі мусово трэба было кудысь ехаці, то Мовша под сено ў свой возок клаў бутылку з водою – і вон ужэ не ехаў, а плыў по водзе – то по моры плыці закон не возброняў.

מאַי אין מיכאַלישעק און סוינציאַן

א

וואָם טוט אין מיכאַלישעק דער מיִי אַצינד
אויב ניט צו ווייַזן וואָם ס'איז עלנטער פון אַ שטיין, –
און אויב דודם פידעלע איז אינעםווינט,
קען נאָר אויף ייִדיש דודם פידעלע דאָ וויינען,
וויַל נאָר אויף ייִדיש האָט דאָ מיַן פאָלק די זון געזען,
נאָר אויף ייִדיש איז דאָ די וועלט אַ מעשהלע געווען, –
איז אַ געבעט אַזאַ אין מיַן שטעטעלע געבליבן,
אַ געבעט, ווי די האַנט פון אַ בעטלער ■ בלינדן,
אַ געבעט אַז אויך גאָט זאָל סיַ זיַן האַם, סיַ זיַן ליבע,
סיַ שילטן, סיַ בענטשן אויף אונדזער איינציקן מאַמע־לשון,
אויף אונדזער ייִדיש אויסגעלאַכטן, אויסגעוויינטן מאַמע־לשון.

ב

ייִדיש, מיט שיפורלעכן טעם פון אַן ערשטן קוש,
ווי מיַן מאַמע אָנבליק פאַרגייט קיינמאָל ניט.
ייִדיש, צו דיר מיַן ערשט געשריי, צו דיר מיַן לעצטער קוש!
ייִדיש, מיט בלענד פון שיַטערדויפנם אָנגעגליט –
וועך וואַגט קעגן אַזאַ גרויזאַם ליכט זיך ווערן?
דורך אַזאַ בראַנד בליַבט פון שׂונא קיין זכר ניט.
ייִדיש, פראָסט ווי ליכט דורך חרובע געסעלעך,
ייִדיש, פשוט ווי די שטיינער וואָם האָבן געצאָרנט
קעגן שׂונא – אין וועלנער און וואַרשעווער געסעלעך.
אַזאַ מרעד – אַזאַ פלאַם, וואָמער בעזעם קען פאַרקערן?
ייִדיש, ווי דעם מאַי איז דיר באַשערט אַוויפל יאָרן.

ג

וואָם איז אין סוינציאַן דער מאַי – מיַן קינדהיַם אַצינד,
אויב ניט אַקעגן זונאויפגאַנג – אַ בלינדער גרייַז,
אַז ס'קען דאָ אַ וויינטעלע, אַ בלום, אַ שטערן, אַ גראָז,
נאָר דעם אייגענעם טרויער די שיינקיַם וויַזן.
אַ וויינטעלע פלאַטערט, ווי אַ פאַרפיַניקט, גופלאָז קינד,
פון מאַמע־מאַמע, פון הימל און ערד פאַרלאָזן.
אַ בלום איז אַ פאַרשפילטע, מאָרגנדיקע פרייד,
אַ שטערן איז – אַן אויסגערונען אויג פון אַ קינד,
און וואָם איז אין שאָטן אַ גראָז, פון זון און פעלד צעשיידט,
אויב ניט אַן אומרו וואָם פלאַפלט ניט דערזאָגטע ריידן?
אַ ניט דערזאָגט וואָרט איז אַ קדוש – אַש אין וויַנט.

ד

וואָם איז אין מײַנע שטעטעלעך דער מאַי אַצינד.
אויב נים אַ בליִענדיקער פֿחד איבער קבֿרימלאָוע קינדער?
אַז ס'איז ניטאָ וועד ס'זאָל די שמחה פון אַ בלעטעלע דערזען.
ווי ס'וואָלט גאָר קיין שום אויג דאָ קיינמאָל נים געווען.
איז דאָ אין יעדן ליבט אַ בלינדקיִם אַזאַ פֿאַראַנען.
וואָם קען דער זון מיט גבורה פון גאָר דעם אומקום באַפֿאַלן.
דאָם עלנטסטע שאָטנדל דערשרעקט דעם פֿריידיקסטן שמראַל.
איז דאָ אין יעדער בלום דער צאָרן פון דאָרן פֿאַראַנען. –
איז דאָ דער מאַי – אַן אויסגעזונדיקטער טוים.
איז דאָ די בענקשאַפֿט נאָך ייִדיש ביז שמאַרבן צאַרט –
צאַרט. ווי אין ווינט – אַ האַרציִסנדיקע פֿליים.

ה

גוט וואָם איז מײַנע שטעטעלעך איז נאָך דער מאַי געבליבן.
די ווינטעלעך קושן נאָך פון ייִדיש דעם פֿראָסטן קלאַנג.
דער ייִדיש וואָם איז נאָך אין שאָרך פון חורבות געבליבן.
מיט גלי און ציטער פון קידוש השם אין יעדן קלאַנג.
אָ, וועד ס'לאָזט ניט ייִדיש, ווי אַ מאַמען ליב צו האָבן.
איז אָן ליבשאַפֿט, מיט שנאה פון אַ ראָב געבאָרן געוואָרן.
קען נאָר זײַן אייגענעם האַם ניט אויפֿהערן ליב צו האָבן:
אָ, ס'איז נאָך קיין גאָלד דורך פּייַער פון האַם ניט געגאָסן געוואָרן.
אָ וויסט איז ער, ווי אַ מדבר־זינגער פון אַ שאַקאַלך־כאָר.
ייִדיש, וויפֿל שטיינער, וויפֿל שנאה ס'וועט דעם וועג אונדז צאַמען.
וועלן מיר, ווי מאַי זיך רײַסן פון צעשפּאָלטענעם שטיין.

ו

ברודער, אָן ייִדיש, וואָם איז דײַן קינדהײַט, וואָם איז דער מאַי,
אויב נים, ווי אָן בליטן – אַ הוילע רויז?
ברודער, אָן ייִדיש, אָן דײַן קינדהײַט – אָן מאַי,
ווי רײַסט מען פון אַזויפֿל מוים זיך אַרוים?
אָ, ייִדיש: מוזנט יאָר חלום, מוזנט יאָר מאַי!

סוויגציאַן

81000

Ідыш-беларускі слоўнік = ייִדיש־ווייַסרוסישער ווערטערבוך / сабраў і пераклаў на беларускую мову
И29 А. Астравух. — Мінск : Медисонт, 2008. — 928 с.

ISBN 978-985-6530-86-2.

У новым «Ідыш-беларускім слоўніку» зьмешчана лексыка найбольш вядомых ідыш-слоўнікаў (аўтары: А. Гаркаві, Г. Страк, Ю. Марк, У. Вайнрайх, Н. Стучкоў, Р. Лёцш, Э. Фальковіч, Ш. Роккінд, Г. Шкляр, Ш. Плаўнік, Н. Рубінштэйн, І. Бэрнштэйн, Ш. Бастомскі, І. Гуры, І. Ніборскі і інш.), апрача таго частка неапублікаваных фразэалягічных матэрыялаў з архіву Ш. Роккінд і В. Сосенскага, жывая лексыка ідышу. У слоўніку блізу 25000 слоўных артыкулаў, 50000 словаў, больш за 5000 прыказак і прымавак, вялікая колькасьць ідыёмаў і цытатаў з літаратурных твораў і жыдоўскіх песень, анэкдотаў, блаславеньні й праклёны, кароткая этымалёгія словаў, а таксама аднакарэнныя словы, сынонімы й антонімы да словаў сэміцкага паходжаньня. Апроч таго, ва ўступных артыкулах і ў дадатку шырока разглядаецца агульны беларуска-жыдоўскі моўны й музычны фальклёр. Слоўнік прызначаны для ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі й яе дзьвюма дзяржаўнымі мовамі: беларускай і ідышам.

УДК 811.161.3’374=112.28
ББК 81.2Идиш

Аўтар рыхтуе да выданьня ідыш-расейскі слоўнік
Автор готовит к изданию идиш-русский словарь

Даведкавае выданьне

Ідыш-беларускі слоўнік

Сабраў і пераклаў на беларускую мову
Аляксандар Астравух

ייִדיש־ווייַסרוסישער ווערטערבוך

געזאַמלט און איבערגעזעצט אויף ווייַסרוסיש פון
אַלעקסאַנדער אַסטראַווּך

Адказны за выданьне: У. Сілянок
Ідэя афармленьня кнігі: Аляксандар Астравух, Андрэй Гарбенка
Кампутарны дызайн: Зьміцер Міцура
Карэктары: Алег Хадыка, Юлія Міцура, Тацьцяна Лаўрык,
Галіна Рабянкова (літара “В”)
Афармленьне форзацаў:
мапа „Lita (Lite): Jewish Lithuania“ (аўтар Довід Кац),
мапа „Беларусь у канцы XVI ст.“ (аўтар М. Сьпірыдонаў)

Падпісана да друку 11.01.08. Фармат 70x100 1/16.
Папера афсэтная. Гарнітура Times New Roman. Друк афсэтны.
Ум. друк. арк. 107,2. Улік.-выд. арк. 135,2.
Наклад 1000 асоб. Замова N 5.

Выдавец і паліграфічнае выкананьне:
Сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасьцю «Медисонт»
ЛИ № 02330/0133391 ад 19.07.04 г.
ЛП № 02330/0056748 ад 22.01.04 г.
220004, г. Мінск, вул. Ціміразева, 9.


ШАЎЛІ
ШАДАЎ
ПАНЯВЕЖ
ЖАМОЙЦКАЯ ЗЯМЛЯ
РАСІЕНЫ
КЕЙДАНЫ
ВЯЛЕНА
ВІЛЬКАМІР
КОЎНА
ВЯРБІЛАВА
НОВ.ТРОКІ
ВІЛЬНЯ
АЛІТА
МЕРАЧ
ДЫНАБУРГ
ЗЕМГАЛЬСКАЯ ГЕРЦАГСТВА
КУРЛЯНДСКАЯ
І Н Ф Л Я Н Т Ы
БРАСЛАЎ
АШМЯНА
ЛІДА
ГАРОДНЯ
НОВАГАРОДАК
МЕНСК
ВАЎКАВЫЙСК
СЛОНІМ
НЯСВІЖ
КЛЕЦК
ЛЯХАВІЧЫ
СЛУЦК
БЕЛЬСК
КАМЯНЕЦ
КОБРЫН
БЕРАСЦЕ
ПІНСК
ТУРАЎ
РАТНА
КОВЕЛЬ
ЛЮБОМЛЬ
К А Р А Л Е Ў С Т В А П

פאַראַן אַ לשן

פון האַלבע וועלטער וואָס קיים איך איפן

און ווערן אויסגעלאָשן

אויף די ליפן.

דאָך פילסטו זיי

מיט אַלע ביינער, מיט די ריפן...

פאַראַן אַ לשן

פון האַלבע וועלטער – אָנגעגליטע קיילן:

אַ זאָג, אַ שעפטשע,

נאָר עפּעס בלייַבט פאַרהוילן,

נאָר עפּעס ניט ביים סאַמען שלונג איך קוילן.

ביים סאַמע שלונג

נאָר קומט ניט אויף דער צונג.

די ווערטער – קאָנסט זיי ניט באַפיילן

אַרויסבאַקומען איך אינגאַנצן.

זיי פייַערלעך זיי טאַנצן

פון מויל צו מויל, –

געווען ערשט און ניטאָ שוין... –

אַזאַ מין לאָשן!

רחל בוימוואָל (גאָוועמבער, 1989)